Вітаўт Кіпель

ЖЫЦЬ І ДЗЕІЦЬ

УСПАМІНЫ

Мінск
Выдавец Зміцер Колас
2015

УДК [325.2(=161.3)(73)+94(476)](093.3)
ББК 63.3(4Беи)
К42

Рэдактар *Сяргей Шупа*

На вокладцы выкарыстаны фотаздымак
Анатоля Клешчука

ISBN 978-985-6992-68-4

© Вітаўт Кіпель, 2015.
© Афармленне. Выдавец
Зміцер Колас, 2015.

Прадмова

Мінуўшчына пазнаецца дваяка: з аднаго боку – азнаямленьнем з навуковымі працамі, а з другога – чытаньнем успамінаў пра жыцьцёвы шлях грамадзка ці навукова актыўных людзей. Гэты апошні жанр, аўтабіяграфічны, бывае ня менш павучальны, чымся навуковыя манаграфіі, а ў дадатак бывае вельмі займальны й лёгка чытабельны. Да такіх кніжак належаць багатыя зьместам успаміны майго даўнага сябры Вітаўта Кіпеля. У ягонай новай кнізе чытач знойдзе калярытнае апісаньне ня толькі 88-гадовага жыцьця аўтара, але й ягонае актыўнае дачыненьне да Беларускае Мінуўшчыны. А гэта таму, што Вітаўтавы бацькі, дый сам ён і ягоная жонка Зора (з дому Савёнак), былі творча задзейнічаны ў беларушчыне – прычым ня толькі на Бацькаўшчыне, але й на чужыне. А завілісты жыцьцёвы шлях д-ра Вітаўта Кіпеля пралёг зь Менску празь Сібір, Нямеччыну, Бэльгію, Амэрыку пакуль не вярнуўся, наездамі, да сваіх айчынных вытокаў.

Кніга Вітаўтавых успамінаў адзначаецца ляканічным апавядальным стылем, які абумоўлены тым, што спачатку тэкст быў электронна нагавораны ў гутарцы з рэдактарам, Сяргеем Шупам, а пасьля пакладзены на паперу. Адсюль дынаміка аповеду: кароткія сказы й рэплікі, людзі, факты, гістарычныя асобы, трагічныя падзеі, забаўныя выпадкі. Жыцьцё апавядальніка было нагэтулькі насычанае, што ён, каб расказаць пра ўсё, як бы сьпяшаецца, пазьбягаючы лішніх слоў. Кніга адзначаецца дынамізмам аповеду, лёгкасьцю чытаньня, гэта – сапраўдны падзейны калейдаскоп.

Другая адзнака ўспамінаў – аўтарава ёмістая памяць, у якой захавалася на дзіва шырокая й дэталізаваная панарама быту, насьвятленьня ўнікальна драматычнай эпохі. Выдатную работу прарабіў рэдактар кнігі Сяргей Шупа, падзяліўшы аповед на кароткія падразьдзелы й даўшы ім загалоўкі, што значна павысіла чытабельнасць кнігі.

Праз увесь гэты багаты аповед рэльефна прасьвечваюцца гістарычныя пэрыяды: савецкі, ваенна-нямецка-акупацыйны, постваенна-дыпіўска-лягерны ды ўрадлівы на грамадзкую й навуковую дзейнасьць самога аўтара пэрыяд амэрыканскі. У адлюстраваньні гэтага апошняга асаблівую цікавасьць маюць:

Праца аўтара заступнікам шэфа навуковага аддзелу ў славутай Нью-Ёркаўскай Публічнай Бібліятэцы. Цікава й аўтарытэтна падаюцца культура кнігі й роля бібліятэкі ў жыцьці амэрыканскага грамадзтва.

Сустрэчы аўтара з многімі прадстаўнікамі Беларускай ССР, якія,

прыязджаючы ў Нью Ёрк на гадавыя сэсіі ААН, не прапушчалі нагоды, каб не заглянуць у Публічную Бібліятэку з мэтай сустрэчы зь «землякамі» па розных афіцыйных даручэньнях савецкіх уладаў ды асабістых сваіх патрэбах.

Цікавы аповед аўтара пра ягоную актыўнасьць у Рэспубліканскай партыі, асабліва ў часе прэзыдэнцкіх выбараў, а таксама ў пашыраньні інфармацыі пра Беларусь праз арганізоўваньне беларускіх фэстываляў, выставак, дэманстрацыяў.

Апавядае мэмуарыст таксама пра сваё актыўнае дачыненьне да радыё «Вызваленьне/Свабода» ў Нью Ёрку, дзе ён быў вольным супрацоўнікам, аўтарам рэпартажоў і камэнтароў.

Багата ва ўспамінах інфармацыі пра дзейнасьць Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва, пра шматгадовага старшыню БІНіМу д-ра Вітаўта Тумаша, пра выдавецкія справы, пра ролю самога аўтара на становішчы старшыні гэтай установы.

Д-р Вітаўт Кіпель шмат часу, вольнага ад прафэсійнай працы, прысьвяціў амэрыканскаму скаўтынгу, празь які прайшоў і ягоны сын Юрка. За ўсё гэта Вітаўт атрымаў высокія ўзнагароды й тытулы.

Многа ва ўспамінах эпізодаў з узгадоўваньня ў сям'і Вітаўта й Зоры Кіпеляў у амэрыканска-беларускім духу іхных дзяцей, якія сёньня займаюць высокія становішчы ў сваіх прафэсіях: сын – доктар дзіцячай кардыялёгіі, а дачка Алеся – адвакат вялікай вашынгтонскай фірмы, спэцыялістка міжнароднага права. Абое яны актыўныя ўдзельнікі ў палітычным і культурным амэрыканскім і амэрыканска-беларускім жыцьці.

Вартасныя дэталі падае аўтар пра беларускія эмігранцкія арганізацыі й палітыку, царкоўны падзел, сваё асабістае дачыненьне да палітычных лягераў, бээнэраўскага й бэцээраўскага, ды мноства іншага.

Зьмястоўная таксама частка ўспамінаў пра кантакты з родзічамі, навукоўцамі й літаратарамі ў Беларусі пасьля падзеньня савецкага рэжыму: сустрэчы са сваякамі й сябрамі, удзел у канфэрэнцыях, зьездах, наведваньні культурных і навуковых установаў і г. д.

Завяршаюцца мэмуары аповедам пра аўтараву ролю ў сярэдзіне 1990-х гадоў перакладніка ў атрымоўваньні ў Злучаных Штатах Зянонам Пазьняком і Сяргеем Навумчыкам статусу палітычных уцекачоў.

Янка Запруднік

Бацькі і маленства ў Менску

Бацька

Бацька Яўхім Яўсеевіч Кіпель паходзіць зь вёскі Байлюкі недалёка ад мястэчка Глуск – як ён пісаў, «кілямэтраў чатырнаццаць, не такая вялікая далечыня, кожны тыдзень нехта адтуль у Глуск вазіў дровы». Бацька зь сялянскай сям'і, сялянскага роду, які ідзе ў глыбіню вякоў. Вёска невялікая, я яе пару разоў адведаў. Дзядоў сваіх па бацьку я ня памятаю, я іх ніколі ня бачыў, прыязджаў у вёску, калі іх ужо не было ў жывых. Ведаю, што бацькава маці Фядора любіла сьпяваць. Наогул у Байлюках Кіпеляў шмат, гэтае прозьвішча ў тых ваколіцах пашыранае, ёсьць там шмат Сапегаў і Янкоўскіх, і мовазнавец Фёдар Янкоўскі таксама быў сваяк па лініі жанімстваў з Сапегамі. (У кнізе Сяргея Дубаўца «Майстроўня» Віктар Асьлюк пра тую мясцовасьць згадвае гэтак: «... я з тых мясьцінаў, дзе нарадзіліся Фёдар Янкоўскі і Яўхім Кіпель. Мая баба па прозьвішчы таксама Кіпель. Яны з адной вёскі, я думаю, яны там усе сваякі былі».)

Што да далейшых продкаў, дык бацька расказваў, што ягоны дзед і шмат іншых людзей яго часу ўдзельнічалі ў паўстаньні. Паўстаньне, як казалі, было супраць цара, хоць дзяды шмат не арыентаваліся, якое гэта было паўстаньне, але бацька казаў, што прыпушчальна Каліноўскага. Можа й Каліноўскага, а можа – паводле майго разважаньня – паўстаньне сялянаў супраць мясцовага пана.

Маці

Маці Марыя Васілеўна Зубкоўская – зь менскіх мяшчанаў, нарадзілася ў Менску ў рагавым доме насупраць гарадзкога тэатру па вуліцы Карла Маркса, уніз, справа. Ейны бацька Васіль Паўлавіч Зубкоўскі прыехаў у Менск, працаваў у тэатры «істапніком», а потым «пры гардзяробе», адрабіў у тэатры каля сарака гадоў.

Дзед паходзіць зь вёскі Вугляны, я на жаль гэтай вёскі не адведаў. Бабка Марфа Кандрацеўна Ваўчок таксама, здаецца, з Вуглянаў або, можа, з суседняга Юзафова. Так што па лініі маці я, як выглядае, сялянскага роду, радня дзядоў жыла ў Вуглянах спакон вякоў.

Вось жа, дзед пераехаў у Менск, уладзіўся працаваць апальшчыкам, а потым пры шатні «ў ціятрах» і жыў гадоў восем ці дзе-

вяць у кватэры дому насупраць цяперашняга тэатру Янкі Купалы, гэты дом належаў уласьнікам тэатру. Пазьней дзед пабудаваў дом на Горным завулку, каля Вайсковых могілак. Туды, як казала маці, яны перабраліся ў годзе 1908–1910-м. Могілкі, як і царква Аляксандра Неўскага на могілках, былі яшчэ «сьвежыя» – царква толькі што пабудаваная, а могілкі налічвалі паўсотні выспачак – дзед дапамагаў «даглядаць» царкву.

Маці закончыла адну зь менскіх жаночых гімназіяў у часы польскай акупацыі.

Знаёмства бацькоў

Бацька дэмабілізаваўся з Чырвонай арміі і прыехаў у Менск у 1921 годзе, пасьля заканчэньня грамадзянскай вайны. Ён быў у войску ад 1915 году, ваяваў спачатку ў Румыніі, потым каля Балтыкі, прынамсі добра ведаў гарады Пскоў і Ноўгарад.

Ён скончыў юнкерскае вучылішча, здаецца, у Маскве, але былі ў ягонай біяграфіі яшчэ сувязі і з Кіевам. Пасьля рэвалюцыі бацька добраахвотнікам уступіў у Чырвоную армію і праслужыў ад 1917 да 1921 году. Меў розныя чыны, узнагароды, але я гэтым мала цікавіўся, а ён не расказваў.

У Менску яны з маці сустрэліся на адной зь беларускіх вечарынаў. Вечарыны-спэктаклі гэтыя адбываліся на Камароўцы, як бацька казаў, «там, дзе Конскі базар», дзе была Беларуская хатка, касьцёл Сьвятога Роха, у тым раёне. Раён быў беларускі, як таксама і раён каля Чырвонага касьцёла. З раёнам каля Чырвонага касьцёла больш зьвязаная мая маці, яна хадзіла туды дапамагаць дзецям, і там «нешта» беларускае адбывалася, але гэта было яшчэ перад рэвалюцыяй. А ў савецкім часе беларуская дзейнасьць была ўжо на Камароўцы. Вось жа там бацькі пазнаёміліся і ў 1923 годзе запісаліся ў загсе.

Такая мая радаслоўная – па лініі маці зь Меншчыны, па лініі бацькі з Глушчыны.

Дзядзькі

Бацькава сям'я была досыць вялікая – тры сыны і дачка. Бацькаў брат Мікіта памёр рана ад запаленьня лёгкіх. Брат Андрэй быў «раскулачаны», пазьней у партызанах, яго застрэлілі ў 1943 годзе падчас налёту немцаў на вёску, дзе дзеілі партызаны. Лёс бацькавай сястры Маланьні мне ня ведамы.

У маці быў брат Мікалай, Коля, ён скончыў АБВШ (Аб'яднаную беларускую вайсковую школу) і атрымаў стыпэндыю ехаць у Маскву ў Фрунзэнскую акадэмію ў 1929 годзе. Па дарозе, спыніўшыся ў Бранску ў дзедавага брата Зубкоўскага (ягонае імя я забыўся), маладыя

лейтэнанты падвыпілі, пасварыліся, і яго застрэлілі. Пахаваны дзядзя Коля ў Арджанікідзэградзе (цяпер Беліца) каля Бранску. Матчына сястра Насьця перад вайной жыла ў Кіеве, дзе яе сьлед згубіўся. У часе вайны мы атрымалі ад яе адзін ліст зь весткай, што бамбяць Кіеў і сям'я плянуе эвакуавацца. Ейны муж быў вайсковец.

Я

Цяпер пра Вітаўта Яўхімавіча Кіпеля, значыць, пра мяне. Народжаны я ў Менску, 30 травеня 1927 году, у шпіталі на цяперашняй вуліцы Багдановіча, а першым маім адрасам быў Горны завулак, дом № 6.

Крыху падрабязьней. Перш за ўсё зь «Вітаўтам». Вось што пазьней расказваў дзед, Васіль Паўлавіч Зубкоўскі. Недзе ў 1926 годзе Яўхім Кіпель і Марыя Зубкоўская пачалі жыць у доме на Горным завулку. Калі Марыя ўжо чакала дзіця, за адной зь сямейных вячэраў паўстала пытаньне, як тое дзіця назваць. Бацька сказаў, калі хлопец, то назавем Вітаўт. Дзед заартачыўся – ніхто на Камароўцы такога імя ня чуў! Бацька адказаў: ці чуў хто, ці ня чуў – будзе так. Дзед таксама быў упарты і кажа: мы назавем інакш. Тады бацька заявіў: то мы зьедзем! Ну дзед зьмякчэў: заставайцеся. І бацькі засталіся. Нарадзіўся я, і пакінулі мяне Вітаўтам.

Ці хрысьцілі мяне ў Менску, ці не – пытаньне цёмнае. Думаю, што не хрысьцілі. Бо пазьней, калі мы з Зорай вырашылі жаніцца і яна змусіла мяне пахрысьціцца ў праваслаўнай веры, то сьвятар прачытаў асобную малітву на тыя выпадкі, калі хрысьцяць чалавека, які, магчыма, ужо быў хрышчаны – бо два разы хрысьціць нельга. Прыпушчаю, што ў Менску хрэсьбінаў ніякіх не было, бо бабка была хворая, дзед гэтаму мала аддаваўся, больш гаварыў, чым каб узяць і панесьці дзіця пахрысьціць.

Дом на Горным завулку быў вялікі, ён складаўся з дзьвюх кватэр, у кожнай па пяць пакояў. У адной кватэры жыў Васіль Зубкоўскі, а ў другой – дзедаў траюрадны брат Павел Зубкоўскі, якому дзед здаваў палову дому. Бадай што жылплошча была вялікая.

Калі бацькі жылі на Горным завулку, бацька працаваў у Інбелкульце, школах, маці – у школах.

Хата на Горным завулку

Дзед купіў зямлю і будаваўся, калі працаваў «у ціятрах». (Дарэчы, на тэатральных паперках стаялі ягоныя подпісы, пра гэта мне расказваў Вячаслаў Сэлях. І нават Ванкарэм Нікіфаровіч пісаў – калі ён убачыў прозьвішча Зубкоўскі, дык прыпомніў, што сустракаў гэтае прозьвішча ў адміністрацыйных архівах тэатру.)

Дзед быў чалавек працавіты і хату збудаваў сам. Купіў зямлю

ў 1901 годзе, а хату скончыў будаваць у 1908 – будаваў сем гадоў. Хата была ягоная да 1938 году. Зімой з 1938-га на 1939-ы ў яго хату адабралі, выгналі яго ў сарай – на той падставе, што ён цесьць ворага народу, а той вораг народу некалі ў хаце жыў, і таму гэтая хата належыць не Васілю Зубкоўскаму, а народу. Нам далі тэлеграму ў Арол, што дзед захварэў – меў сардэчны прыступ. Мы з маці прыехалі забраць дзеда, але ў хату нас не пусьцілі, хата ўжо была канфіскаваная. У вайну хата згарэла, на яе месцы цяпер стаіць іншая. А тады ў 1938-м у хаце мясьцілася рэдакцыя газэты «Рабочы» і там жыў намесьнік рэдактара Мікалай Бухта. Праз мэтраў 50 была хата Варатніцкіх, дык і ад іх забралі палову хаты і зрабілі лясьніцтва. Так што на гэтым Горным завулку дзеілі дзьве дзяржаўныя ўстановы-канторы.

Дзед у 1920-х гадох прадаў частку зямлі за сымбалічную цану, бо вялікі кавалак заставаўся пусты, людзям па прозьвішчы Шабанавы. Шабанавы там жылі, і калі мы ў 1942 годзе пры немцах прыехалі ў Менск, нас прытулілі. Яны збудавалі новую хату пасьля пажару 1941 году.

Маленства ў Менску

Што я з маленства памятаю пра Менск… Магчыма, з пазьнейшых сямейных гаворак прыпомніў, што быў у нас сабака Мірцік і з гэтым сабакам я часта гуляў і хадзіў на могілкі, а на могілкі сабакаў вадзіць не дазвалялі. Памятаю, што адзін раз я ўцякаў з могілак, бо ці то йшоў вартаўнік ці можа людзі заўважылі, дык асела ў памяці, як Мірцік бег наверх па Горным завулку, а я за ім.

І яшчэ мне прыпамінаецца, што ў суседзяў Шабанавых жыў кватарант, у якога была клетка, а ў клетцы жыла вавёрка, і тая вавёрка ўцякла з клеткі і па дрэвах з Горнага завулку дабралася аж да могілак. І цэлы Горны завулак, уключна са мной, з сачкамі ішоў на могілкі лавіць тую вавёрку. Безумоўна, вавёрку не злавілі, ня ведаю, які быў яе лёс. Асабліва мне прыпамінаецца сачок – такі сачок для матылёў зь цьвярдзейшага палатна, і мне надта хацелася злавіць тую вавёрку.

З Вайсковых могілак добра ведаю магілку маёй бабкі, яна пахавана недалёка ад царквы. Там была лавачка, і суседзі часта адпачывалі каля магілкі, быў там невялічкі столік, што мяне так дзівіла – на ім раскладалі абрусік і сілкаваліся. Бабка мая памёрла ў 1928 годзе, праз год пасьля майго нараджэньня. На помніку, які я паставіў, памылкова напісана «1926», але я ўжо не мяняю, бо гэта ня мае значаньня.

Недалёка ад Горнага завулку, на Берасьцянскай жыў бабчын брат Лукаш Ваўчок. Ягонага сына Юзіка ў вайну расстралялі, бо, як казалі, усе тыя Ваўчкі былі зьвязаныя з партызанамі, схапілі і майго траю-

раднага брата Сярожку. Наагул на Берасьцянскай вуліцы пры немцах у людзей былі прапартызанскія настроі, і атмасфэра ў гэтым раёне была прасавецкая. Калі Лукаш Ваўчок памёр у пачатку 1944 году, якраз на Праваслаўныя Каляды, то яго пахавалі ў той самай агароджы, дзе была пахаваная ягоная сястра Марфа. На помніку, які я паставіў, я аб гэтым зазначыў: «Тут пахаваная Марфа... і ейны брат Лукаш...»

Пазьней, калі мы ў 1930-х раз на год прыяжджалі ў Менск, маці заўсёды хадзіла да сваіх сябровак, асабліва да цёці Ядзі Бяганскай, пазьнейшай пісьменьніцы. Нібыта да цёці Ядзі мама хадзіла і перад тым, як мы выехалі зь Менску, але Бяганская жыла на другім канцы гораду – каля Нямецкіх могілак. Дык, як мне расказвалі, і я туды з маці хадзіў.

І яшчэ адну акалічнасьць добра памятаю – як спусьціся з Горнага завулку, адразу пачыналася вуліца Чырваназорная, і направа праз два кварталы, адразу пры заднім уваходзе на так званыя «Польскія могілкі», быў магазын, у якім заўсёды былі цукеркі. Туды я ўжо сам хадзіў, я гэта памятаю выдатна. Дзед папераджаў, каб я ня ішоў на Польскія могілкі. На Вайсковыя можна, гэта блізка, а на Польскіх хто ведае, што можа здарыцца.

Памятаю яшчэ, што я зь дзедам хадзіў часам уніз – да разгалінаваньня вуліцы Даўгабродзкай і Бязбожнага завулку, які вёў да міліцыі, гэтае разгалінаваньне звалася Малыя Вілы, дык у тых Вілах было пару магазынаў і піўная. Там цяпер плошча, і ў другі бок вядзе вуліца Бядулі. А міліцыя была там, дзе цяпер стаіць паўкруглы дом на Круглай плошчы, і там была стайня, дзе стаялі міліцэйскія коні. Таго Бязбожнага завулку больш няма, ён забудаваны. А на ім была крамка, дзе прадавалі газу, і стаяла пару дамоў. Пад тую канюшню мы, дзеці, хадзілі глядзець коней – міліцыя дазваляла.

Дзіцячы садок

Хадзіў я ў Менску і ў садок. Як арыштавалі бацьку, маці падрабляла дзе магла, а мяне аддала ў садок. Праўда, знайшоўся толькі адзін дзіцячы садок, куды мяне згадзіліся прыняць – іншыя мяне як сына арыштаванага нацдэма браць не хацелі. Мой садок знаходзіўся ў будынку, што стаіць і цяперака на вуліцы Інтэрнацыянальнай, за Палацам Рэспублікі. Гэта, як маці казала, быў дом працаўнікоў Наркампросу, дык у той садок мяне якраз і прынялі, і я там быў нейкі час да выезду зь Менску.

У садку, памятаю, я шмат спаў. Дзяцей было вельмі многа, і калі ў садку быў «мёртвы час», спалі і на падлозе ў калідоры. Мне маці казала, што ў гэны садок бралі ўсіх, каго не прымалі ў іншыя.

У садку гулялі, нам раздавалі лапатачкі, нешта капалі, хадзілі пад

бераг Сьвіслачы. І яшчэ памятаю, што ў садочку вучылі песьні. Я люблю сьпяваць, але з таго песеннага «рэпэртуару» мне на ўсё жыцьцё запомнілася толькі гэта:

Гэй вы, хлопцы-камсамольцы
з камсамольскага сяла,
я вясковая дзяўчынка,
павучыцца к вам прыйшла.

Калі ласка, калі ласка,
ў нас заўсёды месца ёсьць,
не саромейся, Параска,
ты для нас жаданы госьць.

Камсамолачка-Дарота,
пойдзем разам ваяваць –
буду біць я з кулямёта,
ты – патроны падаваць…

Пасьля я гэтае песьні нідзе ніколі ня чуў – ня ведаю, ці яна была самаробная, ці выхавальніцы ў садку гулялі ў кампазытараў. Я ў сваёй цешчы Савёнчыхі пытаўся, бо яна таксама працавала ў садках, – яна ніколі гэтай песьні ня чула.

Арышт бацькі

Арышту бацькі я ня памятаю. Маці расказвала, што насіла перадачы і мяне з сабой «цягала», але я не прыпамінаю. Мне тады было тры гады – яшчэ зарана, каб усьведамляць, што адбываецца. Бацька зьнік і зьнік. Я поўнасьцю зразумеў гэта, калі мы ехалі ў Налінск – што мы едзем да бацькі. Маці сказала, што мы едзем да таты, і тады я пачаў разумець – ну так, бацькі няма. Можа я штодзённа нешта і адчуваў, але падзея тая не асела ў памяці. Бо быў дзед, былі тыя самыя абставіны, быў Горны завулак, тыя самыя могілкі, якія былі для мяне і паркам, і галерэяй, і музэем помнікаў, крыжоў, агароджаў ды цудоўных, вельмі разнастайных кветак, якіх ні ў кога ў навакольлі не было, таму рэальнасьць можа так і не адчувалася.

Налінск і Кіраў

Дарога ў Налінск

Бацьку арыштавалі як нацдэма ў 1930 годзе, а маці ў канцы 1932 году параілі – лепш выяжджайце зь Менску, пашпарт мы вам ня выдадзім, працы і прапіскі не дамо. І мы паехалі да бацькі ў Налінск, які знаходзіўся ў тагачасным Горкаўскім краі (цяпер – у Кіраўскай вобласьці).

Першае, што памятаю з дарогі ў Налінск – вялікі-вялікі маскоўскі вакзал, маці моцна трымае мяне за руку, каб не згубіўся. Далей – вакзал гораду Казань, гарадок Вяцкія Паляны. Як ехалася зь Менску да Масквы – я мала прыпамінаю. Ехалі праз Смаленск, дзень ці два затрымаліся ў Маскве, а тады на Казань, і ў Казані нас абакралі. Мы выйшлі на вакзал з багажом, які ў нас быў – пару клункаў і валізка – маці пайшла купіць яйкі і сказала мне стаяць каля багажу і вартаваць. А мне захацелася ўзяць кіпеню, і я з чайнікам – а чайнік быў прывязаны ў мяне на поясе – пайшоў па кіпень, прыйшоў, а багажу няма! Гэта была трагедыя. Маці пачала плакаць, пайшлі ў міліцыю. Праўда, нам там далі сёе-тое – пару коўдраў, трантаў. І далей мы ехалі практычна безь нічога. Я бачыў, як маці перажывала, плакала, гэта было трагічна – згубіць адзёжу і ўсе рэчы – я адчуваў сябе вінаватым.

Дзьве цёці

Мы прыехалі ў Налінск – зіма, было вельмі холадна. На пачатку нейкі час давялося жыць у нейкай халупе, бо мы не маглі знайсьці кватэры. Бацька там меў пакойчык, але ў ім мы ўсе жыць не маглі, бо ён быў занадта маленькі – у прыбудоўцы. Але хутка мы знайшлі пакой на адрасе Першамайская, 32. Гэта быў добры дом, у якім жылі дзьве настаўніцы – цёця Паша (Праскоўя Дзьмітрыеўна) і цёця Каця (Кацярына Трафімаўна), вельмі культурныя і адукаваныя жанчыны. Мужы ў іх былі белыя афіцэры, іх расстралялі бальшавікі, і яны засталіся самотныя ў гэтай вялікай хаце.

Хата была прыгожая, шырокая ўваходная брама зь весьнічкамі, якая зачынялася на завалу, шмат вокнаў з разнымі аканіцамі. Цёця Каця настаўнічала, а цёця Паша дала сабе слова, што яна працаваць

на бальшавікоў ня будзе. Да нас цёці ставіліся з сымпатыяй, а мяне «ўзялі ў абарот» зь першага ж дня: «Такой голубоглазый мальчик должен говорить по-русски!» Я па-расейску не разумеў, у сям'і была беларуская мова, дый наагул, што я тады ў свае 5 гадоў разумеў. І яны пачалі: «Это называется вот так, а это вот как…» Але што мне запомнілася ў гэтым працэсе на ўсё жыцьцё – гэта слова «произношение». З гэтым «произношением» яны мяне пачалі цьвічыць: каб вымаўляў ня так, а гэтак… Ну, бацька й маці былі радыя мяне аддаць пад іхны нагляд, бо самі шукалі працу і былі занятыя, і цёці апрацоўвалі мяне. Маці гэтага «апрацоўваньня» зусім не баялася – яна цьвёрда ведала, што я пад ейным уплывам і мая беларускасьць нікуды ня дзенецца. Ня тое, каб цёці насьміхаліся зь беларускай мовы – не, яны ставіліся з павагай, але вучылі мяне гаварыць чыста па-расейску, і «произношение» давалася мне цяжкавата. Цёці былі мае першыя настаўніцы расейскай мовы.

Бацькі ставіліся да клопатаў цёцяў спакойна – добра, што нехта займаецца зь дзіцёнкам, пакорміць, дапілнуе. Хутка мяне здалі ў дзіцячы садок. Садок быў на другім канцы гораду, на ўскрайку тайгі. У садку выхавальніцы дзецям казалі, што як выйдзеце за плот, дык у лесе могуць быць мядзьведзі. І дзеці тайгі баяліся… У дзіцячы садок я хадзіў сам, без праважатых.

Беларусы ў Налінску

З Налінску мне безумоўна вельмі шмат прыпамінаюцца беларускія кантакты. У Налінску жылі сасланыя дзядзя Мікола Ўлашчык і дзядзя Мікола Азбукін, і яны былі найбліжэйшыя бацькавы сябры, калі мы прыехалі, яны да нас прыходзілі. Дзьве жанчыны, у якіх мы жылі, ставіліся да нас усіх вельмі прыхільна, паколькі мужоў бальшавікі расстралялі, то яны адчувалі салідарнасьць з ссыльнымі. Наагул у Налінску ссыльныя былі «свае людзі», бо туды шмат ссылалі яшчэ пры цары, мне даводзілася чуць, што там былі і палякі, і людзі з Каўказу, а каля Налінску была невялікая вёсачка, якая называлася Пуга!

Дзядзі Міколы прыходзілі, і мы разам выходзілі гуляць за горад. Асабліва мне прыпамінаюцца паходы на рэчку. Праз Налінск цячэ рэчка Воя зь вельмі высокімі пясчанымі берагамі, і там мяне вучылі іншаму – вучылі гімну, ня памятаю каторы зь дзядзяў Міколаў, «Мы выйдзем шчыльнымі радамі». Другі дзядзя мяне вучыў вершам:

– Муляр, слухай! Што кладзеш ты?
– Дол сьмяротны, бачыш – склеп.
От як скончу ўсё дарэшты,
буду мець рубель на хлеб…

Гэта Гарун. Я б сказаў, што з налінскага пэрыяду я выйшаў з добра

падрыхтаваным беларускім «эстрадным рэпэртуарам», мяне навучылі дзесятку песьняў – «Мы выйдзем шчыльнымі радамі», бацька навучыў мяне «У нядзелю раненька», «Гэй, сябры ўдалыя». І каля рэчкі яны сьпявалі так моцна, і маці зь імі сьпявала, далучаліся і яшчэ нейкія людзі, я ўжо іх прозьвішчаў ня памятаю.

Вуліца

Калі цёця Каця і цёця Паша ўбачылі, што я трошкі разумею і гавару па-расейску, мяне пачалі выпускаць на вуліцу, і вуліца зрабіла на мяне вялікае ўражаньне. Налінск – маленькі горад, каля 5 тысячаў насельніцтва, і вось выйшаў я на вуліцу, 2-3 кварталы прайшоў – у горадзе можа дзесяць вуліц усяго было – бачу: вялікі натоўп людзей, пераважна мужчыны, у нешта гуляюць. Я падышоў – гуляюць у грошы! Гульня называлася па-іхняму «ца́ра»: на зямлі праводзіцца рыса, на яе ставіцца «кон» – манэты адна на адну – і з пэўнай адлегласьці кідаліся такія біткі, ужо ня памятаю, як яны называліся… Адным словам, азартная гульня на грошы. Ну й, безумоўна, я прыйшоў дахаты і расказваю – а цёці за галовы ўзяліся! «Как ты туда попал! Ты же смотри сам не играй!» Але хадзіць на вуліцу не забаранілі. Іншая частая на вуліцы гульня называлася «ладыжкі». Ладыжкі – гэта маленькія костачкі з ног у каровы, іх ставяць у рад, за кожнай костачкай стаіць 5, 10 ці 20 капеек, і іх зьбіваюць біткамі – такімі самымі костачкамі, толькі залітымі ў сярэдзіне сьвінцом – як саб'еш, дык грошы твае. У кожнага гульца былі мяшкі з «ладыжкамі».

А ўжо пры гэтых гульнях – сьмех, «прибаутки», расейскае народнае асяродзьдзе, сапраўдная вулічная Русь. Цікава, што людзі пры вулічных гульнях абсалютна не баяліся міліцыі, і мяне гэта дзівіла. Недзе за паўквартала ходзіць міліцыянэр – яго называлі «ўчастковы», – а яны гуляюць, можа якіх 50 чалавек. Гэта ж нелегальна! Але міліцыянэр да іх не падыходзіў і не глядзеў.

Так адбыўся мой кантакт з рускай вуліцай, зьявіліся знаёмыя, якія пазьней клікалі ў тайгу, у грыбы. Дзяцей было поўна. Між іншым, дарослыя гульцы ніколі не адганялі дзяцей, дзеці былі часткай забавы. Яны не гулялі, у іх не было грошай, але яны ў гэтым удзельнічалі. Безумоўна, пры тых гульнях выпівалі, гарэлка была, бутэлькі трымалі ў кішэнях…

Геолягі

У Налінску я ўпершыню пабачыў «геалягічныя партыі» – некалькі чалавек з рукзакамі, малаткамі за поясам, часам з падводай ішлі ў тайгу ці варочаліся з тайгі, а на вазах былі розныя камяні. Гэтыя людзі тады мяне неяк заінтрыгавалі.

Мяне вучаць гаварыць па-расейску

Цёця Каця і цёця Паша былі мае першыя настаўніцы, якія вучылі мяне ня толькі слоўніцтву (ня «сходы», а «лестница», або казалі: «мы тебя поведем в амбар», а я думаю – куды ж яны мяне павядуць… Ну і пасьля павялі ў сьвіран па-нашаму – у склад, дзе ў іх захоўваліся прадукты і збожжа, усё вельмі ўпарадкавана. Яшчэ цікава, што я ўбачыў у «амбары» – там не было часткі падлогі, а была вялікая яма, засыпаная лёдам, і ў гэтай яме трымалі пяльмені. Я тады першы раз пабачыў пяльмені, якія яны захоўвалі ў лёдзе, а ў Налінску досыць холадна, халады пачынаюцца ў кастрычніку, а ў зямлі лёд не раставаў цэлае лета). Дык, вяртаючыся да слоўніцтва – шмат чаго я не разумеў, а цёці мне тлумачылі. Але найбольш яны біліся над тым «произношением» – каб не была «трапка», «цяпер» або што іншае тыпова беларускае, бо я выхоўваўся ў Менску, дзе яшчэ трасянкі не было, а была беларуская мова, і я мову ведаў.

Цёці Каця і Паша мяне вельмі любілі-даглядалі, вучылі і, як выглядае, раніцай выпраўлялі ў дзіцячы садок, бо маці праўдападобна ішла на працу вельмі рана. Прыпамінаю я і песеньку, якую склалі цёці:

Наш Витус карапуз
в детский садик ходит.
Каждый день по утрам
кляузы заводит.

Таму я й думаю, што ў садок мяне зьбіралі і выпраўлялі цёці.

Бацьку забралі ў Вятку

Хутка бацьку з Налінску «забралі» ў Вятку. Ня ведаю, зь якіх меркаваньняў, але тады «забралі» здаецца яшчэ і Азбукіна – яны былі ссыльныя, ці «пораженные в правах», як тады казалі, і мы засталіся з маці самыя. Маці працавала ў невялічкім бюро, а тады засталася бяз працы. Гэтыя дзьве жанчыны – цёця Паша і цёця Каця – казалі: «Мария Васильевна, вы проживете, мы поможем, не бойтесь», стараліся яе падтрымаць, але мама шукала працу. І аднойчы яна прыходзіць, а мы сядзім і вячэраем, і кажа, што была ў газэце. У Налінску выходзіла тыднёвая газэта, ня памятаю, як яна ўжо звалася. Начальнік, зь якім маці гаварыла, выслухаў яе і кажа так: «Мария Васильевна, мы спросим там, где нужно. Если разрешат – вы будете делать всё». Праз тыдзень маці зноў туды пайшла, і начальнік кажа: «Разрешили». І так маці пачала працаваць у рэдакцыі газэты і сапраўды рабіць усё – ад карэспандэнцыі да подпісу ў друк. Для мяне гэткае становішча таксама стала зручным, бо пасьля дзіцячага садку я, ідучы дахаты праз горад, заўсёды заходзіў да яе ў рэдакцыю-друкарню і там гуляў з шрыфтамі, глядзеў машыны – лінатыпу яшчэ не было, быў ручны

набор – стаяць згорбленыя людзі і набіраюць літары… Маці працавала там года паўтара.

Працуючы ў газэце, маці была ў курсе шмат чаго, бо газэта – жывое месца. І аднойчы ўвечары яна кажа, што праз два дні ты пайдзі ў такое і такое месца, бо прывязуць матэрыялы для шрыфтоў на грузавой машыне. Для мяне такая машына не была навіной, бо я зь Менску, на Савецкую выйдзеш – усякія аўтамабілі ж езьдзілі. Але калі я ў Налінску прыйшоў паглядзець на грузавік – там былі сотні людзей, якія стаялі і глядзелі на яго! Для Налінску гэта было такое дзіва – грузавік у горадзе! На тым «тракце» людзі стаялі ў дзьве калёны, каб паглядзець на грузавік. Гэта быў канец 1933 году, можа пачатак 1934-га.

Дзіцячы садок. Забойства Кірава

Адзін выпадак зь дзіцячага садку. Дзяцей было многа. Садок быў амаль за горадам у будынку былога памешчыка, які ўцёк у часе рэвалюцыі, будынак нядрэнны, з рознымі гаспадарчымі пабудовамі. У садку нас таксама вучылі песьням – «По дорожке неровной, по тракту ли…», «Не спи, вставай, кудрявая». Адна дык асабліва засела ў маёй памяці, была мне як «малітва»:

Замучен в тяжелой неволе
Ты славною смертью почил.
В борьбе за народное дело
ты голову честно сложил.

Но враг над тобой не глумился,
кругом тебя были свои.
Мы сами, родимый, закрыли
Орлиные очи твои...

і г. д.

Былі ў садку і вельмі прыемныя ды цярплівыя выхавальніцы, якія таксама вучылі мяне мове. Адна зь іх увесь час «сачыла» за мной і папраўляла або тлумачыла, калі бачыла, што я ня ўсё разумеў: «баравік» – гэта «белый гриб», не «глыбока», а «глубоко». А іншая надта ж змагалася з маім «сягоньня» і выпраўляла на «севодня». Пазьней, калі мы ўжо жылі з бацькам разам, ён часта сьмяяўся: «Во, сынок, як нас з табой вучылі па словах расейскай мове». Нешта ў гэтым было сьмешна-трагічнае...

А аднойчы нам кажуць: «Сёньня мёртвага часу ня будзе». Абвясьцілі гэта раніцай. Там у садку заўсёды кармілі: сьнеданьне, абед, а па абедзе быў мёртвы час, а 1-й гадзіне, гадзіны на паўтары-дзьве. А ў той дзень нас сабралі ў вялікі пакой, нават не пакой, а ў вэранду паміж двума будынкамі, і нейкі чалавек важным голасам кажа, што вось, учора быў ледзь не замах на Савецкі Саюз – «убили Сергея Миро-

новича Кирова». А Кіраў – Сярожа Кострыкаў – з Уржуму, кілямэтраў за 80 ад Налінску, і нібыта ў Налінску вучыўся ў рамеснай вучэльні, дык ён быў як бы налінскі хлопчык. І вось нам цэлую гадзіну – і так на працягу цэлага тыдня – «баўталі» пра гэтага Сярожу Кострыкава, як ён лавіў рыбу, дапамагаў маці. Ня ведаю, ці гэта была праўда, ці пісьменьнікі «дадалі свайго», але нас ладна пічкалі варожасьцю да тых, хто яго забіў. А трэба сказаць, што там антысавеччына жыла, бо адзін раз цэлы дзіцячы садок пацягнулі ў Дом камінтэрну, ці як ён там зваўся, і там на п'едэстале ляжаў забіты міліцыянэр-камсамолец, якога забілі кулакі, дык нас туды вадзілі для ганаровай варты. На гэтым узроўні была і гісторыя з Кіравым – узьнімалі хвалю, што ворагі «дзейнічаюць» і могуць забіць і вас. І так цэлы тыдзень – мы і вершыкі мусілі вучыць мясцовыя, прысьвечаныя Сярожу Кострыкаву. Так што савеччына пачыналася досыць рана і ў мазгах яна заставалася – вось я й дагэтуль добра памятаю, хоць мінула ўжо 80 гадоў…

Калі я прыйшоў дахаты і пачаў расказваць пра Сяргея Кострыкава, цёці Каця і Паша маўчалі. Я прыпушчаю, што яны баяліся нешта сказаць супраць саветаў, але мабыць успаміналі сваіх мужоў і думалі – ну ладна, б'юць і б'юць бальшавікоў.

Дзядзі Міколы

Яшчэ пра дзядзяў Міколаў. Памятаю, што Азбукін пару разоў атрымоўваў пасылкі, прыносіў прадукты і да нас, і аднойчы цёця Каця і цёця Паша зрабілі абед, і былі Азбукін з Улашчыкам. Прычым мы ўсе гаварылі па-беларуску, і нашы гаспадыні проста слухалі, ім было цікава – бо ж гэтыя ссыльныя раней жылі недзе ў Цэнтры, ледзь ня ў Цэнтры цэлага сьвету, бо для Налінску Менск – гэта ж Божа ты мой… Памятаю, Азбукін дэклямаваў верш беларускі.

Калі я бываў з бацькамі ў сямейным коле – гэта бывала, але рэдка, – бацькі расказвалі мне, як у Менску на пачатку 20-х гадоў праходзілі беларускія спэктаклі, як яны разам сьпявалі песьні «Ой расьцьвіла ружа, расьцьвіла» ці «Пане сотнік, ці вы чулі, як музыкі ў карчме гралі» ды іншыя. Пачуў тады я ўпершыню пра выдадзены ў Менску вялікі зборнік «Чатырохсотлецьце беларускага друку», пачуў упершыню і прозьвішча Скарыны.

Адным словам, бясспрэчна, беларускую адукацыю празь сям'ю я атрымоўваў, хоць і эпізадычна, але вельмі стала і трывала. Беларускасьць салідна замацоўвалася ў маім існаваньні.

Што да Ўлашчыка, дык ён пазьней пісаў успаміны, і там ёсьць пра тое, што Яўхім Кіпель яму нешта «даваў». А бацька мне расказваў, што Ўлашчык рыхтаваўся празь Фінляндыю ўцячы з Савецкага Саюзу. Бацька працаваў тады ў лябараторыі, і там у хімічным кабінэце быў цыяністы калій, і Ўлашчык яго ўзяў – на выпадак, калі яго зловяць.

Пра гэта, здаецца, таксама ва ўспамінах ёсьць. Бацька расказваў, што пакінуў кабінэт адчыненым, і Ўлашчык прыйшоў і сам узяў, каб не выглядала, што бацька яму даў. Бацька, калі ўжо вярнуўся пазьней пры немцах, думаў, што Ўлашчык згінуў. Пасьля Налінску яны ўжо ніколі не сустрэліся, дык бацька так і ня ведаў, як Улашчыка злавілі.

Бацька яшчэ да нашага прыезду ў Налінск быў уладзіўся на працу, здаецца, у тэхнікум. Гэта быў нават ня тэхнікум, а вучэльня, якая рыхтавала лясьнічых, дзе вывучалася батаніка і хімія, і бацьку адразу ўзялі, бо ён ведаў хімію, выкладаў у БДУ. А Азбукін напачатку ўладзіўся ў школу. Бацька з Азбукіным і Ўлашчыкам бачыліся часта. Але сустракаліся зь імі і мы з мамай, усе разам хадзілі па ваколіцах. Бацька казаў пасьля, што за ссыльнымі сачылі, асабліва за Ўлашчыкам.

Тайга

З Налінску памятны выпадак – цёця Каця працавала настаўніцай, а настаўнікі мусілі рабіць «абсьледаваньні» – хадзіць да дзяцей, асабліва да тых, што дрэнна вучыліся. І вось аднойчы зімой цёця Каця мне кажа: «Витус, пойдём со мной» (яны мяне звалі Вітус) – яна якраз ішла ў такія адведкі да вучняў. А перад гэтым я сказаў бацьку, які быў дома, што я паеду на лыжах. (Дарэчы, там дзеці езьдзілі на лыжах ад трох гадоў. Ня ведаю, як цяпер, але ў той час у кожным доме – лыжы і стрэльба. Зь дзецьмі йдзеш, да некага зойдзеш – стрэльбы віселі ў кожнай хаце. Стрэльба і лыжы – ну, як лыжка да абеду. Ня ведаю, ці саветы пазьней вывелі гэтыя стрэльбы.) Дык я бацьку сказаў, што паеду на лыжах недалёка ў тайгу, а сам пайшоў зь цёцяй Кацяй. Зь цёцяй Кацяй мы ходзім «па вучнях» цэлы дзень, ужо і цёмна стала, а бацька дома сядзіць і чакае мяне з тайгі. І атрымалася так, што мы зь цёцяй Кацяй падыходзім, а маці бяжыць насустрач і кажа: ты ў хату ня йдзі, бо тата цябе заб'е! А ён ужо быў пайшоў у міліцыю і сказаў, што хлопцы пайшлі ў тайгу і ўжо цёмна, а ты тут шляесься зь цёцяй Кацяй па горадзе. Быў вялікі скандал, праўда, ён мяне не набіў, але хацеў, бо ўвечары ў тыя часы тайга – гэта сапраўды страх, зьвяры, заблукаць можна, а калі зімой пачнецца завея, то згубіцца можна раз-два, і тады прапаў. Тайга – гэта вельмі вялікі няходжаны лес, без канца і краю. Тайгой пужалі дзяцей.

Мова

Моўнай сьвядомасьці ў мяне ў Налінску выразнай не было, калі не лічыць, што мне ўрэзалася ў памяць тое «произношение». Цяпер калі я чую нашага чалавека і яго акцэнт або трасянку, адразу ўспамінаю тых цёцяў, і мне становіцца сорамна за нашых людзей. Я ведаў пра расейскую мову яшчэ зь Менску, але яна не была ў нас ва ўжытку. Дзед ча-

сам ужываў незразумелыя словы, маці казала, што дзед нешта сказаў па-расейску, чуў я расейскую гаворку і на могілках – я разумеў, што ёсьць дзьве мовы, я ж ня жыў на нейкай іншай плянэце. На Камароўцы ў Менску, на Горным завулку мне таксама памятаецца «дзенькуе» і «панечка». На Горным завулку ніхто «спасіба» не казаў.

Пра нацыянальныя справы мне таксама нічога не казалі – я чуў розьніцу мовы і адчуваў, што зь нечым трэба быць асьцярожным, але гэтыя адчуваньні былі не скрышталізаваныя, хоць я ўжо і тады зразумеў, што ёсьць два асяродзьдзі: наша беларускае і іхнае расейскае. Праўда, калі мы хадзілі на прагулкі зь дзядзямі Ўлашчыкам і Азбукіным і сьпявалі, былі выказваньні, што западалі таксама ў мой розум як антысавецкія, але я яшчэ гэтай палітычнасьці поўнасьцю не ўсьведамляў.

Нашы гаспадыні ведалі, што калі мы ішлі на рэчку, у нас былі нейкія беларускія справы. І пасьля часам, калі мы прыйдзем, яны дадуць малака папіць і пытаюцца – «ну, как там было?» І я пачынаў ім дэклямаваць – і ня тое, чаму яны мяне вучылі. Дык яны ведалі, што ў нашым коле сваё жыцьцё, і ніколі не імкнуліся накінуць нам нешта расейскае. Але цёці былі моцна пераконаныя: калі гаворыш па-расейску – дык гавары правільна. «Это же язык, он должен быть кристально чистый…»

Так што Налінск для мяне – гэта перадусім «произношение», тайга і «дзядзі»…

З Налінску ў Вятку

Пасьля таго, як бацька выехаў у Вятку, мы яшчэ даўжэйшы час жылі ў Налінску, а аднойчы зімой маці кажа: «Сёньня будзе міжгародні тэлефон». Мы пайшлі ў паштовае аддзяленьне, там была пошта побач зь міліцыяй – тады ж з тэлефонам не было, як цяпер, аб міжгароднім тэлефоне паведамлялася: прыйшла павестка, што будзе тэлефон тады й тады. І ў тэлефоннай гутарцы бацька маці сказаў: «Прыяжджайце, тэрмін канчаецца, будзем раіцца куды далей».

Чаму яго перавялі ў Вятку – я ня ведаю. Чамусьці ўсіх нацдэмаў зьбіралі ў Вятку, мабыць, думалі нешта з гэтымі ссыльнымі зрабіць. У Вятцы нацдэмам прапанавалі выбар, куды яны могуць ехаць па адбыцьці тэрміну ссылкі.

З Налінску ў Вятку мы перабраліся вясной 1935 году, а там яшчэ заставаўся дзядзя Мікола Азбукін, пазьней ужо ня ведаю, што зь ім сталася.

Разьвітаньне з Налінскам было вельмі цёплае, цёця Каця і цёця Паша казалі – калі толькі хочаце, пераяжджайце сюды. Нават значна пазьней, у часе вайны ў 1941 годзе яны прыслалі адзін ліст з прапановай – прыяжджайце, хата будзе для вас.

Прыпамінаю дарогу з Налінску ў Вятку, якую тады толькі што перайменавалі ў Кіраў. Спачатку трэба было ехаць да прыстані Мядзьведкі, а адтуль ужо параходам па рацэ Вятка да гораду Кацельніч. Усё было бруднае, такі непрыемны ўспамін. Пасьля таго казанскага эпізоду, які ў мяне застаўся ў памяці на ўсё жыцьцё, я вельмі баяўся, каб што ня скралі – дык трэба было напружана глядзець і пілнавацца.

Вятка. Адамовіч. Нулявушка

У Вятцы ўжо было крыху інакш, бо там ужо было шмат «дзядзяў». Жылі мы ў новазбудаваным пасёлку на ўскраіне, там быў невялічкі сквэрык са столікамі, і я памятаю, як аднойчы за такім столікам чалавек пятнаццаць тых «дзядзяў» сядзела, і ўсе гаварылі па-беларуску. Я падыходзіў, але на мяне ніхто не зьвяртаў увагі – ну, нейкі пацан ходзіць і ходзіць, Кіпелеў ці ня Кіпелеў, хто ведае. Пасьля я ў Адамовіча пытаўся, і ён расказаў, што НКВД выклікала кожнага беларуса паасобку, гаварыла, ставіла ўмовы, давала прапановы – дык высланыя беларусы гэта пазьней абмяркоўвалі, хто куды едзе. І Адамовіч мне расказаў: калі майму бацьку сказалі, што ён не паедзе ў Беларусь, дык яго аж «халера ўзяла», узбурыўся – Канстытуцыю парушаеце, і тое, і гэтае, узьняў скандал. А яму кажуць – «ты потише, мы тебя быстро успокоим». І бацька зразумеў, што махіны гэтай не пераломіш, якая там Канстытуцыя…

Антон Адамовіч жыў у Вятцы вельмі блізка ад нас і быў у нас частым госьцем. Раз ён быў у нас, а я прыйшоў зь мясцовым хлопцам, мы распрануліся і нешта рабілі, і калі нам трэба было выходзіць, я да таго хлопца зьвярнуўся: «Где моё зимниё польто». Дык пазьней Адамовіч часта гэты выпадак прыпамінаў і сьмяяўся з таго майго мясцовага расейскага акцэнту.

Часта заходзілі да нас і іншыя «дзядзі». Здаецца, сярод іх быў яшчэ Бабарэка, астатніх ня памятаю. Мне ішоў восьмы год, дык я больш часу на вуліцы быў, мне ўжо вершыкі ў галаву ня лезьлі.

У Кіраве мяне аддалі ў «нулявушку», гэта была падрыхтоўка да школы, тая «нулявушка» мясьцілася ў школьнай прыбудоўцы.

Мы там жылі з паўгода, і там бацька выбраў месца далейшага пасяленьня – горад Арол. У Беларусь яму было забаронена вяртацца назаўжды: ён мог пражываць у Расеі, і то не ва ўсіх гарадах.

І так мы з маці зь Вяткі паехалі спачатку ў Менск. Трэба сказаць, што пасьля «згубы» нашага багажу ў Казані маці так ніколі поўнасьцю і не набыла ўсіх неабходных рэчаў, асабліва адзеньня. Дык гэтым разам, едучы ў Менск на даўжэйшы час (перад тым, як ехаць у Арол), маці вырашыла «атаварыцца» поўнасьцю – набыць усё неабходнае ды закупіць сёе-тое наперад. У Менску гэта можна было зрабіць.

Арол

Пераезд у Арол

У Вятцы бацьку, калі яго «вызвалілі» з высылкі, зрабілі шмат абмежаваньняў і далі на выбар для пражываньня больш за сотню гарадоў. Ён спытаўся, калі можна будзе ў Беларусь, дык той энкавэдыст аж падскочыў: «Ты не шути! Никогда!» І бацька выбраў Арол, які быў найбліжэй да Беларусі – каб лягчэй некалі было вяртацца, так думаў бацька. Маці, безумоўна, не пярэчыла.

Як я ўжо казаў, мы з маці паехалі ў Менск да дзеда раней, каб запасьціся рэчамі, набраць матэрыялу пашыць кашулі, сукенкі – у Менску з гэтым усё ж было лягчэй, чым у Расеі. І ў сярэдзіне жніўня 1935 году мы прыехалі з маці зь Менску ў Арол. Бацькі яшчэ не было – ён да верасьня быў у Кіраве.

У Арле мы пасяліліся ў Доме калгасьніка на 2-й Курскай. Гэта нешта накшталт «гатэлю» для калгасьнікаў, якія прыяжджаюць у горад нечага купіць ці залагодзіць свае справы – у сапраўдны ж гатэль ня пойдзеш, гатэлі былі дарагія, а ў Доме калгасьніка вельмі танна – рубель-паўтара за дзень. Там давалі матрасы спаць, іх трэба было самым набіваць саломай, і так спалі. Быў душ, вялізная кухня, куды можна было прыйсьці з сваёй бульбай, паставіць каструльку – была печка, што палілася на вугаль, можна было жыць.

Маці адразу пачала шукаць працу, а я боўтаўся па тым Доме калгасьніка – хадзіў, разглядаўся: там быў вялікі дом і вялікі двор, шмат калгасьнікаў, коні – васьмігадоваму хлопцу там было што рабіць: паглядзець аднаго каня, другога, папрасіць, каб дазволілі завесьці на папой, праехацца. Былі там яшчэ шашкі, шахматы...

Маці працу досыць хутка знайшла. Арол тады пачынаў пераходзіць у іншую катэгорыю гарадоў – праз пару гадоў стаў абласным цэнтрам. Гэта быў традыцыйны расейскі горад, дзе было шмат заводаў, горад пралетарскі, вялікі чыгуначны цэнтар. Прамысловасьць буяла. Насельніцтва павялічвалася за кошт сельскіх жыхароў, і ўсё больш адкрывалася школаў. І ў тым годзе якраз сфармавалася 26-я школа, дык настаўнікаў бралі хутка. Маці прыйшла ў 26-ю школу, і яе адразу залічылі на працу. У Менску яна скончыла пэдагогіку з дыплёмам настаўніцы беларускай і расейскай мовы і літаратуры, у Беларусі яна выкладала беларускую мову, а ў Арле стала настаўніцай расей-

скай мовы і літаратуры. Ёй далі старэйшыя клясы – ад 8-й да 10-й – і поўную нагрузку, маці была вельмі задаволеная. Яна недзе ўзяла пазыку, зьявіліся хоць і малыя, але грошы, і мы пачалі адразу шукаць кватэру.

Кватэра

Кватэру мы знайшлі ў чыгуначным раёне, недалёка ад вакзалу, і я зразумеў, што такое чыгуначны раён: у кожным доме быў нехта так ці йначай зьвязаны з чыгункай – ціто кандуктар «дальняга сьледаваньня», ціто машыніст, ціто качагар, ціто счэпшчык, ціто стрэлачнік. Чыгуначны раён быў вельмі вялікі.

Кватэра была на вуліцы Прадзільнай, дом 94, і што мне кінулася ў вочы – ва ўсіх дамох, дзе мы шукалі кватэры, былі печы на вугаль. У Беларусі ў печы палілі дровамі, дровы былі і ў Налінску, а тут – вугаль. Справа ў тым, што лясоў у гэтым рэгіёне няшмат, а прамысловасьць прыстасаваная да вугальнага паліва, і людзі, якія працавалі на чыгунцы, кралі вугаль! Прыносілі – хто ў кішэні, хто ў торбачках – і ў кожным доме было поўна вугалю, тоны! Гэта паліва вельмі ёмкае, печкі, пліты з канфоркамі заўсёды былі дзейныя, выгадна – чай загатаваць ці што – заўсёды печка была гарачая.

У «кватэры» быў адзін пакойчык з трыма вокнамі, але безь дзьвярэй. Мы і гэтаму былі радыя. Гаспадар зваўся Мікалай Шылкін, ён быў па прафэсіі кандуктар «дальняга сьледаваньня». Праца ў яго была такая: ад Арла да Масквы ён даяжджаў як «безьбілетны» пасажыр, а ад Масквы на Далёкі Ўсход, у Хабараўск, Уладзівасток, Чыту ён ужо ехаў у сваёй функцыі кандуктара. У дарозе ён бываў па месяцы, па два. Жонка ягоная таксама мела працу вакол чыгункі. У гэты самы пакой неўзабаве да нас прыехаў бацька і хутка знайшоў працу ў тэхнікуме – ціто выкладчыкам, ціто тэхнікам-хімікам. А мяне ўладзілі ў 12-ю чыгуначную школу – у тым раёне ўсё было чыгуначнае…

Школа

Першы мой школьны дзень – 1 верасьня 1935 году. Я выдатна памятаю, як маці падвяла мяне пад школу, велізарны будынак (там пры цары была сэмінарыя, настаўніцкая ці духоўная), і на двары можа дзьве тысячы дзяцей стаялі зь вялікімі дошкамі з нумарамі клясаў, а мой быў «1-й И»! Столькі было тых першых клясаў, і ў кожным чалавек 40… Маці накіравала мяне ў той двор праз браму, сказала – ідзі шукай сваю клясу, і я знайшоў, і так пачалося маё знаёмства з школай – мая навука.

Па-расейску я ўжо добра гаварыў. Але калі нам раздалі буквары,

мяне зьдзівіла, што ў слове «уши» на канцы «и», а ня «ы». Я ніяк ня мог гэтага зразумець – чаму «уши» пішацца з «и»! Я нават падышоў да настаўніцы, і яна мне нешта тлумачыла, пытаўся пасьля і ў маці і ўсё роўна ня мог зразумець. Толькі пазьней да мяне дайшло, што ёсьць правілы і так трэба пісаць.

Так пачалося наша новае жыцьцё – калі ўсе трое былі занятыя. Грошай у нас не было, зарплату бацькі яшчэ не атрымоўвалі, былі мы зусім бедныя, хадзілі па горадзе пешкі: на базар па прадукты, бульбу, варылі бульбу і елі. Карацей, існаваньне беднае, але яно не адрозьнівалася ад соцень тысяч людзей навокал у гэтым расейскім асяродзьдзі.

Бацька й маці працавалі далёка, раніцай давалі мне 15 капеек, каб я купіў у школе сабе паесьці. Праўда, у школе сталоўка была нядрэнная, заўсёды можна было купіць добры абед – катлету, пюрэ, заўсёды кампот.

У Арле я пабачыў ужо іншую Расею і расейскасьць. Калі ў Налінску яна была блізкая да прыроды, народная, то ў Арле расейскасьць была гарадзкая, работніцкая, пралетарская. Але і ў Налінску, і ў Арле дзеці былі падобныя – кемлівыя, крыху галаднаватыя, знаёмыя з сыстэмай, заўсёды знаходзіўся нехта, хто ведаў, што такое Мядзьведжая Гара, Беламорска-Балтыйскі канал. Я з арлоўскімі дзецьмі хутка ўвайшоў у блізкі кантакт, мы сталі хадзіць па горадзе, на чыгунку, лазіць па закінутых развалінах, на рыбу. Ака – рэчка шырокая і рыбная, другая рэчка – Орлік, левы прыток Акі – таксама рыбная, але да яе ад нас было далёка. (На беразе Орліка знаходзіцца «Дваранскае гняздо», апісанае Тургеневым у аднайменным рамане.)

Бацька. Арышт

Бацька прыехаў у канцы жніўня, і было пару дзён вольных, заняткі ў школе яшчэ не пачаліся. Бацька кажа: хадзем памыемся ў рэчку. Бо лазьня каштавала 15-20 капеек – гэта былі грошы. І мы пайшлі – недалёка ад лазьні правы бераг ракі Ака, гэта ў раёне вуліцы 3-й Курскай, мы з бацькам зайшлі ў ваду купацца, узялі мачалкі, мыла. А на левым беразе Акі ў тым месцы – вялікія муры Арлоўскага цэнтралу, вядомай турмы. І вось мы плаваем – я навучыўся плаваць яшчэ ў Налінску на рэчцы Воя – вылазім, бацька глядзіць на тыя муры і нібыта сабе пад нос, але так, што я чуў, кажа: «Вось дзеля гэтых цэнтралаў і на Бацькаўшчыне няма жыцьця. Ты, сынок, аб гэтым памятай». І я адчуў, што гэтая турма для нас – перашкода, прычына таго, што мы жывем не ў Беларусі. Праўда, бацька адразу замаўчаў, можа падумаў – ляпнуў шмат, тут хлопец. Але для мяне гэта быў першы сыгнал нацыянальнай сьвядомасьці – што мы ў Расеі і гэтыя цэнтралы маюць дачыненьне да нашага жыцьця.

У канцы лістапада 1935 году я захварэў на шкарлятыну, і мяне паклалі ў бальніцу. Інфэкцыйная бальніца была далекавата – амаль за горадам. Я там праляжаў тыдні чатыры, а можа й пяць, і выйшаў перад Новым Годам, мяне прывезьлі дахаты на закрытай брычцы. За дзень перад Новым Годам у нас быў вобшук, і гэта я ўжо добра памятаю: ноччу стукаюць, увайшло чалавек пяць са стрэльбамі, НКВД, сінія аколышкі і пятліцы. Загадалі падняць і мяне – а я спаў на плеценай канапе, дык салдаты стукалі і па той канапе. І што мяне зьдзівіла – сказалі адчыніць аканіцы і шукалі нешта ў дзірках шампаламі. Пры гэтым прысутнічаў і гаспадар Мікалай Іванавіч Шылкін. Побач жыла іншая кватарантка – цёця Соня, дык яны пыталіся і ў яе, ці бацька заходзіў у ейны пакой і ў якія наогул пакоі заходзіў, а цёця Соня кажа, што на кухні бываў, дык энкавэдысты сталі шукаць на кухні. Гадзін пяць цягнуўся гэты вобшук, і бацьку забралі. Было гэта 30 сьнежня 1935 году.

І так мы засталіся з маці. Маці, ясна, плакала, але спакойна. Ну, зіма, нічога ня зробіш… А ніхто нічога не паведамляе. Перш ёй сказалі ў НКВД паехаць у мястэчка Понары, пасьля ў Ліпецк, пасьля нехта параіў зьезьдзіць у Курск, абласны горад (тады Арол быў у Курскай вобласьці, Арлоўская вобласьць была ўтвораная ў 1938 годзе). Я ўжо ня памятаю, езьдзіла яна ў Курск ці не, здаецца езьдзіла, але ніхто ёй нічога не сказаў, дзе бацька і што зь ім. І маці страціла надзею нешта даведацца – забралі бацьку і забралі. У яе было шмат працы, трэба было глядзець за мной. Калі маці езьдзіла шукаць бацьку, то мной апекавалася цёця Соня, яе прозьвішча Карабанава. У яе была дачка Валя, гадоў на 5-6 старэйшая за мяне, а іх муж і бацька, як мне сказала Валя, «недзе прапаў» – і гэта ўсё.

Гаспадыня Раіса Паўлаўна Шылкіна «падлівала алею ў агонь», часам нават пры мне, калі стаялі разам на кухні – «Наверно что-то сделал…» Пры дзіцяці ж такія рэчы звычайна не гаворацца, але дзеці такое прымалі спакойна.

Перад канцом навучальнага году, у красавіку-травені 1936-га, раптам сказалі, што мая чыгуначная 12-я школа перагружана, і частку дзяцей будуць перасылаць у розныя іншыя школы. І так у самым канцы году пару першых клясаў перакінулі ў 33-ю чыгуначную школу, якая была ў іншым месцы. Мне гэта было вельмі невыгодна, бо ў школу я заўсёды хадзіў сам і цяпер хадзіць стала далей. А маці працавала ў 26-й школе – далёка ў горадзе. Маці мне сказала, што ў наступным годзе будзе старацца перавесьці мяне ў тую школу, дзе працавала яна, хоць паводле закону гэта было немагчыма, бо ў школу бралі паводле месца жыхарства. Усё ж маці неяк мой перавод у 26-ю школу аформіла.

Вуліца

У Арле я па-сапраўднаму азнаёміўся і зжыўся з «вуліцай». Школа канчалася а 12-й, а 1-й, а тады пойдзеш у кіно ці зойдзеш у Дом піянэраў. Дом піянэраў быў абсталяваны нядрэнна, я належаў да гуртка авіямадэлістаў, але ўдзельнічаў мала, бо трэба было шмат чаго купляць – бамбук, паперу, і на гэта грошай не было.

Як бавілі час – часта хадзілі на рэчку, лавілі рыбу. А так – лазілі сюды-туды, на чыгунку пойдзеш, паглядзіш, як цягнікі ідуць – у той час пусьцілі якраз паравоз «ФД», «Фэлікс Дзяржынскі», і мы, дзеці, стаім на пераезьдзе і лічым, колькі вагонаў у «ФД» – 120, 150, 170… Для нас гэта была вялікая справа – «бачыў «ФД» на 170 вагонаў!» А гэтыя «ФД» – сам паравоз чорны, а перад пафарбаваны чырвоным, а на ім залацістымі літарамі напісана «ФД».

Яшчэ лазілі па нейкіх закінутых прамысловых аб'ектах – ад часоў рэвалюцыі іх яшчэ ніхто не расчышчаў, хадзілі ў «разьбітыя» манастыры, іх было ў горадзе пару, воддаль станцыі шнырылі па пустых вагонах.

Галубы

Маці пачынала баяцца, бо я праводзіў на вуліцы ладна часу, і казала: «Ну, добра, на вуліцы ты гуляй, але Божа барані, каб ты не зьвязаўся з галубятнікамі…» Арол – гэта горад, дзе ў некаторых раёнах кожная другая-трэцяя хата мае галубятню (у Арле казалі – «голубню») – вялікую ці малую, яны галубоў гадуюць, «запускаюць», любуюцца імі і вядома – прадаюць іх на птушыным базары, птушыны базар – раз на тыдзень. І галубятнікі – ня той элемэнт, зь якім маці хацела, каб я меў справы. Рэч у тым, што яны лавілі адзін аднаго галубоў і прадавалі іх, справа набывала камэрцыйны характар. Але ж, вядома, я галубамі непазьбежна зацікавіўся.

Былі й прафэсійныя галубятнікі, якія маюць дзесяток-другі, а сярод іх – пяць-шэсьць спэцыяльных галубоў: запусьцяць іх высока, і тыя па кругу ходзяць, а пасьля – «кубырныя» – мэтраў трыццаць куляюцца ўніз, нібы самалёт у штопары… Такая была забаўка ў людзей.

Справа з галубамі мела ня толькі камэрцыйны бок. Ясна, бывалі галубы і па 300-400 рублёў, і калі такога голуба іншы галубятнік «прылавіў» і выкупіць яго не ўдавалася – у ход ішлі нажы, здаралася разьня. Галубятнікі вельмі часта біліся, міліцыя за імі вельмі сачыла – адгэтуль і заклапочанасьць маёй маці.

Каля галубятняў стаялі шасты. Іх часта кралі. Куплялі шасты на птушыным базары, але яны былі дарагія, рублёў па 10-15. Дык што рабілі галубятнікі: яны прасілі такіх, як я, пацаноў схадзіць у лес Андрабуж (Андрябуж) – а гэта кілямэтраў за 8 ад гораду – і зрэзаць

там прыдатнае для шаста дрэўца. Справа ў тым, што калі такі шост цягнуў пацан і яго лавіў конны аб'ездчык, дык пацану за гэта нічога не было – толькі загадвалі пакінуць дрэўца.

Я адзін раз такое рабіў, але аб'ездчык такое дрэўца ў мяне адабраў.

Галубятнікі як узнагароду за прынесены шост давалі 5-10 рыбалоўных кручкоў. Для пацаноў гэта была вялікая справа!

Ножыкі, футбол, хакей

Іншым папулярным заняткам была гульня ў ножыкі. Ножыкі былі ў кожнага. Сьцізорыкі – пра гэта і гаварыць няма чаго, але былі й фінкі, хадзілі па руках.

Ножыкі – гульня бяскрыўдная, калі толькі не гуляць на грошы. (Так і прыпамінаюцца нечыя паэтычныя радкі: «Жук – няшкодная істота, калі жук ня робіць шкоды».) Палягае гульня ў тым, што кідаючы нож з розных пазыцыяў – з галавы, з калена, з кожнага пальца рукі – трэба, каб нож лязом амаль вэртыкальна ўтыркнуўся ў зямлю. Кожная пазыцыя для кіданьня мела свой назоў, пры гэтым яны ішлі ў цьвёрдай пасьлядоўнасьці – ад лягчэйшых да самых «складаных» (кіданьне нажа праз галаву назад). У выпадку, калі нож не ўтыркаўся, набіраліся мінусы. І вось тут прыходзіў азарт – за кожны мінус, па дамоўленасьці, трэба было плаціць 5, 10, 20 капеек і болей. Так гэта рабілася азартнай гульнёй, міліцыя забараняла, але цяжка было ўпільнаваць – гуляюць на грошы ці на фанты.

Часта правяралі, якімі гуляюць нажамі: калі сьцізорыкам, дык яшчэ нічога, а калі фінкай – то гэта ўжо нелегальна ўдвая, бо фінка даўжэйшая за 4 сантымэтры – гэта ўжо зброя. Міліцыя гэта пілнавала, бо дзе гульня, там могуць і пабіцца.

Былі ў Арле і гульні на грошы. Найбольш пашыраныя былі «алямс» (тое, што ў Налінску звалася «цара») і асабліва «прысьценак». (Прысьценак – кідаеш манэту аб сьцяну, яна адскоквае. Я кідаю ўсьлед – калі мая манэта ўпадзе непадалёк ад твае, то я тваю манэту забіраю. Адлегласьць мералі пядзьдзю – паміж расьцягнутымі вялікім пальцам і мезенцам.) У Арле, у адрозьненьне ад Налінску, міліцыя арыштоўвала, калі лавіла ў часе гэтых гульняў.

Ясна, усіх займаў і футбол. Футболам мы называлі тое, што цяпер называюць футбольны мяч, а мячыкам называлі малы, якім гулялі ў лапту, зь мячыкам гулялі дзеўкі, а мы гулялі ў футбол. У футбол дазвалялі гуляць на школьным пляцы. Сам мяч – футбол, і гульня – футбол. Дык вось, у той час купіць футбол было дорага, ён каштаваў рублёў 20, і таму шмат футболаў не было. Інакш бы футбол выцесьніў і нажы, і ўсё астатняе. Больш іх стала ўжо недзе ў 1938 годзе, прадукцыя стала масавая, і тады ўжо дзеці гулялі толькі ў футбол.

Папулярны стаў тады і хакей – недзе пасьля 1937 году. Хакей у Расеі – гульня нацыянальная. Вось, прыкладам, у Арле: у некага замярзае вялікая частка гароду – і дзеці на тым замёрзлым пляцы гуляюць у хакей. Што такое «хакей» для тагачасных дзяцей? Гэта конская гаўняшка і нейкая палка. Канькі былі дарагія, а яшчэ дарагэйшы рыштунак. Але праўда, у 1938 годзе можна ўжо было купіць і шайбу, і клюшку. Хакею надавалася вялікая ўвага. Былі пляцоўкі, былі і проста замерзлыя кавалкі зямлі, а на Ацэ і на Орліку былі водныя станцыі, дзе рыхтаваліся спэцыяльныя пляцоўкі – расчышчаўся лёд, і гулялі. Саветы хутка дапасаваліся да патрэбаў народу, і хакей стаў даступны, і футбол.

Вядомая справа: час-часом гулялі і ў «гарадкі», і ў «чыжа», але ні ў Налінску, ні ў Арле ніхто ня ведаў «пікара». У маім уяўленьні «пікар» быў чыста беларуская гульня, якой я аддаваўся ў Менску.

Бацька на этапе

Аднойчы – было гэта летам 1936 году – мы з хлопцамі на вуліцы гуляем у ножыкі і бачым – ідзе вайсковец. Мне дзеці кажуць – ты ідзі зь ім пагавары. Я да яго падышоў, а ён шукае №94 – наш дом. Запытаўся ў мяне, як прозьвішча. Тут мушу сказаць, што калі арыштавалі бацьку ў Арле, маці ўмомант зьмяніла прозьвішча на сваё дзявочае – Зубкоўская – і мяне на яго перавяла. Яна лічыла, што так ёй будзе лягчэй дзеля самазахаваньня: муж кінуў, і яе пакінуць у спакоі, не арыштуюць, і я буду зь ёй заўсёды. Дык вось, я сказаў таму вайскоўцу, хто я, і ён мне даў канвэрцік, а ў ім паперка, аддай, кажа, маме. Я маме аддаў, як яна прыйшла, і ў той паперцы было напісана: «Нас будуць везьці этапам праз Арол», – і названы дзень. Тут сталася такое, што і мяне расчуліла: маці прытуліла да сябе тую паперку і заплакала-заплакала. Пачаў усхліпваць і я...

Гэта была першая вестка пра тое, што бацька жывы, бо маці думала, што яго расстралялі. Мне пра гэта яна не казала.

Так, як было напісана ў паперцы, у той дзень мы прыйшлі, эшалён стаяў на станцыі, іх пілнавалі, хадзілі ахоўнікі са стрэльбамі, народу было многа, але ўсё было вельмі спакойна. Гэта быў эшалён вагонаў пятнаццаць, у кожным вагоне два акны, з аднаго і з другога боку, а ў вокнах людзі – чалавекі па чатыры – і людзі тыя ўвесь час мяняюцца, у іх была свая чарга. І трэба было хадзіць і шукаць знаёмы твар, ну і хутка ў адным вагоне мы ўбачылі бацьку. Ён прасунуў нам вяроўку, і на тую вяроўку маці навязала адзёжу, папяросы, махорку, розныя рэчы… Гэта быў першы і адзіны кантакт, падчас якога ён паведаміў, што яго вязуць у Сібір, хоць і не сказаў куды. Ясна, мы супакоіліся, што ён жывы.

Ідучы пасьля гэтага «сьвіданьня» дахаты, маці падбадзёрыла-

ся і казала мне: «Ну што ж, тата адседзіць і вернецца, а ты, сынок, шмат пра гэта нікому не расказвай, будзь асьцярожны!» Што «не расказваць», дык я і сам разумеў, але «быць асьцярожным» – не разумеў ніяк! Асьцярожным – перад чым? Распытваць маці далей я не спрабаваў, бо быў задаволены, што яна падбадзёрылася.

Значна пазьней я запытаўся ў бацькі, як яму ўдалося перадаць тую вестку нам. І ён расказаў, што ў Курску яго ахоўваў беларус, або нават нехта зь ягонай вёскі, і той ахоўнік сам запытаўся, чым яму дапамагчы, дык бацька папрасіў, каб паведаміў сям'і і напісаў паперачку, якую той перадаў іншаму беларусу, і так яно дайшло да нас. Так што нягледзячы на той суворы рэжым этнічныя сувязі былі жывыя. Гэты факт узапраўды мне ўрэзаўся на ўсё жыцьцё: этнічнасьць – моцная штука!

Новая кватэра

Гэтак пачалося жыцьцё бяз бацькі, калі ўжо было вядома, што яго ня будзе даўжэйшы час. Маці вырашыла, што жыць у тым раёне нам досыць цяжка. Па-першае далёка, а па-другое, гаспадыня проста ў нас крала – ежу, рэчы. Дый маці не хацела жыць у тым раёне, дзе арыштавалі бацьку, бо гаспадыня ляпала языком па суседзях, таму маці палічыла, што ў іншым раёне нам будзе спакайней.

Пачалі мы шукаць жытло і знайшлі кватэру ў раёне 2-й Курскай (усяго ў Арле тады было пяць Курскіх вуліц), у доме старых настаўнікаў – Міхаіла Канстанцінавіча і Марыі Іванаўны Падшывалавых. Яны пры цары скончылі ўнівэрсытэты і займалі да рэвалюцыі адміністрацыйныя функцыі ў школьніцтве, ён быў загадчык навучальнай часткі, і яна таксама займала кіраўнічую пасаду выхавальніцы ў школе – і саветы забралі ў іх пэнсію, нібыта за тое, што яны належалі да клясы буржуяў-прыгнятальнікаў! І пры савецкай уладзе гэтыя старыя настаўнікі жылі бяз пэнсіі. Так яны й існавалі – то там нешта зробяць, то там, прыватныя лекцыі, адным словам, неяк «прамышлялі». І вось яны здалі адзін пакойчык нам, маці плаціла за яго 100 рублёў.

Зарплата ў маці к таму часу палепшылася, бо ў яе была поўная нагрузка ў школе ў першую зьмену, мела яна яшчэ нагрузку і ў другую зьмену. У той час у Арле адчыніўся мэханічны тэхнікум, дык яна падпрацоўвала і там. І так усяго разам на месяц яна мела каля 700 рублёў, так што грошай у нас хапала. Кожны дзень яна мне давала 5-10 рублёў, каб я недзе паеў пасьля школы, бо дома нічога не варылася. Пераважна я ішоў у сталоўку – ці на вакзале, ці на якімнебудзь прадпрыемстве, бо там было таньней.

Як мы пераехалі да гэтых настаўнікаў, дык была ўжо зусім іншая атмасфэра. Гэта былі культурныя людзі. Хатка ў іх, праўда, была

маленькая, невялікая пліта і печка апальваліся дровамі, але былі зусім іншыя гутаркі, яны і ў мяне маглі папытацца – як у школе, што праходзім. Цікавіліся школьнымі праграмамі, але ніколі нічога не казалі супраць. Так што за мною быў нагляд, а для маці гэта было галоўнае. Галубятняў і там было поўна на вуліцах, але я нават не стараўся ўвайсьці з галубятнікамі ні ў якія кантакты, бо Падшывалавы за мной пілнавалі, казалі аб усім маці.

Вада, выходак, лазьня

На новай кватэры на 2-й Курскай, так як і на Прадзільнай, па ваду трэба было хадзіць кварталы за два-тры, каля паўкілямэтра. Звычайна я прыносіў два вядры на каромысьле, і вады хапала на тры дні.

Выходак і там і тут быў на двары – мэтраў за 30 ад хаты. На 2-й Курскай быў паміж дамамі на двары, але збоку.

У горадзе была вялікая лазьня на беразе Акі – мыцца хадзілі туды, або я хадзіў на вакзал, дзе былі чыгуначныя душы – таньнейшыя. Летам я заўсёды купаўся ў рацэ, а маці ніколі ў раку не хадзіла, толькі ў лазьню, а там заўсёды ішла ў ванную. Ванна каштавала 3 – 3 з паловай рублі, а лазьня без сваёй шайкі – 50 капеек.

Новая школа

У 26-й школе, куды маці мяне перавяла і ў якой яна працавала, я трапіў у 2-ю клясу, дзе было ўжо вучняў 15, і настаўніца – я ня ведаў, але маці мне сказала – была беларуска, Анастасія Васілеўна Сьмірнова. Муж яе быў з Магілёўшчыны, яго, здаецца, расстралялі. Настаўніца паставілася да мяне вельмі добра.

26-я школа была новая, і пазашкольная праграма была добра арганізаваная, там было больш розных гурткоў, і ўсе яны былі бясплатныя, там авіямадэлістам ня трэба было плаціць за бамбук і за паперу. Першы гурток, у які я запісаўся, быў «Юный ворошиловский стрелок». Заняткаў у гуртку было вельмі шмат, вывучалі ня толькі стрэльбы, але і наганы, хадзілі на стрэльбішча. Я стаў значна больш часу праводзіць у школе.

Памятаю, быў час, калі я запісаўся ў гурток ручной працы і прыйшоў у майстэрню, дзе той гурток займаўся, дык там былі лобзікі – дзесяткі, кожны, хто запісаўся, мог мець, а лобзікі ў той час былі дарагой забавай.

Адным словам, мне ў той 26-й школе паводзілася лепш, з новай школай я адразу «зжыўся». Дый зьмена кватэры на 2-ю Курскую таксама была паваротам да лепшага. Новыя гаспадары часам і распытваліся – дзе бацька, я ім казаў, і яны разумелі. Безумоўна, будучы настаўнікамі, яны часам цікавіліся і прасілі, каб я ім нешта

сказаў па-беларуску. Гэта была хутчэй мяшчанская цікаўнасьць, але мне было прыемна.

Рэха Вялікага тэрору

1937 год быў цяжкі – кругом арышты, арышты, арышты. Як гэта ўсё адчувалі дзеці? Ну, перш-наперш прыходзіш у школу, другая кляса, але гісторыя ўжо выкладалася, былі і мясцовыя падручнікі – і настаўніца казала, што трэба заклеіць ці тую фатаграфію, ці гэтую. А тады ў сярэдзіне году, зімой, прыходзіць Анастасія Васілеўна зь нейкай жанчынай, і тая жанчына кажа: дастаньце з партаў усе сшыткі. А ў той час, якраз у 1937 годзе, зьявіліся новыя сшыткі. Дагэтуль былі простыя: «Тетрадь» і лінейкі. А новыя сшыткі былі з малюнкамі – напрыклад, «Вешчы Алег» і вершык, «Как ныне сбирается Вещий Олег...» Усе дзеці дасталі, у кожнага па 10-15 сшыткаў. І вось тая незнаёмая жанчына адзін сшытак, здаецца з «Трыма багатырамі», выбрала і кажа – аддайце ўсе гэтыя сшыткі мне. І ўсе сшыткі з багатырамі забрала. Пасьля казалі, што там у малюнку было штосьці зашыфраванае, антысавецкі лёзунг ці нешта такое. Тады праз тыдзень прыходзіць піянэрважаты Ціма і зноў – пакажыце ўсе сшыткі! І зноў шукалі, але не знайшлі, што шукалі – нейкія схаваныя вобразы, сьмерць Сталіна там была зашыфраваная, ці нешта падобнае. І так паўгода была сьвістапляска з гэтымі сшыткамі. Потым зьявіліся сшыткі без малюнкаў, і я дзецям хваліўся – сшыткі былі друкаваныя на фабрыцы ў Добрушы, БССР!

Празь нейкі час раптам у старэйшых клясах «прапаў» настаўнік гісторыі Мікалай Іванавіч Жарэс. Яго любіла ўся школа, калі мы гулялі ў двары ў гарадкі, ён часам прыйдзе і з намі пагуляе, і вось раптам прапаў! Вораг народу! Дзеці не маглі гэтага зразумець – настаўнік, гуляў у гарадкі, вельмі папулярны, быў з усімі добры, і раптам – вораг. Гэта была проста бомба.

Дырэктар у нас быў Гапонаў. І раптам недзе пад красавік 1937 году кажуць: цяпер будзе іншы, бо Гапонаў «переехал в другой город». Ну, пераехаў і пераехаў. А пасьля нехта шэпча: яго арыштавалі з усёй сям'ёй! І сярод дзяцей панавала няўпэўненасьць, страх.

Аднаго вечару маці прыйшла з працы вельмі позна і расплакалася. Цяжка дзіцяці стрымаць сьлёзы, калі маці плача, але я тады стрымаўся, бо адчуваў: калі маці плача, то здарылася нешта незвычайнае. Як мог, я пачаў маму распытваць. І маці сказала мне, што ёй надышоў час атрымаць пашпарт, якога ў яе дагэтуль не было, і для гэтага была патрэбная паперка са школы. І вось дырэктар паклікаў яе ў кабінэт і ў прысутнасьці завуча кажа: там у вас у графе нацыянальнасьць стаіць «беларуска», але ж гэта «не имеет никакого значения», і для нас прасьцей і для вас будзе лягчэй, калі мы напішам «руская».

Яна кажа: ну калі «не имеет никакого значения», то хай застаецца «беларуска». Дырэктар нічога не адказаў, і яна выйшла з кабінэту.

Пасьля маці пабаялася, што так зрабіла, але яна не адступіла і кажа мне, што яе могуць арыштаваць. Яе так ніколі і не арыштавалі, але сама падрыхтоўка да таго, што яе могуць арыштаваць, што яна гаспадыні Марыі Іванаўне сказала што рабіць са мной – у дзіцячы дом, ці пазваніць цёці Насьці, матчынай сястры, якая жыла ў Кіеве – каб мяне забрала – усё гэта адбівалася і на мне.

Пару тыдняў мы з маці былі ў вялікім напружаньні, аднак усё абышлося, і ў дзіцячы дом мне ісьці не давялося. Але пры гэтым ува мне ўжо пачала гартавацца беларускасьць.

Дык вось, дырэктар Гапонаў прапаў, кватэра пустая. Досыць хутка прыходзіць новы дырэктар – Міхаіл Канстанцінавіч Ільлюшын, таксама гісторык, але выкладаў ён старажытную гісторыю – Грэцыі, Эгіпту, і калі ён абышоў усе клясы, яму адразу далі мянушку «Мішка-Фараон», якая так і трымалася да самай вайны. Ён, у адрозьненьне ад Гапонава, быў чалавек партыйны.

Цікавая дэталь: дзеці паміж сабой ведалі, які настаўнік партыйны, а які не.

Напружанасьць

У 1937 годзе ў нашай школе «зьнікла» пяць ці шэсьць настаўнікаў. Ніхто пра гэта асабліва нічога не гаварыў – дзеці ўсе ведалі, але маўчалі. Гэта быў вельмі напружаны год для нашай сям'і, бо якраз адзначалася 100 гадоў ад сьмерці Пушкіна, і мая маці, баючыся, каб ён не закінулі, што яна ня надта актыўная, пагадзілася ўзяць нагрузку ў гарадзкім мэтадычным кабінэце – узялася быць каардынатарам юбілейных выставак па ўсіх школах гораду, прысьвечаных гэтаму стагодзьдзю – а школаў сярэдніх і няпоўных сярэдніх было ў Арле больш за тры дзесяткі. Ёй за гэта таксама і плацілі, але яна аддавала гэтаму шмат часу і сілаў, трэба было шмат езьдзіць на трамваях, і я зь ёй езьдзіў, адчыняць пушкінскія выстаўкі то тут, то там. Яна пілнавала, каб на тых выстаўках усё было «правільна», усё прадумана, каб ня дай божа ня ўставіць дзе партрэты афіцэраў або не забыцца ўставіць няню. У 6-й школе быў цэлы скандал – забыліся ўставіць партрэт той Арыны Радзівонаўны! Мае адчыніцца выстаўка, да маці прыяжджаюць на «эмцы» – недзе на партрэтах аж тры афіцэры, а няні няма! І маці едзе зь імі на «эмцы», каб ураташаць выстаўку. (А «эмка» – гэта ўжо нейкае высокае начальства, нехта з аблана.) Або там, дзе мясцовыя настаўнікі «расфарбоўвалі» выстаўкі і дадавалі нешта ў колерах, маці пілнавала, каб дзе разам не было спалучэньня белага, сіняга і чырвонага – расейскага нацыянальнага сьцяга! Дык было напружана. Маці са мной гаварыла як з дарослым – мне было дзесяць гадоў,

казала: ня трэба было брацца за гэта, але ж грошы былі загадзя заплачаныя, 300 рублёў.

Маці была вельмі асцярожная, бо ўвесь час вісела пагроза – як пачнуць расхлёбваць чаму ты, хто ты, як ты, дык могуць таксама арыштаваць. Мне яна часта казала: «Ты ж, сынок, ведаеш таксама як і што гаварыць».

Радзянковы

Прыпамінаецца мне з Арла і такая зьява. Дом тых Падшывалавых, да якіх мы пераехалі, на 2-й Курскай №9а, быў у двары, а ў першым доме ад вуліцы, №9, жыў рускі селянін, які ўцёк ад раскулачваньня – Іван Радзянкоў. Уся ягоная сям'я – жонка, бацька, стары дзед з барадой, дзьве дачкі і сын Сямён – уцяклі зь вёскі падчас раскулачваньня, пакінулі ўсё, забралі толькі каня і падводу. І ў горадзе Іван Радзянкоў пачаў працаваць ламавіком – перавозіў цяжкія рэчы ў горадзе. Усе Радзянковы страшэнна ненавідзелі савецкую ўладу.

І вось сын Сямён уступіў у камсамол! Ну, ня сам – яго ўцягнулі. І адноўчы ён мне стукае ў акно, каб я выйшаў. Я выходжу, ён кажа: «Пойдем, пройдемся». Адышліся мы, і Сямён паказвае мне камсамольскі білет: «Если кому скажешь, я тебя, блядь, зарежу!» (У той час «блін» яшчэ не казалі.) Дык каму ж я буду казаць? «Пахану!» Я кажу, пахану твайму ніколі нічога не скажу. «Зарежу!» І я баюся, бо сапраўды можа зарэзаць… «А если я тебя не зарежу, меня пахан зарежет за этот билет!» Дык што мне рабіць? А ён і сам ня ведае. Я пачынаю разумець, у чым тут справа: бацька ўцёк ад раскулачваньня, сын уступіў у камсамол. Пры гэтым уступленьні ён шмат налгаў, ніяк не сказаў, што яны ўцяклі ад раскулачваньня. Як ён мне пазьней ужо незадоўга перад вайной расказваў – яму хацелася належаць да камсамолу, таму і ўступіў... І так мы зь ім ходзім і ходзім, і ён ужо пачынае плакаць, а ён старэйшы за мяне гады на тры. І я яму кажу, ведаеш што – скажы ў камсамоле, што ў цябе тубэркулёз. «Думаешь, сойдёт?» Я кажу, я ж ня ведаю, я яшчэ ў піянэрах. І я ўжо і сам пачынаю плакаць… І так ён сказаў, што ня можа быць камсамольцам, бо ён тубэркулёзны, заразны, і яго часова выключылі, дык ён быў задаволены.

Такі там быў настрой, і Сямён надта бацькі баяўся, і баяўся, каб я да іх не заходзіў. А побач зь іхным домам быў сарай, дзе стаяў конь, якога яны ўратавалі ад раскулачваньня, быў у іх яшчэ сабака Рыжка. І вось адзін раз нешта мне было трэба да іх зайсьці. Я стукаю – ніхто не адчыняе, я адчыняю дзьверы, ну, як усе дзеці. А ў іх там прыгожая, сьветлая, чыстая кухня, вялікі стол, і яны ўсе стаяць вакол стала і моляцца. Ёлкі-палкі!.. І так я зайшоў, і дзед той стары быў зь імі, і ўсе хрысьцяцца. А тады той Іван Радзянкоў, бацька, кажа мне: «Видишь?» – «Да». – «Понимаешь?» – «Понимаю». – «Ну и мол-

чи». І гэта было ўсё. Ну, я аддаў Сямёну, што трэба было, і пайшоў дахаты і нікому ні слова, толькі маці. Кажу, «нарваўся» на абед, а яны моляцца. А маці мне кажа: «Ты маўчы», пры гэтым нейкім не загадным, а сяброўскім тонам, і потым паўтарала некалькі разоў: «Маўчы, сынок, маўчы».

Татарскі конь

Была яшчэ адна цікавая гісторыйка, якая добра запамяталася зь дзяцінства. Хлопцы звычайна гуртуюцца сваімі кампаніямі, і ў нас такая была ў раёне 2-я Курскай і Перасыханкі (так звалася маленькая рэчка, якая перасыхала – вясной цячэ вада, пасьля цэлы год няма, яна ўпадала ў Аку). Быў 1938 год, мячы прадаваліся, ваўсю гулялі ў футбол. Кіпер (толькі «кіпер»! – ніякіх «вратарей-брамнікаў» тады не было) у нас быў яўрэй Барыс, зь мянушкай Юда, жыў ён у ЖАКТе, вялікім шматкватэрным доме. Яго ўсе звалі Юда, і ён ніколі ня крыўдзіўся. І быў яшчэ татарын Жора Магдзей. Гуляць у футбол мы хадзілі ў маю старую школу, бо там быў добры пляц, і той Жора якраз там вучыўся – даставаў ключы або ведаў, празь які плот можна пералезьці. А мяч, які мы купілі ў складчыну, заплацілі якіх 26 рублёў, захоўваўся ў Жоры. І вось хочам мы пагуляць, а Жоры няма. Сабралі мы Юду-кіпера, Пецьку Кірылава, Борку Кармана, Борку Шкета – усе мелі нейкія мянушкі, толькі ў мяне не было, звалі проста Віта. І кажуць, ну, Віта, ты чалавек спакойны, ідзі ты да Жоры. Я іду – уздоўж Перасыханкі, паўквартала ад 2-й Курскай. Заходжу ў Жораў дом, стукаю – ніхто не адказвае. Адчыняю адны дзьверы – а я часта ў іх у хаце бываў – нікога няма. А другія дзьверы вялі ўжо ў сарай. Я сабе думаю, трэба сунуцца далей, мяч жа ж патрэбны. Стукаю ў другія дзьверы, адчыняю, а там – ягоны дзед бярэ мяне за грудкі, а ў самога вялікі нож… І бачу я – вісіць зарэзаны конь, і яны, два ці тры татарыны, разам з Жорам, разьбіраюць таго каня. І дзед мне: «Ты, иди сюда. Понимаешь?» – «Понимаю». – «Осторожно. Жора сейчас занят. Что тебе нужно?» – «Мне нужен футбол». – «Хорошо. Жора, отдай ему футбол». Я кажу – ну й Жора нам патрэбны, ключы патрэбныя! «Подождешь». Ну, я выйшаў з футболам, паўгадзіны пачакаў, пакуль яны гэтага каня разабралі. Жора выйшаў: «Понимаешь, о чем старик говорил?» – «Понимаю». – «Ну так молчи»…

А я з Жорам сябраваў, ён да мяне адчуваў нейкую сымпатыю, я да яго. Дык я ў яго пытаюся, як вы коней… часта ў вас такое бывае? «Почти каждую неделю».

Вось якая ў нас была кампанія, у такіх умовах расьлі дзеці – слова «маўчы» было ў нас сьвятое. Калі пачалася вайна, дык з гэтай усёй маёй кампаніі Шкета – яму было 17 гадоў – забралі ў армію адразу, двое паехалі ў Нямеччыну, двое засталіся ў горадзе.

Пісталет

Адзін раз галубы ўблыталі нас у гісторыю. Сеў голуб на нечы стары сарай, гаспадар якога – «помещик» Хітраво – уцёк за мяжу, казалі, што ў Францыю, так што і сарай, і хата былі «нічые», хоць кватаранты там і жылі. Ну, нас трое ці чацьвёра кінуліся на гэты сарай зьняць таго голуба («зьняць» – такі быў спэцыяльны тэрмін, гэта значыць злавіць). Калі ты зловіш чужога голуба на страсе, то можаш пайсьці і некаму яго прадаць – 15-20 рублёў. Галубы бываюць розныя, чарнаплёкі – недарагі, а чарнапегі ці сіняпегі – дарагія, а кувырны («кубырной») – дык і 100 рублёў… Ну, палезьлі мы на страху, і той голуб паляцеў. Мы бачым: на страсе прыўзьнятая бляха, а пад бляхай – кабура і новы пісталет! Добры пісталет. І перад намі, што лезьлі па таго голуба, паўстала праблема – ці пакінуць сабе гэты пісталет, ці занесьці ў «участак». Ну, як ва ўчастак занясем, дык скажуць: «У, піянэры, малайцы!..» Хоць з другога боку хто ведае. Я адразу кажу так: «Я ва ўчастак не пайду». Як ня пойдзеш? Ты ж такі баявы, умееш гаварыць… Але я кемлю, што калі я зьяўлюся ва ўчастку і скажу, што я – адзін з тых, што знайшоў пісталет, дык пачнуць разьбірацца: пачакай, дом нічый, адкуль пісталет, нехта ж мусіў яго туды пакласьці, ня сам жа ён туды залез. Што рабіць? Я кажу: «Нет, в участок не пойдем. Это – крышка». Ну, для нас хлопцаў ясна – нехта хавае там пісталет. Але хто? І вось мы сядзім і баімся, чорт яго знае, як яно абернецца. І ў ваду ж ня ўкінеш – гэта ж дурнем трэба быць, каб пісталет у ваду кінуць! Тады адзін зь сяброў кажа: «Будем ждать, пока не пройдет мимо дядя Ваня Новиков». Дзядзя Ваня – наш участковы міліцыянэр. Мы так і зрабілі – сядзелі дзень ці два, і вось ідзе дзядзя Ваня Новікаў: «Дядя Ваня, здрасьте!» – «Ну, что, ребята?» – «Вот мы полезли голубя снимать, нашли пистолет!» – «Где?» – «Там!» І так гэтая справа скончылася. Мы расьлі ўжо з такой вулічнай мудрасьцю…

У кожнага была рагатка. Ножык і рагатка. Фінка была ня ў кожнага, у мяне дык ніколі й не было. З рагаткі страляеш у вераб'ёў, часам падстрэліш, часам не. І аднойчы на Перасыханцы нехта зь сяброў страляе ў гэтых вераб'ёў, а тыя адлятаюць. А я кажу: «Да, эти жиды шухарные!» (Вераб'ёў на вулічным жаргоне называлі «жиды».) Участковы дзядзя Ваня якраз праходзіў непадалёк і пачуў мае словы. Ён падыходзіць і пытае ў мяне: «Что ты сказал? Кто шухарной?» – «Да дядя Ваня, я же…» – «Ты знаешь, что ты сказал? Если еще раз услышу… Понял?» І пайшоў. Такія былі адносіны з участковым.

Мы ведалі, што дзядзю Ваню можна давярацца. Як ён наагул быў на тым «участку»? Калі пачалася вайна, ён нам ніколі не сказаў «ловите шпионов», як рабілі іншыя «ўчастковыя».

Вітаўт

Так я рос на арлоўскай вуліцы. Трэба было быць асьцярожным, асабліва таму, што я ўсьведамляў, што бацька ў канцлягеры. Той самы Сямён Радзянкоў – яшчэ да той гісторыі з камсамолам – выходзіць адзін раз з хаты, а я ўжо сядзеў у двары на іхным возе (бацька, Іван Радзянкоў, прыяжджаў, ставіў воз сярод двара, распрагаў каня, даваў яму авёс, часам мы дапамагалі), выходзіць і кажа: «Эй, а я знаю, кто такой был Витовт! Это был большой князь, который угнетал крестьянство! Так вот ты какой! Я понимаю, что ты откуда-то приехал!» І раве на ўсю пысу! Ну, ясна, гэта ён казаў жартам, а я ўжо пачынаў апраўдвацца, маўляў, ня ведаю, тата даў імя, я й не разумею, адкуль яно. «Ну ты, – кажа, – не бойся, не бойся, я пошутил». Калі расьцеш у такой атмасфэры, дык цьвёрды навык асьцярожнасьці выпрацоўваецца. Я, вядома ж, ведаў, хто такі Вітаўт, бо пытаўся ў маці, і яна мне расказала. Калі мы яшчэ былі ў Налінску, а асабліва ў Арле, яна мне казала: «Май на ўвазе, што ты – ня Віця. Чуеш?» – «Чую». – «Зразумеў?» – «Зразумеў». Маці мая была ўпартая беларуска, хоць і вельмі сьціплая, асьцярожная.

У расейскіх мясьцінах, дзе мы жылі – у Налінску, Вятцы, Арле – імя Вітаўт было невядомае. Зь сямейнага жыцьця я добра ведаў, што маім сябрам на вуліцы, а пазьней у школе мне трэба было вытлумачыць, што маё імя беларускае – Вітаўт, а маці й іншыя мяне клічуць Віта, і так усе мусяць клікаць. Так яно і было, і дзеці ўсюды (а за імі і дарослыя) успрымалі гэта, як я ім казаў. Рабіў я гэта ня толькі з уласнага задавальненьня, але зь веданьня, што так хоча мая мама. Яна мне прывіла і гэтую звычку, і погляд, што там, на вуліцы, у школе, сьвет іншы, ня свой, а свой, беларускі – у сям'і.

Бежанцы

Прыпамінаецца і такі цікавы мамэнт. У мяне быў блізкі сябра Пецька Кірылаў. Жылі яны вельмі цяжка, мама ў яго была паўсьляпая, яна працавала для арцелі, якая пляла кошыкі, двое дзяцей – Пецька і сястра Валя. Мы з маці ў параўнаньні зь імі былі мільянэры. Дык я яму часта прыносіў бутэрброды, даваў грошы, бо ў мяне грошай было значна болей, чым у яго. І адзін раз Пецька просіць зайсьці да іх, і яго мама кажа: «Ты знаешь, что его папа был белорус». Я – як беларус?.. А яна: «У нас было много беженцев, я влюбилась, женилась, Петя родился...» Пецеў бацька пасьля памёр ад сухотаў. Слова «беженцы» мне тады неяк не засела ў памяці, толькі пасьля я даведаўся, што гэта ж былі нашы людзі! Яны ўцякалі, некаторыя заставаліся там, некаторыя ехалі далей у Сібір.

Пазьней, ужо ў Амэрыцы, я даведаўся ад Часлава Ханяўкі зь Нью Брансўіку, што яны былі бежанцамі ў Арле, жылі на 3-й Курскай і ставілі ў Арле ў 1918–19 гадах п'есу Купалы.

Менск

Што я вельмі любіў, дык гэта, безумоўна, летнія паездкі ў Менск. Пра паездкі ў Менск я марыў увесь час. Бываў я там падоўгу, адзін раз, здаецца, у 1936 годзе, маці мяне адправіла ў сярэдзіне чэрвеня, і я быў у дзеда да канца жніўня. Але найчасьцей мы езьдзілі зь ёй разам. Мама адведвала, прыпушчаю, паўгорада сваіх сяброваў, дзьвюх зь іх я добра ведаў – Жэню Перскую і Ядзю Бяганскую, а я меў поўную волю «лазіць» па Менску ад Вайсковых могілак і аж да Парку Чалюскінцаў. У Менску мне было добра – дзедава хата, спакойна жывеш, адчуваеш сябе гаспадаром. А ў Арле – жыць на кватэры ня так прыемна, ну і там асяродзьдзе без каранёў. Хоць і вучысься добра, і на вуліцы свой чалавек, цябе паважаюць, але гэта ўсё ня тое.

Бываючы ў Менску, маці накупляла беларускіх кніжак – Маўра і іншых пісьменьнікаў – думала, што я ўсё перачытаю. Адну-дзьве кнігі я чытаў, а рэшта так і заставалася ляжаць. Аднак беларуская кніга сваю выхаваўчую ролю рабіла.

Цяпер, як кажуць, з пэрспэктывы часу, я ўпэўнена магу сьцьвердзіць, што сувязь зь Менскам – летнія канікулы, мае блізкія сябры ў Менску, «свая атмасфэра» гораду – усё гэта было асноўным беларускім «эліксірам», духоўнай стравай, якая ўлівала энэргію ў маю беларускую адданасьць.

Піянэрлягер

Летнія месяцы ў Арле – ад 1 чэрвеня да 1 верасьня – былі для мяне свабодныя. Галоўнай падзеяй лета была заўсёды паездка ў Менск, але маці канчала навучальны год досыць позна – выпускныя экзамэны часам цягнуліся да канца чэрвеня, так што ў Менск мы звычайна езьдзілі ад сярэдзіны ліпеня да сярэдзіны жніўня. У іншы свабодны час маці старалася мяне аддаць у піянэрскі лягер, каб менш боўтаўся па вуліцы.

Лягеры былі ў розных мясцовасьцях наўкол Арла. Адзін лягер, прыкладам, знаходзіўся ў мясцовасьці Цно, на паўднёвы захад ад Арла. І што я спасьцярог – мы шмат хадзілі па вёсках, у нас былі розныя праграмы вывучэньня мясцовай гісторыі, і ў адной вёсцы – я ўжо забыўся назоў – яны вельмі дзіўна гаварылі. І старшы піянэрважаты паклікаў мяне, каб я паслухаў тую гаворку, бо дзеці не маглі зразумець. Сяляне гаварылі ламанай беларускай мовай, можа, не зусім

беларускай, але я разумеў, мне тая мова не была так дзіўная, як для расейскіх дзяцей.

У іншай мясцовасьці была старая будова – Сабураўская крэпасьць, і той старшы піянэрважаты – я меў таго самага два гады – тлумачыў пра гэта, і тады, магчыма, я ўпершыню пачуў пра «літоўскіх людзей», якія ў гэтай крэпасьці дапамагалі змагацца супраць татараў. Відавочна, што тлумачэньні піянэрважатага пра «літоўскіх людзей» я зь Беларусьсю не спалучаў, але ў памяці засталося нешта неардынарнае.

Блюхер

Цікавы эпізод, зьвязаны зь піянэрскім лягерам, адбыўся на год пазьней – у 1939-м. Лягер называўся «Некрасовка», гэта ўжо, здаецца, на поўнач ад Арла, кілямэтраў за 7. У «Някрасаўцы» мы спалі ў будынках (у іншых лягерах мы спалі ў палатках). Там была вёска, і ў вёсцы быў таксама дзіцячы дом, а ў тым доме быў сын савецкага маршала Васілія Блюхера – Вася. Ён быў мой аднагодка – з 1927 году, і мы пасябравалі, бо дзятдомаўцаў улучалі ў піянэрскі лягер – удзень яны елі разам з намі, хадзілі ў паходы, гулялі ў гульні, а ноччу ішлі спаць у дзіцячы дом. Вася расказваў, як бацьку арыштавалі і сказалі маці, што расстралялі, а яго і сястру забралі ад маці і вывезьлі ў дзіцячыя дамы, і дзе была сястра, ён ня ведаў.

Я быў у лягеры ў 1938 і 1939-м, у 1940-м я хадзіў да яго ў Някрасаўку, мы зь ім хадзілі на рэчку, хадзілі ў вялікі гай, дзе выразалі роўненькія кійкі, а потым на тых кійках ножыкам выразалі розныя фігуркі, шахматныя кратачкі, рабілі таксама шмат сьвісткоў. У 1941-м, можа тыдзень ці два пасьля пачатку вайны, я зноў пайшоў у Някрасаўку зь ім пагутарыць, і мне сказалі, што дзіцячы дом быў эвакуаваны.

Піянэрскія лягеры для мяне ў першую чаргу было тое, што маці мяне забірала, каб я ня быў на вуліцы. Ну а па-другое – ўсё ж на прыродзе, і кармілі там досыць рэгулярна, але недастаткова, дзеці заўсёды былі паўгалодныя, дык бацькі ў нядзелі прыяжджалі і прывозілі ежу. Да мяне маці прыяжджала вельмі рэдка, бо была занятая ў школе, так што я ў піянэрскіх лягерох бываў адзін, але сяброў было дастаткова.

Пазьней, часта прыпамінаючы піянэрскія лягеры каля Арла, я думаў – што ж выхаваўчага давалі тыя лягеры? Нешта ўсё ж давалі, хоць і мала. У лягерох заўсёды гулялі ў «белых» і «чырвоных» – значыць, пра «белых» яшчэ не забыліся! У лягерох я навучыўся і такім пэрлам: «Не спи, вставай, кудрявая, в цепях звеня» (замест «в це-

хах») або «за стеной никто у нас не лишний» (замест «за сталом»). Такія палітычна небясьпечныя варыянты вядомых песень дзеці сьпявалі пры вогнішчах.

Масква

У 1937 годзе летам у нас быў вольны тыдзень-другі перад Менскам, і мы з маці паехалі ў Маскву. Там якраз адчынялася вялікая выстаўка, дзе быў і беларускі павільён, і безумоўна маці мяне ў той павільён павяла. З Масквой у мяне зьвязаны цікавы пэрсанальны мамэнт: у тым годзе, калі мы былі, пусьцілі мэтро. І адна станцыя, ня памятаю ўжо якая, была, як казалі, вельмі «глыбокага заляганьня», і на той станцыі быў эскалятар. Дык я маці казаў, што мы будзем выходзіць толькі на той станцыі, дзе эскалятар. На тую станцыю мы варочаліся некалькі разоў, каб праехаць на «лесьніцы-чудзесьніцы», хоць маці моцна злавалася.

Ясна, паездка ў Маскву была больш для таго, каб пахваліцца: «вось і я быў у Маскве», каб не адставаць ад іншых дзяцей. Праўда, мы ніколі так і не паехалі ў Крым, хоць маці й зьбіралася. А я ўжо паставіўся так, што не хачу больш нікуды езьдзіць, толькі вязі мяне да дзеда ў Менск, бо там мне падабалася найбольш. Больш нікуды мы як турысты ня езьдзілі.

Па дарозе ў Менск

У Беларусь мы езьдзілі звычайна праз Смаленск, хоць часам ехалі і праз Гомель. Расклады цягнікоў складаліся такім парадкам, што і ў Смаленску, і ў Гомелі заўсёды трэба было рабіць перасядкі і доўга чакаць: бывалі гады, што мы праседжвалі на станцыях амаль цэлыя суткі. Мама скарыстоўвала гэты час тым, што вадзіла мяне па горадзе, дык у дзяцінстве я няблага ведаў гэтыя два месты. Часьцей, як я сказаў, мы праяжджалі праз Смаленск. Горад мне вельмі падабаўся: прыгожыя магутныя будынкі, старажытнасьці, маляўнічасьць Дняпра ў дзіцячай сьвядомасьці стваралі рамантызм, заглыбленьне ў даўніну. А аднаго разу, памятаю, мама мне сказала, што некалі ў Смаленску бываў і тата, і ў мяне гэта выклікала нейкую аўтарытэтнасьць, зьвязала горад зь беларускасьцю.

І вось аднойчы ў Смаленску на вакзале, седзячы ў пачакальні адзін, бо мама выйшла штосьці купіць, я пачуў беларускую гаворку групы людзей, асобаў чатырох-пяці, ды пачуў, што яны ўспаміналі горад Полацак. Прабылі тыя людзі ў пачакальні нядоўга. Яны хутка выйшлі ды зьніклі з поля майго зроку. Калі ж вярнулася маці, я ёй сказаў, што чуў, як нейкія людзі голасна размаўлялі па-беларуску

ды называлі горад Полацак. У мамы я адразу спытаў, што гэта за горад (новы для мяне) і чаму мы празь яго ніколі не праязджалі. На маё пытаньне маці адказала прыблізна так: «Полацак – гэта стары беларускі горад, так як і Смаленск, а ты, Віта, добра ведаеш, што нам езьдзіць ня ўсюды можна. Але ты, сынок, не сумуй, калі вырасьцеш, напэўна пабудзеш у Полацку». Вось так падала мне вестку пра Полацак, злучыўшы яго ў маёй сьвядомасьці з Смаленскам, мая мама, добрая беларуская настаўніца!

Яшчэ, езьдзячы ў Менск, мы часам затрымоўваліся ў Карачаве, бо там былі знаёмыя, і ў Бранску, дзе жыла блізкая радня па дзедавай лініі: дзедаў брат працаваў на чыгунцы.

11 ліпеня

У Менску, калі я прыяжджаў да дзеда – гэта найчасьцей бывала ў ліпені месяцы, – бясспрэчна вялікім днём для дзяцей быў дзень 11 ліпеня, дзень вызваленьня Беларусі ад белапалякаў. У той дзень бывала дэманстрацыя ў горадзе, шлі калёны са сьцягамі, Шэсьце пачыналася там, дзе цяпер цырк, адтуль ішлі ўверх і аж да Чырвонага касьцёла. Мы з мамай звычайна стаялі на рагу Ленінскай і Савецкай і глядзелі. Яшчэ памятаю, у Палацы піянэраў аднаго разу быў дзіцячы беларускі фільм – кароткамэтражны, можа, на хвілін дваццаць. Гэта быў адзіны раз, што я быў у Палацы піянэраў. Гэты фільм зрабіў уражаньне, і ня толькі на мяне, бо дзеці, зь якімі я сябраваў – з Горнага завулку, Берасьцянскай, Дрэваапрацоўчай, Чырваназорнай, у нас была цэлая кампанія, – пра гэты фільм гаварылі, і гаварылі шмат. Назоў фільму я ўжо ня памятаю, але прысьвечаны ён тым падзеям 11 ліпеня, там былі белапалякі, якія ўцякалі, паказвалася таксама частка Менску, што нам тады вельмі спадабалася – наш горад трапіў у кінафільм! Для нас гэта шмат значыла. Гэты дзень – афіцыйна ён зваўся «Дзень вызваленьня Беларусі ад белапалякаў» – кожны год, што я бываў, быў вялікі, сьвяточны і нейкі беларускі.

Каталіцкае сьвята

Іншы дзень з маіх побытаў у Менску, які мне заўсёды ўспамінаецца, – 15 жніўня каля касьцёла Сьвятога Роха, гэта вялікае каталіцкае сьвята. Тады на польскія могілкі прыяжджалі людзі, сядзелі там, выпівалі, сьпявалі народныя песьні, у тым ліку і польскія. Мой дзед таксама заўсёды хадзіў – на Камароўцы вялікай розьніцы не рабілі католік ты ці праваслаўны. (Як дзед казаў: «Пайду з Суднікам па справах» – мы з мамай ведалі, што дзеда да вечара ня будзе дома!)

Адчувалася, што гэта быў зусім іншы дзень, не дзяржаўнае сьвята, ніякіх дэманстрацый, але дзень быў гучны.

Пахаваньне з аркестрам

Мы жылі недалёка ад могілак, таму пахаваньні былі звычайнай зьявай. Зь сьвятарамі пахаваньняў я не прыпамінаю, але малітвы над труной нябожчыка гаварыліся часта, голасна і шматгалосна, сьпявалася «Вечная памяць». Але калі з Даўгабродзкай было чуваць аркестар, то зьбягаліся ўсе дзеці з раёну – паглядзець, каго ж хаваюць. З духавым аркестрам хавалі ня так часта, але за лета зь дзесяток такіх пахаваньняў набіралася. Сярод дзяцей такія пахаваньні мелі высокі статус – значыць, хавалі нейкую вялікую шышку.

Нацыянальнае

У школе вучні ведалі, што я беларус – вядома, ведала гэта і настаўніца. Часам беларускасьць была патрэбная. Помніцца такое: у чацьвертую клясу прыехаў да нас украінец, прозьвішча ў яго было Задняпроўскі. І на лекцыі батанікі, дзе ён меўся расказаць пра досьлед, які ён рабіў, быў мамэнцік, што карані, апушчаныя ў ваду, пускалі «пузырьки воздуха». І вось гэтае слова «пузырьки» ён забыўся і кажа «бурбалкі», хоць я й падказваў «пузырьки», але ён не пачуў. Усе дзеці пачалі з тых «бурбалак» сьмяяцца, ну й ясна, што яго адразу пачалі называць Бурбалкай – аж да самай вайны. А яшчэ ў 1937 годзе, недзе сярод зімы, зьявілася дзяўчына-грузінка, дык яе адразу назвалі Суліко, бо ў той час песьня «Суліко» была вельмі папулярная.

Так што дзеці ў нашай клясе рэальна ведалі пра іншыя нацыянальнасьці. Мяне ведалі, я быў досыць актыўны – у розных гуртках і ў школе быў свой чалавек, бо і маці выкладала, і пасьля заняткаў я часта заставаўся – ці гуляў у школьным двары, ці некаму дапамагаў. Але былі і іншыя нацыянальнасьці – была адна ўзьбечка. Я памыліўся – думаў, што яна яўрэйка, а яна сказала, што ўзьбечка. Я зь ёй нават сядзеў за адной партай.

Але выпадак, які запомніўся на ўсё жыцьцё, быў такі. 1939 год, я ў 4-й клясе, настаўніца вядзе курс геаграфіі па падручніку Чафранава. Праходзім рэспублікі СССР, а ўрок прысьвечаны БССР. Вучні, ведаючы, што настаўніца Анастасія Васілеўна Сьмірнова па нацыянальнасьці беларуска, пачалі да настаўніцы чапляцца, каб сказала што-небудзь па-беларуску. Настаўніца ж ня надта хацела, адмаўлялася і казала: «Да вы, ребята, ничего по-белорусски не поймете!» На гэта дзеці дружна адказалі: «А нам Вита переведет», ве-

даючы, што і я беларус. І тут настаўніца супынілася і вельмі голасна сказала: «Добра, спыніце гутаркі!» У клясе разгубленасьць, ніхто не зразумеў ні слоўца. Вучні былі ўражаныя – нейкая іншая мова. І адразу ўсе накіравалі пагляды на мяне – ну, перакладай! І я гэтак жа ўпэўнена, як і настаўніца, вёў: «Хорошо, прекратите разговоры!» Як кажуць, такую сытуацыю і знарок не прыдумаеш.

Настаўніца падала дзецям мову гэтак, што яскрава давяла: мовы іншыя могуць быць незразумелыя. У дзяцей у расейскай школе аб беларускай мове склалася слушнае ўражаньне дзякуючы настаўніцы-беларусцы. У гэтым выпадку настаўніца рызыкавала: ёй маглі «прышыць» нацыяналізм (а нацыяналізм тут быў) і арыштаваць.

Яўрэі, армяне, цыганы

У клясе было і пару яўрэяў, і я нават ня ведаў, што некалі ў Арле была сынагога. Але я сядзеў нейкі час за адной партай з Тайбай Сонькінай – дык пра сынагогу сказала мне яна, інфармацыя паміж дзецьмі цыркулявала. Магчыма, тады ад яе я ўпершыню пачуў і слова сынагога, а таксама даведаўся, што ўсе латкі з ірыскамі на рагох вуліц – гэта яўрэі, а чысьцільшчыкі ботаў каля станцыі – армяне! Тайба ведала ўсё – яна была арлоўская. Было таксама шмат цыганоў – варажылі, танцавалі.

А завучам у школе нейкі час была Тамара Сяргееўна Шапіра, партыйная жанчына, і яна пасябравала з маці. Для мяне гэта было досыць дзіўна, усе ведалі, што Тамара Сяргееўна – шышка ў партыі, яўрэйка, а ейны муж таксама партыйны начальнік, дык я ня мог зразумець – чаму ж маці зь ёй сябравала. Я таксама заўважыў, што маці вельмі часта пазычае ёй грошы. Маці зарабляла добра, жылі мы досыць ашчадна, і ў нас грошы бывалі. Адзін раз у маці пытаюся: «Мама, чаму ты так часта ёй пазычаеш і так блізка зь ёй сябруеш?» – «Бо Тамара Сяргееўна сказала, што ейныя дзяды зь Беларусі». У іх былі вельмі прыязныя дачыненьні. Жыла Т. С. Шапіра ў багатай частцы гораду, той, дзе было тургенеўскае «Дваранскае гняздо» – зялёная частка гораду над ракой Орлік. Тамара Сяргееўна запрашала нас у госьці, але мы так ніколі й не зайшлі.

Наагул, за ўсе гады жыцьця ў Арле мы ні ў кога не былі ў гасьцях, хоць маці шмат хто запрашаў, яе вельмі паважалі як настаўніцу. Думаю, што маці наўмысна не хадзіла ў госьці, каб мець як мага меней кантактаў – у выпадку пазову ў НКВД любыя кантакты маглі б нашкодзіць.

Калі пачалася вайна, недзе ў пачатку ліпеня, Тамара Сяргееўна прыехала да нас і кажа маці: «Слухай, Маруся, я выяжджаю, і ты выяжджай, я табе дам машыну, паедзем у эвакуацыю». Маці безумоўна адмовілася…

Сацыяльныя межы

Я ў клясе быў выдатнікам – вучыўся добра, навука ішла досыць лёгка, я шмат чытаў. Была ў мяне ў клясе суперніца – Ларыса Хлебнікава, вельмі разумная дзяўчынка, а бацька ў яе быў вялікая шышка вайсковец, з «ромбам» – у горадзе пашыбу Арла вялікі чын. Арол наагул быў горад досыць ваенізаваны, там было бранятанкавае вучылішча, колішні кадэцкі корпус, лётная школа, цэнтрал з НКВД, дык вайскоўцаў было шмат. І аднойчы нешта ладзілася ў Доме Чырвонай арміі (былое Дваранскае сабраньне), а матка Ларысы Хлебнікавай была вялікая актывістка, і яны зьбіралі ўсіх выдатнікаў гораду. І вось гэтая мая канкурэнтка Ларыса мне ў школе кажа: «Я не думаю, что тебя туда пригласят». Я гэтаму не надаў вялікага значэньня, але сказаў маці. «Ну й добра, бо там напэўна будуць больш дзяўчаткі…» Маці сказала так, відаць, не падумаўшы, што выдатнікамі бываюць не адны дзяўчаткі. Але я скеміў, што тут «нешта такое», аб чым лепш не гаварыць. Пра гэта пазьней ніколі не ўспаміналі ні тая Ларыса, ні я. Але ў школе былі чуткі, што ў Доме Чырвонай Арміі адбылася вечарына выдатнікаў, і яны прадстаўлялі нацыянальнае жыцьцё СССР. (Я ў Доме Чырвонай Арміі ніколі ня быў, ніколі да тае «эліты» не далучаўся. Нешта ўнутранае трымала мяне бліжэй да вуліцы, дзе дзятва кпіла з «эліты», але даставалася і выдатнікам.) Падобныя вечары ў горадзе адбываліся і раней – у іншых клюбах, у Доме настаўнікаў – і мы заваёўвалі прызы. Наша школа аднойчы ўзяла першы прыз, а верш я дэклямаваў такі:

Я – ненец, приехал из Каинской тундры,
Путь мой был далёкий и трудный,
А теперь расскажу про снега, про морозы,
Про стада, про оленьи колхозы.
Раньше в тундре водилось так:
У кулака-самоеда стадо,
А ты не в счет, самоед-бедняк,
Тебе оленей не надо…

І я ўзяў першае месца!

Кіно, тэатар, клюбы, паркі

У Налінску кіно практычна не існавала. Быў у горадзе адзін клюб, часам прывозілі апарат для кінапраекцыяў, але ўсё было ня надта дапасаванае. А прыехалі ў Арол – там было кіно: тры кінатэатры, пасьля чатыры, а пасьля яшчэ збудавалі і пяты. І вось мой першы кантакт з кіно ў Арле: верасень 1935 году, кінатэатар «Молот», недалёка ад Акі, і каб да яго дайсьці, трэба было перайсьці мост праз Аку, а тады яшчэ мосьцік да кінатэатра. Я – толькі прыехаў з Налінску, яшчэ

зусім «неацёсаны» – іду праз мосьцік, каб купіць білет. Падыходзяць два хлопцы і кажуць: «Мы знаем, что у тебя не хватает денег на билет». Я кажу: «Да нет, хватает!» – і паказваю жменю, а яны – бац па жмені! – падбілі, і мае грошы рассыпаліся, яны пахапалі грошы і ўцяклі, а я застаўся і безь білета, і бяз грошай. Вось так арлоўскія пацаны сустракалі незнаёмцаў.

Рэпэртуар у кіно мяняўся кожны тыдзень. Чатыры кінатэатры – чатыры новыя фільмы штотыдня. На кіно была вялікая рэкляма, паўсюль былі афішныя стэнды. У кіно хадзілі літаральна два-тры разы на тыдзень, білет каштаваў 50 капеек – грошы ня надта вялікія, але й не малыя, прыкладам, поўны абед у школе – суп, каша, катлета і яшчэ шклянка кампоту – каштаваў 1 рубель 15-20 капеек. Кіно мела велізарны ўплыў, асабліва песьні, калі ў кіно сьпявалася песьня, асабліва які Ўцёсаў або Арлова, то назаўтра гэтыя песьні сьпяваюць усе вучні...

У Арле мы з маці часта хадзілі і ў тэатры. Хоць горад ня быў вялікі інтэлектуальны цэнтар, але там былі два тургенеўскія тэатры – вялікі гарадзкі і маленькі ў Тургенеўскім доме. Маці мая тэатар вельмі любіла, бо й нарадзілася каля тэатру, дык мы зь ёй амаль кожную нядзелю бывалі ў тэатры, хоць білеты былі досыць дарагія – якіх рублёў 10. Пасьля тэатру звычайна заходзілі ў «Росконд» або які іншы рэстаран – паесьці.

Былі ў Арле розныя клюбы, але я туды хадзіў толькі раз на год – зімой на ёлачку, бо там задарма давалі падарункі – сходзіш у Клюб Чыгуначнікаў, Клюб Настаўнікаў – і атрымаеш мяшочак з цукеркамі.

Летам адчыняўся Гарадзкі сад, недалёка ад Арлоўскага цэнтралу. У садзе былі танцпляцоўкі, я імі мала цікавіўся. Але ў гэтым садзе былі таксама карусэлі, і праезд каштаваў 10 капеек. Карусэлі яшчэ не былі электрычныя, трэба было круціць: дзесяць разоў пракруціш – табе даюць адзін праезд дармовы. Дык ты паўдня круціш – за 20-30 праездаў... Я гэта вельмі любіў. Ужо ў чэрвені, як ёсьць свабодныя дні, дык ідзеш у парк, падыходзіш пад карусэль і просіш: «Дяденька, возьмите меня!» А ня ўсіх бяруць, бо трэба крэпкія, там наверсе бэлькі, і на іх трэба ціснуць, бегчы зь імі і круціць – тады круціцца той круг, на якім тыя конікі езьдзяць. У карусэлях мэханізм кручэньня быў наверсе – усё было зацягнута брызэнтам, публіка нічога ня бачыла.

Бібліятэка

Я ад другой клясы быў запісаны ў Пушкінскую бібліятэку, якая знаходзілася каля моста праз Орлік на вуліцы Ленінскай, і вельмі часта – літаральна кожны тыдзень – туды хадзіў. Працаваўшы пазьней у амэрыканскіх бібліятэках і ведаючы амэрыканскія школьныя

бібліятэкі, магу сказаць – ёсьць значная выхаваўча-навучальная розьніца паміж савецкімі і амэрыканскімі бібліятэкамі. У савецкай школьнай бібліятэцы бібліятэкары (у 99% – бібліятэкаршы) рэкамэндавалі літаратуру і амаль загадвалі вучням – бярыце гэта і чытайце. І калі вяртаеш кніжку, бібліятэкарка магла ў цябе папытацца: хто ў кнізе героі, што табе спадабалася – быў непасрэдны кантакт бібліятэкара з чытачом. У амэрыканскіх бібліятэках гэтага амаль няма.

Дык вось, у бібліятэцы, дзе я ад другой клясы пазычаў кніжкі, нам паказвалі савецкую моц на прыкладзе герояў кніжак. У адной кніжцы быў пагранічнік Карацупа, недзе ў Малдавіі, дык ён так бароніць савецкую граніцу, што мы можам быць пэўныя: нічога ня можа здарыцца. Але ёсьць фашысты, якія неяк пралазяць, і гэтых фашыстаў трэба пілнаваць, бо яны вельмі хітрыя. І нам падсоўвалі адпаведныя кніжкі – можа, зь дзесяток – былі нават пераклады зь нямецкай мовы: напрыклад, жанчына, якая жыве ў Бэрліне, у яе дзіцёнак, ёй цяжка, яна беспрацоўная, яна кладзе гэтага дзіцёнка спаць, адчыняе газ, выходзіць з кватэры і кідае ключы ў канал ці ў Шпрэю… Гэтак нас падрыхтоўвалі наконт таго, што робіцца ў Нямеччыне.

А пазьней пачалі ўжо крыху інакш пра немцаў гаварыць і пісаць – у тым сэнсе, што трэба зь імі быць асьцярожнымі, што яны настроены супраць савецкага народу. І яны нагэтулькі настрапалілі, што немцы могуць быць вельмі злосныя, што калі немцы прыйшлі ў Арол, я закапаў свае кніжкі! У мяне была кніжка «Черемыш – брат героя» пра слаўнага хакеіста, яшчэ пару кніжак, і я думаю – як будуць шукаць і знойдуць камуністычную літаратуру… Дык я й закапаў.

Кола чытаньня

Але савецкія кніжкі, прынамсі ў маёй 26-й школе, былі не адзінае, што людзі чыталі. Па руках хадзілі старыя кніжкі царскага выданьня: Майн-Рыд, Фэнімор Купэр, вельмі «хадавы» і папулярны Шэрлак Холмс… Мне неяк далі кнігу Купэра пад вялікім сакрэтам, і я ў той кнізе ўпершыню ўбачыў яці, цьвёрдыя знакі – літары, значэньня якіх я ня ведаў, але чытаў цэлыя словы, і выходзіла складна. І гэтыя старыя кнігі былі вельмі чытэльныя, асабліва Купэр – «Скураная панчоха», індзейскія апавяданьні.

А з савецкіх кніг бібліятэкаркі заўсёды стараліся даць «Дикую собаку динго или повесть о первой любви», дзеці гэта любілі і чыталі, але пры гэтым дадуць яшчэ дзьве-тры кніжачкі – пра Карацупу, пра Стаханава – абавязкова трэба было нешта такое ўзяць, бо калі здаеш, бібліятэкарка можа папытацца, і не пра дзікую сабаку, а якраз пра Стаханава.

Каго я яшчэ любіў зь пісьменьнікаў – Маміна-Сібірака, Станюковіча. Вельмі любіў Гогаля. «Тараса Бульбу» я чытаў, можа, пяць разоў.

Жывучы ў Арле, ты мусіў абавязкова прачытаць усё пра Тургенева. Абсалютна ўсё, бо ён сам быў арлоўскі. «Дваранскае гняздо» – у самым Арле, над рэчкай Орлік. Пра Тургенева ў горадзе часта бывалі розныя выстаўкі – то там, то сям. Я чытаў «Муму», «Хаджы-Мурат» – мне не спадабалася.

Вельмі папулярная была кніга А. Талстога «Князь Серебряный» – таксама царскага выданьня: хадзіла па руках, абадраная, паклееная – але яна чыталася.

У арлоўскай бібліятэцы беларускіх кніжак не было, але на той час я ўжо быў прачытаў і «Палескія рабінзоны», нешта Лынькова – пабеларуску, падчас летніх побытаў у Менску. Хоць пазьней, калі бацька вярнуўся з ссылкі і запытаўся «Ці ты чытаеш беларускія кніжкі?», дык я падумаў – нейкі дзівак ненармальны, адкуль у Арле беларускія кніжкі? Маці ў часе летніх паездак у Менск купляла беларускія кніжкі, а потым лёгенька змушала чытаць.

Зь бібліятэкай у мяне былі вельмі добрыя дачыненьні. Бібліятэка была недалёка ад школы, хвілін восем хады. Мусовы быў, безумоўна, Мікалай Астроўскі. Я прачытаў «Как закалялась сталь», але ніколі сябе не асацыяваў з Паўкам Карчагіным. Абавязковы быў Фурманаў (з Чапаева і Пецькі і ў мае часы жартавалі, але ня так шырака, як я пачуў у Менску ў 90-х!). Цярпець ня мог Горкага. Яго я позна пачаў чытаць, можа, у чацьвертай клясе…

Я вельмі любіў паэзію – Някрасаў, ня толькі «Железная дорога», але і іншыя вершы… «Плакала Саша, как лес вырубалі, ей и теперь его жалко до слёз, сколько там было кудрявых берез…» – гэта на мяне рабіла ўражаньне. Я помню, як я прачытаў – «… и танцевали на ней, чтобы к земле прилегла поплотней…» – і ўсё дзівіўся, чаму ім так трэба было тую яліну зламаць?

Вельмі любілі Жуля Вэрна – «80000 кілямэтраў пад вадой» чыталася зь вялікім апэтытам. Добра чытаўся Дзюма, Гюго – «Мушкецёры», «Адрынутыя».

Нацыянальны мамэнт у расейскай літаратуры

Да іншых расейскіх пісьменьнікаў-клясыкаў я, ясна, тады быў яшчэ не даросшы дык надта да іх і не цягнуўся. Вельмі адмоўнае ўражаньне на мяне асабіста зрабіў такі эпізодзік.

Помню, я тады сядзеў на адной парце з рускім хлопцам Жэнькам Русанавым, здаецца, у трэцяй ці чацьвертай клясе. Мы чытаем у Лермантава: «И злой чечен ползет во мраке и точит свой кинжал…», і мне Жэнька Русанаў падсоўвае кнігу, а там падкрэсьлена слова «кинжал». А я ня ведаю, пра што там. Тады на перапынку ён

пытаецца: ці ты прачытаў, што там напісана? Кажу, так. А ён пытаецца: чаму, ты думаеш, ён чачэна туды ўзяў? Ну, я ня ведаю. Значыць, ёсьць нейкія людзі, якія точаць кінжал… Крыху пазьней, калі мы праходзілі гісторыю заваяваньня Каўказу, Шаміля, усё ўстала на свае месцы, але ў той час на мяне гэта зрабіла непрыемнае ўражаньне, што нехта недзе хоча рэзацца, калі точыць кінжал. Гэтак першы раз празь літаратуру да мяне дайшло, што на Каўказе «рэжуцца», што ёсьць жывая нацыянальная варожасьць.

Такія самыя меркаваньні паўставалі ў маёй галаве, калі я чытаў пушкінскае «оставьте, это спор славян между собой», ды яшчэ нешта нацыянальнае, нерасейскае, заставалася ад Гогаля – асабліва ягоны «Астап». Праўда, усіх гэтых нацыянальных пэрсанажаў было яшчэ недастаткова, каб убачыць імпэрыялістычнасьць расейскай літаратуры.

Непрыемнае ўражаньне пакінуў Някрасаў сваім «колтун в волосах... изможден лихорадкой высокорослый больной белорус». Калі я пра гэта сказаў маці, яна раззлавалася, сказала мне менш задумвацца над кожным радком і ... «іншым падабаецца». Відавочна, Марыя Васілеўна пабойвалася, што ў мяне ў галаве могуць зьявіцца нейкія «крамольныя» думкі.

Прадукты

Забесьпячэньне прадуктамі было хвалямі: то прадуктаў поўна ўсякіх – і мандарыны, і ласось, і ікра (бананаў, праўда, тады не было, я іх першы раз пабачыў пасьля вайны ў Бэльгіі), а пасьля прадукты прападаюць і месяцаў пяць нічога няма. Так што з прадуктамі бывала сапраўды цяжкавата. Я заўсёды меў у кішэні 10-20 рублёў, установка была такая: калі што «даюць» – бяжы і бяры, бо пасьля ня будзе! Памятаю адзін раз: бягуць. «Что дают?» – «Сахар!» – «Где?» – «В Рыковском!» (гэта быў стары царскі магазын, пасьля імя Рыкава, а ў 1930-х Рыкава расстралялі, а магазын называлі па-старому). Пабег я ў гэты Рыкаўскі магазын, стаў у чаргу. Цукар даюць – па кіляграме на душу, але трэба мець сваю паперу, а ў мяне няма. Тады я бяру сваю зімовую шапку – ну, добра, наклалі мне ў шапку. І можна было абярнуцца яшчэ раз – я абярнуўся, прарваў кішэні ў паліто, уклаў туды гэты кіляграм цукру (цукар быў «кускавы» – рафінад) і пайшоў у шапку яшчэ кіляграм узяў… І так часта бачыш па горадзе: туды бягуць, сюды бягуць, і я таксама заўсёды бегаў – у любую чаргу.

Маці шмат чаго купляла на рынку, безумоўна, рынак быў шмат чым даражэйшы – там было мяса, масла, але ж ня ўсё – цукру на рынку ня купіш.

Як прыпамінаю, былі пэрыяды, калі прадуктаў, нават прывазных, было многа. Памятаю, збудавалі новы рыбны магазын – прыбудавалі да Гандлёвых радоў. І ў гэтым новым рыбным магазыне наўкола

сьценаў былі акварыюмы, і там плаваюць рыбы! Акварыюмы падзеленыя перагародкамі, у адным аддзеле карпы, у другім акуні. Гэты магазын існаваў цэлы год – гэта было недзе ў 1938-м, а пасьля сярэдзіну магазыну перабудавалі, пачалі прадаваць нешта іншае.

У нашым раёне – 2-й Курская, Перасыханка, Навасільская – дзеці былі бедныя, есьці не хапала. На думцы ў бальшыні дзяцей было – як паесьці. А раён наш быў досыць жывы. Непадалёк былі вайсковыя баракі, курскія вуліцы вялі за горад у калгасы, дык асабліва восеньню праз наш раён праяжджала шмат вайсковых абозаў: Чырвоная армія рабіла запасы. Абозы ехалі ў калгасы, куплялі там бульбу і ехалі назад у горад, у свае часткі – танкісты ў вучылішча, пяхота ў баракі і гэтак далей. І вось едзе чырвонаармеец на фурманцы, а ззаду на іх былі фортачкі, пацан падбяжыць, адчыніць акенца – і бульба сыплецца! І пацан бяжыць зь мяшком і зьбірае тую бульбу і ўцякае, а чырвонаармеец сядзіць – яму напляваць. Я ў такіх «акцыях» ня ўдзельнічаў, але «вуліца» пілнавала, дзе едзе вайсковы абоз і што вязуць – буракі, яблыкі, бульбу. Вазілі яны і жмыхі – змолаты для каня авёс і яшчэ нейкія зярняты, людзі з тых жмыхаў рабілі аладкі і елі – тыя жмыхі былі круглыя, некаторыя пралазяць у фортачку, а некаторыя – не, але часам і палова возу вываліцца тых жмыхаў. Дзеці «прамышлялі» – ня ведаю, як пасьля разьлічваліся вазьніцы-чырвонаармейцы...

Зімой мы, дзятва, часта езьдзілі, прычапіўшыся, на каньках. За трамвай прычапіцца цяжка – бо рэйкі, брук. А калі за вясковы воз прычэпіься кручком, дык можна і пугай атрымаць. А чырвонаармейцу ўсё роўна, калі ты толькі пасьпееш круком зачапіцца, то можаш зь ім ехаць хоць пяць кілямэтраў.

Наагул з арміяй дачыненьні ў людзей былі нядрэнныя. Да вайскоўцаў часта хадзілі, таньней куплялі ў іх авёс – а тыя з радасьцю прадавалі і клалі грошы ў кішэню.

Асабліва ў Арле было шмат танкістаў, але тыя мала што мелі на продаж. Танкісты хадзілі ў прыгожых уніформах, у цёмных шынялях, падцягнутыя. А за горадам стаяла пяхота, ня ведаю, што яны там рабілі, але ў горад прыяжджалі вазамі.

(Бывала, што вайскоўцы паміж сабой і біліся – напрыклад, на стадыёне, калі выйгравала супраціўная каманда. Трэба сказаць, што стадыён і каток былі, бадай, самыя папулярныя месцы ў горадзе.)

У базарны дзень маці заўсёды старалася пайсьці на базар недалёка ад школы і купіць масла, бо ў магазынах масла было радзей і даражэйшае, а на базары можна было купіць таньнейшае і лепшае, заўсёды сьвежае і большы выбар, у лапуховых лістах, заўсёды смачнае. На рынках была прыватная ініцыятыва, там прадавалі печанае – макаўкі, кулічы, ватрушкі. Базарны дзень быў серада, я часта ішоў з маці, у яе была вялікая торба, яна накупіць, а дахаты ўжо нёс я.

У таго суседа Івана Радзянкова быў выкапаны склеп, і яны

дазвалялі нам пакінуць там масла, стаяла там і наша малако, што прыносіла зь вёскі жанчына Сьцепаніда.

Салодкае

Вельмі часта, як канчаліся заняткі ў школе, я ішоў або ў кіно на першы сэанс (сэансы а 3-й, 5-й, 7-й і 9-й гадзіне), або калі канчаў раней, то заставаўся ў школе, і пасьля мы з маці ішлі ў «Росконд» – магазын кандытарскіх вырабаў, там можна было выпіць гарбаты, зьесьці торту «напалеон», але вырабы ў «Росконде» былі дарагаватыя.

З цукерак самыя папулярныя былі барбарыскі і лімонныя корачкі, бо яны былі дзешавейшыя – нешта 2 рублі кіляграм, а кіляграм лімонных корачак – гэта паўвядра. У той час былі яшчэ і прыватнікі, і на рагах стаялі латкі, трымалі іх пераважна яўрэі, у іх можна было купіць ледзянца-пеўня за 10 капеек, пісталет за 50 капеек, але пісталет я ніколі ня браў – як ты будзеш яго смактаць, калі ты яго ў руцэ трымаеш? Былі макавыя ірыскі. Прыватнікі былі вельмі папулярныя сярод школьнікаў.

Самыя дарагія ў той час былі «мішкі» зь менскай «Камунаркі», яны прадаваліся па цэлым Савецкім Саюзе – дзе ні едзеш, яны ўсюды ёсьць. «Мішкі» былі дарагія, і я ня ведаю, хто іх купляў. Мы з маці іх не куплялі, маці наагул надта на салодкае не «націскала».

Трамвай

Трамвай у горадзе быў, былі дзьве вуліцы – Пушкінская (былая Навасільская) і Ленінская (былая Балхаўская) – па якіх, ня ведаю ад якіх часоў, хадзіў трамвай, казалі, што бэльгійскі. Гэтаксама вельмі старая была трамвайная лінія ад вакзалу да цэнтру гораду. А недзе ў 1937–1938 годзе, калі Арол зрабіўся абласным цэнтрам, праклалі трамвайную лінію па 2-й Курскай, дзе мы жылі. Гэта была даўгая – пару кілямэтраў – вуліца, якая ішла ў гару, вельмі густа заселеная, і было добра прадумана, бо трамваі там пустыя хадзіць ня будуць. Дык ужо ў першыя дні ня тое, што на падножках стаялі і віселі – але пазалазілі і на страху! І міліцыя ня ведае, што рабіць – трамвай стаіць, а «пасажыры» на страсе сядзяць і кажуць, што няма закону, што нельга на страсе езьдзіць. Але ўрэшце іх зьнялі, а пасьля на трамваях, што хадзілі па 2-й Курскай, усталявалі такія слупкі з дротам, каб людзі не залазілі на страху. Хадзілі трамваі кожныя 15 хвілін. Натоўп на прыпынку заўсёды чакаў вялікі, як трамвай пад'едзе – бралі з боем. (Гледзячы на трамвайныя прыпынкі ў Менску, асабліва ў 90-х гадох на прыпынак «Бялінскага», дзе ў трамвайны вагон, як і ў Арле ў 1930-х, залазяць «з боем», я ня мог зразумець – чаму

людзі не становяцца ў чаргу і па чарзе не заходзяць у трамвай? Так я «перажываў» у ЗША, калі амаль 30 гадоў карыстаўся аўтобусам для даезду на працу ў Нью-Ёрк. Чарга на маім прыпынку фармуецца вось ужо блізу 80 гадоў!) Вагоны былі малыя, старамодныя, унутры шмат непатрэбнай мэблі, розныя слупы, дэкарацыі, упрыгожаньні, разьба.

Дзед

Дзеда зь Менску мы прывезьлі ў зіму з 1938 на 1939 год. Нам суседзі далі тэлеграму зь Менску, што хату ў дзеда забралі, дзед хворы. Дык мы паехалі ў Менск і прывезьлі дзеда ў Арол. Дзед вельмі наракаў: «Куды ты мяне прыцягнула? Ты, Манька, дурная, а я думаў, што разумная... Чаму ты мяне забрала зь Менску?» Ну, зь Менску трэба было забраць, бо ён быў ужо паралізаваны, праўда, мова ў яго вярнулася і ён трохі рухаўся, але жыць сам ён ужо ня мог, а ў Менску не было з кім яго пакінуць – таму мы яго і забралі. Рашэньне нялёгкае, але маці так вырашыла.

Зь дзедам ужо я мусіў гаварыць па-беларуску. Паколькі ён быў крышку паралізаваны, мова ў яго, калі й была раней мяшчанска-гарадзкая трасянка, то пасьля ўдару ўжо была чыстая беларуская мова. Слоўнік быў вельмі абмежаваны, але гэта была беларуская мова, і я зь ім пару гадоў меў добрую практыку – ён памёр у 1942 годзе.

У нас зь дзедам бывалі канфлікты, бо ён любіў выпіць – калі прынясуць пэнсію, дык ён мяне пасылае: «Купі чацьвяртуху» – казаў ён заўсёды, але я не купляў, бо маці моцна сварылася, ды мне й не прадалі б як непаўналетняму. Ён курыў, дык маці не дазваляла купляць і папяросы. Дзецям і так не прадавалі ні папяросаў, ні гарэлкі, дык даводзілася некага прасіць, каб купілі, так што папяросы я яму забясьпечваў. Маці папрасіла гаспадыню Марыю Іванаўну, каб яна раз на дзень яго карміла, дык яна варыла яму суп, ці катлету, ці кашу, за што маці ёй дадаткова плаціла яшчэ рублёў пяцьдзясят. Гэта значна аблягчала маю сытуацыю, бо раней я мусіў, прыйшоўшы з школы, заўсёды пакарміць дзеда, а так я меў вольны час дацямна.

Так мы зь дзедам жылі ў адным пакоі трох. Пакой быў 15-18 мэтраў квадратных – ложак, кушэтка, раскладушка для мяне, дзьве этажэркі з кнігамі і дзьве клеткі з птушкамі. Рэчы – бялізна, кашулі – віселі на сьценах, прыкрытыя прасьцінамі.

Дзед, безумоўна, памятаў мала, але гаварыў – пераважна пра «ціятры», якія там бывалі «гаспада» – гэта было ўсё ягонае жыцьцё. Даваў ён мне і цікавыя лекцыі пра бацьку – бачыш, кажа, твая маці не такая разумная, вось Насьця была разумная, яна выйшла замуж за «ваеннага», а твая за каго... хто яго ведае, што за ён, «процію уласьці нешта хацеў, і цяпер ты – сын арыштанта, вот табе і на»... Але

гэта ўсё было больш жартам. І яшчэ расказваў, што для ўсіх было новае: калі бацька пасяліўся на Горным завулку, усе мусілі зь ім гаварыць толькі па-беларуску. Я тады яшчэ не зусім разумеў, што за гэтым стаіць, думаў – ёсьць Беларусь, дык мусіць быць і беларуская мова, хоць я ўжо і чуў, што па-беларуску гавораць ня ўсе.

Гэты пэрыяд, калі хворы дзед жыў з намі, быў досыць напружаны – усё ж хворы чалавек, за ім трэба было даглядаць. Але і гаспадыня дапамагала, кожны месяц прыяжджаў доктар, часам даводзілася выклікаць доктара дадаткова – паглядзець вочы ці іншыя праблемы. Вядома, у Менску гэта было б крыху лягчэй – там была цэлая хата, а ў Арле мы ўсё ж былі чужыя людзі і жылі ў адным маленькім пакойчыку.

Далучэньне Заходняй Беларусі

17 верасьня 1939 году. Вучняў, усе клясы, цягнуць у гімнастычную залю, дзе дырэктар афіцыйна чытае з паперкі: сёньня доблесная Красная армія перакрочыла граніцу і вызваліла беларускі і ўкраінскі народы ад польскага ярма. У залі стаіць больш за тысячу вучняў, усе крычаць «Ура!» Вучні зразумелі, што адбыўся наступ на Польшчу, бо палякі дрэнна ставіліся да ўкраінцаў і беларусаў, і Савецкі Саюз больш ня мог гэтага цярпець. І мы ўсё гэта падтрымоўваем, бо калі беднага і слабога б'юць, яму трэба дапамагчы. У вучняў узьняты настрой – пару лекцыяў адмянілі.

Дробная, але характэрная дэталь палітычнай атмасфэры таго часу – я ўжо быў у 4-й клясе, і шмат хто з нас вельмі інтэнсіўна займаўся ў гуртку «Юны варашылаўскі стралок». Былі ў нас і некаторыя вымогі «Варашылаўскага стралка», адна з іх – трэба было два разы на тыдзень хадзіць у цір і там набіраць стрэльныя ачкі. І вось 17 верасьня 1939 году якраз выпала на такі дзень.

У ціры спачатку была лекцыя аб зброі, потым ішлі на стрэльбішча: гэта вялікая заля з байніцамі на ўзроўні падлогі, а адтуль мэтраў за 100-150 мішэні. І па гэтых мішэнях стралялі, звычайна з дробнакаліберкі. Інструктар быў побач. Мішэні мяняліся, але ачкі заставаліся – гэта заўсёды былі лічбы: выбіў гэтулькі – гэтулькі атрымаў ачкоў.

А ў той дзень было інакш: над мішэнямі вісеў лёзунг: «Из 100 возможных – 100 вельможных». Так што мы ўжо білі па людзях з карыкатурнымі тварамі! Замест мішэні выскокваў твар «пана», і па гэтым твары мы стралялі. Пасьля пана замяніў «белафінскі бандыт Манэргейм». Дзеці ўсё ўспрымалі спакойна, але на мяне гэта зрабіла адмоўнае ўражаньне: як жа гэта – страляць па людзях? Чатыры дні перад тым мы стралялі па мішэнях, выбівалі ачкі, а цяпер нас ужо вучылі страляць па людзях. Мне гэта было непрыемна, я помню, што я ўвечары сказаў пра гэта маці, а яна: «Калі табе не падабаецца, дык

не хадзі». Але ж я хачу значок мець, як гэта – не падабаецца… Ну дык, кажа, рабі, што ад цябе патрабуюць.

(Значок «Юны варашылаўскі стралок» я атрымаў неўзабаве перад вайной, але далі мне паперкі, што я ўжо здаў некаторыя вымогі і на «Варашылаўскага стралка», бо былі дзьве катэгорыі – ЮВС і ВС. Яшчэ былі значкі ПВХО – «Противовоздушная химическая оборона», БГТО («Будь готов к труду и обороне»), ГТО («Готов к труду и обороне»). Быў такі жарт сярод вучняў: «Ты сдал на БГСЯК?» – «Нет, а что это такое?» – «Будь готов слону яйца качать!» Былі значкі і менш значныя – нейкія сьледапыты.)

Пасьля таго, як было абвешчана, што савецкія войскі перайшлі мяжу Польшчы, пару дзён былі спэцыяльныя лекцыі для ўсіх вучняў – нас зьбіралі ў гімнастычную залю, і сам дырэктар Ільлюшын – «Мішка-Фараон» – чытаў нам, як жылі «угнетенные братья», як ім будзе цяпер. І тады я ўпершыню пачуў нешта і пра беларускую літаратуру, бо лекцыі былі даволі зьмястоўныя. Такіх лекцый, здаецца, было пяць, цэлы кастрычнік мы па групах хадзілі раз ці два на тыдзень. Так Заходняя Беларусь для мяне напоўнілася зьместам, бо дагэтуль была толькі геаграфічным паняцьцем.

У лістападзе 1939 былі два вялікія зборы цэлай школы, дзе нам тлумачылі, што будзе адбывацца ў Беластоку – Народны сход, які вырашыць аб далучэньні Заходняй Беларусі да СССР. Дзеці пляскалі ў далоні, была нават мастацкая частка – выступаў сьпеўны гурток, тады я ўпершыню пачуў са сцэны ў школе беларускія песьні. Усё гэта было праведзена досыць масава па ўсіх школах у горадзе, і тады шмат хто даведаўся пра Заходнюю Беларусь і Заходнюю Ўкраіну. Ня памятаю, ці неяк асьвятлялася асобна пытаньне Вільні, здаецца не. Прынамсі, пра Вільню нічога не ўспаміналася.

Я часта хадзіў на вакзал, бо там былі прадуктовыя ларкі, сталоўка, дзе можна было таньней паесьці, дык памятаю, што там віселі лёзунгі – «Принимаем в наш общий союз братьев-украинцев и братьев-белорусов» ці нешта падобнае. На вакзале часта віселі палітычныя лёзунгі, бо Арол быў важны чыгуначны вузел, адтуль ішлі цягнікі на поўдзень, на поўнач, на захад, таму палітычная прапаганда там была пастаўлена на шырокую нагу.

У школе кампанія была праведзеная хоць і аднабакова, але досыць інфармацыйна, бо я пасьля гаварыў зь дзецьмі і на вуліцы, і на рыбалцы, у мяне нават дзеці пыталіся, ці ёсьць у мяне родзічы ў Заходняй Беларусі, я кажу – не, нікога няма…

Была яшчэ пушчана такая «качка», што ў горад прыедзе беларускі пісьменьнік і польская пісьменьніца Ванда Васілеўская, было, здаецца, паведамленьне ў газэце «Орловская правда», але ніхто зь іх так ніколі і не прыехаў.

Чэргі, натоўпы і канвоі

У сувязі з чэргамі, натоўпамі і канвоямі мне прыпомніліся пару здарэньняў, якія заселі ў памяці вельмі яскрава і нечым адрозьніваюцца ад «звычайных» гісторыяў у чарзе. Мушу падкрэсьліць і гэткае: для жыхара Арла канвоі былі амаль штодзённым зьявішчам. Справа ў тым, што Арлоўскі цэнтрал знаходзіўся на адным канцы гораду, а вакзал – на другім. Арыштаваных з эшалёнаў вялі ў цэнтрал праз увесь горад, бо быў толькі адзін вялікі мост – Красны мост, які злучаў абедзьве часткі гораду і не разьбіраўся на час ледаходу. Канвой вялі праз самы цэнтар гораду, і гэта займала пару гадзінаў.

Пачатак кастрычніка 1939 году. Настрой у жыхарства нэрвовы – пару тыдняў перад тым, у верасьні, савецкія войскі напалі на Польшчу (людзі казалі менавіта так – «напалі», хоць прапаганда трубіла, што «вызвалілі братоў беларусаў і ўкраінцаў ад панскай няволі»). На вуліцы Маскоўскай, непадалёк ад былога Глагольеўскага гастраному, стаіць вялікая чарга каля хлебнага магазыну: «прывезьлі і даюць хлеб». Ясна, чарга на тратуары, а ў той самы час па вуліцы гоняць калёну польскіх палонных. Было ўжо халаднавата – яны ў абмотках. Пазнаваліся тыя палонныя найперш па дзіўных шапках, шынялях іншага колеру, па абутку. Выглядае калёна стомлена і замучана. Гэтых палонных гналі шмат, думаю, іх усіх гналі ў Казельск, які быў недалёка, па дарозе на поўнач на Тулу.

Мінуўшы хлебны магазын і чаргу пры ім, канваіры дазволілі калёне спыніцца і... тры-чатыры палонныя адлучыліся ад калёны і, выцягнуўшы наперад рукі з шапкамі, пайшлі ўздоўж чаргі, выгаворваючы з акцэнтам: «Ради Христа, братья, подайте, шесть дней не ели, ради Христа просим!»

Гандляры нічога не казалі, а ў шапкі ляцелі рублі, пяцёркі, манэты. Я кінуў апошнюю, сьціснутую ў кулаку, пяцёрку. Хутка шапкі напоўніліся грашыма. Палонным было дазволена – прапусьцілі без чаргі! – зайсьці ў магазын. Там яны купілі буханак 10-15, а мо й болей, хлеба, паразразалі той хлеб, раздалі – і калёна рушыла. І толькі тады пачала рухацца «звычайная» чарга. Ня ведаю, ці ўсім хапіла хлеба, бо я пайшоў дахаты – бяз хлеба і бяз грошай. Затое, расказаўшы маці пра здарэньне, атрымаў ад яе ў адказ: «Маладзец, сынок» і моцны пацалунак у лоб.

Я бачыў толькі адно такое здарэньне, але казалі, што такое ў горадзе здаралася часта.

Другое зьвязанае з арыштантамі здарэньне ў чарзе, якое я назіраў і якое мне сапраўды ўрэзалася ў памяць, было такое. Навагодні (чытай: калядны) сэзон 1940 году. Незадоўга перад тым улады дазволілі ставіць навагоднія (калядныя) ялінкі, адчыніліся спэцыяльныя магазыны навагодніх цацак. Адзін такі магазын адчыніўся

ў Арле ў вельмі бойкім месцы – на скрыжаваньні Маскоўскай, 5-й Курскай, Пушкінскай і яшчэ адной (назвы ня памятаю) вуліц побач зь Першамайскім сквэрам. Вельмі-вельмі жывое і людное месца. Я быў у магазыне з цацкамі і раптам чую крыкі: «Ни с места!», і некалькі міліцыянтаў літаральна ўрываюцца ў магазын. Я гляджу празь вялікае акно на вуліцу, стаю амаль па стойцы «сьмірна» і бачу на вуліцы калёну арыштантаў, якія стаяць на каленях, а паўз калёну ходзяць чырвонаармейцы з аўчаркамі. Публіка стаіць на тратуары, а ходзяць адны міліцыянты. Такая сытуацыя працягвалася хвілін 10-15 – усё цывільнае стаяла нерухома, а арыштанты на каленях. Хвілін праз 20 міліцыянты ў магазыне дазволілі рухацца, калёна паднялася з каленяў і рушыла ў напрамку «Краснага моста».

На маё запытаньне ў міліцыянта на вуліцы – што гэта было, той ціхенька, прыкладаючы пальцы да вуснаў, сказаў – спроба ўцёкаў з калёны. На маё другое пытаньне – ці злавілі, адказ быў яшчэ цішэйшы – здаецца, не.

1939-1941. Фінская вайна

Ад 1939 да 1941 году ў дзяцей быў неспакойны настрой, шмат было сем'яў, зь якіх нехта быў забраны ў армію. Далучэньне Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ўсе віталі, сярод дзяцей адчуваўся ўздым – Чырвоная Армія ідзе, усіх вызваляе з барабанным боем. Але пасьля раптам выбухнула фінская вайна, і яна рабіла адваротнае ўражаньне. Зь людзей, якія былі ў арміі, мы шмат каго ведалі – і былі такія, што не вярнуліся. Людзі прападаюць, вайна доўга цягнецца. Прапаганда ўсё трубіла, што мы гэтых снайпэраў – «кукушак» – страляем і страляем, а мы, дзеці, думаем – добра замаскаваны снайпэр можа шмат каго панастраляць. Пра значэньне снайпэраў нам шмат гаварылі на лекцыях «Варашылаўскага стралка». Усе інструктары падкрэсьлівалі небясьпечнасьць снайпэраў-«кукушак».

Раней казалі «врагов народа» з кніжак выкідаць, там фашысты, а тут прапаганда прымоўкла, сталася спакойнай. Два гады перад Вялікай вайной настрой у школах, прынамсі ў маёй, быў вельмі няясны, прыбіты.

У 1939 годзе мы першы раз не паехалі ў Менск, бо, па-першае, не было ўжо хаты – забралі, а па-другое, маці сказала: «Ай, я не хачу ісьці ў міліцыю, не хачу гаварыць…» Я пачаў распытвацца што і як, а маці мне кажа: «Ведаеш, сынок, пачнуць пытацца, ці я з кімнебудзь з «Западнай» не сустракалася». Дык, як я цяпер думаю, яе час ад часу выклікалі і пыталіся – з кім яна мае кантакты. А кожная паездка ў Менск азначала сустрэчы зь сябрамі, і маці не хацела ніякіх наступстваў і пытаньняў з кім, што і як. Ня езьдзілі мы ў Менск і ў 1940 годзе.

Пасьля фінскай вайны настрой у людзей быў вельмі прыгнечаны. Як гэта – мы, Савецкі Саюз, вызвалілі Заходнюю Украіну і Заходнюю Беларусь, прыпаміналі мы і «перамогі» на Хасане, сьпявалі «На Хасане наломали им бока, били-били, говорили» ну, пока...», а тут супраць гэтых белабандытаў нічога ня можам! Яны ў сваіх белых халатах на соснах сядзяць і страляюць.

Зь фінскай вайны шмат хто не вярнуўся. У нас ужо ў 1940 годзе – я ўжо перайшоў у 5-ю клясу – быў настаўнік Гвозьдзік, ён выкладаў маляваньне і крэсьленьне – яго забралі на вайну, і ён ніколі не вярнуўся. Не вярнуліся і пару галубятнікаў з 2-й Курскай.

Настаўніцкі аўтарытэт

Маці працавала вельмі шмат – першая зьмена, другая зьмена, тэхнікум, прыватныя лекцыі расейскай мовы розным «чына́м», тады яшчэ запрашалі на курсы падрыхтоўкі. Арол зрабіўся абласным цэнтрам, дык было шмат курсаў для адміністратараў, бо яны ні чарта па-руску ня ўмелі гаварыць – гаварылі вельмі няправільна, мова руская там была даволі дзіўная, і яны так і пісалі. Дык на настаўнікаў палявалі, асабліва на настаўнікаў мовы. І такім настаўнікам, як мая маці, было вельмі добра: дзьве-тры лекцыі, добра плацяць.

Мушу падкрэсьліць: у мяне з расейскай мовай было вельмі добра – цёці Каця і Паша ў Налінску добра мяне «нацягалі». А ў Арле «афіцыёз» гаварыў жудасна і нелітаратурна: «моя солнца», «моя коленка», «ряка» замест «река», «он идёть», «он кладёть», замест «он пошел» – «он пошедши». Дык настаўнікам расейскай мовы працы хапала!

Я заўсёды суб'ектыўна зь вялікай сымпатыяй стаўлюся да настаўніцтва, бо бачыў – колькі маці аддавала сваёй энэргіі, жыцьця, ведаў, думаньня, каб дзяцей выхоўваць.

Нягледзячы на цяжкасьці настаўніцкай працы ў Савецкім Саюзе, бо там трэба было быць вельмі асьцярожным з прычыны ідэалёгіі, пэўную ўладу яны мелі. У 5-й клясе ў нас быў такі выпадак. На суседняй парце праз праход ад мяне сядзеў Борка Левіт, яўрэй, я зь ім блізка сябраваў, і мы адзін з адным дзяліліся сваімі плянамі. І гэты Борка мне кажа, што наступны раз ня прыйдзе на гэтую лекцыю. Тады якраз чвэрць канчалася. І вось праходзіць міма настаўнік, і Борка яму кажа, што ня прыйдзе. Настаўнік пачынае тлумачыць, што не, што мусіць прыйсьці, а Борка паднімае крышку парты і дастае з парты фінку ды пагрозьліва паказвае настаўніку. Настаўнік яго моцна хапае за шкірку, ідзе зь ім за дзьверы і вядзе да дырэктара. Дык мы таго Борку, можа, зь месяц ня бачылі, а калі вярнуўся, дык быў ужо ціхі, як бы нічога й не было. Такі быў настаўніцкі аўтарытэт.

Каб цяпер тут, у Амэрыцы, ты ўзяў вучня за шкірку ды яшчэ даў у карак, дык цябе б можа яшчэ і ў турму пасадзілі.

Няшчаснае каханьне ў школе

Недзе пад канец 1937 ці ў пачатку 1938 году была ў нас яшчэ такая гісторыя, зьвязаная з настаўнікамі. Маці была кляснай кіраўніцай у 8-й клясе, і ў гэтай клясе адна дзяўчына – Ніна Чакмарова – улезла ў палонку на рэчцы Ацэ і ўтапілася. Ніна была школьная актывістка, зграбная дзяўчына, добрая, але ўкляпалася ў настаўніка фізкультуры – марака, які прыехаў у Арол на шэсьць месяцаў, і ў школе яго ўзялі за настаўніка. Ён не зьвяртаў на Ніну ўвагі, дык яна ўтапілася. Ну і ўзяліся за маці – дзе «бдзіцельнасьць», гэта ж «мяшчанства», «разврат», дзе «палітычнае выхаваньне»?! Але наш дырэктар «Мішка-Фараон» быў вялікая шышка (а ў Чакмаровай бацька – яшчэ большая шышка), і калі пачалі разьбірацца па партыйнай лініі, Мішка-Фараон кажа бацьку Ніны Чакмаровай: як ты партыйны, дык што ты ў маю школу лезеш, што там няма «бдзіцельнасьці»? Ну ладна, я там Марыю Васілеўну «прыціснў»… І гэтую справу замялі, праўда, маці за гэта нічога не зрабілі, бо Ільлюшын паставіў пытаньне так: сям'я – гэта першае, прычым сям'я партыйнага начальніка, калі ён дапускаў такое «мяшчанства», што дачка закахалася, а той марак ні Богу душой не вінаваты. Ну як яно – дзеўка ўявіла, што гэта «мой», а ён прыехаў з Балтыйскага флёту, у яго там недзе сям'я… Знайшлі яе толькі праз два тыдні, калі цела яе падагнала пад плаціну.

Птушыны базар. Сербіяншчыкі

У Арле існаваў птушыны базар – можа 200 гадоў – дзе прадавалі галубоў, шчыглоў, іншых птушак, трусоў, корм, клеткі. І на гэтым базары існавала свая культурная зьява – вулічныя сьпевакі-танцоры, пераважна цыганы. Яны танцавалі пад бубен і сьпявалі, а людзі кідалі ім грошы – у іх была раскладзена дзяружка – ім кідалі 5 капеек, 10 капеек.

Маці мне дазваляла хадзіць на гэты базар – праўда, пасьля «бурных» гутарак, бо спачатку ўпіралася: «На той базар ты ня пойдзеш!» Але неяк мне ўдалося перамагчы, і на птушыны базар я хадзіў досыць рэгулярна.

Базар быў раз на тыдзень – настойліва прыхіляюся да прыпаміну, што гэта бывала ў нядзелю. Ён пачынаў працу рана, гадзіне а 5-6-й, а канчаўся каля 9-10-й гадзіны. Раніцай яшчэ цёмна, людзі зь ліхтарыкамі ідуць, нясуць клеткі, расстаўляюць, разьвешваюць на спэцыяльныя «козлы». Іншыя прыяжджалі з спэцыяльнымі возікамі-

клеткамі. Былі гэта якбы прафэсіяналы. Яны сярод тыдня лавілі птушак – пераважна шчыглоў і чыжоў – недзе ў палёх за горадам.

Птушак лавілі тысячамі, пачынаючы ўвосень, калі тыя шчыглы адлятаюць. На іх ставяць сеткі-«тайнікі», пасыплюць канопляў, шчыглы садзяцца і – хлоп, якіх 50-60 папаліся, іх садзяць у клетачкі або ў вялікай клетцы прыносяць на базар і па 10-15 капеек прадаюць.

А цыганы ўвесь гэты час танцуюць – гэта была дадатковая забаўная праграма, бо на базар ідзеш ня толькі, каб нешта купіць.

І вось, помню, гэтыя «рэпэры» танцуюць і сьпяваюць такую песьню:

Базар бальшой
и народу много.
Русский барышня идёт,
дайте ей дорога…

Эй джан, дилиджан,
захады к нам в лавка,
мы торгуем баклажан
и различный травка..

(Значна пазьней у жыцьці, калі я прыпамінаў гэты куплет, то задумоўваўся – якая там магла быць траўка?)

Так цыганы сьпявалі, а я думаю – чаму яны так сьпяваюць – «русский барышня идёт»… Але пазьней, калі праходзілі ў школе Шаміля і гісторыю Каўказу, дык я зразумеў, што да рускіх асаблівае стаўленьне. Мяне самога ніхто не накручваў, але я ўжо пачынаў асэнсоўваць, што ёсьць нацыянальныя розьніцы – ёсьць Расея, і тая Расея неяк не ўспрымаецца сваёй… Сваім я сябе адчуваў толькі ў дзеда ў Менску.

На птушыныя базары прыходзіла міліцыя – ці там ня б'юцца, ці не выпіваюць. Выпіваць там ніхто не выпіваў, прынамсі я ня бачыў, а біцца дык біліся. Дык тых «рэпэраў» міліцыя адразу разганяла, бо рэпэртуар у іх быў даволі антысавецкі і вельмі народны і сацыяльны:

Базар бальшой,
купил поросенка,
всю дорогу целовал –
думал, что девчонка.

Калі міліцыя прыходзіла на базар глядзець за парадкам, дык найперш яны ішлі ці нават беглі якраз туды, дзе выступалі гэтыя сьпевакі-танцоры.

Цікава, што калі прыйшлі немцы, дык любыя зборышчы былі забаронены, а птушыны базар – не: як працаваў, так і працаваў далей.

Маці, калі пераканалася, што яна мяне не пераможа і на птушыны базар я пайду, дык хадзіць туды мне дазволіла, але чытала лекцыі – каб я не купляў тога, не купляў сёга, і калі я ўбачу, што мужчыны пачынаюць сварыцца, каб я адыходзіў. Ну, там бывалі эмоцыі – ці хто

што скраў, ці што яшчэ, ці прадасьць труску котную, а яна някотная, дык той пасьля прыходзіць і – трах у морду, што ты мне някотную прадаў! І я хадзіў і глядзеў на гэта ўсё, разявіўшы рот – мяне і птушкі цікавілі, і тое, і сёе…

Сам я меў дзьве клеткі – у адной шчыгла, у другой чыжа.

Птушак купляеш восеньню, праз цэлую зіму трымаеш, і яны пачынаюць сьпяваць. Вясной выпускаеш, каб на восень зноў купіць.

Калі ўжо прывезьлі дзеда, я сказаў, што ўсё роўна шчыгол і чыж мой застаюцца – ніяк ня вынесу, нікуды! І маці саступіла: былі мы зь дзедам і з птушкамі ў адным маленькім пакойчыку.

А фальклёр птушынага базару быў жывучы. Ня ведаю, можа на тым базары і што іншае было, але наркотыкаў ніякіх не было дакладна – я ня бачыў і ня чуў. Пра наркаманаў мы ведалі – у горадзе іх звалі «марфіністы», але на базары мне пра іх чуць не даводзілася.

Музыкі-цыганы сьпявалі з акцэнтам – і іх любілі. Адзін раз я прыйшоў на базар – а таму ўсе мужыкі рагочуць, за жываты бяруцца. Ну, трэба ж і мне ісьці паглядзець, што там. А там – музыка, бубен і сьпяваюць:

Как в нашем-то колхозе
зарезали мерина,
ели-ели три недели -
вспоминали Ленина…

І ўсе пляскаюць у ладкі… Гэта ішло, гэта любілі. Была там і мацяршчына:

Ты е**сь-е**сь, Матрёна,
никому не сказывай.
Заболит п***а и ж**а -
вазелином смазывай!

І такое сьпяваюць. Ну, міліцыя такога дазваляць ня можа… Або:

Мы по улице идем,
охаем да ахаем.
Если девку не найдём -
бабу оттарахаем.

Дарэчы, я пазьней у расейцаў пытаўся – я такіх птушыных базараў нідзе не спатыкаў, каб існавалі стагодзьдзі – а таму арлоўскаму было каля 200 гадоў. Бо пры немцах я пазнаёміўся з чалавекам, якога звалі Ягор Парамонаў, старэйшы чалавек, і аднойчы мы зь ім ішлі – немцы далі нам работу, дык гэта ён мне расказаў, што птушыны базар у Арле існуе ўжо 200 гадоў.

Базарных танцораў звалі «сербіяншчыкі», паводле песьні:

Сербиянка, моя мамка,
не ходи на улицу.
Оторвали девке сиськи –
оторвут и курицу…

Я пришел – она спала,
попросил – она дала.
Не подумай что такое -
стакан водки налила.

Сербіяншчыкі на базары былі «тэатральнай» забавай: наведнікі зробяць сваю справу – купяць-прададуць – і ідуць паглядзець на «артыстаў».

Ляжыць вялікая дзяружка, ім там кідаюць грошы, а яны мяняюцца, іх там два-тры сядзяць крышку далей. Калі міліцыя наляціць, то тыя, хто сядзяць далей, умомант хаваюцца ў натоўпе і іх няма. Міліцыя пайшла – яны нанова пачынаюць.

Міліцыя за імі сачыла найбольш, бо ў іх у рэпэртуары была ня толькі вульгаршчына, але і антысавеччына, напрыклад:

Атаман-то у нас -
Ленин Вовочка,
а верховный – бандит
Троцкий Лёвочка.

А яшчэ з бубнам, з гармонікам! І так яны прасьпяваюць штук дзесяць чыста пабытовых, а тады раз-два – і палітычнае. Міліцыя вельмі за гэтым пілнавала і часам затрымоўвала «сьпевакоў».

Мая маці за мяне баялася. Сама яна на птушыным базары ніколі не была, але падазравала, што на базары магло быць нешта дрэннае і мець на мяне дрэнны ўплыў. Алею ў агонь падлівалі і Падшывалавы: «Мария Васильевна – это же ужас! Птичьи базары – очень опасное место, туда нельзя ходить!» Але маё пакаленьне туды цягнула – якія б ні былі добрыя дзеці. Праўда, дзяцей ваенных і партыйных – як тую Ларысу – я там не спатыкаў. Але звычайныя дзеці, у тым ліку дзеці інтэлігенцыі – на рынак прыходзілі. Нешта там было іншае, незвычайнае, не такое, як усюды.

Прыпамінаецца адно цікавае здарэньне, пасьля якога базар на тыдзень зачынілі…

Птушыны базар разьмешчаны там, дзе Орлік упадае ў Аку, і часам Орлік выходзіць зь берагоў, дык там была невялікая дамба з драўлянымі бар'ерамі. І вось адзін птушкалоў на бар'еры разьвесіў крыжам – шчыглоў гарызантальна, а чыжоў вэртыкальна. І гэты «крыж» у базарныя дні вісеў там можа паўгода, аж аднойчы мы прыходзім – яго няма, а стаіць міліцыянэр.

Так насельніцтва выяўляла сваё незадавальненьне, прычым гэта была не эліта, а мяшчанства і нават ніжэй за мяшчанства – пралетарыят. І мяне ўсё гэта вельмі цікавіла, бо за дзьве гадзіны ты наслухаесься столькі – я дзівіўся, адкуль яны столькі песень ведаюць? Прычым былі і чыста мясцовыя песьні – пра горад Арол. Каля Перасыханкі была фабрыка «Прамвата», там рабілі вяроўкі, рагожу,

канаты. Вада адтуль – сіняватая, з тонкай плеўкай газы на паверхні – выцякала з трубаў у Перасыханку. Жанчыны ў той вадзе паласкалі бялізну, стоячы ў вадзе – вада заўсёды была цёплая. Часам нават была чарга, каб даступіцца да той вады. Аднойчы я праходжу каля гэтага ручая, а жанчыны палошчуць бялізну і сьпяваюць:

Стоим, кругом всё тихо,
«Промвата» лишь стучит
двигатель-коптитель,
и сажа в нос летит…

Людзі ўжо тады крытыкавалі, што гэты тэкстыльны завод поўны сажы, адкідаў у Перасыханцы – такія былі тагачасныя экалягісты. Мне і такім, як я, падлеткам было цікава гэта слухаць. Праўда, калі я прыпамінаю тую сіняватую ваду з «Прамваты», дык становіцца не па сабе – жанчыны і стаялі і паласкалі ў атруце.

Забароненае

Ці былі забароненыя кнігі? Нельга было паказваць царскія кнігі, што хадзілі па руках – нармальныя, чытэльныя кнігі. Калі табе даваў кнігу сябар – гэта было бясплатна, адзін аднаму перадавалі, але старых кніжак хадзіла шмат. У нашых суседзяў Радзянковых апрача Сямёна было дзьве дзяўчыны, старэйшая Тоня і Вера. І адзін раз Тоня мне кажа: я табе дам нешта такое пачытаць з карцінкамі. І дала мне Някрасава – царскае выданьне. Значна прыгажэйшае, чым савецкае, савецкія былі досыць тапорныя… Зачытаны літаральна да дзірак хадзіў па руках «Шэрлак Холмс» Конана Дойля. Калі б такое што знайшлі, дык канфіскавалі б, маглі б бацькоў пачапаць. Я чытаў і стараўся хутчэй аддаць.

У нас у хаце была нядрэнная бібліятэка – маці выпісвала шмат часапісаў і купляла кніжкі – у пакоі стаялі дзьве вялізныя плеценыя этажэркі поўныя кніжак.

Што яшчэ было забаронена. У вялікія рэлігійныя сьвяты заўсёды бывалі заняткі, і калі хто ня прыйдзе ў гэты дзень у школу, дык маглі быць непрыемнасьці. Я аднойчы прыходжу са школы – яшчэ да дзеда, але жылі мы ў Падшывалавых – адчыняю духоўку, а там – вялікі-вялікі пірог. Я ціхенька зачыніў духоўку і пазьней сказаў маці, а маці мне кажа: нікому нічога не кажы, гэта будзе сьвята – тады я даведаўся, якое сьвята Вялікдзень. Так людзі цішком сьвяткавалі.

Строга быў забаронены Сяргей Ясенін. Недзе нехта пра яго ўспамінаў, людзі казалі, што гэты паэт забаронены. Я яго чытаў ужо ў Лювэне, мне ня надта й спадабалася – некаторыя вершы добрыя, а іншыя – ныцьцё, бярозкі, плачы – усё гэта надакучвае. Калі «рэпэр» сьпяваў на птушыным базары, мне было прыемней, чым калі з паэта робіцца ікона.

Паміж вучнямі многа хадзіла «частушак» супраць Дзям'яна Беднага (у «рэпэраў» я такіх ня чуў). Насьмешка зь Дзям'яна была поўная, глыбокая пагарда. Але тых куплетаў я ня памятаю.

Найбольш баяліся, каб не злавілі з эмігранцкай літаратурай. У мяне быў сябра Сярожа Сінельнікаў, ягоны дзед, купец, уцёк у часе рэвалюцыі ў Рыгу. Дзед там жыў і часам прысылаў сям'і лісты. Сярожа мне пра гэта расказваў і казаў, што сям'ю бадай што кожны месяц пытае НКВД, асабліва – ці не прысылае дзед кніжак.

Цёмны бок вуліцы

Курыць дзеці на вуліцы пачыналі вельмі рана. Калі мы прыехалі ў Арол і жылі на вуліцы Прадзільнай – гэта мне было восем гадоў – дзеці там курылі. Зьбіралі бычкі, і бычкі пазнавалі – які ад «Беламору», які ад чаго іншага – і тады смакталі. Калі пераехалі на 2-ю Курскую – мне было дзесяць – то там дзятва поўнасьцю курыла. Але я ніколі не курыў, хоць мой бацька курыў – гадоў зь дзесяці – і цыгарэты, і махорку.

Піць дзеці вуліцы пачыналі таксама досыць рана. Піцьцё было своеасаблівае. Пераважна «падпівалі» на вялікія сьвяты – хадзілі ў паркі, асабліва на Першае мая, і ў парках зьбіралі бутэлькі, калі былі недапітыя, бо ў парках людзі пілі і выкідалі пустыя бутэлькі. Пацаны з такіх недапітых бутэлек і цягалі.

Пра сэксуальнае жыцьцё былі толькі гутаркі, але я яго не заўважаў, яно мяне не цікавіла, хоць да дзевак ужо пачаў прыглядацца, якая зь іх прыгажэйшая. Гэты бок жыцьця быў даволі закрыты, дзеці гэтага ня бачылі, ня тое, што сёньня.

Што было цікава. 1937–1938 гады былі пераломныя – зьявілася больш спартовых рэчаў, можна было купіць футбол, канькі. І зьявіліся вуды! У 1935-м нідзе не было дастаць вуды, ва ўсіх былі самаробныя, крывыя, непрыгожыя. Дык што людзі рабілі – на першамайскім парадзе раздаюць бамбукавыя вуды са сьцяжкамі – ууу, дык на дэманстрацыю дзеля вуды і пяцьсот чалавек прыйдзе – пранёс, выкінуў сьцяжок, забраў вуду і пайшоў. У мяне такіх вудаў было штукі чатыры. Бо ты мог стаць у адну калёну, а там нейкі заўхоз вуды са сьцяжкамі раздае – возьмеш вуду, недзе прыхаваеш і становісься ў іншую калёну, дзе атрымаеш новую вуду са сьцяжком. Дзеці гэта зразумелі вельмі хутка, і неўзабаве ў кожнага была бамбукавая вуда. Дык вось, у 1938 годзе бамбукавых вудаў навезьлі ў магазыны тысячы, яны былі вельмі танныя і прадаваліся ў спартовым магазыне «Динамо». За 30 капеек можна было купіць даўгую вуду, а раскладную – за 2-3 рублі. Ня трэба было хадзіць на дэманстрацыі. Са сьцяжкамі таксама была гісторыя. Як атрымоўвалі вуду, дык папераджалі адзін аднаго, каб ня кідаць сьцяжок проста на тратуар, бо «кучка мусора»

(такая ў Арле была мянушка ў міліцыянэраў) можа падысьці і цябе арыштаваць.

Хоць я быў з вуліцай зьвязаны, але я стараўся ў некаторых «праектах» ня ўдзельнічаць, бо маці была настаўніцай і я адчуваў мяжу – куды я магу, а куды не магу – і сам сябе стрымваў. Праўда, маці ціхенька папярэджвала: «Сынок, будзь асьцярожны».

Горад і вёска

Часта на рынках чуліся антыкалгасныя выказваньні і гутаркі, рынак, агульна кажучы, ня быў савецкай тэрыторыяй. У Арле розьніца паміж вясковым і гарадзкім была вельмі вострая. Быў пагляд: рынак – гэта вёска, гарадзкія прыходзяць, купляюць. Але ў гарадзкіх чэргах тых вяскоўцаў не цярпелі, проста выкідалі. Тыя чэргі – гэта асобная гаворка, ня ведаю, ці яны дзе апісаныя. У некаторых чэргах пісалі на руках нумары…

Наш сямейны кантакт зь вёскай палягаў у тым, што малако нам прыносіла Сьцепаніда – два разы на тыдзень два штофы малака (і на рынках, і ў пабытовым ужытку малако вымяралі штофамі), а прачка Дуня раз на тыдзень забірала бялізну. Калі прыходзіла Сьцепаніда, яна прасіла ў маці, каб пакінула ёй адзёжу – Сьцепаніда пераапраналася і ішла ў краму ў чаргу, каб яе не пазналі, што яна вясковая. Сьцепанідзіна сям'я былі «адзіналічнікі», іх моцна ціснулі. І ў горадзе яна купляла хлеб, бо ў іх, аднаасобнікаў, хлеба няма, а ў чарзе да вясковых нянавісьць, калі ўбачаць «дзеравенскага» ў чарзе – яго выкінуць, такая была злосьць. Сабе хлеба не хапае, а тут яшчэ дзеравенскія прыходзяць купляць. Так Сьцепаніда – да самай вайны – прыйдзе, пакіне малако, пераапранецца, пойдзе купіць у краме хлеба, пераапранецца назад у вясковае і ідзе дахаты. Яе вёска называлася «Большая Грачёвка», але я чуў, што сама яна вымаўляе амаль «Грачёўка», дык я сказаў маці, што Сьцепаніда неяк дзіўна гаворыць, а маці мне: «Ты менш прыслухоўвайся!»

Аднойчы пры немцах мы з бацькам пайшлі ў тыя Грачоўкі, Вялікую і Малую, і бацька кажа мне – глядзі, тыповыя нашы вёскі.

Дуня жыла бліжэй да гораду, лічылася амаль гарадзкой і мела гарадзкую вопратку, дык і праблемаў з чэргамі ў яе не было.

Вяртаньне бацькі

Зімой на пачатку 1941 году вярнуўся бацька – заехаў у Арол на пару дзён. Мы ня ведалі, вернецца ён ці не, бо ніякай камунікацыі не было, апошні год ці паўтара маці не атрымоўвала ніякіх лістоў, перад тым лісты прыходзілі раз на паўгода. Бацька адбываў тэрмін у горадзе Свабодны (былы Аляксееўск), паміж Хабараўскам

і Ўладзівастокам, недалёка ад кітайскай мяжы. Гэта былі Байкала-Амурскія папраўчыя лагеры, і лагернікі будавалі чыгунку – БАМ (Байкала-Амурская магістраль). Паколькі апошні год бацькавага тэрміну камунікацыя спынілася, дык маці мяне настройвала, што «магчыма тата й ня вернецца».

І раптам у канцы студзеня 1941 году нам прыйшла паперка, што бацька прыедзе – маці ведала ўжо тыдні за два і папярэдзіла гаспадара першага дому Івана Радзянкова, што «можа прыйсьці муж». Дык Радзянкоў зьдзівіўся: «Мария Васильевна, ваш муж? Вы никогда не говорили! Ах, из краёв отдалённых? Пускай живет у меня!» Яна кажа, што не, што ён толькі на адзін дзень, а Іван: «Нет, он будет моим гостем!» – ён адразу зразумеў.

Іван Радзянкоў вельмі зьдзівіўся, што маці ніколі не гаварыла пра бацьку. Гэта праўда. Тэма бацькі абмяркоўвалася – і то паўсловамі – толькі паміж мною і маці. Калі маёй маці і ўдалося нешта мне забараніць, дык гэта расказваць людзям пра бацьку. Я гэтую забарону датрымоўваў: пра бацьку нікому нічога не казаў.

Калі маці сказала Падшывалавым, што на дзень-два прыйдзе бацька, яны спалохаліся, але маці запэўніла іх, што ў бацькі дакумэнты ў парадку і ў міліцыю рэгістравацца ён ня пойдзе. Гэта іх супакоіла.

Бацька прыйшоў і сказаў, што толькі на дзень-два, бо яго папярэдзілі яшчэ ў Свабодным, што ў гарады абласныя і абласнога значэньня яму дарога закрыта, але на пару дзён да сям'і яму дазволілі. Ён пайшоў у аблана, і яму далі накіраваньне ў Бранскую вобласьць, Жырацінскі раён, Кульнеўскі сельсавет, куды ён неўзабаве і выехаў. Там ён атрымаў працу настаўніка ў няпоўнай сярэдняй школе і выкладаў 5-6 прадметаў. Да вайны бацька да нас не прыяжджаў, бо гэта было недазволена, і ён не рызыкаваў.

Радыёкропка

У хаце Падшывалавых была радыёкропка. Яны яе заўсёды ўключалі а 6-й гадзіне раніцы: «Внимание! Говорит Москва! Радиостанция имени Коминтерна на волне...! Передаем сводку...» І так радыё цэлы дзень было ўлучанае. Сьценкі там такія – пальцам праткнеш, усё было чуваць. Памятаю, калі далучылі Заходнюю Беларусь, па радыё пачалі даваць шмат беларускіх песьняў, Падшывалавы слухалі, і як я прыйду, распытваюцца – у маці ня будуць, а ў пацана запытаюцца – «что значит то? что значит это?»

Радыё было галоўнай крыніцай, зь якой мы пачулі пра вайну 22 чэрвеня 1941 году.

Арол. Вайна

Навіна пра вайну

Аж да самай вайны да Нямеччыны стаўленьне было невыразнае. Ня памятаю, каб надта моцна прапагандавалі супраць яе. Вялікай варажнечы не было, хоць слова «фашысты» ўжывалася адмоўна, але й вялікай любові не было таксама.

Вялікая перамена ў стаўленьні да Нямеччыны адбылася раптоўна ў нядзелю 22 чэрвеня 1941 году. Для ўсіх гэта быў вялікі шок – пачалася вайна.

У суботу яшчэ быў нармальны, спакойны дзень, я з кампаніяй хлапцоў пайшоў на ноч на рыбу. У маці якраз быў выпускны вечар, адна зь дзясятых клясаў канчала школу. Былі тры паралельныя дзясятыя клясы, і адна зь іх, вельмі позьняя, канчала якраз у гэты дзень.

Прабыла нашая кампанія на рыбе суботу, і ў нядзелю па абедзе варочаемся, добра налавілі, я цэлую нізку нёс – плоткі, пару галаўнёў. Ідзем мы па дарозе – вялікая Крамская шаша – і бачым: едзе машына, грузавік, чырвонаармейцы стаяць у кузаве, і – закрытыя фары, на іх надзетыя чорныя каўпакі з прарэзамі. Мы зьдзівіліся: што гэта такое? А было гэта кілямэтраў за 30 ад гораду, далекавата. Пасьля, бліжэй да гораду, кілямэтраў за 15 – матацыкліст ваенны, і таксама фары закрытыя. (На гэтай дарозе было шмат вайскоўцаў – каля гарадка Кромы была вайсковая база.)

І нехта з нашай кампаніі пытаецца: «Эй, родимый (так найчасьцей называлі салдатаў), что это такое?» А ён: «Не слышали?» – «Нет, не слышали». – «Фашисты напали на нас!» І паехаў далей.

Ага, фашысты напалі, ну мы тады крочым хутчэй. Ужо пад вечар я прыходжу дахаты, а гаспадыня Марыя Іванаўна кажа: «Радио сообщило, что фашистская Германия напала, сегодня бомбили Белоруссию...» Так я даведаўся пра вайну.

Першыя дні вайны

У першыя дні вайны нічога асаблівага не адбывалася, калі не лічыць большае мітусьлівасьці ў горадзе. Бегаюць людзі заклапочаныя, ніхто нічога ня ведае. «Орловская правда» два дні не прадавалася ў кіёсках, але такое бывала й раней, таму гэта не было дзівам.

Праз тры-чатыры дні – стук у дзьверы раніцай: участковы міліцыянт дзядзя Ваня Новікаў. Сёньня ўсім выходзіць капаць бамбасховішча! Там, кажа, у вас гарод, і на гародзе трэба зрабіць сховішча.

А празь дзён пяць я заходжу да Боркі Кармана (сябра з нашай «ватагі», Карман – мянушка, іншы Борка быў Шкет), і прыходзіць ягоны бацька (ці дзядзька, ужо ня памятаю). Ён незадоўга перад тым быў вярнуўшыся зь Беламорскага каналу, а ў першы дзень вайны мусіў зьявіцца ў НКВД, каб зарэгістравацца. Яго зноў арыштавалі і паслалі на «прынудку» (принудительные работы, па бытавым артыкуле – каля Арла нешта капалі), і іх бамбілі. Хто бамбіў? Немцы! Дык тая калёна прынудчыкаў і разьбеглася. Ён прыходзіць, мы сядзім на завалінцы, а ён кажа: «Ну, месяца через два лавочка закроется». Такія настроі панавалі ў той час у гэтым пралетарскім асяродзьдзі. Не скажу «за ўвесь Арол», але там, дзе быў я, настроі былі ня надта савецкія.

А 28 чэрвеня немцы наляцелі і разбамбілі электрастанцыю – яна была ад нас за два кварталы – дык ужо хаваць не было чаго, і было сказана, што быў нямецкі налёт. Да таго афіцыйнай інфармацыі не было, а гаварылі «кума куме», нехта нешта чуў, нехта прыехаў з Бранску. А тут – разбамбілі электрастанцыю! Гэта была адчувальная справа, бо і электрычнасьць па горадзе вылучылася, і вада шмат дзе перастала падавацца. Мы хадзілі па ваду на вадакачку за два кварталы, часам трэба было стаяць у чарзе паўгадзіны, пакуль набярэш. У хаце вады не было, прыбіральня ў гародзе, можа толькі недзе ў цэнтры пару соцень дамоў мелі выгоды. Так што ваду насілі, вядро ставілі ў сенцах і накрывалі, вісеў коўш, карысталіся вадой ашчадна, дарма не вылівалі. Быў рукамыйнік, пад ім быў вялікі таз – там вада зьбіралася і пазьней выкарыстоўвалася, нешта паліваць ці для мыцьця падлогі.

Здаецца, тады і газэта выйшла зь вялікімі шапкамі – маўляў, сёньня «немецким стервятникам удалось прорваться». Людзі сьмяяліся – Арол далекавата ад мяжы, дык прарваліся на якую тысячу кілямэтраў. Жартаў і кпінаў паболела.

Паніка

Калі вайна пачалася «афіцыйна», у горадзе пашырыліся панічныя настроі. Раптам зьніклі прадукты. Літаральна пустыя магазыны. Дзе ні зойдзеш – нічога няма. Каля нас недалёка быў хлебны магазын, хлеб – гэта ж асноўнае, і ў краме павесілі абвестку: цяпер хлеб будзе прывозіцца два разы на тыдзень. Ня так, як раней, калі хлеб заўсёды быў – прывязуць і раз, і два, то булкі французскія, то батоны, хоць і бывалі чэргі. А цяпер – два разы на тыдзень. І прадавачка кажа, што

неўзабаве могуць увесьці карткі. І ў людзей сапраўдная паніка – картак баяліся.

Карацей, пачаўся заўважны балаганчык, які ў ліпені вырас у вялікі балаган. Электрастанцыю, праўда, хутка направілі, і электрычнасьць вярнулася. Бамбілі немцы таксама і частку турмы – Арлоўскага цэнтралу, але турму вельмі хутка падрамантавалі. Тады нямецкая авіяцыя разбамбіла рэйкі, якія вялі я ўжо ня ведаю куды, і расклады на чыгункі перасталі дзейнічаць. Паніка расла, зачыняліся магазыны, трамваі пачалі хадзіць нерэгулярна. Пачалі вывозіць фабрыкі і іншыя прадпрыемствы.

Папаўзьлі чуткі, што ня будзе заняткаў у школах. Ну, да заняткаў было яшчэ амаль два месяцы, але чуткі мацаваліся, што школы могуць увогуле не адчыніцца.

Вайскоўцы, бежанцы

Узрастаў наплыў вайскоўцаў, бо Арол – вялікі чыгуначны вузел і вайсковыя эшалёны ішлі з усіх бакоў. Было добра відаць, што вайскоўцы вельмі стомленыя, часам і галаднаватыя – наляталі на крамы, раскуплялі прадукты. Пры 12-й чыгуначнай школе, дзе я пачынаў вучыцца, быў вельмі добры пляц, дзе мы гулялі ў футбол. І вось аднойчы я праходзіў каля гэтай школы – там праз плот можна было бачыць – і на гэтым пляцы ў школе можа чалавек дзьвесьце чырвонаармейцаў сьпяць, іх аднекуль некуды гналі, знайшлі гэты пляц, дзе яны могуць прылегчы – дык яны там і паснулі.

Пачалося ў тым часе і бліжэйшае знаёмства зь «вялікай Беларусьсю», бо праз Арол вельмі шмат уцякала бежанцаў – ехалі абозы, машыны. І, бывала, стаіш у чарзе па хлеб – на 1-й Курскай быў вялікі магазын – а едзе абоз беларускіх бежанцаў, то яны налятуць на гэты магазын, чаргу разгоняць і забяруць увесь хлеб! Міліцыя на такія «забурэньні» не рэагавала зусім альбо нават спрыяла бежанцам. Таму да бежанцаў паўставала пэўная варожасьць. Гаварылі яны па-беларуску – некаторыя трасянкай, некаторыя чыста. Уцекачоў было поўна на станцыі, у буфэце, спалі ў пачакальнях. Часам я пытаўся ў бежанцаў – адкуль яны, дык зь Менску было мала, былі ўсё магілёўскія і віцебскія. З магілёўскімі быў нават такі кантакт. Мы часта хадзілі лавіць рыбу на Аку, і ў тым месцы, дзе мы лавілі, раз прыходзім – а там разьбіты цэлы лягер, 5-6 вазоў, сядзяць людзі. Я зь імі пагаварыў, па-беларуску. Памятаю, яны зьдзівіліся, што мы ўжо так даўно жывем у Арле, яны думалі, што беларусы жывуць толькі ў Беларусі і нідзе болей. Я расказаў пра гэтую сустрэчу маці, і яна мне загадала, каб менш гаварыў. Маці не цярпела, калі я пра нас расказваў, яна хацела, каб я наагул маўчаў – чым менш гаварыць на вуліцы, тым лепей. Думаю, што гэта была пазыцыя ўсіх матак у тага-

часным Савецкім Саюзе – чым дзеці менш гавораць, тым спакайней. Такая была эпоха…

Фронт набліжаецца

Адчувалася, што ваенныя падзеі набліжаюцца да Арла. Людзі ўспрымалі гэта па-рознаму. Адны казалі, што рыхтуюцца выяжджаць, іншыя сядзелі спакойна, а некаторыя нават чакалі прыходу немцаў. У мяне былі знаёмыя яўрэйскія сем'і – у адной бацька Марк Яфімавіч, прозьвішча ня памятаю, і яшчэ сям'я Баскіных – яны літаральна чакалі немцаў. Марк Яфімавіч быў цырульнік, дык казаў, што «калі саветаў выганяць», ён адчыніць сваю цырульню ў добрым месцы і будзе сваёй працай зарабляць. Дзед Боркі Баскіна прадаваў цукеркі, якія ён сам рабіў: ірыскі – і мятныя, і макавыя – ён насіў на плячах вялікі латок і станавіўся заўсёды каля 12-й школы, а дзеці куплялі па пяць капеек за ірыску. Дык ня толькі дзед, а і ўся сям'я чакала немцаў – спадзяваліся наладзіць ірысавую фабрычку.

Ну, безумоўна, наш сусед Іван Радзянкоў – ён проста казаў: «Як толькі прыйдуць немцы, я паеду ў сваю вёску і забяру тую зямлю, якую ў мяне забралі, калі раскулачвалі…»

Але бальшыня жыхароў рыхтавалася да эвакуацыі на ўсход.

Мы засталіся ў Арле

Наша сям'я нікуды выяжджаць не рыхтавалася, бо не было і магчымасьці. У нейкім часе ў жніўні зьявіўся бацька – можа на адзін дзень – і сказаў дзіўную рэч, што ён цяпер «прызыўны» і мае паперку з ваенкамату, паводле якой мае зьявіцца ў ваенпункт, здаецца, у Пензе, а можа ў Яльцы, а там яму дадуць абмундзіраваньне. Так што ён будзе падавацца на Ўсход, а мы застаемся. Здаецца, я яго нават і ня бачыў, зь ім маці гаварыла.

І так бацька разам з савецкім войскам пайшоў на Ўсход. Што бацькі я ня бачыў – дзіва няма. Я часта бываў на начной рыбалцы, далекавата ад гораду, дык і той «заскок» бацькі да нас «празяваў». Але добра помню, што мяне моцна зьдзівіла, калі маці мне сказала, што «тата ўцякае на ўсход»! Хоць мне ніхто і не казаў, але я сам разумеў, якія ў бацькі былі пачуцьці да савецкай улады. І таму ягоны «марш на ўсход» мне быў проста незразумелы. Але я маўчаў і маўчаў. Маці прывучыла. Поўнасьцю я зразумеў бацьку пазьней, асабліва прачытаўшы ягоныя «Эпізоды» – пра падзеі лета 1941 году.

Маці нікуды ехаць не зьбіралася, хоць ёй Тамара Сяргееўна Шапіра прапаноўвала дапамагчы з машынай. Але падавацца ў бежанства маці ня думала, зрэшты зь дзедам і не было як, ягоная хвароба пра-

грэсавала, ён ужо амаль ня мог хадзіць дый разважаў ужо цьмяна. Так мы й засталіся.

Рух у горадзе

Пад канец лета горад быў ахоплены ўцякацкім псыхозам. Асабліва гэта заўважалася каля вакзалу. Я часта хадзіў на вакзал, хоць было гэта няблізка, але там можна было купіць абеды. Па абеды бывалі вялікія чэргі, але абедаў хапала. Вакзал літаральна быў запруджаны вайскоўцамі, хоць яны ў чэргах і не стаялі. Найбольш вайскоўцы трымаліся ў вельмі старым і прыгожым прывакзальным парку. Там яны займалі ўсе лаўкі, спалі на газонах, часта раскладалі вогнішча ды нешта варылі. Непараўнальна шмат сярод вайскоўцаў было салдатаў зь сярэднеазіяцкіх рэспублік, чаго ў горадзе перад вайной зусім не было.

Улады яшчэ не эвакуаваліся, міліцыя дзейнічала, я часта сустракаў участковага дзядзю Ваню Новікава. Нешта было і новага ў той панічнай сытуацыі. Прыкладам, раней, калі мы – дзятва або дарослыя – хадзілі лавіць рыбу, рыбакоў бывалі дзесяткі, але апрача іх на беразе ракі нікога не бывала. А цяпер па берагах пачалі праяжджаць конныя міліцыянты. Языкі казалі, што міліцыянты езьдзяць, каб вылоўліваць арыштантаў, якія разьбягаліся з турмаў і працоўных калёнаў у часе бамбёжак. Але ўлада заставалася спакойная – паніка была сярод насельніцтва.

Было відаць, што некаторыя прадпрыемствы рыхтавалі да эвакуацыі – яны нешта грузілі, нешта забіралі, нешта вывозілі, а ў некаторых былі ўжо забітыя бляхай дзьверы і вокны. У Арле было некалькі старых расейскіх заводаў, дзе выраблялі зброю, не зусім як у Туле, але, прыкладам, быў там вядомы Мядзьведзеўскі завод па вырабе зброі.

Школьнікаў паслалі ў калгасы

У сярэдзіне жніўня школьнікі атрымалі лісты – зьявіцца ў школу на пару дзён раней, даты дакладнай ня памятаю, яшчэ да 1 верасьня. Дачакаліся мы той даты, прыйшлі ў школу, а нам кажуць, што трэба заўтра прынесьці з сабой пэрсанальныя рэчы, і мы паедзем у калгас зьбіраць бульбу. Раніцай я прыйшоў у школу, прынёс рэчы – бялізну, пару кашуляў – а на школьным двары ўжо стаяла дзесяток запрэжаных коней. Вазакі палічылі нас – 30-40 вучняў – і павезьлі ў калгас, кілямэтраў за 20 ад Арла. Калі мы прыехалі ў вёску, нас разабралі па хатах гаспадары і па абедзе павялі на поле, дзе мы меліся працаваць. Мы там выбіралі бульбу, працы было вельмі шмат. Кармілі нас нядрэнна – малако, кашу, катлеты давалі, але і працавалі мы нядрэнна – трактар араў, мы выбіралі бульбу, грузілі на машыны. Працавалі

мы 10-12 гадзін штодня і так стамляліся, што пасьля працы толькі паесьці і спаць.

Над намі лётала шмат нямецкіх самалётаў, пераважна яны раскідвалі лістоўкі – грубаватыя, зь нейкімі прымітыўнымі вершыкамі, і самыя адозвы былі прымітыўныя, маўляў, «кідайце ўсё, нямецкая армія пераможная, вітайце нямецкую армію…» Памятаю, у адной лістоўцы быў такі вершык:

Сталина сын Яша
к немцам в плен попал.
Говорит: «Папаша,
я жив, а ты пропал!
Лучше сдавайся сразу!»

Лістоўкі гэтыя мала каго пераконвалі, яны выклікалі хутчэй злаславільвы настрой супраць немцаў. Людзі пачыналі разумець: «Вось мы неяк жылі, і раптам нехта пачынае нас біць, якое яны маюць права…»

Адбылі мы гэтых пару тыдняў на бульбе, вярнуліся ў Арол. Нам далі з сабой бульбы па два мяхі, паабяцалі даць пару коней, каб разьвезьці нас па хатах. І гэта калгасныя ўлады выканалі – прывезьлі пад школу бульбу і за дзень ці два разьвезьлі яе вучням па хатах.

Як толькі скончылася гэтая праца, мы вярнуліся ў школу, і нам кажуць, што нас накіроўваюць у іншы калгас, там трэба было выбіраць цукровыя буракі. Паехалі мы й туды. Нам там было па 14-16 гадоў, здаецца, бралі ад пятай клясы, ад 13 гадоў. Калі пасьля буракоў нас прывезьлі ў Арол, то гэтым разам нам нічога не развозілі – разгрузілі буракі каля школы, а далей вазіце самі. Я змайстраваў невялікую тачку (кола ў мяне было) і прывёз буракі дахаты. Для нас – мяне, маці і дзеда – заробленыя мною бульба і буракі сталіся проста жыццёва неабходнымі. Пазьней мы варылі буракі, яны былі салодкія, а як мукі дадасі, дык выходзіў такі цудоўны як бы пірог, які мы зь вялікім апэтытам елі, запіваючы цёплай вадой. Мае першыя заробкі былі выдатныя.

Напярэдадні прыходу немцаў

Так прайшоў верасень 1941-га. У верасьні рабілася відавочна, што немцы хутка наступаюць, бо бежанцаў было больш і больш. Некаторыя прадпрыемствы, што эвакуаваліся, пакідаліся зусім адкрытыя, і людзі ня тое што рабавалі, але сёе-тое адтуль несьлі – то нейкі інструмэнт, то лямпу…

Першага кастрычніка пачалася кананада. Маці хадзіла ў школу штодня, а я перастаў. Пасьля другой паездкі ў калгас ніхто школьнікам не казаў, што рабіць. Нават мая маці, вельмі строгая і дысцыплінаваная настаўніца, мне казала: ну калі ні дырэктар, ні завуч нічога ня кажуць, дык і ня трэба ісьці. Яна сама ідзе, вучняў

у школе няма, заняткаў ніякіх, але адміністрацыйная праца была. Мяне тая сытуацыя зьдзіўляла, і маці я зразумець ня мог.

Спроба выехаць з гораду

Нэрвовая сытуацыя ў горадзе перадалася і маёй маці. 2 кастрычніка яна мне кажа, што чуваць зусім блізка стралянінy, і мабыць, усё ж з гораду трэба будзе выехаць, бо, магчыма, горад будуць бамбіць, дзед хворы – у бамбасховішча ня пойдзе, можа загінуць у часе бамбёжкі. Яна гаварыла з Радзянковым, каб я і Сямён, сын ягоны, пайшлі ў вёску, адкуль яны былі, пазычылі ў некага каня і падводу, каб прыйсьці ў Арол, забраць дзеда і вывезьці яго ў вёску – перачакаць гэты небясьпечны час. Радзянкоў на гэта згадзіўся, кажа: добра, у мяне поўна знаёмых, зробім.

Вельмі раненька 3 кастрычніка – яшчэ цёмна было – мы зь Сямёнам выйшлі з Арла, хутка зайшлі ў вёску, яна была кілямэтраў за 20. Там знайшлі людзей, знаёмых Радзянкова, узялі каня, падводу і паехалі назад у горад.

Арол гарыць

Ехалі мы не сьпяшаючыся, і каля чацьвертай гадзіны, пад'яжджаючы да Арла, бачым здалёк вялікую дымавую завесу. Відаць, вялікае нешта гарыць. Пад'ехалі пад аэрадром, які быў па дарозе – мяне ўразіла яго разбуранасьць, аэрадром быў нібы ўзараны, увесь перавернуты, нагэтулькі шмат на яго было скінута бомбаў. Там ужо ніякіх будоваў не засталося, усё было разьбітае. Перад аэрадромам мы бачылі: лётчыкі едуць на роварах, дзіўна іх было бачыць у авіяцыйнай форме на роварах.

Праяжджаючы каля самага аэрадрому, я раптам пачуў, што ў прыдарожнай канаве нехта стогне. Спыніўшы каня, мы падышлі да канавы. Там ляжаў чалавек, увесь у крыві, ледзьве дыхаючы, як нам здалося – чалавек паміраў. «Дядя, может, мы вам чем-нибудь поможем?» – спытаў мой напарнік Сямён. Але чалавек у канаве ледзь чутна прашаптаў: «Не, не, ня трэба, мне нічога не дапаможа». Пачуўшы гэта, загаварыў я: «Дзядзька, і я беларус, як вам дапамагчы?» На маё пытаньне скрываўлены чалавек спрабаваў падняцца, але ня змог. Затое паклікаў мяне бліжэй і сказаў такое: «Вось, дзетка, я паміраю. Я з-пад Воршы. Мяне выгналі маскалі, і запамятай, дзетка, што ўсё зло на нас ад маскалёў». Тут ён неяк заціх, гэта быў як бы ягоны апошні высілак, галава ягоная зьвесілася, і, як я вычуў, чалавек памёр. Я літаральна аслупянеў. Інстынктыўна я зразумеў, што ён мне сказаў, хоць слова «маскаль» я тады пачуў упершыню. Я ня ведаў, што рабіць. А ў дадатак Сямён настырліва бубнеў: «Что он сказал?»

Неяк стала страшна, але ўцяміўшы, што чалавек мёртвы, я сказаў Сямёну: хадзем, а то і нас мэсэршміты прыстрэляць. Мы падсьцябнулі каня, пагналі ў палаючы горад. Я ня ведаў, што для мяне гэта быў апошні дзень пад савецкай уладай, зь незабыўным подыхам памёрлага земляка – «зло на нас ад маскалёў».

Так я першы раз пабачыў, як чалавек памірае.

Уехалі мы ў горад (бо аэрадром быў кілямэтры два за горадам). Едзем па вуліцы Ленінскай, былой Балхаўской, як бы ў вогненным тунэлі – гарыць усё з двух бакоў. Страшна. Заварочваем пад гандлёвыя рады, што вядуць пад Красны мост праз Аку – і рады таксама гараць. Я бачу, што гарыць і магазын, дзе прадаваліся шапкі – мне надта заўсёды хацелася ў тым магазыне купіць шапку-«капітанку» з бліскучым брылём. Маці ніколі не заходзіла ў той магазын – дарагі, а пра фуражку-капітанку і гутаркі быць не магло. Ну а тут усё гэта гарыць, а шапка ў вітрыне – дык я гэтую вітрыну разьбіў і ўзяў тую шапку! І мы паехалі далей.

Мінулі мы тыя пажары, прыехалі дахаты – добра, што мост быў неразьбіты, мы маглі пераехаць праз рэчку. Маці ўзяла мяне ў работу – адкуль у мяне гэтая шапка? Ну проста як сьледчы: Дзе ўзяў? – У магазыне. – У якім магазыне? Магазын быў адчынены? – Не, зачынены. – Дык ты купіў? – Не, не купіў. – Як не купіў? – Ну, там было акно, я неяк стукнуў выпадкова… – Ах, так? Дык шапка паляціць вон. – Што ты? Горад гарыць! – Малаважна, што горад – шапкі гэтай ня будзе… Ну, скандальчык. Але я перамог, і маці мне саступіла, шапка ў мяне засталася, хоць на той мамэнт справа, як выглядала, яшчэ не закончылася. Шапку гэтую з крыху заламаным уверх брылём (мода!) я насіў і ў Менску.

Немцы

Калі наступіла раніца 4 кастрычніка 1941 году, я выйшаў на 2-ю Курскую ў кірунку на Пушкінскую, былую Навасільскую, і бачу – па ёй ідуць немцы. Ехалі спачатку на матацыклах, а тады пешыя ідуць пасярэдзіне вуліцы, па два, па тры, а за пехацінцамі ехалі шэрыя браневічкі. І так салдаты ідуць у бок станцыі, з паўднёвага захаду на паўночны ўсход.

Мне стала ясна, што пра эвакуацыю дзеда ў вёску ня можа быць ніякае гутаркі. Мы апынуліся ў іншым сьвеце.

Першы дзень немцы нічога не чапалі. Людзі стаялі і глядзелі, салдаты ні ў кога не стралялі. Але празь дзень ці два на слупох зьявіліся абвесткі – шмат, ня ведаю, хто іх расклейваў – што можна хадзіць па горадзе толькі ад 7-й ці 8-й раніцы, калі сьветла, да 4-й, інакш будуць страляць без папярэджаньня. І ўжо праз дзень-два мы бачылі трупы – немцы стралялі і забівалі. Магчыма, яны баяліся правакацыяў

або паўстаньня, але баяцца не было чаго – усё было разьбітае. Нашто людзей было страляць – людзі былі невінаватыя...

Арганізуецца новая ўлада

Досыць хутка пачала арганізоўвацца новая ўлада. Стварылася паліцыя – пераважна з фольксдойчаў. Зь меншасьцяў у Арле немцаў-фольксдойчаў, было найбольш. Яны працавалі ў гарадзкіх службах – асэнізацыйныя абозы, вадакачкі, дагляд за паркамі, публічныя прыбіральні – усё гэта рабілі «паволжскія» немцы. Іх цяжка было распазнаць, яны выглядалі, як рускія, бо ўжо даўно там жылі, некаторыя гаварылі зь лёгенькім акцэнцікам. Яшчэ былі армяне – пераважна чысьцільшчыкі ботаў на рагах вуліц. Былі і грэкі. Пад Красным мостам праз Аку былі аркі, штук дзесяць, і ў пяці ці шасьці з тых арак мясьціліся розныя майстэрні. Там рамантавалі абутак, рознае сапсаванае судзьдзё – лудзільшчыкі, на іх казалі «арцелі», дзе працавалі прыватнікі-саматужнікі. Дык гэта ўсё былі грэкі. Цікава, што яшчэ ў 2-3 арках былі цыганы, якія там жылі, варажылі і танчылі.

Фольксдойчы сталі першымі паліцаямі. Прычым паліцыя разьмясьцілася ў тых самых будынках, дзе раней была міліцыя.

Неўзабаве зьявіліся абвесткі, што хутка трэба будзе зарэгістравацца, а пад канец восені зьявілася і газэта «Речь» за подпісам Міхаіла Актана. У «Речи» даваліся больш падрабязныя інструкцыі – што можна рабіць і чаго няможна, куды людзям дазволена хадзіць і куды забаронена.

Харчавацца не было як

Пра забесьпячэньне жыхарства харчамі, відаць, ніхто й ня думаў, карміцца кожны мусіў сам. Падлеткам – такім, як я, па 14 гадоў – было трохі лягчэй. Мы хадзілі да немцаў, прасіліся ў іх пасячы дровы для палявых кухняў – такіх кухняў па горадзе было шмат – за гэта яны кармілі, часам дадуць кацялок супу, часам хлеба. Але здаралася, што й хапалі. Мяне раз схапілі каля камэндатуры, каб пілаваць дровы «за дурака», дык я першы дзень пілаваў, другі, і немцы не кармілі нічога. І вось я другі дзень пілую дровы, недалёка ад Тургенеўскага музэю, і бачу – праходзіць мая былая рэпэтытарка нямецкай мовы, фольксдойчка. Я вывучаў нямецкую мову ў школе, але маці мне наняла «для большай мудрасьці» рэпэтытара – Эмілію Гербертаўну Курдзюмаву. Дык я крычу ёй: «Эмилия Гербертовна!», а яна: «Вита, это ты? Как ты сюда попал?» Ну, як папаў – мяне злавілі! Яна зайшла мамэнтальна ў камэндатуру, выйшла зь немцам, і мяне вызвалілі.

Трэба сказаць, што немцы хутка – ужо ў сьнежні – пачалі хапаць і прымусова адсылаць моладзь у Нямеччыну, але хапалі старэйшых,

каму было ўжо па 15-16 гадоў. Лавілі на вуліцах, заводзілі ў «цэнтар», будынкі былых складоў, пустыя школы. Такія будынкі былі «аздобленыя» рознымі пранямецкімі плякатамі і лёзунгамі. Былі пункты, дзе рабіліся прышчэпкі для адпраўкі ў Нямеччыну. Мне было толькі 14, споўнілася ў травені, мой век яшчэ не падыходзіў пад дырэктыву вывазу ў Нямеччыну – немцы бралі ад 15-ці.

Відавочна найцяжэй было зь ежай. Елі што было прыхавана ў хаце, але гэтага рабілася меней і меней. Маці вельмі хвалявалася за дзеда – яму мы стараліся даць найбольш.

Ежу браць не было дзе. Усе магазыны былі зачыненыя. Спынілася падача вады ў калонку – апошняя вада з калонкі была 3 кастрычніка, як толькі немцы прыйшлі, вады ўжо не было. Трэба было хадзіць паўз Аку кілямэтры чатыры – там была вялікая крыніца з калодзежам і стаяла чарга часам па 30-40 чалавек. І вось з каромыслам туды йдзеш, набярэш вады, прынясеш, на пару дзён хапае – а тады зноў трэба йсьці. Дык хоць як, але вада была. А з харчаваньнем трэба было камбінаваць і думаць, як паесьці.

Рабавалі элеватар

У часе перамены ўлады было шмат пажараў. Ня ведаю, хто запальваў – ці саветы, калі адступалі, ці немцы, калі бамбілі – але ў канцы вуліцы 1-й Курскай былі вялікія элеватары, і яны пачалі гарэць. У элеватарах было поўна жыта – пяць-шэсьць высокіх структураў і некалькі паўкруглых будынкаў пакгаўзнага тыпу. Людзі пачалі хадзіць туды набіраць падгарэлага дымнага жыта – мяшкамі. Пайшоў і я і прынёс жыта – насіў вёдрамі, а дома мы яго ссыпалі ў мяшкі. (Тады я ўжо другі раз пабачыў, як паміраў чалавек – ён быў паранены і ляжаў там па дарозе, і я некалькі дзён, як хадзіў, дык бачыў яго, як яму рабілася горш. Адзін раз я яму нават даў вады, пасьля прывёў свайго сябра Пецю Кірылава і кажу – як мы можам яму дапамагчы? Чалавек паранены, у горадзе зьвярнуцца няма куды, бо ж да немцаў ня пойдзеш. Ён так і памёр.)

Элеватары рабавалі можа тыдні два. Для нас, што я нанасіў жыта, быў ратунак. Пазьней маці гэтае жыта мачыла, прапускала празь мясарубку, выходзіла каша, яна ставіла яе ў печку, і атрымліваліся вельмі добрыя ляпёшкі. Жыта ў элеватарах вельмі павольна тлела, аж пакуль да канца лістапада элеватары не згарэлі зусім.

У горадзе нічога не працуе

Гэтак мінаў кастрычнік, лістапад. Горад быў як мёртвы: ня толькі не працавалі магазыны, транспарт, не было сьвятла, але і людзей па вуліцах хадзіла мала – баяліся. Электрастанцыя не працавала зусім,

але немцы для сябе мелі палявыя генэратары. Машын нямецкіх было поўна па горадзе, войска нямецкага станавілася ўсё больш і больш. Вайскоўцы займалі школы, адміністрацыйныя будынкі, а невялічкія «атрады» жаўнераў разам з Feldpolizei хадзілі па хатах і рабілі адзнакі на тых, дзе можна разьмяшчаць жаўнераў. Зайшла такая «вайсковая дэлегацыя» і да нас у хату. Але, пабачыўшы нас трох у маленечкім пакойчыку, адразу выйшлі і на ўваходныя дзьверы прыбілі значок – не магу прыпомніць, які на ім быў сымбаль. Але больш немцы ў хату Падшывалавых не заходзілі.

Вярнуўся бацька. Мы – «бежанцы»

Няма словаў, жыцьцё было беспрасьветнае. Я добра гэта ўсьведамляў і думаў – а што ж будзе далей? І раптам нешта сталася: пад канец лістапада зьяўляецца бацька. Ён кажа, што доўга думаў і вырашыў усё ж ня йсьці на Ўсход, пад Пензу і мэльдавацца ў ваенкамаце. Бо, кажа: «Я маю дзьве судзімасьці, рана ці позна мяне пачнуць «цягаць». Дык чаго я маю ісьці ў армію, змагацца і баяцца? Хоць я й немцаў ня надта люблю… Я вырашыў перайсьці фронт і прыйсьці ў Арол. А што тут? Паліцыя?» – «Так, – кажу, – паліцыя ёсьць, трэба рэгістравацца». Бо ўжо абвесткі віселі, гарадзкая адміністрацыя хацела ведаць – колькі людзей ёсьць, якога ўзросту, якіх спэцыяльнасьцяў, і тады паліцыя выдавала новы дакумэнт. Я прыпушчаю, што шукалі працоўную сілу.

Бацька кажа: «Пачакай, як пойдзем у паліцыю, дык скажам, што мы бежанцы». Я запярэчыў: «Якія бежанцы?» Для мяне гэта было наагул дзіка – я ўжо зжыўся з Арлом, Арол стаўся мне блізкім. «Не, – кажа бацька, – скажам, што мы бежанцы, уцякалі зь Беларусі, адсталі ад абозу, згубіліся, а цяпер хочам у Беларусь». Ну я зусім збунтаваўся, думаю – што ён пляце? Як гэта так – я пайду ў паліцыю, нарвуся на некага, хто мяне знае, і буду казаць, што я бежанец! Карацей, была ў нас сварка, а бацька цьвёрда заявіў: «Ты маўчы, я ведаю, што раблю!»

Тады я поўнасьцю сытуацыі не разумеў, а бацька відавочна адразу скеміў, што ёсьць магчымасьць вярнуцца ў Беларусь. Ён ведаў, што, не скарыстаўшы гэтай нагоды, яму на Бацькаўшчыну вярнуцца ня ўдасца. Пасьля вялікіх перамоваў са мной – я ўсё артачыўся! – мы пайшлі ў паліцыю. Добра памятаю, як я хваляваўся. Ну як я буду выглядаць, калі ў паліцыі надарыцца нехта, хто мяне ведае! Але бацька ўзяў сытуацыю ў свае рукі.

Я ўпэўнены, што мае пярэчаньні бацьку, канфлікт зь ім – гэта было ня што іншае, як маё неўспрыманьне ягонага аўтарытэту. Якніяк дзесяць гадоў я быў толькі з маці – усё вырашалася паміж намі дваімі, а тут зьяўляецца трэцяя асоба ды заяўляе пра свой аўтарытэт. Але ўсё ўладзілася, і я згадзіўся – бацькаў аўтарытэт быў галоўны.

У паліцыі бацька, праўда, пачаў гаварыць больш за мяне, я толькі пасьпеў сказаць адрас, а калі спыталіся, колькі я тут жыву, дык бацька пераняў гутарку – мы не жывём, «мы только так, временно». Паліцыянт слухае, а я маўчу, мяне злосьць бярэ, думаю – ну што бацька пляце, зараз паліцэйскі дасьць у морду і ўсё на гэтым скончыцца. А бацька прадаўжае: мы ўцяклі, мы былі ў Магілёве, адсталі ад абозу, а пасьля згубілі тое і сёе, прыехалі сюды, і цяпер мы разгубленыя, і нам «самое хорошее – это как бы возвратиться на родину…» І паліцэйскі кажа: «Да-да, конечно, на родину – это лучше всего» і пачаў сам сабе разважаць. Я думаю, што ж стары (ну які стары – 43 гады) яму такога наплёў! А паліцэйскі прыносіць сіненькую картачку, дзе напісана, што мы – бацька, маці, дзед і я – бежанцы, і дае бацьку. Я ўнутрана супакоіўся: пранесла.

Калі мы выйшлі, бацька быў на дзясятым небе – ухмыляецца, хоча неяк сваю радасьць перадаць мне. А я надзьмуты, іду зь ім і думаю – стары зусім здурнеў, што ён хоча? Я разумеў, што бацька хоча ў Беларусь, але мяне абураў сам тэрмін «бежанец» – ну які я бежанец? Я ж тут жыў! Але ж так маніць адкрыта проста нельга.

Тым часам усё выйшла на дабро. Празь нейкі час зьявілася новае нямецкае распараджэньне, што такія і такія катэгорыі насельніцтва павінны зарэгістравацца, а бежанцы не павінны! Бежанцы павінны ісьці ў мясцовыя камэндатуры, якіх у горадзе было некалькі, але канкрэтных прадпісаньняў не было. І я пачаў разумець, што ў бацькавым пляне ёсьць рэальнасьць – можа й выйдзе на тое, што мы паедзем у Беларусь. Тады я ўжо замаўчаў і супраць бацькі не выступаў. У сям'і наступіла прыемнае пагадненьне, а маці была асабліва задаволеная.

Пачаліся халады. Амэрыка ўступіла ў вайну

Што ўрэзалася ў памяць у той год – вельмі рана наступілі халады. У дадатак да нястачы ежы не было чым ацяпляць хаты. Платы немцы разабралі ў першыя тыдні акупацыі для палявых кухняў. У лепшым стане былі дамы з цэнтральным ацяпленьнем, бо ў іх у запасе быў вугаль.

Вельмі запамяталася дата 7 сьнежня 1941 году – страшэнны холад, выпаў сьнег. Мяне ды яшчэ аднаго хлопца немец узяў працаваць на кухню. Нешта немцы варылі такое, што патрабавала шмат вады – ваду трэба было прынесьці разы чатыры, і нам трэба было далёка хадзіць. Праўда, немцы сказалі, што пакормяць. Вады мы нанасілі, і немцы далі нам есьці. І так мы ямо, а немцы між сабой гавораць, а мы па-нямецку нядрэнна разумелі і чуем зь іх гутаркі: Амэрыка ўступіла ў вайну.

Празь дзень ці праз два чуткі пайшлі шырэй, і трэба сказаць, што

людзі актыўна гэта абмяркоўвалі, калі сустракаліся: «Слышали? Слышали новость?» Аднак есьці ўсё роўна не было чаго, і навіна хутка замёрла, але ўсе ведалі, што Амэрыка ўступіла ў вайну. Навінаў пра Амэрыку не было, у газэтах, у «Речи», пра гэта не пісалася. Гэтая навіна людзям ня тое што дала надзею, але крышачку падбадзёрыла, хоць асабліва бадзёрыцца ў 1941 годзе не было ад чаго – жыцьцё было зусім беспрасьветнае.

Пераезд на іншую кватэру

Прыход бацькі, калі нас стала чацьвёра ў маленькім пакойчыку, пагоршыў нашы пабытовыя ўмовы. Мы з бацькам спалі на падлозе, бо дзед ляжаў на ложку адзін, а маці на кушэтцы. Найцяжэй было зь дзедам – яго трэба было і паварочваць, і мыць, і садзіць на гаршчок – і ўсё ў гэтым пакойчыку. Вялізарная праблема была і з кармленьнем дзеда – ён пераставаў есьці. Калі я прынясу нейкія лушпіны – дык ён часам адмаўляўся есьці. І паступова ён пачынаў паміраць, ужо было відаць – ён ляжаў, зьявіліся пролежні, ад яго пачынала сьмярдзець. Мыла, якое ў нас было, мы вельмі ашчаджалі.

Бацька сказаў, што нам трэба іншую кватэру. Я пайшоў у паліцыю і прадставіў нашу справу: чатырох у маленькім пакоі. Паліцыянт на маё зьдзіўленьне сказаў такое: мы кватэрамі не займаемся, кватэраў у горадзе поўна пустых, ідзі шукай і дамаўляйся з «упраўдомам». Ведаючы адзін з «жактаўскіх» дамоў на вуліцы Старамаскоўскай (вуліца паміж Прадзільнай і 2-й Курскай, знаёмы мне раён), пустую кватэру я знайшоў. З «упраўдомам» я дамовіўся, што часам буду яму прыносіць суп зь нямецкай кухні.

Кватэра была нядрэнная: чатыры пакоі, невялікі калідор, прыбіральня і сарай (каля кватэры), цэнтральнае ацяпленьне, але не на ўсе пакоі. Сапраўдны рай у параўнаньні з папярэднім жытлом. Людзі, якія там жылі – тры партыйныя працаўнікі – падаліся ў эвакуацыю.

Мы вырашылі на «новую» кватэру пераехаць. Змайстравалі з бацькам саначкі, паклалі ў іх дзеда і паехалі. Падшывалавы былі вельмі незадаволеныя, бо ўсё ж я і ім прыносіў есьці, але маці кажа: «Марыя Іванаўна, ня можам мы ўчатырох быць у гэтым пакойчыку». Урэшце гаспадары зьмірыліся, і мы зь імі разышліся.

Новае месца каля цэнтральнай вуліцы было вельмі выгоднае. У тым доме жылі немцы, і таму там было ацяпленьне.

Жывем разам з жаўнерамі

Як толькі мы ў кватэру перабраліся, прыйшоў нямецкі жаўнер і кажа: у гэтым пакоі будуць жыць чатыры ці шэсьць немцаў. І так цэлую зіму чаргаваліся: мы займаем тры пакоі, у адным ляжыць дзед,

у адным кухня, яшчэ ў адным мы з маці і бацькам, а ў вялікім пакоі немцы.

Жыцьцё зь нямецкімі жаўнерамі было напружанае – яны нам ня надта давяралі, і нельга сказаць, каб мы іх любілі. Было вымушанае сужыцьцё.

Яны выяжджалі на фронт, пастаяць на фронце, тады варочаюцца ў Арол і зноў жывуць у той самай кватэры. Вечарамі разам вошы душылі, бо вошай было – брат ты мой! Вечарамі немцы запаляць капцілку – у іх былі капцільныя лямпы – і ўсе мы каля гэтае капцілкі здымаем кашулі і хлопаем вошы.

З жаўнерамі жылося нават і магчыма, бо тое, што яны не даядалі, то яны давалі нам. Мы аддавалі ўсю нямецкую ежу дзеду.

Калі немцаў пашлюць на фронт – яны пакінуць свае рэчы, і тыдняў тры іх няма. Пасьля вернуцца – могуць і іншыя быць, бывае, што каго й забілі, дык яны часам, бывала, і рэчы аддадуць.

Фатаздымак зь Менску

У часе сужыцьця зь нямецкімі жаўнерамі я, па-першае, меў выдатную нагоду практыкавацца ў нямецкай мове – і так я мову добра апанаваў. А па-другое, здарылася і гэткае: немцы хутка скемілі, што мы міжсобку гаварылі не па-расейску – у сям'і заўсёды была толькі беларуская мова, а немцы па-расейску сёе-тое кумекалі. Нам давялося растлумачыць, што мы – высланыя беларусы. І здарылася так, што адзін з тых жаўнераў перад Арлом быў нейкі час у Менску – нарабіў там ладна здымкаў, і на адным здымку менскага вакзалу быў газэтны кіёск пераважна зь нямецкімі часапісамі і газэтамі, але адзін загаловак газэты быў беларускі. Для маіх бацькоў гэта была велічэзная радасьць! Яны пачалі ўяўляць, што ў Беларусі, напэўна, парадак, беларуская ўлада і г. д. Адным словам – нам хутчэй трэба вырывацца з Арла ў Беларусь. Жыць, працаваць у Беларусі была мара і мэта жыцьця бацькоў. І ўвесь пэрыяд жыцьця пад немцамі ў Арле быў для мяне «стрэсавым»: знайдзі нешта паесьці і пытайся ды шукай, як можна выехаць у Беларусь. Аднак, поўнасьцю настроіўшыся ехаць у Беларусь, мы разумелі, што зь дзедам – ён ляжаў цалкам нерухомы – мы нікуды рухацца не маглі. Цяжкая была сытуацыя.

Баранова галава

Сьнежань 1941 году быў вельмі халодны, а пад канец месяца выпаў ладны сьнег. У сярэдзіне месяца немцы зьехалі, хоць у кватэры заставалася шмат іхных рэчаў. Побач з нашым домам – а дом быў рагавы – па вуліцы Пушкінскай, былой Навасільскай, немцы адчынілі бойню – Schlachthof. Ці дакладней, міні-бойню, бо рэзалі

толькі малую жывёлу – авечак, сьвіней, але не кароў. Абсталяваньне для бойні там было – раней у тым будынку быў гастраном, дык былі халадзільнікі, жалезныя сталы, падвясныя крукі. На бойню прыяжджалі салдаты з палявых кухняў па мяса.

Перад Новым Годам я заўважыў, што немцы паставілі на вуліцы, каб было ўсім відаць, пахваліцца на сьвята – а было гэта на рагу 1-й Курскай і Навасільскай – баранову галаву і шыльду «Schlachthof» – «Бойня». Я ўдзень убачыў і думаю: от файна… У навагоднюю ноч я выйшаў праз заднія двары на вуліцу – я рызыкаваў, бо калі б мяне ўбачылі, то хлопнулі б адразу – трэба было прайсьці агародамі і выйсьці трошкі далей на вуліцы і вярнуцца да таго месца, а тады бегчы назад. Крадучыся, я дайшоў да гэтай галавы, схапіў яе і пабег назад. Скраў! Па дарозе выкінуў тую шыльду, прыходжу з гэтай галавой дахаты і кажу маці, і бацька мяне падтрымаў: бяры сякеру, зараз расьсячэм і зварым. А мусім зварыць усё, бо я баяўся, што немцы будуць шукаць галаву. Але паколькі гэта навагодняя ноч, дык яны, падпітыя, не адразу агледзяцца.

Маці ў плач – Божа, мяне й сын забівае, і бацька… ай, прыйдуць, расстраляюць. Я кажу: правільна, прыйдуць, расстраляюць, а ты пакуль што вары і канец! А немцаў у хаце няма – вельмі добра. Паставіла яна адзін гаршчок, другі, расьсеклі мы чэрап – адным словам, наварылі добра. Я ўсе косьці ўзяў, выйшаў і пайшоў гародамі, ззаду, параскідаў іх, пазакопваў пад сьнег – неяк замаскаваў. Гаршкі і каструлі парасстаўлялі па хаце. Пару гаршкоў з булёнам я вынес у сарай і прыкрыў іх нейкім барахлом. Адным словам – правёў апэрацыю і замёў сьляды.

Але я не памыліўся: пад канец навагодняга дня па хатах пачалі хадзіць нямецкія патрулі, шукаючы баранову галаву. Яны былі ў злосьці – з-пад носа скралі галаву! І вось да нас стукаюць і пытаюцца: ці тут жывуць салдаты? – Жывуць, кажу. – А дзе яны? – Я адказваю – ня ведаю, напэўна на фронт паехалі, вось іхныя рэчы… – Калі яны паехалі? – Кажу – я працаваў на кухні, дні два таму паехалі, перад навагодняй ноччу. А я добра гаварыў па-нямецку – бацька гаварыў слаба, маці зусім амаль не гаварыла. Ну, кажуць, пакажыце, дзе печка? Дзе духоўка? Я паказаў, яны паглядзелі. Дзе душ? Я паказаў – там нічога, яны панюхалі і пайшлі. І на гэтым усё скончылася.

Даводзілася бачыць савецкую кніжку «воспоминаний» пра Арол (ня памятаю ні аўтара, ні год выданьня), дык у той кніжцы пісалася, як «кто-то из наших партизан» скраў баранаву галаву, каб адпомсьціць немцам… А гэта ж я скраў гэтую галаву, і мы яе два тыдні елі – усё было добрае, наварыстае.

Праўда, бацька мне пазьней сказаў – ты асьцярожна каля немцаў, бо прыстрэляць. Я яму кажу: тата, я сам ведаю.

Але што рабіць? Есьці хочацца. А тут была, хоць і з рызыкай, та-

кая рэальная магчымасьць – навагодняя ноч, усе выпіваюць, немцаў няма ў хаце. Рызыка аплацілася. Хоць маці і сказала, што пойдзе з хаты, калі я яшчэ раз нешта такое зраблю. Але больш я такога не рабіў.

Аблавы на моладзь

Пасьля Новага Году пачаліся масавыя аблавы – лавілі моладзь ад 15 гадоў, каб адсылаць у Нямеччыну. Побач з намі жылі чатыры жанчыны – матка, бабка і дзьве дачкі. Бацька быў вайсковец, ён уцёк, а дачок злавілі і адпраўлялі ў Нямеччыну. Дочкі нас папрасілі, каб мы іх зарэгістравалі, што яны з нашай сям'і і даглядаюць за дзедам – мы так і зрабілі, і немцы іх пакінулі. Аблавы былі шырокія – людзі баяліся хадзіць па вуліцах. Мне было 14 гадоў, і к таму часу паліцыя ўжо дала паперачкі з правам на побыт, дык я не баяўся, я меў дакумэнт.

Наагул адносіны немцаў, асабліва палявой жандармэрыі, да насельніцтва былі суровыя і варожыя. Выдалі загад усім зарэгістравацца на працоўнай біржы – Arbeitsamt – на працягу 25 гадзінаў. У загадзе казалася: хто не зарэгіструецца – пакараем. Мой добры школьны сябар Алёша А. зацягнуў з рэгістрацыяй (думаў, што неяк выкруціцца, працуючы на кухні) – нямецкая паліцыя яго злавіла, не паслухалі ніякіх довадаў, яму ішоў 16-ы год – і павесілі. Больш брутальнае, безгаловае стаўленьне да насельніцтва цяжка ўявіць.

Немцы небаяздольныя

Зь нямецкімі салдатамі, якія жылі на кватэрах, дачыненьні былі цярпімыя. Немцы, як чорт ладану, баяліся фронту, бо іх там білі, як мух. Зіма была страшэнная, халодная, нямецкія машыны не заводзіліся. Нам было холадна-голадна, але калі б вы пабачылі, як немцы выглядалі – саплівыя, абвязаныя хусткамі, ня могуць ісьці, на нагах драўляныя боты, а яны ня грэюць – гэта ж дрэва.

Ня ведаю, што Гітлеру даносіў штаб, але баяздольнасьць нямецкага войска зімой 1941 году была праўдападобна вельмі нізкая. У нас за зіму можа каля сотні салдатаў перастаяла, зь іх трыццаць ніколі не вярнуліся, а можа і больш – я дакладна не лічыў. Рэшта вярталася назад, пабудуць два-тры дні, тады іх зноў кідаюць на фронт.

Былі выпадкі, калі салдаты стараліся сымуляваць. Адзін быў – Карл зь Нюрнбэргу – мы неяк сталі зь ім гаварыць, ён прынёс нам хлеба, і я яму кажу, што мой бацька быў у канцлягеры. І ён пытаецца – як выжыў? А я кажу – ён шмат сымуляваў. Дык ён і кажа: хадзем да бацькі, і просіць яго навучыць – як паднімаць крывяны ціск і тэмпэратуру. Бацька пытаецца ў жаўнера – навошта табе гэта? А той

адказвае безь ніякае засьцярогі – не хачу на фронт ехаць. Адчуваючы шчырасьць жаўнера, бацька падвучыў яго, як паднімаць тэмпэратуру. У выніку таго Карла звольнілі, і ён выехаў у Нямеччыну! Я шкадаваў, што ня ўзяў у яго адрасу…

Я ўпэўнены, што шмат хто з тых салдатаў у 1941 годзе пераканаўся, што вайна будзе прайграная, бо кліматычныя ўмовы былі жахлівыя. Каб неяк крыху сагрэцца, немцы рабавалі людзей, асабліва палявалі на шапкі-вушанкі, валёнкі, рукавіцы, шалікі. Праўда, салдаты нямецкія не пілі – я ні разу ня бачыў п'янага немца.

Раз у мяне немец схапіў на вуліцы шапку – у яго тры хусткі былі на галаве, а ён яшчэ і шапку ў мяне забраў, а іншы немец зьняў у мяне добрыя скураныя пальчаткі. Ня ведаю, ці рабавалі немцы хаты, але на вуліцах то адбіралі ў людзей шмат рэчаў.

Вясна, вёска

Пад вясну стала крышку лягчэй. У сакавіку выдалі загад, што раз на тыдзень можна выходзіць за горад і ісьці ў вёску шукаць сабе есьці. І тады мы з бацькам пачалі хадзіць. Часам ішлі нешта ў вёсцы некаму зрабіць і паесьці, часам тое-сёе выменяць – я купляў на птушыным рынку ці цьвікі, ці нейкі інструмэнт, абцугі, зубіла, а ў вёсцы гэта быў хадавы тавар, за зубіла можна было выменяць вядзерца бульбы.

Па дарозе ў вёску і назад бацька мне шмат расказваў пра Беларусь, казаў, што беларускія сяляне больш «шляхотныя» – заўсёды вітаюцца, калі каго сустракаюць па дарозе. Навучыў мяне бацька ў тых паходах і такой прымаўцы: «Тут меральі Сьцяпан ды Барыс. А канат вазьмі ды абарвісь! Сьцяпан кажа: давай дамерым, а Барыс сказаў: і так паверацьь!» Гэта бацька казаў мне, калі я нешта пачаў гаварыць пра адлегласьць паміж вёскамі.

Калі ў мірны час горад ставіўся да вёскі варожа, дык у ваенны вёска аказалася больш гасьціннай – варожасьці я не заўважыў.

Памёр дзед

9 сакавіка памёр дзед – ад голаду, ад хваробы. Немцы, што ў нас жылі, зайшлі ў пакой, дзе ляжаў дзед – у той час у нас былі чатыры немцы – перахрысьціліся і сказалі адразу: адчыняйце вокны. Мы адчынілі акно ў той пакой – і дзедава цела замёрзла. Хаваць яго трэба было на манастырскіх могілках у канцы 2-й Курскай, і нам спатрэбіўся амаль цэлы тыдзень, каб выкапаць магілу кіркай і ломам, бо зямля была прамёрзлая мэтры на два. А дзедава цела гэтым часам замёрзлае ляжала ў пакоі. Мы папрасілі немцаў, каб дапамаглі з транспартам, але яны сказалі, што нічога ня маюць. Дык мы зрабілі

саначкі, абматалі яго ў механвіньне і так завезьлі на могілкі і пахавалі. Паставілі крыжык і напісалі «Васіль Паўлавіч Зубкоўскі, зь вёскі Вугляны ў Беларусі».

Па сьмерці дзеда мы цьвёрда вырашылі чым хутчэй зьехаць у Беларусь: пакінем усё, паедзем «як стой», абы выехаць у Беларусь – як бы прысягнулі бацькі. Я маўчаў.

Кармілі на дзень народзінаў Гітлера

20 красавіка – у дзень нараджэньня Гітлера – па ўсім горадзе разьвесілі абвесткі, што будзе адчынена публічная сталоўка і ўсім мясцовым дадуць есьці. Пачалі думаць: як бы паесьці, бо ж мы маем паперы, што мы бежанцы, дык невядома, дадуць нам ці не. Бацька кажа: «Пойдзем у чаргу, але ня разам, ідзі ты першы, а я прыйду пазьней». Для таго, каб зайсьці ў сталоўку, трэба перайсьці рэчку Орлік. А там не пускаюць! Аказваецца, лёд яшчэ не прайшоў, і сапёры ўзрывалі перад мостам і пасьля моста лёд. Па Ацэ ўжо прайшоў ледаход, але Орлік быў яшчэ замёрзлы. Лёд узарвалі хутка, і людзей пачалі прапускаць праз мост.

Прыходжу я да сталоўкі, а там вялізная чарга. Праўда, ніхто ніякіх дакумэнтаў не пытаўся. Стаялі бідоны поўныя пахлёбкі! Спачатку давалі адзін чарпак, а я спытаўся, ці можна кацялок, і мне кажуць: бяры, а калі ёсьць яшчэ, дык дамо і другі – гэтулькі яны наварылі. Памятаю, сядзім мы там за сталом, і трапіла якраз так, што сядзелі са мной яшчэ два беларусы. Пачалі гаворку, і адзін зь іх выказвае думку, што нечаму зайздросьціць, а другі кажа: «Ну во здорава – пазайздросьціў барын халую…» Я першы раз тады пачуў гэтую прымаўку. Выходзячы з сталоўкі я бацьку пабачыў у чарзе – і ён паеў, а я яшчэ занёс кацялок маці.

Наколькі ведаю, гэтак удосыць накармілі толькі адзін раз. Можа, калі мы выехалі, кармілі больш рэгулярна?

Праца на чыгунцы

У травені мне споўнілася 15 гадоў (хоць дата нараджэньня 30-га, але я зарэгістраваўся ранейшай). 15 травеня мяне паслалі на працу, а на працы кармілі. Праца была на чыгунцы – папраўляць рэйкі. Рэйкі ўзрывалі, і іх трэба было рамантаваць: насыпаць зямлі, перацягнуць шпалы, кастылі. Праўда, работнікаў было шмат, дык работа ішла. Работнікі былі амаль выключна моладзь ад 15 да 20 гадоў.

Аднойчы падыходзіць да мяне начальнік і пытаецца: «Ты завтра когда приходишь?» Я кажу: «В шесть…» – «Приди в пол-шестого». Я прыходжу, а начальнік мне кажа: «Ты пойдешь вон туда». Я за некалькі дзён заўважыў, што некаторыя работнікі прыходзяць і пра-

падаюць – прыйдзе чалавек, а ідзем з работы – яго ўжо няма. Аказваецца што: кіраўніцтва на працы было ў камсамольскіх руках, і яны разьмяркоўвалі, хто застанецца ў горадзе, а каго паслаць за лінію фронту на ўсход. А фронт тады быў кілямэтраў за 25, каля станцыі Махавой.

Я запярэчыў, і начальнік пакінуў мяне ў спакоі, нічога не сказаў. Я ведаў, што мне на працы будзе ня надта прыемна. Мне было ясна, што на працы дзейная камсамольская ячэйка і тую моладзь, якая сымпатызавала савецкай уладзе, камсамольцы выпіхалі на той бок фронту. Той чыгуначны раён быў прасавецкі, у параўнаньні зь іншымі ім за саветамі жылося значна лепш – і прадуктаў хапала, і нейкія разьмеркавальнікі былі, да таго ж яны езьдзілі па ўсёй краіне, маглі нешта купіць. Таму жыхары чыгуначнага раёну былі вельмі антынямецкія. Тактыка была – не дапушчаць нямецкія эшалёны на станцыю. Там не было баёў, як у Беларусі – на Арлоўшчыне лясоў няма, адкрытае поле, а ўзарваць маглі.

Праца была вельмі цяжкая, але за той час, што працаваў я, выбухаў не было. Я працаваў ад 15 травеня да 20 чэрвеня – цягаў шпалы, забіваў кастылі. Немцы станцыю ахоўвалі. Памятаю, прагналі састаў, і трэба было паравоз загнаць у адно дэпо. Раней гэта рабілася электрыкай. А цяпер уручную паравоз узганяюць на вялікі круг, які трэба было круціць, каб загнаць паравоз у патрэбнае дэпо. І мы, хлопцы, замест электрыкі, круцілі круг – чалавек пяцьдзясят, і па камандзе «раз-два взяли!» налягалі на рычаг круга, а ён памаленьку з паравозам рухаецца, пакуль рэйкі не супадуць з рэйкамі дэпо.

Часам на працы заставалася ежа, яе не вылівалі, а давалі дахаты, і маці заўсёды чакала, калі я вярнуся і ў кацялку прынясу супу, каб яны з бацькам паелі.

Рыхтуемся вяртацца

У канцы чэрвеня немцы пачалі «разгружаць» горад ад людзей. Бежанцам пачалі даваць дазволы на выезд. Бацька найчасьцей хадзіў на станцыю Арол-Таварны, каб прыгледзецца, калі праходзяць саставы. Знайшоў бацька таксама пару беларускіх сем'яў бежанцаў, якія таксама хацелі вярнуцца ў Беларусь. Мне прыйшлося пару дзён не пайсьці на працу, бо трэба было схадзіць у камэндатуру атрымаць дазвол на выезд.

Вядомая справа, што для насельніцтва ніякіх цягнікоў не было, але бежанцам, калі мелі дазвол на выезд, можна было «прасіцца», каб улезьці ў таварны састаў – ад камэнданта станцыі залежала, каб той дазволіў «прымацавацца» да саставу.

На захад таварныя саставы ішлі досыць часта – немцы вывозілі лес, матэрыялы, часам машыны і трактары.

Паперку з дазволам нам далі 20 чэрвеня – тры чалавекі Weissrussen – Jauchim Kipel, seine Ehefrau Maria Subkouskaja und sein Sohn Viktor могуць вярнуцца ў Беларусь.

Дарога ў Беларусь

Аднаго дня чаканьне нашае нарэшце аплацілася: нас чатыры ці пяць сем'яў беларусаў селі ў таварны вагон і разьвіталіся з Арлом. Эшалён ішоў спачатку да Карачава, гэта кілямэтраў за 80, там трэба было высядаць, але начальнік саставу, немец, нешта зьмяніў і дазволілі ехаць да Добрушу. А ў Добрушы сказалі, што можна ехаць далей да Гомелю. У Гомелі дзьве сям'і вылезьлі, бо яны былі з Мазыра, і ў Менск ехалі ўжо толькі дзьве сям'і: сям'я Мароз – яны былі сапраўдныя ўцекачы, тры ці чатыры чалавекі, і мы ўтраёх.

Даехалі мы з Гомелю ў Менск безь вялікіх перашкодаў і выйшлі ў Менску, здаецца, 25 чэрвеня 1942 году.

Тое, што мы ў Беларусі, адчулася ўжо ў Гомелі. Там у цягнік зайшоў з праверкай беларускі паліцай у чорнай форме. Ня ведаю, да якіх частак ён адміністрацыйна належаў – бел-чырвона-белага на ім нічога не было – але гаварыў ён па-беларуску, тым часам як у Карачаве, Бранску гаварылі па-расейску (у Добрушы я ўжо ня памятаю). І той паліцыянт быў першы, хто паглядзеў на дакумэнт, што мы бежанцы (у нас былі два дакумэнты – дазвол на цягнік і пасьведчаньне бежанцаў).

Менск

Прыезд

Прыехалі мы ў Менск у апошнія дні чэрвеня 1942 году. У Менску мы не былі ад зімы 1938-га.

Калі пад'яжджалі да гораду, кінуліся ў вочы разьбітыя дамы, але поўнай карціны яшчэ не было відаць.

У Менску, як нам здалося, была іншая атмасфэра – адчувалася цывільная ўлада. Таксама кінулася ў вочы на вакзале шыльда кірыліцай «Менск» – пры ўваходзе на Віленскі вакзал над дзьвярмі было напісана па-нямецку і па-беларуску.

Калі цягнік спыніўся, бацька вылез з вагона і адразу пабег, задраўшы галаву. Я зьдзівіўся і раззлаваўся. Пытаюся ў маці – куды ён пабег? Яна кажа, газэту купляць. Я думаю, навошта яму газэты, мяне злосьць бярэ – бо мне даводзіцца цягаць рэчы. Але ён хутка вярнуўся, усьміхаецца, трасе газэтай.

І толькі тады яны мне расказалі ўсё і пра Жылку, пра ягоны пераезд з Прагі ў Менск і пра «Тэстамэнт». Нарэшце я зразумеў, чаму ў Арле быў такі вялікі ператрус. Маці пытаецца: памятаеш дзядзя такі прыяжджаў аднойчы ў Налінск? Ён перадаў нам «Тэстамэнт» Жылкі, беларускага пісьменьніка. І ўжо як прыехалі ў Менск – то яны з бацькам вырашылі, што найлепш будзе гэта аддаць у рэдакцыю газэты, калі там выдаецца беларуская газэта, і надрукаваць.

Мяне ў той час такія справы мала цікавілі, хоць і было прыемна, што бацькі робяць нешта нацыянальна значнае. Я кажу: «Ну дык і што? А хто будзе валізкі цягаць?» Такая была гутарка з маці, і ёй самой было трохі непрыемна, але што зробіш. З вакзалу мы выходзілі моўчкі.

Калі мы выйшлі з Прывакзальнай плошчы і пайшлі ў бок Універсытэцкага гарадка і Дому Ўраду, каб ісьці па Савецкай, я ўжо ўбачыў, як было навокал шырака разьбіта, але яшчэ ня так. Страшнае ўражаньне зрабіла вуліца Савецкая, калі мы дайшлі да ўзгорку, дзе цяпер ГУМ, і далей адкрываўся від уніз, на Сьвіслач – кругом былі адны руіны. Мне аж плакаць захацелася, бо я памятаў Менск, як мы былі апошні раз зімой 1938–1939 году, калі забіралі дзеда – горад квітнеў, а тут – руіны, усё зьнішчана.

Зарослыя травой пагарэлішчы, пагарэлішчы... Вельмі непрыемнае адчуваньне і нястрымныя парываньні да плачу. Я прасьлязіўся,

але маці плакала. Гэтак мы з маці, несучы цяжкія клумкі, чамаданы, варочаліся з чужыны ў свой горад, у іншае жыцьцё. Аднак было ў мяне адначасна і пачуцьцё вялікай прыемнасьці – я вяртаўся ў горад, дзе я сябе заўсёды адчуваў сваім.

Так мы па Савецкай ішлі на Камароўку, цягнулі нашыя рэчы – ніякіх таксістаў, вядома ж, не было – і бачылі ўшчэнт зьнішчаны Менск. Хада ад вакзалу да Савецкай вуліцы прайшла незаўважна. Але па Савецкай уніз пад Сьвіслач мы йшлі доўга: па-першае, было цяжка цягнуць на сабе ўсё барахло, а па-другое – маці, плачучы, затрымоўвалася то тут, то там, успамінаючы і сваіх сяброў, і сваё дзяцінства і юнацтва, зьвязанае зь мясьцінамі, дзе цяпер быў толькі друз руінаў, папялішчы, пагнутыя рэйкі – каркасы будынкаў. Маці плакала і плакала. Абраз руінаў выступіў вельмі рэльефна на фоне ўзыходу сонца, цудоўнае раніцы і ярка зялёных лебяды і лапухоў, якія запоўнілі руіны і пусткі. Відовішча кранала пачуцьці!

Калі мы прыйшлі пад мост, электрастанцыя стаяла, вакол яе руінаў не было. А як перайшлі мост, незакончаныя паўкруглыя дамы на плошчы, а за гэтымі дамамі фактычна ўжо была пустка – панарама была жудасная: тырчаць коміны, там-сям пастушкі ганяюць козы і каровы, усё парасло лебядою. Раніца, пастушкі, бур'ян... Надвор'е было вельмі добрае – сонечнае, прыгожае – такую раніцу часта апісваюць пісьменьнікі.

Ад моста, калі глядзець налева, усё было відаць, тэатар опэры і балету стаяў нібы на п'едэстале, вакол ніводнага дамка не было, толькі коміны, пагарэлішчы.

Горны завулак

Мы прайшлі па Савецкай да месца, дзе на рагу Даўгабродзкай быў Дом сьпецаў, павярнулі направа па Даўгабродзкай. Паміж Даўгабродзкай і Горным завулкам ніводнага дамка не было, і бачым адтуль, што на ўзгорку, дзе мусіла быць наша хата, стаяць зялёныя дрэвы і пару дамоў паміж імі. Гэта нас абнадзеіла – можа й наша хата ацалела... Мы крочым далей, цягнем багаж і прысьпешваем крок у бок Горнага завулку. У Горным завулку першыя дамы справа і зьлева ацалелі – дом Варатніцкіх справа, дом Судніка зьлева, за Суднікам дом Кучынскіх, а з правага боку за Варатніцкімі – дом Шабанавых, а за Шабанавымі – некалі стаяў наш дом, і там ужо было пуста, пагарэлішча... Маці залілася сьлязьмі. Раней ціхенька плакала, а тут загаласіла: «Ой, Божанька! Божанька!» Я стаяў і нічога не казаў, але і мне хацелася плакаць.

Куды ж нам ісьці? Хаты няма, пляц засеяны бульбай, бачым: бульба якраз цьвіце, на нашым месцы нечы гарод. Маці плача, прыхіліўшыся да драцянога плота, і тут мы чуем, як з воклічам «Ах, мілыя мае!»

выходзіць суседка – спадарыня Шабанава. Яна нас пазнала, мы абняліся. І яна пачала плакаць ды кажа: ня бойцеся, будзеце жыць у нас, падбадзёрвае.

Мы з маці трохі ачунялі, але не зусім. Што мы будзем рабіць? Менск спалены, хаты няма, мы ня ведаем хто жывы, хто загінуў – у Менску ж была радня, знаёмыя, і вось – мы вярнуліся на Бацькаўшчыну, а ранейшага Менску ўжо фактычна няма. Цяжкі, цяжкі настрой.

Шабанавы падбадзёрылі, што мы будзем жыць у іх. Яны збудавалі хату пасьля пажару – сям'я была дружная, нацягалі бярвеньня, зрабілі вялікую, лепшую, новую хату. Яны нам саступілі пакойчык, і ў гэтым пакойчыку мы пачалі нашае менскае жыцьцё.

Бацька ў той дзень не вярнуўся – відаць, ён маці папярэдзіў, што можа затрымацца. Потым ён сказаў, што затрымаўся ў горадзе з Адамовічам, бо калі ён прыйшоў у рэдакцыю, там сустрэў Адамовіча, зь якім быў знаёмы яшчэ з 20-х гадоў. Яны абняліся, расцалаваліся, бацька даў яму Жылкаў «Тэстамэнт», і гэты твор быў надрукаваны празь некалькі тыдняў у «Беларускай газэце», маці мне пра гэта ўжо расказала пазьней.

Першы дзень

Як бы там ні было, а на радзіме жыцьцё трэба было пачынаць. Цікавы запомніўся мамэнцік – Шабанава кажа: «Ну, вы ж напэўна есьці хочаце? Дык зараз я каржоў напяку, яешню зраблю...» Я пабеларуску ведаў, але слова «каржы» для мяне было незнаёмае. Я ў маці ціхенька пытаюся: «Мама, што такое каржы? Гэта, відаць, нейкі хлеб з крухмалу?» Бо я баяўся, што будзе тое, што і ў Арле – няма хлеба, і яны будуць частаваць нейкім эрзацам. Маці мне на вуха шэпча: «Не, гэта такія таўстыя бліны...»

Сьнедаем і паступова, асьцярожна пачынаем распытваць: «Як вы тут жывяце?» А Шабанавы спакойна адказваюць, што ёсьць картачкі, ёсьць тое, ёсьць гэтае. Мы раскрылі рот і амаль не даем веры, бо выехалі з гораду, дзе нічога з харчоў не было, час ад часу немцы давалі пахлёбку і на гэтым канец, хлеба мы ня бачылі, апрача як жабруючы ў немцаў. А ў Менску сапраўдны парадак – людзі маюць картачкі, пякуць яешню, каржы!

Шабанавы нас накармілі і пацьвердзілі, што мы будзем у іх і жыць, і... харчавацца. І ад гэтага палепшыўся настрой. Найперш, напэўна, таму, што мы добра, нармальна паелі, бо ня елі ўсю дарогу амаль нічога – дастаць ежы было немагчыма. А па-другое – Шабанавы нас упэўнілі, што праблемаў з харчамі ў Менску няма. Гэта паддавала энэргіі і абнадзейвала.

У той самы дзень маці хуценька пабегла на Берасьцянскую, дзе перад вайной жыў ейны дзядзька Лукаш Ваўчок, брат маёй бабкі. І сапраўды,

хата Ваўчкоў не згарэла, яны надалей там жылі і нават набылі карову. Ваўчкі падышлі да Шабанавых і таксама запэўнілі, што і яны нас падтрымаюць – харчамі, адзеньнем – каб ні мы, ні Шабанавы ня падалі духам.

Менск мяшчанскі, суседзкі, які быў вакол, паставіўся да нас вельмі прыязна, бо ўсе памяталі дзеда Васіля Зубкоўскага, ён там быў старажыл, памяталі Маню Зубкоўскую, калі яна расла. Нас прынялі вельмі сымпатычна – прыйшлі іншыя суседзі – Ждановічы, Кучынскія і Варатніцкія. Дарэчы, Варатніцкія – старыя суседзі, вельмі сымпатычныя людзі, якія мелі хату, збудаваную яшчэ гадоў на дваццаць раней за дзедаву – гэта была першая хата на Горным завулку.

Праблема Варатніцкіх

Але Варатніцкія мелі і сваю праблему. І спадарыня Варатніцкая – усе яе называлі «пані Варатніцкая» – адразу да маёй мамы: «Манечка, ну, напэўна твой муж вярнуўся, і ты сама напэўна будзеш працаваць – дык ты памажы мне». Маці кажа: «Пані Варатніцкая, я толькі сёньня прыехала, яшчэ нічога тут ня ведаю, што ж вы хочаце?» А рэч у тым, што адна дачка пані Варатніцкай арыштаваная. Варатніцкая расказала: «Першы дзень, як прыйшлі немцы, мой стары дурань вывесіў бела-чырвоны сьцяг, што мы палякі...» І калі арганізоўвалася беларуская паліцыя, пачалі арыштоўваць тых, у каго віселі бела-чырвоныя сьцягі, дык арыштавалі і дачку, і яна дагэтуль сядзіць у СД.

І гэта ў першы дзень! Маці ціхенька адказала: «Пані Варатніцкая, як прыйдзе Яўхім – ня ведаю, ці сёньня, ці заўтра – я буду пытацца, каго ён ведае...» Гісторыя гэтая закончылася так. Празь дзень вярнуўся Яўхім, маці пытаецца – каго ён бачыў, і ён кажа, што бачыў Комара – працуе ў гарадзкой управе. Ага, кажа маці – бачыў Комара, дык хадзем да Комара (Комара ведала і маці, у 20-х гадох яны разам удзельнічалі ў працы маладзёвых клюбаў). Пайшлі да Комара, і ён недзе некага ведаў з паліцыі, знайшлі дачку Варатніцкай і выпусьцілі яе. Яна вельмі шчасьлівая, атрымала працу ў гарадзкой управе, і я зь ёй гутарыў у 1991 годзе – яна, калі вярнуліся саветы, 10 гадоў адседзела ў лягеры. (Не падаю імя, бо дакладна ня памятаю – у Варатніцкіх было чатыры дачкі: Чэся, Рэня, Маня, Яня і сын Юзік.)

Камароўскія людзі

Дарэчы, Горны завулак і ўся Камароўка – гэта каталіцкі раён Менску, людзі ўсе вельмі сымпатычныя, але сьведамых беларусаў было ня так і шмат. Яны хадзілі ў касьцёл, і ня толькі ў тутэйшы Сьвятога Роха, але і ў Чырвоны касьцёл, і паколькі маліліся па-польску, дык і лічылі сябе палякамі. Памылкова, але яны думалі, што калі немцы прыйдуць, то палякі будуць граць галоўную скрыпку, а атрымалася інакш.

На Горным завулку апрача майго дзеда праваслаўных не было. Але быў каталік – Суднік – сьведамы беларус, хоць і безь вялікай асьветы. Ён меў сваё прадпрыемства – выраблялі кафлі. Нават каля Чырвонага касьцёла перад паперцю быў выкладзены квадрат гэтымі кафлямі, на іх стаяла і ягонае прозьвішча, ён браў удзел у пабудове касьцёла. Пазьней кафлі Судніка выламалі і заклалі іншымі кафлямі, бо Судніка арыштавалі ў 1938 годзе, вельмі катавалі, усё шукалі ў яго золата – маўляў, ён польскі шпіён і мае золата – але пасьля выпусьцілі. Суднікава хата не згарэла, але пры немцах ягонае прадпрыемства не працавала, хоць кафляў ляжала тысячы, і шмат людзей яшчэ прыяжджалі і куплялі тыя кафлі.

Пра беларускасьць Судніка я ведаў ад дзеда. Дзед, будучы блізка да царквы Аляксандра Неўскага на Вайсковых могілках, калі за ёй ужо не было ніякага нагляду, дапілноўваў, каб яна не разбуралася. У царкве часта трэба было рабіць рамонтныя працы, і дзед заўсёды браў Судніка, бо той і з цэмэнтам меў дачыненьне, і ведаў дзе матэрыялы купіць. Я папрасіў гісторыка Захара Шыбеку, і ў другім выданьні сваёй кніжкі пра Менск ён згадаў пра прадпрыемства Судніка.

Нашыя былыя суседзі Шабанавы ўзялі нас да сябе, але трэба было ўладжвацца самастойна, бо ў нас нічога не было. Ложак і канапу нам далі Шабанавы, далі таксама пару лаваў у сенцах – каб ваду прынесьці паставіць, далі ладна судзьдзя, сёе-тое з адзежы.

Такім парадкам жытлом нас забясьпечылі Шабанавы, у іх мы й харчаваліся. Дапамагалі з харчамі і Ваўчкі, і Варатніцкія. Знайшлася таксама радня – Рачкоўскія – дапамагалі і яны. Але мы і самі пачалі «афармляцца». На Камароўцы, непадалёку ад Інстытуту фізкультуры, на Маскоўскай шашы дзеіла кантора сацыяльнай апекі гарадзкой управы. Зарэгістраваліся мы там, каб атрымаць харчовыя карткі. Але бюракраты ў той канторы сказалі, што картак адразу не даюць – трэба чакаць пару месяцаў. Маці кажа – пакуль картачкі атрымаем, трэба ж зь нечага жыць, нельга ж увесь час у людзей карміцца.

Пастушкоўства

Каб трошкі «ўнезалежніцца», я ўзяўся за першую работу – быць пастухом. Мне сказалі, якія суседзі ў шырокім навакольлі маюць патрэбу ў пастуху, у каго адна-дзьве каровы, у каго козы – іх трэба было раніцай забіраць, ганяць па пагарэлішчах і пасьвіць цэлы дзень, толькі прыгнаць удзень падаіць. Работа была па-свойму цікавая, тых пагарэлішчаў поўна, ад Залатой Горкі і да тэатру опэры і балету – адна пустэча. Раскопваць пагарэлішчы было цікавым заняткам – козы і каровы пасьвяцца, а пастух поркаецца ў пагарэлішчы. Бывала, нешта знойдзеш, нешта раскапаеш – ніякіх вялікіх скарбаў, але аднойчы знайшоў збанок зь мёдам, што было вельмі добра.

Вельмі модна было ў тыя часы расшукваць на пагарэлішчы арытмомэтры – дакампутарныя вылічальныя машыны. Калі знойдзеш машынку ў добрым стане, дык можна было занесьці ў камісіёнку на Нямігу і нядрэнна прадаць – за тысячу рублёў. Арытмомэтры былі хадавым таварам.

Кожны такі, як я, пастух меў торбачку, у якой ляжала пару кавалкаў хлеба, амаль у кожнага была кніжка. Я памятаю, першае, што дала мне Каця Шабанава – нешта Бядулева, чаго я не чытаў. Кніжак па руках хадзіла шмат.

З «пастушкоўскага пэрыяду» мне прыпамінаецца і тое, што сярод менскіх кароваў не было ніякіх «Бурёнок» – адны Красулі, Чарнухі, Пярэстыя. Русыфікацыя да кароваў тады яшчэ не дайшла.

Былі ў гэтым «пастухоўскім» раёне і адміністрацыйныя будынкі, якія ў часе пажару абваліліся. І мы, пастухі, шукалі – у паўпадвальных памешканьнях і засыпаных гаражах тых будынкаў маглі быць засыпаныя аўтамашыны. Калі знойдзеш такую аўтамашыну, то за яе можна атрымаць некалькі мяхоў бульбы. І вось такую засыпаную машыну я знайшоў на рагу Чырваназорнай і Ямнай – там пры савецкай уладзе перад вайной быў двухпавярховы дзіцячы дом, а пад домам быў гараж. Я раскопваў, пакуль не праваліўся ў гараж, а там – засыпаная газагенэратарная палутарка! Я сказаў Колю Шабанаву, сыну гаспадароў, Коля арганізаваў зацікаўленых людзей, яны за два-тры дні прыехалі з коньмі, крыху больш расчысьцілі і выцягнулі машыну. Я атрымаў за гэта дзесяць мяхоў бульбы.

Пастухі літаральна «палявалі» на пагарэлішчах. У раёне каля гарадзкога саду, дзе некалі была хата Якуба Коласа (непадалёку ад цяперашняга забранага ў пісьменьнікаў Дома літаратара), жыло шмат вайскоўцаў. На пагарэлішчах тых дамоў можна было пазнаходзіць цікавыя рэчы. Прыкладам, знаходзілі біноклі – добрая цана на базары. Альбо, прыкладам, можна было знайсьці лягарытмічную лінейку! За такую лінейку можна было выменяць пару кіляграмаў сала. Так пастухі «прамышлялі». А каровы і козы тым часам хадзілі побач і шчыпалі травічку.

Ня быў гэта надта вясёлы занятак, але тым ня менш пастушкі зьбіраліся ў свае групкі, бліжэй знаёміліся, сьпявалі песьні, шмат чыталі, у вольны час рабілі паходы ў Сьляпянку, на азёры, у Батанічны сад.

Так прайшло лета 1942 году.

Бацькі ўладкоўваюцца

Тым часам бацькі ўладжваліся. Бацька пайшоў у БНС (Беларуская народная самапомач – дабрачынная арганізацыя з мэтай дапамогі беларусам пацярпелым ад ваенных дзеяньняў) і там атрымаў працу ў інспэктараце беларускіх школаў, ягоным непасрэдным начальнікам

быў ксёндз Гадлеўскі, бацька зь ім вельмі блізка сышоўся, і яны супрацоўнічалі ў школьнай справе. Паколькі бацька ведаў Менск, бо доўгі час у Менску жыў, дык ксёндз Гадлеўскі яму сказаў: знаходзьце больш людзей, каб прыцягнуць – настаўнікаў, навукоўцаў. Часам бацька затрымоўваўся на ноч, ня ведаю, у каго ён быў – у Гадлеўскага ці яшчэ ў каго – словам, аддаваўся працы поўнасьцю, у хатнія справы не мяшаўся.

У 1943 годзе бацька стаў рэдактарам «Голасу вёскі», і працы ў яго стала значна больш. Таксама стала больш кантактаў з раёнамі – прыяжджалі людзі і часта затрымоўваліся ў нас у хаце на Берасьцянскай.

А маці, каб нам стаць на ногі матэрыяльна, вельмі хутка «пайшла ў Западную» (Заходнюю Беларусь) – мясцовыя менскія жанчыны «хадзілі ў Западную» па прадукты. Найбольш хадзілі пад Івянец – ці, можа, там больш заможныя людзі былі, ці былі нейкія знаёмствы. Гэтыя паходы ў Западную можна было назваць прадпрымальніцкай дзейнасьцю. Тры-чатыры жанчыны дамаўляліся – «пойдзем у Западную» – і ўстанаўлялі сабе маршрут, куды яны пойдуць, да якой найдалейшай мясцовасьці дойдуць. Тады дамаўляліся, што яны панясуць: кожная жанчына мае нешта – ці то прасьціны, ці соду, іншыя «гарадзкія» прадукты для абмену на сельскагаспадарчыя – і каб не дубляваць адна адну. Пару тыдняў перад тым яны ходзяць на базар, робяць закупы. І вось, падрыхтаваўшыся, зрабіўшы закупы, зьбіраюцца, бяруць мяшкі наперавес – і ідуць пехатою ў Западную. Пройдуць 30-40 кілямэтраў і тады разьбіраюць вёскі – адна ў адну, другая ў другую і гэтак далей, а там ходзяць ад хаты да хаты, як «карабейнікі». Заходзяць жанчыны ў хату і кажуць, вось, гаспадар, у мяне ёсьць тое і тое, расчоскі, гузікі, спадніца, ёсьць губны гармонік, можа ў вас дзеці ёсьць, а гаспадар выбірае – вось за гэта я табе дам кіляграм масла, або кіляграм сала. Калі гаспадар незгаворлівы, жанчына ідзе ў другую хату і так далей. Перад тым вызначаюць адну хату, дзе яны ўсе свае рэчы зьбіраюць, і калі кожная ўсё сваё абмяняе, зьбіраюцца назад і наймаюць падводу, каб усё завезьці назад у Менск. Вазаку, вядомая справа, плаціліся таксама.

Паходы ў Западную былі тыповай зьявай у ваенным Менску. Пакуль маці ўладзілася на работу, яна схадзіла раз у Западную. А ўсяго яна была там некалькі разоў і заўсёды затрымоўвалася ў аднаго гаспадара.

Хаджэньне ў Западную мела і небясьпеку. Вельмі часта жанчыны ішлі ў вёскі, што былі ў партызанскай зоне. Партызаны начамі хадзілі па хатах і калі бачылі чужых людзей, то пачыналі пытацца адкуль ты і што ты. Часта пыталіся – пакажыце, што вы прынесьлі, і некаторыя рэчы маглі забраць. Маці аднаго разу набрала хадавы крэм, і пар-

тызаны забралі дзесяць бляшанак таго крэму і нічога не далі. Жанчыны заўсёды маўчалі, бо пачні гаварыць, дык яшчэ й паб'юць. Чым яшчэ былі небясьпечныя партызаны – вельмі часта яны не зачэпяць, але дадуць лістоўкі, каб іх занесьці ў горад. Жанчыны партызанскія лістоўкі бралі, бо адмаўляцца няма як, але перад горадам амаль заўсёды стаіць паліцыя і правярае – што ты вязеш. Дык што рабіць – выкінуць тыя лістоўкі яшчэ да паліцыі? А калі перад паліцыяй будзе партызанскі дазор, і яны праверацьць, ці вязеш ты лістоўкі? Трэба было вазьніцу заўсёды сказаць, што ты маеш лістоўкі, і той амаль заўсёды злаваўся: «Слухайце, бабы, я вас вязу і нічога з палітыкай мець не хачу – зарабіць пару капеек, і на гэтым канец! Выкідайце вашыя лістоўкі, бо інакш не паеду!»

Маці асабліва баялася мець з сабой дакумэнты, бо магло стацца, што партызаны будуць ведаць, што Марыя Зубкоўская – жонка Яўхіма Кіпеля, а ён рэдактар газэты, дык мала што можа быць, але ніколі нічога такога ня сталася.

Неўзабаве маці ўладзілася на працу – спачатку ў школьны інспэктарат, а потым у выдавецтва падручнікаў, дзе кароткі час была карэктарам, а потым перайшла ў газэту. Спачатку працавала ў «Голасе вёскі», а пасьля адначасна і ў «Голасе вёскі», і ў «Беларускай газэце» – была карэктарам.

Народная школа

У верасьні 1942 году я паступіў у 29-ю народную школу на вуліцы Горкага (цяпер там музэй прыроды ў Траецкім прадмесьці). Пры саветах я скончыў 6 клясаў, затым цэлы год гуляў, бо 7-я кляса ў 1941 годзе ў Арле не пачалася, а ў Менску я пайшоў у 7-ю клясу народнай школы.

Найперш я плянаваў запісацца ў школу, якая мясьцілася на вуліцы Падлеснай – той, што выходзіла на Савецкую за радыёзаводам (па вайне там быў прыборабудаўнічы завод імя Леніна). Гэтая школа была найбліжэйшая да Берасьцянскай вуліцы, дзе мы жылі – вялікі будынак – але яна была ўжо ўкамплектаваная, і мне сказалі, што ня могуць узяць ніяк, хоць я і жыву ў школьным раёне.

Іншая школа была ў бок галянтарэйкі, недзе на Правіянцкай – зусім далёка і ў другі бок, я туды не пайшоў.

Школьнай справай я займаўся сам і вырашыў пайсьці ў інспэктарат, каб знайсьці школу, дзе былі вольныя месцы, і мне там сказалі: паспрабуй школу на вуліцы Горкага. Гэта было досыць далёка, але месцы ў школе былі, і я паступіў у сёмую клясу. Школа мясьцілася ў старым яўрэйскім будынку – было мала прасталінейных архітэктурных элемэнтаў, усё паўкругамі, зыгзагамі, была таксама маленькая паўпадвальная заля.

Запіс у школу адбываўся прыблізна так: былі патрэбныя дакумэнты, была строгая бюракратыя. Мне сакратарка, маладая жанчына, аўтарытэтна, па-начальніцку сказала: мы вас прымаем, але гэта ня ваш раён, так што ведаеце... Я ёй кажу: «Таварыш...» (Трэба сказаць, што слова «спадар» тады яшчэ не было ў шырокім ужытку, а слова «товарищ» у Арле гучала нармальна, і хоць немцы прыйшлі, «господином» там ніхто яшчэ нікога не называў.) І вось я кажу сакратарцы «таварыш», а яна так мяне адчытала, маўляў, тут ужо «таварышы» скончыліся. Я кажу: «Выбачайце, я толькі два месяцы як прыехаў зь іншай зоны і ня ведаю, як тут зьвяртацца». Яна папярэдзіла, каб я нідзе больш слова «таварыш» не казаў. Уся гэтая размова, вядома, была па-беларуску.

Гэтак пачалася мая навука пры немцах. У клясе было чалавек 10-12. Вучні мяне прынялі досыць холадна, бо я быў не такі мянчанін, як вучні, я для іх быў «прыежджы», хоць і гаварыў па-беларуску. Бальшыня вучняў таксама гаварылі паміж сабой па-беларуску, але дзьве-тры дзяўчынкі гаварылі па-расейску. Я чуўся ня надта добра, бо, па-першае, я ўсё ж быў «прыежджы», а па-другое, я адчуваў, што яны ведалі больш пра літаратуру, пра геаграфію Беларусі – гэта ж ужо сёмая кляса. А я апрача мовы амаль нічога ня ведаў. Пачалася лекцыя літаратуры, праходзілі Багушэвіча, а я сядзеў, як на турэцкім казаньні. Пасьля была лекцыя сьпеваў, настаўнік Лешчанка – і прынамсі той рэпэртуар, які яны сьпявалі, мне быў новы. Далей прыйшло грамадазнаўства, і зноў жа ў мяне веды былі вельмі слабыя...

Павучыўшыся тыдзень, я прыйшоў да маці і кажу, што ў гэтай школе я дрэнна чуюся. Я быў гатовы кінуць гэтую школу, бо не было кантакту ў ведах. Я адчуваў, што ўсе вучні ведалі добра беларусаведныя прадметы, і мне гэта было балюча, хоць гаварыў я свабодна і нармальна, нават, як мне здавалася, лепш за некаторых іншых вучняў. Была яшчэ ў мяне гутарка з дырэктарам – дырэктарам быў Пётра Сямёнавіч Кісель – паклікаў ён мяне ў дырэктарскую і кажа: бачу, што табе нечага не хапае, я ведаю твайго бацьку, разумею, ты новы, табе цяжка, я пагавару з бацькам.

У адным, у чым я сябе адчуваў значна лепш за ўсіх вучняў – гэта ў нямецкай мове. Я жыў шэсьць месяцаў разам зь немцамі, дык ужо прыстойна гаварыў, а менскія вучні па-нямецку яшчэ слова не маглі зьвязаць.

Карацей, я нагаварыў маці «сорак бочак арыштантаў» супраць гэтай школы. Мне яшчэ ў Арле падабалася, што ня трэба ў школу хадзіць, ня трэба рана ўставаць – гэта захапляе. Думаў: буду гуляць... Маці мае нараканьні на школу рэзка спыніла і сказала: выкінь гэтыя думкі з галавы – беларускую школу ты закончыш!

Антон Лёсік

Невясёлая для мяне стварылася сытуацыя. Але аднойчы ўвечары бацькі мне кажуць: «Мы табе нанялі рэпэтытара». Я аж падскочыў! У мяне ў галаве: ну, зноў пачынаецца як з музычнай школай. (Маці спрабавала мяне запісаць у Арле ў музычную школу, але я выкруціўся!) Само слова «рэпэтытар» гучала для мяне адмоўна – калі табе наймаюць рэпэтытара, дык у маім уяўленьні гэта азначала, што з табой ня ўсё ў парадку. У школе пры саветах, калі некаму наймалі рэпэтытара, то мы адчувалі, што гэты дзіцёнак зусім «выкінуты за борт». І тут – мне нанялі рэпэтытара! Гэта было для мяне вялікім шокам, я ня ведаў, што рабіць. Як-ніяк пятнаццаць гадоў, ты чуесься чалавекам незалежным. Я, вядома, сказаў, што ў ніякім выпадку, нікуды я не пайду, не кажыце мне, я лепей за вас ведаю. Ну ж, бацькі гэта бацькі – надзьмесься, паходзіш, а пасьля вернесься ў хату – трэба слухацца. Я пагадзіўся.

А рэпэтытарам мне нанялі Антона Лёсіка. Бацька пагаварыў з Кісялём, і Кісель яму кажа: з хлопцам усё ў парадку, але ж адкуль ён будзе ведаць літаратуру – Багушэвіча, Неслухоўскага... А бацька з 20-х гадоў ведаў Язэпа і Антона Лёсікаў.

Завёў мяне бацька да Антона Лёсіка. Жыў ён на рагу Інтэрнацыянальнай і Камсамольскай, насупраць нямецкага Soldatenheim'у, на другім паверсе. Дом гэты стаіць і цяпер. І дамовіліся мы, што два разы на тыдзень я буду з школы, з вуліцы Горкага, хадзіць да яго, і ён будзе са мной займацца літаратурай, гісторыяй, геаграфіяй. Бацька дамовіўся зь ім, што на тыдзень будзе даваць за гэта дзьве буханкі хлеба – ён будзе заносіць сам, бо працаваў у цэнтры гораду, непадалёку ад школьнага інспэктарату, дзе працаваў бацька.

Першы паход да рэпэтытара быў асьцярожны – іду я па Нямізе, плятуся, ня ведаю, што мяне чакае, і ўвесь сьвет мне нямілы, хоціць ужо таго, што школа занятак мусовы, а яшчэ й рэпэтытар – ну проста канец сьвету. Прыходжу я да Лёсіка – дзядзька наагул маларазмоўны, але пытаецца па-настаўніцку: ну як, што, адкуль прыехаў... Ляжыць у яго пару кніжак – як цяпер помню: «Полацка-віцебская старына», прыгожая, з царквой на вокладцы. Пачнем, кажа, з гэтага – і пачаў тлумачыць мне гісторыю, досыць займальна. На першай лекцыі ён яшчэ мову не кранаў, а пачаў гістарычнае апісаньне – і так між намі пачаўся дыялёг. Наступная лекцыя была пра мову, і ён мне пачаў даваць крышку граматыкі – паглядзеў, колькі я ведаю, якія я правілы вучыў.

Паступова на працягу месяца Лёсік ахапіў і геаграфію, і гісторыю, і літаратуру, і мову. Кожны раз я праводзіў зь ім паўтары-дзьве гадзіны, і мне ўсё рабілася цікава. А тады ўжо ён пачаў даваць больш сыстэматычныя веды па гісторыі, якой я ніколі не вучыў, якая за-

сяроджвалася на Беларусі – у маіх ранейшых школах такога й блізка не было.

Зь Лёсікам было вельмі цікава, я правучыўся зь ім ад верасьня 1942 да травеня 1943 году – мы сустракаліся два разы на тыдзень і гаварылі, і гаварылі... Часам у яго ў хаце бывала дзяўчына большменш маіх гадоў, але яна хутка сыходзіла. Хата ў яго была застаўлена кнігамі. Цікава, што Лёсік як настаўнік рыхтаваўся да гэтых лекцыяў – кожны раз, як прыходзіш, ляжыць стос кніжачак, якія ён табе ў часе гэтых гутарак пакажа. І я хутка зразумеў, што даганяю іншых у маёй клясе, а па гісторыі ці па геаграфіі ведаў нават і больш за іх. Адным словам, я за той год нашмат перагнаў сваіх аднакашнікаў у школе ў беларусаведзе.

Пасьля выпускных экзамэнаў у школе я зайшоў да Лёсіка, паказаў яму адзнакі – ён ухмыльнуўся, пахлопаў мяне па плячы і сказаў: «Ну, хлапчына, працуй далей». І хоць ён быў чалавек негаваркі, у нас атрымаўся кантакт. Я лічу яго адным з сваіх першых добрых настаўнікаў беларусазнаўства – ён закранаў усё. Ён быў мне нават не як настаўнік, а як старэйшы чалавек, які захоплівае цябе сваімі ведамі. І я ўжо безумоўна ніколі бацькам не сказаў, але тое, што яны нанялі яго для мяне – гэта было вельмі добра. Пазьнейшае навучаньне таксама шмат дало, але Лёсік сапраўды даў мне вельмі шмат, гэтае рэпэтытарства мне запомнілася на ўсё жыцьцё. Ён нават падараваў мне кнігу паэзіі, здаецца «Маладняк Аршаншчыны». Яна пасьля недзе згубілася, здаецца, мы пакінулі ў Менску, калі выяжджалі зь Беларусі.

Школьны год

З школьнага году мала што запомнілася. З настаўнікаў самы цікавы быў дырэктар Пётра Кісель – беларускамоўны, вельмі патрабавальны і вельмі дбайны. На працягу году ён нам прынёс падручнікі Ігнатоўскага – спачатку адзін, потым пяць, потым кожнаму вучню. Дырэктар Кісель таксама прынёс фізычныя карты Беларусі і даў кожнаму вучню. Потым дзякуючы спадару дырэктару зьявілася чытанка «Родны край». Трэба сказаць, што ў яго былі вялікія сувязі ў Менску.

Само навучаньне ў школе – гэта быў працэс штодзённы, шэры, трэба было хадзіць на лекцыі, рабіць канспэкты, бо падручнікаў шмат якіх не было, некаторыя былі няпоўныя, настаўнікі іх адмянялі. Задавалі ладна хатніх заданьняў.

Усяго ў школе было сем клясаў і каля 150 вучняў – калі мы зьбіраліся ў нашай маленькай залі, яна набівалася паўнюткая. Сам школьны будынак быў нестандартны, у ім было, здаецца, толькі дзевяць пакояў.

Першая грамадзкая праца

Прыпамінаю, што ў школах, асабліва з восені 1942 году, амаль кожны тыдзень трэба было браць удзел у грамадзкай працы – дапамагалі сіротам, займаліся з малодшымі вучнямі. У Менску ў той час было шмат дамоў для сіротаў – у каго бацькі загінулі або ўцяклі, а дзеці засталіся – і ім у тых дамах трэба было шмат чаго зрабіць. Дык часам у вучняў пыталіся – ці твой бацька можа тое ці тое дапамагчы зрабіць. А раз дырэктар Кісель прыйшоў і кажа, што па цэлым горадзе будзе збор грошай на сірацінцы, і вучні шостай і сёмай клясаў павінны ў гэтым браць удзел. Адбылася тая падзея ў канцы кастрычніка ці пачатку лістапада, і гэта быў мой першы досьвед грамадзкай дзейнасьці.

У пятніцу пасьля заняткаў вучні разам з дырэктарам цэлай клясай пайшлі пад царкву на Нямізе. У прыцаркоўным доме сабралася каля 150 дзяцей, і нам сказалі, што заўтра раніцай мы мусім сюды прыйсьці, нам раздадуць скарбонкі і з гэтымі скарбонкамі трэба будзе пайсьці, куды накіруюць, і зьбіраць грошы.

Назаўтра раніцай, у суботу, я атрымаў бляшаную скарбонку зь беларускім сьцягам, і мяне паслалі ў раён, дзе трактарны завод. Заводу тады яшчэ не было, але былі паасобныя вялікія будынкі і баракі, людзі ўжо жылі. Той раён як бы лічыўся і не зусім менскі, жылі там людзі новыя, прыежджыя, мянчане да іх ставіліся непрыязна. Калі мы выходзілі з залі, нас праводзілі «напутственным словом» сьвятары. Я запамятаў айца Кушнера і айца Лапіцкага – яны пытаюцца: «А ты куды ідзеш?» Я сказаў куды. «О, – кажуць, – ты там асьцярожней з гэтым сьцягам...» Я ведаў у чым, справа – у Менску ня ўсюды зь беларускім сьцягам было бясьпечна хадзіць. Я нічога не сказаў, але сам думаю: ладна, мне абы адбыць дзень, грамадзкі абавязак. Гэта быў першы раз, і я не хацеў «ударыць тварам у гразь». Запісалі нас у сьпіс, і каля гадзіны пятай ці шостай мы мусілі вярнуцца і здаць скарбонкі.

І я пайшоў... Хаджу, стукаю ў дзьверы, кладуць – хто 10 марак, хто 100 рублёў. Я так да паўдня бачу, што мая скарбонка набітая, а гадзіне а 3-й ужо не было куды пхнуць! Думаю, як ня пхнецца, дык трэба ісьці назад. І нічога, што сьцяг быў – пастукаеш у дзьверы, «мы зьбіраем на дзяцей-сіротаў». Дык людзі або адразу лезьлі ў кішэню, або казалі «заходзь» і давалі грошы. А нас папераджалі, каб гаварылі ўсюды па-беларуску, каб сказалі, што вучні такой і такой школы, каб не выглядала, што нейкі жулік. Я быў зьдзіўлены: ня памятаю дакладна – больш за дзесяць тысячаў сабраў. Але справа нават ня ў суме, а ў тым, што я найбольш набраў марак, а ў той час марка каціравалася больш, чым рубель. За маркі і ў немцаў можна было нешта купіць, а на рублі яны не прадавалі. Здаў я сабраныя

грошы, набітую скарбонку, мяне яшчэ перапыталі – ты ў тым раёне столькі сабраў?

Зімой вучні хадзілі зьбіраць грошы яшчэ разы тры – людзі сапраўды шчодра давалі на сірацінцы.

Дырэктар Пётра Кісель і настаўнікі

Чым адзначаўся дырэктар Пётра Кісель, дык гэта тым, што 29-я школа ўдзельнічала амаль ва ўсіх гарадзкіх мерапрыемствах беларускай грамадзкай накіраванасьці. Пазьней была праца па ўпарадкаваньні старога будынку на Інтэрнацыянальнай, у раёне Гарадзкога валу, каля Пішчалаўскага замку – трэба было падрыхтаваць будынак для беларускай харытатыўнай арганізацыі. Вучні працавалі цэлы дзень – выносілі сьмецьце, мылі, чысьцілі. Бясспрэчна, што дырэктар Кісель уцягваў школу ў грамадзкую дзейнасьць гораду. У мяне наагул аб гэтым настаўніку засталося прыемнае ўражаньне як аб беларускім дзеячу. Калі я пасьля вучыўся ў прагімназіі, то ня меў лучнасьці з дырэктарам Кісялём. Я чуў, што пазьней яго расстралялі, казалі, што ён меў сувязь з партызанамі, што быў замешаны ў забойстве Гадлеўскага – гэтага я дакладна ня ведаю. Але як пэдагог і настаўнік ён быў вельмі беларускі і гэтую беларускасьць вучням і настаўнікам заўсёды стараўся перадаць і прывіць праз школьную дзейнасьць і ўдзел у грамадзкай працы.

Іншыя настаўнікі. Спадарыня Бранавіцкая выкладала геаграфію. Біялёгію выкладала настаўніца, прозьвішча якой ужо ня памятаю, але аднойчы яна паслала нас на Нямігу, каб мы злавілі жабаў і на іх рабілі досьледы – мы злавілі, зрабілі досьледы. Назаўтра прыходзім у школу, настаўніца задае нейкае пытаньне, а нехта адказвае «Жаба», і так гучала, нібыта гэта пра яе, і ад таго часу яе празвалі Жаба і цэлы год толькі так і называлі. Адзін раз яна пачула і пачала плакаць, а вучні былі такія злосныя, што замест таго, каб спыніцца, пачалі яшчэ больш яе так клікаць. Яна старалася, каб усё было па-беларуску, я гэта ўспрымаў нармальна – я прыйшоў з расейскай школы, і таму для мяне ў Менску тое, што тэрміналёгія па-беларуску, было натуральным. А некаторыя дзяўчаткі, якія гаварылі па-расейску, стараліся і адказваць па-расейску, і адзін раз яна ім дала лекцыю: «Калі я гавару так, то і ўсе адказваць будуць так!» Была ў нас фізычка – дык тая гаварыла 50 на 50, і нічога ёй дырэктар Кісель ня мог зрабіць, хоць і вымагаў беларускасьці.

Аднак агульны тон у школе быў беларускі, і калі пачалася падрыхтоўка для фармаваньня СБМ у 1943 годзе, то з 17 чалавек з трох старэйшых клясаў паступова запісалася 10. Тыя, што запісаліся, мусілі раз на тыдзень хадзіць у штаб СБМ, дзе таксама выкладалі гісторыю, вучылі песьні. (Я ўжо ня памятаю, хто прыходзіў з кіраўнікоў СБМ

і казаў, што фармуецца арганізацыя.) Адзін запісаўся, што паедзе ў Альбэртын – Толя Бураў, ён пасьля пайшоў у партызаны – а тады прыехаў з Альбэртыну зь пісталетам і ледзь мяне не застрэліў – прынёс у школу, а я кажу, што гэта несапраўдны пісталет, дык ён кажа – стань пад дошку, я выстралю. І выстраліў! – у сьценцы была дзірка, добра, што я адышоў ад дошкі...

Вучні

З вучняў я найбольш сябраваў з Жэнькам Куліным, я яшчэ й цяпер зь ім трымаю кантакт. Жэнька жыў каля Старажоўскага рынку, а я пасьля школы вельмі часта ішоў на рынак гандляваць, прадаваў сахарын – хлеба заўсёды не хапала, і трэба было на базары купіць сьвежы. Мы з Жэнькам часта ішлі з школы разам і неяк пасябравалі, ён з 1928-га, я з 1927-га, ён добры быў у фізыцы і ведаў шмат усяго беларускага. У 1944-м нашы дарогі разышліся, але калі я прыехаў у 1991 годзе, мне Мальдзіс кажа: нехта хоча з вамі сустрэцца. Ён сустрэў таго чалавека на паседжаньні ўправы Сацыял-дэмакратычнай грамады, гэта быў сябра ўправы Яўген Кулін, які сказаў, што мяне ведае і прачытаў у газэце, што я прыяжджаю. Мы зь Яўгенам сустрэліся, і сяброўства нашае працягваецца.

Другі мой сябра – Лёня Шкода. Ён жыў якраз насупраць дома Антона Адамовіча каля Гарбарнай, недалёка ад рэчкі, і час ад часу я і зь ім хадзіў дахаты, калі ня йшоў на рынак, ад Гарбарнай па Першамайскай і адтуль на Берасьцянскую. Калі мы былі ў 1991 годзе ў Менску, ён перадаў мне ў гатэль пісульку: «Калі помніш Лёню Шкоду – зазвані». Я ноччу з гатэлю зазваніў – сустрэліся, абняліся – сяброўства прадаўжаецца. Лёс наканаваў, што кожны ішоў цяжкім шляхам.

Трэці сябар – Саша Запарожац, быў пасьля даўгі час у Менску хірургам, у школе быў актыўны, але больш аддаваўся навуцы.

Усе трое і цяпер жывуць у Менску.

Нямецкае

Часта на ўрокі настаўнікі прыносілі часапіс «Беларуская школа», у гэтым часапісе былі партрэты Гітлера, іх як бы не заўважалі – ніхто ніколі ні славечка пра іх не казаў. Адзінае, дзе мог быць нейкі «пранямецкі» мамэнт – на лекцыях нямецкай мовы наша немка (я ўжо забыўся яе прозьвішча) заўсёды давала вучыць тры-чатыры вершыкі на выбар, і сярод іх заўсёды быў нейкі мадэрны тагачасны, часам больш-менш нацыстоўскага зьместу – пра ўздым будаўніцтва новага грамадзтва або пра тое, што Бэрлін робіцца цэнтрам сьвету ці нешта падобнае. Але мы ніколі гэткіх вершаў не выбіралі. Бальшыня выбірала Гётэ, некаторыя Шылера.

Нямецкага прапагандысцкага ціску ў школе не адчувалася – партрэтаў Гітлера нідзе не вісела. Над уваходам у школу – гэта быў такі франтон – часам вісеў адзін беларускі сьцяг. І за той год, што я вучыўся ў 29-й школе, немцаў там і блізка не было, хоць нямецкія машыны ўвесь час прыяжджалі ў шпіталь – старую бальніцу на вуліцы Горкага.

Аднойчы школа ўдзельнічала ў радыёпраграме. Вучняў – чалавек 30-40 – павялі на радыёстанцыю (на Інтэрнацыянальнай, ідучы ад пляцу Волі, другі дом зь левага боку, а з правага боку – амаль насупраць, была рэдакцыя газэты), там рыхтавалася інсцэніроўка, кожная кляса мусіла нешта дэклямаваць. Пасьля нас павялі ў залю, далі там пячэньня, чаю, зрабілі фатаграфіі. Памятаю – тры немцы ў уніформе прыйшлі фатаграфавацца каля піяніна, дзе грала дзяўчынка, і чакалі, што ўсе іх абступяць – а дзеці ня йдуць! Тады прыйшла Абрамава з «Саўкам ды Грышкам» – і каля яе стала сто дзяцей. Немцы зрабілі добрую міну, маўляў, ня хочуць фатаграфавацца. А фатаграфія з Абрамавай недзе ёсьць, я нават сябе пазнаў на той фатаграфіі.

Экзамэны

На сёмай клясе народная школа канчалася, і адбыўся выпуск. Перад тым апошнія экзамэны я здаваў у шостай клясе, яшчэ пры саветах: уваходзіш у клясу, цягнеш білет і адказваеш. Рыхтавацца было лёгка – быў падручнік. У народнай школе было інакш. Па такіх прадметах, як трыганамэтрыя, былі падручнікі, а па грамадзкіх прадметах падручнікаў не было, трэба было рыхтавацца па тым, што настаўнікі выкладалі на лекцыях. Прыкладам, па гісторыі поўнага падручніка не было, праўда, на руках быў падручнік Ігнатоўскага, але настаўнік даваў больш матэрыялу і патрабаваў, каб запісвалі, і ў клясе заўсёды было пару чалавек, якія добра запісвалі. Я ў гэтым быў вельмі няспрытны, але некаторыя, як Марыя Букацкая ці Рыта Хацкевіч, пісалі вельмі добра. Дык перад экзамэнамі мы зьбіраліся ўтраёх-учацьвярох, ішлі ў Крушыльнік – лес за Сьляпянскім возерам, і вучыліся разам. Там было спакойна, мы некалькі разоў туды хадзілі, вучылі, задавалі адно аднаму пытаньні і так рыхтаваліся да выпускных экзамэнаў.

Стварэньне СБМ

Як у школе ствараўся СБМ. У лютым 1943-га прыйшоў чалавек у школу, вытлумачыў старэйшым вучням, што рыхтуецца стварэньне маладзёвай арганізацыі, яна будзе нацыянальная, будуць эмблемы, форма. Ніхто пытаньняў не задаваў, але ў арганізацыю

запісалася напачатку, можа, чалавек 10-15. Яшчэ той арганізатар сказаў, што арганізацыя мае свой будынак – штаб СБМ, туды можна будзе хадзіць на лекцыі беларускіх танцаў, або, як тады пачалі часта казаць, скокаў (мы з гэтага слова падсьмейваліся, Менск да гэтага слова ня быў гатовы, можа дзе ў Заходняй Беларусі і скакалі, а ў Менску танцавалі, скакалі – гэта ўжо нешта іншае). Дык вось, штаб СБМ будзе каля Нямігі, там будуць скокі-танцы, сьпевы, гісторыя, геаграфія. Са школы мала хто хадзіў, ніхто не заклікаў, не прымушаў, але я хадзіў рэгулярна – мяне гэта цікавіла, я больш хацеў ведаць пра арганізацыю, таму я шмат з кім у СБМ перазнаёміўся. Я не высоўваўся наперад, але стараўся быць дзе праходзіла нешта беларускае.

У штабе СБМ пераважала моладзь – асабліва кіраўнікі – з Заходняй Беларусі, хоць і мянчанаў было парадкам. Асабліва цікавыя ў штабе былі сустрэчы з рознымі беларускімі дзеячамі – зь менскіх дзеячоў там бывалі Антон Адамовіч, Платон Жарскі, Анатоль Комар.

Выбух у тэатры

22 чэрвеня 1943 году ў гарадзкім тэатры ладзілася ўрачыстасьць з нагоды стварэньня СБМ. Я ня трапіў у тэатар выпадкова. Я ўжо быў апрануўся, надзеў форму (нам яе далі ўжо ў красавіку) і рыхтаваўся ісьці, як раптам нам прывезьлі дровы – маці купіла на базары, і якраз у гэты дзень іх нам прывезьлі, накідалі поўна каля брамы, што не ўвайсьці. І маці кажа: здымай форму, бяры калоду, бяры сякеру і сячы дровы, каб да вечара ўсё было пад паветкай. Я ёй: «Што ты кажаш, у мяне ж зборка!» Яна кажа – усе гэтыя зборкі гэта чапуха, давай во сячы дровы. Я па бацьку, бацька кажа: слухай, дровы на зіму патрэбныя, пакінуць на вуліцы мы іх ня можам, бо пакрадуць, або можа дождж пайсьці, дый ня могуць яны так ляжаць вываленыя перад брамай. Хоць у прынцыпе бацька быў на маім баку, але матчына слова пераважыла. Прынёс я калоду і цэлы дзень махаў сякерай...

І так я ў тэатар не пайшоў, а там адбыўся выбух, загінула 13 СБМ-аўцаў. Дні праз чатыры іх хавалі. Аднаго зь іх я збольшага ведаў і яшчэ бачыў пару разоў каля рэдакцыі – Яраслава Кушаля, старэйшага сына Кушаля і Арсеньневай, астатніх я ня ведаў. Хавалі іх на Вайсковых могілках у адной брацкай магіле, яна была на рагу Берасьцянскай і Даўгабродзкай, уздоўж Даўгабродзкай мэтраў на 25. Людзей было шмат – не скажу, што тысячы, але сотні пэўна былі – асноўная маса была на Даўгабродзкай, уся вуліца была зачыненая. Там, здаецца, і плота ў той час не было. Цяпер тое месца зарослае травой, ніякіх магілаў няма, але мабыць ведаюць, хто там пахаваны, і нікога больш не хаваюць.

Лета ў СБМе

Скончыў я народную школу ў канцы чэрвеня, і было перада мной цэлае лета. Можна зноў пасьвіць козы, можна хадзіць у СБМ – там амаль кожны дзень была заплянаваная праграма – то маршыраваць, то вучыцца песьняў, то лекцыя грамадазнаўства.

Штаб СБМ быў на вуліцы Вызваленьня – калі ідзеш па Нямізе ад мосту на вуліцы Багдановіча і даходзіш да маленькай вулічкі направа зь Нямігі, што выходзіла на вуліцу Астроўскага, дык зьлева ў канцы вулічкі быў штаб, будынак барачнага тыпу. Штаб быў вельмі актыўны – кожны дзень у будынку вывешвалася праграма дня, і ў гэтай праграме быў пункт «маршовай падрыхтоўкі». Што гэта азначала – прыходзяць вучні, якім няма чаго рабіць, сядзяць усярэдзіне або на траве перад будынкам, і калі набіраецца чалавек 20-30, выходзіць кіраўнік – зьвязовы ці падправаднік – і кажа: цяпер будзем маршыраваць. Так фармуецца калёна, і іх пачынаюць ганяць па горадзе: сьпярша на Нямігу, але Няміга крывая, там няма патрэбнага рэзанансу, пачынаецца песьня – «Гэй, у лесе каліна», «Гэй з намі радамі» ці «У гушчарах», а затым выводзяць на Камсамольскую, пасьля на Савецкую, тады ідуць пад Управу, далей на стадыён «Дынама», пасьля па Карла Маркса, каля тэатру... Адным словам, ганяюць калёну па цэнтры гораду, камандуюць права-лева, а калёна маршыруе, сьпявае. Ну, моладзі раз ці два яно й нядрэнна, але калі кожны дзень, то ўжо надакучае. Нават часам калёну юнакоў гналі па Савецкай аж на Камароўку, да Інстытуту фізкультуры. Рабілася гэта, на маю думку, больш для прапаганды.

Праца з Варатніцкім

Я таксама раз ці два памаршыраваў, а пасьля думаю – ладна, трэба шукаць нейкі іншы занятак. І знайшлася для мяне праца. Дачка Варатніцках, якая сядзела ў СД і якую адтуль дапамагла выцягнуць мая маці, уладзілася працаваць у гарадзкую ўправу. (Гарадзкая ўправа была каля стадыёну на вуліцы Карла Маркса, ідучы ад тэатру ўніз кварталы праз чатыры зь левага боку.) Гэтая спадарыня ва ўправе была невялічкай начальніцай і знайшла працу для «татуся» (яна называла свайго бацьку «татусь») – замураваць у будынку ўправы ўсе люкі ніжэй падвальнага памешканьня. Іх было вельмі шмат, туды і пацукі лазілі, і вада залівалася. Татусь на працу згадзіўся і шукае памочнікаў. Прапанавалі мне: «Ты, Вітка, будзеш вельмі добры памагаты». А што трэба рабіць? «А табе дадуць каня, падводу, і ты будзеш падвозіць гліну». Цэмэнту было мала, дык тыя дзіркі замуроўвалі глінай. Татусь Варатніцкі знайшоў мулярaў, сам ён быў за «прараба», а я мусіў на кані вазіць гліну – за Ляхаўкай быў кар'ер, ужо амаль за

горадам, па Чэрвенскім тракце зьлева. Трэба было нагрузіць гліны на падводу і завезьці пад управу. Я месяца паўтара гэтым займаўся – кожны дзень а 6-й раніцы ішоў ва ўправу, браў каня і вазіў гліну. Зарабіў я за гэта чатыры мяшкі солі, што было багацьце, бо соль была вельмі каштоўным прадуктам. Соль дорага цанілася на базары, а яшчэ болей у сялянаў у «Западнай». З маім заробкам – сольлю – мы «разбагацелі». За гэтай працай я правёў лета 1943-га.

Лета і восень 1943: бежанцы, забойства Кубэ

Выбух у тэатры ў чэрвені пакінуў цяжкое ўражаньне ў шырокіх колах жыхарства. Падзея ўсяліла ў людзях страх. Але, тым ня менш, нацыянальная дзейнасьць працягвалася: былі арганізаваныя новыя адзінкі СБМ, болела менчукоў у арганізацыі, у штабе СБМ – калі мне даводзілася туды заглянуць – праграмная дзейнасьць пашыралася, часьцей адбываліся лекцыі з грамадазнаўства.

Што пачало зьмяняцца ў Менску пад восень 1943 году, дык гэта колькасьць новых людзей – бежанцаў з Расеі ды ўсходніх раёнаў Беларусі. У горадзе йшло «ўшчыльненьне» – прадстаўнікі гарадзкой управы хадзілі па хатах і прызначалі туды новых жыльцоў-бежанцаў. Прыкладам, да нас на Берасьцянскай была «прымацаваная» сям'я з Смаленску: маці і двох сыноў, 9 і 5 гадоў, яны занялі адзін з нашых пакояў. Бежанцы стваралі ў горадзе нэрвовы настрой. Калі ўвосень я пайшоў у настаўніцкую сэмінарыю, да нас запісалася каля дзесятка дзяцей бежанцаў, у прагімназію пасьля прыйшлі толькі двох.

Раптам параўнаўча «спакойнае» жыцьцё было парушанае: сталася вялікая падзея. У канцы верасьня ў сваёй рэзыдэнцыі ў цэнтры Менску быў забіты генэральны камісар Беларусі Вільгельм Кубэ. Бясспрэчна, падзея гэтая была неардынарная: вялікая і злавесная. Адразу разышлася чутка, што Кубэ забілі жанчыны, зьвязаныя з партызанамі (Кубэ быў бабнік), якія падклалі «каханку» міну ў ложак.

Забойства Кубэ напалохала жыхароў Менску – людзі вельмі баяліся рэпрэсіяў. Базары апусьцелі, людзі баяліся хадзіць па большых вуліцах, баяліся аблаваў. Уначы спалі на агародах, уладжваліся нават на Вайсковых могілках паміж магілак, ішлі пад Сьляпянку ў поле. Горад ахапіла паніка.

Але страх трываў нядоўга. Наколькі я ведаю, немцы «за Кубэ» арыштавалі некалькі чалавек, і справа паступова пачала заглухаць. Праўда, у нацыянальна-адміністрацыйных колах былі «жывыя» забойствы беларусаў – Фабіяна Акінчыца, Уладзіслава Казлоўскага, Вацлава Іваноўскага – і тут страх, магчыма, быў большы, чым ад забойства Кубэ. Аднак паступова ў галовах людзей пачалі дамінаваць весткі, што рыхтуецца стварэньне нечага накшталт беларускага ўраду.

Прызначэньне фон Готбэрга на месца Кубэ было ўспрынятае амаль адмоўна. Калі нам, гімназістам, на «лінейцы» пра гэта паведаміў дырэктар Акановіч, дык ён нават выказаўся: «Не забывайцеся, што Готбэрг – гэта СС!» Праўда, гэтае выказваньне засталося без камэнтароў: тлумач як хочаш.

Але, як паказалі далейшыя месяцы, фон Готбэрг быў параўнаўча «ціхі». У грамадзтве дамінавала навіна пра стварэньне Беларускай цэнтральнай рады, і хоць Рада была заьцверджаная Готбэргам, ягоную «прысутнасьць» пры гэтым імкнуліся не заўважаць.

Наагул, стварэньне БЦР пад канец 1943 году пераважала ўсе іншыя навіны. Гэтую падзею ацэньвалі як стварэньне беларускага ўраду, хоць было паўнютка і скептыцызму – мала хто верыў, што немцы дазволяць паўнацэнны беларускі ўрад.

Настаўніцкая сэмінарыя

Тым часам немцы пачалі вельмі агрэсіўна вывозіць моладзь у Нямеччыну, і трэба было быць вельмі асьцярожным. Аблавы, паляваньні на моладзь сталіся штодзённай зьявай. Людзі ў Нямеччыну ехаць не хацелі – хто ж хацеў быць парабкам, а немцам была патрэбная працоўная сіла – у Нямеччыне ўсіх мужчынаў забралі на фронт, іх білі, і не хапала людзей. Маладыя людзі зь Беларусі былі добрыя работнікі, дык немцы спрабавалі гэткіх работнікаў чым болей налавіць.

Але ўвесну 1943-га паступае навіна, якую мой бацька адразу даведаўся – немцы дазволілі адчыніць настаўніцкую сэмінарыю, прагімназію і фэльчарскую школу. У фэльчарскай школе амаль сфармаваны настаўніцкі склад, а прагімназія і сэмінарыя да восені таксама будуць гатовыя. Гэта давала надзею, што шмат моладзі можа пайсьці ў гэтыя школы – і так уратавацца ад вывазу ў Нямеччыну, бо вучняў не забіралі.

4-гадовая настаўніцкая сэмінарыя адчынілася ў верасьні на Цнянскай (дакладней, паміж вуліцамі Цнянскай і Беламорскай). Там стаяў вялікі будынак – драўляны, але вельмі добра зроблены. Казалі, што ў будынку меўся быць тэхнікум, так што ён быў дастасаваны да вымогаў навучальнай установы. І я паступіў у сэмінарыю. Прагімназія яшчэ не адчынілася.

Слова сэмінарыя мне наагул не падабалася – для мяне гэтае слова было дзіўнае – і тым больш настаўніцкая сэмінарыя, бо я не плянаваў быць настаўнікам. Хоць я сам зь сям'і настаўнікаў і вельмі гэтую прафэсію паважаю, але я бачыў, што прафэсія гэтая вельмі цяжкая, і трэба мець пакліканьне для гэтае прафэсіі. Мне такога пачуцьця настаўніцкай цярплівасьці і вытрымкі не хапала. Тым ня менш я паступіў, бо ў Нямеччыну ехаць не хацелася.

Калі я прыйшоў у першы дзень на пачатку верасьня, у сэмінарыі было больш як 100 чалавек, а можа нават і больш. Усіх вучняў сабралі ў вялікай залі. І там, дарэчы, я сутыкнуўся з Зорай – маёй будучай жонкай. Сталася гэта так. Вучняў выклікалі па прозьвішчы, а мяне яшчэ маці не перапісала з Зубкоўскага на Кіпеля, і мяне выклікалі як Зубкоўскага, а Зора пару разоў бачыла мяне ў рэдакцыі і ведала, што я сын Кіпеля. І як мяне назвалі Зубкоўскім, дык яна фыркнула: «Ён жа ж Кіпель, колькі ж можна мець прозьвішчаў». Мне гэта не спадабалася – што з хлопца сьмяецца дзяўчына ў такім веку. Я раззлаваўся – і так яно пачалося... Раней я заходзіў у рэдакцыю і Зору ўжо ведаў – яна там працавала на пасадзе «куды пашлюць», радкі падлічвала, іншыя дробныя працы – так што вачмі мы ўжо сустрэліся, але вялікай увагі тады яшчэ не зьвярнулі. Праўда, я заўважыў, што яна заўсёды была ў форме СБМ, а я формы не насіў. Пасьля гэтай сцэнкі ў сэмінарыі мы добра адно аднаму запамяталіся.

У сэмінарыі на Цнянскай было шмат людзей з нашай «гвардыі пастушкоў». Ясна, тады ўжо больш пачаў зьвяртаць увагу на дзяўчат – была такая Вера Шыпко, добры пастух, яна кароваў пяць мела, гляджу – і яна ў сэмінарыю паступіла. Прыпамінаю і іншых: Вася Доўнар, Чэсік Славікоўскі. Як выглядала, пастушкі былі досыць інтэлігентныя – ведалі, што трэба далей вучыцца.

Пачаліся лекцыі. Першая лекцыя, як я памятаю, была літаратура, настаўнік быў малады, ён казаў, што літаратура – гэта асноўны прадмет, які вытварае ў чалавека пагляд на жыцьцё, гэта ня тое, што гісторыя, дзе забіваюць людзей, гэта нешта шляхотнае, і што каб быць добрым настаўнікам, трэба ведаць літаратуру. Гаварыў зь вялікім уздымам, думаю, кожнаму, хто слухаў, напэўна адразу хацелася стаць літаратарам. Калі сэмінарыя пераехала ў будынак гімназіі на Нямігу, я гэтага настаўніка ўжо болей ня бачыў, але мне казалі, што ён пераехаў у Вільню.

З сэмінарыі таксама прыпамінаю, што грамадазнаўства выкладаў нехта К. Ганчар, былі таксама сьпевы, нямецкая мова – каля дзесятка прадметаў.

Саломенік

Дырэктарам сэмінарыі быў Антон Саломенік. У адрозьненьне ад Пятра Кісяля ён быў прасталінейны, менш далікатны. Празь дзень ці два пасьля пачатку заняткаў была лекцыя агульная для ўсіх, і выступаў Саломенік як дырэктар. Найперш ён выклаў правілы сэмінарыі – што можна і чаго нельга. Калі хто з вас курыць, казаў ён – майце на ўвазе: за пяць кварталаў да будынку выкідайце цыгарэту. Каб тут і дыму не было! Па-другое, кажа, калі вы зь дзеўкамі ходзіце, то хадзіце дзе-небудзь у Менску – каля возера, у Сьляпян-

цы, а не каля сэмінарыі. А тады кажа: майце на ўвазе, гэта беларуская настаўніцкая сэмінарыя, і калі вы з сваёй бабкай ці дзедам гаворыце як хочаце, то ў сэмінарыі вы будзеце гаварыць толькі па-беларуску. У беларускай мове, кажа, ёсьць свае асаблівасьці, свая лексыка, свае націскі, і мы будзем гэта вельмі строга дапільноўваць. Затым дырэктар спытаў: зь якіх вы школ прыйшлі? Як вас вучылі па-беларуску, хто выкладаў? І, памятаю, у адной дзяўчыны, калі яна адказвала, праскочыла «г выбухное», і Саломенік зрабіў заўвагу: ёсьць толькі тры словы з такім «г» – гонта, гузік, ганак. (І так за ім замацавалася мянушка – «Гонта-гузік-ганак».) І яшчэ ён казаў: цяпер модна, часам каб пажартаваць ці яшчэ што, вітацца «гутэн морген». Дык вось, з гэтым «гутэн морген» ідзіце пад Soldatenheim, дзе сядзяць немцы, зь імі гаварыце што хочаце, а тут – «дабрыдзень» і ніякіх «гутэнморгенаў». Гэта гучала даволі востра, мы нават пераглянуліся.

Думаю, Саломенікава антынямецкасьць была невыпадковая. У хуткім часе, пасьля пераезду сэмінарыі на Нямігу, Саломенік раптам зьнік. Заступаў яго ў адміністрацыйных справах Аляксандар Акановіч – дырэктар прагімназіі і «начальнік» усяго будынку. Хадзілі чуткі, што Саломеніка расстралялі за сувязь з партызанамі. У мяне аб ім застаўся цьвёрды ўспамін: вельмі строгі беларускі пэдагог.

За што расстралялі Саломеніка, як і Кісяля – дакладна ня ведаю. Кісель нібыта быў блізкі з Гадлеўскім, і ў яго нешта было – ці ён «зашухарыў» Гадлеўскага, ці ў яго былі «савецкія сувязі» – чуткі хадзілі розныя. У Саломеніка была сувязь з партызанамі, і ён не хаваў свае антынямецкія настроі.

Абодва яны – і Саломенік, і Кісель – старыя менскія настаўнікі, ідэйныя беларускія пэдагогі, аўтары падручнікаў. На мяне яны зрабілі ўражаньне і ўплыў, хоць я ведаў іх нядоўга. Мушу зазначыць, што ня раз я лавіў сябе на думцы: усе дырэктары маіх беларускіх школаў – П. Кісель, А. Саломенік, А. Акановіч і А. Орса – зрабілі на мяне ўплыў. Я адчуў, як гэтыя адданыя беларусы, прафэсійныя пэдагогі імкнуліся даць вучням і патрэбныя веды, і беларускасьць.

Прагімназія

Настаўніцкая сэмінарыя месьцілася на Цнянскай тыдні трычатыры, затым вучэльня перабралася на Нямігу, у будынак, дзе працавала прагімназія. Бацькі мне кажуць: ты ж настаўнікам не плянуеш быць? Дык пераходзь у прагімназію. І я пайшоў у прагімназію, мяне ў той самы дзень запісалі, а ў канцы верасьня ў будынак перабралася і сэмінарыя.

Будынак прагімназіі быў на Нямізе зь левага боку, ідучы ад рэчкі, бліжэй да Гарадкога Валу, як спусьціцца ад таго дома, дзе быў Скарынаўскі цэнтар. Часам, каб скараціць дарогу, мы з прагімназіі –

там быў плот зь дзіркай – выходзілі і праходзілі праз двор на Рэвалюцыйную.

Будынак быў вельмі стары – і, думаю, гэта быў яўрэйскі будынак. Уваход быў праз арку, арка зачынялася брамаю з кратамі. На браме Пагоні не было, але была конская галава. Затое ў самым будынку, як зойдзеш – зь левага боку было месца для веласіпедаў, а далей ідзеш калідорам, направа даўгі, налева карацейшы і цёмны і канчаецца замаляванай сьценкай. І часам, калі сонца сьвяціла з таго боку, асабліва раніцай, пад гэтай фарбай праступала выява мэноры, а як сонца зойдзе – сьценка была цёмная. Я гэтага і не заўважаў, і аднойчы мы едзем з Жэнькам Кавалеўскім на веласіпедах (а ён жыў на Камароўцы), і ён кажа: я табе пакажу фокус. Заходзім мы раніцай у будынак, а Жэнька пытае: бачыш? І я пабачыў абрысы мэноры! А ў чым фокус? А як сонца ня будзе, дык нічога й ня будзе. І праўда – праз гадзіну на сьценцы нічога няма! Нешта ў гэтым, было знамянальнае.

Атмасфэра ў прагімназіі была мне больш знаёмая, бліжэйшая. Перш за ўсё – школа мясьцілася ў самым горадзе. Па-другое, мне сказалі, што адзін з выкладчыкаў – Антон Адамовіч, якога я ведаў і чакаў сустрэчы зь ім. Па-трэцяе – што мне вельмі спадабалася – сказалі, што ў прагімназію можна будзе прыяжджаць на веласіпедзе. А к гэтаму часу мой траюрадны брат Сярожка Ваўчок мне сабраў веласіпед, дык мне хацелася паказацца.

Я прыйшоў у клясу, здаецца, на другі дзень працы прагімназіі, у клясе было чалавек 25-30 – гэта 4-я кляса, і яна была поўная. (У прагімназіі 4-я кляса была апошняя, пасьля яе мусілі б быць – калі дазволяць немцы – яшчэ чатыры клясы гімназіі.) Пасадзілі мяне за адной партай – першы рад ад дзьвярэй, другая ці трэцяя парта – з хлопцам, быў ён невыразны, падстрыжаны пад бокс, спакойны. Прайшла лекцыя, пачалася вялікая пераменка (цяпер кажуць «перапынак», але ў нас былі «пераменкі») – 20 хвілін. Я знаёмлюся з тым хлопцам, кажу: «Я Кіпель», а ён: «Я Цэлеш». Гэта, як я даведаўся пазьней, быў сын пісьменьніка Міколы Цэлеша. І мы зь ім нейкі час разам сядзелі. Пра Цэлеша я шмат апавядаў ягонаму бацьку, калі той прыходзіў да мяне ў Публічную бібліятэку ў Нью-Ёрку. Бліжэйшае знаёмства адбывалася прыблізна так. Я кажу: «Я цябе бачыў у СБМе», ён адказвае: «Так». Ён жыў каля Дому ўраду, там ішла крывенькая вулічка Берсана і зьлева стаяў прыгожы драўляны зеленавата-карычневы дом – дык у ім ён жыў, і на Нямігу яму было зусім блізка.

Зімой прыйшлі ў прагімназію двое вярбоўшчыкаў: адзін беларускі вайсковец вербаваць у афіцэрскую школу, а другі – у дапаможныя аддзелы Luftwaffe. Цэлеш запісаўся ў Luftwaffe і неўзабаве з школы зьнік. І я тады перасеў на апошнюю парту, дзе сядзеў Дзімка Карпенка. Ён жыў каля Грушаўскага пасёлку, ягонага бацьку расстралялі –

бацька ягоны быў архітэктарам у групе Лангбарда. Дзімка ўвесь час сядзеў адзін, я таксама ведаў яго з СБМ.

У прагімназіі былі ўсе новыя настаўнікі. Распытваючы, я даведаўся, што адзін з настаўнікаў, «літаратар» – Антон Адамовіч. Гэтае сустрэчы я чакаў, бо я Адамовіча ведаў яшчэ з Кірава, але ў Менску яшчэ ні разу зь ім не сустрэўся, хоць з бацькамі ён бачыўся часта. І вось сустрэча адбылася. У клясу ўваходзіць Адамовіч, глядзіць сабе пад ногі і нясе стос кніжак: ён заўсёды прыносіў мноства кніжак і часапісаў. Ён узьняў галаву і скорагаворкай клікнуў «Жыве Беларусь», і кляса грымнула ў адказ «Жыве!» – усе ўсьміхаліся, усім падабалася. Адамовіч быў адзіны, хто так вітаўся, але рукі не падніма ў. А тады ўбачыў мяне: «Ну, гэтага вучня я, здаецца, ведаю!» і падышоў і абняў мяне, што ўсёй клясе было трошкі дзіўна. Ён кажа: «Я шмат гаварыць ня буду, але некалі далёка-далёка мы былі разам». Так у нас устанавіўся кантакт, але Адамовіч праз пару месяцаў прапаў – яго выправілі ў Нямеччыну.

Гэты год у прагімназіі быў цікавы. Дарэчы, у прагімназіі я першы раз спаткаў Галіну Ганчарэнка – яна вучылася на дзьве клясы ніжэй, у 2-й – яна не была актывісткай і трымалася збоку, але грала на піяніна на розных зборках і ўрачыстасьцях. Мы зь ёй пасьля дзесяцігодзьдзі сябравалі.

Дырэктар Аляксандар Акановіч

Сапраўдным маторам прагімназіі – настаўнікам, адміністратарам, часта дарадцам – быў яе дырэктар Аляксандар Акановіч. (Ягоная жонка Ганна была сястра Сьцяпана Некрашэвіча.) Акановіч быў дзейны менскі настаўнік і падтрымліваў беларускасьць. У прагімназіі была створаная дружына СБМ, тым болей, што штаб быў недалёка – мы нават на пераменках туды хадзілі. У штабе часам казалі: трэба паехаць на радыёзавод, або на Грушаўскі пасёлак, або ў ЦТО. (Центральное торговое общество, была такая ўстанова каля вакзалу, як ісьці на Суражскі рынак. Менчукі казалі ЦТО, але сям-там можна было пачуць і ЦГТ – Цэнтральнае гандлёвае таварыства – што ўжывалася ў рэкляме.) Рэч у тым, што вельмі часта ў штабе шукалі двух-трох СБМаўцаў, каб паслаць у нейкую ўстанову, бо туды прыяжджала па справах моладзь з правінцыі, і трэба было паказаць, што ў Менску дзейны СБМ. Дырэктар Акановіч заўсёды ішоў насустрач і адпускаў – бо ж у дырэктара трэба было пытацца дазволу. Я, Карпенка, Жэнька Кавалеўскі – заўсёды хадзілі, бо нам было цікава, мы гэтым жылі. Акановіч мне казаў: ты заўсёды прыяжджай на веласіпедзе, бо калі трэба недзе выехаць, хутка даедзеш.

Наагул Акановіч вельмі дбаў пра школу. Памятаю, як ён пытаўся ў мяне, ці ня ведаю я каго з аўтамабілем, бо недзе ў Сьляпянцы нем-

цы мелі адукацыйныя курсы «для нямецкай моладзі» і выкідалі шмат наглядных матэрыялаў, якія можна было забіраць, але не было як прывезьці, а гэта трэба было зрабіць хутка.

У канцы верасьня перавялі ў гэты самы будынак і сэмінарыю. Прагімназія канчала свае заняткі а 2-й ці 3-й, пасьля працавала сэмінарыя, а тады яшчэ ўвечары былі заняткі фэльчарскай школы – у адным будынку тры ўстановы. Я так прыпушчаю, што Акановіч быў загадчыкам над усімі і часта ён каардынаваў супольную дзейнасьць. На праваслаўныя Каляды 1944 году адбылося сьвята для ўсіх трох школаў у вялікай залі наверсе – выступалі дзеці, яліначкі, сьпявалі, танцавалі. На сьвята прыйшоў япіскап Філафей, людзі з інспэктарыяту – Я. Скурат, а адчыняў і кіраваў усім Акановіч. Гэта быў адзіны раз, калі я бачыў у гімназіі шышак з тагачаснага беларускага кіраўнічага апарату. А немцаў там ні разу не было.

Акановіч быў вельмі добры адміністратар – гэтыя тры ўстановы былі даволі вялікія, шмат вучняў, а будынак быў заўсёды дагледжаны, спраўнае ацяпленьне – ён усе камунальныя патрэбы залагоджваў. Акановіч выехаў на эміграцыю, быў настаўнікам у беларускай гімназіі і памёр у Міхельсдорфе ад сардэчнага прыступу ў 1948 годзе.

СБМ у прагімназіі

Ладна часу адводзілася і грамадзкім справам. Былі ў прагімназіі гурткі: драматычны – развучваліся п'ескі, быў літаратурны. Пазашкольная актыўнасьць была безумоўна шырэйшая, чым у народнай школе. Але я ў гэтай актыўнасьці ўдзельнічаў мала, бо быў у СБМе.

У прагімназіі дзеіў зьвяз СБМ – тры дружыны, у кожнай каля дзесяці чалавек. Зьвязны быў Жэнька Кавалеўскі, дружыновыя – я, Саша Касьпяровіч, Цэлеш, але мы часам мяняліся (калі Цэлеш адышоў у Luftwaffe, я застаўся з Касьпяровічам). Думаю, што дзьве дружыны былі таксама і ў сэмінарыі. Была адзінка і ў фэльчарскай школе, але фэльчарская школа з моладзі была найменш актыўная, дык тая адзінка СБМ магла быць толькі на паперы. Перш за ўсё – у фэльчарскай школе было шмат расейскамоўных – і гэта заўважалася. Па-другое, вучні фэльчарскай школы адчувалі сябе вышэйшымі – яны ж ужо фэльчарская школа, а тут нейкія шчанюкі школьнікі блытаюцца!

Аднойчы прыйшоў у будынак Зьміцер Стэльмах – старшы праваднік СБМ на Менск, «шышка», і зрабіў зборку СБМу гэтых трох установаў – гімназісты на зборцы пераважалі пяць да аднаго. Прычым у прагімназіі ўсе былі вельмі актыўныя. Клясай ніжэй, у 3-й, вельмі дзейны быў Сашка Касьпяровіч, дружыновы, заўсёды хадзіў у форме, як і Жэнька Кавалеўскі, у яго дружыне было чалавек 12. Я неяк быў ва Ўправе, і мне кажуць: тут ужо СБМаўцы гэта робяць – а рабіла

тое дружына Сашкі Касьпяровіча. Адзін раз – ужо значна пазьней, у студзені 1945 году ў Бэрліне – я іду на Александэр-пляц і лоб у лоб з Сашкам Касьпяровічам сутыкаюся, а ў яго шапка з ССаўскай кукардай. Я аслупянеў і пытаюся: як ты ў гэта папаў? Ён кажа: зь Менску эвакуавалі, быў на заходнім фронце – паранілі, забралі ў РОА, а пасьля РОА расфармавалі, і ён папаў у СС. Яго ў часе бамбёжкі забіла ў Дрэздэне – я бачыў у DP-лягеры аднаго беларуса, дык ён расказаў, што ў Касьпяровіча ў Дрэздэне была сям'я, ён прыехаў на пабыўку, і іх усіх забіла. (Паводле інфармацыі зь дзёньніка К. Езавітава (Запісы, № 36, 2013), сям'я Касьпяровічаў загінула ў Бэрліне.)

Палітыка

Прыпамінаецца мне і такое здарэньне. Настаўнік фізкультуры ў прагімназіі зваўся Янка Козьлік, мянчанін, чалавек выраблены, падцягнуты, з вайсковай выпраўкай, жыў ён у раёне тэатру опэры і балету. Аднойчы на лекцыі фізкультуры – спартовая заля ў нас была на другім паверсе – ён пачаў даваць фізкультурныя каманды і тлумачыць, якія былі каманды савецкія, якія цяпер беларускія, і пачаў устаўляць палітычныя канатацыі, згадаў немцаў. Напрыклад, сказаў, сьмяюцца зь беларускай каманды «Зважай!», якая нібыта не адпавядае камандзе «Смирно!» Козьлік патлумачыў, што зь беларускага шмат чаго могуць сьмяяцца, але пытаньне адпаведнасьці сэнсу каманды і моўнай дакладнасьці будзе вырашана, і «мы вырашым яго не сягоньня, а калі немцаў ня будзе». Козьлік так гэта з націскам сказануў, ясная справа, каб мы ўсе пачулі і зразумелі – упарадкаваньне беларускай тэрміналёгіі будзе зроблена беларусамі. Відаць, ён хацеў перадаць нам, вучням, нешта, што адбывалася глыбей і не было так відавочнае. Як я прыпамінаю, вучні ўспрынялі гэта нармальна. Ніхто нічога не казаў! Неўзабаве пасьля гэтага, у сакавіку, Козьліка прызвалі ў БКА, бо ён быў лейтэнант Чырвонай Арміі. Нам сказалі, што фізкультуры болей ня будзе, а праз тыдзень Козьлік зайшоў у будынак у форме, разьвітацца з вучнямі. Пасьля дзе я ў каго ні пытаўся, ці сустракалі такога Янку Козьліка – ніхто ніколі яго ня бачыў.

Дарэчы, адзін раз я пра гэтыя «зважай» і «сьмірна» расказаў Кушалю, калі ён у бібліятэку прыходзіў. «А, – кажа ён па-салдафонску, – што там думаць! Каманда – гэта каб ня думалі, а слухаліся!»

Нічога нямецкага ці пранямецкага ў прагімназіі абсалютна не было. Праўда, раз дырэктар Акановіч дастаў для анатоміі выраблены з гліны муляжы і розныя табліцы, і былі надпісы па-нямецку. І памятаю, што наша анатамічка надта выбачалася, што няма беларускіх табліцаў. Гэта былі якраз тыя муляжы, для перавозкі якіх ён шукаў машыну.

Выпуск

Год прагімназіі з гледжаньня навучаньня прайшоў для мяне пад знакам паўтарэньня шмат якога матэрыялу. Трыганамэтрыя, алгебра – паўтаралася амаль усё тое, што было ў школе. Што было новага, дык гэта беларусазнаўчыя прадметы: гісторыя і, безумоўна, літаратура. Зь літаратуры трэба было шмат чаго чытаць. Часу хапала, і вучыцца было няцяжка. Я выдатнікам ня быў, але навука давалася лёгка.

Дыплёмы аб заканчэньні прагімназіі мы атрымалі ў сярэдзіне чэрвеня 1944 году, але ў школу я больш не вярнуўся.

Вечаровае жыцьцё

Вечаровае жыцьцё ў Менску існавала. Калі мы прыехалі ў Менск і нас «прытулілі» Шабанавы – у іх быў сын Коля і дачка Каця, абое на пару гадоў за мяне старэйшая – дык у іх хаце амаль кожны тыдзень зьбіралася моладзь і танцавалі пад грамафон. Зьявіліся тады песьні Вярцінскага, Лешчанкі – і яны пад іх танцавалі, ціскаліся, круцілі той грамафон. А я празь сьценку ўсё гэта чуў. Адзін раз я жартам кажу Каці: «Кацька, у вас там многа людзей прыходзіць, глядзіце, каб ня трэснула падлога!» «Не, ня трэсьне, – кажа яна, – ведаеш, хто ў нас быў?» – «Адкуль жа я знаю! Чую – там шоркалі, танцавалі...» – «У нас, – кажа, – быў Куляшоў!» – «Хто такі Куляшоў?» – «Ну Куляшоў – пісьменьніка Куляшова нейкая радня». Значна пазьней я даведаўся, што ёсьць такі пісьменьнік Аркадзь Куляшоў, дык вось, нехта зь ягонае радні танцаваў у Шабанавых. Можа й праўда, а можа й не.

Забаўкі і патанцулькі бывалі ня толькі ў Шабанавых. Я на вечарынкі не зьвяртаў увагі. Але ў 1943 годзе быў адзін такі выпадак, які мне вельмі запомніўся. Аднойчы нехта мне кажа прыйсьці на Інтэрнацыянальную – насупраць дома, дзе быў Скарынаўскі цэнтар, там жыў фатограф, была ў іх вялікая кватэра з вокнамі ў сад. У фатографа была дачка, і яна ладзіла вечарынку, на якой было шмат гімназістаў. Я туды прыйшоў, яны танцуюць, і там была Зора – як яна туды папала, я ня ведаю. Падчас гэтай забавы разыгрывалі фанты – нехта станавіўся на крэсла, нехта мусіў скакаць і цалавацца зь некім. Я ў гэтым ня ўдзельнічаў, але выпала такое, што мне трэба было скочыць і пацалаваць дзяўчыну – яна звалася Гарбузік, Ніна, здаецца. Ну я падскочыў і не папаў – не пацалаваў. Усе рагаталі, а Зора мне ўсё жыцьцё ўспамінала, што я «гуляў зь дзяўчатамі» – «памятаеш, як ты з той Гарбузік цалаваўся!»

Дарэчы, той фатограф рабіў фатаграфіі ўсіх СБМаўцаў для пасьведчаньняў, і ў мяне тая менская фатаграфія захавалася.

У ваенныя гады Менск мяшчанскі безумоўна жыў сваім жыццём. Я гулянкамі мала цікавіўся, але часам чулася – то там арганізоўваюць забаву (тады казалі – «вечарынку»), то там. Адбываліся гулянкі пад гукі патэфонаў зь вялікімі трубамі, і надта ж папулярная была тады песьня пра «чубчык» – адусюль толькі й гучала «Чубчык, чубчык, чубчык кучаравы...» Для савецкай прасторы гэткія песьні былі новыя – яны прыйшлі з эміграцыі: «Сибирь ведь тоже русская земля...»

Ці такое ладзілася ў вялікіх клюбах – я ня чуў. Праўда, мой добры сябра Чэсік Запольскі, ён быў вучнем мастака Волкава, хадзіў на іншыя вечарыны, але куды – я дакладна ня ведаю.

Прысяга СБМ

Адна зь пільных і цягучых навучальных спраў па-за школай была падрыхтоўка да прысягі Саюзу беларускай моладзі ў 1944 годзе. Да прысягі рыхтаваліся як у штабе, гэтак і ў школах – памятаю, у прагімназіі наша дружына зьбіралася, або нават цэлы зьвяз, пад кіраўніцтвам Жэнькі Кавалеўскага. (Заўвага: Быў яшчэ іншы Аўген Кавалеўскі – артыст зь Беларускага тэатру, які пасьля вайны жыў у Парыжы, яго драматычныя творы друкаваліся ў зборніку «Беларуская драматургія на эміграцыі», каля дзесяці п'есаў.) У 1944 годзе ў СБМ была прынятая пастанова, што юнакі, якія ня склалі прысягу летам 1943-га пры стварэньні арганізацыі, прымуць прысягу 25 сакавіка 1944-га.

Для прысягі выкарыстоўвалася кніжачка Ластоўскага пра дзесяць запаведзяў беларуса, некаторыя вытрымкі з падручніка Ігнатоўскага па гісторыі Беларусі – мы мусілі навучыцца іх напамяць, вывучыць таксама пару вершаў Цёткі – гэтак выглядаў курс падрыхтоўкі да прысягі. Кіравалі падрыхтоўкай кіраўнікі СБМ, прыходзілі і іншыя настаўнікі.

25 сакавіка 1944 году на пляцы Волі была вялікая дэманстрацыя – пляц быў поўны, прыйшлі дзесяткі тысяч людзей. З балькона выступаў бургамістар Анатоль Філіпавіч Комар. А моладзь – чалавек 100-150 – пайшла на Вайсковыя могілкі і там каля магілы Ігнатоўскага прымалі прысягу. Тэкст я ня памятаю. Запомніўся барабанны дробат, горн, сьцягі, штандары, здаецца, нават быў залп – усё выглядала тэатральна. І мы, менскія юнакі з прагімназіі, фэльчарскай школы, здаецца і з радыёзаводу былі, зь іншых месцаў – мы складалі прысягу: У імя Беларусі мы, юнакі, прысягаем, што будзем служыць для Беларусі і г. д. Быў халодны дзень, здорава памёрзьлі ў форме – у сакавіку форма ня надта грэла, дый дзень быў пахмурны, але настрой быў прыўзьняты.

Акупацыйны рэжым

Акупацыйны рэжым адчуваўся ў тым, што па вуліцах хадзілі жаўнеры са зброяй. Іх было ня так шмат, але кожны адчуваў, што войска тут прысутнае. Але ў параўнаньні з Арлом можна было б сказаць, што войска ў Менску амаль і не было. Аднак, вядома, было відаць, што горад пад акупацыяй. У цэнтры гораду шыльды былі па-нямецку і па-беларуску. На нямецкіх установах – такіх, як як Soldatenheim – надпісы былі толькі нямецкія.

Найбольш акупацыя адчувалася на Пляцы Волі, дзе мясьціўся Generalkommissariat für Weissruthenien. На пляцы было поўна немцаў. Функцыянэры камісарыяту хадзілі ў бронзавых уніформах і выклікалі непрыемнае пачуцьцё – бо яны адчувалі сябе гаспадарамі. Кожны ведаў, што камісарыят працуе разам зь беларускай адміністрацыяй. Людзі майго веку шмат у гэтым не разьбіраліся.

Калі ў канцы 1943 году зьявіліся лёзунгі, што пакліканая Беларуская Цэнтральная Рада, гэта выклікала пачуцьцё, што будзе больш беларускага. У чым гэтая беларускасьць мелася выяўляцца – дакладна ніхто не ўяўляў, бо і так навокал было беларускае асяродзьдзе. Атрымлівалі картачкі і плацілі падаткі мы ў беларускай установе – камароўскім аддзяленьні гарадзкой управы, якое мясьцілася недалёка ад акадэміі, там была і беларуская паліцыя.

Аднак нямецкасьць была адчувальная, прысутная, яна прыгнятала.

Паліцыя

Беларускасьць улады напэўна заўважалася ў паліцыі, бо паліцыя была беларускамоўная і паліцыі было шмат. Паліцыя была і на базарах, і ў горадзе – паліцаі хадзілі ў чорнай форме, і на пілотках, дзе ў чырвонаармейцаў зорка, у іх была Пагоня, бел-чырвона-белых павязак у паліцыі я ня бачыў.

Паліцыя была ня толькі на базарах, яна пілнавала парадак каля ўваходу ў кіно. Шмат беларускіх паліцаяў было на вакзале. Гэта была рэальная ўлада, якая адчувалася: часам маглі і дакумэнты праверыць, і разьняць бойку, разабраць непаразуменьне паміж людзьмі. Адзін раз я нават быў сьведкам, як паклікалі паліцаяў – людзі пабіліся ў трамваі, дык вагонаважаты спыніў трамвай, паслаў некага па паліцыю, людзі крычаць, а два паліцаі на веласіпедах пад'ехалі і разьбіралі канфлікт.

Орг-Тодт

Апрача нямецкіх вайскоўцаў (вэрмахту) у Менску хадзілі ва ўніформе члены Орг-Тодта – арганізацыі, якая займалася будаўнічымі і тэхнічнымі работамі, названая паводле нямецкага інжынэра Тодта, нешта накшталт інжынэрна-тэхнічных войскаў. У іх была зеленкавата-карычневая форма, на руках свастыкі. Вялікай улады яны ня мелі, я нават ня памятаю, ці была ў іх зброя. У раёне Залатой Горкі каля могілак і далей пад Сьляпянку апрача оргтодтаўцаў я іншых немцаў ніколі ня бачыў. Гэтыя «тэхнічныя» немцы там хадзілі, стукалі ў хаты і пыталіся, ці ў вас часам няможна купіць сала. Яны думалі, што людзі мелі сваіх парсюкоў – парсюкоў білі часьцей, чым кароў, і сала было больш, чым масла. І часта выменьвалі сабе сала – у немцаў былі розныя практычныя рэчы, як мыла, і людзі зь ім часта вадзілі такія гешэфты. Недзе ў канцы Берасьцянскай оргтодтаўцы мелі склады, там былі вялікія майстэрні. Было шмат нямецкіх грузавікоў, якія яны рамантавалі. Ахоўвалі майстэрні тыя самыя оргтодтаўцы, толькі ўзброеныя і за калючым дротам.

Палявая жандармэрыя

Час ад часу ў горадзе можна было спаткаць палявую жандармэрыю – яны былі ў касках, а на грудзях бляхі ў форме паўмесяца. Гэтыя былі небясьпечныя. Яны езьдзілі і хадзілі па горадзе, часам прыходзілі і на базар – але такое ўяўленьне, што іх мэта была застрашыць людзей адным сваім выглядам. Ідуць у касках па горадзе, заўсёды па двое, зь вінтоўкамі, з бліскучымі бляхамі на грудзях – яны наводзілі страх. На пляцы Волі гэткія жандармы былі прысутныя заўсёды, яны там прагульваліся каля камісарыяту. Былі жандармы і каля гарадзкой управы. Прыпушчаю, што іх ставілі на розныя важныя аб'екты, дзе спадзяваліся нападу партызанаў. Для насельніцтва яны былі найстрашнейшыя. Вельмі непрыемна было іх нават на вуліцы бачыць. Езьдзілі яны і на машынах, браневічках, на матацыклах з прычэпам, а часам хадзілі і пешкі.

СД

У Менску было СД, і ў людзей СД выклікала вельмі непрыемнае, страшнае пачуцьцё. Мы, дзятва, нават не хацелі каля таго будынку хадзіць – галоўная будова СД была насупраць Чырвонага касьцёла, там, дзе ўнівэрсытэцкія будынкі – дык усяляк абыходзілі, абы толькі не праходзіць каля будынку. Я, прыкладам, хадзіў на Суражскі рынак у абыход па Нямізе. Дарэчы, каля будынку СД заўсёды стаялі два-тры нямецкія жандармы з кулямётам напагатове.

Кантакты зь немцамі

Зь нямецкімі вайскоўцамі кантактаў бадай што й не было, дый зь немцамі наагул, хіба што былі кантакты ў адміністрацыі. А на «народным» узроўні – пад базары немцы прыходзілі, але ўваход на базар немцам быў забаронены, і беларускі паліцай мог арыштаваць немца на базары. Перад уваходам на базар стаялі вялікія шыльды з абвесткамі па-беларуску і па-нямецку, дзе пісалася, што далей немцы ісьці ня могуць. Таму немцы, калі нешта хацелі прадаць, прыходзілі і станавіліся за паўквартала ад базару, да іх падбягаў якінебудзь хлопец, пытаўся, што яны хочуць прадаць або купіць. Пераважна немцы куплялі сала і масла.

Нямецкае і беларускае жыцьцё магло перасякацца на прыватным узроўні. Пажыўшы больш як паўгода ў Шабанавых, мы пераехалі на вуліцу Берасьцянскую. Нам сказалі, што на Берасьцянскай жыве Серафіма Феліксаўна Жук – сястра братоў Пашковічаў, ведамых беларускіх эсэраў 20-х гадоў. Бацька быў зь імі добра знаёмы і пайшоў да Серафімы Феліксаўны. Спадарыня Жук, як толькі даведалася «хто мы», дык адразу сказала, што кватэру нам здае. Жыла яна фактычна з дачкой Жэняй, але Жэня працавала і з маці асабліва не была. Дачка Ларыса працавала настаўніцай у Глыбокім.

Жэня ў часе акупацыі займала пасаду інжынэра, яна скончыла палітэхніку перад вайной. Працавала яна ў адміністрацыі чыгункі і там сышлася зь немцам з Орг-Тодта – Антонам, яны працавалі разам. Антон жыў з Жэняй, начаваў у яе ў хаце. У Нямеччыне ў яго была жонка, дзеці. Антон крыху ўмеў па-беларуску – з намі ён размаўляў па-беларуску.

Час ад часу яны з Жэняй ладзілі розныя вечарынкі, запрашалі суседзяў, моладзь, часам прыносілі грамафон, і немцаў поўна прыходзіла – гэты Антон прыводзіў. Мы ў вечарынках удзелу ня бралі.

Я ведаў са словаў маці і бацькі, што зь немцамі былі кантакты на ўзроўні адміністрацыі. Маці казала, што ў газэтах – «Беларускай газэце», «Голасе вёскі» – атрымлівалі ад немцаў матэрыялы для перадавіцаў, і іх трэба было перакладаць і публікаваць, але ў «Голасе вёскі» бацька часта іх не пускаў, бо, па-першае, па-нямецку слаба гаварыў, а перакладчыка не было, дык бацька неяк гэта абыходзіў. Калі не зьмяшчалі важнай нямецкай перадавіцы, то ў рэдакцыю прыбягаў немец з камісарыяту і пачынаў крычаць, бывалі і сваркі, часам нават і бурныя, але рэдакцыя была беларускім месцам, побач была беларуская паліцыя, і працаўнікі адчуваліся сябе спакойна.

Дзе былі немцы навідавоку, дык гэта каля Салдацкага дому (Soldatenheim) на Інтэрнацыянальнай, дзе праз вуліцу жыў Лёсік – гэта была чыста нямецкая ўстанова. Немцы часта прыходзілі і з нашымі

беларускамі – як іх пушчалі, ня ведаю, я ў тым Soldatenheim'е ніколі ня быў, але перад будынкам я бываў часавата, бо ў салдатаў можна было купіць цыгарэты, у іх было таньней, пасьля на базары перапрадасі значна даражэй.

Дзяўчат, якія «хадзілі» зь немцамі, было няшмат. Да немцаў наагул такое стаўленьне было – гэта ня нашы людзі, акупанты. А ў дзяўчат гонар быў. Бо, прыкладам, тая Жэня, Серафімы Феліксаўны дачка, з Антонам заўсёды старалася і выйсьці і прыйсьці, калі цёмна – каб суседзі ня бачылі, што яна зь немцам.

Наогул, народ перад немцамі трымаўся з гонарам: мы – народ, мы тут жывем, вы напалі на нас, вы – чужыя, акупанты, мы вашыя загады і патрабаваньні выконваем, але тут наша зямля, а вы – ворагі.

Украінцы

Былі ў горадзе жаўнеры-ўкраінцы – казалі, што галічане, але я зь імі ня меў кантактаў. Яны прыходзілі на базар так, як і паліцаі – хадзілі, куплялі, гаварылі па-ўкраінску. Форма ў іх была нямецкая, толькі шапкі былі ўкраінскія – з трызубам на месцы кукарды. Што гэта за фармаваньні былі – ня ведаю, яны стаялі ў кашарах на Камароўцы.

Пятро Каралевіч

З украінцамі добра прыпамінаецца інцыдэнт, сьведкам якога я быў. Аднойчы зімой 1943 году ішоў я з школы на Старажоўскі рынак – нешта трэба было прадаць. Рынак быў за могілкамі, яны яшчэ былі дзейныя, і царква Магдалены была адчыненая. На могілках шмат людзей, я праходжу далей і бачу – жанчыны ўцякаюць, а на базары нязвыклы рух. Я пытаюся ў адной жанчыны: «Цётачка, што такое?» Мала што, раптам якая аблава. «А, – кажа жанчына, – на базары ўкраінцы грабяць». Думаю, што ж там яны грабяць...

У мяне быў сахарын, але схаваны – можаш быць купцом, а можаш і прадаўцом. Заходжу на тэрыторыю базару, гляджу – ходзяць украінцы ў вайсковай форме са зброяй, можа, чалавек пятнаццаць, але ходзяць паасобку, па два, па тры, сьмяюцца, выглядае, трошкі нападпітку. У аднаго чалавека, бачу, бяруць сала і яшчэ штыком гэтае сала ткнуць, нешта яму сунуць у руку, рагочуць. Ну, ня тое каб грабёж сярод бела дня, але паводзяць сябе як сапраўдныя гаспадары.

Я рухаюся ў натоўпе, але адчуваю, што людзі пачынаюць уцякаць пад могілкі. Думаю – што ж такое? Трэба ж пачакаць, паглядзець. Тады, глянуўшы назад у бок могілак, бачу: ездакі прывязваюць коней, некаторыя злазяць, замацоўваюць павады – пад могілкі яны пад'ехалі галопам. Гэта ўжо цікава – што ж тут такое будзе? Тады

коней яшчэ прыехала – ужо больш за дзесяток, ужо й на вуліцы стаяць. І бачу, наперадзе ідзе відны чалавек, і пазнаю – гэта Каралевіч! Пятро Каралевіч, граза Камароўкі, заступнік камэнданта паліцыі на Камароўцы. Ён заўсёды хадзіў у цывільным, яго рэдка хто бачыў у форме – прыходзіў на Камароўскі рынак, шыракаплечы, высокі, жаўнерскай паставы, адным словам страшнавата-афіцыйны, у даўгім паліце, збоку адтапырана – пад палітом вялікі пісталет. І за ім якіх дзесяць беларускіх паліцаяў ідуць, і таксама ўсе ў цывільным, але па выпраўцы адразу можна пазнаць. Думаю, цікава, гэта ж Старажоўскі базар, а Каралевіч з Камароўкі на конях прыскакаў.

Чорт зь ім з сахарынам, раздумаў я прадаваць і толькі гляджу, што будзе. Заходзяць гэтыя паліцаі на базар ціхенька, і кожны зь іх падыходзіць да ўкраінца, відавочна абкружаюць. І вось адзін украінец таргуецца за сала, а ззаду яго стаіць Каралевіч, і ўкраінец пачынае з мужыком сварыцца, паднімае голас і крычыць «Ды такую тваю маць!» і забірае гэтае сала. І ў гэты самым мамэнт Каралевіч выкрыквае каманду, і кожны зь беларускіх паліцаяў, што стаялі за ўкраінцамі, выхапілі ў іх затворы зь вінтовак, бо вінтоўкі былі на плячах – зроблена гэта было проста прафэсійна – фактычна абяззброілі. І Каралевіч адразу: «На калені!» І ўсіх тых пятнаццаць украінскіх салдат стаяць на каленях.

Тады Каралевіч дастае свой пісталет, ходзіць каля іх і кажа: «Вы што тут – парадак свой будзеце наводзіць? Маці ўспамінаць? Паедзеце ў Маскву маці ўспамінаць!» Тады пад'ехала яшчэ чалавек пятнаццаць беларускіх паліцаяў на конях, украінцам надзяваюць кайданкі – а мо зьвязваюць рукі, ня памятаю – забіраюць вінтоўкі і ўсіх павезьлі.

На гэтым сцэнка і закончылася. Базар шумеў далей. А што адбылося – дык я і іншыя «прадаўцы» прыпушчалі такое: нехта з абрабаваных гандляроў пабег з Старажоўскага базару на Камароўку і сказаў, што на Старажоўцы разышліся ўкраінцы. На Старажоўцы можа свая паліцыя і была, але камароўская была вялікая, камэндантам быў немец Шэйман, а Каралевіч – яго заступнікам. Людзі яго і баяліся, але адначасна трошкі й паважалі.

Ня ведаю, што там і як пасьля было, але «маркі» Каралевіча вырасьлі! Бо перад тым Каралевіч для Камароўкі – гэта быў разбойнік. Ён быў прафэсійны міліцыянэр са Случчыны, якога пару гадоў перад тым паслалі ў «Западную», на Беласточчыну наводзіць парадак, потым быў на фінскай вайне. Нібыта зь сям'і раскулачаных. Ён быў, дарэчы, католік. Пазьней ён мне казаў, што ў хаце былі беларускія малітоўнікі – сьведамая беларуская каталіцкая сям'я.

Чаму я гэта ўсё ведаю – я пазьней зь ім меў справы. Каб падзарабіць, даводзілася гандляваць ня толькі сахарынам, але і содай, керасінам, а керасінам гандляваць было забаронена. Забарона то забарона, але керасін – тавар ходкі, людзям патрэбны, і ў немцаў

купіць няцяжка. Купіш у немца орг-тодтаўца літраў 20-25 і перапрадаеш. Звычайна трымалі керасін у бідонах у кустах альбо за ларкамі (трэба было наглядаць, каб ня скралі!). Бідоны прывозілі альбо на санячках, альбо на возіках. Зь бідона наліеш у літровую ці паўлітровую бутэльку, носіш яе, прыкрыўшы, ды выкрыкваеш: «Каму керасінчык па дзяшоўцы?!» Нехта мяне высачыў, сказаў Каралевічу, а той мяне за шкірку – і ў паліцыю. У паліцыі, калі афармлялі паперы і пыталіся адрас, год нараджэньня, хто бацькі – даведаліся, дзе бацька працуе, некуды патэлефанавалі і выпусьцілі.

Але з Каралевічам мне давялося сустрэцца і пазьней, Калі беларускі лягер з Рэгенсбургу перавялі ў Міхельсдорф, прайшла чутка, што Даніла Клінцэвіч, дасюлешні камэндант беларускай паліцыі, атрымае павышэньне – будзе «супэрвайзэрам» над беларускім лягерам у Міхельсдорфе і лягерам у Віндышбэргерсдорфе (гэты другі лягер яшчэ ня быў беларускі). А новым камэндантам паліцыі ў Міхельсдорфе будзе нехта іншы. І калі я ўбачыў летам 1946 году гэтага новага камэнданта – я пазнаў Каралевіча! Падыходжу і кажу: «Спадар Каралевіч!», а ён глядзіць: «Чакай, я цябе ў Менску бачыў!» – «Так, вы мяне ў паліцыю забралі!» – «А, дык тое было даўно!» Гэтак я сустрэўся з Каралевічам па вайне.

Пазьней, ужо ў Нью Ёрку, я сяджу ў сваім кабінэце ў бібліятэцы, і мне кажуць: прыйшоў амэрыканскі жаўнер і вас пытае. Я выходжу – Каралевіч! Мастэр-сарджэнт, у амэрыканскай форме! Я, прызнацца, ад такога відовішча аслупянеў. «Мастэр-сарджэнт» – важны вайсковы чын. Я кажу: «Добры дзень». А ён чуў, што я належу да царквы на 401 Atlantic avenue, і ён да яе належыць. А форма – ён цяпер на базе ў Каралайне, рыхтуе амэрыканцаў да супрацьпартызанскіх дзеяньняў у Віетнаме, яны спускаюць іх на парашутах у Віетнам, і амэрыканцы ловяць партызанаў. Гэтаксама ён быў досыць актыўны ў царкве – плаціў складкі, бывала ў царкве і сям'я – жонка і двое дзяцей. Пасьля арміі Каралевіч пасяліўся на Бэлэры, жыў там і памёр. Любіў выпіць, але не напіваўся. Меў у хаце зброю. Быў пісьменны. Казаў, што мае напісаныя ўспаміны пра фінскую вайну.

Літоўцы, славакі

Літоўцы-жаўнеры таксама стаялі ў горадзе, іх казармы былі на Камароўцы каля балотаў. Літоўцаў часам можна было бачыць на вуліцах Менску, але характэрная зьява – іх заўсёды было па пяць-шэсьць чалавек разам, па адным ніколі не хадзілі. Украінцы хадзілі і па адным, і па два, не баяліся. Памятаю, адзін раз я літоўцаў спаткаў пры мосьце каля Нямігі, ня ведаю, што яны там рабілі, але яны запыталіся, як прайсьці ў тэатар, дык я ім паказаў дарогу. Гаварылі мы зь імі па-нямецку.

Былі таксама славакі – з крыжамі, у іх на сьцягу быў белы крыжык. Народ да іх прыхільна ставіўся ў тым сэнсе, што гэта ня немцы.

Іншых чужынцаў-жаўнераў я ў Менску ня бачыў. У Арле былі і мадзяры, і італьянцы, і славакі, і гішпанцы, але ніхто іх сур'ёзна як жаўнераў не ўспрымаў. Пра італьянцаў наагул хадзілі чуткі, што ў іх можна і пісталет купіць, толькі дай добрага масла... Гішпанцы прыехалі зімой, а халады былі жудасныя – на нямецкіх жаўнераў страшна было глядзець ухутаных у коўдры, а гішпанцы дык па пяць-шэсьць коўдраў на сябе надзявалі, гэта быў чыста маскарад! Думаю, іх там мароз пабіў больш, чым кулі.

Партызаны

Ці была відавочная прысутнасьць партызанаў? Адказ, бясспрэчна – так, але акрэсьліць, у чым была гэтая відавочнасьць, ня так проста.

Некаторыя «незвычайныя» зьявы я заўважыў яшчэ ў першае лета. Мы, пастухі, часта заходзілі на Вайсковыя могілкі, каб нарваць там лепшай травы для казы. Козаў на могілкі не пускалі, але траву рваць дазвалялася. На могілках было пару каплічак, і некаторыя каплічкі выкарыстоўваліся як схованкі, пункты абмену: бачыш – скрыначка каля каплічкі стаіць, а заўтра яе ўжо няма. Я ніколі ня бачыў хто і што, але мы, дзеці, ведалі, што на могілках адбываецца жывая камунікацыя, і часта на могілкі прыяжджала паліцыя на конях, і раптам з чатырох бакоў тыя паліцаі прывяжуць коней, а самі ідуць на могілкі і нешта шукаюць. Мы за гэтым назіралі і ведалі, але ў нас, дзяцей, ніхто ніколі нічога не пытаўся – бо дзеці ніколі нічога ня скажуць. Так што знак падпольнага руху, прынамсі на Камароўцы, на Залатой Горцы і на Вайсковых могілках, быў відавочны.

Аднойчы да нас у хату зайшоў... Іван Зубкоўскі – мамін стрыечны брат, да вайны ён быў міліцыянтам. Зайшоў, каб прывітацца, бо ў партызанскім атрадзе ён даведаўся, што «Маня вярнулася з мужам і сынам». Зайшоў ён літаральна на пяць хвілін, каб пабачыць маму, мяне (бацькі ў хаце не было). Прыйшоў проста зь лесу. Пазьней мы чулі, што яго застрэлілі.

Шабанавы былі нам як свае, бо дзед даў ім некалі зямлю, яны на ёй пабудаваліся, а пазьней пры саветах зямлі ўжо было няможна атрымаць – таму яны нас прытулілі, калі мы прыехалі ў Менск. А Коля Шабанаў, як мы падазравалі, быў зьвязаны з партызанамі. Аднойчы ён мне кажа: «Вітка, я хачу табе нешта сказаць! Бацька твой падпісваецца Здалевіч, ён рэдактар газэты?» Я кажу – ня ведаю... «За ім, – кажа Коля, – сочаць! Ты яму скажы!» – «Адкуль ты ведаеш?» – «Ты не пытайся, я ведаю». Я бацьку кажу. Ён кажа: «Скажы Колю дзякуй. Я ведаю, што за мной сочаць. Так, сынок, я рэдактар

газэты, я – Здалевіч. Добра, што Коля ведае». Бацька гэта ўспрыняў спакойна.

Бясспрэчна, прысутнасьць партызанаў заўважалася. Яшчэ каля нас на Берасьцянскай, дзе мы жылі ў Серафімы Феліксаўны Жук, наступныя суседзі былі Луцкевічы. Яны былі менскія старажылы, спакон веку там жылі, разумныя людзі – шляхецкага роду. Часта дапамагалі людзям: паломіцца вадакачка – паправяць, дапамагалі людзям на могілках – былі сапраўдныя «слупы» ваколіцы. У іх былі два сыны, і гэтыя сыны – то зьявяцца, то прападуць. І кожны ведаў, што калі прападаў чалавек зусім – дык ці яго забілі, ці ён куды ўцёк, а калі прыходзіць і адыходзіць – то недзе ж ён бывае. І адзін раз старая Луцкевічава маёй маці кажа, што сына паранілі. Як, дзе? «А ён жа ж, – кажа, – у партызанах...» Так на мясцовым узроўні адчувалася, што партызаншчына вакол жывая.

З другога боку чалавек адчуваўся досыць спакойна – ёсьць паліцыя, ёсьць парадак. Калі гэтыя партызаны можа і ваяўнічыя ў лесе, то ў Менску яны скрытыя, хаваюцца, але трэба быць асьцярожнымі. СБМаўцаў, напрыклад, папераджалі: калі вы ходзіце ва ўніформе, то майце на ўвазе, што вас могуць проста забіць, не таму, што вы важныя шышкі, а проста каб запалохаць, каб моладзь ня йшла ў арганізацыю. Папераджалі, страшылі, аднак юнакі й юначкі ў форме хадзілі – было заўважна па ўсім Менску.

Аблавы

Былі ў горадзе аблавы – шмат, часта і нечакана. Аблавы былі прадуманыя. Афіцыйна казалі, што мэта – лавіць партызанаў, але ў насельніцтва быў адзіны і цьвёрды пагляд, што аблавы рабілі з мэтай налавіць людзей і адправіць у Нямеччыну. Абкружалі цэлыя кварталы і раёны, і хто ў гэтых кварталах апынаўся, то падаў пад вельмі пільную праверку дакумэнтаў. Калі ў дакумэнтах выяўляўся мінімальны непарадак, то забіралі ў паліцыю, і калі праблема не вырашалася, паведамлялі родным, што таго і таго адпраўляюць у Нямеччыну. Ня ведаю, ці хоць калі падчас аблаваў злавілі партызана – можа й злавілі, але што некаторых маіх сяброў і знаёмых злавілі і паслалі ў Нямеччыну – ведаю дакладна. Калі бывала аблава на рынку – дык кожны ведаў, што шукаюць партызана, бо на рынак партызаны прыяжджалі часта, і можна было прыпушчаць, калі нехта скупляе ўсё масла, за любую цану, то гэта партызан.

Аблаваў баяліся, стараліся ў іх не трапляць – хоць і дакумэнты маглі быць у парадку, але паліцыянтам не давяралі, лічылі, што паліцыя адрабляе «норму» людзей, каб паслаць у Нямеччыну. У гэтым насельніцтва бачыла слабасьць беларускіх уладаў. Ясна, былі

заклікі праз газэту – едзьце, там будзе праца, заробкі, адпачынкі, але гэта мала дзейнічала, людзі гэтаму мала верылі.

Аблавы моцна падрывалі аўтарытэт беларускай адміністрацыі.

Тэрор

Публічных пакараньняў я ў Менску ня бачыў, хоць ад сьведкаў чуў, што вешалі, але ў Арле адно публічнае пакараньне я перажыў, і да сёньня яно стаіць у мяне ўваччу. Справа была так. Недзе пад вясну 1942 году было абвешчана, што людзі, народжаныя ў 1926–1927 гадох на працягу 24 гадзін мусяць зарэгістравацца ў камэндатуры. Выключэньне рабілася толькі тым, хто працуе і пакажа адпаведныя дакумэнты. Я адразу пабег у камэндатуру і зрабіў тое, што вымагалася, і, варочаючыся па Перасыханцы каля 5-й Курскай, сустракаю знаёмага хлопца, а ён усхвалявана пытаецца: «Чуў, Алёшку Аляксеева павесілі!» Мяне як маланкай шаснула!

Мы з Алёшкам сябравалі. Жылі мы непадалёк адзін ад аднаго, хадзілі лавіць рыбу. Адзін год мы вучыліся ў адной клясе, а пасьля ён застаўся на другі год. Пачуўшы такое, я пабег у Першамайскі сквэр. І – жах! Непадалёк ад трамвайнага прыпынку на дрэве вісеў труп Алёшкі. У мяне сьціснулася дыханьне. Я заплакаў, дрыжалі плечы. Не хацеў верыць. Але – гэта была сапраўднасьць. Жудасна. Немцы павесілі Алёшку. А прычынай было тое, што мой сябра не атрымаў патрэбнае паперачкі аб працы.

Ён працаваў на палявой кухні, але яму не далі паперку, дык паліцыя яго ўбачыла, забрала і павесіла – бо ён ня выканаў нямецкага загаду. Я бачыў яго павешанага і перажываў гэтую жудасную несправядлівасьць. Я ведаў, што ён немцам на кухні сячэ дровы, часам нават я прыйду, і ён мне дасьць паўкацялка паесьці. А яны яму не далі паперкі! – ці ён ім ня вытлумачыў, ці немцы злосныя трапіліся, хто яго ведае. Гэтая падзея пакінула вельмі цяжкае і незабыўнае ўражаньне, гэта было барбарства ў дачыненьні да безабароннага, ні ў чым не вінаватага насельніцтва. І гэта рабіла армія – не жандармэрыя, не гестапа, не СС. Нямецкае войска, вэрмахт, якое б яно ні было «шляхетнае» ў гісторыі, у мінулую вайну паказала, што яно можа быць і бандыцкім, бо вешаньне цывільных людзей – дзяцей! – армейскаму чалавеку ніякімі законамі не апраўданае.

У Менску я такога ня бачыў. Казалі, у 1941-м вешалі палонных на Камароўцы. Зора бачыла, як у верасьні 1941 году ад радыёзаводу да плошчы Якуба Коласа на два бакі на слупах віселі савецкія палонныя. У кнігах я пасьля бачыў здымкі, але самому бачыць не даводзілася.

Яўрэі

Зь яўрэямі я сутыкаўся ў першае лета, калі ганяў козаў і кароваў на пагарэлішчах. На пагарэлішчах бывала, што дом згарэў ня поўнасьцю – верх згарэў, а падвал, палова першага паверху засталіся. І ў некаторых пагарэлішчах хаваліся яўрэі. Яўрэі наагул жылі ў гета, і іх кожны дзень ганялі на працу. Ганялі іх вэрмахтаўцы або оргтодтаўцы (можна было адрозьніць па форме – вэрмахтаўцы ў зялёнай, оргтодтаўцы ў бронзавай), найчасьцей оргтодтаўцы – ішлі са стрэльбамі, часам і з сабакамі – дык праходзілі міма пагарэлішчаў, бо звычайна ісьці было далёка, пад Сьляпянку, дзе яўрэі выконвалі тэхнічныя працы для Орг-Тодту. Ганялі іх калёнамі: ідзе вялікая калёна па Даўгабродзкай у Сьляпянку, і з гэтых калёнаў яўрэі часам выбягалі і ішлі да сваіх знаёмых ці пажабраваць бульбы – і часта на ноч не вярталіся ў гета. У 1942-м такое было магчыма, маглі спакойна ўцякаць. Яўрэі часта на пагарэлішчах начавалі. Як яны давалі рады з падлікам пры вяртаньні ў гета – ня ведаю.

Што яшчэ было зь яўрэямі – і маці расказвала, і я сам назіраў – вельмі часта, асабліва гамбурскія яўрэі, якіх пачалі прывозіць у 1942 годзе, заходзілі ў дамы. Да нас на Берасьцянскай аднойчы прыйшла старэйшая жанчына, яна ўмела па-руску два-тры словы, і просіць – забярыце маё дзіцё. Мая маці кажа: тады і тады мы ідзем у Западную, прывядзі сваё дзіцё туды, адкуль мы будзем адыходзіць. І чатыры жанчыны, якія ідуць у Западную, кажуць дзяўчынцы ісьці за імі сьледам, яна зь імі ідзе і на яе ніхто не зьвяртае ўвагі. Яны даводзяць яе да партызанскай зоны, і дзяўчынка аддаецца партызанам. Дарослых выводзіць не маглі, але дзяцей выводзілі вельмі часта.

Толькі адзін раз – гэта было ў 1943 годзе – я быў сьведкам таго, як цэлая калёна яўрэяў якраз на адцінку паміж Вайсковымі і польскімі могілкамі села на зямлю і ня рухалася. У гета былі пачаліся пагромы, і ім аб гэтым перадалі. Іх вялі са Сьляпянкі ў гета, гэта была даўгая дарога, і яны селі на дарозе. Як доўга яны сядзелі – я ня ведаю, назаўтра мы прыйшлі – там ужо нікога не было, але прынамсі дацямна яны сядзелі і ня рухаліся.

Я ніколі ня бачыў, каб калёну вялі беларускія паліцаі. Найчасьцей ахоўнікі былі з Орг-Тодта. Пару разоў я бачыў ахоўнікаў украінцаў або літоўцаў.

Ад бацькоў я чуў, што кантакты зь яўрэямі былі і на ўзроўні адміністрацыйным, бо некаторыя яўрэі, якія пры саветах былі ведамыя навукоўцы, апынуліся ў гета, і людзі, што працавалі ў беларускай адміністрацыі, атрымоўвалі дазволы выводзіць іх для беларускай працы.

У народзе адчувалася варожасьць да сытуацыі, што частка наро-

ду сядзіць у гета. Народ не прымаў, што раптам яўрэяў ізалявалі. Наколькі мне было ведама, кіраўніцтва гета было ў нямецкіх руках, беларусы да гэтага дачыненьня ня мелі. У мяне склалася ўражаньне, што гета ня надта моцна і ахоўвалася. Вядома, былі пагромы, пра гэта людзі расказвалі, успрымалася гэта адмоўна. Людзі перажывалі, але нічога не маглі зрабіць.

Значную частку гета складалі гамбурскія яўрэі – пераважна багатыя людзі, якія выходзілі ў горад амаль без аховы, мелі грошы, нешта куплялі, мянялі. А нашы яўрэі – гэта была бядота. Калі гамбурскі яўрэй прыходзіў на базар нешта прадаць – дык гэта было важна, а калі прыходзіў наш, дык ніхто не зьвяртаў увагі.

Гамбурскія яўрэі прыходзілі на базар, звычайна на Старажоўскі – яны мелі на вопратцы нашыўку з зоркай Давіда – і прыносілі прадаваць лахі. Іхныя лахі былі досыць дарагія: галёшы, туфлі – відаць, яны з сабой рознага прывезьлі – і людзі ў іх куплялі. Нашытыя зоркі яны мусілі хаваць – баяліся паліцыі, бо заходзіць на базар яўрэям было забаронена.

Языкі казалі, што ў прагімназіі – я ўжо ня памятаю які прадмет, магчыма нават і батаніку – выкладала жанчына яўрэйка, нібыта дырэктар Акановіч яе ведаў з ранейшага часу. Яна была смуглявая, але мы ніколі не пыталіся.

Я чуў ад бацькі, што ў Навуковым аддзеле працавалі пару яўрэяў, якія запісаліся як беларусы.

У газэтах, вядома, падавалася афіцыйная палітыка, пісалася ў тым духу, што «жыды нам шмат нашкодзілі», «савецкая ўлада – гэта жыды», але на пабытовым узроўні гэта ня поўнасьцю прымалася. Ніякай варожасьці да яўрэяў не было, хутчэй само існаваньне гета ўзбуджала варожасьць да немцаў, бо людзі не прывыклі, што твайго былога суседа ізалююць і трымаюць за калючым дротам, а яшчэ нядаўна ўсе жылі разам.

У народзе антысэмітызму не было – хоць, вядома, на бытавым узроўні яшчэ з савецкіх часоў было поўна жартаў. А ў часы нямецкія, я б сказаў, была сымпатыя да іх – каб даць ім паесьці, ці дзіцёнка вывесьці ў Западную – ім дапамагалі. Я нідзе ня бачыў і ня чуў, каб «звычайныя» людзі ставіліся да іх варожа.

У канцы 1943 году гета зьнішчылі, але той раён так і застаўся за дротам. Прычым ніхто не казаў, што яўрэяў забілі там, у гета – казалі, што вывезьлі.

Палонныя

Пра лягеры палонных ведалі – невялікія лягеры былі ў самым горадзе, а пра Трасьцянец не было нават і чуваць, каб нехта пра гэта нешта расказваў, прынамсі да мяне такое не даходзіла. Казалі, што

ёсьць вялікія лягеры палонных, але далёка. Пра палонных найбольш гаварылася на базары, яны былі зьявай штодзённага жыцьця.

Палонныя зь лягеру на вуліцы Шырокай хадзілі па хатах – напрыклад, прыйдзе, спытаецца, ці ня трэба каго пастрыгчы або нешта падшыць, падбіць боты або гарод ускапаць – іх пусьцяць, накормяць, дадуць за работу. Ня ведаю, які ў іх быў рэжым, але хадзілі яны часта – безумоўна часьцей, чым яўрэі. У Серафімы Феліксаўны Жук за той час, што мы жылі, палонныя ўборную на агародзе перанесьлі разы тры. Раней стаяла па два гады, а тут праз два месяцы – прыйдуць у хату, а Серафіма Феліксаўна кажа: «У мяне для вас ніякай працы няма, дык перанясіце ўборную, дам вам паесьці». Адносіны былі добрыя.

Адзін выпадак з палонным мне запамятаўся на ўсё жыцьцё. Прыйшоў у хату палонны: ці трэба каму пастрыгчы валасы, у мяне машынка. Пачаў ён мяне стрыгчы, а машынка паламалася. Ён мне паласу па галаве правёў, і далей няма як. Вось так я выглядаў: праз усю галаву выстрыжана паласа – зусім як у некаторых сёньняшніх маладзёнаў. Палонны кажа бездапаможна: «Ну, извините...» Давялося ісьці ў цырульню на плошчу Якуба Коласа, а там цырульнік кажа: «А такую тваю маці, я цябе стрыгчы ня буду, так і хадзі...» – «Дзядзечка, як жа я буду хадзіць?» Дык я таго цырульніка ўпрошваў, каб ён дастрыг, і неяк упрасіў.

Грошы

Усюды хадзілі рублі і маркі. Рублі бралі менш ахвоча. Калі ты ходзіш на базары і прадаеш, скажам, кашулю, а другі падыходзіць і кажа: а ў мяне боты, давай абмяняем – адно каштуе больш, другое менш, і рэшта аддаецца грашыма. Але калі на базары стаіць ларок, то там ужо таварамі не бяруць, патрэбныя грошы. На базары таксама браліся і рублі, і маркі. (У Менску ў часе вайны дзеілі чатыры вялікія рынкі: Камароўскі, Старажоўскі, Чэрвенскі і Суражскі. Базарныя дні тых рынкаў былі ў розныя дні тыдня.)

Ня ведаю, ці былі афіцыйныя гандлёвыя ўстановы з сваімі правіламі – прыпушчаю, што былі – да іх я ня меў дачыненьня. А там, дзе трэба было плаціць – у падатковым бюро, прыкладам – там таксама бралі і маркі, і рублі.

Маркам аддавалі перавагу (гэта былі ня райхсмаркі, а спэцыяльныя маркі для ўсходніх абшараў), бо за гэтыя маркі можна было нешта купіць і ў немцаў. Рублёў немцы ня бралі. Былі і нямецкія магазыны – каля вакзалу, каля фабрыкі-кухні – я ў тых магазынах ня быў, там толькі немцы маглі купляць.

Прыпамінаецца такі выпадак. У нас развальваліся крэслы, і было немагчыма дастаць сталярны клей, дык я спытаўся ў таго Жэнінага

Антона, нават ня думаючы – а ён кажа: я магу купіць у нямецкім магазыне. Я яму даў 50 марак, і ён мне гэтага клею гэтулькі купіў, што ўсе крэслы пасклейваў. Напэўна, немцы маглі купіць у сваім магазыне ўсё, што ім было патрэбнае.

Нямігa

Прагімназія разьмяшчалася на Нямізе, і за дзьве-тры падваротні ад яе пачынаўся камэрцыйны раён – гэта было сэрца Менску: на абодвух бакох вуліцы былі маленькія камісіёнкі, шашлычныя, забягалаўкі, піўныя. Няміга была вельмі жывое месца, гандаль ішоў вельмі шырока. Там панавала спэцыфічная атмасфэра, там Менск жыў сваім жыцьцём. Гэта ня Цнянская, што далёка і людзей мала, тут была самая гушча, людзі толькі цывільныя, хоць за пару кварталаў быў Soldatenheim, але ён быў незаўважны, ізаляваны. Гэты раён – Няміга, Траецкае прадмесьце, да бальніцы – быў цывільны, немцаў там не было відаць, і прагімназія ўпісвалася ў гэты ляндшафт, дзе было адчуваньне, што ніякай вайны няма. Магазынчыкі маленькія, крамкі, якіх пры саветах і не было, барахлішка невыразнае, тыпы падазроныя, варажбіткі, якіх было поўна. З улікам пазьнейшага досьведу вялікіх гарадоў – Няміга ў Менску была тыповы downtown.

Нашы гаспадары Шабанавы нацягалі ў часы пажару – кніжак, а таксама фатаграфічнай паперы. Я ў іх пытаюся – што з гэтай паперай? Яны кажуць – ай, трэба выкінуць. Дык я занёс на Нямігу ў камісіёнку, і якраз пачкі былі добрыя, незасьвечаныя, і ў мяне купілі гэтую паперу мамэнтальна.

Я ўпэўнены, што старая Няміга для сёньняшняга турыста была б вельмі прыцягальнай, бо сапраўды там можна было і паесьці, і выпіць, і закусіць, і касьцюм пашыць, і фатаграфічны апарат купіць.

Адно што – на Нямізе надта не любілі вучняў. Вучні заходзілі пераважна там, дзе можна нешта паесьці, прычым калі добры кліент булку ня возьме, бо яна памятая, то вучню малаважна, памятая яна ці не, абы зьесьці. Але шмат у якіх магазынах сядзелі варажбіткі, і як толькі зойдзе добры кліент, то яны адразу: «Ну, мілы, давай пагадаю!» А мы ведалі, што гэтыя варажбіткі былі жулікі, і нас у тыя магазыны не хацелі пускаць – яна варожыць на сіце, уткне нажніцы, нешта гаворыць і глядзіць, будзе сіта круціцца ці не. А нехта з цыганоў стаіць і дзьме на тое сіта! А мы кажам: глядзі, глядзі – ён дзьме на сіта! І гаспадар гоніць нас вон. Дык мы ўжо ведалі: дзе варажбіткі – туды лепш не заходзіць.

Наагул, гэта вельмі цікавы мамэнт – я ўжо пазьней перадумваў – пры саветах Няміга ня значыла нічога, звычайная вуліца, і раптам у 1942–1943 годзе стала цэнтрам гораду! Жывым сапраўдным цэнтрам. Можна нават было нешта даведацца, калі патрэбна, бо

якраз каля самага мосту на Ніжнім Рынку быў адбудаваны магазын з прыгожымі шпалерамі, дзе прадавалі і гадзіньнікі, і мэдычныя інструмэнты, але ў іх можна было даведацца, ці ідуць цягнікі. Бо адзін раз у клясе нехта пытаўся, як ехаць на Берасьце, дык іншы вучань адказаў: зайдзіце на Нямізе ў магазын, і вам скажуць расклад цягнікоў. Старая гістарычная вуліца зрабілася цэнтрам дзелавога жыцьця гораду.

Кнігі

Як я зазначыў раней, Менск – горад кніжны. Кніга ня выйшла з ужытку і ў вайну.

На найбольшым у Менску Суражскім рынку быў кіёск, які працаваў толькі ў базарныя дні і ў нядзелі (на розных рынках базарныя дні былі розныя). Там было шмат людзей з «Западнай» – іх пазналі мамэнтальна па адзёжы, бо яны былі лепш апранутыя: кажушкі прыгожыя, шапачкі. Суражскі рынак быў найбліжэйшы да чыгункі, а «западнікі» найчасьцей прыяжджалі чыгункай.

У самым канцы базару быў вялікі кіёск, дзе былі «салідныя кнігі», іх можна было купіць, але можна было і пазычыць – у кіёску былі два ці тры прадаўцы, і яны бралі толькі маркі.

На Камсамольскай вуліцы быў вялікі магазын, дзе таксама прадаваліся кніжкі і ноты – у тым магазыне былі іх сотні, яны ляжалі на палічках, і іх трэба было самому выбіраць. А з кніжак прадавалася пераважна бэлетрыстыка, шмат беларускіх – Мурашка, Бядуля, старыя савецкія выданьні. Нічога іншага я ня бачыў, хоць я надта тады і не шукаў.

Праўда, мой сябар Дзімка Карпенка, зь якім я сядзеў разам у школе пасьля таго, як Цэлеш пайшоў у «Люфтвафэ», адзін раз паказаў мне кніжку Коласа, якая была выдадзеная ў Вільні, – ён купіў яе на Суражскім базары за 2 маркі. Ён і сам любіў чытаць, і маці яго зьбірала кнігі – яны жылі далёка, каля Грушаўскага пасёлку, я часам у іх начаваў. Так што на рынку траплялiся кніжкі віленскіх выдавецтваў.

Калі б я мог параіць нейкаму геральдысту, які рабіў бы герб Менску, я абавязкова настаяў бы, каб у гербе была кніжка. Мне здаецца, што мянчане чытаюць больш за іншых, ці можа я проста больш з такімі людзьмі сутыкаюся.

На мяне і тады зрабіла ўражаньне: маё дзяцінства прайшло ў Арле, я там ведаў птушыны базар, іншыя базары, але ня бачыў, каб на базары прадаваліся кнігі. Калі я прыйшоў на Суражскі базар і ўбачыў, што кніжкі прадаюць – я быў вельмі ўражаны. Я тады не задумляўся, што беларусы бліжэйшыя да Захаду, але адчуў гэтую розьніцу.

Памятаю, Серафіма Фэліксаўна, калі я ішоў на Суражскі базар, нават давала мне заданьне знайсьці канкрэтную кніжку, бо яна шмат чытала і хацела тую кніжку мець.

У сувязі з кніжкамі прыпамінаецца цікавы эпізод. У маёй 29-й народнай школе была дзяўчынка Валя Чачнёва, і я зь ёй хутка пасябраваў. Валя была мянчанка, гаваркая, усім дапамагала, вельмі свойская. Мне яна адразу сказала: знаеш, можна цягаць кніжкі – ведаеш, дзе ўнівэрсытэцкі гарадок? Там, крышку далей за СД, у адным пустым унівэрсытэцкім будынку ў падвале званеныя кніжкі, і хоць ёсьць ахова, але можна праз адчыненыя вокны залезьці. І мы пачалі туды лазіць. Кніжак там было шмат, усё было літаральна завалена, толькі вузенькая сьцежачка паміж імі – гэта былі тыя кніжкі, якія немцы падрыхтавалі для вывазу, але яны мусілі прайсьці нейкі перагляд, аднак ці ў немцаў людзей не хапала ці што – кнігі ляжалі, і моладзь лазіла і выбірала сабе кніжкі для чытаньня. Я, напрыклад, набраў усе тамы Малой савецкай энцыкляпэдыі. Усю восень 1942 году з Валькай Чачнёвай і зь іншымі мы вельмі часта хадзілі і набіралі кніжак. Безумоўна, гэта быў крадзеж – немцы скралі ў беларусаў, з розных бібліятэк, і зьбіраліся вывезьці, а мы «адкрадалі» назад у немцаў.

(Нядаўна я даведаўся, што Валя Чачнёва загінула – згарэла на сумна вядомым пажары на навагоднім балі ў Менску ў 1946 годзе.)

Мовы

Ва ўстановах і канторах мова была беларуская – гэта ніхто не аспрэчваў. Усе надпісы былі па-беларуску. Прыходзіш у кіно купляць білет у касе – касірка гаворыць па-беларуску, тое самае ў тэатры. Тэатар уважаўся цэнтрам беларускасьці.

На базары была трасянка, працэнтаў на 75 беларуская – расейскія словы ўстаўляліся, але пераважалі беларускія.

Час ад часу на базары можна было пачуць нямецкую мову. Базар – гэта гул натоўпу і дзесяткі ўскрыкаў накшталт: «Каму соды!?», «Каму сахарын – дзесяць на марачку?» – і так крыкі, крыкі, усё на беларускай базе, і гутарка паміж людзьмі, і ўсё зьліваецца ў базарны гул.

Думаю, агульны моўны тон задавала тое, што на рынку было шмат людзей з Заходняй Беларусі. Іх прыяжджала ладна – куплялі галянтарэю, соду, пабытовыя вырабы, якія яшчэ засталіся з савецкіх часоў – і «западнікі» выдатна гаварылі па-беларуску, так што іх можна было пазнаць і па адзёжы, і па мове. Яны былі добра апранутыя, у ботах, а асабліва падабаліся нам, «усходнікам», гэтыя іхныя кажушкі – вышытыя, прыгожыя, якіх у нас пры саветах ніколі ніхто ня бачыў, прынамсі я. Людзі з Заходняй Беларусі часта ўстаўлялі ў гаворку польскія словы, а то і сказы.

Польскай мовы я ў Менску ня чуў. Ну, «дзенькуе», «пані», «пшэпрашам» – гэта былі стандартныя менскія словы, з гэтым мы на Горным завулку расьлі, яны й не ўспрымаліся як польскія, гэта былі звычайныя тэрміны менскага этыкету.

Расейскай мовы было значна менш, чым цяпер, ніяк нельга сказаць, што яна панавала, дый у трасянцы расейскага элемэнту было менш.

Ідыш, вядома, ужо нідзе не гучаў, але асобных словаў у гаворцы было «з гакам». Я больш чуў ідыш у словах маёй маці. Яшчэ пры цары на Горным завулку на двух рагох вуліцы Дрэваапрацоўчай былі дзьве крамы (пазьней гэта былі дом Славікоўскага і дом Доўнар-Запольскага), і ў тыя дзьве крамы ў пятніцу ўвечары клікалі заўсёды Маню Зубкоўскую патушыць сьвятло – і там толькі на ідышы й гаварылі, і мая мама свабодна навучылася штодзённаму пабытоваму ідышу.

Яшчэ з мовы ваколіцаў Залатой Горкі – «файна». Можна было пяцьдзясят разоў на гадзіну пачуць «файна», «фэцка!»

Лаянка

Лаяліся людзі па-беларуску: «А каб ты хадзіў па гары і сонца ня бачыў!», «Каб табе вантробы заняло!», «Каб табе духі заняло!», каб табе тое, каб табе гэтае – такое было. А мату сэксуальна-вульгарнага я ніколі ў Менску ня чуў, і для мяне гэтая розьніца з Арлом была вельмі яскравая і відавочная. У Арле мат-перамат – гэта было нармальна, а мянчане не мацюгаліся.

Ад маіх сяброў на вуліцы – на Горным завулку, на Берасьцянскай, на Чырваназорнай – я ніколі не пачуў ня толькі мацюга, але нават выразаў накшталт «сукін сын», «выдзерну з жопы ногі», якія ў Расеі ўжываліся направа і налева. Мая думка такая, што мат, «сквернословие» прыйшлі ў Беларусь пасьля вайны.

Друк

Наагул, Менск пасьля Арла рабіў уражаньне арганізаванага гораду, у якім наладжана жыцьцё. Кідаліся ў вочы кіёскі, дзе можна было купіць газэту – на вакзале, каля Чырвонага касьцёла, быў магазын, дзе прадаваліся і газэты, каля Інстытуту фізкультуры, на базарах былі кіёскі.

У кіёсках прадаваліся беларускія і расейскія газэты. У будынку БНС быў невялічкі кіёск, дзе я першы раз пабачыў «Новы шлях» і яшчэ нейкі беларускі часопіс.

Газэты былі – «Беларуская газэта», «Баранавіцкая газэта» прадавалася ў Менску, «Голас вёскі». Было пару расейскамоўных газэтаў,

ня памятаю назовы. Бэрлінскай «Раніцы» я ў Менску ня бачыў, як і віленскага «Беларускага голасу».

«Беларуская газэта» разыходзілася досыць шырока – прыпамінаю, як людзі разгортвалі яе й чыталі на Суражскім рынку, і на Камароўцы, дзе былі два кіёскі.

Як мы прыяжджалі ў Менску пры саветах, то з Горнага завулку я, мая сяброўка Янька Варатніцкая і яшчэ пару дзяцей кожны дзень хадзілі пад Дом сьпецаў купляць газэты: я – для сваёй мамы, яны для татуся. Пад Домам сьпецаў можна было купіць «Правду», «Известия», іншыя штодзённыя газэты – і мы штодня вельмі любілі прайсьціся, тры-чатыры гадзіны мы разам, пакуль мы тыя газэты прынясем. І вось гэты «татусь» Варатніцкі ўжо ў нямецкія часы заўсёды, як мяне пабачыць з акна, прасіў: «Вітка, куды йдзеш? Купі мне «Беларускую газэту!»

Радыё

Пры немцах ні ў кога я радыё ня чуў. Радыёстанцыя працавала, нехта можа і слухаў, але дзе я ні бываў у людзей – нідзе нічога ня чуў. Нас, вучняў, пару разоў з школы вадзілі на радыё, мы там выступалі, але каб хто гэта слухаў – ня ведаю.

Наагул радыёпрыёмнікі ў людзей былі, іх слухалі. Мой траюрадны брат Сярожка Ваўчок слухаў савецкія зводкі і прыходзіў расказваць.

Кіно, тэатар

Кіно было вельмі папулярнае. Фільмы мяняліся часта. Вялікае «платнае» беларускае кіно было спачатку адно (здаецца, на вуліцы Апанскага). Амаль усе фільмы былі перакладзеныя па-беларуску – у кадры ішлі субтытры. Потым, здаецца, адчынілася яшчэ адно платнае, я ўжо дакладна не прыпамінаю.

У Менску было некалькі кінатэатраў, дзе трэба было купляць білет. А Арганізацыя Тодт, чые майстэрні былі каля Батанічнага саду, зрабіла маленькую кіназалю, дзе для моладзі пускалі фільмы бясплатна. Фільмы былі нямецкія. Самая папулярная акторка была Марыка Рок. Я кіно любіў і пры саветах хадзіў часта, але пры немцах я такі кінаман ня быў, пачаў больш чытаць, захапіўся нацыянальным – больш хадзіў у штаб СБМ, хоць там асабліва не было чым заняцца. Але фільмы з Марыкай Рок прапусьціць было нельга.

Вельмі папулярны быў і тэатар. У маім уяўленьні тэатар быў нават больш папулярны, чым кіно. Тэатар быў жывы, дзейны, ставілася шмат п'есаў, п'есы мяняліся, былі спэктаклі і дзённыя, і вечаровыя. Я ў тэатар хадзіў досыць часта – «На Антокалі», «Шчасьлівы муж»... У маім выпадку тэатар быў часткай штодзённага жыцьця – у тэатар

трэба хадзіць, як у лазьню. Маці каля тэатру нарадзілася і мяне прывучыла.

Зь білетамі ў тэатар стала прасьцей, калі арганізаваўся СБМ, бо тэатар заўсёды даваў 50-100 білетаў на штаб. Раней трэба было ісьці ў касу, але там маладым ня надта прадавалі, казалі – раскуплена.

У травені 1944 году ў Менску зьявіліся афішы спэктаклю «Загубленае жыцьцё». Гэтая п'еса Тодара Лебяды пра раскулачваньне, калектывізацыю ў пастаноўцы Вячаслава Сэляха зрабіла фурор. А на другі тыдзень рэклямуюць, што будзе выступаць тэатар РОНА (РОНА – «Русская освободительная народная армия» Браніслава Камінскага). Нас, моладзі, прыйшло ладна на той выступ. Там пераважна гумар – «пиджак утиль – особый стиль», «чулки зеленыя, туфли голубые» – эстрада, расейскія песьні. І раптам у залі сьвіст: «Давайце беларускую праграму!» Сьвіст, гром! Артысты спынілі выступ, заслона апусьцілася, нехта выйшаў і сказаў, што паказ скончаны, заля затупала нагамі і разышлася. Больш расейскіх эстрадных спэктакляў не было. Выступ тэатру РОНА ў травені 1944-га ў Менску быў сарваны і асьвістаны. Калі мы ішлі – ніхто ня ведаў, што там дакладна будзе, пісалася – эстрада, гумар. А там была пашляціна нізкага густу. Пасьля «Загубленага жыцьця» беларуская моладзь гэтага не хацела, не прыняла, змусіла спыніць – выступ РОНА быў страшны дысананс, Менск беларускі такога выступу прыняць ня мог.

Транспарт

Калі людзям трэба было перавезьці дровы або іншыя рэчы – то наймалі прыватных вазакоў. Нават такое было, што вазілі і ў шпіталь – калі наш сусед ніжэй па Берасьцянскай паламаў нагу, то знайшлі возік і павезьлі ў бальніцу ў горад. Цяжка было, але магчымасьці знаходзілі. Наколькі ведаю – таксі ў часе акупацыі ў горадзе не было.

Трамвай

У канцы 1943 ці ў пачатку 1944 году пусьцілі ў Менску трамвай, і першы дзень ён езьдзіў цэлы дзень пусты – нібыта пробны. А пасьля кажуць, што зробяць так, каб у першым вагоне маглі толькі немцы езьдзіць, а ўжо ў другім – «людзі». Праз два ці тры тыдні трамвай ходзіць – садзіся дзе хочаш, немцаў у вагонах няма. Казалі, што нібыта ў Ліцманштаце ўзарвалі ў трамваі першы «нямецкі» вагон, дык яны цяпер пушчаюць і ў адзін і ў другі, але немцаў у трамваі я ніколі й ня бачыў. Трамвай хадзіў з Камароўкі пад Суражскі рынак – ад плошчы Якуба Коласа проста па Савецкай аж да цяпе-

рашняга пэдунівэрсытэту, адзіны маршрут. Другая лінія, на якой рамантаваліся рэйкі – гэта на Ленінскую налева ад Савецкай, але я ня памятаю, пусьцілі гэтую лінію ці не.

У дзень Кангрэсу, 27 чэрвеня 1944 году, трамваі былі ўпрыгожаныя бел-чырвона-белымі сьцягамі. Наагул, у дзень Кангрэсу бел-чырвона-белых сьцягоў па горадзе разьвесілі парадачна – па Савецкай вуліцы ледзь не на кожны слуп.

Я езьдзіў на трамваі ў нядзелю на рынак – ішоў на плошчу Якуба Коласа, трамвай яшчэ быў пуставаты, так што можна было сесьці. Садзіўся звычайна ў задні вагон і ехаў аж пад Суражскі рынак – гэта займала добрую гадзіну. Цана білета ў трамваі была, здаецца, 1 марка.

Электрычнасьць, тэлефон

Электрычнасьць была ў горадзе – недзе за Сьвіслаччу, ад Гарадзкога саду ўверх, а таксама ў грамадзкіх установах у іншых частках гораду.

На Берасьцянскай электрычнасьці не было. У нас была лямпа, якая запальвалася раз на тыдзень. А на кожны дзень была вялікая шклянка з жалезнай накрыўкай, у шклянку быў наліты бэнзін, тырчаў кнот, падсыпана солі, і кнот гарэў. Гарэў памалу, бэнзін быў самы танны, газу мы ашчаджалі. Але раз на тыдзень запальвалі лямпу – вычысьціш шкло, падкруціш кнот – гэта было цэлае сьвята.

Зрабіць усе хатнія заданьні трэба было засьветла, бо ўвечары не было як рабіць.

Тэлефоны я бачыў толькі ў канторах, але ніколі не карыстаўся. У прыватных хатах я тэлефон ніколі ня бачыў і ня чуў, каб хто меў.

Лазьня

Дзейная была лазьня на Мар'еўскай – яна і цяпер ёсьць. Каля гэтай лазьні былі два ці тры ларкі. У лазьні прадавалі толькі піва – я, калі бываў у Менску пры саветах, часта туды хадзіў зь дзедам. А ў ларках ужо прадавалася і водка – і ў чацьвяртухах, і паўлітра, літровак чамусьці не было. Мужчыны з лазьні выйдуць – і адразу ў ларок, за ларкамі стануць, гэтую бутэлечку – хлоп, на двух, на трох. І вось мы з Зорай пайшлі ў 1991 годзе, падыходзім пад лазьню – а там два з бутэлькі, з горла выпіваюць! Зора ахнула, а я прыпомніў дзяцінства – каля лазьні нічога не зьмянілася.

(Праўда, гэта я Зору нагаварыў падысьці пад лазьню. Ідучы, я ёй расказваў, як бывала раней. І трэба было ўбачыць нашу рэакцыю, выразы твараў, калі мы ўбачылі тую самую карцінку, якую я бачыў 50-60 гадоў перад тым!)

Зьяўляецца Зора

З Зорай пасьля сэмінарыі бачыліся рэдка. Я быў у прагімназіі, яна – у сэмінарыі. Я ня меў ніякага дачыненьня – нейкая дзеўка ходзіць у форме. Адзін раз яна мяне на забаве ўбачыла ў гэтай Ніны Гарбузік і ўсё сьмяялася, але ніякага пачуцьця яшчэ не было. Я ведаў, што вось яна, была яшчэ такая Лялька Кошалева – свае, СБМаўскія дзяўчаты...

У штабе была група людзей, на розную дробную дапамогу якіх кіраўнікі разьлічвалі – Кіпель, Карпенка, Вайтовіч, Кавалеўскі – хлопцы маладыя, але пэўныя, шмат у чым штодзённым дапамагалі. Была такая група і сярод дзяўчат, і адна зь іх была Зора Савёнак. У Менску, як і паўсюль, ёсьць бліжэйшыя людзі, зь якімі ты ідэйна на адной ноце.

Калі я вучыўся ў прагімназіі, Зора пачала мне «трапляць на вочы». Найперш дзеля таго, што яна хадзіла ў форме СБМ, бывала ў штабе і хадзіла дахаты на Камароўку. Раз ці два мы з штабу ішлі дахаты разам. Аб нечым гаварылі, паступова зьбліжаліся, але ніякай «рамантыкі» паміж намі яшчэ не было. Хутчэй за ўсё мы пачыналі адно аднаму падабацца, бо заўсёды «траплялі» ў групы ахвотнікаў нешта рабіць у штабе. Таксама мушу падкрэсьліць, што Зора надта ж не любіла рынку і заўсёды мне казала: «Вітка! Як ты можаш бываць на базары і так добра там чуцца?»

Сьвяты

Сакавік сьвяткаваўся шырака толькі адзін раз – у 1944 годзе. Гэта было самае вялікае сьвята за ўвесь час, што я быў у Менску. (У народнай школе дырэктар Кісель 25 сакавіка 1943 году прыйшоў у кожную клясу і расказаў пра сьвята вельмі дэтальна і вобразна, але ніякага агульнашкольнага адзначэньня не было.) Як сьвяты ў школе адзначаліся Дажынкі і Гуканьне вясны.

Досыць папулярнае сьвята было 1 травеня, бо адчынялася фабрыка-кухня непадалёк Чырвонага касьцёла, і тым, хто ўдзельнічаў у дэманстрацыі, давалі бясплатны абед па талёнчыках. На 1 травеня была дэманстрацыя працоўных – і ў 1943-м, і ў 1944-м – і я ўдзельнічаў абодва разы. Гэтае сьвята мала адрозьнівалася ад савецкіх часоў, розьніца была ў тым, што цяпер давалі паесьці і што ўсюды былі беларускія транспаранты.

У некаторых сем'ях прыватна адзначалі Новы год, але ў нашай сям'і гэткай традыцыі не было. Шабанавы адзначалі традыцыйна, бывала шампанскае, ставілі ялінку, бывала шмат гасьцей. У гэтыя дні былі і большыя пажары – пачынала гарэць ад сьвечак вата, і пажарная ахова была, званілі ў званы, ехалі пажарныя...

Рэлігія

Рэлігійнае жыццё ў горадзе было жывое, але я ў ім ня ўдзельнічаў і ў царкву не хадзіў. Для маёй маці рэлігія была важнай, бо і Васіль Паўлавіч Зубкоўскі, і Марфа Кандратаўна Ваўчок былі людзі рэлігійныя, і маці, калі ў Менску расла, сьпявала то ў адным царкоўным хоры, то ў другім. Ведаю, што ў царкве Аляксандра Неўскага дзед шмат дапамагаў у будаўнічых справах. Думаю, што наагул Зубкоўскія чуліся добра ў рэлігійных справах, але, мне здаецца, надта адданымі праваслаўнымі яны не былі.

Быў такі выпадак у Арле зь дзедам, я паўжартам у яго спытаўся: «А як ты памрэш, то як цябе хаваць?» А ён задумаўся і кажа: «Папа мне не заві». А я кажу: «Што, духавы аркестар?» – «Ах ты, кусок арыштанта!..» Ну, я так думаю: ня хоча папа, на духавы аркестар крычыць, дык я яшчэ раз перапытваю: «Дзедка (так я яго клікаў), дык ты ня хочаш папа?» «Не!» – быў цьвёрды адказ. Я, прызнацца, гэтай гутарцы не надаў вялікага значаньня. А калі дзед памёр, я ў маці пытаюся, калі мы зь ёй былі адны: «Мама, чаму дзед неяк так жартаваў...» – «А ты ў яго што – пытаўся?» – «Пытаўся...» – «А як жа ты сьмеў...» А пасьля расказала, што ў Вуглянах аб праваслаўным жыцьці пры цары былі дрэнныя ўспаміны – там доўга з вуніі не хацелі пераходзіць у праваслаўе, дык прыслалі казакаў, і бывалі эксцэсы. І дзед гэта памятаў!

Маці шчыра раззлавалася, калі даведалася, што я зь дзедам так захоўваўся. Аднак я гэта рабіў ня злосна, а проста «дурэў». Ясная справа, непрыгожа, аднак дзеці часам так невытлумачальна злосна захоўваюцца. Кажу гэта шчыра – бо я дзеда моцна любіў.

Па лініі Кіпеляў да рэлігіі ставіліся без энтузіязму – паважалі, перахоўвалі, але ў «Эпізодах» Яўхім Кіпель пра расейскую царкву выказаўся гэтак: расейскую праваслаўную царкву наагул нельга лічыць хрысьціянскай. І кропка.

Да рэлігійных пачуцьцяў іншых я быў вельмі талерантны. Я часьцей заходзіў у касьцёл, бо некаторыя мае сябры былі веруючыя каталікі, і беларускасьць у касьцёле я адчуваў болей, чым у праваслаўных.

Я праўдападобна быў няхрышчаны, а Зору яе маці пахрысьціла, яна была больш веруючая, маці ў яе каталічка, і Зора паставіла ўмову перад жанімствам – і ты пахрысьціся. І мяне пахрысьцілі ў праваслаўную веру ў сталым узросьце – гадоў у 28.

Пры немцах мне прапаноўвалі ўлучыцца ў беларускае царкоўнае жыцьцё – сьвятар Кушнер у царкве Аляксандра Неўскага на Вайсковых могілках, арганізаваў у царкве хор моладзі. Калі ён мяне часам бачыў – як я працаваў на пагарэлішчах – дык запрашаў, але я казаў, што ня маю часу аддавацца царкоўнай дзейнасьці, бо заняты нечым іншым. Сьвятар Кушнер быў актыўны чалавек, у царкве былі два

хоры – старэйшы і моладзі. Яны і рэлігійныя песьні сьпявалі – я пару разоў заходзіў – і сьвецкія беларускія. Але я ня меў адпаведнага выхаваньня і падрыхтоўкі і хоць ставіўся вельмі талерантна, але бліжэй у царкоўную дзейнасьць не ўлучыўся.

Сьцяг, Пагоня

Пра бел-чырвона-белы сьцяг я даведаўся ў 1942 годзе, калі нас, вучняў, слалі са скарбонкамі зьбіраць грошы на сірацінцы. Як я ўжо згадваў, на сірацінцы я сабраў некалькі тысячаў, ходзячы са скарбонкай, упрыгожанай бел-чырвона-белым сьцягам у не зусім «нацыянальным» раёне. Варожасьці да сьцягу ў насельніцтва не было. Сьцяг вісеў над школай, на фабрыцы-кухні (хоць гэта была нямецкая ўстанова, у несьвяточныя дні там елі салдаты). Былі значкі са сьцягам – іх прадавалі ў кіёсках на базары, саматужнікі выраблялі сувэніры зь сьцяжкамі.

Пагоні было відаць менш – яе і маляваць цяжэй.

Калі я выхоўваўся ў Арле, я чуў пра Скарыну, чуў пра пісьменьнікаў, чуў слова «нацдэмы», чуў шмат чаго нацыянальнага, але пра бел-чырвона-белы сьцяг ні ад маці, ні ад бацькі ня чуў ніколі. Вельмі шмат яны мне расказвалі пра Скарыну, бо калі яны былі маладыя, сьвяткавалася 400-годзьдзе скарынінскага друку, выйшаў зборнік, дык у іх гэта засталося ў памяці, і яны мне гэта перадавалі.

Бамбёжкі

Савецкія бамбёжкі былі памятныя і моцныя, асабліва травеньская бамбёжка 1943 году, якая нарабіла і панікі. Да таго часу ніхто на гэта сур'ёзна ўвагі не зьвяртаў, ва ўсіх быў настрой, што савецкая авіяцыя разьбіта – хоць яны сабе б'юцца і ваююць, але авіяцыі ў савецкага войска няма. А тады ў травені як наляцелі, дык шмат чаго разбамбілі. На Орг-Тодт, які быў пад Батанічным садам, пару бомбаў скінулі, і некалькі складаў згарэла – гэта прыблізна за паўкілямэтра ад нашае хаты, дык было адчувальна, як гарэла, як тушылі, як выбухалі боепрыпасы. Травеньская бамбёжка была сапраўдная!

Пасьля травеня 1943-га бамбёжкі бывалі частавата. Савецкая авіяцыя бамбіла вакзал, вайсковыя аб'екты, майстэрні, склады. Бамбёжкі ўвайшлі ў штодзённае жыцьцё рэальнымі непрыемнымі эпізодамі. Цярпела і цывільнае насельніцтва, людзі гінулі, былі паховіны. І хоць людзі былі незадаволеныя, плакалі – чаму гэта на нас, але ніхто нікога не вінаваціў, гэта ўспрымалася як стыхійнае бедзтва, непазьбежная частка ваенных дзеяньняў. Памятаю, бамбілі нямецкі аб'ект каля Сьляпянкі, ня ведаю што там было, дык забілі двух немцаў і двух беларусаў, і ўсіх іх пахавалі на Вайсковых могілках – немцаў

таксама. Звычайна немцаў хавалі на Маскоўскай шашы – там былі нямецкія вайсковыя могілкі, а гэтых двух пахавалі зь беларусамі, ня ведаю чаму.

«Што будзе з намі, калі прыйдуць нашы?»

З розных крыніцаў – газэт, «адзін аднаму сказаў», дзе-нідзе радыё – людзі сачылі за тым, што робіцца на фронце і што робіць Амэрыка. Як толькі ў Арле даведаліся, што Амэрыка ўступіла ў вайну, то паўсюдна я чуў развагі: «А што ж Амэрыка? Цікава, як Амэрыка?» Усходні фронт і Амэрыка – былі галоўныя тэмы палітычных дыскусіяў у любы час і ў любым месцы. Прычым пра Ўсходні фронт гаварылі з боязьзю: што будзе з намі, калі вернуцца «нашы»? Гэтага баяліся. Вельмі баяліся звычайныя мяшчане, як «татусь» Варатніцкі, якому ў той час было добра за семдзесят – той, якому я гліну вазіў – часам на маім возе вярталіся з працы дахаты, і ён так і пытаўся: «Што будзе з намі, калі прыйдуць нашы?» Ну, такія як я, мая сям'я, казалі, што мы «нашых» больш ніколі не пабачым. Дый увогуле ў маёй сям'і слова «нашы» не было, але іншыя яго ўжывалі направа і налева.

Жыла на Горным завулку Маня Ждановіч, гадоў на восем за мяне старэйшая, іхная хата захавалася – яна была вельмі актыўная ў сэнсе дапамагаць старым. І адзін раз яна бачыць, як я іду ў форме СБМ, і кажа: «Вітка, вы тут напэўна ўжо ня будзеце, як нашы прыйдуць?» Я кажу: «Напэўна ня будзем...» – «А што будзе са мной?» – «Я ня ведаю». – «Я ж нікуды не паеду – у мяне татусь хворы, мама хворая...» І боязь! Людзі баяцца! Яны гэтых немцаў ня лічаць «нашымі», ні ў якім разе, і баяцца тых, хто для іх «нашы»! Што я мог Мані адказаць? Разупэўніць?

Развагі, думкі пра «нашых» нікога не пакідалі ў спакоі. Думаю, людзі спадзяваліся на зьмены, на тое, што «нашыя» ня будуць такімі, якія яны былі да вайны. І гэтым яны, мабыць, апраўдвалі сваё рашэньне, што яны нікуды не паедуць.

Стаіш у чарзе па ваду – у нас быў артэзіянскі калодзеж, дзе Горны завулак упіраецца ў Дрэваапрацоўчую – чалавек пяць-дзесяць стаяць, я помню, зімой і расказваюць, што пад Сталінградам залом наступае – можа радыё слухалі ці газэту па-свойму прачыталі – і адзін другому кажа: «Божа-божа, хто яго ведае, ну можа нічога ня будзе – я ж нічога не раблю...» Во такая гутарка.

Для мяне гэта ўсё былі пустыя развагі, бо я ведаў, што маёй сям'і бацька яшчэ ў Арле задаў кірунак уцякаць далей, кажа: «Я доўга хадзіў, цэлы тыдзень, і разважаў – ці застацца пад немцамі. І вырашыў, што мне горш, чым было пры саветах, нідзе ўжо ня будзе...» Толькі ўцякаць – далей, далей і далей. Ну, безумоўна, па-сыноўску, я да-

лучаўся да бацькавых паглядаў. Я пачынаў усьведамляць, што і мне пры савецкай сыстэме ходу ня будзе – калі й выжыву, то ў Сібіры.

Кангрэс

Чэрвень 1944 году. Скончыліся заняткі ў школе – можна цяпер спакойна хадзіць на возера.

У горадзе адчувалася – ня тое што паніка – але большы рух, больш зьявілася нямецкага войска, аўтамабіляў, танкетак.

Панаваў настрой, што нешта рыхтуецца, хоць у хаце я асабліва не заўважаў. Праўда, прыходзіла шмат незнаёмых людзей – з правінцыі. Але дакладна я нічога ня ведаў, мяне ніхто не інфармаваў, што рыхтаваўся Другі ўсебеларускі кангрэс. Пра кангрэс мне сказала маці ў сам дзень кангрэсу, так і сказала, што бацька шмат працаваў арганізацыйна. І тыя людзі, якія бывалі ў хаце – гэта ўсё зьвязана з кангрэсам.

Кангрэс адбыўся 27 чэрвеня. У гэты сонечны і вельмі прыгожы дзень горад быў урачысты, трамваі хадзілі зь бел-чырвона-белымі сьцягамі.

Я ў гэты дзень з раніцы быў на Нямізе і бачыў, што беларускія сьцягі луналі нават на пляцы Волі, што бывала не заўсёды. У горадзе было поўна людзей, шмат незнаёмых, што прыехалі на кангрэс.

Я да гэтага ўсяго ніякага дачыненьня ня меў, а бацька быў поўнасьцю заняты ў падрыхтоўцы, дык я яго й ня бачыў. Маці была занятая тэхнічнымі пытаньнямі падрыхтоўкі кангрэсу. Іх фактычна ўжо за пару дзён да 27 чэрвеня не было дома, я начаваў у хаце сам.

Парабіўшы свае справы на Нямізе, я пайшоў пад тэатар і пабачыў там вельмі шмат народу – відаць, быў перапынак.

Не прыпамінаю, ці ўвечары бацькі былі ў хаце, але я дамовіўся зь сябрамі, што наступны дзень, 28 чэрвеня, мы ідзем на возера. І так мы – з паўтузіна хлопцаў з Камароўкі, пару дзяўчат аднекуль – правялі цэлы дзень на возеры, купаліся, каталіся на лодках, пасьля нават у нейкіх сяброў на Старажоўцы заначавалі, бо плянавалі ісьці на возера і на наступны дзень.

Выезд зь Менску

На наступны дзень, 29 чэрвеня я прыйшоў дахаты на Берасьцянскую, а маці ўся ўсхваляваная на мяне: «Дзе ты быў, што ты рабіў!?» – «На возеры...» Раптам па абедзе прыяжджае машына, а ў машыне спадар Антон Шукелойць, я яго трохі ведаў, часам бачыліся: «Зараз жа зьбірайце, што ёсьць – выяжджаем!»

Гэта было як абухам па галаве... Я абсалютна не спадзяваўся – ніхто нічога не казаў і не прадказваў, што будзем выяжджаць, усё

вакол было спакойнае і раптам такое. Шукелойць з шоферам зайшлі ў хату, схапілі пару лахманоў: «Зараз жа выяжджаем, я машыну дастаў для вас, каб вас забраць...» Маці на мяне таксама пачала крычаць, каб зьбіраўся. Ну, я таксама схапіў сёе-тое, сунуў у мяшок і кажу: «Я і веласіпед свой бяру...»

Сапраўды для мяне гэта было як гром зь яснага неба. Мы сабе на возеры гулялі – і нічагусенькі ніхто не сказаў, народу было поўна, дні былі прыгожыя. На тое, што набліжаюцца саветы, вялікай увагі не зьвярталася, хоць было ведама, што пачаўся савецкі наступ. Маё асяродзьдзе – мае аднагодкі – мы былі абсалютна спакойныя і ўпэўненыя, што нічога не адбываецца.

Папярэдняе адчуваньне было, што стабілізуецца беларуская ўлада – адбываецца кангрэс, фармуецца беларускае войска – нешта будзе больш беларускае, чым было. Такі быў настрой.

Было, вядома, усьведамленьне, што немцы не такія моцныя, як раней, што яны адступаюць, саветы наступаюць, недзе ваююць амэрыканцы. Было адчуваньне, што Нямеччына слабее. І адначасна ўзмацоўвалася пачуцьцё, што пашыраецца беларуская ўлада. Беларуская краёвая абарона, афіцэрская школа – усё гэта дадавала нам, маладым, пачуцьця, што беларуская ўлада мацнее. Газэты ў такім узросьце звычайна чытаюць мала, хто чытаў – можа й ведаў, што саветы магутна наступаюць, але як далёка ці блізка, які гэта прыме абарот – пра гэта ні я, ні мае сябры не задумоўваліся. А час быў ваенны, абставіны мяняліся хутка.

І вось мы ў нашай хаце, маці нэрвовая, спадар Шукелойць стаіць і чакае, шофер крычыць «Быстрэй, быстрэй!» Сёе-тое вынесьлі з хаты: мяшок пшаніцы, я зь веласіпедам. Пасьля я пачаў крычаць: у мяне было шмат трусоў – я іх не пакіну, забяру з сабой! Шофер крычыць: «Ты што – здурэў?!»

Я ў Шукелойця пытаюся – што, сапраўды трэба ехаць? Ён адказвае: «Так, так! Мы выяжджаем зь Менску, і то зараз жа!» Мы хутка закінулі ў кузаў наша барахло і паехалі. Гэта было маё апошняе падарожжа па Менску – зь Берасьцянскай пад будынак Цэнтральнай Рады.

Пад будынкам Рады сабралася ладна народу, выглядала, што адтуль проста выяжджаюць на цягнік. Я быў разгублены – я быў да гэтага не гатовы. Спадар Шукелойць скінуў нашыя рэчы на траве зьлева перад уваходам у Цэнтральную Раду.

Мяне гэтая сьпешка так выбіла з каляіны, што я нават ня памятаю, ці быў там недзе бацька. Наогул той дзень прыпамінаў сумбурна.

Пераначавалі мы каля Рады. Было там з паўсотні-сотня людзей з рэчамі – спалі на зямлі. Нікога знаёмага я ня бачыў.

Раніцай зноў жа спадар Шукелойць прыехаў з машынай, пагрузіў нашы рэчы ў кузаў, і мы паехалі на вакзал. Прыехалі – а там эшалён ужо поўна набіты, нідзе няма месца. Там ужо прыпамінаю і бацьку.

І Шукелойць нас упіхвае ў вялікі таварны вагон, а там пачынаюць крычаць. У гэтым вагоне я пазнаў Шчаглова, бо ён часта ў тэатры выступаў, Арсеньневу, якую таксама пару разоў бачыў – і яны крычаць, што месцаў больш няма. А Шукелойць ім кажа: гэтыя людзі будуць тут, інакш прывяду паліцая – панічная, крыклівая сытуацыя... Ну, неяк ён нас усё ж упхнуў у вагон.

Я ў Шукелойця пытаўся пазьней, што й як было. Ён спахапіўся каля Беларускай Цэнтральнай Рады – дзе Кіпель? Ніхто ня ведаў. Дык ён паехаў шукаць дахаты і так нас выцягнуў. Так што выезд на эміграцыю зь Менску я заўдзячваю толькі Антону Шукелойцю – у гэтыя дні пасьля кангрэсу мы маглі разгубіцца і застацца.

У цягніку разышлася чутка, што Чырвоная армія ўжо за якіх 50 кілямэтраў ад Менску – тады ў мяне расплюшчыліся вочы: ага, вось што робіцца, пачаўся савецкі наступ, і гэты выезд – уцёкі ад наступу. Бо да таго я ніяк ня мог асэнсаваць, што адбываецца – я рыхтаваўся правесьці добры летні адпачынак, усё навокал выглядала так спакойна, і раптам гэтыя ўцёкі... У вагоне, здаецца, Кушаль ці ягоны сын прачыталі ў нямецкай газэце, што Чырвоная армія на подступах да Менску і мяркуецца, што за дзень-два савецкія войскі будуць у Менску. Тады ўжо ўсё стала ясна. Настрой у мяне канчаткова сапсаваўся, бо я бачыў, што з маіх плянаў прыемна правесьці лета зь сябрамі ў Менску нічога ня будзе.

І мы паехалі. Хто б мог падумаць, што зь Менскам мы разьвітваемся зноў – аж на 47 гадоў...

Нямеччына

Выезд зь Менску

У цягніку я трымаўся сам адзін, збоку. Было няўтульна, бо пасадка ў цягнік была непрыемная і на Кіпеляў глядзелі скоса.

Праўда, я ўбачыў, што ў вагоне ехала Зора – адзіная асоба, якую я больш-менш знаў зь Менску, дык падумалася: будзе кампанія.

Успаміны з дарогі ў мяне ўрывачныя. Памятаю, што ноччу затрымаліся каля Баранавічаў, там бамбілі. Больш застаўся ў памяці той мамэнт, калі цягнік нарваўся на міну каля Мастоў на станцыі Скрыбаўцы. Мы, моладзь, сядзелі – я, Сямёнаў, Зора, Кушаль, і раптам – бух! бах! – глядзім наперад, а на завароце вагоны пачынаюць падаць адзін за адным, але за пару вагонаў да нашага перасталі, і мы не зваліліся. Немцы бягуць у жыта, рыхтуюць кулямёты, крычаць, каб людзі скакалі з вагонаў і клаліся на зямлю – баяліся партызанаў. Думаю, калі б партызаны напалі – прыбілі б усіх, а эшалён быў вялікі.

Забітых выцягнулі, некаторых там адразу і закапалі. Эшалён затрымаўся.

Прыпамінаю, што ў той самы дзень я хадзіў па ежу ў вёску. Трэба ж было есьці, а ў нас быў мяшок пшаніцы, якую я прыцягнуў у вагон у Менску. Дык мы з сынам Кушаля пайшлі ў вёску, абмянялі пшаніцу на хлеб, на масла, так што было што есьці.

Далей прыпамінаецца, што затрымоўваліся ў Беластоку. Дакладней памятаю прыезд у Кёнігсбэрг. Мушу сказаць, што падарожжа зь Беларусі ў маёй памяці не было надта прыемным. Я быў проста прыбіты, што гэтак раптоўна, безь ніякай падрыхтоўкі, прыйшлося літаральна ўцячы зь Менску, дзе я пакінуў свае заняткі, зацікаўленьні – зборкі ў СБМ, трусоў, зборку другога веласіпеда. Магчыма, а то і напэўна, што гэта банальнасьці, але гэта было пачуцьцё, што я ўжо быў пачаў прырастаць да радзімы, і раптам – уцёкі. Стваралася прыкрае адчуваньне, што пакідаеш усё сваё.

Канец чэрвеня – пачатак ліпеня 1944 году ў маёй памяці замацаваўся як бурлівы пэрыяд: нэрвова, мітусьліва я разьвітваўся зь дзяцінствам і юнацтвам і пераходзіў у невядомае – новыя краіны, новыя людзі. На душы было цяжка – выяжджаць з свайго гораду, з Бацькаўшчыны ахвоты не было.

Першыя дні ў заходнім сьвеце

Адносны спакой у эвакуацыйнай гарачцы наступіў у Кёнігсбэргу, куды наш эшалён прыехаў на пачатку ліпеня. У Кёнігсбэргу нас пасялілі ў кірсе, у якой, як казалі, бываў сам Кант. Спалі мы на дворыку – моладзь трымалася разам: я, Зора, Дзіма Сямёнаў, сястра Лявона Галяка. Пачаліся выхады ў горад – мы атрымалі талёнчыкі на прадукты, пахадзілі па горадзе, схадзілі на мора, пакупаліся. Час ад часу з намі па Кёнігсбэргу хадзіла Туся Шчаглова, у Менску я бачыў яе пару разоў у штабе СБМ, але бліжэй пазнаёміўся ў цягніку. Блізкім спадарожнікам была Зора, а таксама сын капітана Шнэка – Алег.

У Кёнігсбэргу Юры Сабалеўскі, які інфармаваў уцекачоў аб штодзённых праблемах, абвясьціў, што ўсе мы, хто едзе ў эшалёне – гэта БЦР, і хутка мы паедзем у Бэрлін. Прызнацца, я і без Сабалеўскага хутка зразумеў, што гэтае ўгрупаваньне ўцекачоў – гэта беларускае кіраўніцтва, БЦР. Празь некалькі дзён эшалён БЦР (дарэчы, шмат хто з эшалёну застаўся ў Кёнігсбэргу) накіраваўся ў Бэрлін.

У Бэрліне «эшалён» разьмясьцілі ў вялізным паўцёмным памяшканьні (некалі гэта была шыкоўная танцавальная заля), у якім цяпер у некалькі радоў стаялі падвойныя нары зь цюфякамі і коўдрамі. Кожнаму былі выдадзеныя прадуктовыя карткі на пару дзён, а немец з Ostministerium, які раздаваў карткі, таксама сказаў, што ў гэтым будынку мы прабудзем ня больш за тыдзень, а тады БЦР – адказная за нас – разьмяркуе людзей.

У сьведамасьці цьвёрда асядала: гэта ўжо была Нямеччына. Першапачатковая разгубленасьць праходзіла, яе зьмяняла пачуцьцё таго, што трэба дапасоўвацца да новага жыцьця, ня даць сябе апанаваць пэсымізму. Найперш трэба было мабілізаваць веданьне нямецкай мовы – і ў галаве было зусім ясна: пачынаецца іншы жыцьцёвы этап. Я за пару дзён зарыентаваўся – не скажу, што на раз-два, але паступова – і сабраў свае веды нямецкай мовы. Захацеў схадзіць у кіно – першы раз пайшоў сам, знайшоў кінатэатар, купіў білеты, бо ўжо аднекуль зьявіліся і маркі, праехаў у мэтро, якое тут звалася U-Bahn. Так пачалося жыцьцё ў Нямеччыне.

У Бэрліне людзей БЦР пачалі разьдзяляць. Адна група – там была і Зора – празь дзень-два выехала ў Сілезію. А дні праз чатыры-пяць – а я быў з бацькамі – бацькі кажуць, што БЦР выяжджае ў Пазнань. Ты, кажуць, далёка не адыходзься, бо нас паклічуць – праз гадзіну ці дзьве – трэба будзе ісьці на вакзал, і адтуль паедзем у Пазнань. Я кажу: «Дык што, я мушу сядзець тут?» А ў «гатэлі» бежанская атмасфэра, дык мне ня надта хацелася й сядзець. Я хадзіў ня толькі ў кіно, я купіў такую кніжачку-праваднік па Бэрліне – Baedecker – і паступова пачынаў арыентавацца ў новым горадзе.

Каля 10 ліпеня раніцай прыходзіць у гатэль немец зь Міністэрства ўсходніх справаў і па-нямецку, моцна, абвяшчае: сёньня тыя, хто працуе ў Беларускай Цэнтральнай Радзе, павінны пайсьці на Ангальцкі вакзал, і туды будзе пададзены цягнік, у які яны мусяць сесьці. Я пераклаў тым, хто там стаяў. І праўда, на тую гадзіну, што было сказана, людзі на вакзал зьявіліся, некалькі дзесяткоў чалавек – хто на таксі, хто прыйшоў. Ня ведаю, якія ў таго немца былі крытэрыі, паводле якіх ён вызначаў хто працуе ў БЦР, а хто не, але прозьвішчы супрацоўнікаў БЦР ён назваў.

У ліку названых БЦРаўцаў быў і мой бацька, бо ў Менску ён займаў пасаду кіраўніка навуковага аддзелу, дык мы таксама селі ў цягнік і паехалі ў Пазнань. Ехалі мы туды ня так доўга, гадзін дванаццаць, ехалі ноччу, цягнік пасажырскі, асобнае купэ, ехалася нармальна – загрузілі нас вечарам, і на раніцу мы былі ўжо ў Пазнані.

Пазнань

На вакзале ў Пазнані нам сказалі, што месца, дзе разьмесьціцца БЦР, знаходзіцца на ўскраіне гораду і даехаць туды можна толькі трамваем. Фактычным лідэрам гэтай групы стаўся Аўген Калубовіч. Ён гаварыў па-нямецку слабавата і ўзяў за перакладчыцу адну з дачок Сымона Кандыбовіча – Іру Кабыш, якая па-нямецку гаварыла добра. (Ну я з усёй той групы па-нямецку гаварыў найлепш.) Выдатна гаварыў па-нямецку Сьцяпан Стаськевіч – амаль зусім як немец – але ня быў галоўны. Такая ў маім уяўленьні стварылася герархія.

Мы даехалі трамваем па Glogauerstrasse да канца лініі, а там трэба было яшчэ мэтраў 200-300 прайсьці. Трамваем прыехала адна група, за ёй другая – разам асобаў 50-60. Сабраўшыся разам, мы рушылі ў патрэбным кірунку – відаць, Калубовічу былі дадзеныя інструкцыі, як дабрацца. Падышлі мы пад вялізную дзялянку зямлі, абнесеную высокай і густой драцяной агароджай. За агароджай былі відаць баракі, абнесеныя трыма лініямі калючага дроту. Пры ўваходзе ў лягер была вялікая драўляная будка, адгароджаная ад лягеру дротам, а мэтраў 200 далей па дарозе было відаць, што агароджа канчаецца і пачынаюцца могілкі. Іра Кабыш выйшла наперад з Калубовічам, сказалі хто яны і што яны. Вартавы адчыніў браму, і праз браму мы з усім барахлом увайшлі ў месца, прызначанае для Беларускай Цэнтральнай Рады.

Радзе былі адведзеныя два жылыя баракі – яны былі пустыя і вычышчаныя. У бараках былі нары ў два паверхі, і Калубовіч разьмеркаваў каму якія нары. Быў яшчэ адзін барак дадатковы – там была сталоўка, стаялі сталы і туды прыносілі, як тады казалі, «зупу» (мне гэты тэрмін вельмі рэзаў вушы), і адзін барак, дзе былі прыбіральні і душы.

Назаўтра Калубовіч усіх сабраў і паведаміў расклад лягернага жыцьця: сьнеданьне, абед, вячэра. Зазначыў таксама, што нам дадуць спэцыяльныя біркі і будуць выпускаць зь лягеру, калі мы хочам. Лягер складаўся з розных зонаў, мы былі ў першай, самай бліжняй, далей за дратамі былі іншыя баракі, паміж імі былі брамкі, але хто там быў – я ня ведаю.

Так пацякло лягернае жыцьцё. Праўда, абмежаваньняў выхаду зь лягеру мы ніякіх ня мелі – можна было выходзіць і прыходзіць калі хочаш, круглыя суткі. Немцы – кіраўнікі лягеру – ставіліся да жыхароў-БЦРаўцаў з павагай.

У гэтым лягеры «мянчане» пражылі, можа, тыдні тры. Мой бацька праз два дні выехаў – кажа, я тут сядзець ня буду. Ён паехаў у Бэрлін, а мы засталіся з маці.

Пазнаньская група БЦР была вельмі актыўная – Калубовіч, Кандыбовіч, Каракулька, Стаськевіч. (Стаськевіч да вайны скончыў інстытут, працаваў у Акадэміі навук разам з Трысмаковым. Міністар працы ў БЦР, зрабіў неблагую кар'еру ў Амэрыцы – працаваў нейкі час у Бібліятэцы кангрэсу ў бюро перакладаў тэхнічнай літаратуры, а таксама ў аддзеле тэхнічных перакладаў у выдавецтве MacGraw-Hill. Ён заходзіў да мяне ў бібліятэку, шукаў літаратуру.)

Прыпушчаю, што ў Пазнані былі прынятыя некаторыя рашэньні БЦР – бо нарады кіраўніцтва адбываліся часта, лягернае начальства давала ім іншыя памешканьні ў іншай зоне, хоць «афіцыйнае бюро» БЦР было ў бараку, дзе мы харчаваліся.

У мяне ўражаньне такое, што недзе на вярхах у Бэрліне Астроўскі сказаў Усходняму міністэрству, што ён хоча, каб БЦР была бліжэй да Беларусі, і, праўдападобна, міністэрства вырашыла, што БЦР з Бэрліну перабярэцца ў Пазнань.

У Пазнані БЦР вяла працу: прыяжджаў шэф СБМ Міхась Ганько, прыяжджалі нейкія людзі ў уніформе. А я ў Пазнані найбліжэй, калі можна так сказаць, пасябраваў зь Дзюнікам – Эдвардам Шабуням – братам Данчыкавай бабкі Яні. Быў ён гадоў на дзесяць за мяне старэйшы, да БЦР не належаў, гаварыў па-расейску. Трапіў Дзюнік у групу БЦР толькі таму, што быў братам спадарыні Яні, якая ў той час была жонкай Калубовіча.

Дзюнік быў прыстойны чалавек, да беларускага руху ставіўся прыхільна, але ня быў ніякім ні дзеячом, ні «рухавіком». Ён пасябраваў са мной, бо я там быў адзіны, хто, як і Дзюнік, ня быў адміністрацыйна зьвязаны з групай. Дзюнік мне кажа, ты ж па-нямецку добра гаворыш – я кажу, вельмі добра. Ну дык мы з табою будзем выходзіць у горад, шукаць, дзе прадаюцца маркі, старыя кнігі – бо ён быў калекцыянэр. І мы зь ім выходзілі ў горад на цэлы дзень – у адзін магазын пойдзем, у другі – і так бавілі час. Маці мая сядзела, як на гарачай патэльні, бо яе выпадкова ўзялі сюды зь Яўхімам Кіпелем,

а Яўхім Кіпель зьехаў, прычым паехаў са скандалам – пасварыўся з Калубовічам: што вы нас, кажа, прывезьлі ў нейкую дзірку. Дзеля гэтага маці баялася, што яе выставяць на вуліцу.

І так мы ходзім зь Дзюнікам па Пазнані, там я першы раз купіў кніжку Энгельгарта «Weissruthenien» – была кнігарня, дзе на самым відным месцы ляжала некалькі гэтых кніжак на каляровай дзяружцы.

Знайшлі мы і Беларускае прадстаўніцтва, хоць і чулі пра яго раней і ад Калубовіча, і ад Кандыбовіча. Мы зайшлі ў прадстаўніцтва, пазнаёміліся з кіраўнікамі, нас там пачаставалі. У прадстаўніцтве стала працавалі дзьве сакратаркі і яшчэ пару асобаў. Кіраўніком там быў Струк (ці Строк), індустрыяліст, уласьнік некалькіх фабрык канцылярскіх вырабаў у Польшчы, вялікая шышка. Яго ведаў асабіста Тумаш, але ніколі нічога пра яго не расказваў, казаў толькі, што гэта быў чалавек хітраваты, больш паляк, чым беларус. Прадстаўніцтва займала вялізны прыгожы дом над Вартай з шыльдай па-беларуску і па-нямецку: як заходзіш – Пагоня, сьцяг, вялікі офіс, пару карцінаў.

БЦР зьяжджае, я застаюся ў Пазнані

Урэшце надышоў дзень, калі было абвешчана, што БЦР вяртаецца ў Бэрлін. Пра гэта абвясьціў Калубовіч на агульнай зборцы. Ну, ясная справа, пасьля такога паведамленьня ў бараку рух, задавальненьне, усьмешкі. А мне Калубовіч ціхенька ківае пальцам: «Хадзі сюды». Я зьдзіўлена падыходжу, а Калубовіч, паклаўшы руку мне на шыю, кажа: «А ты застанесься на некаторы час тут, у Пазнані». Я, прызнацца, ад такое навіны ледзь не самлеў. «Я?!!! Што такое?» Калубовіч, адвёўшы мяне ў бок, растлумачыў сытуацыю. Рэч у тым, што эшалён з БЦРаўскім багажом – тры ці чатыры вагоны, – які ехаў зь Менску ў Кёнігсбэрг, цяпер едзе з Кёнігсбэргу ў Бэрлін, адтуль ён прыйдзе ў Пазнань. Трэба яго дачакацца, атрымаць на вакзале накладную, запоўніць усе блянкі і адправіць усё ў Бэрлін. І гэта мушу зрабіць я, бо гавару па-нямецку!

Ну мне і духі заняло, я й рот разявіў… А Калубовіч такі аўтарытэтны, маўляў, слухай, тут і гаварыць няма чаго – ты чалавек граматны, дзе вакзал ведаеш, ну дык і будзеш хадзіць туды кожны дзень пытацца, і калі прыйдзе – падпішаш, зробіш што трэба, адправіш, і на гэтым канец.

Адначасна Калубовіч дае мне білет, які мне зацьвердзяць на станцыі, а таксама пісульку ў Беларускае прадстаўніцтва, каб мне выдалі картачкі – бо прадстаўніцтва мела паўнамоцтвы выдаваць Lebensmittelkarten. Калубовіч мне дае гэтыя паперкі і кажа – цяпер забірай свой чамаданчык і выходзь адсюль.

Я кіруюся на выхад, але пераконліва яму кажу: ведаеце, у мяне й грошай няма. Калубовіч кажа, пачакай, яны з Кандыбовічам пагаварылі, Кандыбовіч пайшоў і прынёс каля пяці тысяч марак, суму нядрэнную. Я думаю: уга, мне тут хопіць і на маркі, і на ўсё. Вось так за мяне ўсё было вырашана. Цяпер мне заставалася паведаміць пра гэта маці.

Маці, калі ўсё гэта ад мяне пачула, спачатку абурылася, што нават ёй аб «такой зьдзелцы» нічога не сказалі, а потым як бы ледзь ня ў плач, кажа, сынок, можа я папрашу, каб цябе ўзялі ў Бэрлін... Аднак мама мая была стрыманая асоба, яна ведала, што ні ейныя просьбы, нішто тут не дапаможа, бо гэта было свайго роду «грамадзкае даручэньне», а ў сям'і панаваў прынцып – «калі грамадзкае, то трэба»! І хутка маці супакоілася, але, думаю, затаіла крыўду на Калубовіча за тое, што зь ёй не параіліся – бо яна напэўна б згадзілася.

Грамада пачала зьбірацца на выезд, а я пайшоў адразу на станцыю запытацца. Знайшоў адрас аддзелу, які гэтым займаецца, расказаў хто я і што, паказаў паперкі, яны сказалі: добра, усё ясна, будзеш прыходзіць і пытацца, мы дапаможам.

З вакзалу я пайшоў у Беларускае прадстаўніцтва, кажу: можа, памятаеце мяне, мы пару разоў былі тут зь Дзюнікам, а цяпер я пару дзён павінен у вас прабыць, і даю ліст ад Калубовіча. Сакратарка мамэнтальна пабегла наверх. Вышэйшы ўрадовец прыйшоў і сказаў: вось тут у пакойчыку ты будзеш начаваць. А ў тым пакойчыку жыў беларускі дзяяч Карпінскі-Карпейка, вельмі прыстойны чалавек з Наваградчыны, ён стаўся маім апекуном.

І так пачалося маё жыцьцё ў Беларускім прадстаўніцтве. Кожную раніцу я хадзіў на станцыю і пытаўся, ці няма вагонаў, якія належаць Беларускай Цэнтральнай Радзе. Дні я праводзіў у горадзе, хадзіў на рэчку, а вечарам варочаўся ў прадстаўніцтва. Я зблізіўся з спадаром Карпейкам, ён шмат адукоўваў мяне ў справе беларуска-польскіх дачыненьняў.

Аднойчы я прачнуўся, пачуўшы, што за акном адбываецца нейкая мітусьня. Я выйшаў у калідорчык, нібыта ў прыбіральню, адчыніў акно, бачу – стаяць дзьве машыны, адна меншая, другая большая, з кузаваў выладоўваюць скрынкі. Я ціхенька вяртаюся ў пакой, буджу Карпейку і кажу: спадар Карпейка, там нешта робіцца. А Карпейка мне напаўголаса кажа: гэта палякі, там зброя, у прадстаўніцтве перахоўваецца зброя. Ты нічога ня бачыў, і маўчы. Ну, маўчаць, дык маўчаць. А ўдзень зноў усё нармальна – прыходзіць поўна бежанцаў зь Беларусі, усім даюць картачкі, ставяць штэмпэлі – прадстаўніцтва робіць сваю справу. Праўда, пасьля гэтага здарэньня я ў прадстаўніцтве чуўся ня надта добра: зьявілася нутраная нязгода. Але я маўчаў – жыцьцё прывучыла!

Замах на Гітлера

Адна раніца ў ліпені мне добра запамятавалася. Іду я на станцыю – а часам я хадзіў двойчы на дзень – і бачу, што перад станцыяй усё перагароджана, стаяць браневічкі, і нямецкая жандармэрыя правярае дакумэнты ў тых, хто ідзе на станцыю. Я паказаў дакумэнты, мяне прапусьцілі, іду далей – а на станцыі зноў кардон.

Аднак на вакзал мяне ўпусьцілі, я хуценька праверыў сваю справу і выйшаў назад, ні ў кога нічога не пытаючыся.

Адышоўшы ад станцыі, я купіў газэту – Völkischer Beobachter – і прачытаў, што 20 ліпеня быў замах на Гітлера, і мне ўсё стала ясна – нацысты ўсхваляваліся, баючыся, што можа гэта рэвалюцыя пачынаецца па цэлай краіне, таму ўсюды былі ўзмоцненыя нацыстоўскія патрулі. Але пад вечар я ўжо ня бачыў нічога асаблівага, усё супакоілася.

Я праседзеў у Пазнані зь месяц. Калі прыйшлі БЦРаўскія вагоны – здаецца, тры, але я ўжо не прыпамінаю – я запоўніў досыць даўгія фармуляры, тут мне дапамаглі паперы і блянкі, якія мне даў Калубовіч. Запаўняць трэба было дакладна, бо ў накладных, якія, відаць, рыхтаваліся ў Кёнігсбэргу, апісвалася дакладна ўсё, што было ў вагонах: паперы БЦР, архівы, прыватныя рэчы і падобнае. Выканаў я заданьне вельмі пільна і дакладна. Калі я прыпамінаю гэты эпізод, мне становіцца сьмешна. Я ж мог зрабіць з гэтым майном што хачу – мог бы загнаць куды мне ўздумаецца! Але такога ў мяне і ў думках не было – відаць, мне-ткі было прыемна, што і мне нешта давяраюць! Калі што й ёсьць цікавага ў гэтай гісторыйцы, дык гэта тое, што Калубовіч чамусьці палічыў, што мне можна давяраць. Дзіўна! Пазьней, калі Калубовіч быў маім настаўнікам у гімназіі, ён ніколі не паставіў мне ніводнай пяцёркі, хоць мне здавалася, што на пяцёрку я ягоны прадмет ведаў.

У той дзень, калі вагоны БЦР пайшлі на Бэрлін, я сеў на цягнік і таксама паехаў у Бэрлін.

Бэрлін

Прыехаў я ў Бэрлін у самым канцы жніўня ці ў пачатку верасьня 1944 году, знайшоў, дзе знаходзіцца Беларуская Цэнтральная Рада, знайшоў Калубовіча, здаў яму справаздачу, аддаў усе паперкі. Ён мне падзякаваў, запытаўся, ці не хачу я паесьці. Я кажу, вельмі хачу, бо нічога ня еў. Калубовіч даў мне талён у сталоўку БЦР (якая к таму часу займала пару вялікіх будынкаў каля станцыі мэтро Weissensee і была добра арганізаваная) і кажа: мы ня ведаем, дзе твая маці, ня ведаем, дзе твой бацька – паеш, і матай адсюль.

Разышліся мы з Калубовічам, і я думаю: што ж мне рабіць, куды ісьці? А тады вырашаю: найбліжэйшы знаёмы, што быў у нас сярод

бэцээраўцаў, быў Сэлях – дык я падыду да яго, можа, ён што ведае пра бацькоў. Так я і зрабіў, і Сэлях навёў мяне на сьлед: тата твой, здаецца, працуе ў Вінэце, установе пры Міністэрстве прапаганды, вось табе адрас, едзь туды.

Я паехаў у Вінэту. Там кажуць: так, Кіпель тут бывае, але не працуе, а каб даведацца нешта пра беларусаў, трэба ісьці да капітана Міхала Пугачова. Пайшоў я да Пугачова, куды мне сказалі, а Пугачоў ужо быў адышоў ад БЦР і перайшоў да Ўласава. І Пугачоў мне паведаміў, дзе бацька – бацька, кажа, будзе працаваць у Вінэце, але мы адышлі ад БЦР і пераходзім да Ўласава. Мяне гэта ня надта цікавіла, але я хацеў мець адрас, дзе жыве бацька. Пугачоў мне адрас даў.

Знайшоў я бацьку. Ён сказаў: мы жывем з маці ў адным пакойчыку, ты, ясна, будзеш жыць з намі, але спачатку ідзі ў Arbeitsamt і зарэгіструйся. Пайшоў я ў Arbeitsamt, а там кажуць так: ты гаворыш па-нямецку, мы цябе адправім – ёсьць такі Deutsches Institut für Ausländer, дзе рыхтуюць перакладчыкаў. Але там ты зможаш вучыцца толькі калі адбудзеш Arbeitseinsatz тры разы на тыдзень – тры дні на выбар будзеш працаваць і тры дні вучыцца, выбірай якія хочаш курсы – мову найперш, а потым можаш браць дадатковыя курсы.

Нямецкі інстытут для замежнікаў

Бясспрэчна, на такую прапанову я згадзіўся і паехаў у інстытут – Am Kupfergraben, 5 – гэта была частка Бэрлінскага ўнівэрсытэту. У інстытут мяне адразу залічылі ў рабочую каманду муляраў – бо найбольш былі патрэбныя муляры. Брыгадзірам гэтай каманды быў нехта Herr Gajewski, які мне адразу сказаў, што пару месяцаў я буду вучнем у майстра-муляра, аднак я мушу выяжджаць на любую працу, калі едзе майстар.

Езьдзілі мы па цэлым Бэрліне, калі не было разьбітае мэтро – там, дзе былі акадэмічныя будынкі. Калі будынкі бывалі разьбітыя падчас бамбёжак, мы замуроўвалі вокны, дзьверы. Часта будынак быў разьбіты ўшчэнт, тады і мураваць не было чаго – такі будынак агароджвалі калючым дротам.

Што да курсаў, я сказаў, што хачу далей вывучаць нямецкую мову. Яшчэ сказалі, што ў тыя дні, калі я буду працаваць на Arbeitseinsatz, я магу спаць на месцы – у іх быў інтэрнат, куды можна было прыйсьці пасьля працы, памыцца ў душы. А калі спаць і ў тыя дні, што я буду вучыцца, то там ужо трэба было плаціць. І так я чатыры дні жыў там, на Kupfergraben, 5 – мяне там кармілі і давалі спаць, а на тры дні прыяжджаў да бацькоў – спаў на падлозе, бо ў іх быў толькі адзін ложак.

Гэтак цягнулася да канца лютага 1945 году. Для мяне гэта быў вельмі памысны пэрыяд. Я працаваў у чацьвер, пятніцу і суботу, а ў панядзелак, аўторак і сераду былі асноўныя лекцыі, пяць-

восем гадзін штодня. Я хадзіў на лекцыі, заўсёды была адчыненая бібліятэка, падагнаў шмат прапушчанага і навучыўся новага.

У студзені 1945 году прафэсар доктар Крэймэр, якая вяла моўны курс, кажа мне: слухай, у цябе добра з навукай, калі хочаш, то можаш запісацца на матуру – браць больш лекцыяў і здаць на атэстат за паўгода-год. Але Arbeitseinsatz трэба адбываць і далей. Я на гэткую праграму таксама згадзіўся.

Графік быў напружаны, а калі быў вольны час, то адпачыць хадзілі ў кіно. Кінатэатраў было шмат, было шмат і фільмаў. У той час на мяне найбольшае ўражаньне, бадай, зрабіў фільм «Der Fuchs von Glenarvon» – пра ірляндцаў, якія змагаюцца за сваю незалежнасьць. Ну й безумоўна папулярны ў той час быў музычны фільм «Die Frau meiner Träume». Але запамятаць усе фільмы было б проста немагчыма.

Праца на Arbeitseinsatz была цяжкая. Herr Gajewski – стары аўстрыйскі яўрэй, ужо за 60, які меў ці ня 10 ордэнаў зь Першай сусьветнай вайны. Ён быў патрыятычны немец, але выказваўся свабольна – не пагаджаўся з нацыстоўскай праграмай. Як ён трапіў у Бэрлін – я ня ведаю, але ён быў старшы над групай 60-70 чалавек, што адбывалі Arbeitseinsatz.

У інстытуце было шмат чужынцаў, пераважна яны вучылі нямецкую мову, былі вялікія нацыянальныя групы – мадзяраў былі сотні. Беларусаў было мала, а ўкраінцаў я амаль зусім ня бачыў. У інстытуце былі курсы літоўскай, латыскай і фінскай моваў. Былі там і румыны, якія сьпявалі «мамалыга молоко, Румыния далеко»…

На гэтым курсе ў Deutsches Institut für Ausländer тая прафэсар доктар Крэймэр, паколькі там былі прадстаўнікі розных народаў, падрыхтавала аднойчы лекцыю пра БНР для студэнтаў, прынесла карты – прыйшло чалавек пяцьдзясят. Тады я ў яе папытаўся: пакажыце, дзе бібліятэка, дзе ёсьць беларускія кнігі, і яна мне паказала. І там, у інстытуцкай бібліятэцы, было якіх 200-300 беларускіх кніжак, а на ідышы дык можа тысяча было – на іх стаялі менскія пячаткі, віленскія – цэлыя стэлажы. Праўда, я зайшоў туды толькі раз ці два, бо трэба было працаваць – вольны час быў вельмі абмежаваны, а яшчэ трэба было вучыцца, кожныя два-тры тыдні здаваць экзамэны. Навука там была інтэнсіўная, вымагалася шмат, усё гэта адбывалася па-нямецку.

На моўныя курсы потым паступіла Галіна Ганчарэнка, Уладак Кушаль, сын Струка з Пазнані і яшчэ некалькі беларусаў, але я зь імі дачыненьня ня меў.

Адзін выпадак мне запомніўся як незвычайны. Было прыняцьцё з нагоды ўнівэрсытэцкае гадавіны – а галоўнай арганізатаркай там была доктар Крэймэр. На прыняцьці было чалавек сто – публіка вельмі шматнацыянальная. Як заўсёды на такіх імпрэзах – новыя знаёмствы, сяброўствы, шчырыя гутаркі. Падыходзяць да мяне два грузіны, якіх я ведаў, і кажуць: мы з табой былі добрыя сябры, а зараз мы

з табой разьвітваемся, бо заўтра нас з дэсантам скідаюць у Грузіі. Я іх прозьвішчы памятаў, яны былі старэйшыя за мяне, колішнія чырвонаармейцы. У той вечар яны мне падаравалі свае фота, але я іх недзе згубіў.

Як выглядае, для грузінскіх палітыкаў гэтая справа была вядомая, бо значна пазьней, калі я працаваў на Радыё Свабода і блізка пазнаёміўся з грузінскім дзеячом князем Вачнадзэ (мы зь ім езьдзілі на паляваньне на козаў на фарме Савёнкаў! князь быў і паляўнічы, і выдатны апавядальнік), ён расказаў мне больш дэталяў і пра той дэсант, і пра грузінска-нямецкае супрацоўніцтва.

Літоўцы. Пагоня

Найбольш сярод студэнтаў, зь якімі я разам займаўся мулярствам, было літоўцаў, і ў мяне зь імі нават адбыўся канфлікт.

Прыйшоў я на працу, у мяне на пінжаку прыколата Пагоня. Літоўцы ўбачылі, і адзін зь іх падыходзіць да мяне і кажа – слухай, ты палітоўску не гаворыш, чаму ты носіш Пагоню? Я кажу: я ня ведаў, што яна літоўская, мяне ў школе навучылі, што Пагоня беларуская. Якая, кажа, беларуская? Што гэта такое? Я кажу, ну як што такое (а мы гаворым па-нямецку). Ну так, Пагоня наша, кажа, а пра беларусаў мы ніколі ня чулі! Я кажу: Пагоня наша, гэта я пра вас ніколі ня чуў. А іх там многа, а я адзін! І той літоўскі студэнт мне заяўляе: ты ня будзеш насіць Пагоню. Я яму: як гэта ня буду насіць? Я яе насіў, мне гэтую Пагоню ў Менску падаравалі – зь бел-чырвона-белым сьцягам наверсе, бурачковага колеру, прыгожая Пагоня – і буду насіць! Тады падышло пару іншых літоўскіх студэнтаў, і адзін зь іх кажа: у цябе на бірцы на руцэ (мы ўсе насілі біркі зь імем і прозьвішчам) напісана «Вітаўт», дык ты напэўна літовец. А я кажу: ды абсалютна не! І так мы неяк перакідваемся словамі – і варожа, і прыязна, не разумеючы адзін аднаго. Яны мне даводзяць, што я, ня будучы літоўцам, ня маю права насіць Пагоню, а я ім: спадары, адчапіцеся ад мяне! Мне ў школе было сказана, што гэта маё, Пагоня – беларускі знак!

Нарэшце паклікалі прафэсара, старэйшага чалавека, ён слаба гаварыў па-нямецку, але добра валодаў расейскай мовай і ведаў пару словаў па-беларуску. Дык ён мне кажа: ясна, ты насі Пагоню, але добра, каб ты і літоўскую мову ведаў. Я яму: слухайце, мне хапае і нямецкай мовы, я буду з вамі вельмі добра, але застануся, як быў. Гэтак канфлікт быў зьліквідаваны, і я зь літоўцамі жыў добра.

Працы было шмат, бо як толькі бамбілі нешта зьвязанае з унівэрсытэтам, будынкамі, лябараторыямі, нас паднімалі – пераважна літоўцаў і мяне – калі можна, мы ехалі S-Bahn'ам, калі можна, давалі машыну, і мы ехалі разьбітае замуроўваць, хоць часьцей сталі абносіць дротам.

Памятаю, як мы замуроўвалі нешта каля станцыі Zoo і цягнулі возікі з цэмэнтам праз Brandenburger Tor. І той літовец, зь якім я калісьці спрачаўся за Пагоню, кажа: давай станем і пакінем успаміны. І мы ўсе спыніліся і пасцалі пад той Брандэнбурскай брамай…

Калі я празь некалькі гадоў паступіў у Цюбінгенскі ўнівэрсытэт, аднойчы іду па вуліцы – і лоб у лоб з тым бэрлінскім літоўцам сустракаюся. Мы абняліся, і ён кажа: слухай, Вітаўт, давай старое не ўспамінаць! Я кажу – дык няма чаго і ўспамінаць… Пасьля ён выехаў у Амэрыку, а перад тым дапамог мне атрымоўваць гарачую ежу з кухні UNRRA, якая была поўнасьцю абсаджана літоўцамі.

Беларускі Бэрлін

Беларускі Бэрлін у тым часе быў актыўны. Выходзіла газэта «Раніца». Гэтую газэту – а выходзіла яна раз на тыдзень – можна было купіць у звычайным нямецкім газэтным кіёску. Я яе купляў звычайна ў адным з двух кіёскаў – на Stadtmitte, я туды даяжджаў, калі езьдзіў да бацькоў, ці на Alexanderplatz. (Alexanderplatz – гэта было месца, дзе можна было купіць што душа жадала, або выменяць, сустрэцца зь людзьмі.)

Другая газэта, якая выходзіла ў Бэрліне – «Беларускі работнік» – таксама прадавалася ў кіёсках, але «Работнік» пазьней зьліўся з «Раніцай», і «Раніца» пачала выходзіць двойчы на тыдзень.

У памешканьні газэты «Раніца» сустракалася шмат беларусаў, і яшчэ – ня ведаю, ці ў памешканьні газэты, ці дзе – беларусы мелі вялікую залю, і бадай што кожны тыдзень там адбываліся вечары. Якраз я ўпершыню там пабыў на вялікім вечары, прысьвечаным Слуцкаму паўстаньню, і там раздавалі ўсім, хто прыходзіў – а там было, можа, асобаў сто – лятучкі, што будзе сьвяткавацца Новы Год у гэтым памешканьні.

Адбываліся вечары і ў будынку Беларускай Цэнтральнай Рады на станцыі Weissensee.

Як я зазначаў раней, лекцыя пра БНР прайшла ў Deutsches Institut für Ausländer, праўда, не для шырокай публікі, але тым ня менш гэта была беларуская падзея.

Дзеілі ў Бэрліне і беларускія студэнты, зь імі я сустрэўся аднойчы ў сталоўцы – у тыя дні, калі я працаваў, нам давалі талёны ва ўнівэрсытэцкую сталоўку, дзе я ўбачыў групу беларускіх студэнтаў, яны гаварылі па-беларуску. Было іх чалавек дзесяць. Праўда, я толькі зь імі павітаўся, але яны на мяне не зьвярнулі ніякае ўвагі. Мне зь іх прыпомніўся толькі Стась Грынкевіч, зь якім я пазнаёміўся пазьней і прыпомніў пра тую сустрэчу. Ён мяне нібыта таксама прыпомніў, але я ня веру.

За гэты час я два ці тры разы быў у «Вінэце» – там бывалі беларускія

канцэрты, а артысты казалі, што гэта рэпэтыцыі для пазьнейшых выступаў у астаўскіх лягерох. У «Вінэту» прыходзіла шмат народу – і беларусы, і небеларусы.

Была таксама праваслаўная царква, я раз туды езьдзіў, там бывалі беларусы-астаўцы і вайскоўцы. Прыпамінаю адзін сьмешны выпадак у сувязі з той царквой. У адну нядзелю мы ў царкву паехалі разам з бацькам. Бацька заўсёды любіў езьдзіць туды, дзе можна было сустрэць беларусаў. Апранутыя мы былі яшчэ па-летняму – у пінжаках, а ў пятліцах у нас былі «Пагоні». І вось каля царквы да нас падыходзіць афіцэр у нямецкай форме, але з расейскай кукардай і пытаецца: «Какого войска, господа, будете?» Ну й раззлавала гэтае пытаньне майго бацьку, і ён таму афіцэру даў добрую лекцыю. Праўда, афіцэр выбачыўся і сказаў, што ўпершыню сустракае беларусаў з «Пагоняй».

Так што беларускі Бэрлін у той час быў досыць людны і дзейны.

Люфтвафэ

Дапаможная служба Люфтвафэ – Luftwaffenhelfer – гэта былі аддзелы моладзі, якія дапамагалі зэнітнай артылерыі падаваць патроны, абслугоўваць гарматы, кулямёты. У Нямеччыне іх было поўна – пераважна былі балтыйцы, літоўцаў, думаю, было найбольш, і беларусы – яны былі апранутыя ў шэрую ўніформу з нацыянальнымі сьцяжкамі на рукавах. Зь вядомых нямецкіх людзей там служылі Гюнтэр Грас, Гельмут Коль, папа Бэнэдыкт.

У Люфтвафэ, як я прыпушчаю, у Нямеччыне было куды болей беларускай моладзі з СБМу, чым па-за Люфтвафэ – у Шпандаў, прыгарадзе Бэрліну, а таксама ў Кюстрыне, на ўсход ад Бэрліну. У Кюстрын мы езьдзілі па цэмэнт, калі я працаваў памагатым муляра ў Нямецкім інстытуце для замежнікаў, і там у сьнежні 1944 году я сустрэўся з групай у публічнай сталоўцы – можа, чалавек 150 – гэтых дапаможнікаў Люфтвафэ. Мы ўжо елі, і бачу – заходзіць адзін, другі, у шэрай уніформе, ва ўсіх бел-чырвона-белыя сьцяжкі на рукавох, а тады цэлы пакой! Я ўхмыльнуўся і думаю – во дзе група. У тым пакоі было больш за сотню юнакоў. Але я зь імі ні ў які кантакт не ўступаў.

СБМавец

Адзін раз я сустрэўся й разгаварыўся зь юнаком у беларускай уніформе СБМаўца. Я быў тады ў Deutsches Institut für Ausländer, дзе былі людзі розных нацыянальнасьцяў, і мы дамовіліся – я, украінец, адзін ці два армяне і расеец – што сустрэнемся ў нядзелю ў Потсдаме. Нам трэба было напісаць укладаньне па-нямецку пра Потсдам па праграме вывучэньня нямецкай мовы, але заданьне было – аба-

вязкова адведаць Потсдам. Я жыў тады ў інтэрнаце, а астатнія былі ў розных месцах, і кожны дабіраўся да Потсдаму як мог. Я ехаў у мэтро (S-Bahn) – сеў, здаецца, на Фрыдрыхштрасэ і ехаў на Потсдам. У электрычцы я сустрэўся зь юнаком у СБМаўскай форме, я падышоў, сказаў, што я таксама ў СБМ, паціснулі адзін аднаму рукі. Ён быў родам з-пад Лепелю і выехаў у Нямеччыну з працоўнай арганізацыяй, стаўся сябрам СБМ, але ім яшчэ ня выдалі працоўнай вопраткі, і таму ён хадзіў у СБМаўскай форме.

Бамбёжка 3 лютага

На Новы Год я, здаецца, быў у інтэрнаце і нікуды не хадзіў, бо было шмат працы – бамбёжкі былі штодня і вялікія.

Вельмі моцна разбамбілі Бэрлін 3 лютага – думаю, што 80% цэнтру было зьнішчана – і пасьля гэтага налёту нашай групе муляраў трэба было шмат працаваць, па 18 гадзін на дзень.

Бамбёжка 3 лютага была сапраўды зьнішчальная. Пазьней я бачыў статыстыку – у налёце бралі ўдзел каля 8000 амэрыканскіх самалётаў. Бамбілі якраз той раён, дзе я жыў, недалёка ад унівэрсытэту.

Бамбёжка пачалася рана, каля 10-й гадзіны раніцай. Калі загула трывога, я выйшаў з памешканьня – была цудоўная, амаль вясновая пагода, ярка сьвяціла сонца, неба было блакітнае-блакітнае. Я ўбачыў самалёты-бамбавікі – каля дзесятка – як я прыпушчаю, над раёнам Stadtmitte. Пабачыў я і першыя бомбы, і тады хуценька зайшоў у бамбасховішча. Праз пару хвілін бомба трапіла ў дом над бамбасховішчам, і мы – чалавек 15-20 – апынуліся пад руінамі. Электрычнасьці не было, а вады было амаль да калена. Ясна, мы думалі, што гэта канец. Але немец – як выглядала, уласьнік дому – не разгубіўся і ў пацёмках пачаў казаць, каб мы па чарзе плячом ціснулі ў дзьверы бункера, бо, як ён казаў, дом, які быў над намі, складаўся з дзьвюх частак – вышэйшай, дзе было і бамбасховішча, і ніжэйшай. Калі ніжэйшая частка не заваленая, то, папіхаючы дзьверы, можна сапхнуць цэглу, якая заваліла дзьверы, у ніжэйшую прастору. Гэта выглядала варажбой на кававай гушчы, але атрымаўся цуд – як і прадбачаў немец! Сапраўдны цуд. І гадзін праз 5-6 нашы дзьверы крыху прачыніліся, нават бліснула неба – сапраўды, дом быў разбураны толькі напалову! Мы ўсе таго гаспадара абдымалі, вылазячы з бамбасховішча.

Вылезьлі – і няма куды ісьці, усюды ўсё гарыць. Але ў немцаў быў такі звычай, што ў іх стаялі сырэны ў пэўных месцах, дзе ёсьць выхад са сховішчаў. Дык на гук сырэнаў пасьля бамбёжак можна было ісьці, каб выйсьці з полымя. Так выйшлі і мы – усё было абсалютна ў полымі, усё зьнішчана, навокал не было ніякага жыцьця, кругом агонь.

Пасьля налёту 3 лютага 1945 году я яшчэ цэлы месяц быў у Бэрліне – за гэты час горад бадай і не аправіўся ад той бамбёжкі. У друку пісалася, што бамбёжка Бэрліну 3 лютага была прымеркаваная да пачатку працы Ялцінскай канфэрэнцыі.

Выезд з Бэрліну

Лекцыі ў інстытуце спыніліся ў пачатку сакавіка, бо два будынкі, дзе мясьціўся інстытут, былі татальна зьнішчаныя. Я нават не пайшоў у адміністрацыю, бо бачыў, што з Бэрліну трэба выяжджаць, было ясна – Бэрлін будзе заняты савецкімі войскамі.

Выехалі мы з Бэрліну ў пачатку сакавіка разам з эшалёнам уласаўцаў, бо бацька мой у той час адышоў ад БЦР і далучыўся да ўласаўскага руху – там былі Пугачоў, Дземчанка, Сэлях, Анатоль Комар. Выехалі мы ў кірунку на Ляйпцыг, але зьмянілі кірунак на Пільзэн, а пасьля паехалі на Судэты. Цягнік рухаўся памалу, яго бамбілі, і ўрэшце праз пару тыдняў мы прыехалі ў Карлсбад – нібыта там меліся фармавацца войскі генэрала Ўласава. Карлсбад, прыгожы чэскі гарадок зь лячэбнымі водамі, запоўніўся жаўнерамі.

Карлсбад

У горадзе апынуліся некалькі дзесяткоў беларусаў і некалькі тысячаў жаўнераў РОА. У 1945 годзе беларусы там адзначалі дзень 25 сакавіка – была невялічкая акадэмія ў гатэлі «Рычманд», здаецца, Дземчанка рабіў даклад. Наагул у Карлсбадзе жыцьцё было невыразнае, але я да гэтага ня меў ніякага дачыненьня. Гэта быў пэрыяд нявызначанасьці, а тым часам у Карлсбадзе была ўжо чуваць кананада з усходу і днём і ноччу. Таму ўцекачы з былога Савецкага Саюзу імкнуліся чым хутчэй адтуль вырвацца. Адчувалася, што набліжаецца канец вайны.

Цікава, што ў Карлсбадзе – а гэта Sudetenland – у магазынах віселі шыльды «Гаварыць па-нямецку», але як толькі ты заходзіў і загаворваў па-беларуску, то можна было купіць і хлеб, і цукар безь ніякіх картачак – можа, чэхі, прымалі нас за остаўцаў, але прынамсі ў мяне засталося ўражаньне вельмі прыемнае.

У Карлсбадзе ішла пераарганізацыя ўласаўскіх вайсковых фармаваньняў, меліся быць створаныя і беларускія вайсковыя аддзелы. Адным з кіраўнікоў беларускіх аддзелаў меўся быць Міхаіл Пугачоў. Гэта вайсковец родам з-пад Барысава, скончыў Беларускую аб'яднаную вайсковую школу, у Менску ў канцы 20-х гадоў быў беларускамоўны, быў у Чырвонай Арміі ў розных частках СССР, у часы акупацыі браў удзел у арганізацыі беларускай паліцыі ў Менску.

Дарэчы, жонка Пугачова і цешча, як казалі, былі яўрэйкі. Яны

вельмі добра гаварылі па-нямецку, я да іх пару разоў заходзіў. Цешчы была патрэбная спэцыяльная вопратка, якую можна было дастаць толькі праз Чырвоны крыж, і яны заўсёды бралі мяне больш для формы (я гаварыў па-нямецку і ня быў зь сям'і). Я чуў, як часам паміж сабой тыя жонка і цешча перакідваліся славечкамі на ідышы.

Пугачоў меў шмат справаў з арганізацыяй беларускіх вайсковых аддзелаў. З расейскімі афіцэрамі ён дамаўляўся адразу, але там, дзе былі немцы – а іх было ладна – то Пугачоў ні ў зуб нагой. Ён панямецку не гаварыў. І ў такіх выпадках Пугачоў клікаў мяне. Прычым справы зь немцамі паўставалі ня толькі ў Ost-лягерох, але і ў іншых структурах.

Прыпамінаецца такое: аднойчы я паехаў залагодзіць Пугачову адміністрацыйную справу ў Марыенбад – другі горад, дзе разьмяшчаліся ўласаўскія часткі (трэцім «уласаўскім» горадам быў Эгер). Ён даў мне білет, рэзэрвацыю ў гатэль, і мне трэба было на другі дзень пайсьці ў нямецкую ўстанову і нешта там залагодзіць, і я ўсё гэта выканаў. Але калі я прыехаў у Марыенбад і пасяліўся ў гатэлі, у тым пакоі, што для мяне быў зарэзэрваваны, увечары зазваніў тэлефон. Я падняў слухаўку. Гэта звоніць з Прагі беларускі пісьменьнік Уладзімер Дудзіцкі – які тады зваўся Гуцька – і пытаецца, ці я ў такім і такім пакоі і што я раблю. Я сказаў хто я і што я. А ён кажа: «Праверце ў тумбачцы каля ложка – я там забыўся свой пісталет!» Я адчыніў тую тумбачку, паглядзеў – там нічога няма. «А, ну добра», – кажа ён, і на гэтым размова скончылася. Дудзіцкі належаў да ўласаўскага камітэту – быў у адміністрацыйных колах падрыхтоўкі беларускіх аддзелаў. Хадзіў у форме БКА, і пісталет у яго быў заўсёды.

За маю дапамогу Пугачоў – яго называлі «капітан Пугачоў» – даваў мне ладна Lebensmittel-картак, што мяне вельмі задавальняла.

У беларускіх уласаўцаў, як мне здавалася, праблемаў значных не было, асабліва зь немцамі – былі ў беларусаў праблемы з Уласавым і ягоным штабам (так мне казаў бацька), але затое ў расейцаў былі праблемы зь немцамі.

Там, дарэчы, у мясцовасьці паміж Марыенбадам і Карлсбадам быў выпадак: адзін вайсковец застрэліў другога. Рэч у тым, што ў РОА быў загад насіць расейскія пагоны, а, відаць, афіцэры РОА любілі, каб ім казыралі. Там і нямецкія афіцэры любілі, каб ім казыралі расейскія афіцэры. І атрымалася так, што ў цягніку расейскі афіцэр не казырнуў нямецкаму, бо быў вышэйшы чынам за таго немца, але паводле пагонаў немец ня мог гэтага зразумець. Дайшло спачатку да слоўнага выбуху, а потым расеец выхапіў пісталет і немца застрэліў. Увесь Карлсбад быў вельмі напружаны – чакалася, што з боку немцаў у адказ на гэта будуць рэпрэсіі, але нічога не было.

Уцёкі ад саветаў

У канцы сакавіка з Карлсбаду ўласаўскія войскі, якія былі ў стадыі фармаваньня (фармавалася, здаецца, але я ня пэўны, 2-я дывізія, там было і шмат украінцаў і ідэль-уральцаў), накіравалі ў Тыроль, дзе меліся быць сфармаваныя нацыянальныя вайсковыя аддзелы для адсылкі на ўсходні фронт. Усе – у тым ліку і немцы – лічылі, што амэрыканцы хутка пачнуць вайну з саветамі. Панавала такая думка. Псэўдаабгрунтаваньне было такое, што Амэрыка з саветамі суіснаваць ня зможа – гэтыя дзьве сыстэмы былі несумяшчальныя. І лічылася, што нацыянальныя войскі – расейскае, украінскае – будуць мець значэньне ў будучым паходзе на Савецкі Саюз. Такое было меркаваньне, якое абсалютна сярод тых людзей дамінавала.

Дарэчы, у раёне Карлсбаду-Марыенбаду, дзе былі шахты і здабываліся рудныя мэталы, было парадачна і остаўцаў – зь беларусаў было шмат маладых дзяўчат зь Беласточчыны і з Пружанаў. Памятаю такое: у адным зь лягероў каля Карлсбаду ў нядзелю была забава (танцы), і там я пачуў і пабачыў дзяўчат у беларускіх вышыванках, якія сьпявалі беларускія народныя песьні – у сярэдзіне сакавіка 1945 году!

Гарміш-Партэнкірхен

З Карлсбаду два эшалёны ўласаўцаў эвакуавалі ў Аўстрыю. Праўда, ехалі пакручаста. Эшалёны часта, вельмі часта бамбілі. Хутка гэтыя эшалёны былі разьбітыя і разьдзеленыя. Адзін зь іх пайшоў на Баварыю – на Плятлінг і Пасаў, дзе іх ушчэнт разбамбілі. У Плятлінгу, здаецца, у часе бамбёжкі загінуў Мікалай Будзіловіч. Дземчанка, як казалі, застаўся ў Карлсбадзе. З двух эшалёнаў да Тыролю засталося толькі пяць-шэсьць вагонаў, дзе ехалі пераважна беларусы і ўкраінцы.

З гэтымі рэшткамі ўласаўскіх фармаваньняў мы праехалі праз усю Аўстрыю і пад'ехалі пад Бодэнскае возера. Там у адным мястэчку, здаецца Ізьні, мясцовы камэндант, немец у чыне капітана, сабраў бежанцаў і кажа: вы ўцякайце, бо вас будуць выдаваць саветам, а гэтую мясцовасьць зоймуць французы. Уцякайце ў амэрыканскую зону, у Баварыю – можа, амэрыканцы вас ня выдадуць. І так мы ў масе людзей пайшлі па дарозе, з возікам – памятаю, з намі доўга ішоў расейскі пісьменьнік з Кубані Яўціхі Каваленка. З гэтым Каваленкам мы дайшлі да мястэчка Вайльгайм, а там Яўціхі кажа: лепш павернем у бок Альпаў. Праз ноч мы прыйшлі ў горад Гарміш-Партэнкірхен. А там камэндант гораду абвясьціў амэрыканцам, што горад здаецца бяз бою.

Амэрыканскія танкі ўвайшлі ў горад з поўдня ў апошнія дні кра-

савіка, а на другі ці трэці дзень у горадзе былі расклееныя абвесткі: усе, хто паходзіць з былога Савецкага Саюзу, мусіць зьявіцца ў артылерыйскія кашары для ўліку. Рэч у тым, што каля Гарміш-Партэнкірхену ў гарах было шмат абаронных заводаў, дзе працавала шмат остаўцаў. Безумоўна, ні мы, ні іншыя бежанцы ў кашары не пайшлі, а прыйшлі ў першую вялікую нямецкую будову і кажам: слухайце, у вас вялікая сядзіба, ці можна ў вас пераначаваць? Кажуць: калі ласка, вось сарай, можаце там жыць, калі трэба, дык і даўжэй. Немцы, трэба прызнаць, падабрэлі ў той час.

Праз дзень-два мы з бацькам ідзем па вуліцы, шукаем, мо дзе што знойдзем паесьці, гаворым па-беларуску, і раптам падыходзіць да нас маладзейшы чалавек і пытаецца: «Я пачуў, што вы размаўляеце па-беларуску. Вы беларусы?» Мы зьдзівіліся. «І я, – кажа, – беларус». Гэта быў спадар Сымон Жамойда. Раней мы знаёмыя не былі, ён сам зь Вільні, потым быў у палоне, з палону прыехаў у Белую-Падляскую, быў настаўнікам. «Я, – кажа Жамойда, – тут даўно». – «Як даўно?» – «Я прыехаў у Гарміш на даручэньне Беларускай Цэнтральнай Рады каля году таму арганізоўваць дзіцячыя садкі ў гэтай акрузе. Тут шмат остаўцаў, шмат дзяцей, і я арганізоўваю беларускія дзіцячыя садкі. Я тут ведаю адміністрацыю і вам кватэру забясьпечу, хадземце са мною».

Для нас нібы зь неба анёл звалiўся. Ён нас павёў у барак для остаўцаў, якія там працавалі, да кіраўніка, які быў кіраўніком і пры немцах, на Martinswinkelstrasse. Той кіраўнік даў нам пакой, вось вам печка, вазьміце абавязкова печку, каб варыць есьці. Мы былі вельмі задаволеныя і засталіся ўдзячныя Жамойду на ўсё жыцьцё.

Гэтак зусім нечакана, дзякуючы дбайнаму земляку, мы атрымалі страху над галавой. На той час гэта азначала вельмі шмат.

Капітуляцыя Нямеччыны. Рэгістрацыя

Капітуляцыя Нямеччыны так, як мы назіралі ў Гармішы, адбылася абсалютна спакойна. Прыйшлі амэрыканскія войскі, назаўтра па горадзе езьдзяць танкі, а на іх напісана: «Deuschland hat kapituliert». І кажуць: больш не змагайцеся, калі ёсьць якая зброя – кідайце на вуліцу. Палонных нямецкіх жаўнераў зьбіралі каля вакзалу, абгарадзіўшы вялікую плошчу дротам.

Кіраўнік барачка, дзе мы пасяліліся, немец, прыпушчаю, што колішні нацыст, кажа мне: «Слухай, патрэбныя будуць дакумэнты. Учора я вас зарэгістраваў, а сёньня бачыш – амэрыканцы езьдзяць і кажуць, што вам трэба рэгістравацца. А вы ў мяне запісаліся як народжаныя ў Менску. Вам давядзецца ісьці ў кашары». У яго акуратна задакумэнтавана, і сытуацыю ён зразумеў. І я пытаю: «Дык што мне рабіць?» – «Ідзі, – кажа, – у Rathaus, там сядзіць Гайнц, у яго

няма адной нагі – адарвала каля Віцебску, – скажы, што я цябе туды прыслаў. І выкладзі Гайнцу сваю справу». Я кажу: «Пачакай, учора ж прыйшлі амэрыканцы, улада зьмянілася, Rathaus будзе зачынены...» – «Што ты! Амэрыканцы да гэтага нічога ня маюць, Rathaus не для іх. Rathaus хіба што толькі на Каляды будзе зачынены. Ідзі, Гайнц там будзе сядзець».

Іду ў Rathaus – і, як начальнік казаў, той Гайнц сядзіць за столікам – інвалід з адной нагой. Я яму кажу: «Я зь Беларусі, мяне прыслаў да вас кіраўнік бараку з Martinswinkelstrasse». – «О, – кажа, – а я ў Беларусі згубіў нагу!» Перакінуліся мы з Гайнцам пару ўспамінамі пра Беларусь, ён асабліва прыпамінаў, як яму было холадна ў пілётцы, бо мерзьлі вушы, а таксама як даглядалі яго ў Віцебску беларускія лекары пасьля ампутацыі нагі і пасьля апэрацыі зашываньня. Ён абсалютна ня быў злосны. Тады пачаў гаворку я і сказаў, што хачу, каб ён выдаў мне пасьведчаньне, дзе было б напісана, што я народжаны ў Вільні. «Давай, калі ласка», – садзіцца за машынку і набівае: «Кіпель Яўхім, Вільня; Кіпель Марыя, Вільня; Кіпель Вітаўт, Вільня...» Ставіць штэмпэль, дае мне – і да пабачэньня. Прыходжу ў барак, кіраўнік мне кажа: «Ну, я ж казаў, што так і будзе». І ён перапісаў нашы зьвесткі і ў сябе.

Увечары прыходзіць да нас Яўціхі Каваленка і кажа, што стаяў недзе ў чарзе і чуў, як беларус Жамойда казаў: «Они из Вильна». Дык ён прыйшоў у нас запытацца, ці гэта праўда. Я кажу: «Так, зь Вільні, мы зьмянілі дакумэнты». Тут Яўціхі проста ўзмаліўся: «Слушай, сделай и мне документ. Я родом с Кубани, но надо, чтобы я был не с Кубани, а из Югославии».

Іду я да таго начальніка бараку і пытаюся: «Слухай, калі я пайду да Гайнца, ці ён мне гэта зробіць?» Ён кажа: «Гайнц зробіць, калі да дваццаці чалавек. Калі больш, то ўжо будзе хвалявацца, што выдаў зашмат блянкаў, трэба будзе даваць справаздачу...» Тады я Яўціхію кажу: «Яшчэ каго-небудзь маеце?» – «Маю». І яшчэ пяць чалавек аб'явілася, якія хацелі зьмяніць месца нараджэньня. Я пайшоў да Гайнца, і той аднаногі Гайнц, чыя нага засталася недзе каля Віцебску, шлёпае ўсім такія дакумэнты, якія ты хочаш! Яны ўсе запісаліся, што яны зь Югаславіі. Прыйшоў адзін украінец, Алешчанка з Харкава – «Напішыце, што я з Львова». Зрабілі дакумэнт і ўкраінцу.

Так на пачатку «знаёмства» з амэрыканскай акупацыяй мы, былыя грамадзяне СССР, сталіся або выхадцамі з Заходняй Беларусі, або «старымі эмігрантамі».

Месяцы праз чатыры я прыехаў у Гарміш зь Мюнхену, і ў мяне было кіляграмы два масла – я хацеў зрабіць Гайнцу падарунак, і ён ня ўзяў! «Я, – кажа, – рабіў работу, на якой я сяджу». Бо не ягоная справа была – даходзіць, праўда тое ці няпраўда. Гайнц проста табе верыў, і ў яго была пячатка, якая сьцьвярджала, што гэта правільна,

і ўсё. Яшчэ пазьней, перад Вялікаднем у 1946 годзе – бацька і маці так і заставаліся там – я прыехаў зь лягеру да бацькоў і прывёз шакаляд, а гэта тады была вялікая рэдкасьць! Пайшоў я ў Rathaus – Гайнц там так і сядзіць – і шакаляд ён у мяне ўзяў.

Мяне дагэтуль дзівіць – у нас пры перамене ўлады чалавек сказаў бы: куды я пайду, сёньня новая ўлада, якая работа! А нямецкі Гайнц робіць сваю работу далей, хоць і ўлада зьмянілася.

Праз пару дзён пасьля прыходу амэрыканцаў у Гармішы працавала і паліцыя, але на пастарунку была шыльда ўжо не гатычным шрыфтам, а звычайным.

Рэпатрыяцыйная місія

Мы ня спадзяваліся, што з дакумэнтамі пойдзе так лёгка. Мы думалі пра гэта, але хаваючыся, падпольна. Мала таго: жывем мы ў Гарміш-Партэнкірхене і чакаем – можа нас пачнуць высяляць, у нас ніякіх афіцыйных падставаў тут заставацца няма.

Былыя остаўцы паступова выяжджалі – баракі пачыналі пусьцець, і мы думалі, што іх могуць заняць амэрыканскія жаўнеры. Мы так думалі, хоць амэрыканцы ўжо пазаймалі ўсе гатэлі і багатыя дамы, а на баракі не зьвярталі ўвагі. Аднак мы падшукоўвалі сабе іншае памешканьне, бо ўсё ж цьвёрда верылі, што нас амэрыканцы выселяць. Нехта нам падказаў, што мы можам перабрацца на стадыён, там ужо некаторыя жывуць.

Стадыён у Гармішы быў ня проста гарадзкі стадыён, а алімпійскі аб'ект, бо Зімовыя алімпійскія гульні 1936 году праходзілі ў Гарміш-Партэнкірхене. І на новазбудаваным вялізным стадыёне было добрых пару сотняў невялічкіх кабінак для спартоўцаў, і шмат былых савецкіх грамадзянаў ужо жылі ў гэтых кабінках. Дык і мы падумалі – чаму б нам не заняць адну кабінку: яны былі адкрытыя, паставіш замок – кабінка твая. Ніякіх гаспадароў там не было, і мы занялі сабе такую кабінку – фактычна мы жылі ў двух месцах.

Я туды часта хадзіў – там у сярэдзіне таго аб'екту быў вялікі пляц і таўкучка, дзе людзі прадавалі і абменьвалі прадукты і рэчы – масла, маргарын, кансэрвы. Аднойчы я прыйшоў, а людзі кажуць, што ў абед прыедзе амэрыканец і будзе нешта важнае гаварыць, так напісана ў лятучках. Ну, я думаю – мяне гэта ня тычыцца абсалютна, мы тут не жывем стала, хоць і трымаем пакойчык на ўсялякі выпадак. І вось перад абедам заяжджае на стадыён джып з рупарам і па-расейску, вельмі добрай мовай, абвяшчаецца: заўтра прыедзе савецкая рэпатрыяцыйная місія, дык калі хто хоча зь ёй гаварыць, можна запісвацца адразу. Місія прыедзе са сваім штабам і будзе рыхтаваць дакумэнтацыю па тых людзях, якія паходзяць з Савецкага Саюзу. Як амэрыканская машына паехала, за пяць хвілін гэты пляц

апусьцеў, апусьцелі і кабінкі, бо ўсе паўцякалі ў горы, так баяліся рэпатрыяцыйнай місіі.

Засталіся на стадыёне толькі пару старых. Пазьней яны расказвалі, што прыяжджала савецкая вайсковая дэлегацыя разам з амэрыканскім афіцэрам. Пахадзілі яны па пустых калідорах, пляцы і паехалі назад. Гэтак было і ў іншых мясцовасьцях.

Нешта падобнае было ў 1945 годзе ў Рэгенсбургу, калі арганізоўваўся Беларускі камітэт і Вініцкі быў старшынём. У яго быў загад: людзей з Усходняй Беларусі не запісваць. Ён ідзе да камэнданта гораду, чэха, і кажа: «Слухай, ня ведаю, што мне рабіць, у мяне столькі людзей з Усходняй Беларусі!» А той кажа: «А што, у іх на лобе напісана, што яны з Усходняй Беларусі? Ну дык і рабі, што хочаш!»

У Гармішы савецкая місія пабыла месяцы тры і выехала. Немцы адчынілі магазыны, можна было купіць прадукты бяз картак. Да таго ж у горадзе было вельмі шмат амэрыканцаў. Я ішоў кожную раніцу дапамагаць разгружаць таварныя цягнікі з прадуктамі, якія пасьля грузілі на грузавікі. Дык прыйдзеш пад станцыю – і грузчыкам цябе бяруць адразу. Нагрузіш, і амэрыканец пытаецца – што ты хочаш браць, дае табе пустую скрынку, набіраеш у гэтую скрынку што хочаш, так што ежы хапала. Такія, як бацька ці Жамойда, не хадзілі, бо баяліся, што іх схопяць амэрыканцы і выдадуць. Старэйшыя людзі амэрыканцам не давяралі.

Ці ісьці ў школу

Пасядзеў я ў Гармішы лета, а пасьля паехаў шукаць беларусаў. І з гэтага пэрыяду ўжо пачынаецца новая старонка мае біяграфіі.

А сталася гэта так. Канчаецца лета, маці ў мяне пытаецца – а што ж са школай, ты ж яшчэ сярэдняй школы ня скончыў! Я, прызнацца, пра школу і ня думаю, а маці думае наперад, каб яе хлопец не скруціўся. У маці, дый у бацькі, было цьвёрдае пераконаньне, што я мушу вучыцца далей – школа, універсытэт.

Аднаго дня маці прачытала ў мясцовай газэце (а газэта пачала выходзіць ужо праз два дні пасьля прыходу амэрыканцаў – як выходзіла 80 гадоў перад тым), што ў Вайльгайме за 30 кілямэтраў ад Гармішу 15 жніўня пачынае працаваць гімназія, бо ў Гармішы школа зачыненая і занятая амэрыканцамі. І маці вырашыла, што мне ў тую нямецкую школу трэба ўладзіцца. Пачаліся гутаркі: сынок, едзь, запішыся, абавязкова скончы гімназію, і больш я цябе чапаць ня буду. Я падумаў, трэба, мабыць, паехаць і запісацца ў тую гімназію, хоць і ня надта хочацца, але відаць усё ж вучыцца давядзецца.

Але вырашэньне гэтай справы рухалася памалу, вельмі памалу. Прысьпешыла мяне вось якая акалічнасьць. Аднойчы да мяне

зьвярнуўся на вуліцы чалавек – незнаёмы, але недзе я яго бачыў – што на могілках трэба выкапаць магілу. Амэрыканскі грузавік зьбіў насьмерць двух чалавек, рускіх, іх трэба пахаваць, а няма каму выкапаць яму. Ясна, я згадзіўся – пайшоў на могілкі, выкапаў магілу, забітых пахавалі.

На тых самых могілках дзеіла невялічкая каплічка. Спадар Жамойда, сын праваслаўнага сьвятара, зладзіў з тае каплічкі царкоўку. Час-часом бываў там праваслаўны сьвятар, але спадар Жамойда быў заўсёды, а каля яго зьбіралася чалавек 10-15 пагутарыць – свайго роду Майдан. Пасьля пахаваньня тых дваіх забітых і я стаў заходзіць у тую царкоўку. Заходзілі туды і сэрбы, і ўкраінцы. Ад украінцаў я даведаўся, што на поўначы Баварыі арганізоўваюцца нацыянальныя лягеры зь людзей, што не вяртаюцца ў Савецкі Саюз.

Навіна мяне заінтрыгавала: я заўсёды быў вельмі адчувальны на тое, калі дзе што рабілася нацыянальнае. Украінец, які падаў гэтую вестку, зваўся Брынза, родам з Харкава. Я пачаў распытваць, што гэта за лягеры, ці ён ведае што пра беларусаў. Брынза мне кажа, што ён быў у Аўгсбургу і што ўсіх беларусаў, якія туды прыходзяць, украінскія ўлады лягеру запісваюць украінцамі. «І што, – кажу, – усюды?» – «Не, – кажа, – ня ўсюды. Там, дзе беларусы маюць дакумэнты, што яны «западныя», іх запісваюць беларусамі. Ведаеш, як да Мюнхену даехаць?» Там, кажуць, ёсьць беларускі камітэт.

Гэтая навіна зьмяніла мой жыцьцёвы кірунак. Я быў амаль гатовы ехаць у Вайльгайм, нават і хлопца немца знайшоў, каб разам ехаць паступаць у нямецкую школу. Але калі даведаўся, што ёсьць Мюнхен, ёсьць беларускі камітэт, пляны зьмяніліся, і паехаў я ў Мюнхен.

Мюнхен

Летам 1945 году ў Нямеччыне цягнікі хадзілі вельмі дрэнна – сталага раскладу не было. У Гармішы, ходзячы на станцыю пару дзён, я нарэшце здолеў сесьці на цягнік, які ішоў на Мюнхен.

На цягніках тады часта бывалі рабункі – яўрэі, якія з канцлягераў павыходзілі, рабавалі рэдкіх пасажыраў. Рэчаў, ясна, у мяне ніякіх не было апрача невялікай торбачкі, дзе ляжала пару бутэрбродаў. Калі мы пад'яжджалі да станцыі Мурнаў, каля мяне з двух бакоў падселі яўрэі. Я бачу, да чаго ідзе справа і па-беларуску ім кажу: «Хлопцы, я бачу, вы паглядаеце на сумку. Па-першае, у сумцы нічога няма, а па-другое, я ня немец, а беларус». Яны ўхмыльнуліся і, ні слова ня кажучы, адышлі ад мяне – пайшлі ў іншы вагон.

Падарожжа з Гармішу ў Мюнхен трывала гадзін 10-12, хоць нармальна гэта займае паўтары-дзьве гадзіны. Я прыехаў у Мюнхен пад раніцу наступнага дня. Фактычна, ні гораду, ні вакзалу не было – былі руіны, руіны, руіны і сярод іх шыльда «München». Праўда, ад

вакзалу застаўся каркас – жалезныя аркі – але гэта была будовіна! Ну, думаю, што мне рабіць? Куды падацца, дзе нечага шукаць? Ад станцыі некуды – як мне здалося, у цэнтар – была вялікая расчышчаная дарога, і па гэтай дарозе соўгаўся натоўп, і ў той натоўп уліўся, усмактаўся і я. Гэтак з натоўпам я падсунуўся пад рэчку Ізар і за мостам пабачыў велізарную будову – цэлую! – Deutsches Museum. Пра гэты музэй я чуў – ведаў, што каля музэю зьбіраюцца людзі, былыя савецкія, дык там, мабыць, можна сёе-тое даведацца.

Падыходжу да Deutsches Museum, бачу – людзі сабраліся, югаславы ці мадзяры, мова – ці фактычна мовы – гучалі неяк невыразна. Пасьля чую – гавораць па-ўкраінску. Пытаюся: землячкі, ці чулі можа пра мюнхенскіх беларусаў? Чулі. Дзе? Далі мне прыблізны мюнхенскі адрас, але папярэдзілі, што далекавата. Праўда, я пайшоў туды адразу, пытаючыся па дарозе рэдкіх стрэчных – пехатою ў мяне заняло дайсьці гадзіны дзьве.

Знайшоў вуліцу, дом. Украінцы казалі «камітэт», дык я спадзяваўся пабачыць «будынак», а тут – звычайная хата. Пастукаў – спытаўся па-беларуску, па-беларуску ж і адказалі: «Так, гэта Беларускі камітэт, а ў якой ты справе?» (Той, што спытаў, як я цяпер прыпамінаю, быў Уладзімер Тамашчык, пазьнейшы япіскап БАПЦ Васіль.) Я сказаў, што шукаю беларускія лягеры. Спыталіся, хто я, я сказаў. Тамашчык прозьвішча ведаў, кажа: а, твой бацька быў на Кангрэсе. Кажуць мне, што ёсьць Беларускі камітэт у Рэгенсбургу. Далей я спытаў, ці яны ведаюць дзе ёсьць беларуская школа. Гэтага ў Мюнхене ня ведалі ды, як я зразумеў, яны былі заклапочаныя, каб у Аўгсбургу (горадзе на захад ад Мюнхену) дапамагчы арганізаваць беларускі лягер. Я ня стаў уваходзіць у іхныя дэталі, разьвітаўся і вырашыў паехаць у Рэгенсбург.

Перад тым вырашыў я яшчэ зьезьдзіць у Гарміш, бо калі я паеду ў беларускі лягер, то напэўна там і застануся. Прыехаў я ў Гарміш і кажу маці: слухай, я пакуль у нямецкай гімназіі рэгістравацца ня буду. Маці мне кажа: а, ты ўцякаеш, ня хочаш вучыцца… Ну, маці як маці. Я кажу: паеду ў Рэгенсбург. Маці ня верыць. Кажа: «Хай тата едзе з табой». Я кажу: «Нашто ён мне?» «Ну, – кажа, – ты нікуды не запішасься, ты мне гаворыш проста, каб гаварыць». Ладна, кажу, калі тата хоча ехаць са мной – хай едзе, бо гэта ня так проста, удвох будзе разумней. А бацька кажа: добра, мы найперш праедзем паглядзець, бо мы не зьбіраемся ў Гармішы, у правінцыі, заставацца, трэба ж нешта далей рабіць. Калі ўжо мінула небясьпека з выдачай саветам, то трэба рухацца. І бацька пачынае лягічна разважаць – там будзе больш сэнсу затрымацца.

Так на сямейнай нарадзе мы вырашылі, што паедзем разам. Дабіраліся мы да Рэгенсбургу дні тры. У Мюнхене была аблава – лавілі палонных, якія ўцякалі, пераважна немцаў, нацыстаў. Нас

затрымалі, праверыць дакумэнты адразу не маглі, пасадзілі на ноч у турму. Бацька сьмяяўся – цяпер і ў нямецкай турме пасядзеў. Нараніцу дакумэнты – тыя, што ў Гармішы выдаў Гайнц! – праверылі, пабачылі, што мы не нацысты, нават ня немцы, і адразу адпусьцілі. Такія аблавы былі штодзённай, нават штогадзіннай зьявай, бо з палону надта шмат уцякала, асабліва нацыстаў – яны ведалі, што іх будуць судзіць, уцякалі і выяжджалі зь Нямеччыны.

Рэгенсбург

Яшчэ празь дзень дабраліся мы да Ляндсгуту машынай, а адтуль ішоў цягнік на Рэгенсбург. Вакзал у Рэгенсбургу быў разьбіты, але горад цэлы. Як толькі мы зьлезьлі зь цягніка, пытаемся ў першага стрэчнага паліцая-немца: ці ведаеце Вы, дзе Беларускі камітэт? Паліцай крыху падумаў – відаць, слова «weissruthenische» было яму знаёмае – але пра камітэт нічога ня чуў. Тады ідзе амэрыканскі вайсковы паліцыянт – іх многа хадзіла, сымпатычныя парнягі. Я, як мог, змабілізаваў сваю ангельскую: «Вайт рашн? Вайт рашн?» А ён кажа: «Так, тут ёсьць камітэт...» Ёлкі-палкі, амэрыканец ведае, дзе Беларускі камітэт! І дае мне паперачку з адрасам на Маршальштрасэ, зусім недалёка. Трэба падкрэсьліць, што амэрыканская вайсковая паліцыя – МР – была добра асьведамленая. Яны ведалі амаль усё, што адбываецца ў навакольным цывільным жыцьці, аб чым я ня раз пераконваўся, калі езьдзіў па Нямеччыне ў скаўцкіх справах. Амэрыканскія вайсковыя паліцыянты добра дапамагалі з інфармацыяй.

Прыйшлі мы на Маршальштрасэ, а там шыльда «Беларускі камітэт» на трох мовах – нямецкай, ангельскай і беларускай! Бацька ледзь не на калені стаў... Зайшлі ў памешканьне, а там ужо знайшліся і знаёмыя, пачаліся гутаркі, асабліва разгаварыўся бацька. Мне бацька ціхенька дакладае: чуў, кажуць, што тут будзе арганізоўвацца школа – беларуская гімназія. Праз пару хвілін у камітэт заходзіць Кушаль! Я то яго ня ведаў, а бацька знаў, яны абняліся – выжылі, спаткаліся пасьля вайны. Дык Кушаль пытаецца, ці мае бацька нейкія дакумэнты. Бацька кажа, што толькі нямецкія. Ну, кажа Кушаль, гэткія тут нядзейныя, бо арганізоўваецца лягер. Тады бацька кажа: «Ведаеце што, я ў лягер пакуль ісьці не зьбіраюся. Я буду жыць у Гармішы сярод немцаў – паеду назад, а сын няхай застаецца».

Як толькі мой бацька паехаў, гэта было пад канец дня, я выходжу з Кушалем, мы плянавалі ісьці ў «абшчыну» паесьці, раптам бачу – Зора з маці ідуць! Мы нават абняліся і абое пачырванелі... Мы нічога ня ведалі адно пра аднаго дзе хто быў, а тут прыехалі ў той самы дзень у Рэгенсбург і адразу сустрэліся! Распыталіся дзе і што – і яны, і мы шукалі беларускія лягеры, і на гэтым у той дзень разышліся.

Бацька паехаў у Гарміш, а я застаўся як бы «пад апекай» Кушаля. Ён паабяцаў бацьку, што атрымае для мяне новыя амэрыканскія дакумэнты. Адбывалася гэта ў сярэдзіне верасьня 1945 году. Кушаль у камітэце ня жыў, толькі часам заходзіў. І аднойчы ў часе «візыту» Кушаль мне кажа: «Хадзем са мной на Мэсэршміт. Там цяпер вялікі польскі лягер – некалькі тысяч чалавек. Там жывуць мае хлапцы – сын Улодак і Дзіма, які мне таксама як сын. Ды ты іх, пэўна, ведаеш». Далей Кушаль мне сказаў, што ў яго ёсьць знаёмыя ў канцылярыі лягеру і ён мяне туды павядзе атрымаць амэрыканскія дакумэнты, сказаўшы, што я – ягоны пляменьнік. Пры гэтым ён строга загадаў мне маўчаць. І сапраўды, ягоны плян удаўся! Прыйшлі мы ў канцылярыю, і праз пару хвілін мне выдалі амэрыканскую DP-картку, у якой было запісана, што Vitaut Kipel народжаны ў Вільні. Прыпісалі мяне і да пакою, дзе жылі Ўлодак і Дзіма Сямёнаў. Сам Кушаль там не начаваў, і я застаўся з хлопцамі.

Пераначаваў я ноч, раніцай пайшоў у Рэгенсбург у камітэт, вярнуўся назад. А перад гэтым зайшоў у сталоўку, якая працавала амаль 24 гадзіны – там ужо амаль нікога не было. Сяджу, а два палякі побач між сабой гавораць, а я па-польску слаба, але слухаю… Ем я і чую, як адзін кажа: «Дзісяй в ноцы бэньдземы лапаць совецяжуф». Я думаю: нешта падазрона… Іду я ў пакой і кажу Ўлодэку: «Што гэта значыць – лапаць совецяжуф?» Улодак схамянуўся: «Дзе ты чуў?» Я кажу, што пайшоў паесьці і пачуў у сталоўцы. «Гэта, – кажа Ўлодак, – палякі ў лягеры будуць лавіць сёньня ўсіх, хто не гаворыць па-польску, бо думаюць, што тут ёсьць былыя савецкія грамадзяне». А на Мэсэршміце і праўда «зашылася» шмат і рускіх, і ўкраінцаў. «Але ты, – кажа, – ня бойся». – «Э, ні храна, я тут сёньня ня буду!» І я ўвечары пайшоў на Маршальстрасэ. У тую ноч і сапраўды палякі пачалі «лапаць», хадзілі ад пакоя да пакоя. Прыйшлі і да Ўлодэка, ён зь імі спакойна па-польску, дык яны яго і пакінулі, а Сямёнаў маўчаў. Пазнаходзілі шмат украінцаў, аддалі іх амэрыканцам, але амэрыканцы ўкраінцаў выпусьцілі.

Я тым часам зноў пераспаў ноч на Маршальштрасэ. Там быў былы жаўнер Малышка, адказны за чысьціню. Я ў яго запытаўся, дзе Савёнкі, і ён кажа – каля камітэту ёсьць пакойчык, яны там начуюць. Але кажа, каб я меў на ўвазе, што начаваць у камітэце можна, а ўдзень быць ніяк нельга. Так я і «абсталяваўся» пры камітэце. Начальнікам у камітэце быў Аляксандар Русак, пасьля Русака быў Аўген Каханоўскі (былы Калубовіч, які зьмяніў прозьвішча на Каханоўскі па жонцы), але я яго там амаль ня бачыў. Найбольш прымаў людзей Міхась Міцкевіч, Коласаў брат – ня ведаю, якая ў яго была функцыя. Былі яшчэ Ксэнафонт Вайцяхоўскі, Алесь Вініцкі, Хведар Шыбут. Для мяне гэта былі начальнікі.

Камітэт даваў талёнчыкі на харчаваньне – недалёка ў горадзе была

«праваслаўная» абшчына са сталоўкай для людзей, якія вырашылі, што ня будуць вяртацца ў Савецкі Саюз. Абшчыну ўтрымоўвалі амэрыканцы.

Украінская гімназія

Празь нейкі час беларускія кіраўнікі ў камітэце пагутарылі з моладзьдзю майго веку. Спадар Вініцкі накіраваў мяне і яшчэ пару вучняў ва ўкраінскую гімназію. Прыйшоў я ў гімназію, а мне кажуць, што ў іх ужо ёсьць беларусы зарэгістраваныя. Але, кажуць, усе вучні мусяць прайсьці экзамэн, каб вызначыць, у якую пойдуць клясу. Я на той час ужо быў скончыў шэсьць клясаў пры саветах, яшчэ адну пры немцах, пасьля паўтарыў амаль тое самае ў прагімназіі пры немцах, дык думаў, што гатовы ісьці ў дзявятую клясу. Ну, можа і ў восьмую, але я хацеў у дзявятую. Але так ня выйшла!

Экзамэн кожнаму вучню рабіўся індывідуальны. Мне экзамэн рабіў прафэсар Білостоцький – добры настаўнік, пры немцах – кіраўнік украінскай моладзі. Але да мяне ён чамусьці падышоў неаб'ектыўна – відаць, не давяраў маёй «савецкасьці», маёй савецкай адукацыі (сам ён быў зь Львова) і падыходзіў да такіх, як я, паблажліва, не зусім сур'ёзна.

Пачалося з пытаньня, на якой мове будзе праходзіць экзамэн – ці добра я ведаю беларускую мову? Я кажу, гаварыце па-ўкраінску, я буду па-беларуску. Калі што не зразумею, то запытаюся па-нямецку або па-расейску. Ён пытаецца: «Шчо цэ таке Донбас?» Я думаю – ці ён дурны, ці што... Я яму пачынаю тлумачыць. Наступнае пытаньне: «Крывы Ріг?» Я ў думках амаль пераканаць: ён зь мяне кпіць. Пасьля пачаў пытацца пра Дняпро, пра прытокі – на мой погляд, несур'ёзныя пытаньні. Тады пытаецца, якія я ведаю ўкраінскія парты. Ну я кажу, што ведаю, на Чорным моры ёсьць такія і такія парты. Ён удакладняе: украінскія. Халера, думаю, што ён ад мяне хоча? Я ведаю, што ёсьць порт Севастопаль, ня ведаю, ці ён лічыцца ўкраінскім. Ну, я кажу, вось чарнаморскія парты, а ці ўкраінскія яны ці якія іншыя... Я вучыўся ў савецкай школе, нам геаграфію выкладалі, не падкрасьляючы этнічную прыналежнасьць порту. Ня ведаю, ці Уладзівасток – гэта рускі порт? Наагул, кажу, нацыянальнае мала падкрасьлялася ў савецкай школе. Ён спыняе мяне і кажа: «Вы пойдзеце ў шостую клясу». Я кажу: «Вы жартуеце? Гэта ж на дзьве клясы ніжэй!» Ён кажа: «Ну як ніжэй...» І пачынае са мной дыскутаваць наконт праграмы савецкай школы і гэтае гімназіі. У гэтай праграмнай дыскусіі ён, як я прыпушчаю, ужо бачыць, што я не такі дурань, але ўсё адно, паводле таго, як было ў «Польшчы», гэта будзе шостая кляса. Мяне гэты экзамэн пачаў нэрваваць, думаю, можа мне плюнуць на ўсё, але ўрэшце вырашыў цярпець і застаўся ў шостай клясе. Значыць –

яшчэ тры з паловай гады, каб скончыць сярэднюю школу! Ці варта заставацца?

Але ўсё ж я стрымаўся і ня кінуў школу – выйшла на добрае, бо пазьней скончыў школу беларускую – што мяне толькі і цікавіла.

Ва ўкраінскай гімназіі беларусаў набралася чалавек 15-20, мы пачуваліся добра, украінцы да нас ставіліся з сымпатыяй. Як я даведаўся пазьней, Зоры, Тусьцы Шчагловай і Ніне Палянскай экзамэнаў не рабілі – проста ўзялі і пасадзілі ў шостую клясу. Усяго ў клясе было 15 чалавек, зь іх 7 беларусаў.

Украінская гімназія мясьцілася ў самым цэнтры Рэгенсбургу, у прыгожым доме – вельмі старым, але ў цудоўным стане. Вучні жылі на прыватных кватэрах, але шмат украінскіх вучняў жылі на Ganghofer-Siedlung, дзе пачынаў арганізоўвацца міжнацыянальны лягер DP (Displaced Persons – «перамечшаных асобаў»). Вучні-беларусы амаль усе жылі на Зідлюнгу. У гімназію трэба было хадзіць пешшу – кілямэтры тры ў адзін бок. Паколькі я быў адзін, безь сям'і, мяне дырэкцыя гімназіі прыпісала да ўкраінскай бурсы (інтэрнату) на Зідлюнгу, але я туды хадзіў толькі паесьці два-тры разы на дзень, а начаваў у Беларускім камітэце. Ад камітэту да гімназіі хады было хвілін 10-15.

Ва ўкраінскай гімназіі я прабыў ад верасьня да сьнежня 1945 году. Для мяне гэты час быў цікавы найбольш дзеля знаёмстваў. Шмат з кім з украінскіх вучняў сяброўства захавалася на ўсё жыцьцё.

Аднак і ў гімназіі я сачыў і за беларускім жыцьцём у селішчы, мяне гэта цікавіла. Фактычна з Рэгенсбургу пачалося шмат што беларускае на эміграцыі, што трывае і да сёньня – хоры, друк і г. д.

Калі ў сьнежні 1945 году адчынілася Беларуская гімназія, такім як я самотным далі пакойчыкі ў Беларускім селішчы ў Зідлюнгу, дзе камэндантам быў Янка Станкевіч. Усяго на Зідлюнгу беларусы атрымалі паўсотні хатаў. Расейцы – іх было няшмат – былі зарэгістраваныя як праваслаўная абшчына.

Беларускае селішча ў Рэгенсбургу

Будзе на месцы сказаць пару словаў пра Зідлюнг. Ganghofer-Siedlung – паселішча на паўднёвым захадзе Рэгенсбургу, раней звалася Hermann-Göring-Siedlung, там былі збудаваныя дамы для работнікаў авіязаводу Мэсэршміта. Пасьля вайны будынкі стаялі пустыя, і амэрыканцы вырашылі ўцекачоў, якія ня хочуць вяртацца ў Савецкі Саюз, пасяліць на нейкі час у тым Зідлюнгу. Быў гэта адзін зь першых лягероў DP у амэрыканскай зоне акупацыі. У селішчы былі людзі розных нацыянальнасьцяў, таму там арганізаваліся польскае паселішча, латыскае, літоўскае, эстонскае, украінскае і беларускае. Беларусы жылі на адной вуліцы – дамоў пяцьдзясят. Дамкі

тыя былі двухпавярховыя, пакояў было вельмі шмат – у кожным па пяць-сем пакояў. Для таго, каб мець асобнае селішча, трэба было, каб у камітэце зарэгістравалася 1000 чалавек. Усё лета 1945 году Русак сьцягваў людзей у Рэгенсбург, каб набраць тысячу. І калі Зідлюнг пачаў засяляцца, беларусам выдзелілі асобнае селішча, бо ў камітэце было зарэгістравана больш за тысячу чалавек. На гэтае засяленьне пайшла восень 1945 году – гэта была каардынаваная праца Беларускага камітэту на Маршальштрасэ і амэрыканскіх уладаў, бо некаторым, каб прывезьці сем'і, амэрыканцы давалі свае машыны.

Разважаючы пра беларускую эміграцыю і накрэсьліваючы яе радавод яшчэ ад 1920–30 гадоў, трэба асобна падкрэсьліць вось што. Першым арганізатарам палітычнай эміграцыі дзейнай ад 1945 году, на мой погляд, трэба ўважаць Аляксандра Русака. Русак быў вельмі дальназоркі дзяяч, які пайшоў да амэрыканскіх уладаў па дазвол на заснаваньне Беларускага камітэту. І камітэт стаўся якраз тым агеньчыкам, на які пачалі зьлятацца людзі, што былі ў беларускай адміністрацыі пад немцамі і наагул беларускія перасяленцы ў Нямеччыне – улучна з остаўцамі – якія не жадалі вяртацца на Радзіму. Гэтыя людзі і далі пачатак шматлікім беларускім арганізацыям, якія пачалі шырокую вонкавую дзейнасьць.

Роля Аляксандра Русака застаецца неадзначаная: будучы бургамістрам Баранавічаў пры немцах, пайсьці ў 1945 годзе да амэрыканцаў, атрымаць дазвол – такі крок патрабаваў палітычнай сьмеласьці, і Русак гэты крок зрабіў.

Штодзённае жыцьцё ў селішчы

Восень 1945 году ў Рэгенсбургу была вельмі актыўным беларускім пэрыядам. Паколькі я спаў у камітэце і харчаваўся то ў бурсе, то ў праваслаўнай абшчыне, кожны дзень я бачыў шмат новых людзей, прыяжджалі сем'і, іх рэгістравалі, плянавалі беларускі лягер. У Русака былі дзьве легкавыя машыны, якія формай мне нагадвалі ЗіСы, я тады Кадылакаў ня знаў: чорныя, з аднаго боку амэрыканскі сьцяг, з другога беларускі. У яго былі таксама два шофэры: Іван Нядзьвіга і Іван Тугалукаў, першы з Кубані, другі з гораду Асколу, яны сьмяяліся: «Цяпер мы беларусы». Калі Русак заснаваў камітэт, ён атрымаў дазвол на аўтамабіль, нават два. Патрэбныя былі шофэры, дык ён пайшоў з амэрыканцамі ў лягеры для палонных і запытаўся: «Ребята, кто умеет водить машину?» І гэтыя два мамэнтальна вызваліся, што ўмеюць. Няважна да каго, абы вырвацца зь лягеру палонных – і амэрыканцы іх выпусьцілі, на просьбу Беларускага камітэту.

Трэба падкрэсьліць, што абодва Іваны назаўсёды засталіся зь беларусамі. У Нямеччыне Іван Нядзьвіга кіраваў шафёрскімі курсамі ў беларускім лягеры, а Іван Тугалукаў служыў тэхнікам. У ЗША або-

два належалі да беларускіх арганізацыяў і выпісвалі беларускія газэты! Быў час, калі ў ЗША ў горадзе Пасэйку ажно тры Іваны (Тугалукаў, Нядзьвіга і Іван Гукоўскі са Случчыны) мелі сваю запраўачную станцыю і рамонтную майстэрню, якая называлася «Three Ivans» – «Тры Іваны».

У Рэгенсбургу наладзілі Іваны машыны, прымацавалі белчырвона-белыя сьцяжкі і езьдзілі па блізкіх і далёкіх ваколіцах гораду і зьбіралі людзей. Толькі пазьней я зразумеў чаму гэтая акцыя праводзілася вельмі хутка – Русаку трэба было стварыць селішча і дзеля гэтага набраць тысячу чалавек. Іх трэба было аднекуль сьцягнуць і зарэгістраваць у камітэце, а камітэт як пераходная інстанцыя перадасьць іх селішчу.

Калі заснавалася Беларускае селішча, пачаліся беларускія праграмы, вечары, выступы. Беларуская дзейнасьць каардынавалася зь іншымі, бо ў гэтым селішчы было ладна ўкраінцаў, шмат палякаў – думаю, польская група была найбольшая, другая – украінская, а трэцімі паводле колькасьці маглі быць беларусы. Былі там і балты – разам літоўцы, латышы і эстонцы. Апрача гэтага была праваслаўная абшчына – найменшая колькасна, гэта былі этнічныя расейцы, пераважна зь Югаславіі, але было сярод «абшчынцаў» шмат і былых савецкіх.

Ад мамэнту, калі камітэт перасылаў людзей у селішча, уцекачы атрымоўвалі амэрыканскі дакумэнт, які сьведчыў, што яны пад наглядам UNRRA (Агенцтва ААН для апекі над уцекачамі). Гэтыя людзі набывалі афіцыйны статус DP (Displaced Persons) і атрымлівалі матэрыяльную дапамогу праз UNRRA. Магчыма, сродкі ад UNRRA атрымоўваў і камітэт – усё ж у камітэце былі дзьве машыны (і ўвесь час езьдзілі зь бел-чырвона-белым сьцяжком), а трэба было мець сродкі і на бэнзін і на ўтрыманьне машын. Як я пазьней даведаўся ад А. Русака, UNRRA забясьпечвала ўтрыманьне машын і працаўнікоў камітэту.

Беларускае селішча на Ganghofer-Siedlung фармавалася паступова – камітэт прысылаў людзей у новасфармаваную адміністрацыю селішча. Быў выбраны камэндант селішча, камэнданта паліцыі зацьвярджала UNRRA. Трэба сказаць, што камэндант паліцыі быў вельмі важнай асобай – ён меў дачыненьне і з UNRRA, і з амэрыканскай вайсковай паліцыяй (MP), а часам і зь нямецкай паліцыяй. Камэндантам беларускай паліцыі на селішчы быў Даніла Клінцэвіч – прафэсійны вайсковец, вельмі паважаны і тактоўны чалавек.

Першым камэндантам селішча быў доктар Янка Станкевіч, але яго хутка пераабралі, і камэндантам стаў Францішак Кушаль. Янка Станкевіч спрабаваў пераназваць Беларускае селішча ў «Крывіцкае селішча», на канцылярыю нават павесілі шыльду «Крывіцкае селішча», але гэтая «крывіччына» адразу сустрэла моцны супраціў сярод пасяленцаў, і як толькі Кушаль быў абраны камэндантам, «крывіцызацыя» спынілася, хоць мянушка «крывічы» прыжыла-

ся і была прылепленая да актыўнай часткі беларускай эміграцыі. Вось дзе дзіва – эпізод з увядзеньнем тэрміну «Крывія» ў масы быў вельмі кароткатрывалы, два-тры месяцы, але наступствы, прычым не заўсёды пазытыўныя, трывалі добрых паўстагодзьдзя.

Крывія ці Беларусь

Наагул спроба зьмены назову (Крывія замест Беларусь) была на мой пагляд несур'ёзная і непрадуманая. Яна ўнесла разлад у грамадзтва, антаганізавала людзей. Можна было пра гэта дыскутаваць тэарэтычна – але не рабіць на такім узроўні і ў тым часе. Добра наагул, што людзі былі ў беларускім лягеры і хоць так трымалі беларускасьць. А галоўнае – як можна на эміграцыі мяняць назоў краіны і нацыі? Аб гэтым можна было толькі акадэмічна дыскутаваць, а не праводзіць у жыцьцё! Такі быў мой пагляд ад пачатку і застаецца цяпер – я не прыхільнік зьменаў назоваў. Калі некалі і дойдзе да зьмены назову, то гэта мусіць рабіцца на дзяржаўным узроўні, праз спэцыяльныя камісіі, узгадненьні. Згаджаюся, назоў «Беларусь» нам накінуты, ня надта падыходзіць, прыйдзе час – можа й зьменім. А пакуль – хай застаецца, бо нам трэба прабівацца палітычна, каб нас заўважылі як асобную нацыю. Калі ж мы пачынаем сварыцца з-за назову – гэта не спрыяе нашаму палітычнаму дынамізму, абгрунтаваньню нашай сёньняшняй дзяржаўнасьці.

Беларуская гімназія

У сьнежні 1945 году была адчыненая беларуская гімназія. Прыблізна месяц яна мясьцілася ў адміністрацыйным будынку на Беларускім селішчы, а зь сярэдзіны студзеня 1946 году і беларуская гімназія, і беларуская школа былі пераведзеныя ў агульны адміністрацыйны будынак, дзе мясьцілася таксама ўкраінская гімназія, амэрыканская (УНРРАўская) адміністрацыя селішча, а таксама скаўцкая адміністрацыя. У тым самым вялікім – двухпавярховым – УНРРАўскім будынку была вялікая тэатральная заля і спартовая заля. Амаль увесь другі паверх будынку займаў шпіталь.

Пераход з украінскай гімназіі ў беларускую адбыўся так. Украінская гімназія дала нам пасьведчаньні, што мы праслухалі такія і такія курсы, экзамэнаў яшчэ не здавалі, а беларуская гімназія нас прыняла ў тыя самыя клясы, у якіх мы былі ў украінскай. Тыя, хто прыходзіў у беларускую гімназію не з украінскай – ім рабілі ўступны экзамэн, а нас проста перавялі з шостай клясы ў шостую. Мы былі незадаволеныя – нас сем чалавек прыйшло з украінскай гімназіі ў шостую клясу беларускай, мы ведалі, што мы шостую клясу перарасьлі, але не хацелі сварыцца. Тады, пасьля ваеннага напружаньня, быў настрой:

дзякаваць богу, што мы жывем, што можна паесьці, а ў якой клясе быць – гэта ўжо ня так важна, хоць мяне гэты факт доўга злаваў.

Я спачатку аддаўся толькі навуцы – бо і прапусьціў шмат, і ў украінскай гімназіі адчуў, што хоць гэта і паўтор, але трэба вучыцца, прыпомніць, што забыў.

Атмасфэра ў беларускай гімназіі была інакшая, чым у папярэдніх школах: па-першае, было менш вучняў, па-другое, мы ведалі шмат каго з настаўнікаў, па-трэцяе, вучні былі зь дзесятка розных школаў, быў разнабой у ведах. Варта прыпомніць пару словаў пра некаторых настаўнікаў, бо іх прафэсійнасьць і зрабіла гімназію.

Настаўнікі

Гісторыю выкладаў Антон Адамовіч, пазьнейшую гісторыю – Іпаліт Паланевіч, мову – таксама Адамовіч. Нейкі час гісторыю выкладаў Янка Станкевіч, але вельмі коратка. Быў такі выпадак: лекцыі гісторыі выкладаліся разам шостай, сёмай і восьмай клясе, часта там зачытваліся тэксты з кнігі «Пад Полацкам дажджы», і мы ўсё чакалі пачуць пра Скарыну – адным словам, настаўнікі нам стараліся сказаць, што ёсьць літаратура на гэтую тэму. Янка Станкевіч нешта чытаў зь літаратуры, і ў тэксьце быў сказ «Князь сьвіснуў коней», і ён пытаецца, ці ўсе разумеюць, што гэта значыць. Ну вядома, усе вучні кажуць, што разумеюць, а Кастусь Вайцяхоўскі ўстае і кажа: «Ну што – ведама, што князь скраў коней, што яшчэ...» А Янка Станкевіч гэтага жаргону, відаць, не разумее і пытаецца: «Што??? Што вы кажаце???» Але неяк сытуацыя разьвязалася, а Янка Станкевіч прачытаў нам лекцыю пра мову.

Найбольш строгім сярод настаўнікаў мы ўважалі Аўгена Каханоўскага (Калубовіча). Ён выкладаў беларускую мову і літаратуру ў старэйшых клясах. Гэта быў, бясспрэчна, вельмі патрабавальны настаўнік. Праграму ён выконваў цалкам – было шмат працы ў клясе, і хатнія заданьні ён задаваў рэгулярна. Пры гэтым ён дапаўняў клясныя лекцыі кнігамі, якіх у яго было шмат і якія ён патрабаваў ад нас чытаць. Ведаю напэўна, што для лекцыяў літаратуры Каханоўскі пазычаў кнігі ў каго мог у лягеры (у Віцьбіча, Панькова, Золака і іншых). Да мяне ён быў асабліва «пільны». За ўсю маю сярэднюю асьвету Каханоўскі для мяне застаўся найбольш патрабавальным настаўнікам. Каб пашырыць нашыя веды ў беларускай літаратуры, ён арганізаваў у гімназіі літаратурны гурток, дзе таксама «праходзілася» беларуская літаратура. Я дзіўлюся – калі выдаваўся часапіс літаратурнага гуртка «У Выраі», Каханоўскі папрасіў мяне напісаць для яго перадавы артыкул.

Сярод настаўнікаў, якіх мы лічылі вельмі сур'ёзнымі, быў і Мечыслаў Рагажэцкі, які выкладаў матэматыку. У Савецкім Саюзе ён

быў настаўнікам гадоў дваццаць, а ў гімназіі карыстаўся нямецкімі падручнікамі. Другім такім настаўнікам быў выкладчык геаграфіі Аляксандар Орса, які скончыў універсытэт у Празе – памятаю, як ён расказваў пра геамарфалёгію, як мяняецца паверхня зямлі. Здаецца, гэта была ягоная любімая тэма – ён геамарфалёгію вельмі цікава выкладаў.

Наагул мы былі ўжо крыху старэйшыя векам і «з практыкай» і разумелі, што настаўніка можна і «абдурыць», бачачы, як настаўнікі пілнавалі беларускасьць. Вось прыклад. Лекцыі рэлігіі таксама былі для шостай, сёмай і восьмай клясаў разам, выкладаў айцец Лапіцкі. А гэты сьвятар вельмі ўшаноўваў Эўфрасіньню Полацкую. І вось вучань Алесь Хібінскі на лекцыі рэлігіі паднімае руку і кажа: «Вось вы ўсё Эўфрасіньня, Эўфрасіньня… А ў нас казалі Ахрасіньня!» І айцец Лапіцкі рэагуе: «А, казалі, цікава, трэба Янку Станкевічу сказаць…» І нешта сабе запісвае, а Хібінскі ўхмыляецца. Я пасьля кажу Хібінскаму: «Слухай, што ты дурака валяеш, якая Ахрасіньня?» А ён мне: «А што – затое час прайшоў».

У гімназіі я бачыў зблізу Янку Станкевіча першы раз і першы раз меў зь ім дачыненьні. Праўда, неўзабаве ён перастаў чытаць у нас лекцыі.

Што да іншых настаўнікаў, то хоць мы й ведалі, што яны знаюць шмат, але ў іх, на наш пагляд, было менш пэдагагічнага досьведу. Адну дэталь я запомніў на ўсё жыцьцё. Быў у нас такі настаўнік Парфіры Трысмакоў – інжынэр «да мозга касьцей», які працаваў да вайны ў Акадэміі навук, пасьля ў тэхнічным інстытуце ў Менску. Ён выкладаў фізыку, і на адной лекцыі – а гэта быў пачатак 1946 году, DP-лягер, вучні з бору па сосенцы – настаўнік вучням у глыбокім задуменьні кажа: будучыня тэхнічнага сьвету – гэта электроніка. І тлумачыць нам, што такое электрон, якія рабіліся досьледы, і якое значэньне будзе мець электроніка ў вылічальных машынах (!), якія будуць думаць за чалавека. У той час расказаць нам пра электроніку, пра якую яшчэ ніхто не гаворыць… Гэта было незвычайна чуць, гэта сапраўды было нешта новае, і мы проста захапляліся такімі настаўнікамі, яны станавіліся для нас аўтарытэтам назаўсёды. Шкада, што Парфіры Трысмакоў быў на эміграцыі, бо калі б ён жыў увесь час у Менску, то шмат чаго б мог стварыць, бо ў яго быў творчы палёт, ён разумеў будучыню і стараўся захапіць гэтым вучняў.

Анатомію выкладаў Аляксандар Багдановіч – доктар мэдыцыны, ён быў доктарам і ў лягеры, а таксама працаваў у нямецкіх шпіталях. Цікавая была настаўніца нямецкай мовы – Іна Рытар, яна была адзіная, хто казаў, каб мы запісаліся ў нямецкія бібліятэкі і чыталі нямецкія кніжкі. Памятаю, у Міхельсдорфе, я аднойчы іду з Каму, дзе мне трэба было нешта адміністрацыйнае залагодзіць (рыхтаваліся да футбольнага матчу, і я ў аднэй пякарні мусіў дамовіцца, каб выпеклі столькі

і столькі булак для пераможцаў), а яна ідзе ў Кам, адна, у полі сьцюжа, у руках нешта вялізнае, закручанае ў цырату – яна ідзе ў Кам мяняць кніжкі! Яе прынцып у пэдагагічнай працы быў такі: інтэлектуальны патэнцыял найбольш разьвіваецца праз чытаньне. А калі будзеце чытаць па-нямецку, то будзеце разумныя, такія, што разумнейшых і на сьвеце няма! – заўсёды жартавала спадарыня Рытар.

Ангельскую мову выкладала спадарыня Марыя Станкевіч – матка Юркі і жонка Янкі Станкевіча. Гэта былі нашы першыя знаёмствы з мовай, а яна скончыла ў Амэрыцы ўнівэрсытэт і ведала мову добра. Сама яна была чэшка, па-беларуску гаварыла з акцэнтам і была першая для нас настаўніца, якая акрэсьліла розьніцу паміж брытанскім і амэрыканскім варыянтамі ангельскай мовы.

Іншыя настаўнікі, якія працавалі з намі, былі Іван Муха (фізкультура, спорт), Мікола Кругловіч (маляваньне), Мікола Сіцько (ангельская мова) – усе яны прыкладалі максымум энэргіі, каб зрабіць лекцыі сваіх прадметаў паўнацэннымі.

Французскую мову выкладала Натальля Арсеньнева. Яна пабыла ў нас год ці два, заклала пачаткі, потым выкладала ў іншых клясах. Мы былі ёй удзячныя – пасьля ва ўнівэрсытэце мы ўспаміналі двух настаўнікаў: яе, бо мы вучыліся па-французску, і матэматыка Перагуда-Рагажэцкага. Калі мы прайшлі праграму 8-й клясы і заставалася яшчэ пару тыдняў да канца школьнага году, Рагажэцкі нам кажа: я вам дам яшчэ дыфэрэнцыялы, пазнаёмлю з інтэграламі. І мы выйшлі з гімназіі знаёмыя з дыфэрэнцыяльным вылічэньнем досыць добра – у тыя часы гэта было ўжо па-за праграмай сярэдняй школы. Калі мы прыйшлі ў Лювэн і там усё пачыналася з дыфэрэнцыялаў, перш чым перайсьці да аналітыкі, дык нам набытыя ў гімназіі веды вельмі спатрэбіліся.

Удакладню, што я хачу выказаць: Беларуская гімназія імя Янкі Купалы на чужыне была салідная навучальная ўстанова. Яна падрыхтавала дзесяткі маладых людзей для далейшага шляху ў адукацыйным працэсе – да ўнівэрсытэту. Бясспрэчна, тагачасны беларускі нацыянальны актыў быў і дальнабачны і вельмі адказны: арганізацыя і вядзеньне беларускіх школаў, улучна зь беларускімі гімназіямі – сьведчаньне адданасьці і ахвоты служыць Беларусі заўсёды і ўсюды і рыхтаваць адукаваныя кадры нацыянальнае інтэлігенцыі.

Інцыдэнт з крывіцкай шыльдай

Гімназія была ўстанова шырокага навучальнага профілю – выкладаліся і гуманітарныя, і дакладныя прадметы. Навучальны тон гімназіі задаваў Аляксандар Орса, выдатны беларускі пэдагог. Ён быў добры настаўнік, добры дырэктар, добры адміністратар, вельмі любіў, калі вучні вучацца. Прынцып у яго быў такі: адрабіце лекцыі

паводле раскладу, пасьля вас будуць экзамэнаваць, будуць пытацца, што вы ведаеце, і дадуць вам адзнаку, і хто лепшы – той будзе наперадзе. І ніякіх зьніжак ні на што – ці ты заняты грамадзкай дзейнасьцю, ці не. Праўда, ён, як некалі Акановіч – рабіў палёгкі вучням, якія займаліся грамадзкай працай. Калі я мусіў паехаць па скаўцкіх справах – а гэта бывала вельмі часта – ён выклікаў да сябе і злаваўся: «Зноў ты просіш дазволу! Чорт яго ведае – гэта школа ці нейкія дзіцячыя гульні!» – але ўрэшце адпускаў. Я яму шмат абавязаны ў маёй грамадзкай дзейнасьці.

Навучаньне ў гімназіі ішло безь вялікіх «падзеяў». Аднак адно ня надта прыемнае здарэньне мне ўсё ж урэзалася ў памяць. Сталася гэта ў Міхельсдорфе недзе глыбокай восеньню 1946 году. Палітычная атмасфэра ў лягеры была напружаная: ішло «беларускакрывіцкае» змаганьне. На гімназіі вісела прыгожая, па-мастацку выкананая шыльда «Крывіцкая гімназія» – яна вісела яшчэ ў Рэгенсбургу, дзе «крывіцкі тон» задаваў Янка Станкевіч – і калі пераехалі ў Міхельсдорф, шыльду пакінулі. І вось аднойчы нехта зьняў гэтую шыльду з гімназіі і павесіў на прыбіральню – і добра прыбіў цьвікамі. А прыбіральня ў лягеры адна: доўгі барак наўскрай лягеру і з аднаго боку напіс «мужчынская», а з другога «жаночая». І ўвесь лягер – каля 1000 чалавек – карысталіся гэтай установай, даводзілася хадзіць у яе «пешкі» мэтраў 50-60. І вось людзі ідуць у прыбіральню і чытаюць – «Крывіцкая гімназія»…

Я прыходжу ў школу – мяне выклікаюць у настаўніцкую. У настаўніцкай ужо сядзіць мой сябра Ўладзімер Цьвірка. Заходзіць дырэктар, а каля дырэктара сядае ягоная жонка, Натальля Орсіха. Дырэктар кажа: «Давайце, расказвайце!» А мы й ня ведаем, што расказваць. Цьвірку ўзбурыла, што сядзіць Орсіха: «Хай яна выйдзе!» – «Хто гэта «яна»? Гэта настаўніца!» Цьвірка кажа: «Тут яна толькі як сьведка, што мы будзем казаць. А мы ня хочам, каб яна сядзела тут!» Я маўчу, думаю, нашто ты набраўся такога тону… Спадарыня Орса спакойна паднімаецца і выходзіць. Дырэктар пытаецца: «Хто перавесіў шыльду?» Мы адказваем: «Мы ня ведаем!» Мы бачылі – шыльда вісіць прыбітая цьвікамі, і добра прыбітая, цьвікі загнутыя з другога боку, проста так ня здымеш. Тады дырэктар вядзе размову так: «Добра. Калі ня скажаце – не разьлічвайце, што скончыце гімназію». Мяне ягоная гутарка раззлавала, і я кажу: «Слухайце, спадар дырэктар, трэба ж неяк…» А Цьвірка перабівае: «Спадар дырэктар, ня ў вас пачыналі – ня ў вас скончым! Майце гэта на ўвазе. Мы гэтага не рабілі, і вы нам верце».

Мы шчыра нічога ня ведалі і хацелі, каб дырэктар нам паверыў. А дырэктар, ведаючы нашую настроенасьць супраць «Крывіі», прадаўжаў: «Але ж вы супраць крывічоў!» – «Так, мы супраць крывічоў». – «І асабліва Кіпель напэўна супраць крывічоў». Але гэтага мы

не рабілі: шыльды мы не здымалі і на прыбіральню не прыбівалі. Тады я сказаў дырэктару прыблізна гэтак: «Так, спадар дырэктар, мы можам пайсьці ў іншую школу, можам застацца тут, можам пайсьці ў нямецкую. Але вы нас ня страшце». Відаць, нашыя шчырыя словы падзейнічалі на дырэктара, у яго ўжо і сьлёзы выступілі – у яго вочы на мокрым месцы былі – «Дык што мне рабіць? Мне нехта сказаў, што вы ведаеце». Я кажу: «Дык калі вам нехта сказаў, прывядзіце гэтага «нехта» сюды – і мы будзем гаварыць. Але мы абсалютна нічога ня ведаем». – «Вы мяне ставіце ў такое нязручнае становішча!» – «Але ж вы самі сябе паставілі ў такое становішча. Калі вам нехта гаварыў, вы мусілі ў яго запытацца, ці ён бачыў». – «Ну, добра, ідзіце, я буду думаць». І мы пайшлі на лекцыі.

Справа, як відаць, далей не пайшла. Нас зь Цьвіркам пакінулі ў спакоі – ніхто і ніколі з настаўнікаў пра гэта ня ўспомніў. Мы таксама абодва выбачыліся перад спадарыняй Орсай, і яна, як выглядала, нам прабачыла, бо сказала: «Ведаеце, вы абодва былі вельмі грубыя, але наконт шыльды я вам веру – вы гэтага не рабілі».

У адзнаках за чвэрць нам зь Цьвіркам паставілі за паводзіны 4 з тлумачэньнем «за грубасьць да настаўнікаў», і гэта было ўсё. Цьвірка думаў ісьці сварыцца за такую адзнаку за паводзіны, але я яго ад гэтага адгаварыў. Аднак мушу сказаць, што выпадак той спадарыні Орсе запамятаўся, бо яшчэ і ў Нью-Ёрку яна мне аднойчы яго прыпомніла.

Выявілася, што гэтую шыльду перавесіў Коля Запольскі, паліцай – хлопец дуракаваты, ня ведаю, што яму стрэльнула ў галаву, можа, пажартаваць хацеў. Але шыльду ў той самы дзень зьнялі, і паліцыя яе забрала да сябе – да магчымага судовага разбору. На гімназію павесілі новую шыльду «Беларуская гімназія».

Пазьней я ў таго Запольскага пытаўся – што яго дзёрнула на такі ўчынак. Ён кажа: «Нішто ня дзёрнула, а мяне падгаварыў Ложка» (Ложка застаўся жыць у Нямеччыне.) Трошкі падпілі, той кажа: давай зробім – і зрабілі, «пажартавалі»...

Да гонару лягеру: выпадак асуджалі літаральна ўсе насельнікі.

Скаўтынг

У амэрыканскай зоне акупацыі беларускі скаўтынг пачаўся ўвосень 1945 году. Ходзячы ва ўкраінскую гімназію ў Рэгенсбургу, я часам бачыў маладых людзей – украінцаў і асабліва балтаў – ва ўніформах, якія адрозьніваліся нацыянальнымі адзнакамі. Я ў некага запытаўся – што гэта такое, і мне адказалі, што гэта скаўты. Пра скаўтаў я, прызнацца, нічога ня чуў. Да арганізацыяў моладзі я належаў і раней – піянэры, СБМ, а вось пра скаўтаў чуць не даводзілася. А калі арганізавалася Беларускае селішча, моладзі

ў скаўцкіх уніформах пабольшала – былі там і палякі, і расейцы, але найбольш было ўкраінцаў і балтаў.

Памятаю, прыходзіць да мяне Юзя Брэчка, зь ёй я таксама пасябраваў адразу, калі сустрэўся зь ёй першы раз у Беларускім камітэце, і яна мне кажа: «Ведаеш, іншыя нацыянальнасьці маюць скаўтаў, трэба і нам гэтую арганізацыю стварыць – ты ж любіш моладзевыя арганізацыі». Так пачала мяне агітаваць Юзя Брэчка. Трэба сказаць, што зь Юзяй я сябе адчуваў вельмі адкрыта – мог ёй шчыра нешта сказаць. Вось я ёй і кажу: «Ведаеш, Юзя, я пра скаўтынг нічога ня ведаю, прыехаў я сюды вучыцца ў беларускую школу, трэба шмат даганяць – пакінь ты мяне ў спакоі». Юзя чамусьці маім адказам не задаволілася і пачала мне расказваць, што такое скаўтынг – на базе таго, што ведала пра польскіх гарцэжаў. Мяне гэта ніяк не пераконвала.

Тады праз пару дзён Юзя прывяла да мяне ў пакой Сьцяпана Кірыліка. Той, быўшы кіраўніком СБМ, здаецца, у Клецку, адразу загнуў, што кожны былы СБМавец павінен прадаўжаць працаваць з моладзьдзю. І наагул Кірылік закрануў тэму беларускасьці, а на гэта я быў заўсёды адчувальны. Кірылік даў мне больш ведаў пра скаўтынг і сказаў, каб я прыйшоў на зборку актыву па арганізацыі скаўтынгу на селішчы.

На арганізацыйную зборку я пайшоў. Вёў яе латыскі скаўтмайстар Зэмгаліс – чалавек вельмі адукаваны, шматмоўны, з шырокай эрудыцыяй. Зэмгаліс выклаў асновы скаўцкага руху: галоўная задача – падрыхтоўка лідэраў для грамадзтва, якім адначасна можна было даць шмат чаго нацыянальнага праз праграму скаўцкіх спраўнасьцяў. Мне гэты пункт асабліва спадабаўся: разам з агульналюдзкімі міжнароднымі вартасьцямі – выхаваньне ў нацыянальным духу. Я вырашыў запісацца на курсы скаўцкіх кіраўнікоў, якія неўзабаве арганізоўваліся там у лягеры. Пачалі хадзіць на курсы таксама Кірылік і Саша Сасукевіч, але поўнасьцю ўсю праграму прайшоў толькі я. Далучыліся да скаўтынгу і іншыя былыя СБМаўцы – Палікарп Манькоў, Сьцяпан Кірылік, Кастусь Вайцяхоўскі, Юзэфа Брэчка, Вітаўт Кіпель, Зора Савёнак, Алесь Марговіч, Лявон Карась, Тамара Карповіч, але найбольш прыйшло новых маладых людзей: Алесь Бута, Юрка Станкевіч, Дзіма Сямёнаў, а праз пару месяцаў – Янка Жучка, Васіль Шчэцька, Сьцяпан Кісель і іншыя.

На самым пачатку арганізацыі беларускага скаўтынгу трэба было нам, ініцыятарам, добра азнаёміцца з гэтым рухам. Сам я поўнасьцю аддаўся вывучэньню літаратуры пра скаўтынг і дыскусіям пра гэты рух зь беларускімі юнакамі і юначкамі. Праўда, будучы знаёмы з украінцамі, я пару разоў схадзіў і на іхныя скаўцкія зборкі. Паступова ў нас у Рэгенсбургу вызначылася ладная група актывістаў, якія маглі стаць і сталі скаўцкімі кіраўнікамі. Пра тое, што мы вельмі добра працавалі, сьведчыць факт, што на першым «джэмбары» скаўтаў у Рэгенсбургу

бралі ўдзел каля 40 дружынаў, беларусы ўзялі ў спаборніцтвах першае і другое месцы (першае – мая, другое – Алеся Буты). Паступова мы пашыралі сваю дзейнасьць: перакладалі скаўцкую літаратуру, езьдзілі ў іншыя лягеры – шукалі беларускую моладзь.

Так пачаўся беларускі скаўтынг. Мне спадабалася праграма, як яна была выкладзена. І я пачаў хадзіць па хатах да людзей, дзе былі дзеці, і расказваць, што такое скаўтынг, каб пусьцілі сваіх дзяцей у скаўты. Адміністрацыя дала нам сьвятліцу – пакой. У гэтую сьвятліцу мы запрашалі новых дзяцей, расказвалі пра скаўтынг, як мы будзем працаваць, якая ў нас будзе структура, і так далей.

Скаўцкая дзейнасьць у амэрыканскай зоне на пачатку лягла на плечы Кірыліка і Палікарпа Манькова. Яны былі не ў гімназіі, гэта былі людзі старэйшыя векам – Кірылік гадоў на пяць за мяне старэйшы, а Манькоў – былы настаўнік са Случчыны, пісьменьнік. Але ў іх быў вольны час, яны маглі аддавацца арганізацыйным справам.

Пачалася рутынная праца, адбываліся розныя скаўцкія гульні. Мы езьдзілі на першы зьлёт беларускіх скаўтаў – гэта было ў чэрвені 1946 году, бо скаўтынг ужо арганізаваўся ў ангельскай зоне, нейкія крокі рабіліся і ў французскай. Зьявіліся кіраўнікі – Вацлаў Пануцэвіч, кароткі час кіраўніком у Рэгенсбургу быў Зьміцер Сямёнаў. На адной зь першых зборак кіраўнікоў быў і Адамовіч – яна адбывалася ў яго-най хаце – і ён паставіў пытаньне аб скаўцкай літаратуры (сам ён у той час выдаваў бюлетэньчык «Ведамкі»).

Рост і канец селішча

Лягер таксама быў вельмі жывым месцам. Напачатку Беларускі камітэт прыслаў 800 людзей – так мне казалі, але з часам іх стала больш, пачаліся «ўшчыльненьні». Мне далі пакой у адміністрацыйным будынку і сказалі, што са мной будзе жыць разам студэнт. Ён вучыцца ў Мюнхенскім унівэрсытэце і раз на тыдзень ці на два тыдні будзе прыяжджаць забіраць паёк, але будзе лічыцца, што ён жыве са мной, а тым часам спаць у маім пакоі будзе іншы чалавек. А я буду адказны за пакой, за рэчы таго студэнта.

Студэнтам, якога да мяне прыпісалі, быў Вітаўт Рамук, а чалавек, што рэальна жыў, быў пазьнейшы настаўнік сп. Герцых. Герцых хутка прапаў – трапіў у турму, бо недзе пабіўся зь немцамі, а Рамук, які вучыўся ў Мюнхене, прыяжджаў, забіраў прадукты, якія я для яго назапашваў у спэцыяльным памешканьні. Спадар Рамук затрымоўваўся ў лягеры на дзень-два, у яго было шмат знаёмых. Даведаўшыся, што ў гімназіі выкладаецца лаціна, ён узяўся мяне «падцягнуць» (я лаціну ведаў слаба, бо вучыў яе толькі адзін год у Менску ў прагімназіі). Зь Вітаўтам Рамуком я пасябраваў і меў зь ім кантакт праз усё жыцьцё.

З часам Беларускае селішча разраслося – у ім было тысячы паўтары чалавек. Было шмат беларускіх палонных з вэрмахтаўскіх і ССаўскіх частак, і калі яны праходзілі амэрыканскую камісію па выпуску з палону – бо яны не былі нацыстамі і наагул не былі вялікімі ваякамі – іх выпускалі. К таму часу «шырокае грамадзтва» дыпісаў (такі размоўны тэрмін ужываўся замест DP) у амэрыканскай зоне ведала, што ў Рэгенсбургу ёсьць беларускі лягер, туды прыходзілі людзі, і кіраўніцтва спрабавала тых людзей неяк уладзіць у лягер, хацела лягер пашырыць. Таму ўвесь час можна было пачуць, што прыехаў нехта новы, усяліўся новы чалавек. Мяне, безумоўна, гэта мала кранала, я меў свой пакойчык, да мяне ўвесь час некага падсялялі, але як жывеш адзін, дык гэта не такая вялікая праблема. За зіму 1945–46 са мной «пражыло» чалавек дзесяць.

Трэба сказаць, што самотныя былі такая група людзей – і значная група, – да якой адміністрацыя лягеру ставілася вельмі «лёгка» – «ушчыльнялі» ўвесь час. Я, прыкладам, хадзіў у адміністрацыю скардзіцца, што са мной разам стала жыве Рамук, дык каб больш нікога не падсялялі, але мае скаргі ня браліся пад увагу. Калі я сказаў, што мне трэба рабіць хатнія заданьні, то кіраўнік адміністрацыі – а ім быў тады спадар Янка Крэсла – сказаў проста: вучыся ў скаўцкай сьвятліцы, яна сярод тыдня пустая. Так я і рабіў.

У Рэгенсбургу мы прабылі да канца ліпеня 1946 году. У той час адбыўся канфлікт паміж кіраўніцтвамі на вярхах, і беларусаў вырашылі вывезьці з Рэгенсбургу ў якасьці пакараньня.

Аднойчы раптам Беларускае селішча абляцела навіна: беларусаў вывозяць у іншае месца. Прычына: палякі настаялі перад адміністрацыяй UNRRA, каб беларусаў вывезьлі, бо яны «абразілі» польскага праваслаўнага япіскапа Саву. А справа была гэткая. На селішчы беларусы збудавалі царкву сьв. Эўфрасіньні. Царква была вельмі папулярная, і япіскап Сава, адведваючы польскі лягер, хацеў адслужыць службу ў беларускай царкве. Беларуская царкоўная адміністрацыя Саву ў гэтым адмовіла, матывуючы адмову тым, што япіскап Сава не прызнае асобнасьці Беларускай праваслаўнай царквы. Адным словам, япіскап Сава не прызнаваў Беларускай царквы – і яго ў беларускую царкву не пусьцілі. У выніку беларусаў вывезьлі ў Міхельсдорф, вёсачку каля гораду Кам (Cham), непадалёк ад чэскай мяжы.

Міхельсдорф

Сам пераезд я дакладна ня памятаю – галава была занятая нечым іншым. Перавозілі нас цягніком і часткова машынамі – але ўжо ў канцы ліпеня 1946 году мы былі ў лягеры ў Міхельсдорфе. І гэта ўжо быў лягер толькі для беларусаў.

Пару тыдняў пайшло на ўпарадкаваньне: трэба было каля тысячы

людзей разьмеркаваць па бараках. Ішло гэта досыць спраўна, але не без канфліктаў. Прыкладам, доўгі час скаўтам не прызначалі памешканьня, пры разьмеркаваньні ў бараках дзьве-тры сям'і траплялі ў адно аддзяленьне бараку і хацелі перамяніцца, і падобнае. Адно было ясна: пабытовыя ўмовы ў Міхельсдорфе ніяк нельга было параўнаць з умовамі жыцьця ў добрых дамах у Рэгенсбургу. Міхельсдорф – гэта вёска, баракі, прырода. Рэгенсбург – горад з усімі выгодамі дагледжанай прасторы. Аднак, як я ўважаю, для праводжаньня беларускасьці Міхельсдорф быў лепшым месцам, чым Рэгенсбург.

Праз пару месяцаў пасьля пераезду ў Міхельсдорфе адбыліся выбары кіраўніцтва лягеру, Францішак Кушаль, дасюлешні камэндант лягеру, выбары прайграў. Старшынём выбралі Міхаіла Ігнатовіча – гэта быў былы студэнт з Прагі, добры русацяп. Ігнатовіч пабыў камэндантам год, і тады замест яго выбралі Барыса Шчорса. Шчорс быў беларускі нацыянальны дзеяч, супрацоўнічаць зь ім было прыемна. Шчорс пілнаваў беларускасьць лягеру.

У Міхельсдорфе былі толькі беларусы, і лягерны парадак быў ужо зусім іншы. Была мачта зь беларускім сьцягам, які штодня паднімалі і апускалі, была. беларуская паліцыя.

Гімназіі ў новым лягеры далі барак, і яна з усім сваім пэрсаналам пераехала з Рэгенсбургу, у яе працы нічога не зьмянілася.

У Міхельсдорфе была таксама арганізаваная царква. Царква была і ў Рэгенсбургу, але далекавата, а тут – пад носам, адбываюцца службы, аднаго сьвятара, айца Лапіцкага, звальняюць, прыходзіць другі, усё ідзе спраўна, рутынна.

Працуе скаўтынг, адбываюцца скаўцкія курсы, прыяжджаюць маладзейшыя людзі з амэрыканскай зоны, некаторыя зь іх застаюцца ў лягеры, некаторыя вяртаюцца ў «свае» мясьціны і вядуць беларускую дзейнасьць там.

Але галоўнае для мяне й моладзі майго пакаленьня – гэта асьвета, штодзённыя заняткі ў гімназіі. Яны пачыналіся а восьмай гадзіне і працягваліся да першай-другой гадзіны. Пасьля трэба зрабіць хатнія заданьні, а тады ты вольны чалавек – можаш займацца скаўтамі, можаш у драматычны гурток або хор, пайсьці ў горад у кіно або рыбу лавіць.

Жыцьцё ў лягеры было актыўнае. На спартовым полі былі турнікі, заўсёды было людна на валейбольнай пляцоўцы. Скаўцкія дружыны, ці то ў формах, ці без, адраблялі свае заданьні ў скаўцкай сьвятліцы або на полі. Раз на месяц тэатральна-харавая грамада ладзіла паказы. Апрача таго адбываліся і палітычныя вечары, асабліва калі ў лягер прыяжджалі іншыя беларусы. Праходзілі таксама і паэтычныя сустрэчы – выступалі Сяднёў, Арсеньнева і іншыя пісьменьнікі. Вёска Міхельсдорф была ад гораду Кам за 2-3 кілямэтры, але сувязь з гора-

дам была шчыльная: хадзілі ў кіно, у магазыны, на пошту, каталікі – у касьцёл, наведвалі танцавальны і спартовы клюбы – дачыненьні зь немцамі былі добрыя.

У горадзе быў невялічкі яўрэйскі лягер, і беларусы час ад часу хадзілі да іх – там бывалі танцавальныя вечары. Яўрэі таксама прыходзілі да нас. Гэта былі тыя яўрэі, пераважна савецкія і польскія, што ехалі ў Палестыну – яны чакалі, пакуль іх пасадзяць на аўтобусы і некуды завязуць. Сярод іх было вельмі шмат расейскамоўных, якія вайну перабылі ў Савецкім Саюзе, пасьля як польскія грамадзяне выехалі ў Польшчу, адтуль уцяклі ў Нямеччыну і зьяжджалі на Захад, далей ад саветаў.

Увосень 1946 году – яўрэяў прывезьлі можа пару тысяч і разьбілі новы лягер каля Міхельсдорфу, на ўзьлётным полі былой авіябазы, за ноч паставілі некалькі дзесяткоў велізарных палатак. Раніцай мы ўстаем і бачым – побач вырас цэлы лягер! Палаткі стаяць, але ні вады, ні прыбіральняў няма. Новапрыбылым было сказана карыстацца міхельсдорфскімі прыбіральнямі і лазьняй. Стаялі яны там тыдзень ці два, і гэта быў прыемны кантакт. Яўрэі рваліся ў Палестыну. Шмат сярод іх было і менскіх, якія ў вайну былі ва Ўзьбекістане. Я з такімі двума пазнаёміўся – яны вярнуліся з Узьбекістану ў Менск, а там запісаліся, што яны зь Ліцманштату – і ўцяклі. За які тыдзень-два гэты лягер зьліквідавалі, але тых пару дзён яўрэі карысталіся і беларускай кухняй, і выгодамі, і было досыць завозна ва ўсіх лягерных «установах». Самае цікавае з гэтага эпізоду тое, што ніякае варажнечы паміж беларусамі і яўрэямі не было, не адбылося ніводнага канфлікту.

Дарослым людзям, хто не вучыўся ў гімназіі, у лягеры не было чым заняцца, як «забіць» вольны час. Як яны бавілі гэты час? Ведамая справа, моладзь была занятая – вучыліся, мелі свае арганізацыі, ладзілі экскурсіі. Іншыя лягернікі займаліся хто чым. Адны лавілі рыбу – побач рыбная рэчка Рэген, іншыя займаліся на курсах – аўтамабільных, шавецкіх і іншых – курсы арганізоўвала адміністрацыя лягеру. Больш актыўныя ў нацыянальным руху займаліся ў хоры, драматычным гуртку, арганізоўвалі дыскусійныя вечары. Ладзіліся выстаўкі: вышыўкі, мастацтва. Жыцьцё ішло – чакалі перамен, можа, канфлікту з СССР, а найбольш – магчымасьці выезду за акіян. Аб'ектыўна кажучы, грамадзтва было нечым занятае – п'янства не было, хоць, вядомая справа, сям-там здараліся і п'янкі, але калі гэта выходзіла за межы прыстойнасьці – паліцыя была на месцы і адразу наводзіўся парадак.

Харчамі забясьпечвала UNRRA-IRO, аднак дастаўка прадуктаў у лягер была абавязкам лягернай адміністрацыі. У лягеры былі людзі дзьвюх катэгорыяў – тыя, што бралі сухія прадукты і самі варылі (у бараках былі печкі, там некалі жылі лётчыкі з авіябазы), і другая група – яны ня бралі ніякіх прадуктаў, а прыходзілі есьці ў сталоўку.

Адміністрацыя разьмяркоўвала – колькі прадуктаў мае ісьці на кухню, і з гэтага варылі сьняданьні, абеды і вячэры для тых, хто не атрымліваў пайка. Нібыта й былі нейкія талёны, але там была тысяча людзей, дык усё ішло больш-менш «на вока».

Час ад часу IRO прывозіла рознае барахло і раздавала, бо не было адзёжы. Хутка адзелі скаўтаў – раз далі ўніформу, другі – і гэта вельмі дапамагло павялічыць колькасьць сяброў, бо нашы людзі доўга раздумвалі, ці пусьціць свайго хлопца ці дзяўчыну ў скаўты, але калі форму даюць «за дурака», хай сабе ўступае ў арганізацыю.

Скаўтынг у Міхельсдорфе

Скаўтынг у Міхельсдорфе разьвіваўся інакш, чым у Рэгенсбургу. У Рэгенсбургу беларускія скаўты былі часткай вялікай міжнацыянальнай скаўцкай арганізацыі, а ў Міхельсдорфе беларускія скаўты былі самі – маналітная скаўцкая арганізацыя. Дарэчы, пры пераезьдзе ў Міхельсдорф былыя рэгенсбургскія кіраўнікі – Сямёнаў, Сасукевіч, Кірылік – засталіся ў баку і адышлі зусім добраахвотна ад непасрэднай працы з моладзьдзю.

З моладзьдзю засталіся фактычна амаль усе «аднакашнікі»-СБМаўцы. Мы сабраліся: Запруднік, Цьвірка, Марговіч, Жучка, Урбан і яшчэ пару і выбралі мяне кіраўніком скаўтаў у Міхельсдорфе, а Буту зрабілі штандаровым (кіраўніком на амэрыканскую зону). Аб гэтым мы паведамілі Вацлаву Пануцэвічу (галоўны кіраўнік) і Францішку Кушалю (апякун). Кушаль адразу згадзіўся, а Пануцэвіч паведаміў пра сваю згоду празь месяц-другі. Мы вырашылі таксама, што на новыя скаўцкія формы будзем нашываць назоў «Беларусь», а ня «Kryvija». А гэта азначала бунт супраць Галоўнай кватэры. Аднак Пануцэвіч нічога супраць не рабіў, маўляў – няхай будзе і так, і так.

Скаўцкая праца ў Міхельсдорфе пайшла вельмі інтэнсіўна. Адбываліся штодзённыя зборкі – ішло беларусаведнае навучаньне. Ладзіліся конкурсы ў беларускай геаграфіі і гісторыі. Амаль штомесяц мы езьдзілі на скаўцкія «джэмбары» ў Рэгенсбург, Мюнхен, Аўгсбург і добра там выступалі. Былі арганізаваныя курсы малодшых кіраўнікоў, на якіх было каля 20 слухачоў. Усяго ў Міхельсдорфе было каля 170-190 скаўтаў. Пачаўся там таксама і асобны дзявочы скаўтынг, хоць яны падпарадкоўваліся агульнаму кіраўніцтву.

Латыскія скаўцкія курсы

Падвышалі мы скаўцкую адукацыю і на іншанацыянальных курсах. Я так сышоўся з латышамі, што мяне паслалі на латыскі курс Garezers, я нават пачаў вучыць латыскую мову. (Латышы і эстонцы мелі права арганізоўваць курсы найвышэйшых скаўцкіх кіраўнікоў.)

Курс быў каля Касэлю, цягнуўся амаль два месяцы, спачатку туды паехалі таксама Тулейка, Арцюх і Пагуда, але пасьля яны кінулі, а я застаўся. Начальнікам курсу быў Клэтніекс – кіраўнік латыскіх скаўтаў на эміграцыі. Я прыехаў у Касэль, і спадар Клэтніекс мне кажа: «Слухай, ты з латыскай мовай ня справісься. Калі хочаш, мы табе будзем выкладаць па-расейску, а хочаш – па-нямецку». Я кажу – лепш па-нямецку, бо я па-расейску скаўцкай тэрміналёгіі ня ведаў.

На курсе было чалавек сорак, усе латышы. Але сярод іх я бачыў чалавек восем, якія трымаліся асобна – яны мелі іншы курс, у дадатак да скаўцкіх справаў у іх была асобная праграма, іх забіралі на два-тры дні ў вялікія лясы вакол Касэлю. І адзін раз мне адзін з тых васьмі кажа: «Слухай, як ты сёньня пасераш, дай мне панюхаць, і ты сам панюхай – і ці ты пазнаеш, што там ёсьць бульба?» Я пытаюся: «Я што?» – «А ты нічога ня ведаеш?» – «Нічога…» Ну, пайшлі мы ў лес, і ён кажа (а гэта 1948 год): «Слухай, нас восем чалавек рыхтуюць для перасылкі ў Савецкі Саюз, мы мусім арыентавацца – калі пабачым гаўно, дык мусім ведаць, што чалавек еў у лесе – ці гэта амэрыканскі агент, ці хто яшчэ – чым яно пахне». Гэтаму іх вучылі спэцыяльныя інструктары. «Не, – кажу я яму, – я займаюся скаўцкімі справамі…» І праўда, за якіх пару тыдняў гэтых восем чалавек прапала – прыпушчаю, што іх перакінулі ў Савецкі Саюз, але маглі яны пайсьці і ў нямецкую армію, памежныя аддзелы, якія ў той час пачалі стварацца.

Курс Garezers мне шмат дапамог. Пасьля, прыехаўшы ў Амэрыку, я скончыў яшчэ курс Wood Badge і стаў амэрыканскім скаўтмайстрам. Цэлы курс цягнецца каля году. Значна пазьней, у 1975 годзе, я стаў выкладчыкам на такім курсе. Бясспрэчна, падрыхтоўка скаўцкіх кіраўнікоў неабходная для стварэньня саліднага скаўцкага руху.

Эстонскія скаўцкія кіраўнікі ў мяне пыталіся ў 1948 годзе: ці няма ў беларусаў ахвотнікаў сярод скаўцкіх кіраўнікоў, хто б пайшоў на курс Wood Badge для марскіх скаўтаў, каля гораду Фленсбургу. Бо толькі эстонцы мелі дазвол на арганізацыю такога курсу. Дапамагалі ў арганізацыі марскога скаўцкага курсу ангельцы – яны давалі марскі рыштунак і яхты. На жаль, у беларусаў на такі марскі скаўцкі курс кандыдатаў у той час не было. Аб гэтым я дыскутаваў з Пануцэвічам, калі адведваў яго ў Фленсбургу зімой 1948 году.

Мушу падкрэсьліць, што ў арганізацыі беларускага скаўтынгу на эміграцыі скаўты балтыйскіх краінаў, асабліва латышы, вельмі шмат дапамагалі. Сувязь з латыскімі кіраўнікамі я трымаў яшчэ доўга.

Дадам і такую дэталь. Калі я прыехаў у Амэрыку, шукаў работу і часта заходзіў у бібліятэку – аднойчы я сустрэў там спадара Клэтніекса. Я падышоў, ён мяне пазнаў, вельмі ўзрадаваўся, пацалаваў, старэйшы ўжо чалавек. У ЗША ён займаў пасаду дырэктара бойз-таўну ў Карні (Kearny, NJ). У Амэрыцы ёсьць такое – сіротаў зьбіраюць у бойз-таўны, сіраціцы, дзе хлопцаў вучаць, пасылаюць у школу,

пасьля выхаванцы пераважна ідуць у вайсковыя школы і ўліваюцца ў грамадзтва. Дык ён мне кажа: «Ведаеш, што я пішу? Я пішу працу пра сувязь беларускіх і латыскіх арнамэнтаў!» Ён паходзіў з Латгаліі. Ня ведаю, ці ён закончыў тое дасьледаваньне, бо неўзабаве памёр.

Канец сярэдняй адукацыі

У гімназіі было чатыры выпускі – тры ў старой, да падзелу, а чацьверты – пасьля таго, як гімназію ў 1948 годзе разьвезьлі ў розныя лягеры. Я адвучыўся ў гімназіі сёмую і восьмую клясу і скончыў у сакавіку 1948 году. Скончыў, праслухаў усе належныя курсы і атрымаў дыплём. Такім парадкам, на тое, каб атрымаць сярэднюю адукацыю, мне спатрэбілася аж 13 гадоў, ад 1935 да 1948 году – была вайна, давялося паўтараць клясы з-за розных школаў ды несупадзеньня праграмаў. Але вясною 1948 году ў мяне ў кішэні быў дыплём аб заканчэньні сярэдняй школы.

У асабістым пляне гэта была вельмі дадатная падзея, асабліва таму, што асьвета была здабытая ў беларускай установе – гімназіі імя Янкі Купалы ў Нямеччыне. Словаў няма, я адчуваў сябе моцна ў беларусаведзе і ў вялікай меры заўдзячваю гэта гімназіі. Але разам з тым пляны на будучыню былі невыразныя. Паступіць ва ўнівэрсытэт у той час было ня так проста: ня ўсе ўнівэрсытэты ў Нямеччыне акрыялі пасьля вайны – некаторыя былі зачыненыя. Была вялікая чарга на прыём, ільготы даваліся былым жаўнерам, якія вярталіся з палону, прыходзілі маладыя паваенныя немцы, і чужынцам бяз бацькаўшчыны месца заўсёды было толькі ў канцы чаргі. Аднак, надзея ня траціласа!

Дарога да Цюбінгену

У красавіку 1948 году, праз пару дзён па выпускным вечары 3-е матуры Беларускае Гімназіі імя Янкі Купалы ў Баварыі, дырэктар гімназіі доктар Орса паклікаў мяне ў настаўніцкую ды сказаў, што ёсьць магчымасьць паступіць на Цюбінгенскі Ўнівэрсытэт (стары ўнівэрсытэт у Нямеччыне), хоць для дырэктара і не было ясным, як і хто гэта аформіць. Мяне дырэктар проста спытаў: «Ну, а ты паедзеш?» – «Ясна, што паеду», – адказаў я. Тады ён сказаў, што пагутарыць і зь іншымі выпускнікамі. Пасьля доўгіх перамоваў згадзіліся ехаць у Цюбінген чатыры абітурыенты: Вітаўт Кіпель, Зора Савёнак, Оля Харытончык і Галіна Ганчарэнка.

Але ня ўсё ішло так гладка! Горад Цюбінген знаходзіўся ў французкай акупацыйнай зоне, а мы жылі ў зоне амэрыканскай. Дазволу на пераезд у іншую зону акупацыйныя ўлады не давалі, а вызначаныя міжзонныя межы ахоўваліся як нямецкімі, так і саюзьніцкімі

вартавымі. Таму мяжу трэба было пераходзіць нелегальна. Гэтак мы, даехаўшы да апошняе чыгуначнае станцыі на амэрыканскім баку (здаецца, гарадок Гэрэнбэрг), зьлезьлі зь цягніка і вечарком пешкі пайшлі празь мяжу ў французскую зону.

Ісьці трэба было кілямэтраў 8-10 да першае станцыі ў зоне французскай. Ісьці было невыгодна: мы мелі ладна рэчаў, ішлі напрасткі празь лясочкі й кустарнічкі, а ў гэты час – месяц красавік – зямля ў той мясцовасьці мокрая й чарнюшчая. Мы здорава ўпэцкаліся, было цяжкавата, асабліва цягнуць рэчы, бо адна з нашых сябровак мела не заплечнік, а вялізарную валізку! Але з прыгодамі – той-сёй паваліўся, добра, што мінулі пагранічнікаў – прыйшлі мы ў французскую зону ды вырашылі пехатой дабірацца да Цюбінгену (яшчэ кілямэтраў 6-8), бо баяліся, што можа быць праверка ў цягніку.

У палякі запісацца адмовіліся

Праз гадзінаў 12-15 пасьля таго, як мы вылезьлі зь цягніка ў амэрыканскай зоне, дабраліся да Цюбінгену. Прыйшлі на кватэру спадарства Гэльвігаў, адрас якіх атрымалі ад доктара Орсы. Хутка на той самай кватэры мы сустрэліся і з прадстаўнікамі арганізацыі, якая мелася ўладкаваць нас на ўнівэрсытэт. Выявілася, што гэтая арганізацыя – польская, але ўся квота не запоўнена палякамі, дык кіраўнікі згаджаюцца дапусьціць праз сваю арганізацыю на ўнівэрсытэт і нас як былых грамадзянаў Польшчы. Ведама, што ў той час афіцыйна мы ўсе былі запісаныя як польскія грамадзяне, каб пазьбегнуць выдачы ў Савецкі Саюз. Адразу ж зь месца я й мае сяброўкі заявілі. што раз гэтая арганізацыя польская. мы ў яе ўступаць ня будзем – мы не палякі. Гэткая нашая заява выклікала буру гневу – пасыпаліся эпітэты «совецяжы». «кацапы», «пятая калёна», папрокі, што мы не паважаем аказанага нам даверу. Не прамінулі сказаць, што, калі мы ня ўступім у гэтую арганізацыю, не атрымаем і паёк ад Палёніі, а паколькі мы з амэрыканскай зоны – нелегальныя, дык нас могуць і арыштаваць. Але мы ні на якія пагрозы не зьвярнулі ўвагі, выйшлі з хаты ды пайшлі на вакзал, які ад гэтага часу стаўся нашым домам (хоць трэба было добра лавіраваць, каб не пападацца на вочы паліцыі) . Вырашылі, што раз мы ў Цюбінгене, дык паспрабуем неяк уладкоўвацца самі.

Празь дзень-другі пайшлі ў рэгістрацыйны аддзел унівэрсытэту, дзе нам сказалі, што нямецкая адміністрацыя нічога ня можа вырашыць адносна студэнтаў-чужынцаў, а з гэтай справай трэба зьвяртацца ў вайсковую адміністрацыю. Сустрэўшыся зь некаторымі мясцовымі беларусамі, мы выказалі свой намер пайсьці да французкіх вайсковых уладаў і паспрабаваць атрымаць дазвол на запіс ва ўнівэрсытэт. Землякі палічылі нас за вар'ятаў: «Калі вы пойдзеце да французаў, вас усіх адразу арыштуюць і вывезуць у савецкую зону», – так нас

застрашылі нашыя суродзічы. Ясна, што сытуацыя была нецікавая: мы ня мелі ні памяшканьня, ні харчоў, ні адпаведных дакумэнтаў. І тым ня менш, мы зь дзяўчатамі вырашылі паспрабаваць шчасьця.

Французкі палкоўнік

Ведаючы, куды зьвяртацца, мы паказалі вартавым пры будынку вайсковай адміністрацыі скаўцкія легітымацыі, якія выдаваліся Інтэрнацыянальным Скаўцкім Бюро для ўсяе Заходняе Нямеччыны. Пайшлі мы – я і Галіна Ганчарэнка – да палкоўніка Дзю Банэ (а можа, Дзю Манэ) і выказалі нашую справу. Той выслухаў нас спакойна, сказаў, што справа няпростая, мы для яго – нелегальныя чужынцы і павінны быць адразу выдаленыя з французкай зоны, але пакольк мы хочам вучыцца ва ўнівэрсытэце, ён нам дазволіць сустрэцца з вышэйшым начальствам.

Празь дзень, гэтым разам ужо я сам адзін (дзяўчаты вырашылі, што ім будзе лягчэй нешта рабіць, калі б мяне затрымалі!) пайшоў да іншага француза-палкоўніка, які наглядаў за сыстэмай вышэйшае адукацыі ў французкай зоне. Палкоўнік сустрэў мяне ветліва, адразу спытаў, на якой мове будзем гаварыць (у маім моўным багажы ў той час была толькі адна нямецкая мова з заходніх моваў), і я пачаў сваё апавяданьне. Я расказаў яму пра Беларусь, паказаў кнігу Энгельгарта (гэтую кнігу я гадоў пяць вазіў у сваім заплечніку), вытлумачыў, чаму мы не вяртаемся на бацькаўшчыну (адно зь першых ягоных пытаньняў да мяне было – ці ўсё ж я ня думаю вярнуцца ў Савецкі Саюз?), ды асабліва падкрэсьліў, што нам важна здабыць асьвету на Захадзе і служыць Беларусі.

Гэтаксама, вёў я, нам, беларусам, патрэбныя свае арганізацыі, а таму, у выпадку нашае рэгістрацыі на ўнівэрсытэце, мы хацелі б мець беларускую студэнцкую арганізацыю. Гэтыя мае словы як бы ўзарвалі палкоўніка. Ён рэзка павярнуўся, ускінуўся ды разьюшана выпаліў: «Што гэта вы сабе думаеце! Нелегальныя грамадзяне ў французкай зоне просяць зарэгістравацца на ўнівэрсытэт ды яшчэ – проста нахабства – хочуць стварыць новую арганізацыю. Гэта нечувана!» – крычаў палкоўнік. Я ж спакойна яму паясьніў, што ня лічу нахабствам, калі нечага прашу. «Вы мне проста можаце адмовіць, аднак я яшчэ раз хачу падкрэсьліць, што раблю гэта з нацыянальнага абавязку, а не для задавальненьня асабістых патрэбаў». Пачуўшы мой спакойны тон, палкоўнік, здалося мне, неяк суцішыўся. А ў маёй галаве думкі скакалі, як у калейдаскопе: «Што рабіць, калі ён зараз пакліча варту й мяне арыштуюць?! Уцякаць няма куды, я – у памяшканьні вайсковай адміністрацыі». Асабліва я напужаўся, калі палкоўнік, ня кажучы мне ні слова, зьняў тэлефонную трубку, глянуў на мяне ды пачаў набіраць нейкі нумар. «Ну, думаю, хана ...

« Відаць, мой твар выказваў вялізарнае занепакаеньне, бо палкоўнік зрабіў нейкі адчэпна-заспакаяльны жэст – маўляў, ладна, сядзі...

І тое, што ён пачаў гаварыць у тэлефон, ашаламіла мяне. Я не хацеў верыць сваім вушам. Палкоўнік некаму сказаў, каб мяне прынялі і выканалі маю просьбу. Дарэчы, гутарка палкоўніка зь некім адбывалася таксама па-нямецку. Я быў на дзясятым небе. Хацелася сардэчна паціснуць гэтаму французу руку, але я сядзеў, не адважваючыся нічога сказаць. Павесіўшы трубку, палкоўнік растлумачыў мне, што ён гаварыў з канцылярыяй віцэ-рэктара, сказаў, каб я туды адразу ішоў – нашая просьба будзе задаволеная. Ён нават не дазволіў мне выказаць словы ўдзячнасьці, перабіў мяне і заўважыў, што ён адступіў ад правіла, бо яму здалося, што я гаварыў шчыра. Ён, сапраўды, мог у гэтым не сумнявацца. І мая гутарка, і паводзіны ўсіх нас – Галіны, Зоры, Олі – кіраваліся толькі адным – быць карыснымі беларускай справе. І ўсё, што мы рабілі, было шчырае.

Мы – студэнты

Далейшы ход падзеяў быў просты (праўда, я на хвілінку завагаўся: ці знайсьці на станцыі дзяўчат і сказаць ім навіну, ці ісьці адразу ў канцылярыю віцэ-рэктара). Вырашыў, што скажу пазьней, залагодзіўшы ўсе справы. Я прыйшоў да віцэ-рэктара, запісаў нашыя прозьвішчы, запоўніў патрэбныя анкеты і падаўся на вакзал шукаць дзяўчат. Празь некалькі дзён на галоўнай адміністрацыйнай дошцы зьявілася паведамленьне, што пры ўнівэрсытэце зарэгістраваная новая арганізацыя – Беларускае Студэнцкае Згуртаваньне. Былі таксама афармленыя нашыя ўнівэрсытэцкія дакумэнты, і на наша найбольшае задаваленьне (да нейкай ступені зьдзіўленьне) у нашых «аўсвайсах» (мы іх і цяпер захоўваем) нават нашая дзяржаўная прыналежнасьць была запісаная як «вайсрутэнішэ» – беларуская! Гэтак мы пачалі студэнцкае жыцьцё.

Гэта было ў красавіку 1948 году. Зімовы сэмэстар цягнуўся ад студзеня да красавіка, а ад красавіка 5-6 тыдняў скандэнсаванага навучаньня – гэта быў летні сэмэстар, а ўжо ў верасьні пачынаўся восеньскі – усяго тры сэмэстры.

Напачатку ва ўнівэрсытэце было досыць цяжка, бо не было памешканьня, не было дзе начаваць, начавалі на вакзале. Наш юрыдычны статус жыхароў амэрыканскай зоны ўнівэрсытэцкае кіраўніцтва не хваляваў, праблема была толькі з французскімі вайсковымі ўладамі. Але тут якраз гэтыя ўлады далі загад унівэрсытэту нас прыняць, дык неяк выкручваліся.

Жылі мы – прынамсі былі прапісаныя – у горадзе Гэрэнбэргу, у амэрыканскай зоне, за 22 кілямэтры ад Цюбінгену. Часам хадзілі ў Гэрэнбэрг, а часьцей начавалі сям-там у французскай зоне.

Мы бралі ўдзел у колькіх міжнародных студэнцкіх імпрэзах-вечарох, я ад нашае групы быў на зьезьдзе ў Марбургу (канец травеня 1948 году), а пазьней, восеньню 1948 году, паколькі мы дзейнічалі як самастойная арганізацыя, дамагліся ад унівэрсытэту памяшканьня для служэньня беларускіх праваслаўных службаў айцом Сьцяпанам Войтанкам. К таму часу разам з намі ўжо былі Валодзя Жаромскі, Янка (Яніна) Калюцік і іншыя студэнты. У канцылярыі мне сказалі, што ёсьць яшчэ адна студэнтка-беларуска – Надзя Юрэвіч.

Навука ў Цюбінгене стаяла вельмі высака: мы наведвалі лекцыі фізыкі ў прафэсара Косэля, аднаго з бацькоў актэтнай тэорыі структуры ядра, хімію выкладаў прафэсар Віціг, выдатны нямецкі хімік, слухалі іншых, ня менш знакамітых навукоўцаў.

Гісторыя з капліцай

Як толькі мы зарэгістраваліся ва ўнівэрсытэце, далучылася да нас адна беларуска, якая была зарэгістраваная ва ўнівэрсытэце – Янка Калюцік, былая кіраўніца СБМ. Цікава, як мы зь ёй сустрэліся. Аднойчы, седзячы на лекцыі, яе пазнала Зора, у перапынку падышла да яе, і я бачу, як яны цалуюцца! Яны былі разам у СБМе на кіраўнічых курсах. «А Зорачка, а дзе ты жывеш?» – «Мы жывем на станцыі, бо няма дзе...» – «Дык прыходзьце да нас, у нас ёсьць кватэры, часам можна будзе і паесьці». Так мы да Янкі Калюцік і хадзілі – то паспаць, то памыцца, то паесьці. А калі дзяўчаты выехалі, я ўсё роўна хадзіў да Янкі Калюцік – яна была выдатным сябрам.

Аднойчы Янка мне кажа: «Да мяне прыйдзе доктар Войтанка». – «А хто такі Войтанка?», пытаюся я. – «А гэта беларускі дзяяч». Прыходзіць доктар Войтанка, а зь ім сьвятар, і кажуць: «Мы бачылі на дошцы, што пры ўнівэрсытэце зарэгістраванае нейкае беларускае студэнцкае згуртаваньне». Я кажу: «Так, ёсьць». Тады доктар Войтанка кажа: «Ведаеце што, вы маеце права пайсьці да віцэ-рэктара і папрасіць дазвол, каб далі капліцу». Я пытаюся: «Якая капліца? Што вы хочаце ад мяне? Ведаеце, мне трэба здаваць экзамэны, дзяўчаты выехалі, я цяпер адзін. Адзіныя, хто мяне тут падтрымоўвае – гэта студэнт Валодзя Жаромскі і Янка Калюцік. Яны з французскай зоны, ідзіце вы да іх». – «Не, не, мы хочам таго, хто гэтае студэнцкае згуртаваньне рэгіструваў». – «А што вы хочаце?» – «Мы хочам, каб вы атрымалі дазвол мець капліцу». – «А што такое капліца?» – Ну, яны мне нарэшце растлумачылі, што такое капліца – гэта каб мець там службы. «А што такое службы?», зноў пытаюся я. – «Ну, гэта калі сьвятар служыць...» Ах, так... Ну але калі гэта нешта беларускае, а яшчэ ў дадатак Янка Калюцік просіць – бо ад мяне справа залежыць, я падчас рэгістрацыі даў свой подпіс – дык трэба справу зрабіць.

І я думаў: во, брат, папаўся! Я ж ня ведаю нічога абсалютна ў царкве, ні ў чым не арыентуюся. Што мне рабіць? Хоць ты ўцякай. Бо ісьці прасіць неяк ня хочацца, калі ня ведаеш чаго прасіць. Урэшце, думаю, ладна. Пайшоў я зноў да віцэ-рэктара, дайшоў да сакратарак, растлумачыў ім, а яны мне кажуць, што гэта можна, і мамэнтальна пішуць паперачку: эвангелішэ кірхэ, вайсрутэнішэ дынст і ўсё такое. Іду я да Янкі Калюцік і кажу: на табе гэтую паперачку, аддай яе таму доктару, і на гэтым канец.

На першую службу прыйшло чалавек пятнаццаць – «православные города Тюбингена» – але ў часе багаслужбы доктар Войтанка сказаў, што гэта будуць беларускія царкоўныя службы, што адрадзілася Беларуская Царква (за год да таго быў сабор у Канстанцы). І так гэтая каплічка ў Цюбінгене стала адным зь першых месцаў для беларускіх набажэнстваў. Яны служылі там раз на месяц, даволі доўга – я ўжо выехаў, а беларусы яшчэ там адпраўлялі набажэнствы.

У Беларускае студэнцкае згуртаваньне Цюбінгенскага ўнівэрсытэту ўступіла пазьней студэнтка Юрэвіч, Жаромскі, Дубовік, іншыя – згуртаваньне агулам налічвала чалавек дванаццаць.

Калі я прыпамінаю той час, у мяне склалася ўражаньне, што за рэлігійнай актыўнасьцю БАПЦ найбольш стаяў нават ня доктар Віктар Войтанка, а беларус Міхаіл Шчурка, які ў Цюбінген прыяжджаў з гарадку Ройтлінген. Пры багаслужбах спадар Шчурка быў дзякам. Адзін раз пасьля багаслужбы ён кажа: «Усе студэнты, якія сёньня прысутнічалі ў капліцы, могуць да мяне прыехаць на абед». Ён жыў за 12 кілямэтраў ад Цюбінгену, і ўсе студэнты, якія там былі, да яго паехалі, і Шчурка зладзіў шыкоўны абед. Быў гэта вельмі патрыятычны чалавек, без высокае адукацыі, але разумны і адданы беларускай справе. Пазьней ён эміграваў у Аўстралію і працаваў там сярод беларусаў на рэлігійнай ніве.

Грашовая рэформа ў Нямеччыне

Нашую дзейнасьць спаралізавала грашовая рэформа, хоць я і прабыў на ўнівэрсытэце да красавіка 1949 году, а дзяўчаты павыяжджалі раней. Наступным нашым студэнцкім этапам – на даўжэйшыя гады – стаўся ўнівэрсытэт у Лювэне.

У тым часе якраз прайшла грашовая рэформа – Währungsreform. Дзяўчаты – Харытончык, Савёнак і Ганчарэнка – вырашылі, што яны атрымаюць 40 марак, якія давалі ўсім у дзень уступленьня рэформы ў сілу, у лягерох. А я атрымаў іх у Цюбінгене і застаўся сам. З новымі маркамі было крыху лягчэй, бо літаральна на другі дзень у магазынах можна было купіць што ты хочаш. Перад гэтым усе магазыны былі пустыя, а калі нешта прадавалася, то было вельмі дорага. Гра-

шовая рэформа чэрвеня 1948 году ўзмацніла нямецкую марку. Ад гэтага мамэнту пачалося нямецкае эканамічнае адраджэньне.

Дзяўчаты атрымалі маркі ў лягерох (бо і «дыпісы» мелі права на тыя грошы) і вырашылі ўжо ў Цюбінген не варочацца – падавацца на эміграцыю: Ганчарэнка і Харытончык у Амэрыку, а Зора запісалася ў Бэльгію. У беларускім эміграцыйным друку зьявілася паведамленьне, што ў Бэльгіі, у Лювэне, ёсьць унівэрсытэт, куды могуць падаваць заявы і былыя савецкія грамадзяне – рускія, украінцы і беларусы. Зора спыталася ў лягернай адміністрацыі, і ёй сказалі, што ў Лювэне ёсьць Беларускае студэнцкае згуртаваньне, і Зора адразу ўзяла кірунак на Лювэн.

Я застаўся ў Цюбінгене сам

Я застаўся ў Цюбінгене. За гэты час – у траўні 1949 году – беларускі лягер зь Міхельсдорфу перавялі ў Бакнанг каля Штутгарту, за 40 км ад Цюбінгену. Мне стала значна лягчэй з харчамі, па якія я пад'яжджаў у беларускі лягер.

Вучыўся я на мэдыцынскім факультэце. Я хацеў паступіць на геалёгію, яна мяне прыцягвала зь дзяцінства – я бачыў геолягаў яшчэ ў Налінску, шмат чытаў пра геалёгію папулярныя кнігі акадэміка Ферсмана ды іншых аўтараў – я адчуваў і зацікаўленьне прадметам, і нейкую рамантыку. У Цюбінгене быў геалягічны факультэт, але пасьля вайны ён ня быў дзейны. Хімічны факультэт быў перапоўнены, а адзіны факультэт, дзе былі месцы, быў мэдыцынскі. Я запісаўся на мэдыцыну з тым, каб браць прадметы толькі такія, якія будуць патрэбныя для хіміі ці для геалёгіі.

Праслухаўшы два сэмэстры і зрабіўшы лябараторныя практыкі, я пачаў рыхтавацца да форфізыкуму (экзамэн для студэнтаў пасьля двух сэмэстраў, фізыкум – пасьля двух гадоў). Я хацеў здаць хімію і фізыку, бо чыталі гэтыя прадметы ведамыя прафэсары, была добрая практыка. Але ва ўнівэрсытэце настала невыразная сытуацыя – сказалі, што на хімічны факультэт набору ня будзе яшчэ гады два, а калі адчыніцца геалягічны – наагул невядома. Выглядала, што давядзецца заставацца на мэдыцыне, а быць мэдыкам я ніяк не плянаваў. Тым часам Зора напісала ліст з Бэльгіі, што ў Лювэне яшчэ квота не запоўненая. Я напісаў ліст студэнцкаму згуртаваньню ў Бэльгію, і мне адказалі: так, яшчэ два-тры месцы ёсьць, калі я прыеду да ліпеня 1949 году, то яны мяне запішуць на восеньскі сэмэстар 1949–1950 гадоў.

Я махнуў рукой на экзамэны ў Цюбінгене, у Амэрыку ехаць я ня думаў – і вырашыў, што паеду ў Бэльгію. Заехаў у Бакнанг, разьвітаўся з бацькамі, узяў дзьве-тры кашулі, якія былі, і паехаў у Бэльгію.

Разьвітаньне зь Нямеччынай

У сярэдзіне чэрвеня 1949 году я вырашыў не здаваць экзамэны, якія меліся быць у сярэдзіне ліпеня. Бо калі б я іх ня здаў, мне было б ужо ў Бэльгію ехаць позна, дакумэнты трэба было падаць у пэўны тэрмін, а я ж і на выезд у Амэрыку не запісаўся, а час запісу на выезд у Амэрыку скончыўся. Так я вырашыў ехаць у Бэльгію.

Настрой быў непрыемны. У Нямеччыне я ўжо быў асвойтаўся, у Амэрыку ехаць зусім не хацелася, абсалютна. Я лічыў так: у Нямеччыне будзе цяжка, бо там у той час эканоміка толькі пачынала адраджацца, усё яшчэ было разьбітае, ляжала ў руінах, беспрацоўе поўнае, варочаюцца дзесяткі тысяч палонных. Але веданьне краіны і мовы былі тымі фактарамі, якія гаварылі за тое, каб заставацца ў Нямеччыне.

Бэльгія, што праўда, давала больш упэўненасьці. Як выглядала зь перамоваў зь Беларускім студэнцкім згуртаваньнем у Бэльгіі, навука ў Бэльгіі забясьпечвалася поўнасьцю пры ўмове пасьпяховай здачы экзамэнаў. Не гарантавалася, але пазытыўна сьцьвярджалася, што пасьля студыяў у Бэльгіі можна будзе атрымаць працу. Ну і ў Бэльгію паехала вучыцца Зора, на якую я ўжо сур'ёзна заглядаўся. Такія былі асноўныя фактары, якія мяне пераканалі і схілілі мой выбар на карысьць Бэльгіі.

Прыехаў я зь Цюбінгену ў Бакнанг, дзе ў беларускім лягеры жылі бацькі. Выклаў я бацькам свае пагляды – яны, ясна, цалкам згадзіліся, і тады засталося выпісацца зь лягеру. Аб гэтым я таксама пагутарыў з камэндантам лягеру Барысам Шчорсам, зь якім я блізка і выдатна супрацоўнічаў на ўсіх грамадзкіх дзялянках. Ён вырабіў мне вайсковы білет – ён як камэндант меў блянкі вайсковага ведамства. Усё было аформлена, і ў канцы чэрвеня 1949 году скончыўся мой жыцьцёвы этап побыту ў Нямеччыне.

Апошняе разьвітаньне зладзілі мне скаўты. Праўда, у Бакнангу было ўжо няшмат тых, з кім я пачынаў працу ў скаўтынгу, бо лягеры былі расфармаваныя і шмат маіх сяброў выехала ў Розэнгайм. Але ў Бакнангу яшчэ былі Уладзімер Пеляса, Тамара Карповіч, Сяргей Кайка, Ваня Заруцкі, быў там таксама Палікарп Манькоў, а таксама шмат маладзейшых скаўтаў.

Разьвітаньне было ў скаўцкім стылі: вогнішча, мастацкая частка, успаміны – вясёлыя гісторыйкі. Мне падаравалі вышыты скаўцкі гальштук, Пеляса недзе купіў скаўцкі капялюш, падаравалі мне таксама ўсе скаўцкія часапісы, якія да таго часу былі надрукаваныя. Было вельмі цёплае, шчырае разьвітаньне – сапраўды, з гэтай грамадой я правёў разам апошнія чатыры гады – 1945–1949. Зь некаторымі зь іх я сустрэўся пазьней у ЗША, а зь некаторымі мы рассталіся назаўсёды.

Еду ў Бэльгію

Падарожжа ў Бэльгію заняло дня паўтара. Нічога цікавага не было. Нямеччына яшчэ ляжала ў руінах, былых жаўнераў у старых, падраных уніформах было паўнютка на станцыях, у вагонах. Праўда, жабракоў не было, але беднасьць, беспрасьвецьце адчуваліся на кожным кроку.

На нямецка-бэльгійскай мяжы вобшук быў досыць пільны – кантрабанда ў тыя часы квітнела, а можа была і ў самым зэніце. Абшуквалі ня толькі багаж (заплечнік), але і вопратку, і чаравікі. Доўга разглядалі дакумэнты, фотакартку. Але ў мяне ўсё было ў парадку. Калі пераехалі мяжу, я пачаў чытаць назвы станцыяў, каб не прапусьціць Лювэн.

Праз гадзіны дзьве ў цягніку гляджу ў акно і бачу: праяжджаем Лювэн, а цягнік не спыніўся і едзе далей! Даехаў я да Брусэлю і думаю: як жа мне цяпер ехаць назад у Лювэн? Грошай ні капейкі няма. А я ўжо па-французску крыху слоў знаў – Арсеньнева некалі вучыла, і я меў падручнік з сабой, заўсёды ляжаў у рукзаку. Я пачаў пытацца – які наступны цягнік ідзе на Лювэн? Мне растлумачылі. Я думаю: сяду на цягнік, даеду да Лювэну, а там будзем бачыць. Даехаў я да Лювэну, а там, як у Эўропе, трэба білет паказваць і пры выхадзе з пэрону. Бачу я – там жалезны плот, думаю: пайду ўздоўж плоту і недзе выйду, бо білета ў мяне няма. Так і зрабіў, такім парадкам мой першы ўезд у Лювэн быў безьбілетны.

***

У чэрвені 1949 году закончыўся мой пэрыяд жыцьця ў Нямеччыне. Пражыў я ў гэтай краіне ад ліпеня 1944 да чэрвеня 1949 году. Як я гляджу на пражыты ў Нямеччыне кавалак часу?

Нацыстоўскія часы – ад ліпеня 1944-га да травеня 1945-га – я б акрэсьліў як часы выжываньня, клопату над тым, як паесьці, дзе пераначаваць, каб ня трапіць пад бамбёжку, асьцярожнасьці да немцаў. Тады я пачаў разумець і спачатку дзівіўся: немцы амаль нічога ня ведаюць пра Беларусь – заўсёды і паўсюдна трэба тлумачыць пра сябе і сваю краіну. Мне гэта здавалася вельмі дзіўным і незразумелым.

Паваенныя гады ў Нямеччыне – ад травеня 1945-га – я ўважаю для сябе як пэрыяд вучэньня, дынамічнага жыцьця. Я вучыўся і скончыў беларускую школу, здабыўшы ў ёй добрыя веды пра Беларусь. Пачаў пазнаваць шырокае беларускае грамадзтва – арганізоўваў моладзь, увайшоў у беларускі палітычны, незалежніцкі рух. Карыстаючыся бібліятэкамі, маючы шырокія кантакты зь небеларусамі, я пераканаўся, што грамадзтва на Захадзе ня ведае Беларусі,

а таму – колькі будзе магчымасьці – трэба будзе Беларусь прапагандаваць, даносіць да грамадзтва інфармацыю.

Выяжджаў я зь Нямеччыны з дваякім пачуцьцём: зь лёгкай настальгіяй па ведамым і знаёмым і зь невытлумачальнай асьцярожнай боязьзю перад будучыняй у ненямецкім сьвеце.

Бэльгія

Першы кантакт зь беларусамі

Выйшаў я з тэрыторыі вакзалу – і я ў Лювэне! Сабраўшы ў купу ўсе мае веды французскай мовы, пачаў распытвацца, як прайсьці да пляцу Гувэра. Выявілася, што і мае веды мовы не былі такія благія, і пляц Гувэра ад вакзалу быў недалёка.

Падыходжу пад дом №8, стукаю. Адчыняе дзяўчына брунэтка. Пытаюся: «Ці гаворыце вы па-беларуску?» – «Так, -кажа, – я – Зоя Жалязоўская, студэнтка. А вы?» А я кажу, што я студэнт-пачатковец Вітаўт Кіпель, прыехаў зь Нямеччыны. Студэнтка прыветліва ўсьміхнулася, сказаўшы нешта накшталт: «Ага, новыя прыяжджаюць! Выдатна, мы якраз сьнедаем. Заходзьце, будзьце як дома!» І праз даўгі калідор павяла мяне на тэрасу-дворык. Там за досыць вялікім сталом сядзела 5-6 чалавек, якім я голасна прадставіўся. Назвалі і яны сябе, але я ніводнага прозьвішча не ўхапіў, бо нікога з там прысутных ня ведаў. Наагул, калі не лічыць пару беларускіх студэнтаў у Цюбінгене, я з студэнтамі і беларускімі студэнцкімі арганізацыямі быў мала знаёмы, бо працаваў у іншай дзялянцы – з моладзьдзю ды «шырокай» публікай. Праўда, у травені 1949 году я быў на студэнцкім зьезьдзе ў Марбургу і там пазнаёміўся з Барысом Рагулем і Янкам Жыткам і спадзяваўся, што зь імі сустрэнемся ў Лювэне.

Мяне запрасілі за стол. Упершыню за доўгія гады ніхто не абмяжоўваў – колькі лустаў хлеба ці булачак можна зьесьці! Пачалася гаворка аб штодзённым: дзе спаць, калі рэгістравацца. Сказалі, што ёсьць адно вольнае памешканьне, але там цяпер чалавек сьпіць – яны пусьцілі туды аднаго паляка, дык мне давядзецца жыць зь ім. Пакой быў на першым паверсе, там жыў польскі студэнт Збышак.

Такі быў мой першы кантакт зь Беларускім домам і беларускімі студэнтамі. Праз пару дзён мяне паклікаў Рагуля і спытаўся, што я думаю студыяваць. Я сказаў, што першае – я буду вучыцца мовы, трэба французскую падагнаць. А па-другое, як я пісаў раней – я хацеў паступіць на геалягічны факультэт, бо мяне даўно прыцягвала геалёгія. Ён сказаў, што трэба падаць патрэбныя паперы, выканаць фармальнасьці. І яшчэ сказаў, што ў той вечар у Лювэн меўся прыехаць старшыня Саюзу Беларусаў Бэльгіі спадар Уладзюк Рыжы,

і ён мяне зь ім пазнаёміць. Бо ва ўнівэрсытэце ўсе былі занятыя экзамэнамі, а Рыжы быў свабодны – ён ехаў з Рыму і нейкі час меўся пабыць у Лювэне. Рагуля кажа: «Рыжы вас увядзе ў курс лювэнскай і бэльгійскай рэчаіснасьці».

З Уладзюком Рыжым па Бэльгіі

Увечары мяне пазнаёмілі з Уладзюком Рыжым – першае ўражаньне аб ім было невыразнае: высокі чалавек з бародкай, выглядае паміністэрску, носіць камізэльку, трошкі картавіць. Ён кажа: я табой заапякуюся. Я – былы старшыня Саюзу Беларусаў Бэльгіі, але ўжо год, як я выехаў, і цяпер няма старшыні, дык трэба рыхтаваць сход. Мы будзем езьдзіць разам з табой па Бэльгіі і адведваць беларускія асяродкі». Я кажу, што мне трэба вучыцца, а ён на тое – навука не ўцячэ! Мне такая гутарка не была даспадобы, але я падумаў: нічога, буду асвойваць мову.

Рыжы даў мне асноўную інфармацыю пра Бэльгію – лад, праблемы, а таксама расказаў пра ўнівэрсытэт. Я спытаўся ў Рыжага, дзе знаходзіцца горад Намюр, там жыла Зора, якая прыехала ў Бэльгію раней і прыслала мне з Намюру пару лістоў. Расказаў Рыжы і пра Намюр, і як туды даехаць. «Аднак да Намюру мы з табой паезьдзім па іншых мясьцінах», – закончыў Уладзюк Рыжы амаль пяцігадзінную першую гутарку.

Назаўтра Рыжы кажа, што дамовіўся зь беларускім работнікам, ён нас будзе чакаць і давязе грузавічком у Брусэль, а далей мы паедзем аўтастопам на поўдзень – гэтак я ўпершыню езьдзіў аўтастопам. Найперш мы паехалі ў горад Шарлеруа, там зрабілі зборку – была субота, прыйшло можа якіх 50 беларусаў, што працавалі на шахтах. Зборка была вельмі жвавая. Рыжага, як выглядае, усе ведалі, ён шмат расказваў. Выбралі новае кіраўніцтва аддзелу – кіраўніком быў Хмара. У яго цікавая біяграфія. Ён быў у польскім войску, у 1939 годзе трапіў у палон і як палонны працаваў шахцёрам у Данбасе. Калі прыйшлі немцы, яго як былога палоннага перавезьлі працаваць на шахты ў Бэльгіі. Такім парадкам Хмара ў Бэльгіі быў старажыл і быў добры арганізатар – беларускі аддзел у Шарлеруа быў найбольшы.

У Бэльгіі чатыры вугальныя басэйны – Шарлеруа, Монс, Льеж і Лімбург, у кожным, як мне казалі, па некалькі соцень шахтаў, і на шахтах працавалі нашы людзі. Пераважная большасьць прыехалі ў 1947 годзе і працавалі па кантрактах. Калі першыя кантракты канчаліся, можна было заключаць новыя – ці на шахтах, ці ў іншых галінах прамысловасьці. Таксама па сканчэньні кантракту работнік меў права выехаць з краіны, што бальшыня беларускіх работнікаў і зрабіла – яны перабраліся ў ЗША ці ў Канаду. Прыпушчаю, што ў Бэльгіі засталося ня больш за сотню работнікаў. Маё знаёмства зь

беларускімі работнікамі ў Бэльгіі пачалося ад паездак па шахцёрскіх асяродках.

Так я з Уладзюком Рыжым некалькі тыдняў езьдзіў па Бэльгіі. Мы зь ім нядрэнна пасябравалі, хоць ён – ня мой тып, трошкі авантурнік. Вось прыклад. Прыехалі мы ў Льеж, ён кажа, што ў Льежы шмат работнікаў – каля 100 чалавек, зробім сходку. «Але, – кажа ён, – перад тым я думаю, як бы купіць дом для беларусаў. Давай зойдзем у адно бюро, і я буду зь імі таргавацца. І скажу, што ты – мой сакратар». – «А калі ў цябе нешта запытаюцца?» – «Ты маўчы і нічога не кажы. А я буду ўдаваць, што я з царскай сям'і Раманавых – інакш са мной гаварыць ня будуць...» Я думаю: гэта ж авантурніцтва! Але я маўчаў.

Прыехалі мы ў Льеж і перад тым, як ісьці на сход, зайшлі ў тое бюро. Рыжы кажа, што ён зь сям'і Раманавых і хоча паглядзець пару дамоў, якія прадаюцца, бо хоча набыць маёмасць для арганізацыі. Пахадзілі мы па тых аб'ектах, ясна, цэны там былі мільённыя. А Рыжы вельмі спакойна кажа прадаўцам: «Гэта нам не па кішэні!» Так задума набыць маёмасьць у Бэльгіі для Саюзу Беларусаў у Бэльгіі і засталася нерэалізаваная.

Рыжы прабыў у Бэльгіі гэтым разам да красавіка 1950 году. Я зь ім паезьдзіў вельмі шмат – працавалі, дапамагалі работнікам. Езьдзілі мы найбольш аўтастопам, але часам і веласіпедамі. Праўда, Рыжы быў купіў матацыклет, але адразу ж і прадаў яго, бо даводзілася шмат той матацыклет рамантаваць.

Праца ў мадам Тусэн

Пасьля аднае з паездак мяне сустрэў у сталоўцы Барыс Рагуля і кажа: «Калега, ёсьць праца». У адной фэрмэркі, дзе працуюць ужо два ці тры беларусы, ёсьць пяцьдзясят кароў, якіх трэба даіць, а чалавек, які доіць, захварэў, і трэба сьпешна знайсьці яму замену. Я кажу, што я ж ня ўмею! (Хоць адразу прыпомніў, што некалі ў Менску даіў і кароў, і козаў.) «Нічога, – кажа Рагуля, – вас навучаць. Там добрая плата – 50 франкаў за дзень». Для мяне тады гэта былі вельмі вялікія грошы, бо я ня меў нічога. Напрыклад, праезд у Льеж каштаваў 10 франкаў, а тут – 50 франкаў і на ўсім гатовым... «О, – кажу, – я адразу паеду пагляджу, што там у яе...»

Назаўтра я прыехаў у Льеж, а адтуль да фэрмы Вэрлен яшчэ 12 кілямэтраў, дык я пайшоў пешкі, бо шкадаваў траціць грошы на трамвай. Прыйшоў я да фэрмэркі – мадам Тусэн – пад вечар. А яна мне кажа – хадзем адразу даіць, мы тут доім толькі машынамі. Я табе, кажа, пакажу, ты ня бойся, заўтра табе трэба будзе іх выганяць. Яна ўзяла адмысловы апарат – кацёл, а ў ім чатыры дзіркі з гумовымі штэпсэлямі, падключаеш трубу, дзіркі падключаеш да вымя, і трубкі

выцягваюць малако – мэханіка даволі простая. Мадам Тусэн мне паказала што і як, і назаўтра я ўжо з гэтым працаваў.

Раніцай а 4-й гадзіне я мусіў выгнаць каровы на пашу, каля 11-й прыгнаць назад, падаіць, тады зноў на пашу, а ўвечары а 6-й прыгнаць і падаіць зноў. Надоіш дваццаць літраў – трэба выліць іх у 50-літровы бідон, а затым у цыстэрну, а тады малако з цыстэрны забірае прамысловец, які малако перарабляе ў масла. Так я «спасьцігнуў» новую прафэсію… Мадам Тусэн мне сказала: «Я доўга чакаць ня буду – на табе 100 франкаў на пачатак, а я табе буду плаціць 75 франкаў на дзень». Я думаю, Божа ты мілы, я б і за палавіну пагадзіўся. Я ёй вельмі дзякаваў і, ясна, падумаў, што я з такімі грашмі не прападу.

Назаўтра гаспадыня пазнаёміла мяне з двума беларусамі, якія там працавалі – гэта былі Мікола Шуст і студэнт Міхась Жылік.

Міхась Жылік пасьля закончыў унівэрсытэт у Лювэне, працаваў у шпіталях у Бэльгіі, а потым перабраўся ў ЗША. У Злучаных Штатах рабіў кар'еру ў войску – вайсковы доктар, даслужыўся да чына палкоўніка, выйшаў на пэнсію. Чамусьці парваў дачыненьні зь беларускіх рухам – беларусаў не цураўся, але ў грамадзкай дзейнасьці ўдзелу ня браў.

Затое Мікола Шуст, зь якім мяне пазнаёміла мадам Тусэн, зь беларускім рухам застаўся на ўсё жыцьцё. Больш таго – будучы добрым умельцам, майстрам інкрустацыі саломкай, выдатна прадстаўляў Беларусь на выстаўках у Канадзе і ў ЗША. Мы зь ім блізка сябравалі. Вось як бывае ў жыцьці. Чалавек атрымае асьвету пры дапамозе беларусаў, а потым губляецца. А іншы без адукацыі, селянін з глухое правінцыі – і столькі зробіць для пашырэньня ведаў пра Беларусь.

Гэтак нас трох беларусаў, у дадатак да 12 іншых работнікаў, працавалі ў мадам Тусэн. Калі пачаліся заняткі ва ўнівэрсытэце, то я быў Лювэне, прыехаў туды і Жылік, а празь месяц-два беларускія студэнты забралі ад мадам Тусэн у Лювэн і Міколу Шуста, запрапанаваўшы яму быць кухарам у Беларускім студэнцкім доме.

Каровы, трактар, Марыя

Мая сялянская кар'ера разьвівалася досыць проста: я выганяю каровы, прыводжу, кармлю іх, адводжу на луг, зноў прыводжу і даю. Аж адзін дзень мадам Тусэн мяне чакае і кажа: «Ты думаеш ісьці ва ўнівэрсытэт? Кінь гэта. Ты бачыў маю дачку Марыю? Жаніся адразу! Сын Боб ужо мае сваю дзеўку, а Марыя нікога ня мае. Ня будзь дурнем, жэніся – і фэрма твая!» Я аслупянеў ад такой прапановы і, саромеючыся, адказаў мадам Тусэн гэтак: «Слухайце, я толькі прыехаў…» А яна мне: «Я цябе не выганяю, ты вельмі падабаесься Марыі, дык добра падумай, каб жаніцца. Ты так хутка навучыўся

даіць і даглядаць за каровамі – ты будзеш добра весьці гаспадарку». І мадам Тусэн пайшла, а ў мяне сапсуўся настрой – мне гэтая гутарка не падабалася.

Прыйшоў я спаць у цяжкім настроі – нам былі адведзеныя добрыя пакоі – і кажу Мішку Жыліку: «Жылік, мадам Тусэн мне прапаноўвае жаніцца, браць Марыю!» – «І што ты ёй сказаў?» – «Я нічога не сказаў, кажу, што толькі-толькі пачаў». А тая Марыя была нічога, прыгожая, але ніхто ж ня думаў! І Жылік мне кажа: справа ня надта прыемная, але ты проста скажы, што пра жаніцьбу яшчэ ня думаеш.

Пасьлязаўтра мадам Тусэн зноў у мяне пытаецца: «Слухай, Віктор, ты не прапускай мамэнт – глядзі, якая ў мяне гаспадарка, а я ж сама!» Яе мужа ў часе вайны забілі немцы. Яна арандуе зямлю – каля 200 гектараў, з гэтай зямлі трохі засеяна, мае пяцьдзясят кароваў, здае малако на выраб спэцыяльных сыроў і прадае іх. Словам – жыве з гаспадаркі. Сама зямля ня ейная, а нейкага барона, які жыве за паўтара кілямэтра, а цяпер наагул у Швэйцарыі. У яе дачка і сын, дык яна сватае дачку як толькі можа. Урэшце пасьля некалькіх маіх адмоваў, мадам Тусэн кажа: «Ты падумай. Я табе больш ня буду казаць. А пакуль так: з каровамі ты ўжо ўмееш, дык заўтра цябе навучаць езьдзіць на трактары, і нам трэба будзе скасіць ячмень». Ячменны пасеў у мадам Тусэн быў спэцыяльны пад наглядам аддзелу сельскай гаспадаркі, а таму ўвесь ураджай трэба было здаваць.

Назаўтра я прыходжу на кавалак поля, куды яна сказала, а там ужо стаіць чалавек, які спэцыяльна прыйшоў, каб навучыць мяне кіраваць і езьдзіць на трактары. Ён кажа: «Так, я пабуду з табой да абеду, а пасьля ты будзеш сам. Бачыш, я тут на веласіпедзе». Я думаю: «Оёй, ёлкі-палкі...» Але што зробіш, калі плацяць 75 франкаў на дзень.... Паказаў ён мне трактар – на што ціснуць, за што цягаць. (Калі Рагуля ў мяне пытаўся – бо там былі пэўныя вымогі – я яму сказаў, што ў лягеры былі шафёрскія курсы, і я ўжо навучыўся езьдзіць на машыне. Праўда, у нас былі толькі грузавікі.) А гэта быў нават ня трактар, а маленькі камбайн, які косіць. І так, гэта было недзе каля 20 ліпеня, я стаў ледзь не трактарыстам. Скасіў я за той дзень палову поля, па абедзе прыйшлі жанчыны і пазьбіралі той ячмень.

Тады гаспадыня мне кажа: «О, у мяне ёсьць яшчэ і пшаніца! Во ты і доіш добра, і на трактары даеш рады. То ж не забывай, што ў мяне ёсьць Марыя!»...

І яшчэ дадала: «Мы вас кормім, але ты слухай – і перадай сваім сябрам – непадалёку ад вашага пакою стаіць шафа, а там сыры. Можаце есьці якія хочаце, бо вы добра працуеце. Трэба сказаць, што мадам Тусэн казала праўду – мы працавалі вельмі добра. Я і Жылік рабілі ўсё, што нам казалі, а Мікола Шуст – сам з Палесься, з гаспадаркі – ня раз нешта паляпшаў ці ўдасканальваў у гаспадарцы гэтай бэльгійскай уласьніцы. Прыкладам, калі пачалі жаць пшаніцу,

трэба было занесьці на другі паверх гаспадарчага будынку. Мы пачалі насіць мяхі на плячах па каменных сходах (я ніколі ня думаў, што так цяжка насіць цяжар па каменных сходах!). Але Мікола Шуст хутка наладзіў «пад'ёмны кран» з кола. Мадам была бязьмежна ўражаная. Падказаў ёй Мікола і такое: заміж выліваць масьлёнку ў гной – лепш прадаваць яе суседу-фэрмэру, які гадуе сьвіней. Мушу сказаць, што галава ў Шуста была запраграмаваная на вынаходніцтвы.

Да Зоры ў Намюр

Кіраваць трактарам я падвучыўся. Асновы «трактарнага руху» мне выкладалі вечарамі, і за пару вечароў я збольшага навучыўся. З працай я спраўляўся, і праца мне падабалася. Нядзелі для нас былі вольныя ад працы, праўда, раніцай я мусіў падаіць кароў, але пасьля 10-й гадзіны я быў вольны. І аднойчы я спытаў у мадам Тусэн, ці мог бы я ў нядзелю пад'ехаць у Намюр – гэта прыблізна за 50-60 кілямэтраў на паўднёвы ўсход ад тае мясцовасьці, дзе была фэрма мадам Тусэн. Я сказаў ёй, што ў Намюры працуе дзяўчына – мая сяброўка.

Мадам, пачуўшы словы «дзяўчына» і «сяброўка», неяк выпытліва ўхмыльнулася, глянула пранізьліва мне ў вочы і вельмі ветліва сказала: ведаеш, калі едзеш да дзяўчыны, дык бяры мой веласіпед, гэта ня так далёка – за дзень справісься. Прызнацца, я быў зьдзіўлены такім паваротам справы. У бліжэйшую суботу я зьезьдзіў у Намюр – сустрэўся з Зорай.

Зора працавала пакаёўкай у барона, спраўлялася вельмі добра і няблага ўжо гаварыла па-французску. Мне стала зайздросна, і я моўчкі даў сабе слова, што за мову «засяду сур'ёзна». Зорын барон – фактычна, баранэса з дачкой – зладзілі нам шыкоўны абед ды, выбачаючыся, сказалі, што для мяне ў іх, на жаль, працы няма. На што я зрэагаваў, сказаўшы, што прыехаў толькі, каб сустрэцца з Зорай. Але неўзабаве я мусіў і з баронамі, і з Зорай разьвітацца, бо думаў яшчэ за сьвятлом вярнуцца на «сваю» фэрму.

Вяртаньне ў Лювэн, пачатак заняткаў

На вялікі жаль, праца мая ў мадам Тусэн неўзабаве раптоўна скончылася. Пад канец жніўня я пакалечыў палец – нават цяпер яшчэ ёсьць метка – секанула гусеніцай па пальцы вельмі глыбока, туды трапіла аліва. Здарылася гэта на полі ў пятніцу, а ў суботу рука напухла і здранцьвела. У нядзелю мадам Тусэн мне кажа: я цябе на кані завязу на цягнік – бо рука ўжо сіняя, гэта нядобра.

Завезла мяне мадам Тусэн на расьпісной брычцы з канём з срэбнай збруяй (літаральна!) на найбліжэйшы паўстанак чыгункі, дала на

разьвітаньне пару сот франкаў і сказала: на працу да мяне можаш прыяжджаць хоць калі – праца заўсёды будзе.

Прыехаў я ў Лювэн позна ўвечары і адразу пайшоў ва ўнівэрсытэцкі шпіталь Сінт-Пітэр, паказаў руку, і дактары сказалі, што пачынаецца заражэньне крыві. Мяне ў шпіталі трымалі дзесяць дзён, рабілі пераліваньне крыві і, хоць стан быў досыць паважны, выратавалі.

5 верасьня 1949 году пачаліся заняткі. На фэрму я пасьля яшчэ варочаўся ў вольныя ад навукі дні, але працаваў часова. Праўда, пра Марыю мадам Тусэн мне ўжо ня згадвала, бо тая Марыя знайшла сабе кавалера. Пасьля я з мадам Тусэн яшчэ трымаў лучнасьць гады тры і езьдзіў на падработкі. Мне як студэнту гэта была добрая магчымасьць падзарабіць, бо ў самім Лювэне можна было падпрацоўваць амаль выключна ў рэстаранах, але дзе ты набярэш столькі рэстаранаў на 12 тысячаў студэнтаў!

Геалягічны факультэт

Я паступіў на геалягічны факультэт. Першыя два сэмэстры геалягічныя прадметы не выкладаліся – трэба было праслухаць і здаць да канца году экзамэны зь фізыкі, хіміі, батанікі і матэматыкі.

Лекцыі пачыналіся а 8-й гадзіне раніцы. Ад 12-й да 2-й – перапынак, а па абедзе ад 2-й да 6-й – практыка. Заняткі адбываліся ў розных інстытутах – часам трэба было літаральна бегаць зь лекцыі на лекцыю. Лювэн горад стары – панад паўтары тысячы гадоў, вулачкі вузенькія, брукаваныя, крывыя. Праўда, у горадзе былі дзьве трамвайныя лініі, але для студэнтаў гэта была малая дапамога – бальшыня ўнівэрсытэцкіх будынкаў была па-за абсягам трамвайных маршрутаў.

Відавочна, першыя пару месяцаў мы былі поўнасьцю адданыя навучаньню. Трэба было азнаёміцца і з падручнікамі, і з кабінэтамі для практычных заняткаў, і зь бібліятэкай, а ў дадатак трэба было падзубрываць і мову. Мы стараліся як мага болей гутарыць па-французску, чыталі газэты, кнігі – у мяне чытаньне займала 4-5 гадзін штодня!

Праўда, з мовамі быў выбар – можна было паступіць на флямандзкае аддзяленьне, туды з нашых пайшло два-тры чалавекі. Нам, беларусам, было крыху няёмка, бо мы адчувалі, што трэба было б падтрымаць флямандцаў. З другога боку, мы хацелі вывучыць французскую, таму беларусы – і ня толькі беларусы – запісваліся пераважна на французскамоўнае аддзяленьне.

У бэльгійскай унівэрсытэцкай сыстэме ёсьць так званы examen partiel, частковы экзамэн. Пачынаеш навуку, а праз чатыры тыдні – частковы экзамэн. Для студэнтаў-пачаткоўцаў гэта цяжка, бо яшчэ не пасьпяваеш разабрацца як і што, а экзамэны былі абавязко-

выя. А мне яшчэ трэба было з Рыжым езьдзіць па справах Саюзу Беларусаў Бэльгіі. Аднак найбольш я аддаваўся навуцы – бо ж дзеля таго я ў Бэльгію і паехаў і ад гэтага залежала мая будучыня.

На фізыцы і хіміі аўдыторыя бывала чалавек па 200, прафэсар прыходзіў, бурчаў сабе пад нос, ці ты чуеш ці ня чуеш – твая праблема. Так што ад першага дня, як прыйдзеш зь лекцыяў, трэба было перачытаць два-тры разы тое, пра што гаварыў прафэсар, матэрыял разжаваць, бо ўсё было па-французску, разуменьне мовы яшчэ не было дасканалае, было досыць цяжка.

На геалягічным факультэце навука працягвалася чатыры гады. Першыя два гады геалягічных прадметаў было няшмат, больш было агульных прадметаў – хімія, фізыка, батаніка, астраномія, матэматыка. Праўда, палеанталёгія, крысталаграфія і мінэралёгія пачыналіся ад другога году. Ад другога году пачыналіся для геолягаў і «палявыя выезды» – агляды клясычных шахтаў, кар'ераў. Трэба было пісаць шмат справаздачаў – на кожны палявы выезд патрабавалася справаздача – дэтальнае апісаньне геалягічнай структуры, стратыграфіі. Трэці і чацьверты гады былі прысьвечаныя выключна геалягічным дысцыплінам, іх было шмат, але найбольш было геахіміі. Трэба было праводзіць больш часу ў палявых выездах, трэба было шмат чытаць, асабліва па мінэралёгіі.

На трэцім годзе зімою трэба вызначыцца з спэцыялізацыяй – ці то будзе вугаль, ці цьвёрдыя горныя пароды, ці структурная геалёгія. Я вырашыў спэцыялізавацца па здымцы вугальных басэйнаў. Мне прафэсар прынёс геалягічную карту 1897 году і кажа: вось гэты квадрат, тут столькі і столькі кілямэтраў, трэба гэта ўсё праверыць, бо цяпер робіцца вялікая здымка, пры якой удакладняюцца дэталі. І я меў на гэта паўтара года. Гэта была дыплёмная праца (licence), і яе ня трэба было абараняць, а толькі прадставіць – абгрунтаваць свае дадаткі да геалягічнай карты.

Дыплёмная праца

Мне дасталася мясцовасьць Буф'ю ў басэйне Шарлеруа па дарозе на Дзінант, на поўдні Бэльгіі. Апошняя геалягічная здымка там была зробленая за 60 гадоў да таго, і невядома было, ці правільная яна, ці не, бо за той час зьявіліся новыя дарогі, павыкопваліся новыя калодзежы, сталіся даступнымі глыбінныя пласты.

Працу трэба было плянаваць самому. Трэба было наведваць лекцыі, выконваць усе ўнівэрсытэцкія патрабаваньні, але праз год – за паўгода да заканчэньня ўнівэрсытэту – трэба здаць гэтую працу свайму прафэсару. І так я езьдзіў у Буф'ю паўтара года. Мае дасьледаваньні пацьвердзілі правільнасьць старой здымкі – трэба было праверыць, ці даходзіць пэўны геалягічны скід ад Шарлеруа

да Буф'ю. Базуючыся на новых дадзеных – разрэзы, тунэлі, дарогі – я выявіў, што той скід сапраўды даходзіць да Буф'ю.

У належны тэрмін я здаў прафэсару Эцьену Асэльбэргу карту, ён і яшчэ іншыя прафэсары паехалі на месца, паглядзелі структуры і згадзіліся з маімі высновамі. Мне засталося здаць экзамэны, і мая дыплёмная праца была залічаная.

Спэцыфіка геалягічнага факультэту была ў тым, што трэба было шмат езьдзіць. Наагул у Бэльгіі я шмат езьдзіў – і па справах Саюзу Беларусаў Бэльгіі з Рыжым, і па навуцы. Найбольш аддавалася часу геалягічнаму картаграфаваньню. У часе геалягічных працаў бывалі і забаўныя здарэньні. Аднойчы на другім годзе мне трэба было зрабіць невялічкае картаграфаваньне ў мясцовасьці Прэль па дарозе з Шарлеруа ў Намюр. І вось аглядаю скалы, бяру патрэбныя камяні, выходжу зь лесу, раптам падыходзяць паліцэйскія ці жандармы і мяне адразу пад рукі – уцёк нейкі вар'ят і ходзіць ды зьбірае каменьне... Давялося гэтую гісторыю расхлёбваць, я расказаў паліцыянтам што і як, яны пазванілі ў Лювэн – і «здарэньне» скончылася. Наагул, дзе б я ў Бэльгіі ні працаваў, дзе б ні хадзіў – калі спытаесься, дзе якая мясцовасьць або якая вуліца, людзі глядзелі на мяне – чалавека з картай і компасам у руцэ – і заўсёды пыталіся: «Гэта нешта ваеннае?» І не з адным мной так было – з усімі геолягамі.

Апрача ўсяго іншага за гэтыя два гады геалягічнай спэцыялізацыі трэба было некалькі разоў выехаць з прафэсурай ў ведамыя кар'еры. На геалягічным факультэце Лювэнскага ўнівэрсытэту ўлюбёным «клясычным» рэгіёнам для геолягаў быў французскі Эльзас. За гады майго жыцьця ў Лювэне я наведаў гэты рэгіён разоў восем. Экскурсіі ў Эльзас заўсёды падганяліся пад вясновыя канікулы – каля Вялікадня. На экскурсіі выяжджалі студэнтаў 10-15 – геолягі і горныя інжынэры – а кіраўніком быў ведамы бэльгійскі геоляг П'ер Дэбэцюн. Кар'еры і клясычныя разрэзы гранітаў у Эльзасе былі выдатныя, важным было і тое, што амаль усе кар'еры былі ў працоўным стане – там распрацоўваўся граніт, пераважна абліцовачнага ўжытку. Што мне з тых экскурсіяў сапраўды ўрэзалася ў памяць – гэта назіраць, як прафэсійныя, патомныя каменячосы зь велізарных глыбаў граніту патраплялі вырабляць тонкія абліцовачныя пліты.

Апрача Эльзасу мы езьдзілі на экскурсіі ў Альпы, а таксама ў мясцовасьці па рацэ Рэйн у Нямеччыне.

Навука на геалягічным факультэце мне падабалася – хацелася стаць геолягам. Як я зазначаў раней, геолягаў я бачыў яшчэ ў Налінску, шмат чытаў пра геолягаў, уражвалі мяне і расказы пра геалёгію. Падабалася мне і Бэльгія як краіна, людзі знаёмыя з геалёгіяй – праўда, сярод іх было больш горных інжынэраў. Вугаль у Бэльгіі здабываецца каля 200 гадоў, і людзі ведаюць, што каб знайсьці вугаль, патрэбныя спэцыялісты. Геолягаў рыхтавалі Лювэнскі і Льежскі ўнівэрсытэты,

але курсы па геалёгіі чыталіся і ў Брусэлі, і, здаецца, у тэхнічнай школе ў Антвэрпэне.

Не скажу, каб на факультэце было лёгка вучыцца – далёка не. Трэба было шмат зубрыць, асабліва ў палеанталёгіі і мінэралёгіі, але я даваў рады. У дадатак да французскіх кніжак я карыстаўся нямецкімі (тады нямецкая мова мне была амаль як свая!) і расейскімі. На расейскай мове было шмат буйных аўтараў па мінэралёгіі, геахіміі, і што асабліва важна – шмат апісаньняў клясычных радовішчаў карысных выкапняў. Тады ж ва ўнівэрсытэце я пачаў вывучаць і ангельскую мову. Трэба сказаць, што бальшыня тагачаснае навуковае літаратуры – асабліва новыя дасьледаваньні, тэорыі, абагульненьні – узьнікалі і друкаваліся ў ангельскай мове. З новай геалягічнай літаратурай мы мусілі быць знаёмыя, таму ладна часу праводзілі ў бібліятэцы, дзе зьбіралася англамоўная літаратура. (Фактычна, пачаўшы ад Лювэну, я меў дачыненьне з ангельскай мовай праз усё жыцьцё.)

Пасьля заканчэньня геалягічнага факультэту былі добрыя пэрспэктывы працы – асабліва патрэбныя былі геолягі ў Бэльгійскім Конга, патрэбныя былі і выкладчыкі ў школах. Дарэчы, наколькі я прыпамінаю, ад другога году навукі да мяне час-часом зьвярталіся розныя індустрыйныя кампаніі і пыталіся, ці не хацеў бы я працаваць у іх пасьля заканчэньня ўнівэрсытэту, а яны б тады аплачвалі мне навуку. Я такія прапановы адхіляў, бо ўсе яны былі ад афрыканскіх кампаніяў, а ў Афрыку ехаць я не зьбіраўся.

Навука і грамадзкая праца

Я прабыў у Лювэне шэсьць гадоў. Унівэрсытэцкае жыцьцё было досыць напружанае, але цікавае. Вядомая справа, перш за ўсё трэба было грызьці навуку, здабываць прафэсію, нагрузка была вялікая, да таго ж усё было па-французску. Шмат трэба было працаваць са слоўнікам, было нялёгка. Штодня на навуку траціласа восем-дзесяць гадзін – былі лекцыі, практыка, потым зноў пераглядалася, што сёньня казаў прафэсрар. Нічога нельга было прапусьціць, калі не зразумееш сёньня, то ўжо не дагоніш.

Унівэрсытэцкія вымогі былі строгія. Некаторыя прафэсары правяралі прысутнасьць – ці ўсе студэнты паводле сьпісу ходзяць на лекцыі, а некаторыя не зьвярталі ўвагі – абсалютна было да лампачкі. На лекцыях па хіміі было па дзьвесьце чалавек студэнтаў, а на аналітычнай мэханіцы – сем-восем чалавек. У нас, геолягаў, бальшыня курсаў была разам з хімікамі і горнымі інжынэрамі.

Матэматыка і астраномія падаваліся ў даступнай навуковай форме, але практычныя заняткі па гэтых дысцыплінах займалі ладна часу. Наагул, навуцы надавалася найбольш увагі і энэргіі, што цал-

кам зразумела, бо побыт у Лювэне быў магчымы толькі калі студэнт спраўляўся з навучальным працэсам.

Праўда, у беларускіх студэнтаў была і іншая нагрузка і абавязкі – грамадзкая дзейнасьць. Відавочна, у грамадзкую працу былі ўцягнутыя ня ўсе студэнты, але тым, што былі ўцягнутыя, даводзілася шмат працаваць. У Бэльгіі, апрача студэнцкіх, дзеілі яшчэ дзьве грамадзкія арганізацыі – Саюз Беларусаў у Бэльгіі (СББ) і арганізацыя вэтэранаў.

Саюз Беларусаў у Бэльгіі

Я асабіста быў заангажаваны ў дзейнасьць СББ. Гэтая арганізацыя, паводле выдадзеных пасьведчаньняў (carte d'identité), налічвала каля 400-500 чалавек, пераважна шахцёраў. Арганізацыя была падзеленая на аддзелы: правінцыя Лімбург, правінцыя і горад Льеж, горад і ваколіцы Шарлеруа, Монс і Брусэль.

У кожным аддзеле адбываліся зборкі, сьвяткаваньні і сустрэчы. Было шмат арганізацыйна-плянавае працы. Гэтаксама трэба было дапамагаць работнікам у залагоджаньні розных бытавых праблемаў, кантрактаў. Дзе-нідзе трэба было арганізоўваць лекцыі, «школкі» беларусаведы. Цімала было працы і ў дачыненьнях з сындыкатамі – дамагацца розных дапамогаў, аплаты за прапушчаныя тэрміны працы, за павышэньне кваліфікацыі... Адным словам, занятасьць у Саюзе Беларусаў у Бэльгіі была штодзённая, карпатлівая і, часта, аб'ёмістая.

Да таго ж мы разгарнулі шырокую культурніцка-асьветную працу сярод работнікаў. Ладзілі культурныя вечары, міні-канцэрты, сустрэчы. Варта мець на ўвазе, што праца ў СББ адбывалася па-за Лювэнам. Даводзілася разьяжджаць, пры гэтым вельмі часта ня толькі ў свабодныя ад вучобы дні, а гэта азначала, што часта даводзілася прапускаць заняткі. Ну, але неяк ішло. Я ў гэтай дзялянцы чуўся вельмі добра, і, бадай, не было ў Бэльгіі шахты або работніцкага асяродку, дзе мне не давялося працаваць з работнікамі.

Кіраўніком арганізацыі быў ад пачатку Уладзюк Рыжы. Калі ён выехаў у Гішпанію (вясна 1950 году), абавязкі кіраўніка выконваў я, але я ніяк гэтую пасаду заняць ня мог, бо толькі пачынаў студыі – і гэта было для мяне асноўнае. Таму ўжо на першым агульным зьезьдзе старшынём быў абраны інжынэр Янка Жытка, а я згадзіўся быць заступнікам – на гэтай пасадзе я прабыў гады тры-чатыры. Пасьля Жыткі старшынём быў абраны айцец Аўген Смаршчок, і я працаваў зь ім пару гадоў. Мушу сказаць, што а. Смаршчок быў выдатны праваслаўны сьвятар, адданы грамадзкі працаўнік, вельмі адукаваны чалавек, і працаваць зь ім было прыемна – ды я яго асабіста пазнаёміў амаль з усім СББ! Вялікай згубай для нацыянальнай працы было тое, што а. Смаршчок вельмі рана памёр.

Падчас працы ў Саюзе Беларусаў у Бэльгіі мы бадай што ўпершыню сустрэліся лоб у лоб з савецкай прапагандай, скіраванай супраць беларускага нацыянальнага. Былі гэта прасавецкія «ячэйкі» розных патрыётаў (у Бэльгіі па вайне асела цімала беларускіх дзяўчат, якія павыходзілі замуж за бэльгійцаў), што адкрыта вялі антыбеларускую прапаганду. Асабліва дзейныя антыбеларускія групы былі ў гарадах Антвэрпэне, Брусэлі і Вэрвіе. Але... як бы там ні было – бо ўвесь час трэба было мець на ўвазе, што ў канцы году трэба здаваць экзамэны – праца ў СББ была цікавая і давала маральнае задавальненьне.

Хор Равенскага

Пад восень 1950 году кіраўніцтва Беларускага Студэнцкага Згуртаваньня вырабіла дакумэнты на пераезд зь Нямеччыны і затрыманьне ў Бэльгіі кампазытара Міколы Равенскага з мэтай арганізаваць студэнцкі хор. Да хору далучылася каля 20 студэнтаў, і пачалася праца. Кожны вечар Равенскі ладзіў сьпеўкі – ад панядзелка да серады паасобку з партыямі (басы, барытоны, тэнары), а ў чацьвер была агульная сьпеўка. Разам зь сьвецкімі песьнямі развучвалі і рэлігійныя – праваслаўныя, бо плянавалася сьпяваць і ў невялічкай праваслаўнай капліцы ў Міжнародным студэнцкім цэнтры. Адным словам, нагрузкі значна прыбавілася.

Гэтаксама пачалася падрыхтоўка да канцэртаў, бо ж галоўнай мэтай заснаваньня хору былі выступы зь беларускай песьняй і данясеньне інфармацыі пра Беларусь да бэльгійскай публікі, па-за Лювэнам. Праўда, выступы хору пачаліся якраз зь Лювэну ў сьнежні 1950 году – канцэрт прайшоў выдатна.

Асноўную ролю ў падрыхтоўцы гэтага канцэрту ўзяла на сябе Арганізацыя Беларускіх Вэтэранаў (Тодар Цімафейчык, студэнт палітычнага факультэту), хоць, праўда, і мы зь Цьвіркам за дзень да канцэрту езьдзілі па горадзе на спэцыяльным аўто і праз рупары па-французску і па-флямандзку абвяшчалі пра канцэрт. Аўтарэкляма тады была ў модзе і дапамагла прывесьці на канцэрт шмат публікі. А яшчэ за пару дзён да гэтага мы паразьвешвалі на рэклямных тумбах вялікія – мэтровыя – афішы, таксама на дзьвюх мовах.

Была створаная таксама танцавальная група, якой кіравалі Люда Рагуля і Зора Савёнак – так канцэртныя выступы рабіліся эстрадай, што добра дапамагала агульнаму посьпеху.

Канцэрты адбываліся шмат дзе – у спэцыяльных залях, цэрквах, дамох для старых, санаторыях, школах. На выступы мы езьдзілі на спэцыяльна найманых аўтобусах, у часе паездак падвучваліся – пераглядалі канспэкты, падручнікі.

У часе канцэртных падарожжаў здараліся забаўныя мамэнты, пра адзін я раскажу. Недзе ў 1951 годзе мы арганізоўвалі першы бела-

рускі канцэрт у Льежы. Вакол Льежу разьмяшчаецца найбольшы вугальны басэйн, сам Льеж – індустрыйны горад, і там было шмат беларускіх работнікаў. Мы лічылі, што канцэрт нам дапаможа здабыць больш сяброў у арганізацыю. Канцэрт ладзілі пры дапамозе YMCA, і канцэрт гэты быў інтэрнацыянальны. Найбольшая праграма была наша і ўкраінская, але там таксама выступалі і немцы, і мадзяры – іхныя работнікі таксама былі ў Льежы. Асобная група, якая хацела выступіць, былі казакі, кіраўнікі нікому не адмаўлялі, дык дазволілі выступіць і казакам.

Калі мы рыхтаваліся да выступу, да нас падыходзіць кіраўнік казакоў і кажа, што хацеў бы пагаварыць з кіраўніком нашага хору. Мы ім – калі ласка, праходзьце, гаварыце. І вось казак падыходзіць да Равенскага, ляпае яго па плячы і кажа: «Папаша, научите нас так махать руками!» Мы ўсе выбухнулі сьмехам.

У канцы 1952 году Равенскі пачаў падхворваць – у яго быў рак лімфатычных сасудаў, яму зрабілі апэрацыю – у яго перасыхала горла. Дзеля гэтага ён заўсёды насіў з сабой у кішэні маленькую бутэлечку вады і пасьля кожнага выступу ішоў за сцэну і рабіў пару глыткоў з той бутэлькі. Збоку гэта выглядала камічна і неадназначна.

Спадар Равенскі відавочна слабеў і слабеў – пачынала круціцца галава ад недахопу вадкасьці ў арганізьме – і ён пачынаў здаваць. Было відавочна, што хору патрэбны новы кіраўнік. Праўда, у гэтым часе хор пачаў найграваць песьні на кружэлкі – трэба было езьдзіць у студыю ў Брусэль і спадар Равенскі неяк патрапляў. Аднак выхаду кружэлак ён ужо не дачакаўся. У лютым 1953 году яго паклалі ў шпіталь, і мы з Зорай былі апошнія, хто яго бачыў жывога, гэта было 8 сакавіка, быў прыгожы вясновы дзень. Мы зайшлі да яго, ён чуўся вельмі добра, быў у бадзёрым настроі, гаварыў, жартаваў, рабіў пляны. На хвілінку прыйшла сястра даць яму лек, і мы адышлі. Я кажу Зоры: «Можа прынесьці яму трошкі вінца?» Яна, на мяне раскрычалася, мы выйшлі. Назаўтра, у панядзелак – я якраз быў у Інстытуце геамарфалёгіі – прыходзіць сакратарка і кажа, што нехта кліча мяне да тэлефона. Я падышоў, і мне з шпіталю паведамілі, што спадар Равенскі памёр.

Для студэнцкае грамады гэта быў цяжкі час. Мы мусілі яшчэ закончыць запісы кружэлак, былі і выступы. Добра, што хору згадзіўся дапамагчы Алесь Карповіч, які даяжджаў у Лювэн зь Нямеччыны, і Кастусь Кіслы, які жыў у Льежы. Кружэлкі былі выдадзеныя студыяй «Decca».

Нелегальна празь мяжу

На фоне напружанага і манатоннага студэнцкага жыцьця ў Лювэне прыпамінаецца і пару «разынак» – падзеяў не такіх ужо й ардынарных, часам напружаных, якія адлюстроўваюць рэаліі таго часу.

Пачаўся мой першы навучальны год, сьнежань, я рыхтуюся да частковага экзамэну (examen partiel) – і раптам атрымоўваю тэлеграму зь Нямеччыны: «Прыедзь у Брэмэн. Мы выяжджаем у Амэрыку. Мама». Я аж ахнуў, бо ў мяне было ўражаньне, што бацькі на эміграцыю зь Нямеччыны не паедуць – бацька не хацеў, маці таксама, яны здалі экзамэны на нямецкіх настаўнікаў і спадзяваліся атрымаць працу ў нямецкай школе. І я думаю – што ж рабіць? Бо ў мяне ні пашпарта, ні грошай, а з бацькамі ж трэба разьвітацца! Каб выехаць, трэба было мець пашпарт і візу, а атрымаць гэта было няпроста – бо быў 1949 год, перамяшчэньні былі абмежаваныя.

Аднак я вырашыў, што пайду празь мяжу бяз пашпарта. Даехаў да канцавой станцыі ў Бэльгіі (Herbesthal), вылез зь цягніка і пайшоў у кірунку Нямеччыны. Гэта было перад Калядамі, ішоў дождж, было страшэнна холадна. Іду я, раптам бачу – нейкія людзі! Я спалохаўся, думаў, што памежнікі, а гэтыя людзі спалохаліся мяне. А кругом ноч, дождж... Тады яны кажуць, што ідуць туды, дзе можна запытацца. Дайшлі да хаты лесьніка, а гаспадар кажа: дайце па пяць марак – браў толькі нямецкія маркі – і я вам скажу куды ісьці. Далі мы – тыя двое, мужчына і жанчына, і я – пятнаццаць марак. Давёў нас лясьнік да высокага дрэва і паказаў куды далей ісьці. Хвілін пятнаццаць хады – і я ўжо ў Нямеччыне!

Мае спадарожнікі таксама ішлі, але пару сот мэтраў за мной. Тая нелегальная сьцежка, па якой мы прыйшлі ў Нямеччыну, падыходзіла пад самы трамвайны прыпынак – канцавы прыпынак лініі гораду Аахен. Хвілін праз 20-25 язды я быў ужо на аахенскім вакзале. Там я пачаў разглядацца, дзе й калі ідуць цягнікі на Брэмэн, і знайшоў усё, што мне трэба, параўнаўча лёгка і спакойна.

Але пры пасадцы ў цягнік я ледзьве не «засыпаўся». Каля вагона стаялі нямецкія паліцаі і пыталіся ў пасажыраў дакумэнты – правяралі, ці яны нямецкія грамадзяне. Відаць, вылоўлівалі кантрабандыстаў. Я быў здорава спалохаўся – у мяне апрача бэльгійскай студэнцкай картачкі нічога няма! Што рабіць?! А тады прыпомніў, што ў мяне ў кашальку засталася паперына зь Цюбінгену, нейкі цэтлік, чэк з крамы ці нешта такое. Я яе паказаў, і паліцыянт кажа: Alles in Ordnung! Гэта было ў Аахэне. Там я сеў на іншы цягнік і на раніцу ўжо быў у Брэмэне.

Разьвітаньне з бацькамі

З Брэмэну я дабраўся ў Брэмэргафэн – порт, адкуль DP выяжджалі за акіян. І тут я зразумеў, што іду «на деревню дедушке» – ніякага дакладнага адрасу ў мяне не было, на тэлеграме быў зазначаны толькі нумар і назва гораду. Праўда, знайсьці лягер было няцяжка – першы стрэчны нямецкі паліцай паказаў дарогу.

Фактычна гэта была частка гораду, абнесеная калючым дротам, зь вялікай брамай. Побач брамы – адміністрацыйны барак. Зайшоў я ў гэты будынак зь нейкім страхам – мяне тут могуць затрымаць, увесь час у галаве круцілася думка, што я ў Нямеччыне нелегал! Аднак я супакоіўся, калі пачаў гаварыць з паліцаямі ў адміністрацыі. Сказаўшы хто я і чаму прыехаў сюды і зазначыўшы, што бацькі – беларусы, я з прыемнасьцю ўбачыў, як адзін з службоўцаў узяў асобны сьпіс на вялікай дошцы з загалоўкам «Whiteruthenians» – «Беларусы» – у эміграцыйным пункце гэта была асобная група «перамешчаных асобаў»! (Пазьней, пішучы кнігу «Беларусы ў ЗША», я часта шкадаваў, што не зрабіў фатаграфію той дошкі, але ж фотаапарат у тыя часы быў рэдкасьць.) Службовец знайшоў прозьвішча маіх бацькоў у сьпісе і месца, дзе яны знаходзіліся ў тым эміграцыйным раёне.

Аднак тамтэйшы начальнік мне сказаў, што ў той дзень я зь імі сустрэцца не змагу, бо яны якраз праходзяць мэдычны агляд, а таму ніякія кантакты зь імі не дазваляюцца. Напэўна на маім твары зьявілася спалоханасьць – што ж мне рабіць, куды падзецца – хоць я, безумоўна, мог і пачакаць. Начальнік, відаць, мяне зразумеў і паставіўся прыхільна. Ён параіў наступнае: я магу сустрэцца з бацькамі назаўтра, а пакольк начаваць мне няма дзе, бо я прыехаў здалёк, то адзінае месца, дзе мяне можна разьмясьціць (начальнік падкрэсьліў: адзінае) – гэта іхная турма. Калі я праседжу 24 гадзіны ў той турме, будзе лічыцца, што я прайшоў патрэбны карантын, безь якога сустракацца з эмігрантамі не дазваляецца. Няма чаго й казаць, што я на такія ўмовы пагадзіўся – выбару ў мяне не было.

Так як і было прадпісана мясцовым рэглямэнтам, я адседзеў у камэры каля 24 гадзінаў. Мяне там пару разоў пакармілі, звадзілі ў душ, у прыбіральню, а пры выхадзе далі і паперку, што я ў такі й такі дзень і ноч быў пад наглядам паліцыі ў эміграцыйнай зоне. На другі дзень нямецкі паліцыянт пасадзіў мяне ў джып і павёз туды, дзе знаходзіліся бацькі, той раён у зоне быў пазначаны «Whiteruthenians».

Паліцыянт высадзіў мяне перад домам, у якім жылі бацькі, і папярэдзіў, што з зоны я выходзіць ня маю права, але ў зоне ёсьць сталоўка, клюб – бацькі ведаюць – там можна прабавіць зь імі час, і ў іх памешканьні я магу спыніцца на 24 гадзіны. А выйсьці з зоны я магу толькі праз браму, дзе ўвайшоў і адседзеў пэўны час у камэры, аб чым маю паперку. Усё ясна. Я падзякаваў паліцыянту і пайшоў у хату.

Пастукаў – адчыніла маці... і ледзь не самлела, пабачыўшы мяне. Сустрэча была сапраўды цёплая – сьлёзы ў маці ліліся і ліліся, а бацька ўсё круціў галавой. Для мяне, ясна, найбольш цікавым было даведацца ў бацькоў – чаму яны раптам выяжджаюць у Амэрыку?

Я пытаюся ў маці: «Мама, як гэта так сталася, што раптам вы едзеце ў Амэрыку?» А яна кажа: «Ведаеш, стаўся цуд». Сядзіць яна

ў лягеры ў Бакнангу (а бацька надалей быў у Гарміш-Партэнкірхене), і раптам прыходзіць Шчорс і пытаецца: «Марыя Васілеўна, калі прыедзе ваш Яўхім Яўсеевіч? Бо тут зь ім хочуць пагаварыць». Маці адказвае: «Сёньня ўвечары я буду зь ім гаварыць па тэлефоне і скажу яму, каб прыехаў». Назаўтра бацька прыяжджае, прыходзяць двое, і той зь іх, хто заходзіў раней і хацеў зь ім пагаварыць, кажа: « Вы – Кіпель?» – «Кіпель». – «Вы былі ў канцлягеры?» – «Быў». «Гэта сядзелі там і там?» – «Там». – «Вы былі на кангрэсе?» – «Быў». – «Вы пісалі антыкамуністычныя артыкулы?» – «Пісаў». І тады чалавек пераходзіць на расейскую мову (а дагэтуль размова была па-нямецку): «Нам патрэбныя такія людзі, як вы, антыкамуністы. Калі хочаце ехаць у Амэрыку, я пастаўлю штэмпэль, што вы можаце ехаць».

Праўда, казала маці, бацька адразу не хацеў зь імі гаварыць – гутарка перапынілася, і тыя чыноўнікі паехалі з хаты. Пазьней бацька да іх паехаў сам, і ўсё скончылася памысна – бацькам далі візы і магчымасьць выехаць у ЗША.

(У ЗША ў 1982 годзе выйшла кніга Джона Лофтуса «Belarus Secret», у якой аўтар зь вялікім абурэньнем апавядае, што амэрыканская армія шмат якім эмігрантам-антыкамуністам рабіла палёгкі пры эміграцыі ў ЗША. Бясспрэчна, яно магло так быць. Але ў дачыненьні да Беларусі гэты аўтар выяўляе проста зьвярына-біялягічную злосьць і нянавісьць, падаючы ўвесь матэрыял у кнізе нагэтулькі сфальшавана і перакручана, што кніга гэтая сталася прыкладам фальсыфікацыі рэчаіснасьці. Але больш пра гэта – пазьней.)

У гутарках з бацькамі я правёў 24 гадзіны, пераспаўшы ў іхным памешканьні, а на раніцу мы разьехаліся амаль на сем гадоў – я заставаўся ў Эўропе, а яны праз пару дзён эмігравалі ў ЗША. Было гэта перад Калядамі 1949 году.

Праваднік

Вяртаўся я ў Бэльгію той самай дарогай – усё прайшло выдатна, назаўтра я быў у Лювэне. Праўда, гэты выпадак нелегальнага пераходу мяжы замацаваў за мной у лювэнскай студэнцкай грамадзе статус «экспэрта» ў пытаньнях пераходу мяжы. Таму хутка, пад лета, да мяне пачалі зьвяртацца студэнты, каб я перавёў іх празь мяжу: магчымую рызыку для іх пераважвала эканомія на коштах візы і хуткасьць «апэрацыі». Пераводзіў я празь мяжу Міколу Арцюха (ён знайшоў брата ў Нямеччыне), Зору Савёнак і Вольгу Харытончык (езьдзілі да бацькоў у лягер). Пераводзіў таксама Ўладзімера Цьвірку і Алеся Марговіча, якія везьлі тканіну, каб пашыць «аблачэньне» уладыку Васілю (БАПЦ) – гэтым разам я, прызнацца, здорава хваляваўся, бо калі б злавілі, то «прышылі» б кантрабанду.

Зь нелегальным пераходам мяжы прыпамінаю я і іншы эпізод.

Як ведама, на пачатку 50-х гадоў у Лювэне быў інтэрнат беларускіх гімназістаў, якія вучыліся ў бэльгійскіх гімназіях (хлопцы і дзяўчаты). Яны жылі ў беларускім інтэрнаце на бульвары Схрора пад наглядам айца Аўгена Смаршчка, а бацькі тых гімназістак былі ў Францыі.

І вось у калядны сэзон 1952 году чатыры гімназісткі не атрымалі візаў, каб на Каляды зьезьдзіць да бацькоў. Трагедыя... Нікому нічога ня кажучы, айцец Смаршчок пытаецца ў мяне, ці лёгка перайсьці мяжу ў Францыю! Я кажу: пераход мяжы ў Францыю – справа нескладаная, асабліва ў раёне гораду Монс, дзе на бэльгійскіх шахтах працуе шмат работнікаў з Францыі, а цэлы той рэгіён я таксама добра ведаю, бо шмат там бываў па маёй навуцы – наведваў шахты, часта бываў на практыцы. Дык айцец Смаршчок папрасіў мяне перавесьці празь мяжу дзяўчат, бо візы «спазьніліся».

Я гэта зрабіў безь ніякае напружанасьці – пасадзіў дзяўчат (але сам зь імі не паехаў) на трамвай, які ў пэўным часе вазіў шахцёраў. Праверак там, як звычайна, не было, хоць і мусілі б быць.

Пад сярэдзіну 1950-х гадоў працэс атрыманьня візаў спрасьціўся, візы падзешавелі, і «бязьвізавыя» пераходы мяжы спыніліся.

Магчыма, гэта гучыць і ня надта этычна, але нелегальнае «хаджэньне празь мяжу» ладзілася пераважна дзеля ашчаднасьці, з прычыны вялікай бюракратыі для чужынцаў, а ў нашым беларускім выпадку – прызнаюся: рабілася гэта і дзеля лепшага настрою ў асяродку. Пэру Рабэру я пра гэтыя «штучкі» расказаў толькі тады, калі закончыў студыі.

Фабрыка кішак, іншыя падпрацоўкі

Што яшчэ з таго бэльгійскага студэнцкага жыцьця засталося ў памяці? Прыпушчаю, што шмат каму з студэнтаў запамяталіся эпізоды, зьвязаныя з працай – мы апыналіся ў іншым асяродзьдзі, пазнавалі жыцьцё бэльгійскай глыбінкі, бэльгійскія звычаі. Да таго ж, працоўныя эпізоды мелі і прыемныя мамэнты – студэнт атрымліваў грошы, а гэта азначала большую незалежнасьць у спартанскім студэнцкім бытаваньні.

Аб адным такім эпізодзе – працы на фэрме мадам Тусэн – я расказаў, а зараз раскажу пра іншыя працы.

Студэнты заўсёды шукалі працу, каб падзарабіць пару капеек, бо мы атрымоўвалі як argent de poche (кішанковыя грошы) 200 франкаў на месяц – на гігіену, пастрыгчыся, схадзіць у кіно, час ад часу выпіць кавы, піва. Гэтых грошай, бясспрэчна, было мала, і студэнты падраблялі. Некаторыя студэнты, якія прыйшлі да нас з Бэльгіі – напрыклад, Саўка Міхальскі або Сашка Лазанаў – ішлі на шахты, дзе яны працавалі перад тым, і падраблялі там. Іншыя працавалі там, дзе ўдавалася знайсьці нейкую працу..

Першы год пасьля таго, як я здаў экзамэны, я падпрацоўваў на «фабрыцы кішак» у прадмесьці Брусэлю, куды зь Лювэну можна было даехаць на трамваі. Гэта цікавае прадпрыемства – на той час яму, можа, было гадоў дзьвесьце – фабрыка, ці хутчэй фабрычка, дзе мыюць кішкі і падрыхтоўваць іх для кілбасаў. У тыя гады пластыкавых абалонак для кілбасаў не было – мясам начынялася кішка. І гэтая фабрыка, а была яна досыць вялікая – на той час каля 50 работнікаў, рабіла закупы кішак ва Ўзьбекістане (гэта былі 1949-1950 гады), дзе прадукцыя тых кішак была наладжаная ў спэцыяльных калгасах. Прадстаўнікі фабрыкі езьдзілі ва Ўзьбекістан, закуплялі там кішкі з авечак – а кажуць, што кішкі з авечак найлепшыя для кілбасаў, вельмі даўгія – зматаныя ў вялікія клубкі, іх салілі, складалі ў вялікія бочкі, грузілі на карабель, і той савецкі карабель раз на месяц прыплываў у Антвэрпэн, дзе яго разгружалі і везьлі кішкі на фабрыку.

Праца на фабрыцы была гэткая. У вялікім, мэтраў на сто ў даўжыню, цэху стаіць мэталёвы стол з трубкамі – калі рукой прыціснуць трубку, зь яе ідзе моцны струмень вады, а калі адпусьціць – струмень стрымваецца. Каля кожнай трубкі стаіць работнік, за работнікам – скрынка з клубкамі кішак. Работнік бярэ клубок, знаходзіць канец кішкі і насоўвае кішку на трубку, націскае трубку – і вада пад напорам паступае ў клубок, пачынае яго размотваць. У часе размоткі выяўляецца, што даўгая кішка неаднародная ў дыямэтры: ёсьць кавалкі дыямэтрам 1-2 см, а ёсьць і па 5 см. Работнік мусіць хуценька кожны кавалак усадзіць у шкалу, што знаходзіцца перад трубкай, і адрэзаць кавалак кішкі аднолькавага дыямэтру, кідаючы адрэзаны кавалак у скрыню з адпаведным нумарам, якая стаіць ззаду. Работа гэтая вельмі хуткая, мокрая, у салёнай вадзе, з нажамі – адным словам, досыць напружаная, і трэба вельмі пілнавацца і поўнасьцю засяродзіцца на працэсе каліброўкі. Праца выключна фізычная, думаць там няма патрэбы – але платная! Працуючы па 10-12 гадзін, можна было нядрэнна падзарабіць.

Я вельмі добра працаваў ад першага знаёмства, і гаспадар сказаў: прыходзь калі хочаш, удзень, уначы, летам, зімой – заўсёды будзе праца. Дык калі я часам меў дзень ці паўдня свабоднага часу, я туды ехаў: папрацую, памыюся – і ўжо адразу маю грошы. Фабрыка працавала 18 гадзін у суткі, бо попыт на кішкі быў вялікі, ня ведаю, можа яна была адна такая – гэтае прадпрыемства лічылася вельмі старым у Бэльгіі і было бадай не адзінае, якое мела дачыненьні з Савецкім Саюзам. Першы раз, калі трэба было разладоўваць гэты карабель, нас з фабрыкі паехала чалавек пяць. Трэба было заходзіць на сам карабель, я трохі баяўся, але неяк зайшоў. Трэба было выкочваць бочкі, каб не разьбіць, і перагрузіць на грузавікі.

Так я пэрыядычна працаваў на гэтай фабрыцы чатыры гады – па паўдня, па дні, па два – калі быў час.

Іншыя працы былі крышку больш платныя – напрыклад, параўнаць канфігурацыю кар'ераў, якія былі затопленыя вадой у басэйне рэчкі Мёз. На трэцім годзе шмат студэнтаў працавалі рэпэтытарамі – давалі лекцыі студэнтам ніжэйшых курсаў. Я, прыкладам, вельмі шмат даваў лекцыяў крысталаграфіі – шмат студэнтаў яе не разумелі і вучылі абы здаць экзамэны, дык трэба было наймаць рэпэтытараў.

Іншыя студэнты працавалі ў рэстаранах, некаторыя ў індустрыі, іншыя ў транспартных канторах. З працай у Бэльгіі не было цяжка, беспрацоўе было досыць малое, і студэнтаў бралі лёгка, бо ведалі, што яны знаходзяцца там легальна. Дазволаў на працу студэнты ня мелі, а дазволы былі патрэбныя, дык гаспадары студэнтаў наймалі ахвотна і плацілі гатоўкай.

Сувязь зь іншымі студэнцкімі грамадамі

Лювэнскі ўнівэрсытэт вельмі стары (заснаваны ў 1425 годзе), старая была і традыцыя, што там жылі студэнты-чужынцы. У тым часе, калі вучыся я, такіх студэнтаў было шмат, мы мелі кантакты зь іншымі – мадзярамі, украінцамі, немцамі. Немцаў была вельмі вялікая грамада, можа паўтысячы студэнтаў, але ў Бэльгіі ёсьць два нямецкія раёны – Ойпэн-Мальмэды – дзе былі і нямецкія школы, адміністрацыя, магазыны – і калі адтуль прыяжджалі студэнты ў Лювэн, яны фактычна й не былі чужынцамі.

Нямецкія студэнты жылі ў некалькіх дамох і належалі да Карпарацыі студэнтаў Ойпэн-Мальмэды – старой бэльгійскай арганізацыі. Палітыкай гэтая карпарацыя цікавілася мала, але час-часом ладзіла дэбаты, і беларускія студэнты былі ў іх сталымі гасьцямі. Найбольшую сувязь зь немцамі меў Вітаўт Рамук, пару разоў бываў там і я.

Вялікая грамада была ў украінскіх студэнтаў – каля сотні чалавек, яны мелі свой студэнцкі дом. З украінцамі ў нас былі цесныя сувязі, а зь некаторымі зь іх мы засталіся сябрамі на дзесяцігодзьдзі. Адзін з тых студэнтаў – пазьнейшы старшыня Таварыства імя Тараса Шаўчэнкі ў ЗША Жэнька Федарэнка – быў маім сябрам, мы часта радзіліся зь ім у розных справах і ў ЗША.

Быў у нас кантакт з мадзярскімі студэнтамі, і на дэбатах у міжнародным студэнцкім цэнтры яны заўсёды падтрымоўвалі нашу палітычную пазыцыю.

Расейскія студэнты ў Лювэне вучыліся ад 1920-х гадоў. Іх было няшмат, але і ў іхным цэнтры бывалі палітычныя даклады. Сярод іх найбольш было прыхільнікаў НТС (Народно-Трудовой Союз), і зборкі ў іх бывалі досыць бурлівыя. Папулярны сярод студэнтаў у Лювэне

быў расейскі Тацянін дзень (у студзені), калі студэнцкая грамада бывала на добрым падпітку.

Былі кантакты і з балтыйскімі студэнтамі. Найбольш у Лювэне было латышоў, менш літоўцаў і зусім мала эстонцаў.

Вядомая справа, у Лювэне было шмат польскіх студэнтаў – яны мелі некалькі інтэрнатаў. У тыя часы іх студэнцкая грамада была ня надта моцная, сярод палякаў быў палітычны разлад у пытаньні: як ставіцца на Народнай Польшчы. Спрэчкі над гэтым займалі ў іх найбольш энэргіі.

У шматнацыянальным студэнцкім жыцьці мы, беларускія студэнты, былі вельмі актыўныя, і таму ў Лювэне пра Беларусь ведалі.

Пэр Рабэр

Прыпамінаючы студэнцкія гады ў Лювэне, бясспрэчна, нельга абмінуць чалавека, прысутнасьць якога адчувалася заўсёды – гэта айцец Рабэр ван Каўэлярт. Барыс Рагуля і Ян Запруднік у сваіх успамінах шмат напісалі пра гэтага манаха-бэнэдыктынца, «апекуна» беларускіх студэнтаў. Ён быў з старой бэльгійскай шляхоцкай сям'і, і паводле традыцыі ў кожнай сям'і быў нехта, хто прысьвяціў сябе працы на рэлігійнай ніве, і так ён пастрыгся ў манахі, атрымаў добрую тэалягічную адукацыю і аддаўся справе аб'яднаньня цэркваў усходняй і заходняй, праваслаўнай і каталіцкай – быў уніятам. У яго было замілаваньне да ўсходніх царкоўных сьпеваў і традыцыяў, і так ён стаў апекуном беларускіх студэнтаў, гаспадаром Беларускага дома. Праўда, кіравала домам Беларускае студэнцкае згуртаваньне, дзе быў старшыня, заступнік, скарбнік, і самі студэнты пілнавалі, каб у доме быў парадак. Свае правілы ў Беларускім доме былі – напрыклад, нельга было слухаць радыё пасьля адзінаццатай, але наагул не было ніякіх абмежаваньняў – вядома, нельга было ладзіць выпіўкі, але прыходзіць можна было калі хочаш, у студэнтаў былі свае ключы – адчыняеш браму-дзьверы і заходзіш.

Жыў айцец Рабэр у студэнцкім доме і быў там фактычна скарбнікам – пад ягонай адказнасьцю былі ўсе фінансавыя справы беларускіх студэнтаў. Фармальна айцец – ці, як мы яго называлі, пэр Рабэр прадстаўляў бэльгійскую арганізацыю Камітэт дапамогі беларускім студэнтам. Роля айца Рабэра ў кіраваньні Беларускім студэнцкім домам была хутчэй сымбалічная, аднак аўтарытэт у яго быў велізарны. Усе студэнты яго вельмі паважалі і раіліся зь ім і ў студэнцкіх, і ў асабістых справах. Ясна, былі студэнты, зь якімі ён быў бліжэй, а былі й такія, што мелі зь ім толькі фармальныя дачыненьні.

Вельмі часта да студэнтаў прыяжджалі знаёмыя, ім трэба было недзе пераначаваць, і пэр Рабэр заўсёды дапамагаў. Месца ў доме

было ў абрэз – усе пакоі занятыя, у кожным па два-тры, а часам і чатыры чалавекі, дадатковых ложкаў не было, дык пэр Рабэр знаходзіў бэльгійскую сям'ю або гатэльчык, дзе было крышку таньней.

У тыя часы мы не маглі сабе дазволіць купіць на цэлы дом пральную машыну, таму раз на тыдзень прыяжджала машына, якая забірала нашу бялізну і праз тыдзень прывозіла назад. Нехта аплачваў усе гэтыя рахункі, усё дапілноўваў – і адміністрацыяй гэтае будзёншчыны займаўся пэр Рабэр.

Калі на нашы запросіны прыехаў спадар Равенскі, ён быў у поўным здароўі. Я ім найбольш апекаваўся, бо ён ведаў маіх бацькоў зь Менску, таму мы былі даволі блізкія. Тым больш, што ён быў знаёмы і з Савёнкамі – дык мы з Зорай шмат яму дапамагалі, найчасьцей нас было трое – я, Вострыкаў і Зора. Але калі Равенскі захварэў і трэба было зь ім у шпіталь, дык за гэта ўзяўся пэр Рабэр. Хварэў Равенскі пару гадоў, у яго быў рак лімфатычных сасудаў, хвароба зацяжная – мяняліся шпіталі, мяняліся дактары, усім гэтым апекаваўся пэр Рабэр.

Я асабіста быў зь ім блізкі, але, думаю, ня быў у ліку ягоных найбліжэйшых сяброў і дараднікаў. Што мяне ўражвала ў айцу Рабэру, дык гэта ягонае разуменьне і адданасьць беларускай справе: ён пашыраў імя Беларусі дзе мог (а сувязі ў яго былі надзвычайныя!) – гаварыў пра Беларусь, пісаў, дзе мог падаваў як прыклад. Як мне здаецца, ён зразумеў Беларусь – будучы радавітым, адукаваным фламандцам, адначасна адчуваючы сябе роўным і ў французскамоўным культурным асяродзьдзі (якое «заглушала» флямандзкасьць), пэр Рабэр зразумеў праблему і беларусаў – глыбокую русыфікацыю, велізарнае жаданьне беларусаў вырвацца з расейскага поля прыцягненьня, тым часам як шырокая грамадзкасьць гэтай праблемы не разумела. Флямандзец зразумеў беларусаў і як мог ім дапамагаў. Я ўпэўнены: тое, чаго беларуская студэнцкая грамада дасягнула ў Лювэне, не было б магчымым, калі б не было пэра Рабэра.

Беларускі дом як інтэрнат для беларускіх студэнтаў праіснаваў да сярэдзіны 60-х гадоў. Пэра Рабэра нібыта за мяккацеласьць у дачыненьні да студэнтаў пакаралі і паслалі ў Афрыку на місійную працу. Там ён прабыў гадоў дваццаць, потым, кажуць, прыехаў у Лювэн, захварэў і памёр.

Студэнты і беларуская палітыка

Што да паваенных беларускіх палітычных падзелаў, то студэнты ў Лювэне на 99 працэнтаў падтрымлівалі Міколу Абрамчыка, выключэньнем былі я і Сянькоўскі. Мы былі «стрыманыя» БНРаўцы: было відавочна, што БНР як беларускае прадстаўніцтва была тады больш на часе, але з тым, каб ганьбіць беларускую працу падчас нямецкай

акупацыі, адмаўляцца ад яе, мы пагадзіцца не маглі. Было яшчэ зь дзесяток студэнтаў нэўтральных, якіх абсалютна не цікавіла беларускае палітычнае жыцьцё.

Бывалі і канфлікты, а пра адно здарэньне варта і прыгадаць, бо яно ніколі не было задакумэнтаванае. Недзе вясной 1953 году Юрка Сянькоўскі, прыехаўшы зь Нямеччыны, кажа мне, што ён запрасіў Радаслава Астроўскага ў Лювэн для сустрэчы з студэнтамі – Астроўскі будзе ехаць з Англіі і на дзень-два спыніцца ў Лювэне. Я Юрку адразу кажу, што ён паступіў няправільна. Рэглямэнт студэнцкага дому быў зусім ясны: любыя запросіны дакладчыкаў, палітыкаў павінны ўзгадняцца з кіраўніцтвам студэнцкага згуртаваньня. Гэта была дысцыпліна, і мы з гэтым патрабаваньнем пагаджаліся. Аднак, кажу я Сянькоўскаму, калі ўжо запрасіў і Астроўскі будзе ехаць празь Лювэн – я пайду перагавару з пэрам Рабэрам, як такую справу палагодзіць. Я прыхіляўся да думкі, каб з Астроўскім сустрэцца. Айцец Рабэр – чалавек аб'ектыўны і таксама прыхільны да сустрэчы – кажа мне, што парушаць рэглямэнт студэнцкага дому нельга, але ён, айцец Рабэр, замовіць і заплаціць Астроўскаму пакой у гатэлі, і ў тым самым гатэлі студэнты могуць зь ім сустрэцца. Так гэтая справа і вырашылася: Астроўскі спыніўся ў гатэлі (за гатэль ён заплаціў сам), а мы зь Сянькоўскім наладзілі сустрэчу. Прабыў Астроўскі ў Лювэне дня паўтара – гутарыў зь дзесятком студэнтаў, а таксама з айцом Рабэрам. Большай лучнасьці з Астроўскім не было, хоць часам, калі паўставала грамадзкая патрэба, абменьваліся лістамі.

Частым госьцем у Лювэне быў прэзыдэнт Рады БНР Мікола Абрамчык, раз быў Лявон Рыдлеўскі, доктар Станіслаў Станкевіч, Пятро Сыч і дзесяток іншых беларускіх дзеячоў.

Рэгулярныя студэнцкія сходы адміністрацыйнага парадку адбываліся штомесяц. Але бывалі сходы спэцыяльныя – палітычнага профілю – і гэткія сходы бывалі бурныя. Асабліва прыпамінаецца палітычны сход, скліканы з ініцыятывы студэнтаў, калі Папа рымскі ў 1952 годзе выдаў дакумэнт «Да народаў Расеі». Гэта выклікала вялікі выбух абурэньня ў нашым доме і ў украінцаў – былі зборкі, былі прынятыя рэзалюцыі ў тым сэнсе, што папа мусіць зьвяртацца да кожнага народу асобна, а не да «народаў Расеі». Беларуская рэзалюцыя была складзеная ў нагэтулькі рэзкай форме ў дачыненьні да Рыму, што старшыня (здаецца, гэта быў Рамук) склікаў другі сход, каб перагледзець фармулёўкі. Але і другі сход падтрымаў рэзкі характар рэзалюцыі. Пэру Рабэру было цяжкавата, бо копія рэзалюцыі слалася таксама ў рэктарат. Але рэктарат і ўнівэрсытэт наагул ніяк на гэта не зрэагавалі – прынялі рэзалюцыю, падшылі ў справу і, мабыць, нікому яе й не паказвалі.

Рэакцыя на вострую ў дачыненьні да Рыму студэнцкую рэзалюцыю была з боку япіскапа Слосканса (яму таксама была высланая

копія рэзалюцыі). Япіскап Слосканс у гутарцы зь Вітаўтам Рамуком зазначыў, што рэзалюцыя была вострая, але наша студэнцкая пазыцыя – правільная, і што калі Рым мае нешта сказаць, дык мусіць выказвацца да кожнае нацыі асобна, а не да «народаў Расеі».

Наогул студэнцкія сходы былі сьведчаньнем таго, што ў студэнцкім доме ўсё ідзе нармальна, яны былі выдатным форумам для залагоджаньня як штодзённых праблемаў, так і ідэалягічных спрэчак.

Курсы беларусаведы

Студэнты па сваёй падрыхтоўцы ў беларусіцы былі «разнашэрсныя». За тыя гады, што я быў у Лювэне, беларусаў прайшло чалавек панад пяцьдзясят. Зь іх беларускія школы скончыла чалавек дзесяць, рэшта людзей ня мела ніякага досьведу беларускай школы – яны канчалі польскія школы або савецкія дзесяцігодкі і ў беларускім пытаньні былі неабазнаныя.

Каб хоць крыху зьліквідаваць «прагалы» ў беларусазнаўстве ў студэнтаў, было вырашана наладзіць курсы лекцыяў выключна на добраахвотных пачатках. Настаўнікамі-лектарамі згадзіліся быць Аляксей Арэшка, Янка Запруднік, Васіль Шчэцька, Вітаўт Кіпель, Юры Сянькоўскі, Уладзімер Цьвірка, Алесь Марговіч. Лекцыі працягваліся год-два, праслухалі іх амаль усе студэнты. У тым самым часе мы «ўпрыгожылі» асноўную залю дому, дзе адбываліся лекцыі, вялікай картай Беларусі, якую намаляваў Міхась Саўка. Уважаю вельмі дадатнай зьявай правядзеньне тых беларусаведных лекцыяў сярод студэнтаў у Лювэне.

Пачаткі «Халоднай вайны»: студэнты і спэцслужбы

Сыстэмнае супрацьстаяньне Захаду і Ўсходу пачалося ад другой паловы 1940-х, аформілася мілітарна з стварэньнем НАТО ў 1949 годзе, а ад пачатку 1950-х на поўную пару ішла «Халодная вайна». Эмігранты з усходнеэўрапейскіх краінаў, нядаўнія DP, пільна сачылі за разьвіцьцём падзеяў, і нязгаслыя спадзяваньні павароту на бацькаўшчыны бадай штодня падмацоўваліся паведамленьнямі ў друку і радыё, выступамі палітыкаў. Вядома ж, беларускія студэнты не былі выключэньнем што да палітычных настрояў сярод усходнеэўрапейскіх уцекачоў – усе спадзяваліся на вайну і, бясспрэчна, на перамогу Захаду. Здавалася, што вось-вось пачнуць разгортвацца падзеі! Хадзілі чуткі, што нібыта недзе нехта ўжо фармуе нейкае войска. Усе кругом мелі антысавецкія настроі і былі гатовыя вярнуцца са зброяй.

У гэтым мілітарысцкім ажыятажы было прыдатнае поле дзейнасьці для спэцслужбаў, у чыіх колах, напэўна, лініі фінішу ў змаганьні з камунізмам былі адсунутыя на дзесяцігодзьдзі наперад (калі такія наагул былі). Аднак праца працай, калі ёсьць грунт – трэба дзейнічаць. Тысячы былых жаўнераў яшчэ не распакавалі валізкі, дый за паваенныя гады падрасло і маладое пакаленьне. Сярод студэнтаў і работнікаў было ці мала людзей, гатовых змагацца з савецкім рэжымам і ў падпольных умовах. Прадстаўнікі спэцслужбаў такіх і шукалі. У студэнцкіх дамах, прыкладам, у Беларускім студэнцкім доме ў Лювэне, вывешваліся абвесткі з запрашэньнем на сустрэчы з прадстаўнікамі розных арганізацыяў, камітэтаў.

Аднойчы маю з Зорай увагу прыцягнула абвестка аб магчымасьці павучыцца сэмэстар-два ва ўнівэрсытэце ў Страсбуры (Францыя), дзе ў летнія месяцы будуць выкладацца прадметы па ўсходнеэўрапейскай гісторыі і палітыцы. У абвестцы было напісана, што зацікаўленыя могуць пагутарыць у гэтай справе з прадстаўнікамі такой і такой арганізацыі ў фае такога і такога гатэлю. У вызначаны час мы прыйшлі ў прызначанае месца. Бачым – стол, пры стале – паперка з надпісам: «Зацікаўленыя студэнты зь беларускага інтэрнату». Каля стала – пару прыстойных джэнтэльмэнаў, прывіталіся, сказалі, што яны прадстаўляюць «Кааліцыю дапамогі студэнтам». Гутарка пачалася прыблізна так: што студыюеце, на якім сэмэстры, ці зацікаўленыя Беларусьсю, ці хацелі б вучыцца далей толькі ў Страсбуры або ў іншым унівэрсытэце, краіне? Гутарка ішла вельмі памалу – «інтэрвіюэры» былі добра падрыхтаваныя і ў беларускіх пытаньнях – ведалі што робіцца ў Беларусі, былі знаёмыя зь беларускімі студэнтамі ў Нямеччыне. Так працягвалася гадзіны дзьве, і ў выніку «скрышталізавалася» такая магчымасьць: мы зможам студыяваць у Страсбурскім унівэрсытэце або ў нейкім унівэрсытэце ў ЗША, але па сканчэньні студыяў – калі мы згодзімся на іхныя ўмовы – нам давядзецца праехаць «для пашырэньня нашага кругагляду» і ва Ўсходнюю Эўропу (Польшчу), а магчыма і ў Савецкі Саюз. На такой невыразнай ноце гутарка і скончылася. Мы з Зорай сказалі, што навуку будзем заканчваць у Лювэне. Разышліся мы з тымі інтэрвіюэрамі ў добрых дачыненьнях і... больш ніколі не сустракаліся.

Падобныя інтэрвію-кантакты адбываліся і зь іншымі студэнтамі і, здаецца, сярод мадзярскіх студэнтаў пару чалавек паехалі на студыі ў Страсбур.

Падкрэсьлю: настрой сярод усходнеэўрапейскіх уцекачоў, работнікаў у шахтах, студэнтаў быў такі, што вайна з Савецкім Саюзам пачнецца непазьбежна, і магчымае і прымальнае супрацоўніцтва зь любым саюзьнікам супраць СССР.

У атмасфэры такога настрою адбывалася і вярбоўка парашутыстаў. Зь беларусаў у гэтую акцыю ўключыліся выдатныя беларускія

патрыёты – Янка Філістовіч, Міхась Вострыкаў, Міхась Кальніцкі і іншыя, якіх я ня ведаў. Філістовіча я ведаў вельмі мала, але з Вострыкавым доўгія гады быў у сяброўскіх дачыненьнях, ведаў ягоны настрой і магу сказаць, што той крок ён рабіў абдумана і пераканана. Падобны глыбока антысавецкі настрой быў і ў Кальніцкага, зь якім я блізка супрацоўнічаў у Саюзе Беларусаў у Бэльгіі. Ён ня раз выказваў шкадаваньне, што апынуўся на Захадзе, а не застаўся ў антысавецкіх партызанах.

Што ў эміграцыі ведалі пра паваенную Беларусь

Бальшыня студэнтаў, вядома ж, хацела ведаць як мага больш пра Беларусь – Беларусь была ў думках у кожнага, вельмі малы працэнт студэнтаў думалі атайбоўвацца на Захадзе.

Усе добра ведалі ранейшую Беларусь, даваенны рэжым, ад якога ўцякалі, зь якім змагаліся – хто зброяю, хто словам. Але, на жаль, інфармацыя пра паваенную Беларусь траплялася толькі спарадычна. Былі перабежчыкі, ладна вестак даваў таксама «вялікі» французскі друк, але сыстэматычнай інфармацыі не было.

Калі ж гаварыць пра савецкі друк, дык праблемаў з атрыманьнем гэтай пісаніны ніколі не было. Яшчэ з часоў UNRRA савецкія агенцтвы стараліся, каб іх друк трапіў да ўцекачоў. Прыпамінаю, што яшчэ ў лягеры Міхельсдорф – гэта было прыблізна ў 1946 годзе – амэрыканцы прывезьлі цэлую скрынку савецкіх часапісаў. Я памятаю, як Барыс Шчорс паказаў мне тыя часапісы (я кіраваў скаўтамі, і Шчорс думаў, ці ня даць іх у скаўцкую бібліятэку), але я параіў яму аддаць тыя часапісы Юрку Віцьбічу.

У Бэльгіі беларускія савецкія часапісы «Полымя» і «Беларусь» прадаваліся ў магазыне «Цэлы сьвет». Ясна, савецкаму друку ніхто не давяраў, ніхто яго ня браў сур'ёзна. Падсьмейваліся з савецкага друку як крыніцы інфармацыі і бэльгійскія газэты. Праўда, больш мы ведалі пра Польшчу, бо з Польшчай каталіцкая царква на Захадзе мела кантакты і праз царкву інфармацыя – больш праўдзівая або прынамсі менш савецкая – трапляла ў шырокі друк.

Што «астудзіла» беларускую студэнцкую грамаду, як зрэшты і шмат каго на Захадзе – гэта сытуацыя вакол сьмерці Сталіна. Калі прыйшла вестка пра ягоную сьмерць, мы – эмігранты – думалі, што народ, які мы ўважалі «паняволеным», узьнімецца і ўзбунтуецца. Так думалі і заходнія назіральнікі. Але гэтага ня сталася! Як пісалася ў друку і ў чым мы пазьней пераканаліся ў гутарках зь землякамі, людзі (праўда, ня ўсе!) плакалі! Гэтая падзея падарвала і нашыя заходнія спадзяваньні, што за Жалезнай заслонай усталюецца дэма-

кратыя – калі ня поўная, дык хоць бы нешта падобнае да Югаславіі. У мяне асабіста настаў нейкі пералом у паглядах, бо ў часы майго дзяцінства – таксама сталіншчыны – Сталіна народ не любіў. Я ў сваёй галаве сьпісваў перамены ў стаўленьні савецкіх людзей да Сталіна на перамогу ў вайне. Выйшла так, што антысавецкасьць савецкіх людзей на Захадзе пераацанілі – яны ўсё ж прынялі сыстэму, і Сталін, як выглядае, быў для іх аўтарытэтам.

Фактычна па сьмерці Сталіна мы паступова пачыналі прыходзіць да думкі, што перамены ў СССР – справа далёкай будучыні і што наўрад ці яны адбудуцца без ваеннага канфлікту. Мімаволі, але ўсё мацней і мацней станавілася рэальнасьцю думка пра тое, што, відаць, давядзецца заставацца на Захадзе.

Радыё Свабода і Інстытут па вывучэньні СССР

У той час «на поўную пару» дзейнічаў Інстытут па вывучэньні СССР. Была група людзей старэйшых і маладзейшых – я, айцец Гарошка, Кабыш, Адамовіч, Станкевіч, Яловіч, Запруднік – і з інстытутам пачалося супрацоўніцтва. Безумоўна, былі такія, як Урбан і Марговіч, якія пазьней поўнасьцю працавалі ў інстытуце, але тым ня менш інстытут меў сваіх супрацоўнікаў і па-за Мюнхенам. Да мяне з інстытуту часта зьвярталіся, каб дапамог знайсьці інфармацыю пра вытворчасьць солі або іншых выкапняў у Беларусі. Я напісаў пару артыкульчыкаў для дырэкцыі пра падрыхтоўку геолягаў, а таксама інжынэраў. Інстытут сярод іншага вывучаў сур'ёзна стан эканомікі ў Савецкім Саюзе. Пару разоў я езьдзіў у Мюнхен на канфэрэнцыі – у 1954, 1955 гадах. З часам інстытут пачаў заваёўваць аўтарытэт – я ў гэтым пераканаўся, калі прыехаў у Злучаныя Штаты. Для мяне зусім не было дзіўна, калі на пачатку 60-х гадоў кіраўніцтва Савецкага Саюзу запатрабавала зачыніць гэты інстытут, і немцы пайшлі ім насустрач і зачынілі яго (а амэрыканцы згадзіліся!).

Штодзённы побыт

Ясна, што галоўнае, чым жыў кожны студэнт, была навука. Затым былі грамадзкія абавязкі: удзел у хоры, грамадзкіх арганізацыях. Заставалася трохі часу і на «звычайнае жыцьцё».

Што мы рабілі ў вольны час? Перш-наперш хадзілі ў кіно. Кіно было найбольшай аддушынай у напружаным жыцьці ў Лювэне. У горадзе было некалькі кінатэатраў, а фільмы мяняліся штотыдня, выбар быў. Квіток у кінатэатар каштаваў 7-10 франкаў. Ішлі пераважна фільмы амэрыканскія, але былі таксама выдатныя французскія і італьянскія. З амэрыканскіх фільмаў найбольшае ўражаньне пакінуў «High Noon», а з французскіх хітом быў любы фільм з Фэрнандэлем.

Апрача кіно пару разоў на тыдзень хадзілі ў піўныя бары папіць піва (з бэльгійскіх напояў студэнтам найбольш смакавала піва Stella Artois), а таксама пагуляць у більярд або настольны футбол. Трэба сказаць, што ўсё лювэнскае студэнцтва любіла бары, а ў барах часта пілося ў доўг – бармэн запісваў кліента «на сьценку»: «той з вусамі» або «тоўсты» выпіў столькі і столькі – адзначалася на дошцы палачкамі, а расплачваліся пазьней. Быў поўны давер.

Папулярны быў і тэатар. Мы з Зорай бадай кожны тыдзень езьдзілі ў тэатры – у Брусэлі было дваццаць-трыццаць тэатраў, большых ці меншых, дык думаю, мы ў Брусэлі мала прапусьцілі прэм'ераў.

Зь Лювэну ў Брусэль хадзілі цягнікі, аўтобусы і трамваі, даезд быў вельмі лёгкі. Цягнік быў найдаражэйшы, тады аўтобус, а найтаньнейшы – трамвай, але трамвай ішоў найдаўжэй, бо спыняўся ва ўсіх маленькіх вёсачках, маршрут трамвая быў пракладзены так, каб ахапіць найболей населеных пунктаў. Аднак мы езьдзілі пераважна аўтастопам – выходзіш на дарогу, паднімаеш руку і «ловіш» машыну. Час ад часу з намі езьдзіў нехта яшчэ – найчасьцей Юрка Сянькоўскі або Аляксей Арэшка.

Аднаго разу Зора купіла тры білеты на п'есу Сашы Гітры, вельмі папулярнага актора і драматурга, і мы выбраліся ўтрох зь Юркам Сянькоўскім. Ну, вядома, як ідзеш у тэатар, дык крышку прыадзенесься, пачысьціш чаравікі, каб выглядаць «пры парадзе», як казалі франкамоўныя бэльгійцы – endimanché. Выйшлі мы загадзя на краі Лювэну на шашу, каб нас нехта падабраў да Брусэлю. Тром сесьці ў адну машыну не заўсёды ўдавалася, дык мы дамовіліся, дзе сустрэнемся, калі даедзем паасобку – каб не разгубіцца. І раптам бачым – едзе катафалк, мы махаем рукой, і ён спыняецца, пусты. Мы селі ў катафалк, і даехалі на ім да самага тэатру. Падарожжа ў катафалку запамяталася.

Былі і іншыя забавы інтэлектуальнага профілю. Час-часом былі палітычныя мітынгі, так, прыкладам, прыяжджаў з дакладам у Лювэн Пол-Генры Спаак, вялікая палітычная фігура. Я часта бываў у фламандзкіх культурных цэнтрах і пазнаваў дасягненьні гэтага народу.

Былі ў Лювэне шахматна-шашачныя клюбы, заходзілі мы і туды. Але найчасьцей наведвалі «Кола студэнтаў-чужынцаў», дзе штодня адбываліся даклады на розныя тэмы.

Дзень Сьвятога Мікалая

Падчас навукі ў унівэрсытэце напружаньне было вялікае, вучыцца трэба было шмат, трэба было здаваць экзамэны – па-французску. Грамадзкая праца таксама займала ладна часу. Але часам надараліся вальнейшыя дні – свайго роду аддушына. Прыкладам, у сьнежні ўнівэрсытэт адзначаў Дзень Сьвятога Мікалая – яго адзначала цэлая

Бэльгія, каталіцкая краіна. Дык у нас у студэнцкім доме ў гэты дзень было цэлае сьвята, спэцыяльны абед і нават мастацкая частка сіламі студэнтаў. Найбольшым прыхільнікам сьвята і цырымонімайстрам быў Васіль Шчэцька – ён рыхтаваў народныя прыпеўкі пра Мікалая, прыкладам:

Йшоў Мікола з таго сьвету,
рымда-рымда-го,
йшоў Мікола з таго сьвету,
рымда-рымда-рымда-го,
аглянуўся – торбы нету,
го-го-го...

Гэта торбу з падарункамі, якую ён нёс, студэнты скралі...

Стаў Мікола варажыці,
рымда-рымда-го,
стаў Мікола варажыці,
рымда-рымда-рымда-го,
дзе мог торбу ён згубіці,
го-го-го...

І прыпомніў наш Мікола,
рымда-рымда-го,
і прыпомніў наш Мікола
рымда-рымда-рымда-го,
што ў лунацікаў быў учора,
го-го-го...

Лунацікі – гэта студэнты, якія позна прыходзілі зь піўнушкі, тэарэтычна трэба было быць у хаце да 10-й ці 11-й, а яны прыходзілі а 2-й, а 3-й...

Флямандцы

У беларускіх студэнтаў быў адзін мамэнт «вінаватасьці» – мы адчувалі, што нам трэба было больш быць зарэгістраванымі на флямандзкім факультэце. Флямандцы нам былі бліжэйшыя, яны змагаліся за сваю ідэнтычнасьць, імкнуліся вызваліцца ад цяжкога культурнага ціску французчыны, бо яна панавала над флямандцамі і пануе да сёньня. Вельмі шмат флямандцаў – нягледзячы на тое, што гэты народ вельмі шмат даў і ў культуры, і ў мастацтве, і ў літаратуры (Тыль Уленшпігель і іншыя пэрсанажы) – адчувалі ў сабе комплекс другараднасьці. І мы, беларускія студэнты, разумелі, што трэба было і вучыць флямандзкую мову, і больш быць з флямандзкімі студэнтамі. З другога боку мы ведалі, што нам патрэбная французская мова, мы ў масе сваёй мала яе вывучалі, больш пашыраная была нямецкая. І ўсё ж на арганізацыйным узроўні ў нас было больш кантактаў з флямандзкімі, чым з французскімі студэнтамі. Я сам ча-

ста хадзіў на зборкі флямандзкіх студэнцкіх арганізацыяў, а калі трэба было нешта сказаць, то карыстаўся нават нямецкай мовай – для іх гэта было больш прымальна, яны былі больш задаволеныя, калі зь імі гаварылі па-нямецку, а не па-французску.

Флямандзкую мову вывучала Зоя Жалязоўская, Люда Рагуля і, здаецца, Віктар Даўгаленка, быў такі малады студэнт, і больш ніхто.

Лета ў манастыры

Лювэнскае студэнцкае жыцьцё было такое, што вы рыхтуецеся да экзамэнаў, неабходна гэтыя экзамэны здаць увесну, каб мець свабоднае лета. Калі вы не здалі экзамэны ў веснавую сэсію, якая цягнецца да сярэдзіны чэрвеня, то трэба рыхтавацца летам. Бэльгійцы звычайна едуць да бацькоў і там рыхтуюцца, а нам быў выбар – сядзець у студэнцкім доме, дзе ня будзе ні кухні, ні іншых бытавых выгодаў, і трэба самому харчавацца, альбо нам прапаноўвалі ехаць у манастыры, дзе за мінімальную працу – дзьве-тры гадзіны – можна было заставацца цэлы дзень і ноч і вучыцца. І так мы, тыя, хто ня здаў веснавую сэсію, разьяжджаліся рыхтавацца па манастырах. Я два разы ня здаў экзамэнаў у першай сэсіі і бываў летам у манастырах.

Адзін раз, думаю, гэта было ў 1950 годзе, я быў у езуіцкім манастыры Алькен на поўначы Бэльгіі – поўнасьцю флямандзкім. Я там пасябраваў з адным сьвятаром-езуітам, расказаў яму пра беларускую літаратуру і прачытаў яму па-нямецку Багдановічаў верш «Ёсьць на сьвеце такія бадзягі, што ня вераць ні ў Бога, ні ў чорта – ім прыемны стракатыя сьцягі караблёў акіянскага порта...» у перакладзе Энгельгарта. Праз два дні ён паклаў гэты верш на музыку! І мы зь ім развучылі і сьпявалі пад гітару, нават пару манахаў далучылася: «Es wandern gar viele Gesellen, die von Gott und dem Teufel nicht wissen...». Асабліва тым манахам спадабаўся радок, што «ня вераць ні ў Бога, ні ў чорта».

Тыя ноты так і засталіся ў тым манастыры – думаю, у іхнай бібліятэцы яны й да сёньня недзе ляжаць, бо ў тых манастырах кожная паперачка захоўваецца, не выкідаецца стагодзьдзямі.

Наагул, флямандцы нас разумелі – мы народ, пра які мала ведаюць, які пад культурным і палітычным ціскам Расеі, які русыфікуецца. Яны праводзілі паралель, параўноўвалі сваю сытуацыю пад ціскам французаў.

Так мы летам і праводзілі па два-тры месяцы ў манастырох. Недзе ў 1951 годзе я быў у манастыры каля Антвэрпэну ў мясцовасьці Брасхат у французскамоўных «белых сьвятароў». Мы там былі разам зь Цімохам Вострыкавым і Юркам Сянькоўскім. (Якраз там нам Вострыкаў сказаў, што прадаўжаць ён вучыцца ня будзе, а будзе шукаць шляхоў, як вярнуцца на Бацькаўшчыну. Нам зь Юркам было

ясна, што ён уступіў у кантакты з амэрыканцамі, і ўсё ішло да таго, што хутка ён зьнікне.) Тыя манахі былі вельмі адчувальныя на тое, што мы, праваслаўныя, прыехалі да іх вучыцца на ўсё лета. І яны нам сказалі, што кожную нядзелю будуць нам даваць па 10 франкаў, каб мы абавязкова ехалі ў Антвэрпэн, бо там ёсьць расейская праваслаўная царква. Вострыкаў ім адразу кажа: «Вы мне хоць сто дайце – я не паеду!» – «Як? Аяяй, сыне мой, што ж гэта такое...» Дык мы ім цэлую лекцыю прачыталі, але яны не разумелі і ў нашых рэлігійных тонкасьцях зусім не арыентаваліся.

Вострыкаў, Кальніцкі і іншыя

З Вострыкавым мы пазнаёміліся ў Міхельсдорфе, як толькі туды перавялі беларускі лягер – ён зьявіўся аднекуль, пасьля я даведаўся, што ён працаваў у баўэра. Я жыў тады ў бурсе і пайшоў зь ім да Шчорса, дзе ён запісаўся ў лягер і афіцыйна стаў DP. Ён пачаў вучыцца – ня ведаю, у якой ён тады быў клясе, чацьвертай ці пятай – быў вельмі актыўны ў скаўтынгу і заўсёды бываў бліжэй да фізкультуры, фізычных практыкаваньняў. Наагул актыўна ўлучыўся ў грамадзкае жыцьцё з моладзьдзю.

Пасьля ён разам з «дванаццаткай» выехаў у Англію, тады я ніякай лучнасьці зь ім ня меў, пакуль ён з той «дванаццаткай» у сакавіку 1950 году не прыехаў у Бэльгію. У Бэльгіі Вострыкаў улучыўся ў грамадзкі рух, згадзіўся быць распаўсюднікам газэты «Бацькаўшчына». Рассылалі газэту мы ўтрох – Вострыкаў, я і Зора. У тым часе я зь ім часта езьдзіў па справах Саюзу Беларусаў Бэльгіі, бо фінансавы бок распаўсюду газэты вёў Саюз, таму ён меў зь ім больш справы, чым са студэнцкім згуртаваньнем. Я зь ім пару разоў езьдзіў на правінцыю, і ў Льежы мы блізка сышліся зь Міхасём Кальніцкім. Вучыўся ён у фізкультурным інстытуце, далей ад цэнтру гораду.

Больш мы зь ім зблізіліся падчас летняга побыту ў манастыры, дзе ён сказаў, што пляную пакінуць навуку. Перад Новым Годам (з 1951 на 1952) мы разам з Зорай утрох разам правялі цэлую навагоднюю ноч – пайшлі ў рэстаран, танцавалі... І тады ён сказаў, што скора паедзе на Беларусь. І неўзабаве паехаў.

Чуткі пра яго даходзілі праз радыё (Запруднік зь ім таксама вельмі сябраваў) – яго імя згадвалася, калі быў выбух у маскоўскім мэтро. Было цікавае супадзеньне: на адной з сустрэчаў з работнікамі я пазнаёміўся з адной сям'ёй, і яны хацелі свайго бацьку сьцягнуць зь Менску, бо той быў стары і ня мог жыць сам адзін. Той бацька – яго прозьвішча Круцько – адседзеў гадоў дзесяць. Ён быў у БКА, быў паранены і ляжаў у шпіталі. Калі прыйшлі саветы, то яго забралі ў савецкую армію, ён дайшоў да Бэрліну і ў 1946 годзе вярнуўся да сябе

недзе пад Вялейку. І вось у 1950 годзе яму кажуць, што хутка яго арыштуюць – быў нейкі знаёмы ў міліцыі, які перадаў. Дык ён пайшоў у партызаны і быў у лесе недзе да 1952 году. Тады яго з цэлай групай злавілі і засудзілі, далі 25 гадоў. А дачка гэтага чалавека, Галіна Харавец, была тут, і калі жанілася, на яе вясельлі быў і Вострыкаў. І недзе ўжо ў сярэдзіне 1950-х гадоў яна даслала бацьку, які сядзеў у турме, фатаграфію з свайго вясельля. А ён якраз быў у тым самым лягеры, што й Вострыкаў. Паказаў фатаграфію, а Вострыкаў яму кажа: а гэта я!

Пасьля таго, як Вострыкаў пазнаў сябе на фатаграфіі, той Круцько перапісваўся з дачкой і напісаў ёй, што сустрэўся з Вострыкавым. З гэтай весткі мы ведалі, што ён жывы.

Круцько, калі адбыў свой тэрмін, быў ужо стары – зь нейкага, можа 1914 году – і жыў адзін. Дык Галіна з братам старалася сьцягнуць яго ў Амэрыку. Яны папрасілі мяне дапамагчы. Я, маючы розныя кантакты з рэспубліканскімі коламі, зьвярнуўся да сэнатара Кэйса, лібэральнага рэспубліканца, які між іншага выступаў за тое, каб Радыё Свабода выйшла з падначаленьня выведкі і было перададзенае Кангрэсу. Кэйс узяўся дапамагчы, справа пайшла ў ход. І тады выйшла так: мяне аднойчы паклікалі ў офіс сэнатара і там сказалі, што ніяк ня могуць сьцягнуць яго сюды, бо яго судзілі паводле артыкулу «бытавы бандытызм», а гэта крымінал. На тым тая справа і скончылася.

І вось аднойчы ў Менску, здаецца, у 1993 годзе, падчас зьезду, сядзім мы на сьнеданьні ў гатэлі і бачым здалёк Вострыкава, які некага шукае вачыма. Першым ён убачыў Зору, яны абняліся. Тады яшчэ ў «Голасе Радзімы» была вялікая фатаграфія, як ён вітаецца і абдымаецца з Зорай і Алесяй.

Зь Міхасём Кальніцкім мяне пазнаёміў Уладзюк Рыжы ў 1949 годзе. Кальніцкі быў старшынём аддзелу СББ у Льежы, быў вельмі актыўны. Ягоныя бліжэйшыя памочнікі былі Мікола Калінка і Валодзя Сітнік. Гэтыя ведалі, што Міхась не жадае заставацца на Захадзе, а марыць змагацца з саветамі. Калі Калінка і Сітнік – таксама былыя жаўнеры БКА- выбіраліся з Бэльгіі ў ЗША, Кальніцкі «паляцеў» на Ўсход...

Дасьледаваньне сьлюдаў

Калі я скончыў унівэрсытэт і атрымаў дыплём, паўстала пытаньне – што далей. На эміграцыю за акіян ехаць не хацелася, Зоры яшчэ заставаўся год – яна заканчвала тэзу. Дык было няясна – што рабіць.

Праўда, у гэтым часе я падпрацоўваў для нафтавай кампаніі Shell, але гэта былі толькі падпрацоўкі, а дайшло да іх так.

На восьмым сэмэстры (на чацьвертым годзе) прафэсар Франс Гю-

лентопс з флямандзкага аддзяленьня зьвярнуўся да мяне з пытаньнем, ці не хацеў бы я падрабляць, вывучаючы фарамініфэры – гэта цэлая кляса палеанталягічных скамянеласьцяў чацьвярцічнага пэрыяду – для кампаніі Shell. Я згадзіўся – мне гэта давала добры падработак, пару тысячаў франкаў за месяц. І калі я скончыў унівэрсытэт, Гюлентопс пытаецца, што я зьбіраюся рабіць далей. Дакладна адказаць прафэсару я ня мог – я быў на раздарожжы. Бачачы гэта, ён кажа: ты маеш добрую тэарэтычную падрыхтоўку, нядрэнна справіўся практычна з аналізам фарамініфэраў – чаму б табе не перайсьці на спэцыялізацыю нафтавіка (у Лювэне такой спэцыялізацыі не было). Гюлентопс параіў мне ехаць у Парыж і паступіць у Найвышэйшы інстытут нафты (Institut supérieur du pétrole), дзе я мог бы атрымаць спэцыяльнасьць геоляга-нафтавіка. Пару дзён падумаўшы, паехаў я ў Парыж, фактычна паехалі мы разам з Зорай, бо ў яе быў вольны час. У Парыжы я спыніўся ў YMCA, а Зора – у знаёмага Аўгена Трусава. Было гэта ў канцы верасьня, калі якраз можна было здаваць экзамэны ў Інстытуце нафты. Здавалі экзамэны каля дзесятка геолягаў з Гішпаніі і Нямеччыны, і я з Бэльгіі. Экзамэн быў для мяне няцяжкі – я яго здаў і быў залічаны ў інстытут, мне сказалі, што я магу адразу мець кантракт на працу, яны мяне пашлюць у Габон, у Афрыку.

У міжчасе на адрас Зоры прыйшоў ліст ад майго прафэсара Таро, зь якім я пару разоў меў гутаркі наконт таго, каб рабіць у яго дактарат. У лісьце Таро казаў, што магчымасьць працаваць над дактаратам ёсьць – каб я прыяжджаў адразу. Зноў раздарожжа! І хоць мне паведамілі, што я залічаны ў Інстытут нафты, я вырашыў вярнуцца ў Бэльгію.

У Бэльгіі прафэсар Таро мне кажа: ёсьць магчымасьць рабіць дактарат. Вялікая бэльгійская мінэральная кампанія Union minière мае цікавую нявырашаную праблему. Ім трэба разгадаць геалягічную загадку – ці магматычныя растворы праходзілі праз пэўныя мясцовасьці, бо знойдзеныя ў тым раёне сьлюды-лепідаліты (сьлюды з утрыманьнем элемэнту літыю) багатыя на літый. Аналіз сьлюдаў можа сьведчыць, што ў тых мясцовасьцях могуць быць радовішчы літыю. Кампанія дае стыпэндыю на дасьледаваньне тых сьлюдаў, а тэма падыходзіць да доктарскае распрацоўкі.

Я, безумоўна, згадзіўся і запісаўся на дактарат.

Трэба было прааналізаваць розныя віды сьлюдаў – іх было каля ста дваццаці, усе прывезеныя з Афрыкі. Кампанія асобна за працу не плаціла, але поўнасьцю аплачвала навуку, жытло, пражыцьцё. Зрабіць працу трэба было хутка – на працягу двух-трох гадоў.

На мяне адразу абрынулася гара працы – столькі трэба рабіць аналізаў. Мне далі тэхнічную дапамогу, але я зразумеў, што ў мяне не хапае навыкаў рабленьня некаторых аналізаў. Досыць складана

рабіць аналіз сылікатаў, у якіх ёсьць фтор – сылікат трэба расплавіць пры тэмпэратуры 1200 градусаў Цэльсія, а фтор выпараецца пры 900 градусаў. Мне мой прафэсар аднойчы – гэта было ў 1954 годзе, бліжэй да лета – кажа, што адно месца, дзе можна навучыцца як рабіць аналіз – у Швэцыі. У Стакгольме аналізуюць такія самыя сьлюды, бо ў іх на поўначы адкрылі падобныя радовішчы – сьлюда тая самая і праблема тая самая. А я ўжо працаваў над гэтым больш чым паўгода, столькі нааналізаваў. Я вырашыў, добра, зьежджу ў Швэцыю. Але зноў жа, у мяне не было ні пашпарта, нічога. Я пайшоў да айца Рабэра і папрасіў дапамогі. Ён мне: о, сын мой, я табе ўсё ўладжу, пайду да дзядзькі (а дзядзька – старшыня парлямэнту). І так пэр Рабэр мамэнтальна вырабіў патрэбныя дакумэнты. Залагодзіць справу даезду ў Швэцыю дапамагла Зора.

Данія і Швэцыя

Зора ў гэты час падпрацоўвала пакаёўкай у прафэсара Дэбэзьё, і якраз жа зяць гэтага прафэсара меўся ехаць у Данію. Дык той зяць давёз мяне да Капэнгагену, а да Швэцыі я ўжо дабраўся сам.

У Швэцыю праз праліў я праехаў безь вялікіх уражаньняў, але затое ў Швэцыі пачаў «філязофстваваць»: вось я ў краіне, якая не ваявала пару сот гадоў – усё тут цэленькае, памаляванае, новае. А за пару сотняў кілямэтраў на поўдзень – краіны, якія ўвесь час ваююць. І што тыя войны даюць? Пад гэтым уражаньнем я прабыў у Швэцыі пару тыдняў.

У Стакгольм я дабіраўся аўтастопам. Знайшоў унівэрсытэт, прафэсара. Расказаў хто я і што раблю (праўда, мой прафэсар Таро напісаў яму перад гэтым рэкамэндацыйны ліст) і сказаў, што хачу падвучыцца тэхніцы аналізу сьлюдаў. Швэды прынялі мяне вельмі добра, далі месца для працы, шафу. Праўда, мне ўзяло ладна часу, каб растлумачыць, што я беларус, а не бэльгіец – давялося прынесьці карты – але ўрэшце ўсё стала на сваё месца. Гаварылі мы зь імі па-нямецку, бо па-ангельску я тады ведаў толькі мову геалёгіі і мінэралёгіі.

У Стакгольме мне паказалі некаторыя тэхнічныя дэталі аналізу, а таксама расказалі пра тое, чаго ня трэба рабіць, каб не губляць час – адным словам, мне Швэцыя вельмі добра дапамагла. Далі мне з сабой і дзесяткі два працаў, якіх я ня меў раней – некаторыя па-ангельску, адна ці дзьве па-швэдзку, так што я добра ўзброіўся і, вярнуўшыся ў Бэльгію, працаваў памысна над дактаратам.

Будучы ў Швэцыі, я схадзіў на кватэру Федарука, тамтэйшага беларуса – але яго ў хаце не было, гаспадыня сказала, што была пятніца і ён выехаў на тры дні – ён недзе гуляе, і тры дні яго ня будзе. А я прыехаў толькі на дзесяць дзён, працаваў цэлы тыдзень, і гэта

былі адзіныя выходныя. Так што Федарука я так і не пабачыў, і мае «беларускія пляны» ў Швэцыі ня зьдзейсьніліся. Але наагул знаёмства з Швэцыяй і дасьведчаньне зь лябараторыі мне дапамаглі і пакінулі ўражаньне на ўсё жыцьцё.

Назад з Швэцыі я вяртаўся цягніком: заашчадзіў досыць грошай на білет. Прыехаўшы ў Капэнгаген, я меў пляны зайсьці ў Беларускі камітэт, прадстаўнік якога і адрас падаваліся ў газэце «Бацькаўшчына». Дарэчы, калі ў Лювэне, задоўга да паездкі ў Швэцыю, я распытваў студэнтаў, ці ня мае хто зь іх сувязяў у скандынаўскіх краінах, Янка Жучка сказаў мне, што чалавек у Капэнгагене, які рассылае «Бацькаўшчыну», родам з-пад Сіняўкі, Жучка яго ведае, прозьвішча ягонае – Лабейка. Жучка настойваў, што я абавязкова мушу яго знайсьці. Я з Жучкам сябраваў, лічыўся зь ім, ды мне й самому хацелася пазнаёміцца зь беларускімі актывістамі.

Камітэт гэты я знайшоў – непадалёк ад цэнтру. Бачу, на дзьвярах невялікая дошчачка «Беларускі камітэт» (па-дацку). Пазваніў. Адчыняе дзьверы... чалавек з адной нагой, на мыліцах. Знаёмімся. Ну, заўсёды беларуская прыветлівасьць – гутаркі, чарка. Бліжэйшае знаёмства – расказ пра сябе. Лабейка ў Беларусі быў жаўнерам БКА, быў прызваны ўвесну 1944 году. Удзельнічаў у баях з партызанамі, быў паранены, але рана была хутка залечана. У часе эвакуацыі быў зноў паранены – гэтым разам параненым быў пагружаны на карабель, і там давялося параненую нагу ампутаваць. Карабель дайшоў да Капэнгагену, і там яго здалі ў шпіталь. Так ён і трапіў у Данію, дзе жыве ўжо дзесяць гадоў. Гаворыць па-дацку, працуе. Сьведамы, дзейны беларус. У той самы дзень – была гэта пятніца – я пазнаёміўся яшчэ з паўтузінам беларусаў, якія прыйшлі да Лабейкі пагутарыць, распакаваць газэты. Вядомая справа, на ноч я застаўся ў той кампаніі.

Назаўтра Лабейка паабяцаў мне паказаць Капэнгаген, кругом паезьдзіць. Я думаю – як жа я буду зь ім езьдзіць? Раніцай ён будзіць мяне і кажа: матацыкл з гаражу прывёз – едзем! І так мы тры дні езьдзілі па Капэнгагене кругом, пасьля паехалі туды, дзе нарадзіўся Андэрсэн. У славутую астранамічную вежу я, праўда, ішоў сам, туды заяжджаць не дазвалялася, гэтаксама як і па парку Tivoli – мы зь ім хадзілі пешкі. Гаспадар мой усё пытаўся: «Ты не баісься езьдзіць са мной?» Бо спачатку ён убачыў мой позірк... «Мяне, – кажа, – усе ведаюць». Я кажу: ня ў тым справа, але ж мы можам так хлопнуцца... А ён: «Мы ня хлопнемся, галоўнае, каб я ня быў п'яны. Бо я яшчэ й выпіваю».

Што мне яшчэ запомнілася з Капэнгагену, гэта калі я праз тры дні знаёмства зь беларускай грамадой садзіўся ў цягнік на Брусэль – на вакзале ў кіёску на відным месцы я ўбачыў часапіс «Беларусь», які я,

ясна, купіў і ад коркі да коркі перачытваў падчас даўгаватага падарожжа з Данії ў Брусэль.

Пачаткі сямейнай бібліятэкі

Ад дзяцінства я меў сапраўдную любоў да кніжак. Прыпамінаю, што была ў нас маленечкая калекцыя кніжак яшчэ ў Налінску, але я яшчэ чытаць ня ўмеў – глядзеў на кнігі і вучыўся іх паважаць (помніцца, так казалі цёці Каця і Паша: «Книги надо уважать!»). Але затое ў Арле я чытаць ужо ўмеў, дык у нашым маленькім пакойчыку маці зрабіла месца для этажэрак, і на іх было поўна кніг – маці купляла, выпісвала, падпісвалася (напрыклад, на сэрыю «Жизнь замечательных людей»). Дзіву даюся, як мы там зьмяшчаліся: нас трох, мае птушкі і этажэркі! Спрабаваў я зьбіраць кнігі і ў вайну, але, на жаль, усё засталося ў Менску.

Калі ж нарэшце надышло нармальнае жыцьцё – было гэта ў Бэльгіі – дык мы з Зорай (а яна любіла кнігі бадай ці ня больш за мяне) пачалі зьбіраць бібліятэку.

Перш-наперш трэба сказаць, што Бэльгія – кніжная краіна, і ў Лювэне, і ў Брусэлі адбываюцца цудоўныя кніжныя кірмашы. У Брусэлі шмат букіністычных магазынаў, у пэўныя дні ў пэўных месцах бывалі кніжныя базары, а яшчэ ў Брусэлі быў магазын «Le monde entier» (Цэлы сьвет), левы, камуністычны, але там бывалі добрыя кніжкі з Савецкага Саюзу – ня толькі новыя, але і ранейшыя выданьні.

Мы сабралі нядрэнную бібліятэку – калі мы пераяжджалі ў Амэрыку, у нас было каля 1800 кніг – прыйшлося заплаціць за перавоз каля 600 даляраў – выдаткі на кнігі не пакрывалі ніякія харытатыўныя службы. Мы і охалі і ахалі і злаваліся, але заплацілі. Гэта былі пераважна французскія кнігі, іх было шмат, але ладная была і расейскаая частка. Перавезьлі мы ў ЗША амаль усе кнігі. Некаторыя кніжкі я пазьней аддаў у Нацыянальную бібліятэку Беларусі – старыя французскія, што тычыліся нашых земляў. Адну кніжку я вельмі шкадую, бо часта сам разглядаў – гісторыю пабудовы Суэцкага каналу ў трох тамах – цудоўная кніжка, карты, ілюстрацыі... Я яе купіў, здаецца, у Парыжы і цягаў з сабой, а Зора сказала: «Аддамо ў Нацыянальную бібліятэку...» Яшчэ адна кніжка, што шкадую – сэнтымэнтальны ўспамін – мне пасьля выпуску прафэсар структурнай геалёгіі Асэльбэргс падараваў адзін зь першых геалягічных атласаў Эўропы, выдадзены ў Аўстрыі. Для сёньняшняй геалёгіі ён састарэлы, але само выданьне было вельмі прыгожае, а яшчэ падарунак ад Асэльбэргса, які тады быў дэканам факультэту.

Але месца кнігам – у даступных бібліятэках. І нашыя кнігі ўсе-ўсе

пайшлі ў бібліятэкі – часткова ў Нацыянальную бібліятэку Беларусі, беларусіка – у бібліятэку Прынстанскага ўнівэрсытэту, а вельмі шмат эміграцыйных выданьняў – у Нью-Ёркскую публічную бібліятэку.

Дактарат

Праца над дактаратам займала вельмі шмат часу. У лябараторыі я праводзіў 12-15 гадзін штодзённа – аналізы, знаёмства зь літаратурай. Я атрымаў дазвол на тое, каб англамоўныя мінэралягічныя і геалягічныя часапісы чытаць у лябараторыі. Шмат у аналізах дапамагаў мне асыстэнт прафэсара Таро – Андрэй Міхайлавіч Дыкенштэйн, геоляг, расейскі эмігрант часоў рэвалюцыі. Гэта быў добры чалавек, ён ведаў геахімічную літаратуру і сачыў за маімі аналізамі. Хоць ён быў і старэйшы за мяне гадоў на 25-30, але я зь ім пасябраваў. Што было асабліва прыемна – ён абсалютна не цікавіўся палітыкай, таму мае пераканаьні – а я іх яму часам выказваў – не ўплывалі на нашыя дачыненьні.

Пад вясну 1955 году я пабачыў, што неўзабаве скончу аналізы сьлюдаў і змагу зрабіць высновы. Аднак прафэсар Таро вырашыў, што дасьледаваньне трэба пашырыць – трэба зрабіць рэнтгенавы структурны аналіз крысталаў розных сьлюдаў. Мы прыцягнулі да супрацоўніцтва прафэсара ван Мэрша з флямандзкага аддзяленьня, спэцыяліста ў галіне рэнтгенавага аналізу. Пад кіраўніцтвам ван Мэрша і мне давялося добра прастудыяваць рэнтгеналягічную тэхніку, а таксама прыстасаваньне рэнтгену ў мінэралёгіі.

На пачатку лета 1955 году прафэсар Таро кажа, што, як выглядае, да восені я пастаўленых мэтаў дасягну – усе аналізы будуць скончаныя, і можна будзе сказаць нешта канкрэтнае пра прысутнасьць літыю ў магматычных растворах у дасьледаваным рэгіёне (у бэльгійскім Конга). У чэрвені я падаў вестку ў прафэсійныя таварыствы (геалягічнае, крысталаграфічнае), што ўвосень буду бараніць дактарат, таксама падаў заяву ў рэктарат (у Бэльгіі такі звычай – аб рыхтаванай абароне дактарату інфармаваць унівэрсытэцкія ўлады і калегаў па прафэсіі). Праўда, запаўняючы неабходныя бюракратычныя блянкі для дактарату, я мусіў падаць тое, што ў бэльгійскіх унівэрсытэтах называецца thèse-annexe – дадатковую тэзу. Звычайна гэта тэза на тэму, якая жвава дыскутуецца ў прафэсійнай літаратуры – трэба паказаць, што ты абазнаны ў гэтай тэме. Дадатковая тэма, аднак, ня мусіць быць зьвязаная з асноўнай – наадварот, мусіць быць ад яе дастаткова далёка.

Я выбраў дадатковай тэму з палеанталёгіі – клясыфікацыя фарамініфэраў паводле Парра (аўстралійскі геоляг). Палеантоляг прафэсар Марыюс Леконт на гэтую тэму згадзіўся. Для мяне гэта было проста

выдатна, бо з фарамініфэрамі я быў добра знаёмы з тых часоў, калі падпрацоўваў для кампаніі Shell.

Абарона дактарату адбылася 29 кастрычніка 1955 году. Тэза мая называлася «Les lépidolites de la pegmatite de Manono (Katanga)». У аўдыторыі было чалавек 20: некалькі прыежджых з універсытэтаў Льежу і Брусэлю, астатнія свае, лювэнскія. Я прадставіў праблему, даў аналіз працы, сказаў, што зроблена новымі дасьледчыкамі ў Канадзе і Швэцыі, і пазнаёміў з сваімі вынікамі. Мне было пастаўлена пару пытаньняў, але на ўсе пытаньні я аўтарытэтна адказаў. Апрача «публікі» ў залі на першай лаве (за сталом) засядаў кансыліюм – шэсьць прафэсараў зь Лювэну, якія атрымалі копію дысэртацыі месяц перад тым і якія меліся даць свой прысуд перад універсытэцкімі ўладамі адносна мяне і мае працы – ці вартая гэтая праца ўзроўню доктарскае распрацоўкі. Пасьля мае прэзэнтацыі кансыліюм выйшаў у сумежны пакой на нараду, і я здорава хваляваўся, бо бывалі выпадкі, што дактарантам раілі яшчэ сёе-тое дапрацаваць!

Хвілін праз 15-20 кансыліюм вярнуўся ў аўдыторыю і яго старшыня прафэсар Фэлікс Кейзэн прачытаў прыблізна гэткае: «Пасьля азнаямленьня з прадстаўленай нам раней працай і пасьля праслуханьня абароны пастаўленае тэзы, мы лічым, што дактаранту Вітаўту Кіпелю наш універсытэт можа надаць тытул доктара навук, а праца, праробленая дактарантам, заслугоўвае адзнакі grande distinction». Пачуўшы гэта, я ледзь не самлеў – кансыліюм мяне віншуе, а я проста мычу. Я ведаў, што працаваў шмат і нямала зрабіў, але на адзнаку «grande distinction» я не спадзяваўся. Думаю, што маю працу найбольш ацаніў і зразумеў мой уклад прафэсар Таро – хоць ён і ня быў членам кансыліюму, але мог ускосна мяне перад імі пахваліць. Але гэта толькі мае здагадкі.

Пасьля абароны дактарату была невялічкая цырымонія ў Геалягічным інстытуце (там адбывалася і сама абарона) – мяне павіншавалі прафэсары, студэнты і віцэ-рэктар біскуп Літ (Monsignor Litt), мне ўручылі дыплём, герб універсытэту, і ўсе разышліся.

З інстытуту я адразу пайшоў у парк, дзе дамовіўся сустрэцца з Зорай і Юркам Сянькоўскім. Яны на абарону не пайшлі (баяліся, як яно будзе!). Ну ясна, Зора, пачуўшы, што і як было, пабегла ў свой інтэрнат прынесьці куплены ёю падарунак – кішанковы гадзіньнік «Omega», а я зь Юркам пайшоў у беларускі студэнцкі дом расказаць пра ўсё пэру Рабэру.

Калі пэр Рабэр пачуў ад мяне пра абарону дактарату, я заўважыў на ягоным твары лёгкую крыўду – чаму я трымаў гэтую падзею ў сакрэце? Аднак ён адразу ж павесялеў, што я і дактарат абараніў, і атрымаў адзнаку «grande distinction» – пэр Рабэр падкрэсьліў, што я быў першы ў беларускай студэнцкай грамадзе, хто атрымаў такую адзнаку. Хутка ў дом прыйшла Зора, і мы ўчатырох пайшлі на абед.

Празь дзень-два пэр Рабэр зрабіў для мяне ўрачыстасьць у залі дому, куды я запрасіў таксама Андрэя Міхайлавіча Дыкенштэйна і паўтузіна маіх калегаў з Геалягічнага інстытуту. Адным словам – дактарат адсьвяткавалі, а ў мяне зарадзілася настальгічнае пачуцьцё разьвітаньня з студэнцкімі гадамі, з Alma Mater, дзе я за шэсьць з паловай гадоў прыжыўся, стаў часткай гэтай установы, гэтага асяродзьдзя. Дзіўны ўнутраны стан: задаволены, што нешта здабыў, адолеўшы немалыя цяжкасьці, і разам з тым невыразнасьць, прыгнечанасьць – што будзе далей?

Праўда, з інстытутам я не разьвітаўся і праз пару дзён пачаў прыходзіць туды, каб «падчысьціць» свае сталы (іх было пару), здаць хімічную апаратуру (асабліва плятынавыя капсулькі). У адзін з такіх візытаў мой прафэсар Таро запрапанаваў застацца ў яго ў асыстэнтуры, бо ў мяне была добрая акадэмічная падрыхтоўка, доктарская тэза. Рэфэрат тэзы быў прыняты да друку ў Бэльгійскай Акадэміі Навук. (Тэза была надрукавана ў 1956 годзе пад аўтарствам ван Мэрша, Жака Таро і Вітаўта Кіпеля. У французаў ёсьць добрая прыказка – калі ты бачыш трох аўтараў, то пра трэцяга кажуць: c'est le nègre qui fait le travail – гэта той нэгр, які робіць працу.)

Я мог затрымацца пры ўнівэрсытэце, але не зрабіў гэтага, магчыма і не абдумана. Неўзабаве пасьля абароны дактарату прафэсар Гюлентопс запрапанаваў мне працу ў Марока, а бэльгійская нафтавая кампанія Petrofina давала стыпэндыю ў Парыж – зноў у Інстытут нафты, але я з выбарам працы не сьпяшаўся. На парадку дзённым было ажаніцца з Зорай, а яна цьвёрда вырашыла перабірацца ў Амэрыку.

Пляны пасьля ўнівэрсытэту

Як я ўжо згадваў, з Зорай мы пазналіся ў Менску, паступова зблізіліся, сябравалі. Хутка мы ўбачылі, што ў нас вельмі шмат падобнага, а нутраное пачуцьцё – патрэба працаваць у беларусіцы – у нас было аднолькавае.

Але і Зора і я яшчэ з гімназіяльных часоў ведалі, што здабыцьцё вышэйшай адукацыі – справа абавязковая, важная жыцьцёвая вяха, і таму калі пачалося навучаньне ва ўнівэрсытэце, мы вырашылі, што пакуль мы студэнты – жаніцца ня будзем. Мы разумелі, што спалучаць сямейнасьць і студэнцкасьць ня варта: будзе на шкоду і аднаму, і другому.

Аднак у Лювэне, у студэнцкай грамадзе, мы заручыліся. Васіль Шчэцька быў нашым сватам, ён падрыхтаваў праграму заручынаў: пасадзіў у крэслы, зьвязаў рушніком рукі і прапяяў пару заручынных песьняў. Гэтая цырымонія насіла жартаўліва-студэнцкі характар, але для нас яна была прыемная і пакінула моцнае ўражаньне. Дый без

цырымоніі мы ведалі, што пажэнімся, калі прыйдзе час. І вось той час надышоў: універсытэт закончаны, у жыцьці пачынаецца новы перыяд.

Зора, атрымаўшы дыплём, магла застацца працаваць у Бэльгіі – яна рабіла тэзу ў галіне спэктральнага аналізу, папулярнай у той час тэхналёгіі, але яна цьвёрда вырашыла, што варта перабірацца ў ЗША. Ясна, Зора ўважала, што і я таксама туды перабяруся. Вясельле вырашылі спраўляць у Амэрыцы, хоць я й ня быў пэўны, калі я атрымаю дакумэнты на ўезд у ЗША. Праўда, я не выключаў магчымасьці, што перад Амэрыкай яшчэ дзе-небудзь «падраблю» (Марока выглядала прывабна), але пэўных плянаў не было. Што мяне стрымвала ад Марока – гэта адарваньне ад беларускай грамады, беларускага асяродзьдзя. За гады працы ў Геалягічным інстытуце ў Лювэне я пазнаёміўся зь дзесятком геолягаў, якія працавалі і ў Марока, і ў Габоне, і ў Конга, і ўсе яны аднагалосна казалі – калі паедзеш у Афрыку, то нічога апрача палявое працы там ня будзе, і мяне гэта насьцярожвала.

Як бы там ні было, мы з Зорай дамовіліся, што ў 1956 годзе пажэнімся, пачнем нашую сям'ю. Перад выездам у ЗША Зора вельмі далікатна папрасіла мяне, каб я пахрысьціўся, бо пытаньне майго хросту было няяснае – але мы пераконліва схіляліся да пагляду, што я няхрышчаны. Я гэта зрабіў. Паколькі Зора была праваслаўная, да гэтай канфэсіі далучыўся і я. Аформіў маё хрышчэньне і быў маім хросным бацькам Іван Фёдаравіч Нядзьвіга – кубанскі казак, шчыры, цудоўны чалавек, муж Лідзіі Рыгораўны Янушкевіч, актрысы Беларускага тэатру імя Янкі Купалы – пачынальніцы беларускасьці ў тэатры. На здымках у кнігах Няфёда яна затушаваная.

І так я, пахрышчаны, з дыплёмам геоляга, шукаю працу, а Зора выяжджае ў ЗША, дзе зьбіраецца чакаць мяне.

У Амэрыку

Ведаючы, што выезд у ЗША ня будзе простай справай, я ўсё ж залагодзіў усе фармальнасьці з пашпартам. Здабыць пашпарт, які даваў бы магчымасьць атрымаць візу для выезду з Бэльгіі, для мяне было таксама няпроста. Справа ў тым, што прыехаўшы ў 1949 годзе ў Бэльгію, я страціў статус DP – у Бэльгіі я ўжо быў проста асобай без грамадзянства. Адным словам – сытуацыя невясёлая. Адзінай надзеяй на выезд з Бэльгіі была дапамога такіх арганізацыяў, як World Church Service, Caritas Catholica, Талстоўскі фонд – гэтыя арганізацыі добра разьбіраліся ў фармальнасьцях, зьвязаных з грамадзянствам і лёсам мільёнаў уцекачоў, якія боўталіся па Заходняй Эўропе пасьля Другой сусьветнай вайны.

Маё мінулае вызначала маё месца ў картатэцы Талстоўскага

фонду – гэтая арганізацыя апекавалася былымі грамадзянамі СССР. З Талстоўскім фондам мне даводзілася мець дачыненьні па лініі СББ, бо шмат беларускіх работнікаў, скончыўшы кантракты ў Бэльгіі, перабіраліся як асобы без грамадзянства ў Канаду, ЗША ці Паўднёвую Амэрыку. Надышоў, аднак, час, калі і мне асабіста спатрэбілася дапамога Талстоўскага фонду. Фонд меў вялікі офіс у Брусэлі, там працавалі кампэтэнтныя і ветлівыя людзі. Працоўныя мовы былі французская і флямандзкая, хоць амаль усе працаўнікі гаварылі і парасейску. Асоба, якой я выклаў сваю справу, сказала, што я адпавядаю профілю «кліента» фонду, нягледзячы на тое, што я ўжо раз прыехаў у Бэльгію як DP. Аднак выезду ў ЗША мне давядзецца пачакаць, бо сьпіс на выезд вельмі доўгі. Праўда, паколькі я самотны і без багажу – безь ніякіх фармальных «тармазоў» – то можа здарыцца нагода і хутчэйшага выезду. І мне параілі заходзіць у фонд часьцей (бо ж тэлефона ў мяне не было!).

Аднаго дня, будучы ў Брусэлі па справе шуканьня працы ў Марока, я падумаў – зайду-тка я ў Талстоўскі фонд, можа там што новага пачую. Як толькі мяне пабачыла сакратарка, яна мне кажа: добра, што я зьявіўся – са мной хоча гутарыць спадарыня Тацяна Шаўфус, заступніца дырэктаркі фонду ў Эўропе Аляксандры Талстой (дачка Льва Талстога, знаная пісьменьніца і філёзаф, я яе ніколі ня бачыў). Спадарыня Шаўфус – вельмі дзелавая жанчына, зь якой мне даводзілася мець дачыненьні раней – кажа (гутарыла яна са мной парасейску): «Вітаўт, праз пару дзён з Брусэлю ў Нью-Ёрк адлятае самалёт кампаніі Flying Tiger, які знаходзіцца ў нашым распараджэньні, і ў ім ёсьць адно вольнае месца (нехта захварэў). Пакіньце Ваш пашпарт нам, мы ўсё афармім, а Вы ні з кім не ўступайце ні ў якія гутаркі!» Празь дзень-два яны меліся мне паведаміць калі дакладна будзе адлятаць самалёт. Усё, што яна запрапанавала, я выканаў і 21 сьнежня 1955 году зьявіўся ў брусэльскі аэрапорт. Там спадарыня Шаўфус аддала мне пашпарт, узяла пад руку і завяла ў самалёт. Гэтак праз Талстоўскі фонд я апынуўся ў амэрыканскім самалёце і паляцеў у ЗША. Праўда, я падпісаў паперку, што пералёт мой каштуе $100, якія я абавязаўся сплаціць (я сплаціў іх у 1956 годзе).

Адна памятная дэталь зь пералёту за акіян: у самалёце я сустрэў Алеся Міцкевіча, зь якім я жыў і сябраваў, а таксама працаваў у СББ. Алесь ня быў студэнтам, але жыў у Лювэне. Я нікольк не зьдзівіўся, калі пабачыў яго ў самалёце – з Бэльгіі выяжджала шмат чужынцаў. І гэтак мы з Алесем ляцелі ў ЗША гадзін 18. У дарозе шмат аб чым гутарылі, пераважна на беларускія тэмы. Я неяк сказаў, што ў мяне ў кішэні толькі бэльгійскія капейкі, і Міцкевіч на гэта вельмі павольна – у ягонай звычнай манеры – адказаў так: «Хочаш, каб я табе пазычыў? Ну што ж, пазычу. На табе сто даляраў, некалі аддасі».

Вось так 22 сьнежня 1955 году мы разам з Алесем Міцкевічам прызямліліся ў Нью Ёрку ў аэрапорце «Айдлвайлд» (цяперашні Кенэдзі).

Гэтак напрыканцы 1955 году закончыўся мой бэльгійскі (і эўрапейскі) пэрыяд жыцьця. Як я ацэньваю яго? На лёгкай ноце заўважу, што пры першым знаёмстве з краінай – і гэта засталося ў памяці на ўсё жыцьцё – было дзіўна і непрыемна глядзець на рэклямныя і вітрыны пахавальных канторaў, дзе былі выстаўленыя труны, тапачкі для нябожчыка і падобнае. Што яшчэ было дзіўна – вулічныя пісуары зь нізенькімі сьценкамі, якія амаль не закрывалі працэс «адліву». Але гэта я разглядаю як мясцовыя дзівосы: «што ні край, то абычай».

Калі ж гаварыць сур'ёзна, то мой досьвед і ацэнка майго побыту ў Бэльгіі вельмі пазытыўныя. Я пазнаёміўся з старой эўрапейскай дэмакратычнай культурай: мастацтвам, літаратурай, архітэктурай. Спазнаў талерантнасьць жыхароў дзяржавы, якая жыве ў няпростых умовах двунацыянальнасьці, спалучэньня рэлігійнасьці і сэкулярнасьці з глыбокім усьведамленьнем патрэбы служыць чалавецтву.

Атрыманьне вышэйшай асьветы чужынцам без грамадзянства – падзея неардынарная. Таму я застаюся пажыцьцёва ўдзячны Каталіцкаму Ўнівэрсытэту ў Лювэне за – хай сабе гэты выраз і банальны – «пуцёўку ў жыцьцё».

Гэтаксама мы – беларусы з бэльгійскім дасьведчаньнем – удзячныя гэтай краіне за гасьціннасьць і дапамогу ў патрэбны час. Калі гаварыць вузей, я атрымаў таксама выдатнае дасьведчаньне з працы з шырокім беларускім грамадзтвам – студэнтамі і работнікамі Саюзу Беларусаў Бэльгіі.

ЗША. Пачаткі

Прылёт. Пасэйк

Першай маёй базай у ЗША стаў горад Пасэйк у штаце Нью Джэрзі, непадалёку ад Нью Ёрку, кілямэтраў за 10-12. Гэта невялікі горад, каля 50 тысячаў жыхарства, стары і індустрыяльны. Была разьвітая тэкстыльная прамысловасьць, выраб гумовых тавараў, мэблевыя фабрыкі, харчовая прамысловасьць. Жыхарства гораду вельмі інтэрнацыянальнае: яўрэі, мадзяры, немцы, славяне (палякі, славакі, украінцы, русіны, беларусы). У горадзе дзеілі чатыры вялікія праваслаўныя царквы, некалькі ўніяцкіх парафіяў, польскі каталіцкі і народны касьцёл, некалькі касьцёлаў славацкіх, пару нямецкіх кірхаў і шмат сінагогаў.

Гадоў пяць-шэсьць у сярэдзіне 1950-х дзеіла і беларуская праваслаўная царква, дзе настаяцелем быў айцец М. Сьцяпанаў. Беларусы ў Пасэйку пачалі сяліцца напрыканцы XIX – пачатку XX стагодзьдзя, а ў 1948–1955 гадох у горадзе пасялілася каля сотні беларусаў былых DP. Калі я прыехаў у Пасэйк, там дзеіла беларуская школка і пару беларускіх арганізацыяў. Беларускімі актывістамі ў Пасэйку былі Эмануіл Ясюк, Аляксандар Русак (жыў у горадзе Гарфілд побач з Пасэйкам), а. Мікалай Лапіцкі, Аркадзь Барсук, Сымон Жамойда, Андрэй Мінчук, Уладзімер Дутка. У Пасэйку ладзіліся вечары, сходы. Бацькі мае жылі ў горадзе ад 1949 году, мелі невялічкую кватэру, і я пасяліўся ў іх.

Першыя крокі

Першае, што я зрабіў у Пасэйку, гэта зайшоў у «ваенкамат» ці, як кажуць амэрыканцы, «рэкруцкае ўпраўленьне» – зарэгістравацца для вайсковай службы. У тым ведамстве дзяжурны вайсковец праверыў мой пашпарт, візу, фатаграфію – усё было легальнае. Той вайсковец адразу ж некуды пазваніў і, вяртаючы мне бэльгійскі дакумэнт, сказаў (гаварыў ён са мной расьцяжна па-ангельску – і я яго разумеў!), што свой мабілізацыйны век я перакрочыў, бо мне ўжо за 28 гадоў, а ў войска бяруць толькі да 25 гадоў, таму мяне ўзяць ня могуць і я магу ісьці на ўсе чатыры бакі. На гэтым гутарка закончылася. Праўда, у тым ведамстве мне параілі адразу пайсьці зарэгістравацца

ў Social Security, Агенцтва сацыяльнай апекі, бо бяз нумару Social Security я не змагу атрымаць працу. Гэта я ў той самы дзень і зрабіў. Нумар у рэестры сацыяльнага страхаваньня суправаджае чалавека ад першага дня на працы да пахавальнага бюро. Пасьведчаньне сацыяльнага страхаваньня і правы кіроўца – два найважнейшыя дакумэнты кожнага амэрыканца. У аддзеле Social Security мне далі адрас школы, дзе я мог бясплатна наведваць лекцыі ангельскай мовы, што было вельмі пажадана, хоць ангельская мова была мне ўжо не чужая. Па дарозе ў школу я зайшоў у бібліятэку, запісаўся на абанэмэнт. У бібліятэцы я вельмі зьбянтэжыўся, бо, пагартаўшы каталёг, не знайшоў нічога пра беларусаў.

Тым часам бацькі запыталіся – ці ёсьць у мяне нейкая адзёжа. Ну ясна, прыехаў студэнт, чалавек, які за шэсьць гадоў неяк узьбіўся на пару сваіх кашуляў, але апрача гэтага ў мяне амаль нічога й не было. Пайшлі ў магазын, купілі ўсё новае, ясна, усё вельмі старамоднае, бо ў той час Пасэйк ня быў цэнтрам амэрыканскай моды.

Сустрэча з Зорай

Залагодзіўшы амэрыканскія пабытовыя справы, я пачаў думаць больш «цяжкія» думы, якія не пакідалі мяне ў спакоі – трэба было залагодзіць справы «буйнейшыя», жыцьцёвыя, асабістыя – аформіцца зь вясельлем, знайсьці працу.

Каб асягнуць першае – пачаць вырашаць зь вясельлем – трэба было расшукаць Зору, якая выехала з Бэльгіі раней і дала мне адрас і тэлефон сваіх бацькоў, у якіх яна затрымалася. З геаграфіяй новай краіны я яшчэ знаёмы ня быў, але добра разумеў, што гэта – не Бэльгія, у параўнаньні зь якой ЗША сапраўдны гігант. Як дабрацца да Зоры – я ня меў зялёнага паняцьця. Ня быў вялікай дапамогай і тэлефон: мае бацькі тэлефона ня мелі, а каб званіць з будкі, трэба было мець цэлую кішэню драбязы, якое ў мяне не было. Я знайшоў у бацькоў старую карту ЗША, а на той карце знайшоў горад – фактычна вёсачку – па тым адрасе, што мне дала Зора. Вёсачка звалася Памона, на паўднёвым усходзе штату Нью Джэрзі, а большым горадам каля Памоны быў Атлантык Сіты, да якога трэба было дабірацца з дзьвюма перасядкамі аўтобусам, а адтуль кілямэтры тры-чатыры пешкі. На даезд пайшло шмат часу, але ўрэшце я дабраўся! Зора, убачыўшы, як я іду пад іхную хату, расплакалася.

Сустрэча з Савёнкамі была вельмі цёплая, свойская – найбольш хіба гутарылася пра грамадзкія справы, але тады я заявіў, што хачу ажаніцца з Зорай. Запярэчана не было – яны згадзіліся. Дамовіліся мы на дату вясельля – 25 лютага 1956 году. Вырашылі браць шлюб паводле праваслаўнага звычаю, у айца Лапіцкага, хоць Зорына маці Апалёнія была каталічка. Праўда, мы з Зорай былі прыхільныя да

БАПЦ, належалі да БАПЦ і спадарства Савёнкі (прыход на 401 Atlantic Avenue у Нью Ёрку), але мае бацькі – Марыя і Яўхім Кіпелі – былі прыхаджанамі парафіі Сьвятой Эўфрасіньні Полацкай у Саўт Рывэры. Здавалася б – далікатная сытуацыя. Аднак у пытаньні аб выбары месца шлюбу дапамагло шматгадовае знаёмства з айцом Лапіцкім – яго добра ведалі як сьвятара і грамадзкага дзеяча. Асабліва была важная дапамога айца Лапіцкага Лявону Савёнку і іншым беларускім грамадзкім дзеячам у часе, калі іх – каля дзесятка інтэрнаваных амэрыканцамі беларускіх актывістаў – маглі выдаць саветам у 1945-1947 гадох.

Пачаў шукаць працу

Перадвясельная гарачка мяне амаль не захапіла. Я больш аддаўся справе шуканьня працы. На адну працу я, прызнацца, разьлічваў яшчэ зь Лювэну, але з гэтага нічога ня выйшла. А справа была такая.

Працуючы ў Лювэне над дактаратам, я пазнаёміўся з амэрыканскім прафэсарам геахіміі з Калюмбійскага ўнівэрсытэту ў Нью Ёрку Браянам Мэйсанам, аўтарам аўтарытэтнага на той час падручніка па геахіміі. Прафэсар Мэйсан азнаямляўся з нашым інстытутам, а найбольш зь мінэралягічнай лябараторыяй, і правёў нейкі час са мной, дэталёва знаёмячыся з хіміяй мае дысэртацыі. У адной зь лябараторных гутарак прафэсар Мэйсан, даведаўшыся, што я магу апынуцца ў ЗША, сказаў мне, каб я – калі там буду – зайшоў да яго ў Калюмбійскі ўнівэрсытэт, ён дапаможа мне знайсьці працу.

Вядомая справа, я пра гэтую гутарку не забыўся і праз тыдзень-два свайго жыцьця ў Пасэйку паехаў у Калюмбійскі ўнівэрсытэт. На жаль, прафэсар Мэйсан у «Калюмбіі» болей не працаваў – як мне сказалі, ён перайшоў працаваць у Музэй натуральнай гісторыі, тут жа ў Нью Ёрку. Я хутка знайшоў і той музэй, і прафэсара Мэйсана. Сустрэча нашая была вельмі цёплая, ён азнаёміў мяне зь мінэралягічнай калекцыяй гэтае выдатнае ўстановы, сказаў, над чым яны працуюць і г. д., але – «на жаль, на жаль...» – узяць мяне на працу ня могуць, паабяцалі, што, можа, праз год... Выйшаў з я музэю вельмі засмучаны. Пазьней я ўспамінаў і думаў – наколькі я яшчэ не разумеў амэрыканскай рэчаіснасьці: праца так хутка не знаходзіцца!

Зора і я

У новым сьвеце ўся жыцьцёвая энэргія накіравалася на ўладкаваньне ў новых абставінах. Ад старога сьвету нязьменнымі засталіся толькі пачуцьці ды ўнутранае адчуваньне, што трэба поўнасьцю ўпарадкавацца, закласьці сям'ю. Таму прыпомню пра дачыненьні з Зорай, пра каханьне, супольныя пляны.

Часта бывае ў жыцьці, што сужэнства замацоўваецца хутка: як кажуць, закахаліся зь першага позірку – і пад вянец. У маім жыцьці да вясельля і сям'і дайшло не «з налёту», хоць і запалі мы адно аднаму ў душу зь першае сустрэчы. Каханьне было першае ды збліжэньне з каханай асобай пачалося даўнавата, зь юнацкіх гадоў, але сям'я Зоры Савёнак і Вітаўта Кіпеля аформілася пасьля ладнага пэрыяду «хаджэньня».

Мы з Зорай пазнаёміліся ў Менску ў 1943 годзе. Калі мы першы раз сустрэліся ў сэмінарыі на вуліцы Цнянскай, у мяне на сэкунду мільганула пачуцьцё, што гэтая дзяўчына мне нечым спадабалася, але вытлумачыць – чым? – я ня мог. Было ў ёй нешта такое, што мне падабалася і прыцягвала. Найбольш, хіба, добрая ўсьмешка і беларуская мова: калі б і дзе б яна ні гаварыла – гэта заўсёды было мякка, ветліва й па-беларуску. У тым мяшчанскім менскім асяродзьдзі беларускасьць заўважалася і прымалася прыхільна.

Далей сустракаліся мы на зборках СБМ, і нам было прыемна вяртацца разам дахаты на Камароўку, дзе мы абое жылі. Часам мы выпадкова сутыкаліся лоб у лоб у будынку школы і абавязкова пераклідаліся слоўцам, жартавалі. Раз мы былі гасьцьмі на адной вечарынцы, пазьней Зора падсьмейвалася зь мяне, прыпамінаючы тую вечарыну! Ужо тады ў Менску мы адчулі, што падабаемся адно аднаму і што мы цьвёрдыя беларусы.

Зь Беларусі мы выяжджалі ў адным вагоне, але ў Бэрліне разъехаліся: яна ў Сілезію, я ў Пазнань. Мы перапісваліся і абмяняліся фотакарткамі. Пасьля вайны мы ў той самы дзень прыехалі ў Рэгенсбург, шукаючы ў разьбітай паваеннай Нямеччыне беларускае асяродзьдзе. Гэта была бяссрэчная выпадковасьць, але яна была сымбалічная – мы злучыліся.

У Рэгенсбургу мы пачалі вучыцца ў беларускай гімназіі ў адной клясе. Часта я, Зора, Ніна Палянская і Туся Шчаглова рабілі разам хатнія заданьні, гулялі па Рэгенсбургу. Нейкі час, калі паўстала беларускае селішча Ganghofer-Siedlung, я харчаваўся ў Савёнкаў. Працавалі мы з Зорай разам у скаўтынгу – я болей, яна крыху менш, бо ў яе зьявіўся ўхажор, Лёня Карась. Вядомая справа, у маладыя гады ўхажоры мяняюцца, і ў нейкім часе Лёньку падмяніў Вітаўт. Але ўсе мы заставаліся вельмі добрымі сябрамі.

Скончыўшы гімназію, мы паступілі ва ўнівэрсытэт у Цюбінгене, нас было чатырох: я, Зора, Галя Ганчарэнка і Оля Харытончык. Вучыцца далей Зора паехала ў Бэльгію, куды праз пару месяцаў – летам 1949 году – прыехаў і я. У Бэльгіі мы з Зорай пачалі збліжацца болей, была на гэта і свая падстава: амаль усе курсы для хімікаў і геолягаў былі супольныя, а чацьвёра вушэй схоплівалі больш і лепш тое, што прафэсар выкладаў у французскай мове. Разьбіралі праслуханыя

лекцыі разам. Збліжаў і матэрыяльны момант: на білеты ў кіно часта прыплачвалі адно аднаму.

І так паступова сяброўства перайшло ў каханьне. Часам гаварылі пра закладаньне сям'і. Зора была больш настойлівая, прапанавала, каб на трэцім годзе навукі мы ажаніліся. Я пагадзіўся. Але галоўную згоду Зора хацела атрымаць ад мамы, Апалёніі Савёнак, якая з мужам жыла ў ЗША. Мама адказала дачушцы вельмі строга: жаніцца будзеш калі скончыш універсытэт і прыедзеш у Амэрыку. Мы чакаем. Зору мамін адказ вельмі абескуражыў, але як паслухмяная дачка яна згадзілася, сказаўшы мне, што трэба заручыцца, а на заручыны яна мамінага дазволу не патрабуе. Я згадзіўся на ўсе ейныя прапановы.

Заручыны ў студэнцкім доме на 19 Place Hoover мы адгулялі гучна й прыемна. Зора дамовілася з Васілём Шчэцькам – яе партнэрам у народных танцах – каб ён быў сватам. Васіль добра ведаў народныя звычаі і да справы падышоў сур'ёзна. Ён недзе «адкапаў» у беларускіх работнікаў рушнікі, падабраў адпаведныя крэслы, пасадзіў нас на тыя крэслы, зьвязаў нам рушніком рукі ды пачаў сьпяваць заручальныя песьні, у якіх яму падпяваў невялічкі хорык. Сьпяваліся песьні і гаварыліся мудрасьці. Быў каравай і фармальная заручальная гулянка. Былі свае і госьці студэнты, асабліва Зора хацела, каб былі сяброўкі латышкі з Латгаліі, якія гаварылі па-беларуску. Заручыны нашыя адбыліся ў 1952 годзе, і мы былі вельмі радыя гэтай падзеі. Зора бачыла ў гэтым беларускую традыцыйнасьць, а яна традыцыі абагаўляла.

Ажаніліся мы ўжо ў ЗША. 25 лютага 1956 году адбылося вясельле ў грэцкай царкве ў Пасэйку, а вянчаў нас айцец Мікалай Лапіцкі. Мы абое былі аўтакефалісты і, паводле амэрыканскага звычаю, адразу ў ЗША запісаліся да беларускай парафіі Сьвятога Кірылы Тураўскага (БАПЦ) у Нью Ёрку (будынку царквы на 401 Atlantic Avenue яшчэ не былі набыўшы). Але, ведаючы айца Лапіцкага яшчэ зь Беларусі і як сьвятара-незалежніка, і як грамадзкага дзеяча (яго ведалі і супрацоўнічалі зь ім сем'і Савёнкаў і Кіпеляў), мы бралі шлюб у яго, хоць ён і належаў да грэцкае юрысдыкцыі.

Як сям'я мы былі зьяднаная адзінка. У нас былі аднолькавыя пагляды і на беларускія справы, хоць Зора была больш прыхільная да лягеру БНР, але шанавала і нацыянальную групу БЦР. Я быў больш гаваркі ў абароне БЦР, хоць нам абаім было ясна, што БНР – гэта асноўны сымбаль дзяржавы і што апошняе слова ў выбары дзяржаўнасьці будзе мець народ.

За два месяцы да сьмерці Зора расказала пра нашае супольнае жыцьцё як сужэнства ў інтэрвію для Радыё Свабода, і я вельмі хачу, каб гэтыя словы былі ў маёй кнізе ўспамінаў:

«Пазнаёмілася я зь Вітаўтам, калі мне было 15 гадоў, фактычна, калі нам было па 15 - бо мы з аднаго 1927 году. І так ужо мусіць было наканавана, што шляхі нашыя ішлі разам праз усё далейшае жыццё - школа, унівэрсытэт, жанімства, сям'я.

У жыцьці не было вялікіх фэервэркаў, зорак зь неба - было спакойнае сужыцьцё, супрацоўніцтва, асабліва ў сфэры беларускасьці. Мы паходзім зь беларускіх сем'яў вельмі падобных лёсам і накіраваньнем, і гэта шмат дапамагала ў жыцьці. Мы стварылі адзінку. У ангельскай мове ёсьць вельмі трапнае слова team. У спорце гэта перадаецца як «каманда», у бізнэсе - «група». У сям'і, мусіць, найлепш перадаць як «адзінка».

Мы маем розныя характары, мы не згубілі сваёй індывідуальнасьці. Мы дапаўняем адно аднаго, дапамагаем адно аднаму, у выпадках стрымліваем адно аднаго, часам падштурхоўваем. Мы - неразлучныя. Мы ўсё жыцьцё аддалі беларускасьці. Як Вітаўт любіць гаварыць, працуем для Беларусі па-за Беларусьсю.

У маладосьці Вітаўт быў хіба што больш сэнтымэнтальны. Пад старасьць зрабілася я. Я не ўяўляю свайго жыцьця бязь Вітаўта».

Вясельле

Наша вясельле адбылося 25 лютага 1956 году. Мы з Зорай гасьцей не запрашалі, бо мы былі «новыя» і шмат ня ведалі. Сваіх знаёмых запрасілі бацькі – было чалавек 100-150. Праходзіла ўсё паводле амэрыканскага звычаю – з аркестрам, сьцягамі, надзьмутымі каляровымі шарыкамі. Беларускасьць вясельлю задавалі свацьця й сват – Лідзія Рыгораўна Янушкевіч і Сымон Жамойда. Лідзію Рыгораўну мы з бацькамі ведалі зь Менску – яна ад пачатку 1920-х гадоў працавала ў Купалаўскім тэатры. На вясельлі яна сьпявала вясельныя песьні, а Жамойда дапаўняў сьпевы расказамі і жартамі. Былі й прамовы – найбольш прачулую сказаў наш былы дырэктар гімназіі Аляксандар Орса.

На вясельлі мы сустрэлі шмат каго зь сяброў, зь якімі вучыліся яшчэ ў гімназіі – Ніну Палянскую, Галіну Ганчарэнка, Косьціка Вайцяхоўскага, іншых. Яны канчалі ўнівэрсытэты ў Амэрыцы, былі ўцягнутыя ў амэрыканскае жыцьцё і былі ў гэтым сэнсе крыху наперадзе нас, былі ў нейкім сэнсе амэрыканцамі, асабліва з матэрыяльнага боку – у іх ужо была «капейка», а мы пачыналі літаральна зь нічога, апрача дыплёмаў, якія мы атрымалі ў Лювэне, і, безумоўна, падтрымкі з боку бацькоў. Зорыны бацькі сказалі, што дапамогуць чым могуць, але не грашыма – іх не было. Мае бацькі рэсурсаў надта ня мелі, але на выпадак патрэбы пару капеек заўсёды маглі даць. Гэтак пачыналася наша амэрыканскае жыцьцё, а вясельле сталася добрым уваходам у амэрыканска-беларускае грамадзтва.

Далейшыя пошукі працы

Пасьля вясельля інтэнсіўна працягвалася шуканьне працы: я рассылаў дзесяткі рэзюмэ, абыходзіў сотні кампаніяў у Нью-Ёрку – браў тэлефонную кнігу, шукаў, што падыходзіць, і йшоў туды. Мы мамэнтальна зразумелі, што аснова для таго, каб стаць на ногі ў Амэрыцы – гэта праца. Былі прапановы працы, але таксама адразу ставілася пытаньне, ці маем мы амэрыканскае грамадзянства. Гэта было першай перашкодай, каб атрымаць працу геоляга – трэба было быць амэрыканскім грамадзянінам, і я з гэтым доўга меў цяжкасьць. На той час паводле бэльгійскіх законаў мы разглядаліся як апатрыды, асобы без грамадзянства. Амэрыканскія законы такога статусу не прадугледжвалі – у амэрыканскім бюракратычным сьвеце ўлічвалася апошняе грамадзянства, якое чалавек меў. У анкетах я на гэта не зьвяртаў увагі і ўсюды пісаў «апатрыд», і гэта абярнулася мне вельмі непрыемным бокам. Значна пазьней, калі я падаваў дакумэнты на дзяржаўную службу, мяне аднойчы паклікалі ў іміграцыйную службу і загадалі, каб я нідзе больш не пісаў «апатрыд»: «Для нас вы – савецкі падданы». Я запярэчыў, што я з Савецкім Саюзам нічога супольнага ня маю, мы зь ім у 1941 годзе разышліся. Так, кажуць бюракраты, але на дзяржаўную працу вы ня маеце права, бо належыце да катэгорыі «unfriendly aliens», непрыязныя чужынцы. Зь дзяржаўнай бюракратыяй змагацца не было сэнсу, і я цьвёрда вырашыў чакаць, пакуль стану грамадзянінам, а тады падаваць паперы на дзяржаўныя пасады або ў кампаніі, якія маюць дачыненьне зь дзяржаўнымі органамі.

Рэкамэндацыя прафэсара Таро

Адчуваньне было непрыемнае – пачынаеш жыцьцё, а жыць няма з чаго. Праўда, у мяне была рэкамэндацыя ад майго прафэсара Жака Таро ў Лювэне да ягонага калегі прафэсара Джозэфа Данэя ў Амэрыцы, які эміграваў гадоў трыццаць перад тым і быў прафэсарам ва ўнівэрсытэце імя Джонса Гопкінса ў Балтыморы, штат Мэрылэнд. Я паехаў да прафэсара Данэя. Гэта была вельмі прыемная сустрэча. Прафэсар Данэй займаў ва ўнівэрсытэце пасаду загадчыка катэдры крысталаграфіі і неарганічнай хіміі. Я расказаў яму хто я і што я. Ён распытваўся, як маецца прафэсар Таро, зь якім ён ня бачыўся ўжо гадоў трыццаць. І пасьля ён кажа, каб з пачатку новага студыйнага году, у верасьні месяцы, я прыяжджаў у Балтымор, праца мне знойдзецца. Не скажу, каб такі адказ мяне задаволіў, і я спрабаваў удакладніць, якая будзе праца. На што прафэсар Данэй адказаў, што дасьць мне пасаду асыстэнта (з правам прадаўжаць студыі) на катэдры геахіміі, або як яна тут звалася – «пэтрагенэзу». Плата за працу невялікая – парадку пару сот даляраў на месяц, а зьмест працы бу-

дзе акрэсьлены прафэсарам. Безь вялікага энтузіязму я пакінуў Балтымор, але і не адмовіўся, думаючы, што да верасьня знайду нешта.

Да верасьня я шукаў працу і было пару цікавых момантаў.

Першыя даляры

У маім рэзюмэ было напісана, што я ведаю геахімію і мінэралёгію сьлюдаў. Аднойчы я атрымоўваю ліст (бо ў маіх бацькоў тэлефона не было, наагул, нашы людзі тады яшчэ тэлефонаў мелі няшмат), што нейкай кампаніі ў горадзе Патэрсан, недалёка ад Пасэйку ў штаце Нью Джэрзі, патрэбны такі спэцыяліст, як я – спэцыяліст па сьлюдах. Я паехаў у тую кампанію, знайшоў яе. Прыйшоў да галоўнага загадчыка – ён кажа, о так, ведаем, ты прыслаў рэзюмэ, мы табе адказалі, зараз я зьвяду цябе зь людзьмі, якім ты патрэбны. Я ўжо й рады – некаму я патрэбны. Прыходзяць жанчына і два мужчыны і распытваюцца – што я рабіў, як і дзе. Выслухаўшы мяне, кажуць: зараз пойдзем у цэхі, дзе мы працуем са сьлюдамі, і мы табе пакажам, што мы шукаем. Аказалася, што гэта фабрыка, якая вырабляла жалезныя печкі, а дзьверы ў печках мелі сьлюдзяныя вокны, і гаспадары хацелі тыя вокны рабіць розных колераў. З майго рэзюмэ людзі зразумелі, што я дапамагу ім вырашыць, як таньней тую сьлюду фарбаваць. Я паглядзеў і сказаў, што абсалютна ня ведаю, чым ім магу дапамагчы, бо я больш ведаю навукова, з чаго гэтая сьлюда складаецца, ведаю, што ёсьць чорная сьлюда біятыт, ёсьць лепідаліт, ёсьць сьветлая сьлюда мускавіт. Гэта ўсё яны ведалі, але хацелі, каб тая сьлюда была жоўтая. Я сказаў, што калі яны хочуць, я магу паспрабаваць, але што я наўрад ці ім падыходжу, што ім патрэбны інжынэр, які ведае кераміку. І яны былі ўдзячныя, што я ім гэта падказаў. Мы ўжо разьвітваліся, і яны мне даюць чэк на 200 даляраў! Я бачу, што 200 даляраў, і разумею, што гэта чэк – але ў мяне няма банкаўскага рахунку, дык я з чэкам нічога не магу зрабіць. Тады жанчына, што зь імі была, пайшла запытацца ў бухгальтара, ці можна даць гатоўкай, і праўда – празь дзесяць хвілін прыносіць мне 200 даляраў. Гэта быў мой першы амэрыканскі заробак, які на той момант быў для мяне велізарны, калі я прыйшоў і паказаў Зоры – яна ледзьве давала веры, што я атрымаў столькі грошай, і сказала: «Цяпер мы можам траціць хоць пяць даляраў на дзень!»

Union Carbide

Быў яшчэ адзін памятны момант у пошуках працы, калі мяне запрасілі на інтэрвію ў амэрыканскую кампанію-гігант Union Carbide. Гэта хімічная кампанія, але займаюцца яны і здабычай мінэралаў. Калі я быў ужо ў Балтыморы – бо рэзюмэ я рассылаў раней – мяне паклікалі на інтэрвію ў Нью Ёрк і напісалі, што аплацяць дарогу.

Я паказаў гэта прафэсару Ўотэрсу, зь якім я працаваў, ён сказаў – безумоўна, едзь.

Паехаў я ў Нью-Ёрк, пайшоў на інтэрвію і бачу, што кампаніі патрэбны геоляг, які мае такую падрыхтоўку, якую меў я – тая самая спэцыялізацыя – але яны хочуць, каб я на два гады паехаў у Турцыю. Я ня быў да гэтага гатовы і сказаў, што з Амэрыкі нікуды не паеду. Мне заняло шмат часу, каб трапіць у ЗША, дый імігрыйны закон прадбачае, што я пяць гадоў ня маю права нікуды выяжджаць, калі я выеду – працэс пераезду ў ЗША пачнецца з нуля. Людзі з Union Carbide спрабавалі пераканаць, што паспрабуюць нешта зрабіць для мяне ў Вашынгтоне, але пасьля прыйшла жанчына і сказала, што наўрад ці нешта ўдасца зрабіць. У выніку я сказаў, што калі праз два гады – бо я ўжо буду грамадзянінам – гэтая праца яшчэ будзе, я буду гатовы яе ўзяць. (Тады я яшчэ й ня ведаў, што грамадзянства трэба было чакаць пяць гадоў.) На гэтым мы й разышліся, праўда, яны вельмі шчодра аплацілі мне дарогу. Наагул, што да грамадзянства, у тыя часы законы былі жалезныя, і іх трэба было выконваць літаральна.

Выезд з Пасэйку

Карацей кажучы, я за вясну і лета працы ў геалёгіі не знайшоў, і так мы паехалі з Пасэйку. Як першая «база» ў ЗША Пасэйк пакінуў па сабе прыемныя ўспаміны, і пазьней, калі бывала магчымасьць, я сустракаўся зь «беларускім» Пасэйкам. Я браў удзел у беларускай калёне на адзначэньні 100-х угодкаў гораду, калі народжаная ў Пасэйку беларуска – Вера Божка – была абраная «каралевай балю». Я выступаў у Пасэйку 24 верасьня 1978 году на ўкраінскай дэманстрацыі падчас адзначэньня 45-х угодкаў Галадамору ва Ўкраіне. Бываў на ўрачыстасьцях ушанаваньня сьвятых Кірылы і Мэтода ды на іншых імпрэзах. Праз Пасэйк, калі ёсьць хоць нейкая нагода, праяжджаю і цяпер. Дарэчы, на могілках у Пасэйку пахавана шмат актыўных беларусаў – Лідзія Янушкевіч, Сымон і Тацяна Жамойды, Юрка Барташэвіч.

Балтымор

У верасьні 1956 году я прыехаў у Балтымор працаваць асыстэнтам у прафэсара Арона Ўотэрса на катэдры геалёгіі. У прафэсара было каля 30-40 студэнтаў. Мая праца палягала ў тым, каб падрыхтаваць для лекцыяў розныя пароды, перагледзець, ці працуюць мікраскопы, а калі прафэсар ня прыйдзе – у часе практычных заняткаў дапамагаць студэнтам разумець прадмет.

Амэрыканская стыпэндыя асыстэнта (assistantship) разьлічаная на студэнтаў, якія трохі падзарабляюць, але галоўнае тое, што асыстэн-

цтва ўлучае права наведваць лекцыі без аплаты. Гэта самае важнае, а таму для людзей, якія маюць навуковую ступень, сямейных, асыстэнцтва – вельмі часовы пэрыяд, бо яно мала аплочванае.

Падрыхтоўка да працы са студэнтамі забірала ладна часу, але я меў магчымасьць наведваць лекцыі па прадметах, якіх я ня меў у Лювэне – напрыклад, пэтрагенэз (нараджэньне пародаў). Трэба было здаваць экзамэны, хоць на гэта я не зьвяртаў увагі. Я думаў – што гэта мне дае? Тытул доктара ў мяне ёсьць – хопіць. Сэнс майго побыту ў Балтыморы быў у тым, каб трымацца разам з геалягічнай навукай і трохі зарабіць, шукаючы працы па-за ўнівэрсытэтам. Праўда, у Балтыморы былі падработкі ў галіне геалёгіі. У тым самым унівэрсытэце Джонса Гопкінса разьмяшчалася галоўная кантора геалягічнай службы штату Мэрылэнд. Загадчыкам службы ў той час быў прафэсар Зынгенвальд, я зь ім пазнаёміўся, часам туды заходзіў. І прафэсар Зынгенвальд ведаў, дзе можна знайсьці працу для неграмадзяніна: зрабіць гідралягічную экспэртызу, або аналіз пробаў зь сьвідравінаў – такую працу мог рабіць і неамэрыканец. Зынгенвальд мне такія працы даваў, што дазваляла зарабляць па 70-80 даляраў за дзень, добрыя на той час для мяне грошы.

Я трымаўся ў Балтыморы яшчэ і з таго меркаваньня, што на катэдры геалёгіі плянавалася разбудаваць экспэрымэнтальную геахімічную лябараторыю. Падобная лябараторыя была ў Вашынгтоне, а другую меркавалі адкрыць у Балтыморы. У такой лябараторыі займаліся б сынтэзам пародаў: хімікі дасьледавалі б склад той або іншай пароды, а геолягі меліся б з паасобных элемэнтаў сынтэзаваць такую самую пароду. Гэта была вельмі важная справа. Хімічны аддзел такой лябараторыі якраз і зьбіраліся адкрыць у Балтыморы і разьлічвалі на вялікі штат. Загадчыкам лябараторыі меўся быць Ганс Ойгстэр – швэйцарац, які ў часе вайны апублікаваў шмат артыкулаў на матэрыяле Швэйцарскіх Альпаў. Але з гэтых плянаў нічога ня выйшла, бо праз год – у кастрычніку 1957 году – у космас паляцеў першы савецкі спадарожнік. Амэрыканцаў ахапіла паніка. У выніку ўсе сродкі, прызначаныя на розныя навуковыя праекты, уключна з геахімічнай лябараторыяй у Балтыморы, пайшлі на фізыку, астраномію і іншыя навукі, зьвязаныя з дасьледаваньнем космасу. Так надзеі на працу ў новай лябараторыі не збыліся. Трэба было шукаць нешта іншае і чакаць на грамадзянства.

Першыя кантакты з грамадзкім жыцьцём у ЗША

У Балтыморы было ад 50 да 100 беларусаў, якія трымаліся разам. Фармальнай арганізацыі не было, але беларусы зьбіраліся – на вясельлі, іншыя сьвяты. Неабвешчаным лідэрам быў Іван Канарчук.

Канарчукі – беларусы зь Лепельшчыны, Іван у часе вайны быў у беларускай адміністрацыі. Жонка Оля працавала настаўніцай. Яны былі стараверы: сям'я была вялікая – брат Лёўка, сястра Маруся, дзеці. Іван Канарчук атрымоўваў пару дзесяткоў асобнікаў газэт «Бацькаўшчына», «Беларус» і раздаваў людзям. Адрас Канарчукоў мы даведаліся праз Савёнкаў.

Да нас Канарчукі паставіліся вельмі добра, дапамагалі. У нядзелю, калі зьбіраліся беларусы – у іх ужо тады была аўтамашына, – Канарчукі прыяжджалі і забіралі нас да сябе.

Цікава, што да іх на зборкі прыходзілі і старыя эмігранты. Адзін раз такая зборка была ў праваслаўнай царкве, і там мне сказалі, што раней у Балтыморы была беларуская арганізацыя. Мяне пазнаёмілі з чалавекам, які належаў да той арганізацыі, і той чалавек сказаў, што пакажа мне месца на могілках, дзе за агароджай пахаваны беларус, які сам сябе застрэліў. І сапраўды – на помніку было напісана «беларус». Я не запісаў адрас могілак, тым часам усе тыя людзі памерлі, і я не магу іх знайсьці.

Працавалі амаль усе беларусы Балтымору ў цукровай кампаніі «Domino». Балтыморскія беларусы жылі сваім жыцьцём, адарваныя ад большых арганізацыяў, але Іван Канарчук і Лёўка Кавалёў трымалі лучнасьць з БАЗА, з Кангрэсавым Камітэтам. Пасьля таго, як калі памерлі Іван і Оля Канарчукі, беларускасьць у Балтыморы трымае Лёва – Іванаў малодшы брат. Зь Лёвам і ягонай жонкай, мы трымаем лучнасьць і да сёньня.

Былі ў Балтыморы беларусы цікавыя сваёй біяграфіяй. Адзін зь іх – Мікалай Нагорны з Баранавічаў – добра запомніўся. Калі ў 1939 годзе прыйшлі саветы, Нагорных адразу раскулачылі і ў кастрычніку вывезьлі ў Карэлію. Але ў дарозе на нейкай станцыі савецкі афіцэр пераглядаў хлопцаў, якіх везьлі на высылку, і кажа Мікалаю: «Этот парень нам подходит» і забраў яго ў войска, і так Мікалай стаў савецкім салдатам. Ён быў на фінскай вайне, быў інтэрнаваны і ніколі не вярнуўся на Бацькаўшчыну. А потым – калі пачалася нямецкая вайна, трапіў у нямецкае войска, а пасьля – да амэрыканцаў.

Назіраючы за беларускім жыцьцём у Балтыморы, я бачыў, што беларускія кантакты могуць быць без фармальнай структуры. Аднак, безумоўна трэба, каб быў актывіст, рухавік, які будзе трымаць беларускасьць. Іван Канарчук уважаў, што так будзе найлепш, бо, казаў ён, калі стварыць арганізацыю, людзі пачнуць паміж сабой сварыцца, і арганізацыя развалiцца. Думаю, што ў некаторых выпадках гэта разумны падыход.

Ясна, у Балтыморы было значна больш беларусаў, але ня ўсе трымаліся з Канарчукамі. Давялося мне сустрэцца ў той час зь беларусамі, якія прыехалі ў ЗША перад Першай сусьветнай вайной

і памяталі доктара Аляксандра Сянькевіча і ягоны беларускі гурток у 1912–1915 гадох, калі ён студыяваў мэдыцыну ў Балтыморы.

У бібліятэцы ўнівэрсытэту Джонса Гопкінса была нядрэнная беларуская калекцыя кніжак, але мяне дзівіла, што яны выпісвалі шмат газэт. Ці там гэтым нехта спэцыяльна займаўся – я так і не даведаўся, бо закоратка там прабыў. У геалягічнай бібліятэцы ў мяне адбылася цікавая сустрэча зь бібліятэкаркай. У Геалягічным інстытуце была вялікая бібліятэка, якой я часта карыстаўся, бо трэба было шмат чытаць, сачыць за літаратурай. А я пачуў, што бібліятэкарка гаворыць з акцэнтам, і адзін раз яна ў мяне пытаецца, хто я і адкуль. Я кажу, што беларус, і пытаюся хто яна. «А я, – кажа, – латышка. Скончыла ў ЗША бібліятэчны факультэт, а дома я была настаўніцай і працавала недалёка каля Дзьвінску». І кажа, што чуецца нядобра, бо часта даводзілася беларускіх дзяцей ляпаць лінейкай, калі яны гаварылі міжсобку па-беларуску. Я са зьдзіўленьнем спытаўся – чаму так? «А нам было загадана так рабіць», – сказала яна...

Разьвітаньне з Балтыморам

Хоць у Балтыморы мы пражылі ўсяго пару гадоў, 1956–1958, у гэтым горадзе адбыліся памятныя для мяне падзеі: нарадзілася дачка Алеся, пачалі ўваходзіць у амэрыканскае жыцьцё, зьявіліся першыя сябры-амэрыканцы (як, прыкладам, прафэсар Данэй, зь якім мы пазьней доўга трымалі лучнасьць і супрацоўнічалі), наладзіліся трывалыя кантакты з амэрыканскімі беларусамі. У Балтыморы я пачаў зьбіраць дакумэнтацыю пра беларусаў Амэрыкі. Гэты быў наш з Зорай пачатковы пэрыяд амэрыканскага этапу жыцьця. Быў ён аптымістычны, поўны спадзяваньняў і цьвёрдай перакананасьці – мы самыя, сваімі сіламі, верай, дасьведчаньнем павінны будаваць сваю будучыню.

Кантакт, праца ва ўнівэрсытэце давалі ўпэўненасьць, што тут можна затрымацца і працаваць, аднак было відавочна, што станавіцца на ногі, рухацца ўгору на асыстэнцкай зарплаце непэрспэктыўна. Трэба шукаць нешта іншае, больш платнае. Зора ў Балтыморы працавала ў крысталаграфічнай лябараторыі ў прафэсара Данэя, ён тады рыхтаваў даведнік «Crystal Data» – ідэнтыфікацыя крысталаў паводле аптычных і рэнтгенамэтрычных парамэтраў. Так мы з Зорай пастанавілі: дабудзем да канца акадэмічнага году, г. зн. да чэрвеня, а тады паедзем альбо ў Нью Ёрк, альбо куды-небудзь далей. Можна было перабрацца і ў Вашынгтон, там я меў пару знаёмых, але Вашынгтон быў ня надта адпаведным месцам для шуканьня працы на дадзеным этапе. Кампаніі, якія займаліся геалягічнымі справамі, былі зьвязаныя адміністрацыйна зь дзяржаўнымі структурамі, а я пакуль што ня меў амэрыканскага грамадзянства, таму атрымаць працу ў такіх кампаніях было немагчыма.

Жыццё на фарме ў Памоне

У чэрвені 1958 году Зора з дачкой Алесяй паехала жыць да бацькоў у Памону. Пераезды нашы адбываліся лёгка: я знаходзіў студэнта, які меў машыну, той грузіў наш багаж, і – паехалі! Рэчаў у нас было вельмі мала, а кнігі, якія мы прывезьлі з Эўропы, амаль усе завезьлі на фарму да Савёнкаў, бо Зорын бацька прасіў прывезьці да іх усе кнігі на славянскіх мовах.

У гэтым пэрыядзе нашага жыцьця ў ЗША нас выручала фарма – невялічкая хата і 10 гектараў зямлі ў сельскай мясцовасьці, куды зь Нью Ёрку ў 1954 годзе перабраліся спадарства Савёнкі. Справа была такая: Савёнкі прыехалі ў ЗША ў 1950 годзе і пасяліліся ў Нью Ёрку. Ім пашчасьціла хутка знайсьці працу і добра зарабляць, асабліва спадару Лявону. Але ў пачатку 1954 году абое страцілі працу, і эканамічная сытуацыя была такая, што выглядала – працу знайсьці будзе нялёгка. Абое былі «ў гадах». Каб не апынуцца на вуліцы і бяз грошай, вырашылі заняцца сельскай гаспадаркай – купілі фарму і пачалі разводзіць курэй. І праца, і заробак! Гэтак Савёнкі дацягнулі да пэнсіі.

Калі Зора абзавялася сям'ёй, а свае хаты мы яшчэ не набылі, фарма для нас сталася «сваёй хатай», асабліва для дзяцей (Юра нарадзіўся 25 верасьня 1958 году ў Атлантык Сіты). Для дзяцей фарма была раем – прырода, лес, грыбы, ягады, зьвярушкі. Дзеці разам зь дзедам «Нёням» (Лёням) і бабкай (бабак звалі толькі «бабка») і даглядалі курэй, і садзілі гародніну, і качалі ваду са студні – усё было натуральнае, прыроднае. На фарме часта бывалі і госьці-беларусы: Стомы, Канарчукі, Паланевічы і іншыя. І яшчэ – дзеці гаварылі па-беларуску! Няма словаў, фарма Савёнкаў была і для нас, і для ўнукаў утульным беларускім прыстанішчам памятным на ўсё жыцьцё.

Бібліятэка

Пошукі працы ў Нью Ёрку

Я тым часам больш бываў у Нью Ёрку, начаваў у маіх бацькоў ды шукаў працу. Дарэчы, шукаў ня толькі ў Нью Ёрку – езьдзіў і ў штат Канэтыкат, і ў Пэнсыльванію. Абяцальна выглядала адна праца ў Трэнтане – сталіцы штату Нью Джэрзі, але як толькі выявілася, што я ня маю амэрыканскага грамадзянства, усё лопнула. Шукаў я працу пераважна як геоляг-палявік, але разглядаўся і на ўнівэрсытэты з надзеяй на большую зарплату, чым у Балтыморы.

Пару разоў я меў падработкі ў Амэрыканскім інстытуце нафты – пераклады, праца гэтая добра аплачвалася, але была часовая. Пару месяцаў працаваў зь пяскамі штату Нью Джэрзі, аналізуючы працэнт мінэралу рутылу (вокіс тытану) у пясках, але кампанія неўзабаве перабралася на захад краіны, стаўшы субкантрактарам у фэдэральным урадзе, і ўзяць мяне туды не маглі, бо ня меў грамадзянства.

Наагул, пошукі працы – справа невясёлая, прыгнятальная, а шукаць працу ў геалёгіі, ня будучы грамадзянінам ЗША, як я спасьцярог – справа літаральна безнадзейная. Аднойчы, ходзячы ад фірмы да фірмы, я зайшоў у кафэтэрыю, купіў кубак кавы, дастаў з сумкі бутэрброд, ем сабе і думаю, а мэнэджэр падыходзіць і ціхенька кажа, што з сваім бутэрбродам у кафэтэрыю заходзіць нельга, наступным разам пагоніць вон...

Праўда, знаходзіліся кароткатрывалыя працы – каля месяца я працаваў у NJ Zink, аналізуючы буравыя шурфы непадалёк ад Нью Ёрку. І ўсё ж мы з Зорай упорыста верылі, што ў Нью Ёрку знайсьці працу ўдасца.

Празь нейкі час я атрымаў адказы на высланыя раней рэзюмэ, што магчымая праца будзе ў штаце Нью Джэрзі ў прыватнай кампаніі, а яшчэ кампанія Shell можа мець вакантнае месца ў геахімічным аддзеле. Але ўсё гэта азначала: чакаць, чакаць... Выглядала, што ў Нью Ёрк трэба было перабірацца, атайбоўвацца на даўжэйшы час. Настрой быў ні к чорту. Асабліва злавала тое, што пакінулі Балтымор, дзе можна было сядзець і працаваць, шукаючы працу праз пошту і тэлефон. Але тое ўжо ня вернеш!

Затрымаліся мы, знайшлі й нанялі кватэру ў Нью Джэрзі – таньней, чым у Нью Ёрку – у горадзе Ўолінгтан. Гэта малы, амаль цал-

кам польскі гарадок, хоць кватэру мы знайшлі ва ўкраінцаў. На нейкі час Ўолінгтан стаў нашай базай. Зора пачала падзарабляць друкаваньнем на машынцы (для Янкі Станкевіча ў камітэце па перакладзе Бібліі на беларускую мову), а я прадаўжаў пошукі працы, падзарабляючы аказійна: рабіў карту старога закінутага кар'еру, пераклады для ААН (артыкулы з эканамічнай геалёгіі) – усё, што трапляла пад руку.

Паступова праскоквала думка – а мо ўзяць некалькі дадатковых лекцыяў у Калюмбіі і пайсьці ў гуманітарна-эканамічныя навукі? Прызнаюся, што беларусіка мяне прыцягвала ўвесь час. Памятаю, як аднойчы, яшчэ ў Балтыморы, калі я быў у геалягічнай экспэдыцыі, кіраўнік партыі, убачыўшы ў мяне беларускую кніжку, сказаў – праўда, жартам – каб я чытаў нешта з геалёгіі.

Бібліятэка на 5-м авэню

Як бы там ні было, але пры пошуках працы прыходзілі ўсякія думкі. Калі настрой быў зусім прыбіты і жыцьцё здавалася беспрасьветным, сапраўднай аддушынай было пабыць пару гадзін у бібліятэцы на рагу 42-й вуліцы і 5-га авэню, куды я заходзіў пасьля дзённых працашукальных паходаў і сустрэчаў пачытаць часапісы, газэты, папытацца ў працаўнікоў пра новыя кнігі. На той час гэтая бібліятэка была бадай ці не адзінай, дзе выпісвалася з тузін газэтаў і часапісаў з БССР, атрымоўваліся амаль усе эмігранцкія беларускія выданьні, а ў навуковым аддзеле я мог азнаёміцца літаральна з усёй геалягічнай літаратурай сьвету. Па ўсіх маіх (і ня толькі!) стандартах гэта было выдатнае месца. Прычым, каб атрымаць літаратуру, не было ніякіх бюракратычных фармальнасьцяў. Запоўні цэтлік – і за 10-15 хвілін часапіс у цябе ў руках.

Кудайберген Куджамбердыеў

Аднойчы чытаю я нешта беларускае – а бібліятэчны пэрсанал ведаў, чым я цікаўлюся – падыходзіць супрацоўнік, чалавек мангольскага тыпу, і кажа па-расейску з усходнім акцэнтам: «Я вижу, что ты белорус (перайшоў адразу на «ты»), интересуешься белорусскими книгами». Я кажу, так. А ён мне: пойдзем вып'ем кубак гарбаты, я да беларусаў маю вялікую любоў, бо шмат чым беларусам абавязаны, а найбольш – жыцьцём. Вядомая справа: запрашаюць, а я чалавек свабодны – пайшлі.

Мой новы знаёмы прадставіўся: ён па нацыянальнасьці кіргіз, Кудайберген Куджамбердыеў. Паходзіць з аулу каля кітайскай мяжы ў Кіргізіі, быў у Чырвонай Арміі, пачалася вайна, трапіў у акружэньне ў Беларусі. У палон ня здаўся, доўгі час бадзяўся ў ра-

ёне Івянца, сям-там падрабляў. А потым, ужо ў 1942 годзе, у тых мясьцінах зьявіўся савецкі лейтэнант і кажа былым салдатам: вам усім у лес. Гэта савецкія вайскоўцы, скінутыя на парашутах, фармавалі партызанскі рух. Было вельмі цяжка, холадна, есьці не было чаго, туліліся ў зямлянках. Сьвежаскінуты лейтэнант – ён называў прозьвішча, але я не запомніў – кажа: «Ребята, я вас одену и обую». І вось аднаго дня – пасьля Кудайберген даведаўся, што гэта былі Каляды – партызаны акружылі касьцёл (ён прыпушчае, што гэта было ў Івянцы), дзе йшла калядная служба, сказалі ўсім мужчынам скінуць кажухі, боты, забралі ўсё і пакінулі іх так – прадаўжайце маліцца! А партызанскі атрад добра апрануўся. Нікога не стралялі. Настрой у партызанаў быў узьняты, а ў насельніцтва, распранутага і разутага, прыбіты. Але калі партызаны адыходзілі, іх дагнала беларуская паліцыя. Паліцыі было значна больш, яна была лепш узброеная, пачаўся бой, партызаны прайгралі. Паліцыя шмат партызанаў пастраляла, стралялі на месцы. А яго, Кудайбергена, чамусьці не расстралялі. «Гэтага, – сказалі, – адправім у Нямеччыну». Першы пункт, куды, як ён памятае, яго прывезла паліцыя, была Вялейка, там яго перадалі немцам. Немцы пагрузілі ўсіх у таварныя вагоны і вывезьлі ў Нямеччыну.

Так Кудайберген трапіў у Нямеччыну. У Нямеччыне ён быў мабілізаваны ў туркестанскія вайсковыя фармаваньні, тыя фармаваньні былі кінутыя ў Францыю, дзе Кудайберген дачакаўся канца вайны, а тады перабраўся ў Турцыю. У Турцыі быў закон, што любы мусульманін, што туды прыедзе, можа стаць туркам. У Турцыі ён прабыў нейкі час пасьля вайны і чуўся там досыць добра, але яго ўсё адно цягнула ў Эўропу. Ён паехаў у Парыж, там улучыўся ў туркестанскі рух, а адтуль выехаў у Амэрыку. Так ён трапіў у бібліятэку, куды яго ўзялі, бо там былі вялізныя залежы літаратуры арабскімі літарамі, якая друкавалася ў Савецкім Саюзе ў 1920-х гадах. Некаму трэба было ўсё гэта разабраць, бо прафэсар Олдсўорт з Калюмбійскага ўнівэрсытэту, займаўся вывучэньнем таго пэрыяду. І Кудайберген быў першым, хто пачаў тую літаратуру разьбіраць: ён ведаў татарскую і арабскую мовы.

Калі Кудайберген прыпамінаў тое здарэньне ў Івянцы, у яго былі сьлёзы на вачах. Ён, трэба сказаць, быў досыць сэнтымэнтальны. Таксама ведаючы, што я беспрацоўны, што ў мяне цяжка з грашыма ён вельмі часта прапаноўваў мне начаваць у ягонай кватэры ў Брукліне, каб заашчадзіць на аўтобусных білетах у Нью Джэрзі. Я зь ягоных прапановаў карыстаў – начаваў у Брукліне. З тых сустрэчаў мне будзе заўсёды памятацца: бывала, сядзіць Кудайберген, заківае галавой, нахіліцца як бы ў малітве і кажа: «Чудо... чудо... не расстреляли... Сколько живу, буду помнить и любить белорусов!»

Як я выпадкова атрымаў працу

Але я забягаю наперад. У той час жыцьцё ішло памалей. Мы знаёміліся з Кудайбергенам бліжэй, знаёмства перайшло ў сяброўства. Кудайберген пазнаёміў мяне з геолягамі, былымі грамадзянамі СССР, а цяпер ЗША, якія знайшлі сабе працу. Гэтыя людзі – Е. Аляксандраў (да вайны працаваў у АН УССР у Кіеве) і Леанід Сьмірноў (зь Ленінграду, быў галоўным навукоўцам Паўночнага марскога шляху з Архангельску ва Ўладзівасток) – таксама нешта спрабавалі для мяне зрабіць, але ўсё ўпіралася ў грамадзянства.

У адзін з маіх візытаў у бібліятэку Кудайберген мне кажа (ягоны акцэнт я не забуду ніколі!): «Слушай, я могу тебе помочь с работой. Я планирую съездить в Турцию и жениться – там много наших красивых татарок. Но! Мой библиотечный начальник, поляк – я его очень не люблю! – сказал, что отпустит меня с работы, если я найду себе замену. Я думаю выехать минимум на месяц-полтора. Я тебя очень прошу, я люблю белорусов и я знаю, что ты ищешь работу. Пожалуйста, замени меня. Для моей жизни это очень важно!»

Ён ня толькі гаварыў. Ён горача прасіў, на ягоным твары быў выраз: мне гэта жыцьцёва неабходна – калі ласка! Ну што я мог адказаць на такую просьбу – раптоўную, нечаканую, жыцьцёвую? Я разгубіўся, такі абарот справы быў мне нязручны, ён гамаваў маю дзейнасьць. Але бачачы ягоную разгубленасьць, літаральна фатальнасьць – адмовіць яму я ня мог. Я кажу: добра, я гатовы цябе на нейкі час падмяніць, але я мушу пагаварыць з тваім начальнікам. Я яму скажу, што я шукаю працу, хаджу на інтэрвію ў розныя фірмы, і калі ён будзе мяне па абедзе адпушчаць, я гатовы цябе замяніць.

Назаўтра Кудайберген прадставіў мяне начальніку – доктару Рычарду Ляванскаму, які займаў пасаду заступніка загадчыка Славянскага аддзелу. (У тым часе доктар Ляванскі фактычна дзеіў як загадчык аддзелу, бо загадчык, доктар Джон Міш, быў у Рыме.) Маё інтэрвію зь Ляванскім было кароткае: праца будзе ўлучаць разбор залеглае літаратуры на славянскіх мовах, улучна зь літаратурай навуковай, ды акрэсьленьне, зь якімі навуковымі ўстановамі СССР трэба навязаць абмен, а таксама ўпарадкаваньне беларускіх матэрыялаў. Дзеля таго, што, як расказаў яму Кудайберген, падрыхтоўка ў мяне ёсьць, ён уважаў, што з працай я спраўлюся.

Я Ляванскаму коратка расказаў пра сябе ды пра тое асноўнае, што было ў мяне ў той час у галаве – пошукі працы. Ляванскі адразу мне сказаў, што я магу прыходзіць калі хачу, аплата мая пагадзінная, працу шукаць – я вольны, не прывязаны да гэтага месца. Паколькі ў мяне працы ніякае не было, а тут было можна зарабіць капейчыну – я згадзіўся. Ляванскі быў вельмі задаволены, а яшчэ больш быў задаволены Кудайберген – яго доктар Ляванскі адпускаў.

Пачатак працы ў бібліятэцы

Так я часова ўладзіўся на працу ў Славянскі аддзел бібліятэкі. Пазнаёміўся зь Ляванскім бліжэй. Ён паляк, пратэстант, паходзіў з Варшавы. У 1939 годзе быў у польскай арміі, ваяваў з саветамі, быў паранены, трапіў у палон, а далей – у Сібір. З арміяй генэрала Андэрса выйшаў з СССР і ваяваў у Афрыцы і Італіі. Афіцэр. Гісторык, перад вайной скончыў Варшаўскі ўнівэрсытэт, а ў ЗША – бібліятэчны факультэт Каліфарнійскага ўнівэрсытэту. Жонка італьянка, мае сына. Зь беларусамі сустракаўся ў арміі, ведае доктара Жука-Грышкевіча. Ня любіць Кудайбергена і рады, што я нешта зраблю ў аддзеле.

Трэба сказаць, што мы абодва – Ляванскі і я – пачуліся добра пры знаёмстве, шмат у чым нашыя пагляды супадалі. Празь дзень ці два пасьля знаёмства Ляванскі мне кажа, што ён укладае бібліяграфію славянскіх слоўнікаў і нічога ня можа знайсьці беларускага, дык ці не згадзіўся б я яму дапамагчы з пошукамі. Ясная справа, што я згадзіўся і дапамог (мая першая праца ў гуманістыцы!).

Тым часам Кудайберген выехаў у Турцыю, як ён казаў, на месяц, але прыпушчаў, што можа там затрымацца даўжэй, бо ён напэўна хацеў ажаніцца з мусульманкай, калі магчыма, зь ягоных краёў. Я паступова пачынаў знаёмства з славянскімі калекцыямі і «залежамі», асабліва ваеннага пэрыяду. Праз пару тыдняў мае працы ў аддзеле – як звычай я ў аддзеле бываў па абедзе – доктар Ляванскі запрашае мяне на падвячорак і кажа, што да нас далучыцца яшчэ адна асоба – спадар Джордж Бон, загадчык Навуковага аддзелу бібліятэкі.

Так і было, праз хвілінаў пяць да нас падсеў маладжавы з выгляду, рухавы чалавек і прадставіўся: Джордж Бон. Пасьля жартаўліва працягваў: паўгода загадчык Навуковага аддзелу, а перад тым два гады дарадчык Нацыянальнае бібліятэкі Турцыі па справах навуковае літаратуры і інфармацыі. І далей расказаў пра сябе: народжаны ў Агаё ў сям'і нямецкіх эмігрантаў, якія жылі ў ЗША каля 150 гадоў. Па адукацыі інжынэр-хімік, таксама 5 гадоў таму скончыў Caltex – Каліфарнійскі тэхналягічны інстытут, факультэт інфарматыкі і бібліятэказнаўства. Затым он, кажучы, што ў яго часу ў абрэз, зварачаецца да мяне гэтак: «Я пра вас ведаю ад доктара Ляванскага. Ведаю, што вы геоляг, ведаеце некалькі моваў і шукаеце працу. Мы можам вас узяць на працу. У Навуковым аддзеле паводле бюджэту ёсьць вакансія. Як выглядае, Навуковы аддзел адказны за падбор навуковай літаратуры з СССР, але, як мяне інфармавалі, – кажа Бон, – гэтая пасада застаецца незанятая каля дзесяці гадоў, не маглі знайсьці адпаведнага кандыдата». Працуюць «у пацёмках»!

Далей Бон вельмі станоўча сказаў, што калі я зацікаўлены – мяне могуць залічыць на гэтае вакантнае месца, а зарплата будзе лічыцца стыпэндыяй. Гэта 360 даляраў месячна, аднак дадатковыя вымогі

стыпэндыі – каб кандыдат быў запісаны на бібліятэчны факультэт. А іхная дадатковая вымога, дадаў Бон – каб я два разы на тыдзень па тры гадзіны адбываў стаж інфармацыйнае працы – працаваў з публікай.

Вось гэтак Бон расказаў мне аб магчымасьцях заробкаў і пайшоў. Я застаўся зь Лявансkім. Зь ім я пачаў разважаць: прапанова Бона выглядала прывабна, але гэта азначала, што мне трэба здабываць іншы дыплём. У выпадку згоды на прапанову абмяжоўваўся мой час на пошукі працы. Паколькі мы разышліся з Бонам безь ніякае канкрэтнае дамовы, я папрасіў Лявансkага сказаць яму, што аб гэтай справе я мушу парадзіцца з Зорай і добра падумаць.

Пераход у Навуковы аддзел

Радзіліся і разважалі мы з Зорай аб прапанове даўгавата. Дыскутавалі аргумэнты «за» і «супраць». Перамагло «за» на той галоўнай падставе, што працу ў Навуковым аддзеле я заўсёды магу кінуць: кантракту я не падпісваў. Меў сваё значаньне фінансавы бок, а таксама тое, што я буду мець дачыненьне і да беларусікі. Я зноў сустрэўся з Бонам і сказаў яму пра маю згоду працаваць у Навуковым аддзеле, як і пра тое, што прадаўжаю шукаць працу ў геалёгіі. Бон адразу даў запоўніць мне патрэбныя фармуляры для паступленьня на бібліятэчны факультэт Ратгерскага ўнівэрсытэту, дзе ён таксама выкладаў прадмет «навуковая літаратура». Пры гэтым мы перакінуліся заўвагамі: Бон сказаў, што калі я на працягу году не знайду працы ў геалёгіі і буду заканчваць бібліятэчны факультэт – тады пагаворым аб умовах, на якіх я змагу застацца ў Навуковым аддзеле. Гэтак аформілася мая праца ў аддзеле. Дзіўна, як бывае ў жыцьці: то працы не было, у кішэні ні капейкі, а тут раптам аж дзьве працы!

Празь месяц-паўтара з Турцыі, ажаніўшыся, вярнуўся Кудайбергеn. (Ажаніўся ён з «казанскай» татаркай, якая жыла ў Турцыі – ведала мовы, вельмі «зарадная» і прыгожая жанчына.) Прыйшоў ён да мяне ў Навуковы аддзел заклапочаны і кажа: «Пойдем чаю выпьем». (Ён кавы ня піў.) «Ну ты, – кажа, – этого поляка любишь?» Я кажу, ведаеш, ну як, я зь ім нічога ня маю. У асноўным я працую ў Навуковым аддзеле – і я расказаў Кудайбергену, што адбылося за ягоную адсутнасьць. Гэтаксама мая праца зь беларускай калекцыяй аплачваецца зь іншых фондаў, і Кудайбергену клапаціцца за сваё месца няма чаго. Гэта вельмі яго супакоіла, хоць ён паўтарыў, што Лявансkага ня любіць, і мы зь ім засталіся сябрамі. Больш я быў яму ўдзячны, што ён знайшоў мне заробак, і дзякуючы гэтаму ўрэшце сталася так, што я застаўся працаваць у бібліятэцы. Думаў я: некалі яго беларусы пашкадавалі, а пазьней ён мне дапамог у жыцьці.

Кудайберген уладзіў сваё жыццё нядрэнна. Атрымаўшы амерыканскае грамадзянства, ён узяў сабе імя і прозьвішча Азамат Алтай, як ён мне тлумачыў – «чалавек гор». Пазьней, у 1970-х гадох ён паехаў у Мюнхен працаваць на Радыё Свабода, дзе стаўся кіраўніком Кіргіскай рэдакцыі. Памёр Кудайберген у 2006 годзе. Вечная яму памяць!

Працу ў Навуковым аддзеле я пачаў з таго, што азнаёміўся з геалягічнай літаратурай, асабліва з тым, што яшчэ не было закаталягавана – ваенны пэрыяд, зрабіў справаздачу. Гэтаксама пачаў знаёміцца з інфармацыйнай працай – меў дачыненьне да чытацкай публікі.

У іншыя дні, пераважна па суботах, працаваў зь беларускай калекцыяй у Славянскім аддзеле. Адразу спасьцярог, што беларускую калекцыю трэба будзе шмат дапаўняць, было ўсяго пару інбелкультаўскіх выданьняў, амаль нічога не было зь літаратуры Заходняй Беларусі. Напісаў справаздачу і падкрэсьліў, што з БССР трэба наладзіць кнігаабмен. Трэба сказаць, што ў той час я быў вельмі заняты, бо зьвярнуліся да мяне яшчэ і з Калюмбійскага ўнівэрсытэту і папрасілі дапамагчы ўпарадкаваць славянскія матэрыялы – фактычна, вылучыць украінскія і беларускія (іх было няшмат) лісты з Рускага загранічнага архіву, за якім наглядаў Л. Ф. Мегероўскі.

Вядомая справа, я добра пазнаёміўся зь Ляванскім. Аднойчы, калі я абедаў зь Ляванскім і Бонам, апошні сказаў мне такое: калі я скончу бібліятэчны факультэт, у Навуковым аддзеле мне могуць даць пасаду бібліятэкара трэцяга разраду, што давала зарплату каля 9 000 даляраў у год. Ад такой навіны аж закруціла ў галаве, бо на пасадзе, на якую я спадзяваўся ў геалягічнай службе, плацілі 8 200 даляраў. Праўда, Бон растлумачыў, што да гэтае зарплаты я дайду асобнымі крокамі за паўтара года. Да зарплаты заўсёды «дакідаецца» даплата за доктарскую ступень – 1000 даляраў. Такая была бюракратычная лесьвіца і заработная шкала. Умовы мяне задавальнялі. З Бонам я дамовіўся, што калі на працягу году не знайду працы ў геалёгіі і скончу бібліятэчны факультэт, то застануся на прапанаваных умовах у Навуковым аддзеле.

На душы стала прасьвятляцца: зьявілася праца, была гарантыя, я працаваў і зь беларусікай, быў на шляху да новага дыплёму і мог прадаўжаць шукаць працу ў геалёгіі. Жыць стала весялей!

Застаюся ў бібліятэцы

Такая пара няяснага чаканьня цягнулася паўтара-два гады. За гэты час я меў дзьве прапановы працы ў геалёгіі: коледж у Паўдзённай Дакоце і яшчэ адзін коледж бліжэй, але ў абедзьвюх установах была малая нагрузка, дык гэта мне не падыходзіла. Пад канец 1961 году

я сказаў Бону, што сур'ёзна думаю пра бібліятэчную кар'еру, бо блізілася заканчэньне бібліятэчнага факультэту.

Калі я скончыў факультэт, падышоў час атрыманьня грамадзянства, якое я ўзяў у 1962 годзе. Праўда, у працэсе прыняцьця грамадзянства былі «зачэпкі», але я пасьпяхова адказваў на ўсе запатрабаваньні. Асноўнае, да чаго чапляліся іміграцыйныя воргаы – гэта справа з тым, чаму я спрабаваў уладкавацца геолягам на дзяржаўныя пасады і «хаваў сваё былое грамадзянства». Было цяжка вытлумачыць ворганам, што тэрмін «апатрыд» у графе грамадзянства не азначаў, што я сваё грамадзянства хаваў. У розных маіх ранейшых анкетах нідзе не было пытаньня пра «ранейшае грамадзянства», таму я і пісаў (бо не дапытваліся!), што я апатрыд – асоба без грамадзянства.

Стаўшы грамадзянінам ЗША, я напісаў у геалягічную службу запыт, ці можна маю справу шуканьня працы аднавіць. Мне адказалі, што трэба яшчэ чакаць. Мяне гэта раззлавала, і я цьвёрда вырашыў застацца ў новай прафэсіі. Аб гэтым я паведаміў Бону, ён быў вельмі задаволены і сказаў, што мне даюць трэці разрад. Фактычна адміністратары бібліятэкі пабойваліся, што можа паўстаць канфлікт з прафсаюзамі, але прафсаюзы тады былі яшчэ вельмі слабыя. Пазьней такі нумар ужо б не прайшоў, бо да трэцяга разраду трэба было б яшчэ гадоў шэсьць працаваць.

Але й падстава, што мне далі трэці разрад, была салідная: у мяне быў абаронены дактарат, я ведаў некалькі моваў, меў друкаваныя працы, зрабіў пару справаздачаў аб стане навуковае калекцыі ў бібліятэцы – дастатковыя вымогі для трэцяга разраду.

Такім ходам справаў была задаволеная і Зора – мы вырашылі заставацца ў Нью Ёрку пры бібліятэцы, падшукоўваць хату – дзеці расьлі. Купілі першую машыну – «Шэўрале» – за няпоўных 1700 даляраў, якія сплацілі гатоўкай.

Нью-Ёркская публічная бібліятэка ўчора і сёньня

І так, выпадкова і нечакана, бібліятэка стала маім месцам працы. Уважаю, што аб бібліятэцы неабходна сказаць пару слоў, бо гэта сапраўды неардынарная ўстанова.

Шырокае амэрыканскае грамадзтва звычайна атаесамляе Нью-Ёркскую публічную бібліятэку зь вялікім шэрым будынкам клясычнай архітэктуры на рагу 42-й вуліцы і 5-га авэню ў Нью Ёрку. Пагляд правідловы, але не зусім, бо няпоўны. На рагу 42-й вуліцы і 5-га авэню знаходзіцца толькі палова бібліятэкі – тое, што называецца Research Department (Дасьледнае аддзяленьне). Другая палова – Circulation

Department (Абанэмэнтнае аддзяленьне), панад 80 філіялаў – разьмешчаныя ў розных месцах Мангэтэну, Бронксу і Стэйтэн-Айлэнду (Куінс і Бруклін належаць да іншых бібліятэчных сыстэмаў.)

Дасьледнае аддзяленьне – прыватная бібліятэка, якая фундуецца прыватнай карпарацыяй Astor, Lenox and Tilden Foundations, а Абанэмэнтнае аддзяленьне – гарадзкая бібліятэка, якая фундуецца з грамадзкага бюджэту гораду. Аддзелы існуюць цалкам асобна і незалежна адзін ад аднаго, але пад адной дырэкцыяй.

Дасьледнае аддзяленьне складаецца з аддзелаў – навуковага, славянскага, усяго панад 25 – і налічае ў сваіх фондах каля 18 мільёнаў пазыцыяў. Абанэмэнтнае аддзяленьне абслугоўвае панад 3 мільёны чытачоў.

Вось жа, поўны назоў бібліятэкі, выбіты ў мармуры над галоўным уваходам на 5-м авэню, гэткі: The New York Public Library, Astor, Lenox, Tilden Trust.

Зацікаўлены чытач мо крыху схамянецца ці ўхмыльнецца, пачуўшы такое, але напэўна і запытаецца: як да такой раздвоенасьці дайшло? Адказ на пытаньне будзе такі: не дайшло, а менавіта з такога дуалізму ўсё й пачыналася.

А было гэта так. У сярэдзіне XIX стагодзьдзя ў Нью Ёрку дзеіла разьвітая сыстэма гарадзкіх публічных бібліятэк. Паралельна ў горадзе функцыянавалі бібліятэкі прыватныя, прыкладам – магната-індустрыяліста Ленакса, дзе зьбіраліся Бібліі і рэлігійныя матэрыялы ў розных мовах; бібліятэка фінансіста Тылдэна зь вялікай колькасьцю літаратурных кніжак і манускрыптаў; асабліва папулярнай была бібліятэка багача-прамыслоўца Астора, створаная ім для «працоўнага», «занятага» чалавека, з тысячамі кніг найбольш прэстыжнага і навуковага профілю. Больш таго, Астор выдаткоўваў вялікія грошы на абслугу бібліятэкаў ды амаль рэгулярна высылаў прадстаўнікоў свае бібліятэкі на эўрапейскія кніжныя кірмашы ды навуковых бібліятэкароў у розныя ўнівэрсытэты, каб наладзіць куплю і абмен навуковае літаратуры.

Напрыканцы XIX стагодзьдзя фінансавыя аддзелы гэтых трох бібліятэк стварылі фундацыю для будучага бібліятэчнага росквіту – Astor, Lenox and Tilden Foundations. Гарадзкія ўлады Нью Ёрку, бачачы надзвычайнае разьвіцьцё і рост кніжных фондаў і папулярнасьць ды карысьць для грамадзтва бібліятэкаў карпарацыі Астора-Ленакса-Тылдэна, запрапанавалі ім злучыцца з гарадзкой бібліятэчнай сыстэмай, стацца часткай Нью-Ёркскай публічнай бібліятэкі.

Карпарацыя Астора-Ленакса-Тылдэна згадзілася на такі крок пад умовай: горад мае збудаваць для трох бібліятэкаў, злучаных у адну, асобны будынак у цэнтры гораду, кнігі бібліятэкаў Астора, Ленакса і Тылдэна перавозяцца ў гэты новы будынак, і фінансаваньне гэтае часткі бібліятэкі застаецца ў руках іхных карпарацыйных дырэкта-

раў. А фінансаваньне гарадзкой сыстэмы застаецца адказнасьцю гарадзкіх уладаў. Была там таксама і яшчэ адна невялічкая «кляўзула»: будынак утрымоўваецца горадам.

Горад пагадзіўся на ўмовы карпарацыі. Будоўля будынку пачалася напрыканцы XIX стагодзьдзя і была закончаная ў 1911 годзе. Ад таго часу бібліятэка ўяўляе сабою адну ўстанову з двума адміністрацыйна незалежнымі аддзяленьнямі, на чале якіх стаіць адзін дырэктар, Рада дарадцаў (Trustees), адзіны аддзел кадраў. Вымогі працы ў аддзяленьнях дапасаваныя да вымогаў гарадзкога працоўнага кодэксу, аднак практычная розьніца застаецца, крыху розьняцца і заробкі (так, прыкладам, у Дасьледным аддзяленьні вымагаюцца для працы два дыплёмы, веданьне замежных моваў, іншыя характарыстыкі).

Для зацікаўленага чытача дадам таксама: калі ў 1911 годзе быў адчынены будынак на рагу 42-й вуліцы і 5-га авэню, аб'ём кнігасховішча быў разьлічаны прыблізна на 75 гадоў наперад. Аднак кнігасховішча запоўнілася яшчэ ў 1940-х гадох, і ад таго часу бібліятэка дакупляе новыя будынкі, дзе ствараюцца дадатковыя сховішчы. апошнім такім дадатковым кнігасховішчам сталася прастора пад зямлёй – падземнае кнігасховішча пад сумежным зь бібліятэкай Браянт-паркам. Пасьля доўгіх гадоў адміністрацыйна-судовай валакіты, у 1980-х гадох бібліятэцы было дазволена збудаваць пад паркам (а гэта прыватная зямля, падараваная гораду) кнігасховішча – яно злучанае пад зямлёй з галоўным будынкам. Аднак сёньня і гэтая прастора амаль цалкам запоўненая, і бібліятэка купіла некалькі будынкаў пад кнігасховішчы ў штаце Нью Джэрзі, а таксама заплянавала новыя падземныя паверхі пад Браянт-паркам.

Праца ў Навуковым аддзеле

А цяпер крыху аб Навуковым аддзеле. Навуковы аддзел – адзін з большых у бібліятэцы. У аддзеле працавалі каля 10 бібліятэкароў, паўтузіна асыстэнтаў, і паводле бюджэту прадбачалася 250-400 штодзённых гадзінаў для пажоў. У кнігасховішчы аддзелу было каля 800-850 тысячаў кніжак і каля 2 мільёнаў тамоў пераплеценае пэрыёдыкі. Штодня аддзел абслугоўваў 200-300 наведнікаў, зь якіх палова зварачалася з пытаньнямі да дзяжурных бібліятэкароў за «даведачным сталом», дзе цэлы дзень дзяжурылі 2-3 бібліятэкары. Аддзел быў адчынены ад 9-й раніцы да 10-й вечара ў чацьвяргі і панядзелкі, ад 9-й раніцы да 6-й вечара ў іншыя будныя дні і ад 1-й дня да 6-й вечара ў нядзелі.

Аддзел быў адказны за разбудову кніжных калекцыяў дакладных і тэхнічных навук, інжынэрных дысцыплін, гісторыі навукі і тэхнікі. Бягучая пэрыёдыка налічала каля 40 тысячаў часапісаў і сэрыйных выданьняў, а штодня мы рэгістравалі каля 1000 назоваў пэрыёдыкаў.

Зьбіраў аддзел выбарачна навуковыя калекцыі ў іншых мовах, улучна з славянскімі.

Ад 1912 году аддзел выдаваў месячны бюлетэнь «New Technical Books», і бібліятэкары былі адказныя за яго выданьне. (Я быў рэдактарам бюлетэню ў 1982–1984 гадох.) Кожны біліятэкар мусіў зрабіць тыднёва 3-4 рэцэнзіі-анатацыі на новыя кнігі, якія выдавецтвы дасылалі нам бясплатна. Падпіска за бюлетэнь, ведамы ў бібліятэчным сьвеце ў скароце NTB, азначала прыбыткі ў бібліятэчнай скарбонцы – каля сотні тысячаў даляраў, улучна з цаной дасланых кнігаў. Нядрэнная рэкляма і «падзаробак» для бібліятэкі. Бібліятэкары Навуковага аддзелу мусілі мець два дыплёмы: навукова-тэхнічны і бібліятэчны. Кожны дадатковы дыплём аплачваўся дадатковай тысячай даляраў у гадавым заробку.

Мая праца ў Навуковым аддзеле пачалася з упарадкаваньня каля 100 000 тамоў геалягічных кнігазбораў (паводле колькасьці тэмаў – найбольшыя ў аддзеле) і з таго, што на прафэсійным жаргоне называецца «бібліяграфічны кантроль» усяе навуковае літаратуры СССР і Польшчы на прадмет замаўленьня новае літаратуры, а таксама з упарадкаваньня «прагалаў» у літаратуры савецкага блёку. Адначасна я мусіў прайсьці трэнінг даведачна-інфармацыйнай працы, каб умець карыстацца (ведаць, што пакрываецца) каля 80-цю рэфэратыўнымі часапісамі, такімі, як Chemical Abstracts, Engineering Index, а таксама 700-1000 стандартнымі інжынэрна-навуковымі даведнікамі. Відавочна, напачатку вучыцца было чаму, але найбольш мяне «ўсхвалявала» адказнасьць за літаратуру з Савецкага Саюзу, бо попыт на яе быў і адгаворак не магло быць ніякіх.

Мушу прызнацца, што першых пару гадоў я працаваў, як вол. Не парываў я кантактаў і з геалёгіяй. Працуючы практычна з геалягічнай літаратурай усяго сьвету, я пачаў рэкамэндаваць для агляду літаратуру ў Chemical Abstracts, Engineering Index, зрабіў пару перакладаў у International Geology Review ды пачаў стала супрацоўнічаць з часапісам Economic Geology, Chicago. Таксама я пачаў неўзабаве сябраваць з прафэсарамі нью-ёркскіх коледжаў і ўнівэрсытэтаў, ведаў зацікаўленьні геалягічных факультэтаў, што дапамагала ў працы. Праз гады два-тры я цьвёрда стаў на ногі, што давала магчымасьць бываць і на бібліятэкарскіх канфэрэнцыях – к таму часу я быў сябрам Амэрыканскага геалягічнага таварыства, Таварыства геолягаў Бэльгіі, Таварыства спэцыялістаў бібліятэкароў, Асацыяцыі дасьледнікаў славяназнаўства , а галоўнае – мог аддаваць больш увагі дзейнасьці Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва. Як выглядала, мы больш-менш усталяваліся з працай. Мой дадатковы дыплём бібліятэкара даў Зоры думку таксама скончыць бібліятэчны факультэт, і мы ўзяліся за пошукі больш сталага жытла.

Дом у Радэрфордзе

Пакуль што мы жылі на кватэры, але Зора даўно насілася з думкай купіць хату, да чаго я ставіўся халаднавата. Працэс набыцця хаты ня быў доўгі: Зора гэтым займалася і знайшла прыдатны аб'ект у мястэчку Радэрфорд (Rutherford) – гэта ўнівэрсытэцкі гарадок з добрай школьнай сыстэмай, з выдатнай камунікацыяй у Нью Ёрк – ехаць 25-30 хвілін. Дом быў дзьвюхкватэрны: на першым паверсе пасяліліся мае бацькі, што нам было вельмі на руку, а на другім і трэцім – мы.

Дом быў вялікі – разам 16 пакояў, тры гаражы, вялікі падвал (абшалёваны дрэвам) і надбудоўка над гаражамі. На наступныя 39 гадоў гэты дом для нас станецца выдатным сямейным месцам, добрым складам для беларускіх друкаваных матэрыялаў, «гатэлем» для дзесяткоў беларускіх гасьцей, афіцыйным адрасам БІНіМу і іншых беларускіх арганізацыяў. Юрка Станкевіч запачаткаваў і добрых гадоў дзесяць трымаў у тым доме друкарню «Пагоня», якая выпусьціла каля дзесятка школьных падручнікаў.

Некаторыя нашы сябры пражывалі ў доме тыдні, месяцы. За гэтыя гады ў доме вельмі часта бывалі Міхась Белямук, Кастусь Калоша, Сяргей Карніловіч, Васіль Мельяновіч. Начавалі Язэп Арцюх, Вітаўт Рамук зь сям'ёй, Язэп Сажыч, Раіса Жук-Грышкевіч, Івонка Сурвіла, Ева Пашкевіч, айцец Аляксандар Надсан, Аляксандар Лашук, Зоя Смаршчок, Юры Сянькоўскі, Міхась Зуй, Аўген Трусаў, Мікола Шуст, Уладзімер Бортнік, уладыка Мікалай, Віктар Сянкевіч, Джым Дынглі, Гай Пікарда, Лявон Тарасэвіч, Сакрат Яновіч з жонкай, Аляксандар Баршчэўскі, Ян Максімюк, Юрка Каліна, Мікола Прускі, Адам Мальдзіс, Вольга Іпатава, Радзім Гарэцкі, Сяргей Шупа, Алег Латышонак, Лёля і Янка Міхалюкі, Ласло Пастор, праф. Джоэн Брэдфард, Новік, Кастусь Хадыка, Галіна Квасіновіч, Хведар Нюнька, Зянон Пазьняк, Сяргей Навумчык, Ігар Лабацэвіч, Юры Гарбінскі, Алег Гардзіенка, Анатоль Міхайлаў, Аляксандар Калбаска, Віржыні Шыманец, Аляксандра Гужон, моладзь ЗБМА – дзесяткамі, калі зьбіраліся ехаць на лыжы. Ясна, затрымоўваліся з розных нагодаў, найчасьцей – на зацягнутых «паседжаньнях», і заставаліся пераначаваць Янка Запруднік, Антон Шукелойць, Катэрына Балерыні і іншыя сябры.

Тое, што дом быў вялікі, дазволіла нам сабраць і раскласьці па паліцах эмігранцкія друкі, упарадкаваць іх і пасьля перадаць калекцыю ў Нью-Ёркскую публічную бібліятэку. Дарэчы, у нас была нядрэнная бібліятэка беларусікі, каля 5 тысячаў тамоў, якія мы амаль цалкам падаравалі Прынстанскаму ўнівэрсытэту.

Заступнік загадчыка

Але вернемся да працы ў Нью-Ёркскай публічнай бібліятэцы. Я пазнаваў калекцыі, уваходзіў у адміністрацыйныя структуры, шмат езьдзіў па вялікіх індустрыяльных кампаніях, як, прыкладам, Merck, Hoffman-La Roche, наладжваў супрацоўніцтва ў галіне інфармацыі паміж бібліятэкай і прамысловымі кампаніямі. Зьяўляліся думкі аб павелічэньні базы інфарматыкі аддзелу. Адным словам – я ўліўся ў бібліятэчнае жыцьцё і адчуваў, што буду салідным дадаткам да вялікага Навуковага аддзелу. Аж раптам загадчык аддзелу Джордж Бон заявіў, што ад 1 студзеня 1965 году пакідае пасаду ў Нью Ёрку і становіцца дырэктарам бібліятэкаў Гавайскага ўнівэрсытэту. Гэта крыху паблытала мае пляны: з старым загадчыкам было ведама, што робім, а заняць ягоную пасаду я быў яшчэ не гатовы, не было адміністрацыйна-бюджэтнага дасьведчаньня. Што рабіць? Аднак адміністрацыя бібліятэкі пайшла мне насустрач: была створаная новая штатная адзінка – заступнік загадчыка, і гэтую пасаду запрапанавалі мне. Я павесялеў і канчаткова вырашыў застацца ў бібліятэцы.

Пасаду заступніка загадчыка Навуковага аддзелу я прыняў з пачуцьцём асабістага задавальненьня, але было і адчуваньне боязі перад новай адказнасьцю. Паколькі пасада была новая, яе трэба было «напоўніць», і, за прыкладам іншых падобных установаў, адміністрацыя ўсклала гэтае заданьне на мяне. У прынцыпе праца заступніка загадчыка аддзелу ахоплівае: арганізацыя працы даведачнага стала, г. зн. інфармацыйная абслуга 250-400 асобаў штодзённа (на практыцы – кожны бібліятэкар адбываў штодня 3-4 гадзіны на даведачным стале); рэшта працоўнага дня разьмяркоўвалася на бібліяграфічны кантроль, што азначае працу з каталёгамі навуковых выдавецтваў, замаўленьне кніг з гэтых каталёгаў.

Новыя абавязкі

Кожны бібліятэкар штодня атрымоўваў па разьмеркаваньні заступніка загадчыка 5-10 каталёгаў, пераглядаў 20-50 навуковых часапісаў (паводле спэцыяльнасьці бібліятэкара), знаёміўся з новымі кнігамі, якія штодня паступалі ў аддзел (100-150 назваў), адказваў на лісты чытачоў, пісаў анатацыі для бюлетэня «NTB». Пры складаньні дзённага раскладу трэба было прымаць пад увагу ўдзел бібліятэкароў у розных бібліятэчных камітэтах і даваць ім на гэта час. Бясспрэчна, праца была напружаная. Але асноўны стрэс быў зьвязаны з складаньнем раскладу даведачнага стала – гэты сэгмэнт працы быў самы адказны. Справа ў тым, што ў амэрыканскім грамадзтве пануе добра замацаваны пагляд: Нью-Ёркская публічная бібліятэка – гэта як бы апошняя інстанцыя ў пошуках патрэбнай літаратуры. У гэтай

бібліятэцы павінна быць усё. Гэткі пагляд і выклікае напружаньне, бо чытач спадзяецца атрымаць патрэбную інфармацыю, а гэта часам бывае ня так проста. Відавочна, што інфармацыю можна было мець, калі былі адпаведныя рэсурсы. Таму на падрыхтоўку бібліятэкароў, якія разбудоўвалі калекцыі і вялі інфармацыйную дзейнасьць, зварачалася асаблівая ўвага. Праводзіліся спэцыяльныя сэмінары, бібліятэкары знаёміліся з рэсурсамі іншых бібліятэк і пад.

Апрача працы зь бібліятэкарамі заступнік загадчыка аддзелу быў адказны за стол пэрыёдыкі і кнігасховішча – працу зь бягучымі пэрыядычнымі выданьнямі і ўпарадкаваньне пераплеценага матэрыялу. З гэтымі абавязкамі я сустрэўся зь першага дня на новай пасадзе і вазіўся з вырашэньнем праблемаў у ходзе далейшае працы. Важнай і цікавай, а для мяне «пасільнай» была праца з іншамоўнымі часапісамі і кнігамі. Аддзел ад самага свайго заснаваньня ў 1911 годзе быў адказны за навуковую літаратуру ў заходнеэўрапейскіх мовах, а таксама ў мовах славянскіх і ўсходніх. Гэты аспэкт працы я значна ўдасканаліў – стараўся браць на працу бібліятэкароў, якія ведалі мовы. За навуковай літаратурай і сотнямі ўстановаў, якія яе выдавалі, я рэгулярна сачыў – асабіста пераглядаў каталёгі, бюлетэні, а таксама значна пашырыў тэматычны асартымэнт навуковае літаратуры з СССР. Праца заступніка загадчыка ўлучала таксама пэрыядычнае наведваньне прамысловых кампаніяў, знаёмства зь іх бібліятэкамі, асабліва калекцыямі патэнтаў (Нью-Ёркская публічная бібліятэка мела калекцыю амэрыканскіх патэнтаў ад № 1 і зборы патэнтаў 40 краінаў. Патэнты былі на адказнасьці Навуковага аддзелу.) Трэба сказаць, што індустрыя істотна падтрымоўвала Навуковы аддзел.

Ну і вядомая справа, заступнік загадчыка аддзелу быў асноўнай асобай, якая прымала рашэньні ў справе найманьня на працу бібліятэкароў і тэхнічных супрацоўнікаў, бо заступнік загадчыка быў адказны за далейшую працу кожнага новага працаўніка.

Такім парадкам, застаўшыся працаваць у бібліятэцы, зьмяніўшы прафэсію, я сутыкнуўся і з новымі абавязкамі, якія трэба было апанаваць: адміністратара, бюракрата, кіраўніка. Але асноўнае, што ўвесь час прыемна сьвідравала мазгі – гэткая зьмена прафэсіі пакідала мяне ў сфэры майго «геннага» зацікаўленьня – беларусікі.

Відавочна, працай у бібліятэцы я быў задаволены: часткова прыстасаваў мае веды геалягічнай літаратуры. Можа й будзе самахвальствам, але прызнаюся: геалягічныя кнігазборы і асноўныя часапісы (вялікіх і малых таварыстваў) я ўпарадкаваў, зьліквідаваў прабелы, шмат чаго, асабліва старых выданьняў – наклеіў на марлю або «ўмацаваў» іншымі хімічнымі спосабамі. У штодзённай працы, у кантактах з амэрыканскім акадэмічным сьветам я прычыніўся шмат у чым да супольнага набыцьця сотняў сэрыйных выданьняў, вельмі шмат дапамог амэрыканцам у карыстаньні, разуменьні навуковай

літаратуры з эўрапейскіх краінаў і былога савецкага блёку. Калі я заўважаў, што некаторыя кнігазборы або дакумэнты недастаткова вядомыя, я друкаваў «сыгналізацыйныя» агляды – напрыклад пра літаратуру па аэранаўтыцы.

Бясспрэчна, 70-80 працэнтаў майго працоўнага часу было зьвязана з «акадэмічнасьцю», з навуковай літаратурай і інфармацыяй. Але мой штодзённы перапынак, доўгія гадзіны вечарамі, суботы і нядзелі – мой бібліятэчны час па-за Навуковым аддзелам – аддаваліся беларусіцы: шуканьню матэрыялаў пра беларусаў Амэрыкі, рэдкім выданьням. Таксама я прыпушчаю, што працэнтаў 20 штодзённае працы ў аддзеле было аддадзена працы з чытачамі, іх праблемам. Былі і цікавыя моманты, нешта асаблівае, што засталося ў памяці. Паасобныя здарэньні я зафіксаваў.

Чытачы: звычайныя і ня вельмі

Пару словаў аб чытачах. Чытачоў-карыстальнікаў у Навуковым аддзеле штодзённа ў сярэднім бывала асобаў 200 – падкрэсьлю: у сярэднім. Падчас канікулаў, калі прафэсура і студэнты вольныя ад заняткаў, бывалі пэрыяды, калі статыстыка даходзіла і да 1000 – трэба было «арганізоўваць» чаргу, бо чытацкіх месцаў у аддзеле было толькі 120. Статыстыка наведваньня вялася проста: чытач расьпісваўся ў «кнізе карыстаньня», якая ляжала на даведачным стале.

Чытацкая аўдыторыя была інтэрнацыянальная: каля 80% амэрыканцы, а каля 20% – чытачы з замежжа. На даведачным стале працавалі бібліятэкары зь веданьнем моваў. Зацікаўленасьці чытачоў мелі вельмі шырокі дыяпазон: ад пытаньня, ці ёсьць у нас такая і такая публікацыя і як яе знайсьці, аж да складаных тэмаў накшталт «апошніх тэрмічных назіраньняў падводных плыняў у рэгіёне пэўнага акіянскага грабэну» (з націскам на апошнім слове!). У пераважнай бальшыні мы чытацкія патрэбы задавальнялі – часам у выніку міні-дыскусіяў з удзелам усіх бібліятэкароў аддзелу – гэта быў наш абавязак.

Мне асабіста працаваць з чытачамі было прыемна – я заўсёды чуўся гатовы паглыбіцца ў вырашэньне нейкага цяжкога пытаньня.

Праўда, бывалі з чытачамі і праблемы.

Устаноўка ў дачыненьні да колькасьці патрэбнай чытачу літаратуры была такая: калі чытач у нечым спэцыялізуецца і замаўляе кнігі на адну тэму, то бібліятэкар мае права падысьці да гэтага чытача і далікатна спытацца: паколькі Вы замаўляеце шмат кніжак, у Вас на стале ўжо цэлая гурба, дык можа, каб не перашкаджаць іншым, Вам патрэбны свой маленькі «пакойчык»? Бібліятэка мела каля 20 спэцыяльных клетачак-пакояў для навукоўцаў, якія патрабавалі шмат літаратуры. І звычайна справа вырашалася: так або не.

Аднойчы быў такі выпадак. Чытач замаўляе ўсё, што толькі можна,

на тэму «электроніка ў побыце» – перад ім на стале ўжо каля сотні кніжак. Паж, кемлівы хлопец, ведаючы правілы аддзелу, сыгналізуе мне, што адзін з чытачоў, як выглядае, ня спыніцца на сотні, а будзе патрабаваць болей: «Абслугоўваць яго далей, ці, можа, Вы пагаворыце?»

Я падыходжу да чытача і ціхенька пытаюся: «Спадар, мы больш ня можам Вам прыносіць кнігі на гэтую тэму, бо іншыя чытачы могуць хацець гэтыя кнігі, а яны ляжаць тут у Вас». Чытач таксама вельмі спакойна мне адказвае: «Мне гэтыя кнігі патрэбныя, я працую з электронікай, пішу кнігу «Handbook of Shoplifting» («Даведнік як красьці ў крамах»). Разумееце? Даведнік!» Чытач гаворыць гэта цалкам сур'ёзна, а я не разумею! Я перапытваю. Ён паўтарае, а на маё пытаньне, ці гэта законна, адказвае на поўным сур'ёзе – законна! І адразу пералічае мне параграфы законаў, паводле якіх гэта легальна, і дадае: «Вы мяне законнасьці не вучыце!» Мяне гэта трохі «ўзварушыла», і я чытачу адрэзаў: «А Вы мне параграфы не цытуйце. Дапамога крадзяжу – акт антызаконны. Гэтую размову з Вамі працягне наша бібліятэчная служба бясьпекі!»

Канец гэтай гісторыі быў такі, што чытачу дазволілі скончыць ягонае «дасьледаваньне», але ў аддзеле бясьпекі і з умовай, што калі кніга будзе надрукаваная, там будзе зазначана, што бібліятэка яму ў гэтым не дапамагала. Але тая кніга так ніколі й ня выйшла – не знайшлося выдаўца, бо хоць кампіляцыю такога роду чытач мог рабіць «для сябе», аднак ужываць гэтую інфармацыю на практыцы ня меў права.

Аднак, побач з такімі дзівосамі, былі выпадкі, калі мы давалі парады – якіх кніжак яшчэ няма, хоць у іх ёсьць патрэба, і часта на такія нашыя парады ствараліся добрыя кнігі.

Бывала, што парады бібліятэкароў дапамагалі канчатковым разьвязкам канфліктаў. Прыкладам (і я сам у гэтай справе ўдзельнічаў) канфлікту паміж кампаніямі GM і Ford у спрэчцы – хто першы выкарыстаў электрастатычную афарбоўку для мэталу. Часта да мяне з пытаньнямі зварачаўся знаны навуковец і журналіст газэты The New York Times Ўолтэр Салівэн – напрыклад, ён пытаўся, ці я ведаю, хто з аўтараў працуе над тэмай «Мы не адзіныя ў сусьвеце». Менавіта ў нашым аддзеле «распрацоўваліся» ксэраграфічныя тэхналёгіі.

Супрацьзачаткавыя таблеткі як пацьверджаньне ўзросту

Іншы памятны выпадак з чытачамі, якому я быў сьведкам. Кнігу ў Нью-Ёркскай публічнай бібліятэцы мог атрымаць амаль кожны, хто зайшоў у бібліятэку – кніга давалася ў карыстаньне толькі ў бібліятэцы, пазычаць кнігі было нельга. Праўда, каб атрымаць рэдкую

кнігу, былі пэўныя абмежаваньні, але і яны залагоджваліся на працягу гадзіны-другой. Але існавала ўзроставая «дыскрымінацыя», пад якую траплялі маладыя людзі да 18 гадоў, у асноўным вучні сярэдніх школаў. Бібліятэка ўважала, што школы павінны задавальняць чытацкія патрэбы вучняў, і таму школьнікам кнігі выдаваліся рэдка. Бібліятэкары, што дзяжурылі на даведачных сталах, правяралі ў маладых людзей дакумэнты – вучні адсылаліся ў свае школы з тлумачальнымі нататкамі.

Аднойчы ў навуковы аддзел зайшла групка маладых дзяўчатак, і яны замовілі нейкія кнігі. Дзяжурнай пры даведачным стале была вельмі падрыхтаваная, старэйшая бібліятэкарка Сара Канінгхэм (я быў у той момант каля стала па іншай справе). Бібліятэкарка загаварыла зь дзяўчынкай гэтак: «Міс, Вы надта молада выглядаеце, ні не магла б я ведаць, колькі Вам гадоў? Вы маеце дакумэнт?» Дзяўчынка ж, не міргнуўшы вокам, досыць задзірыста кажа: «Мой дакумэнт – супрацьзачаткавыя таблеткі. Гэтага хопіць? Гэта Вас задавальняе?» А Сара Канінгхэм у адказ: «Таблеткі можна мець і прымаць у 14 гадоў. Пакажыце мне дакумэнт, што Вам 18!» Дакумэнтаў дзяўчынка ня мела, кніжкі не атрымала. Стала крычаць, што гэта дыскрымінацыя, але ўсе яны выйшлі.

Мы, бібліятэкары, пераглянуліся. Такое здараецца нячаста: супрацьзачаткавымі таблеткамі пацьвердзіць узрост!

Падарункі чытачоў

З упэўненасьцю магу сьцьвярджаць, што дачыненьні бібліятэкароў з чытачамі былі добрыя, магчыма, нават вельмі добрыя. Часта мы дыскутавалі з чытачамі новыя кнігі, чытачы інфармавалі бібліятэкароў пра новае ў праграмах коледжаў, пра дасьледныя працы ў розных фірмах. Гэта не былі гутаркі дзеля гутаркі – пра надвор'е ці нешта такое, яны былі цікавыя для абодвух бакоў. Відавочна, глыбейшыя дыскусіі, абмен думкамі адбываліся не ў чытальнай залі. Не было рэдкасьцю, што чытачы прапаноўвалі бібліятэцы падарункі – дарылі альбо свае кнігі, альбо рэдкія выданьні, а часам і цэлыя калекцыі кніг на вузкія тэхнічныя тэмы. З падарункамі заўсёды трэба было быць вельмі асьцярожнымі. Па-першае, любая «датацыя» бібліятэкі, мала важна ў якой форме (грошы альбо кнігі), мусіла афармляцца афіцыйна праз спэцыяльны аддзел. Калі зьяўляліся прапановы аб падарунках, мы ў Навуковым аддзеле – альбо загадчык, альбо я – стараліся спачатку азнаёміцца з падарункам неафіцыйна, і толькі пасьля такога азнаямленьня перадавалі справу ў адпаведны аддзел.

Вось пару такіх здарэньняў.

Першае – Transfer Collection. У Навуковы аддзел даўгавата хадзіў чытач – чытач сур'ёзны, працаваў з інжынэрнай літаратурай па

транспарце. І вось аднойчы ён мне заяўляе: «Хачу вам зрабіць падарунак – перадаць вам калекцыю перасядачных квіткоў». Я, прызнацца, толкам не зразумеў, што ж такое ён хоча нам падараваць, але, ведаючы чытача як чалавека сур'ёзнага, разам з загадчыкам Робэртам Крупам мы паехалі паглядзець, што ж там быў за падарунак. Тое, што мы пабачылі, было сапраўды нешта ўнікальнае. Гэта была калекцыя перасядачных – зь лініі на лінію – квіткоў гарадзкога транспарту: трамваяў, аўтобусаў, мэтро. Той чытач, інжынэр паводле адукацыі, зьбіраў іх усё жыцьцё: каля 110 тысячаў квіткоў з розных гарадоў сьвету. Ён сам распрацаваў сыстэму клясыфікацыі і анатацыяў і ўклаў квіткі ў сотні спэцыяльных скрыначак. Сапраўды ўнікальная зьява, асабліва таму, што ён зьбіраў квіткі для гісторыі транспарту.

Спачатку мы вагаліся, ці браць гэтую калекцыю. Абмеркавалі справу з «аддзелам падарункаў», і калекцыю ўзялі. Для гісторыі транспарту – гэта адзіная падобнага тыпу калекцыя. Вагаліся мы таксама – ці зьбіраць квіткі далей, каб прадаўжаць калекцыю. І гэтае пытаньне было вырашана станоўча: мы напісалі ў розныя транспартныя ведамствы, каб нам дасылалі перасядачныя квіткі. Калекцыя захоўваецца ў Навуковым аддзеле Нью-Ёркскай публічнай бібліятэкі пад назвай Walter Weichsel Transfer Collection.

Яшчэ адзін выпадак, які таксама трымаецца ў памяці – «кнігі Мое Berg». У сярэдзіне 1970-х гадоў мне пазванілі з «аддзелу падарункаў» і сказалі, што паступіла прапанова дару Навуковаму аддзелу бібліятэкі кніжнай калекцыі Морыса Бэрга (у скароце: Мое Berg). Гэтая інфармацыя адразу захапіла маю ўвагу. Я выдатна ведаў, хто такі быў Морыс Бэрг і якой легендарнай славай ён карыстаўся ў сярэдняга амэрыканца. Морыс Бэрг, яўрэйскага паходжаньня, быў знаны прафэсійны бэйсбаліст, гуляў у Major Leagues, скончыў Прынстанскі ўнівэрсытэт і юрыдычны факультэт Калюмбійскага ўнівэрсытэту. У часе Другой сусьветнай вайны ён стаўся амэрыканскім шпіёнам выведнага ведамства Office of Strategic Services у галіне ядзернай тэхналёгіі. На доўгі час «зьнікаў» у Заходняй Эўропе, Югаславіі ды няведама дзе яшчэ, а потым зьяўляўся. Грамадзтва ідэалізавала Мо Бэрга як шпіёна-інтэлектуала-спартоўца. Памёр ён у 1972 годзе, пакінуў па сабе шмат кніг. Не азнаёміцца з кнігамі Мо Бэрга я ня мог – гэта быў бы вялікі мінус для майго прафэсійнага самаадчуваньня. Я паехаў у горад Ньюарк, штат Нью Джэрзі, у паўночнай частцы якога быў ягоны выдатны і, мабыць, дарагі асабняк. На жаль, мая рэкамэндацыя, якая склалася пасьля дзённага азнаямленьня з калекцыяй, была: узяць толькі кнігі з аўтографамі вялікіх спартоўцаў, а ў Навуковы аддзел – толькі пару кніг з гісторыі навукі. Мая рэкамэндацыя была канчатковай: сам Мо Бэрг быў значна большы і важнейшы, чым ягоная кніжная калекцыя.

Навуковы аддзел і беларусіка

Спадзявацца на цікавыя моманты зь беларусікі ў Навуковым аддзеле, ясная справа, цяжкавата, але сёе-тое прыпамінаецца.

Прыкладам, калі Навуковы аддзел ладзіў выстаўкі рэдкіх кніг і выстаўляліся ўсе пераклады і лацінскі арыгінал працы Казіміра Семяновіча, зазначалася, што Казімір Семяновіч – беларус.

Але быў адзін выпадак і з сучаснай беларускай кнігай, што запамятаўся. Недзе ў канцы 1970-х гадоў звоніць мне ў кабінэт дзяжурны бібліятэкар даведачнага стала і кажа: «Доктар Кіпель, вось перада мной чытач, і ён кажа, што ведае напэўна – недзе выйшла англамоўная кніга пра АН БССР, і ён дамагаецца яе паглядзець!» Мяне гэтая навіна і патрабаваньне чытача зьдзівілі – я пайшоў да даведачнага стала. Перада мной быў зусім прыстойны, «нармальны» чытач, які выкладаў у адным з коледжаў прадмет «Навука і навуковыя ўстановы СССР». Ён сказаў, што «наколькі ён ведае», Нью-Ёркская публічная бібліятэка – гэта «бібліятэка апошняй інстанцыі», а ён якраз у Нью Ёрку і таму спадзяецца кнігу пабачыць.

Унутрана мне стала не па сабе – няўжо прапусьціў, недагледзеў? Я стаў вельмі інтэнсіўна варушыць мазгамі. Праз пару сэкундаў у галаве пачалі круціцца нейкія вестачкі: ці не займаецца вывучэньнем навуковага жыцьця ў СССР нейкі аддзел амэрыканскага ўраду? Думка праскочыла і разьвілася: так, урад займаецца і перакладамі і выданьнем савецкіх матэрыялаў у рамках праграмы JPRS – і гэта ў нас захоўваецца ў Аддзеле эканомікі. Іду я з чытачом у Аддзел эканомікі і праз 10 хвілін знаходжу інфармацыю пра кнігу В. Купрэвіча «Акадэмія навук БССР» (1958), якая была перакладзеная ў ангельскую мову. Бібліятэка мае гэтую кнігу, і праз хвіліну кніга была ў руках чытача – а мы захавалі сваю рэпутацыю!

Іншым «хадавым» матэрыялам з БССР былі матэматычны ды інжынерна-тэхнічны часапісы. У нас былі ня толькі арыгінальныя камплекты гэтых выданьняў, але мы падпісваліся і на пераклады, што было супраць правілаў – бо перакладаў мы ў прынцыпе ня бралі. Важныя былі таксама працы з БССР у галіне спэктральнага аналізу. Відавочна, найбольш аўтарытэтная была БССРаўская біялягічная і мэдычная літаратура, але гэтыя навуковыя галіны «зьбіраліся» Нацыянальнай бібліятэкай мэдычных навукаў у Вашынгтоне і бібліятэкай Нью-Ёркскай акадэміі мэдычных навук.

Праца з кадрамі

Калі гаварыць пра неардынарныя здарэньні за гады працы, дык іх было болей у сфэры дачыненьняў паміж супрацоўнікамі. Але пры гэтым важна мець уяўленьне пра структуру бібліятэчных кадраў.

У будынку на рагу 42-й вуліцы і 5-га авэню, дзе я адпрацаваў панад чвэрць стагодзьдзя, працуе каля 300-400 чалавек: на поўнай стаўцы, пагадзінна, служба бясьпекі і інш. 80% супрацоўнікаў маюць беспасярэдняе дачыненьне да кніжак і чытачоў, 20% – адміністрацыя, бухгальтэрыя, кафэтэрыя і г. д. Бібліятэчныя супрацоўнікі ў вузкім сэнсе падзяляюцца на тры асноўныя катэгорыі: бібліятэкары, тэхнічны пэрсанал і пажы.

Бібліятэкары – аснова ўсёй установы, гэта людзі з вышэйшай адукацыяй і бібліятэчным дыплёмам; тэхнічны пэрсанал – зь незакончанай, а часам і закончанай вышэйшай адукацыяй, але безь бібліятэчнае асьветы; пажы – пераважна студэнты або вучні старэйшых клясаў сярэдніх школаў. Кожная катэгорыя на працы мае акрэсьленыя абавязкі і патрабаваньні. Для ўсіх катэгорыяў пажадана ведаць пару моваў, бо нават паж, ведаючы код кнігі, мусіў бы прачытаць загаловак кнігі, падаючы яе чытачу.

Забесьпячэньне кадрамі ўваходзіць у абавязкі заступніка загадчыка – заступнік рыхтуе спэцыяліста на даведачны стол, на бібліяграфічны кантроль, падбор літаратуры, разбудову калекцыяў. На пошук кадраў, найманьне на працу траціласа вельмі шмат часу.

Я заўсёды вельмі ўважліва ставіўся да інтэрвію з новымі бібліятэкарамі і тэхнічным пэрсаналам. З гэтае адміністрацыйнае практыкі ў мяне ў памяці засталося пару эпізодаў.

Белае і чорнае

У аддзеле працуе каля дзесятка бібліятэкароў, кожны зь іх мае папярэднюю іншую асьвету – бо ў бібліятэцы такога профілю і ўзроўню, як наша, кожны бібліятэкар павінен мець два дыплёмы: бібліятэчны і спэцыяльны. Спэцыяльны дыплём у бібліятэкара ў Навуковым аддзеле мусіць быць навуковы – фізыка, хімія. (Біялягічнай літаратуры бібліятэка не зьбірала – гэтым займалася Акадэмія мэдычных навук на 63-й вуліцы.) Бібліятэкараў-спэцыялістаў мы вельмі цанілі, бо калі бібліятэкара-хіміка знайсьці адносна лёгка, то, напрыклад, матэматыка цяжэй, вельмі цяжка.

У канцы 1970-х гадоў надышла першая большая хваля кампутарызацыі, зьявіліся розныя мовы праграмаваньня, і я бачыў, што аддзелу патрэбны спэцыяліст, бо нашы матэматыкі або фізыкі не былі дастаткова падрыхтаваныя ў кампутарнай навуцы. Я даў абвестку ў тыднёвы бібліятэчны бюлетэнь, які пашыраецца толькі ў бібліятэках, што ў Навуковым аддзеле ёсьць вакансія з такімі і такімі патрабаваньнямі. Гэта стандартны працэс: найперш абвестка даецца ў мясцовы бібліятэчны бюлетэнь, калі не знойдзецца нікога ў бібліятэчных колах – пішацца заява ў аддзел кадраў, і пошукамі ўжо займаюцца яны: калі ў іх картатэцы няма патрэбнага спэцыяліста,

даюць абвесткі ў газэты, звычайна ў New York Times, і праз тыдзень-два пачынаюць прыходзіць кандыдаты «звонку». Спачатку яны зварачаюцца ў аддзел кадраў, там іх адсейваюць, некаторых прысылаюць на інтэрвію. І калі ты некага зь іх выбераш, ты ня маеш права нічога сказаць абранаму кандыдату, а мусіш паведаміць пра свой выбар у аддзел кадраў.

Я шукаў бібліятэкара-спэцыяліста, які б ведаў мовы праграмаваньня. Пасьля абвесткі ў газэце прыйшло пяць-шэсьць кандыдатаў, і аддзел кадраў складае графік, калі яны маюць прыйсьці да мяне на інтэрвію. Першая прыйшла бібліятэкар-хімік, жанчына грэцкага паходжаньня, і папярэдзіла, што ня можа працаваць вечарамі – а гэта было адно з маіх патрабаваньняў: адзін вечар на тыдзень працаваць да 10-й гадзіны вечара. Іншы прыйшоў малады чалавек – спэцыяліст па батарэйках з Канэтыкуту, але яму няма як даяжджаць у суботу. Ну й так кандыдаты адсейваюцца. Наступная прыходзіць адна вельмі прыгожая маладая жанчына з Калюмбійскага ўнівэрсытэту, добра арыентуецца ў тэме, але больш як мэнэджэр, чым знаўца моваў. Яна працавала ва ўнівэрсытэце ў інжынэрным аддзеле, а там некаторыя мовы ўдасканальваюць для сваіх патрэбаў. Іначай усё ў яе падыходзіла – жыве ў горадзе, муж працуе. Я так сабе ў думках зазначаю – «прыдатны кандыдат».

Праз пару дзён на інтэрвію прыходзіць чорны – Дэрэк Роска, мужчына гадоў 45, зь бібліятэчнай адукацыяй і ведае пару моваў праграмаваньня. Я пачаў зь ім гаварыць – ён шустры, ведае бібліятэчную працу, служыў у арміі, быў у Афрыцы, а апошняе месца працы было ў кампаніі ў Каліфорніі, дзе праграмуюць на патрэбных мовах. Я бачу, што ён у тэме разьбіраецца, і пытаюся – чаму ж ён кінуў працу? А я, кажа, пасварыўся з начальнікам. Так проста і сказаў – пасварыўся.

Ён выйшаў, а я сабе думаю – гэты кандыдат мае ўсе кваліфікацыі, што мне патрэбныя. У мяне ваганьня не было – ён ведае тое, што мы шукаем. «Пасварыўся з начальнікам» – мне гэтая шчырасьць спадабалася, а далей хай аддзел кадраў звоніць таму начальніку, пытаецца як там было, будуць разьбірацца безь мяне, але мне ён патрэбны. Я бяру тэлефон, званю ў аддзел кадраў і кажу ім, што вось гэты апошні – Роска – мне падыходзіць. А Рэнэ, сакратарка, падлятае і мяне цалуе: «Я ніколі б не падумала, а мне ўжо 36 гадоў, што белы чалавек возьме негра, калі перад ім была такая прыгожая жанчына...» Я кажу: «Рэнэ, you're crazy! Мы так ня думаем!» – «А мы, – кажа, – чорныя, думаем іначай». Я кажу, павесіўшы трубку: «Рэнэ, ты разумееш, што тут канфлікт глыбока філязафічны. Вот ты сядзь і зразумей – мне патрэбны бібліятэкар. І ты думаеш, што я вазьму прыгожую жанчыну дзеля таго, што яна прыгожая?» Я так зь ёй пагаварыў, а яна пачала плакаць – Рэнэ не магла ўсьведаміць,

што белыя думаюць іншымі катэгорыямі, апрача колеру скуры. Думаю, што і да сёньня чорныя амэрыканцы не ва ўсім давяраюць амэрыканскім белым. Гэта праблема, нават трагедыя, але яна існуе.

Расавыя дачыненьні на працоўным месцы ў ЗША – «гарачая бульбіна». Калі кіраўнік стаіць перад выбарам «чорнае-белае», ён павінен быць вельмі аб'ектыўным і ўважлівым. За гады працы, калі мне патрэбна было наймаць на працу, толькі адзін раз у мяне ўзьнік канфлікт. Чарнаскуры спэцыяліст, не атрымаўшы пасады (а атрымаў яе белы, бо меў значна вышэйшыя кваліфікацыі), падаў на мяне ў арбітражны суд Амэрыканскай асацыяцыі мэнэджмэнту. Справу я выйграў ужо ў першым слуханьні (звычайна прадбачаюцца тры слуханьні).

Брус Слуцкі

Яшчэ адзін выпадак з адміністрацыйнай практыкі. У аддзеле працавала пару бібліятэкароў-хімікаў, але быў патрэбны яшчэ адзін спэцыяліст – хімік-арганік з касмэтычным ухілам. Пасьля ўсіх абвестак у газэтах ды адсейваньня ў аддзеле кадраў шлюць да мяне на інтэрвію чалавека, Бруса Слуцкага, які працаваў у касмэтычнай кампаніі «Revlon». Заходзіць да мяне ў кабінэт чалавек гадоў 40-45 досыць «аляпаватага» выгляду. Я пачынаю інтэрвію: дзе вучыўся, што скончыў, дзе працаваў і так далей. Уся ягоная папярэдняя падрыхтоўка адпавядае нашым патрабаваньням. Але пад канец інтэрвію я вырашыў усё ж спытацца ў яго, ці ён ведае, адкуль у яго такое прозьвішча – Слуцкі? Брус, не задумваючыся, адказаў, што добра ведае і... паехаў мне тлумачыць, што ёсьць такая краіна Беларусь, там ёсьць горад Слуцак, у ім некалі была разьвітая тэкстыльная прамысловасьць, а ягоны дзед, адзін з суўласьнікаў мануфактуры, некалі эміграваў у ЗША. Брус Слуцкі прачытаў мне лекцыю пра Слуцак! Бывае ж такое...

Гляджу я на Бруса зь зьдзіўленьнем і захапленьнем ды кажу: «Bruce, you got the job!» Я расказаў яму, што і я зь Беларусі – мы землякі. На гэтым інтэрвію скончылася, Брус пайшоў у аддзел кадраў ды ляпнуў там, што доктар Кіпель сказаў яму: праца – твая! Празь пяць хвілін мне званок з аддзелу кадраў, і гутарка ішла літаральна так: «Слухай, Кіпель, ты хочаш тры месяцы пагуляць без зарплаты? Ты ж ведаеш, што канчатковае слова наконт працы – за намі. Ты што, забыўся? Ну, але паколькі ты працуеш даўно – прабачым табе гэты ляпсус. Брусу Слуцкаму скажам, што працу ў Навуковым аддзеле ён атрымаў».

У мяне адлягло ад сэрца. З Слуцкім я працаваў пару гадоў. Ён быў добра падрыхтаваным бібліятэкарам. Пазьней ён падаў заяву на пасаду загадчыка Навуковае бібліятэкі ў Сэйнт-Джон-коледжы

ў Кўінсе – я даў добрую рэкамэндацыю, і працу Брус атрымаў. Можа яшчэ й цяпер там працуе, бо быў добра маладзейшы за мяне.

Ніколі б я не падумаў, што Брус Слуцкі будзе пісаць успаміны! Ажно ў нейкіх яўрэйскіх зборах Алесіна сяброўка Аня знайшла Брусавы ўспаміны, дзе ён у добрым, пахвальным тоне прыпамінае і мяне ў часе працы ў Навуковым аддзеле.

Пажы

У навуковым аддзеле было каля 400 штодзённых бюджэтных гадзін працы для пажоў, гэта значыць, штодня іх працавала некалькі дзесяткоў. Цякучасьць кадраў сярод пажоў была вялізная. З пажамі інтэрвію рабіў ня я – я іх адсылаў да таго або іншага бібліятэкара альбо да асыстэнта старэйшага векам – спадара Эмануіла Рапапорта, фактычна, супэрвайзэра ўсіх пажоў. Раз тэлефануе мне з аддзелу кадраў спадарыня Роджэрс і кажа: «Да цябе ідзе малады чалавек Глік, але ты будзь зь ім асьцярожны, бо я бачу, у яго кніжка з сабой і ведаеш якая кніжка? Карл Маркс!» Яна ўжо яго незалюбіла і дае мне інструкцыі. Праўда, прыйшоў хлопец з даўгімі валасамі, пара наколак... Я паслаў яго да аднаго з падначаленых, і яго прынялі на працу, ён гадоў шэсьць працаваў. Аднойчы Глік падняў скандал: бягуць да мяне ў кабінэт – у яго прапаў пярсьцёнак! Скралі залаты пярсьцёнак. Званіць ахове маюць права толькі я і кіраўнік аддзелу. Глікава начальніца кажа: доктар Кіпель, крадзеж, калі ласка паведаміце ахове. Я кажу: пакліч мне сюды Гліка, я хачу ў яго нешта спытацца. А сам думаю – каму трэба той пярсьцёнак, зь нейкай паметкай, сэнтымэнтальная рэч... Глік прыходзіць, я кажу, што зараз буду званіць ахове, але паспрабуй зрабіць, як мяне вучыла маці: прайдзі ў думках кожны крок ад моманту калі ты прыйшоў на працу – дзе ты быў і што рабіў. Ён думаў-думаў, і раптам пабег. Праз хвіліну прыбягае – успомніў, што мыў рукі і каля ўмывальніка пакінуў той пярсьцёнак! Справа скончылася.

Іншы выпадак, зьвязаны з пажамі, прыпамінаецца асабліва: гадоў 5-6 працаваў у аддзеле паж Пётр Айзэнштат. Добры хлапец, разумны, начытаны, часта гутарыў са мной – распытваўся пра Эўропу, Беларусь. Быў ён габрэйскіх каранёў з Польшчы (прадзед прыехаў з Лодзі). Працуючы пажом, ён закончыў навуку, зрабіў дактарат у адным з гарадзкіх унівэрсытэтаў і «пайшоў у жыцьцё». Разьвітаўся са мной, падзякаваў, што праз усе гэтыя гады давалі яму працу... З такімі за чвэрць стагодзьдзя ў бібліятэцы я працаваў з пару тысячамі. Пайшоў і пайшоў.

Але Пётр Айзэнштат раптам вынырнуў. Аднойчы звоніць мне, што ён займае пасаду аднаго з рэдактараў энцыкляпэдыі пра горад Нью Ёрк (такая была першая) і што ў сьпісе нацыянальнасьцяў, якія там

трэба будзе апісаць, ён ня ўбачыў беларусаў! «А беларусы ж у Нью Ёрку ёсьць – я з Вамі працаваў каля 6 гадоў!» – казаў мне Айзэнштат. Ну я сказаў: так, разумею, прапусьцілі. А ён мне адразу заяўляе: «Калі ласка, напішыце артыкул пра беларусаў для заплянаванай энцыкляпэдыі. Што я і зрабіў – артыкул выйшаў у першым выданьні (1995), а для выданьня 2010 году такі артыкул напісаў ужо Лявон Юрэвіч. Такі вось вынік і блізкіх сувязяў з супрацоўнікамі, і веданьня каранёў.

Сяброўства з калегамі

Відавочна, у працэсе працы зь людзьмі паступова ствараліся і прыязныя таварыскія дачыненьні з калектывам: з аднымі бліжэйшыя, з другімі далейшыя, больш афіцыйныя.

У мяне ў аддзеле было некалькі блізкіх сяброў. Катэрына Балерыні – італьянскага паходжаньня, бібліятэкарка, сябравала са мной і Зорай больш за 40 гадоў. Лу Мінц – бібліятэкар яўрэйскіх каранёў з Аўстрыі (Мінцы ў ЗША жывуць ужо гадоў 250-300). Тоні Мэдына з Пуэрта-Рыка, матэматык, потым пайшоў у прафэсуру. Доўн Полмэн – бібліятэкарка ангельскага паходжаньня, яе род у ЗША ўжо гадоў 200, і характэрна, што ўся іх сям'я зьвязаная з морам – капітаны, боцманы, рыбакі, а сама яна ў часе Другой сусьветнай вайны добраахвотна служыла ў марскім флёце.

Мы сябравалі, часам хадзілі адны да адных у госьці. Аб адным такім гасьцяваньні мушу расказаць. Калі я толькі прыйшоў у Навуковы аддзел, давялося працаваць у першую ці другую нядзелю ад 1-й да 6-й гадзіны. Дзяжурны бібліятэкар быў Лу Мінц. Гадзіне а 2-й званок Мінцу: прыяжджай у шпіталь, жонка мае нарадзіць. Справа паважная. Мінц едзе ў шпіталь, пакідаючы дзяжурным па аддзеле мяне – а я працаваў у аддзеле ўсяго толькі тыдзень! Але так было. Я з працай справіўся, і мы сталі зь Мінцам блізкімі сябрамі, хоць ён пайшоў па бібліятэчнай лесьвіцы ў іншы аддзел – стаў загадчыкам усіх кнігасховішчаў, адказная, важная пасада. Аднойчы Мінц запрашае нас з Зорай на бар-міцву сына, які нарадзіўся ў тую нядзелю, калі Мінц пакінуў мяне дзяжурным. Мы, ясна, запросіны прымаем – едзем на першую ў нашым жыцьці яўрэйскую ўрачыстасьць. Зора вельмі задаволеная і кажа мне: сёньня я еду на прыняцьцё з спакойнай душой – ня будзе гарэлкі. Ваў! як кажуць амэрыканцы. Як Зора перажывала, калі ўбачыла на сталах «мора разьліванае»: сябры зь бібліятэкі выпівалі ня горш за сяброў «пад царквой». Але мы прыемна правялі час.

Бывалі мы ў гасьцёх і ў Доўн Полмэн, і ў Тоні Мэдыны, і ў іншых бібліятэчных калегаў.

Памятная, хоць і сумная дэталь – Лу Мінц памёр за дзень перад Зорай, 13 красавіка 2003 году.

Джэй Разіель

З дачыненьняў зь сябрамі-калегамі памятаецца і такі выпадак. Напрыканцы 1970-х гадоў я быў моцна ўцягнуты ў беларускую фэстывальную дзейнасьць – арганізацыю і правядзеньне беларускіх фэстываляў у штаце Нью Джэрзі. Фэстывалі патрабавалі вельмі шмат часу, залагоджваньне ўсіх гэтых справаў адбывалася пераважна ў вячэрнія гадзіны (паседжаньні бывалі і да 2-й гадзіны ўначы!), на працы браліся вольныя дні з рахунку гадавых адпачынкаў. Некаторыя справы залагоджваліся тэлефанічна.

Аднойчы адзін з маіх новых калегаў-бібліятэкароў – я яго нядаўна перад тым узяў на працу – Джэй Разіель, яўрэй народжаны ў Ізраілі, дзяды зь Беларусі, з-пад Беластоку, мне кажа: «Чую, што ў тэлефонных размовах Вы, доктар Кіпель, часта ўжываеце слова «песьня» – я трохі разумею па-беларуску». Я расказаў Джэю Разіелю, што займаюся арганізацыяй беларускіх фэстываляў – гэта маё «хобі». І Джэй адразу ж мне кажа, што хацеў бы ўдзельнічаць у фэстывалі. Рэч у тым, што ён жыве ў горадзе Пэрл Рывэр (на мяжы штатаў Нью Ёрк і Нью Джэрзі), і там ёсьць яшчэ пару яўрэяў зь Беларусі – у іх там музычны квартэт, і яны часта граюць беларускія мэлёдыі. Гэта іх «хобі», а практыкуюцца яны ў мясцовай публічнай бібліятэцы.

Такая адбылася гутарка, аб чым я паведаміў спадарыню Ірэну Рагалевіч, адказную за індывідуальныя музычныя нумары праграмы, і так на беларускім фэстывалі выступіў яўрэйскі квартэт зь беларускімі нумарамі.

Джэй Разіель стаў маім блізкім прыяцелем, але ў пачатку 1980-х гадоў здарыўся няшчасны выпадак: ён касіў траву і адрэзаў частку пальца на руцэ, страціў шмат крыві. Трэба было зрабіць пераліваньне, і з новай крывёю ён атрымаў заразу – СНІД – і хутка памёр.

Выканаўца абавязкаў загадчыка. Працы стала болей

Калі ў пабытовым пляне станавілася крыху лягчэй – дзеці заканчвалі коледжы, «станавіліся на ногі», узрастала нагрузка на працы. Прыходзіла больш кніжак, трэба было больш езьдзіць на канфэрэнцыі – адбывалася цэнтралізацыя бібліятэчных сыстэмаў, трэба было быць у курсе навінак. Я адчуваў, што «гамую» мой асноўны праект «Беларусы ў ЗША». У 1982 годзе сталася нешта такое, што ніхто ня мог прадбачыць: мой начальнік Боб Круп трапіў пад цягнік, і яму адрэзала ногі. Аднак бюракратычная валакіта з заканчэньнем яго кар'еры цягнулася даўгавата.

Я быў прызначаны выканаўцам абавязкаў загадчыка аддзелу. Ясна, што фінансава гэта было мне вельмі спрыяльна, але ў аддзеле не хапала чалавека, адна пасада заставалася незапоўненай. А тут – «і трэба ж было такому здарыцца» – адміністрацыя, бібліятэчныя «тузы» вырашылі, што ў сярэдзіне 1982 году Навуковы аддзел павінен перайсьці на кампутарнае абслугоўваньне чытачоў. Навіна цудоўная. Кампанія IBM стаяла за гэтым і дапамагала. Але, але... Перш чым зрабіць кампутары даступнымі для публікі, трэба навучыць кампутарнай справе бібліятэкароў.

І пачалі мы адукоўвацца. Працавалі overtime, суботы, знаёміліся з кампутарамі. Я ў кампутарызацыю амаль ня ўлазіў, але каардынаваў працу аддзелу, выконваў і старыя абавязкі, і новыя. Мушу сьцьвердзіць: працы было «па вушы». У другой палове 1982 году ў Навуковым аддзеле былі ўсталяваныя пару кампутараў, і мы маглі шукаць новыя кнігі, а таксама рабіць кароткі пошук літаратуры, дадзеных на кампутары. Зьява была для бібліятэкі новая, жадаючых карыстацца кампутарамі было поўна, зьявілася літаральна чарга. Пры кожным кампутары быў заняты бібліятэкар.

Відавочна, я добра арыентаваўся ў сытуацыі – бо быў начальнікам, але ў галаве ўмацоўвалася думка, што я ўжо маю дастатковы стаж, каб выйсьці на пэнсію. Калі заставацца на працы, трэба поўнасьцю аддацца новай тэхналёгіі, новым працоўным вымогам. І я быў перакананы – так думала і Зора – што прыйшоў час выйсьці на пэнсію і поўнасьцю аддацца кнізе «Беларусы ў ЗША» і наагул пачаць актыўней працаваць у беларусістыцы. Напрыканцы 1984 году я вырашыў, што выйду на пэнсію ў 1985 годзе – што я і зрабіў.

Ведаю, што за 25 гадоў працы ў Навуковым аддзеле я замовіў больш за сотню тысячаў новых публікацыяў, упарадкаваў геалягічныя калекцыі (найбольш – каля 120 тысячаў тамоў), прычыніўся да разбудовы тэматыкі навуковых калекцыяў ды пасьпяхова абслугоўваў многія тысячы чытачоў.

Рэкляма рэсурсаў

Ясная справа, Нью-Ёркская Публічная Бібліятэка наўрад ці мае патрэбу ў рэклямаваньні сваіх кніжных рэсурсаў. Іх зьмест і шырыня ведамыя як спэцыялісту, так і любому амэрыканцу. І тым ня менш бібліятэка ў цэлым і паасобныя аддзелы рэгулярна наладжваюць выстаўкі – юбілейныя, тэматычныя, асабовыя – каб зрабіць большую рэкляму ў прэсе. Выстаўкі – гэта справа пахвальная, але і працаёмкая, а значыць дарагая.

У Навуковым аддзеле ў функцыі заступніка кіраўніка аддзелу ўваходзіла каардынацыя выставак. За час працы ў аддзеле пры маім

удзеле прайшло добра панад сотню выставак – выстаўляліся кнігі, дакумэнты, прыходзілася даваць інтэрвію на тэлевізіі і радыё. Асабліва вялікімі былі выстаўкі «Пачаткі і заняпад Нью-Ёркскага мэтро», «Масты Нью Ёрку», выстаўкі прысьвечаныя Мендзялееву і Каперніку (я даваў інтэрвію і «Голасу Амэрыкі», і «Радыё Свабода»). Варта таксама згадаць выстаўку прысьвечаную аэранаўтыцы, дзе адным з экспанатаў была кніга Казіміра Семяновіча (дарэчы, усе пераклады Семяновіча ёсьць у Нью-Ёркскай бібліятэцы), дзе я зазначаў, што Семяновіч – беларус.

Адбываліся выстаўкі і ў Славянскім аддзеле, дзе працавала Зора, а я там быў дараднікам. Найбольшая выстаўка ў Славянскім аддзеле – прысьвечаная 450-годзьдзю беларускага друку – трывала блізу году, і асаблівым посьпехам карыстаўся рэклямны плякат з партрэтам Скарыны на 5-м авэню. Былі таксама выстаўкі, прысьвечаныя беларускай лацінцы, Купалу, Коласу, Літоўскаму статуту, выстаўляліся таксама паасобныя кнігі Ніны Ватацы, Ларысы Геніюш, Уладзімера Жылкі, маладнякоўцаў і інш.

Лісты ў Беларусь

Мушу адзначыць, што бібліятэчныя кантакты былі шырокія, яны дапамагалі пашыраць знаёмствы, дазвалялі выказаць зацікаўленьне беларусікай, беларускім друкам, у зьбіраньні якога Нью-Ёркская публічная бібліятэка была піянэрам.

Некалькі лістоў ад бібліятэкі было напісана Ніне Ватацы, бо мы хацелі скамплектаваць усе бібліяграфіі культурнага профілю – літаратура, гісторыя, археалёгія, каб гэта ўсё ў нас было (з гэтым Зора працавала). Але нам ніколі ніхто не адказаў. Праўда, ужо ў 1990-х гадох, калі мы зайшлі да яе пэрсанальна, Ніна Ватацы нам дала ўсе бібліяграфіі, што мы шукалі, і цяпер у Нью-Ёркскай публічнай бібліятэцы выдатная, як на заходні сьвет, калекцыя беларускай бібліяграфіі. Дапамагала нам і навязаць кантакт зь Нінай Ватацы, і сабраць ейную бібліяграфію Людміла Рабок, за што ёй вялікая падзяка.

Гэтаксама не было адказу – але мы на яго й не спадзяваліся – ад Ларысы Геніюш. Справа была такая: мы атрымалі кніжку «На чабары настоена», там не было ніякага подпісу, але я бачыў, што яна была адпраўлена з Горадні, і я вырашыў, што нам трэба Ларысе Геніюш падзякаваць. Звычайна гэта рабілася вельмі проста – нехта з тэхнічнага пэрсаналу бярэ спэцыяльны фармуляр, запаўняе і дасылае. А тут я пайшоў да загадчыка аддзелу, які разглядае ананімныя датацыі – спадара Сэма Ўільямса, у мяне зь ім былі прыязныя дачыненьні – і папрасіў яго напісаць Ларысе Геніюш ліст па-беларуску. Пасьля кароткай дыскусіі ён згадзіўся.

Фонд беларускай кнігі

Працуючы ў бібліятэцы, мы здавалі сабе справу, як шмат гэтая ўстанова прычынілася да пашырэньня і паглыбленьня інфармацыі пра Беларусь, дапамагаючы ў стварэньні новых кнігаў – у Нью-Ёркскай публічнай бібліятэцы пісаліся сотні кніг важных для беларускай культуры. Таму мы – Зора, я і ўся наша сям'я – вырашылі нечым дапамагчы, у «мініятурнай» форме аддзячыць бібліятэцы: стварыць невялічкі дапаможны фінансавы фонд, як кажуць, «на ўсякі пажарны».

Бібліятэка яшчэ ніколі не была ў фінансавым крызісе, каб абмежаваць набыццё кніжак. Былі фінансавыя «замінкі» ў кадравым аддзеле, на пэўны час абвяшчалася «замарожваньне» пэўных пасадаў – не запаўняліся вакантныя месцы, але на куплю кнігаў бюджэт не абразаўся ніколі. Аднак у будучыні можа быць усякае. Прыкладам, зьявіцца ў продажы Скарынава Біблія 1517 году і на яе будзе высокая цана. Калі бюджэт ня будзе дазваляць купіць Скарыну, то сума, якой недастае, можа быць узятая якраз з нашага Фонду беларускай кнігі! Фонд быў створаны на выпадак патрэбы. Першапачатковыя сумы фонду былі 10-20 тысячаў даляраў. Фундатарамі былі Вітаўт і Зора Кіпелі, далей фонд прадаўжаюць Алеся, Юрка і Лёрэйн Кіпелі. Цяперашняя сума (2013) – каля 60 тысячаў, а плянуецца давесьці яе да 100 тысячаў даляраў. Сума не такая вялікая, але паколькі фонд амаль не выкарыстоўваецца, а прыбытковыя працэнты растуць, фонд будзе расьці і расьці.

Эмігранцкі друк у Нью-Ёркскай публічнай бібліятэцы

Ці раз мне даводзілася падкрэсьліваць важнасьць кнігі для беларускай нацыянальнай культуры. Кніга, а пагатоў кнігазбор беларускага эмігранцкага друку дакумэнтуе і непамерна ўзмацняе нацыянальнае адраджэньне, якое стала і мэтадычна нішчыцца і грозіцца на Бацькаўшчыне. Эміграцыя гэта дакумэнтавала, дапамагала адраджэньню, а мы, наколькі гэта было магчыма, гэты друкаваны даробак эміграцыі сабралі. Сабраную калекцыю беларускага друку на эміграцыі мы перадалі ў калекцыі беларусікі Нью-Ёркскае публічнае бібліятэкі.

Ніжэй зьмяшчаю згадку Лявона Юрэвіча пра беларускі эмігранцкі друк у бібліятэцы.

«У 1999-м годе Зора і Вітаўт Кіпелі падаравалі Нью Ёркаўскай Публічнай Бібліятэцы калекцыю беларускага й беларусаведнага друку – 171 скрынку пэрыёдыкі й манаграфічных выданьняў: кніжак, адозваў, памфлетаў. Калекцыя «Беларускі й беларусаведны друк на Захадзе» ахоплівае каля

90 адсоткаў усяго, што друкавалася беларускімі арганізацыямі, прыватнымі асобамі, друкарнямі на эміграцыі, пачынаючы ад 19-га стагодзьдзя. Калекцыя ўнікальная, бо адзіная ў сьвеце такой паўнаты й цэльнасьці. Відавочна, дапаўненьні да калекцыі будуць: трэба мець на ўвазе, што на эміграцыі не было адзінага цэнтру. Але Нью Ёркаўская Публічная Бібліятэка становіцца адным з цэнтраў досьледаў беларускага эміграцыйнага друку – побач з Нацыянальнаю Бібліятэкаю ў Менску, Скарынаўскаю ў Лёндане ды Кангрэсоваю ў Вашынгтоне.

Пад тэрмінам «Беларускі і беларусаведны друк на Захадзе» разумелася друкаваная прадукцыя, якая стваралася беларусамі, беларускімі арганізацыямі, цэрквамі, установамі ў беларускай і небеларускіх мовах (ангельскай, нямецкай, французскай і інш.). У паняцьце «Беларускі і беларусаведны друк на Захадзе» ўлучыліся гэтаксама друкі-кнігі, улёткі, падручнікі, што ствараліся-друкаваліся небеларускімі ўстановамі, арганізацыямі, асобамі небеларускага паходжаньня, але якія маюць значэньне для беларускай культуры – прыкладам, лісты, дэкрэты і пасланьні Папы Рымскага ці Канстантынопальскага Патрыярха, дзяржаўныя друкі Кангрэсу ЗША ці Міжнароднае Лігі Правоў Чалавека, якія тычацца Беларусі».

Сталы кантакт зь бібліятэкай

Ад «хлебазаробкавай» працы ў бібліятэцы я адышоў даўнавата. Але бібліятэка і да сёньня для мяне застаецца месцам, дзе мы «трымаемся» – то нешта правяраем, то шукаем, то пішам, то сустракаемся зь сябрамі, то наведваем канфэрэнцыі. Праўда, зьмены ёсьць: на адзначэньні 100-гадовага юбілею бібліятэкі ў 2011 годзе было ўсяго некалькі асобаў з тых, што ў 1961 годзе адзначалі 50-гадовы юбілей. Кампутары замянілі каталёгі, зьявілася шмат іншага, новага. Калі гаварыць аб новым, то для мяне найважнейшае – супрацоўнікі-беларусісты, а менавіта Лявон Юрэвіч, які і працуе бібліятэкарам, і пільнуе беларусіку.

Я згадаў пра канфэрэнцыі. Лявон выступаў за беларускасьць на некалькіх сустрэчах зь бібліятэкарамі зь Беларусі, выдатна камунікаваў зь Сьвятланай Алексіевіч. За гады ў бібліятэцы ён добра падняўся па працоўнай лесьвіцы (15 гадоў таму ён закончыў Бібліятэчны факультэт), за гэты час закаталягізаваў тысячы беларускіх дакумэнтаў.

Што памятаецца найбольш

Пражыўшы ў ЗША амаль 60 гадоў, я ў нейкай меры ўжо настроіўся на амэрыканскі лад. Амэрыканец на гэтым месцы абавязкова запытаўся б: «А што Вам запамяталася найбольш зь бібліятэчнага жыцьцёвага эпізоду?»

Пытаньне не такое й простае: пасьля доўгай працы на «скрыжаваньні сьвету» – 42-й вуліцы і 5-га авэню ў Нью Ёрку – з магутнымі

рэсурсамі Публічнай Бібліятэкі, у кантакце з сотнямі тысяч людзей – шмат чаго бачылася і памятаецца. Але найбольш запамяталіся два эпізоды, зьвязаныя зь беларусікай. Вось яны.

Недзе напрыканцы 1960-х гадоў, у часе перапынку на абед, каля 1-й гадзіны, я працаваў у кнігасховішчы, правяраючы нейкую цытату ў друках NATO. Падыходзіць да мяне паж і кажа: «Доктар Кіпель, Вас шукае спадар Сэдоў (Арнольд Сэдоў, бібліятэкар)». Я адразу кідаю тое, што я рабіў, і іду ў бок кабінэтаў, каб сустрэцца з Арнольдам. Думаю: напэўна ён ня зможа сёньня (чацьвер) дзяжурыць вечарам – ён працаваў увечары па чацьвяргах, так мы дамаўляліся, калі я яго браў на працу. У мяне з Арнольдам былі выдатныя дачыненьні: ён, немалады ўжо чалавек, адслужыў 25 гадоў у арміі, удзельнічаў у Другой сусьветнай вайне, а цяпер пару дзён на тыдзень падрабляў у бібліятэцы. Ён меў бібліятэчную адукацыю і працаваў на паўстаўкі, улучна з тым вечаровым дзяжурствам. Паводле паходжаньня ён быў яўрэй, дзед быў зь Менску і зваўся Садоўскі. Так я іду да яго і думаю, што сёньня да 10-й вечара давядзецца працаваць мне. Але – бачу здалёк – Арнольд сьмяецца і крычыць мне: «Вітаўт, выйдзі хутчэй на 5-е авэню – паглядзі, што робіцца каля рэклямы выстаўкі «450-годзьдзе беларускага друку!» (Тады якраз была тая беларуская выстаўка.)

Я выйшаў хуценька з будынку на 5-е авэню, і тое, што я там убачыў, не забудзецца ніколі. Пры абочыне вуліцы стаяў жоўты школьны аўтобус, зь яго выходзілі вучні і невялічкімі групкамі, па 3-4 чалавекі, фатаграфаваліся на фоне бібліятэкі каля рэклямнага пляката ў вялікай меднай аправе – выява Францішка Скарыны і інфармацыя па-ангельску і па-беларуску. Я падышоў, запытаў і кіраўніка, чаму яны вырашылі сфатаграфавацца «разам з Скарынам» (я сказаў, што беларус, працую ў бібліятэцы). Кіраўнік мне адказаў, што яны з-пад гораду Скрэнтан, штат Пэнсыльванія – «прывязем у нашу школу памятку, якую рэдка можна пабачыць». Я яму падзякаваў і... згадзіўся.

Другое здарэньне. Увесну 1983 году нехта з супрацоўнікаў у аддзеле мне кажа: «Спадар Кіпель, у друку ёсьць паведамленьне, што сёньня – Дзень маркі БССР. Вы беларусікай цікавіцеся – дык купіце марку». Я адразу пайшоў у аддзяленьне пошты на 43-ю вуліцу, думаючы, што змагу купіць марку там. Але мне сказалі, што марку выдала ААН і трэба ісьці туды. Ну, трэба дык трэба. Падышоў я да будынку ААН, а там – велічэзная чарга! Пытаюся – чаму гэта, што даюць? Зьдзіўлена на мяне глянуўшы, апошні чарговец прамармытаў: «Сёньня – дзень маркі Беларускае ССР, тут усе стаяць, каб купіць марку». Я быў уражаны даўжынёю чаргі па «беларускі зьмест». Стаў я ў чаргу і таксама набыў некалькі марак, прысьвечаных БССР.

Пару думак і разважаньняў

Бібліятэчны эпізод майго амэрыканскага пэрыяду жыцьця – бадай ці не найгалаўнейшы на маім жыцьцёвым шляху. Бясспрэчна, праца ў тым часе была і «для хлеба», і для душы, хоць пэрыяд гэты быў вельмі напружаны. Па-першае, была штодзённая адказнасьць у абслугоўваньні некалькіх сотняў падрыхтаваных чытачоўспэцыялістаў. Я ўжо зазначаў, што абслугоўваньне чытача ў Нью-Ёркскай публічнай бібліятэцы было справай агульнаамэрыканскага маштабу: у амэрыканскім грамадзтве пануе думка, што бібліятэка на 5-м авэню мусіць для любога чытача-карыстальніка мець адказ «на ўсё». Кнігасховішчы «бібліятэкі паміж львамі» маюць нацыянальны статус, саступка ня робіцца нават Бібліятэцы Кангрэсу – сапраўды Нацыянальнай Бібліятэцы, бо ў сваёй большасьці амэрыканцы лічаць БК толькі бібліятэкай Кангрэсу ЗША.

Ясна, што такі падыход грамадзтва да справы ствараў стрэс у працы. Зь першага вынікала другое: пасьпяховасьць інфармацыі магла быць дасягнутая толькі праз падрыхтаванасьць бібліятэкара, што сядзеў за даведачным сталом: ён мусіў ведаць рэсурсы аддзелу, бібліятэкі, а гэта дасягалася падрыхтоўкай, трэнінгам, адукацыяй. І гэтая акалічнасьць «ціснула» штодзённа – месяцамі, гадамі. З стрэсам трэба было спраўляцца, што і рабілася.

У гэтым «бібліятэчным» пэрыядзе жыцьця расла і сталела наша сям'я. Вялікая ўвага надавалася выхаваньню дзяцей у школе і паза школай, найбольшы цяжар тут ляжаў на Зорыных плячах, хоць даводзілася пацець і мне, «памагатаму».

Гэтаксама ў бібліятэчныя гады аддавалася вельмі шмат часу дасьледаваньню беларусікі: зьбіраліся матэрыялы пра беларусаў ЗША, рыхтаваліся бібліяграфіі.

Але ўсё гэта – праца, стрэс, выхаваньне, іншыя сямейныя клопаты – рабіла жыцьцё поўным і цікавым, і мы поўнасьцю сваім жыцьцём цешыліся.

Бібліятэчныя сустрэчы і кантакты

Ніхто не запярэчыць, што бібліятэка – выдатнае месца для сустрэчаў, кантактаў, знаёмстваў. У мастацкай літаратуры і кінафільмах бібліятэка часта бывае зьвязаная з завязкай шпіёнскіх сюжэтаў. За чвэрць стагодзьдзя, якія я памысна адпрацаваў у будынку ў цэнтры Мангэтэну, я сустракаўся і кантактаваў з тысячамі чытачоў, карыстальнікаў, дасьледнікаў.

Для амэрыканцаў я быў функцыянэр, памагаты, прафэсійны бібліятэкар, заданьне якога – дапамагчы карыстальніку знайсьці інфармацыю: старое амэрыканскае выслоўе «бібліятэкар – чалавек, які злучае кнігу і чытача» дапасоўваецца і да цяперашняга часу, нават пасьля кампутарызацыі бібліятэчнай справы.

Для карыстальнікаў з рэгіёну былога СССР, а асабліва БССР я быў «нацыяналіст» (а мо і «калябарант», але ў вочы мне гэтага ніхто не казаў), зь якім цікава было пагутарыць, хоць першапачатковы кантакт амаль заўсёды пачынаўся з пытаньня бібліятэчнага – «ці ёсьць у Вас такая кніга?» (гэта для страхоўкі).

Найчасьцей знаёмства адбывалася за даведачным сталом, але бывала, што сустракаліся і «паміж ільвамі» на 5-м авэню. З землякамі-эмігрантамі, тымі, што распрацоўвалі беларускія тэмы, і з тымі, што сустракаліся каб пагутарыць, я звычайна дамаўляўся тэлефанічна. Землякі з БССР прыходзілі без папярэджаньня, у вольную для іх хвіліну. За гады працы ў бібліятэцы такіх сустрэчаў былі сотні, я прадыскутаваў усе беларускія справы, шмат каму дапамог парадай, літаратурай.

Запамятаць усіх, з кім я меў бліжэйшы кантакт, проста немагчыма, але шмат хто застаўся ў памяці, асабліва тыя, з кім даводзілася дыскутаваць беларусіку.

Адным зь першых, з кім мне давялося «пра сёе-тое перагаварыць», быў Іван Любачка, але ён паставіўся з засьцярогай да «крывічоў», калі я запрапанаваў яму прадыскутаваць ягоную працу пра Беларусь пад Сталіным на паседжаньні ў БІНіМе. Праўда, з Іванам Любачкам я быў знаёмы яшчэ зь Нямеччыны, але бліжэйшага супрацоўніцтва ў Нью Ёрку не навязалася, хоць некаторую статыстыку для свае працы ён знайшоў толькі ў Нью-Ёркскай публічнай бібліятэцы.

З амэрыканскай прафэсуры запамяталіся, бясспрэчна, тыя, з кім давялося супрацоўнічаць на ніве беларусікі. Прыкладам, Патрыцыя Грымстэд – я дапамагаў ёй у заканчэньні працы пра архівы БССР; пра-

фэсар Максін Сэлер – у ейнай кнізе аб амэрыканскіх нацыянальных тэатрах мы з Зорай апрацавалі разьдзел аб беларуска-амэрыканскім тэатры (потым выйшаў асобнай брашурай); прафэсар Сьцяпан Горак – ягоная пераважна бібліяграфічная праца пра нацыянальнасьці СССР была паўсюдным дапаможнікам у амэрыканскіх унівэрсытэтах, для гэтае кнігі разьдзел пра БССР я апрацаваў выключна на матэрыялах бібліятэкі. Над беларусікай працавалі таксама Юры Шавялёў, Саламон Шварц, Пол Вэксьлер, Барыс Унбэгаўн, Пётра Гой, Зоя Юр'ева, Сьцяпан Зымэр, Майкл Поп, Майкл Урбан – і гэта толькі тыя, з кім я супрацоўнічаў даўжэйшы час. Усіх не прыпомніць!

Землякі-беларусы ў бібліятэцы

Зь землякамі зь Беларусі ў мяне кантакты былі фактычна бесьперапынныя, але былі гэта амаль выключна афіцыйныя асобы з розных урадавых дэлегацыяў, сябры камісіяў ААН і падобнае. Турыстаў не было.

Як ведама, у складзе ўрадавых дэлегацыяў заўсёды былі прадстаўнікі літаратурна-культурных ведамстваў рэспублікі: пісьменьнікі, настаўнікі, журналісты. Найчасьцей прыходзілі пісьменьнікі, але заходзілі і іншыя «інтэлектуалы». Усіх цяжка прыпомніць, хоць некаторыя не забываюцца. Адным зь першых маіх знаёмых з БССР быў удзельнік дэлегацыі на асамблею ААН Міхаіл Мінковіч, у той час намесьнік, а праз пару гадоў міністар культуры БССР. Быў гэта беларускамоўны, палітычна падрыхтаваны чыноўнік, ветлівы, уважлівы да думкі субяседніка, абазнаны ў беларускіх справах і, як я пераканаўся, з шчырым і адказным нацыянальным пачуцьцём. Я сустрэўся зь Мінковічам раз ці два. Яго цікавіла беларуская культура ў замежжы, асабліва друк, а я выказваў яму мае пагляды на «дзяржаўнасьць» рэспублікі. Пры разьвітаньні Мінковіч папытаўся ў мяне, ці мы ў бібліятэцы адчуваем патрэбу ў дапамозе з атрыманьнем беларускіх кніжак. Я сказаў яму, што так – адчуваем патрэбу ў дапамозе, а асабліва важна для нас было б мець поўны камплект «Летапісу беларускага друку» (пазьней «Летапіс друку БССР»). Мінковіч папрасіў дадзеныя, якія я ўжо меў падрыхтаваныя, сказаў, што паспрабуе нашую просьбу залагодзіць і асьцярожна спытаў: «Вітаўт Яўхімавіч, ці варта падаць у друк, што мы з Вамі сустракаліся, гутарылі?» На што мой адказ быў: «Ня думаю, што варта, але калі Вы аб гэтым напішаце, то і эмігранцкі друк напіша таксама. Нам важней, каб Вы даслалі нам тое, што мы ў Вас папрасілі». Я правёў госьця да выхаду зь бібліятэкі на 42-ю вуліцу, мы разьвіталіся. Больш я з спадаром Мінковічам не сустракаўся, але празь некалькі тыдняў бібліятэка атрымала вялікую скрыню матэрыялаў, якія мы прасілі – улучна з гадавікамі «Летапісу друку БССР».

Такі быў мой першы кантакт з высокім чыноўнікам з БССР.

Якаў Качан

У 1964 годзе я меў нагоду пазнаёміцца і сустракацца зь Якавам Качаном. У той час Якаў Качан быў рэдактарам «Камуніста Беларусі» і ў Нью Ёрку быў у складзе дэлегацыі БССР на Генэральнай Асамблеі ААН. Качан прыйшоў у бібліятэку, разам зь ім яшчэ пару чалавек, сказалі, што хочуць са мной пагаварыць. Селі мы каля бібліятэкі ў парку, і Качан пачаў мне расказваць, што ён і яшчэ нехта выступаюць у абарону «Нашай Нівы». Я сказаў, што я чытаў тыя артыкулы ў абарону «Нашай Нівы». У тым самым часе тэма «Нашай Нівы» дыскутавалася і ў беларускім эміграцыйным друку. Я сказаў, што ў БІНіМе было прачытана пару дакладаў аб «Нашай Ніве», і запрасіў Качана на даклад у БІНіМ. Прапанову маю ён, ясна, адхіліў, але пра «Нашу Ніву» гаварыў зь вялікім энтузіязмам і ўпэўненасьцю, што газэту пачнуць дасьледаваць і ў БССР. Якаў Качан мне адкрыта сказаў – падкрэсьліўшы, што ён упэўнены – газэта «Наша Ніва» будзе перавыдадзена факсыміле і станецца даступная дасьледнікам. Я, помню, так жартам кажу: вы глядзіце, каб вы не згубілі сваёй працы з гэтым усім.

Прыехаў ён у Беларусь – і яго ня толькі зьнялі з пасады, але й «Камуніст Беларусі» перавялі на расейскую мову. Ён таксама выдаў кніжку, дзе пісаў, што хадзіў у бібліятэку, гаварыў з Кіпелем, а ў Кіпеля шрам на твары, гэта шмат аб чым гаворыць – яўны намёк на ваеннае мінулае! Я, прызнацца, ягонае пісаніны ў адмоўнанасьцярожаным да мяне тоне сур'ёзна ня браў. Я ўпэўнены, што ён ніяк не хацеў мяне «падкалоць» ці зьняважыць. Са мной ён быў вельмі шчыры, а пра шрам на твары яму, напэўна, сказалі ўставіць. (Адкуль той шрам: калі я ўвосень 1945 году прыехаў у Рэгенсбург, у мяне на твары напухла скула, фурункул, яго выразалі, прычым рабілася гэта без наркозу. Я пайшоў да немцаў, яны кажуць, што нічога зрабіць ня могуць, у іх усё зачынена, параілі ісьці ў лягер палонных. Я пайшоў у лягер, а мне амэрыканец кажа: тут ёсьць доктар Мартынчык – ці беларус, ці ўкраінец, – ён мае інструмэнты, каб рэзаць. Мяне паклалі на стол і выразалі – безь ніякага наркозу! Але шрам застаўся назаўсёды.)

Прафэсар Васілёнак цікавіцца Сяргеем Вільчыцкім

Адна сустрэча – дакладней, гутарка пры сустрэчы – была надзвычайная, проста незабыўная. Быў у Нью Ёрку ў складзе дэлегацыі БССР прафэсар БДУ Васілёнак, чалавек сярэдняга росту, бландзіністы, знаў літаратуру. Дарэчы, як ведама, у складзе дэлегацыі БССР на Генэральнай асамблеі ААН заўсёды былі прадстаўнікі культурнай сфэры. Васілёнак прыйшоў у бібліятэку папаўдні, зайшоў проста да

мяне, мы доўга гаварылі пра літаратуру, ён глядзеў картатэкі, нешта выпісваў. Пасьля Васілёнак кажа: «Я запрашаю на вячэру». Я пытаюся, ці можна я запрашу свайго сябра, Янку Запрудніка? «О, так, клічце, калі ласка!» Я заўсёды Янку клікаў, бо ён працаваў у радыё, і яму такія сустрэчы былі таксама цікавыя.

Вельмі яскрава, выразна да дэталяў стаіць у памяці такое: мы выходзім зь бібліятэкі на 5-е авэню, там, дзе калёны, шарэе, гэта было восеньню – ён, з аднаго боку я, з другога Запруднік. І тут Васілёнак спыняецца і кажа: «Хлопцы, выбачайце, у мяне ёсьць адна справа, і я б хацеў яе хутка вырашыць, бо я мушу вырашыць». Да таго быў вельмі прыязны і прыемны, а тут раптам напружыўся. Я дык падумаў – ну, нешта пачне пытацца пра радню, я ўжо такое знаю, і гэта непрыемна. А ён сур'ёзна кажа: «У нас шукаюць – ці ня чулі вы пра эмігранта Сяргея Вільчыцкага? Пад якім ён цяпер прозьвішчам, ніхто ня ведае. Дзе ён можа быць?» Мы з Запруднікам (Сяргеем Вільчыцкім!) замёрлі. Я перапытваю: «Як, кажаце, прозьвішча?» – «Вільчыцкі. Ён недзе з-пад Міра, і яго даўно шукаюць». Я кажу: «Хто, літаратары?» – «Не, не літаратары. Ну, нехта цікавіцца, і мяне папрасілі, каб я з вамі пагаварыў пра гэта». Я так на Запрудніка гляджу і кажу: «Я такога ніколі ня чуў на эміграцыі». Запруднік кажа: «Ну, калі ты ня чуў – а ты езьдзіш паўсюль, маеш дачыненьні зь людзьмі, то што я буду ведаць, седзячы ў кабінэце!» Васілёнак кажа: «Ну, хлопцы, усё ў парадку, я спытаўся – зрабіў тое, што мне трэба. Цяпер пойдзем на вячэру». І мы пайшлі на вячэру.

Ня ведаю, як мы з Запруднікам стрымаліся, каб ня выдаць, што прозьвішча Вільчыцкі нам ведамае – мы не былі падрыхтаваныя да такога пытаньня, маглі зрэагаваць інакш, ухмыльнуцца, і Васілёнак мог бы адчуць, што мы нешта ведаем. Але мы ўбачылі, што ён прыняў нашы словы за чыстую манэту.

У тым часе яшчэ жыла Запруднікава маці, і ён падазраваў, што менскія «органы» хацелі праз маці яго выцягнуць. Яны шукалі – хто такі Вільчыцкі, і мы дапушчалі: КДБ падазравала, што Запруднік і Вільчыцкі – той самы чалавек, але шукалі пацьверджаньня. І таму даручылі прафэсару менскага ўнівэрсытэту запытацца ў Кіпеля, бо ён, можа, будзе ведаць і пацьвердзіць. Слоў няма – Вільчыцкі для КДБ быў патрэбны.

Пятро Глебка

Бліжэйшы кантакт зь Пятром Фёдаравічам Глебкам адбыўся недзе ў 1962–1963 гадох. Я працаваў у навуковым аддзеле. Ён прыйшоў да мяне, але ён па-ангельску слаба гаварыў, дык яго нехта прывёў. І пытаецца: «Ваша прозьвішча раней было Зубкоўскі?» Кажу: так. «Ваша мама вучылася там і там?» Так. «Ну і я там вучыўся». Маці

сапраўды часта ўспамінала пісьменьнікаў, зь якімі вучылася – Сымона Баранавых, Янку Скрыгана, іншых. «Я, – кажа, – Пятро Глебка». Я адказваю: «Я вас пазнаю». Бо я знаў яго з партрэтаў. «Я, – сьцішае голас Глебка, – шукаю майго добрага сябру Антона Адамовіча». Я кажу, што знаю, дзе Адамовіч, але перш яму пазваню і скажу. «Ну, я, – кажа, – пайду ў Славянскі аддзел, буду там сядзець чытаць, а вы пазваніце». Я пазваніў Адамовічу, той адразу кажа: «О, давай, прыводзь яго сюды, але ня сёньня, сёньня я заняты».

У той дзень я з Глебкам быў сам. Расказаў яму пра бібліятэку, спытаў, якія эмігранцкія выданьні яго цікавяць. Разьвітваючыся, мы выпілі кавы, і я пасадзіў яго ў таксі, сказаўшы таксісту адрас місіі БССР. Глебка сказаў, што ён празь дзень-два прыйдзе раніцай у бібліятэку. Праз пару дзён ён сапраўды прыйшоў зноў, праўда, пабыў у Славянскім аддзеле коратка, але даў мне сьпіс кніжак беларускіх эмігранцкіх выдавецтваў.

З Адамовічам Глебка спаткаўся праз тыдзень. Спачатку ён прыйшоў у бібліятэку, а затым мы зь ім пайшлі ў рэстаран, дзе нас чакалі Адамовіч і Запруднік. Сапраўды, спатканьне было вельмі цёплае. Сьлёзы ў аднаго, сьлёзы ў другога, абняліся. Было гэта ў рэстаране «Стакгольм» на 48-й вуліцы. Замовілі вячэру і гутарылі, гутарылі. Выпівалі: Адамовіч ня піў, але Глебка добра дзёрнуў. Усё гэта адбывалася павольна. Мы з Запруднікам больш слухалі і назіралі. Праседзелі мы ў рэстаране гадзіны ад 6-й да 10-й, Глебка быў і падпіты, і стомлены. Мы з Адамовічам спачатку вырашылі яго аднаго пасадзіць на таксі, але потым Адамовіч мне кажа: «Не, браток, ты лепш сядзь зь ім і давязі куды трэба, я заплачу». Так мы і зрабілі: Адамовіч пайшоў зь Янам на мэтро, а я сеў у таксі і павёз Глебку пад місію БССР. Высадзіў я яго перад самым уваходам у місію, а сам паехаў на аўтобусны вакзал – было пазнавата, а назаўтра трэба быць рана на працы.

Сустракаліся мы зь Пятром Глебкам і ў бібліятэцы, ён прыходзіў разоў дзесяць. Пятро Фёдаравіч мне сказаў, што будзе ў бібліятэцы працаваць увесь час, бо ён у місіі папрасіў дазволу, і яму зрабілі выключэньне – каб не хадзіць на сходы асамблеі. Іншым не дазвалялі, а яму дазволілі, і ён увесь час праводзіў у бібліятэцы.

Я, ясна, сказаў маці, што Глебка ў Нью Ёрку і згадваў пра яе. Яна кажа: запытайся пра аднаго пісьменьніка, яўрэя, што жыў недалёка ад Залатой Горкі, маці зь ім вучылася і зналася перад тым, сустракалася, як прыяжджала ў Менск, дык Глебка сказаў, што пасьля 1937 году ніхто пра яго ня чуў. Не прыпамінаю, хто гэта быў.

У часе працы ў бібліятэцы Глебка занатоўваў, якія эмігранцкія кнігі ён хацеў бы ўзяць з сабой. Ён падрыхтаваў даўгаваты сьпіс кніг і даў яго мне. Я ў сваю чаргу зьезьдзіў у Саўт Рывэр, атрымаў там усе кнігі Кавыля, Сяднёва, «Драбы» Случанскага і яшчэ зь дзесяток

выданьняў і перадаў Глебку добры пачак. Пятро Фёдаравіч быў «на дзясятым небе», гараваў – «як я з табой расплачуся за такі падарунак»? Ён выйшаў зь бібліятэкі, па яго прыехалі людзі зь місіі, зь якімі ён дамаўляўся – яго прывозілі, бо сам мог згубіцца. Праз пару дзён ён прыйшоў да мяне і кажа, што пры ўваходзе ў місію афіцэр, які там сядзіць, забраў тыя кніжкі і сказаў: «Не беспокойтесь, мы их вам пошлём, дайте адрес». Ён надта перажываў, ледзь ня плакаў, казаў мне, што мае дазвол на прывоз кніжак, але што зробіш... Кнігі ў яго забралі.

Калі ўжо заканчваўся ягоны пабыт, Глебка кажа, што яму хацелася б набыць 500 мэтраў лёскі – у яго быў цэлы сьпіс сваякоў, каму патрэбная лёска. На 42-й вуліцы быў спартовы магазын «Hermann», я там купіў яму лёску – 1000 мэтраў.

Увечары перад ад'ездам яны з Адамовічам самі недзе пайшлі на абед – ні мяне, ні Запрудніка зь імі не было. Адамовіч нам сказаў, што хоча пагутарыць з Глебкам сам-насам, як старыя сябры.

Пятро Глебка другі раз

Праз пару гадоў – у 1965-м, Глебка прыехаў зноў і тады ўжо не бываў у бібліятэцы так часта, але толькі часам прыходзіў. На маё пытаньне, ці атрымаў ён кнігі, якія ў яго «ўзялі дзеля перасылкі» пры ўваходзе ў місію падчас мінулага побыту, Пятро Фёдаравіч моцна крутануў галавой на знак адмовы, і больш пра гэта гутарак не было.

Гэтым разам Глебка падрыхтаваў сьпіс кніжак раней. Сьпіс быў даўгаваты, але я сказаў, што ўсё падрыхтую. Ён моцна мяне абняў, сьціснуў руку і як бы па сакрэце мне шапнуў: «Цяпер я кнігі правязу». Ня ведаю як і што, але калі я аддаў яму гэтыя эміграцыйныя кніжкі, то зь імі ён ужо не садзіўся ў машыну – а нехта прыйшоў зь беларускай місіі і ўзяў пачак. Глебка быў рады. Там у місіі, відаць, былі «свои ребята», яны зналі, хто такі Глебка, адным словам, нейкае раздваеньне там было.

Але гэта яшчэ не канец. Глебка захацеў таксама мець альбом Пікаса ды яшчэ спытаўся – колькі можна было б купіць шарыкавых ручак. Ці можна, скажам, дзьвесьце? Я кажу: «Ня ведаю, Пятро Фёдаравіч. І з альбомам таксама нічога ня ведаю – дзе і як яго шукаць». Але Глебка пра альбом усё ведаў: дзе можна купіць і колькі каштуе – пра гэта я сказаў Адамовічу. Альбом быў велізарны і каштаваў 420 даляраў, і Адамовіч Глебку яго купіў.

Пра ручкі я паабяцаў даведацца. Іду я да Кудайбергена і расказваю яму пра Глебкаву просьбу. Кудайберген кажа сваёй манерай – ён гаварыў у нос: «Подожди, ничего не покупай». У яго ёсьць прыяцель узьбек, які працуе на складзе. Я кажу: «Кудайберген, я са складам ніякіх справаў мець не хачу. Мне патрэбны рахуначак, каб

паказаць, што гэта куплена, каб калі ў яго запытаюцца, не было скандалу». Назаўтра ён прыходзіць і кажа, што гэта будзе каштаваць 270 даляраў – тысяча штук! ОК, кажу я, можа мы з Адамовічам і Запруднікам утрох складземся і купім. Так мы і зрабілі – купілі Глебку 1000 шарыкавых ручак! Ён аж ахнуў, а для мытні мы далі яму рахунак аб куплі тых ручак.

У тым часе ў Глебкавым інстытуце выйшла кніга «Беларускае мастацтва», і было ведама, што тую сэрыю па-беларуску спыняць. Але тады якраз пачынаўся праект «Беларуская народная творчасьць». Глебка тое «Беларускае мастацтва» нам падараваў.

Эдуард Цыганкоў

Найбольш шчыры ў гутарках са мной і з Зорай быў Эдуард Цыганкоў – тагачасны загадчык урадавай бібліятэкі, які ў ЗША быў на экскурсіі. Прыйшоў сам, без суправаджэньня, выклікаў мяне і Зору і проста пачаў казаць: нічому ня верце, што цяпер пішацца, русыфікацыя паўсюдная і моцная, прымітывізм у літаратуры страшэнны. Усё, што пішуць – гэта туфта. Мы проста разявілі раты – так адкрыта ён гаварыў. Ён расказваў пра бібліятэкі – як іх змушаюць купляць што загадаюць, пра тыражы, якія залежаць ад таго, хто піша кніжку – а не ад таго, што трэба чытачу. Наагул, спадар Цыганкоў вельмі пацьвердзіў нашыя ўяўленьні пра стан русыфікацыі і камунізацыі БССР.

Ігар Жолудзеў

Цікавыя былі даўжэйшы час сустрэчы зь Ігарам Жолудзевым. Ігар Жолудзеў – бібліятэкар, рускі па нацыянальнасьці, ваяваў. Калі скончылася вайна, вярнуўся, ажаніўся зь беларускай і застаўся жыць у Менску. Спадар Жолудзеў здаў экзамэн па конкурсе на загадчыка бібліятэкі пэрыядычных выданьняў ААН і гады два быў там загадчыкам. Пазнаёміў нас Міхайлаў. Ігар Жолудзеў быў падрыхтаваны бібліятэкар, ведаў літаратуру. Мы зь ім сустракаліся часта ці то ў Нью-Ёркскай публічнай бібліятэцы, ці ў Бібліятэцы ААН. Размовы былі пра літаратуру, бібліятэчныя справы, Беларусь. Мы востра крытыкавалі русыфікацыю, Ігар часам з намі згаджаўся, але настойваў, што ў той сыстэме спыніць гэты працэс нельга. Перад выездам ён кажа: «Вітаўт і Зора, зойдземце ў кафэтэрыю». У кафэтэрыі ён сарамліва паўтарыў разоў дзесяць: «Я мушу вам гэта сказаць!» І вось што ён сказаў: «Цяпер, пасьля двух гадоў, я мушу запытацца ў вас тое, што ў мяне прасілі запытацца ў «Голасе Радзімы», бо мне ўвесь час бубняць, дураць галаву. Ці ў вас ёсьць радня, дзе яна жыве?» Мы сьмяемся. «Ну, – кажа, – малаважна, што вы мне адкажаце. Галоўнае, што я запытаўся».

У 1997 годзе мы з Зорай прысутнічалі на сьвяткаваньні 70-годзьдзя Нацыянальнай бібліятэкі. Сьвяткаваньне праходзіла на добрым узроўні: чыталіся даклады па сэкцыях – мы таксама выступалі, былі наладжаныя выстаўкі, прыехала шмат гасьцей з розных бібліятэкаў з замежжа. Мы сябе адчувалі цудоўна. Гаспадыняй гэтай урачыстасьці была дырэктар бібліятэкі Галіна Алейнік, зь якой у нас былі вельмі добрыя дачыненьні. Карыстаючыся зь сяброўскіх адносін з Алейнік, Зора ёй гэтак і сказала: «Мы хацелі б схадзіць у тэатар – там будзе прэм'ера «Ладзьдзі роспачы»«. Ясна, такая просьба зьдзівіла Галіну Алейнік. Яна спрабавала нас адгаварыць, замяніць тэатар нечым іншым. Але Зора ўперлася – хачу і ўсё. Празь нейкі час Алейнік прыбягае і кажа – сёньня прэзыдэнцкая ложа пустая. Не, кажа Зора, у прэзыдэнцкую ложу не пайду. «Не, ну прэзыдэнта ня будзе!» – «А, тады пайду». Пайшлі мы ў прэзыдэнцкую ложу – вечар пакінуў незабыўнае ўражаньне на ўсё жыцьцё. У перапынку бачу – з партэру нехта мне махае, у вайсковай форме. Я ў адказ махнуў рукой, бачу – чалавек падняўся ісьці да нас наверх. Я вохнуў – Ігар Жолудзеў! (Нагул, ён гаварыў па-беларуску нядрэнна, але толькі калі яго змусіш.) Я пытаюся: як ты, Ігар, тое-сёе. Ну, кажа, з жонкай разыходжуся, пятае-дзясятае. Я кажу: пачакай, ты ж добры кадр для Лукашэнкі – ты браў Бэрлін, рускі па нацыянальнасьці. Не, кажа, «мяне туды не запрашалі і не запросяць, і я туды не пабягу».

Іван Чыгрынаў

З Іванам Чыгрынавым мы сустракаліся некалькі разоў на пачатку 1980-х. Гэта былі незабыўныя, дзіўна-цікавыя сустрэчы.

Першая сустрэча зь пісьменьнікам адбылася падчас літаратурнага вечару 20 лістапада 1978 году ў залі Нью-Ёркскага Гарадзкога Ўнівэрсытэту на 42-й вуліцы, насупраць бібліятэкі. Іван Чыгрынаў прачытаў падрыхтаваную раней лекцыю пра беларускую савецкую літаратуру з падкрэсьлена савецкім падыходам: літаратура багатая, адлюстроўвае новае жыцьцё, статыстыка, ніякіх праблема няма. Праўда, пісьменьнік пачаў хвалявацца і не даваць адказы на пытаньні (аўдыторыя была чалавек 40-50, пытаньні сыпаліся з усіх бакоў!), а адказваў штампамі, чырванеў.

Праз пару дзён мы – я і Зора – сустрэліся зь ім у бібліятэцы. Пісьменьнік, прывітаўшыся, адразу рэзка спытаў: «Дзе каталёг?» Я паказаў яму стары картачны каталёг, а Зора, падышоўшы, стала тлумачыць, што кампутарны каталёг пачынаецца ад 1972 году і... Але Чыгрынаў ня слухаў, нэрвова гартаў карткі старога каталёгу і нешта занатоўваў на паперачку. І раптам загаварыў – а чаму таго пісьменьніка няма, і гэтага няма? Ён узбуджаўся. Зора, скеміўшы, што Чыгрынаў хоча сварыцца, кажа: хадземце паесьці. Чыгрынаў згадзіўся. На абе-

дзе гаварылі шмат аб чым і «ўзьбіліся» на літаратуру. Я асьцярожна сказаў, што ў БССР усё ж ёсьць цэнзура, «я так зразумеў з Вашай лекцыі ва ўнівэрсытэце». Чыгрынава гэтая мая думка ўзарвала, ён устаў і абурана сказаў: «Я з Вамі сам-насам ня буду спатыкацца, але калі і спаткаемся, дык я некага з сабой прывяду, бо я ня мушу выслухоўваць тое, што Вы гаворыце на Савецкі Саюз – гэта для мяне абраза».

На гэткай кіслай ноце мы разышліся. Але праз пару дзён пісьменьнік прыйшоў у бібліятэку – была гэта субота, я дзяжурыў, і «яны» прыйшлі ў Навуковы аддзел. Чыгрынаў прыйшоў з кампаньёнам, ён прадставіў мне яго – таварыш Булат. «Дарэчы, – вёў далей пісьменьнік, – таварыш Булат – сын вялікага партызана з гадоў Вялікай айчыннай вайны Барыса Булата. Таварыш Булат працуе ў місіі БССР пры ААН у Нью Ёрку і можа ў выпадку патрэбы быць вам карысны», – скончыў уводзіны Чыгрынаў. Булат паціснуў мне руку, сказаў, што будзе заходзіць у бібліятэку, бо вось – цяпер мае знаёмага земляка (гэта значыць – мяне!). Па-беларуску Булат гаварыў добра. Іван Чыгрынаў таксама сказаў, што ён аб нечым хоча мяне папрасіць, дык пагутарым даўжэй і, можа, пойдзем на абед – плаціць ён, і яны з Булатам зарагаталі. Я ж весела адказаў – цудоўна, мне менш траціцца, пойдзем!

Каля 12-й гадзіны мы пайшлі на абед у рэстаран на рагу 42-й вуліцы і Lexington Ave. Замовілі ежу. Булат сказаў, што ў яго ёсьць «нешта моцнае», але я яго стрымаў, бо рэстаран быў безалькагольны. Булат вёў гутарку ў бок акупацыі і сказануў, што беларускія эмігранцкія пісьменьнікі «вінаватыя» ў нямецкіх злачынствах. Мяне такая гутарка паступова насьцярожвала, і я ў адказ такім самым тонам сказаў, што гэта паклёп, пісьменьнікі-эмігранты ні ў чым не вінаватыя, гэтаксама як нельга вінаваціць беларускіх пісьменьнікаў у злачынствах савецкай улады. Чыгрынаў тут падскочыў, хапае паліто і крычыць: «Гэта паклёп! Савецкая ўлада ніякіх злачынстваў на сабе ня мае! Я не магу такое слухаць!» і літаральна выбягае з рэстарану. Мы з Булатам засталіся сам-насам, я расьсьмяяўся, Булат чуўся ніякавата, але маўчаў. Сядзім, перакідваемся словамі. Непрыемнае становішча. І раптам... хвілін праз 15-20 варочаецца Іван Чыгрынаў і мне ціха кажа: «Я абражаюся, калі чую паклёпы на савецкую ўладу». На што я ў адказ пытаюся: «Дык закончым сустрэчу?» А Булат: «Чаму ж? Навошта? Гаварыць можна – кантакты павінны адбывацца. Пярэйдзем на іншую тэму...» Булат прадоўжыў сустрэчу на гадзіну-дзьве. Праўда, Чыгрынаў сядзеў надзьмуты, маўчаў, але... даў мне замову на эмігранцкую літаратуру! Ён папрасіў дастаць яму кнігі Масея Сяднёва, Натальлі Арсеньневай, Станіслава Станкевіча і Антона Адамовіча пра беларускую савецкую літаратуру – шмат чаго. Я, прызнацца, трохі зьдзівіўся, што Чыгрынаў гэтак настойліва хацеў набыць эмігранцкія кнігі.

Вядомая справа, кнігі я паабяцаў «дастаць». У той дзень мы разышліся, але праз тыдзень-два Іван Чыгрынаў сам прыйшоў у бібліятэку і прынёс мне ў абмен пару кніжак, цукерак, вырабы з саломкі. Мы пасядзелі ў вэстыбюлі бібліятэкі, спакойна пагутарылі аб Нью Ёрку, напружаньня не было. Пасьля Чыгрынаў прыйшоў у бібліятэку яшчэ адзін раз – каб разьвітацца.

Таварыш Булат пару месяцаў прыходзіў «пагутарыць», але гутаркі ня клеіліся, і Булат проста зьнік.

Вячаслаў Адамчык

Найлепшае ўражаньне з усіх беларускіх пісьменьнікаў і гасьцей зь Беларусі ў Нью Ёрку зрабіў Вячаслаў Адамчык. Некаторых пісьменьнікаў Том Бэрд запрашаў у Queens College, дзе ён запачаткаваў сэрыю сустрэчаў «Вечары зь беларускімі пісьменьнікамі» – усяго такіх вечароў адбылося чатыры – з Рыгорам Барадуліным, Генадзем Бураўкіным, Віктарам Казько і Алесем Барскім зь Беласточчыны. А калі прыехаў Адамчык, то Тома Бэрда не было ў Нью Ёрку, і мы запрапанавалі зрабіць сустрэчу ў Фундацыі Крачэўскага – ён прыйшоў і зрабіў добрае ўражаньне. Мы пачалі гаварыць пра русыфікацыю, а Адамчык кажа: слухайце, мы жывем у Беларусі, мы гэта ўсё ведаем, што вы нам соліце вочы? Мы ж лепш за вас гэта ўсё разумеем... Зьмяніць мы гэта ня можам – так, як і вы ня можаце. І гэтая ягоная рэпліка стварыла вельмі шчыры кантакт паміж ім і аўдыторыяй – трошкі абсадзіла самых зацятых крыкуноў. Адамчык прачытаў некалькі фрагмэнтаў з сваіх твораў ды падзяліўся творчымі плянамі.

Алесь Адамовіч

Алесь Адамовіч наведаў бібліятэку, калі быў у Нью Ёрку на сэсіі Генэральнай асамблеі ААН. Праўда, калі мы запрасілі яго зрабіць даклад для эмігранцкае і студэнцкае аўдыторыі, адразу паўстала насьцярожанае пытаньне: дзе і хто будзе весьці сустрэчу? Адносна месца засьцярогаў не было. Што да вядучага, мы сказалі, што адкрые вечар, зробіць уступнае слова і будзе весьці да пэўнага часу прафэсар Том Бэрд, але пасьля яму трэба будзе адысьці, таму прадаўжаць будзе Вітаўт Кіпель. На гэта Адамовіч і яшчэ нехта прысутны разам зь ім зь місіі папярэдзілі, што згаджаюцца, але хацелі б, каб не было «правакацыяў» – бо тады яны пакінуць сустрэчу. Мы запэўнілі, што «правакацыяў» ня будзе, і наагул, рабленьне правакацыяў – гэта ня наш стыль.

На даклад Алеся Адамовіча прыйшло шмат народу, улучна з тымі, што некалі зь ім сустракаліся ў Менску – як, прыкладам, Андрэй Клёнаў і Аркадзь Рутман. Алесь Адамовіч хваліў савецкую літаратуру

ды наагул выступаў як абаронца савецкай сыстэмы. Яму пачалі пярэчыць, асабліва Аркадзь Рутман (які, паводле «органаў», скраў дзьве бочкі салёных агуркоў і ўцёк у ЗША). Рутман пачаў з свайго досьведу казаць пра русыфікацыю, дыскрымінацыю, ціск, цэнзуру – а ён сыстэму ведаў добра: франтавік, два дыплёмы, усё жыцьцё пражыў у БССР. Адамовіч відавочна пачынаў хвалявацца і сказаў: «За той час, як Вы, Рутман, зьехалі, шмат чаго зьмянілася». Я як вядучы сустрэчы спрабаваў зьмякчаць сытуацыю. З крытыкай дакладу выступалі і Мярляк, і Клёнаў, але я прасіў устрымоўвацца ад крытыкі і канцэнтравацца на пытаньнях дакладчыку. Вечар скончыўся спакойна, але на кіславатай ноце.

Аб гэтым вечары, дакладзе, нясмаку, канфрантацыі эмігрантаў з Алесем Адамовічам я стаяў і думаў – думаў аб беларускім лёсе і непрадбачальнасьці падзеяў – на закладцы помніка на магіле пісьменьніка ўлетку 1994 году ў мястэчку Глуша, куды мы разам зь Янам Запруднікам былі запрошаныя і дзе мелі таксама шчырую гутарку зь мясцовым начальствам пасьля ўрачыстасьці на могілках. Там мы сутыкнуліся з правінцыяй, настроенай за Лукашэнку.

Анатоль Міхайлаў

Анатоль Міхайлаў быў у ЗША даўгавата, гадоў пяць-сем. У ААН дзеюць розныя камітэты і інстытуты, і сярод іх – Інстытут сацыяльнага разьвіцьця, установа больш філязофскага накірунку, якая сярод іншага займаецца вывучэньнем псыхалёгіі злачынцы, аналізам паводзінаў крымінальнага сьвету. І ў гэтым інстытуце Міхайлаў быў прадстаўнік ад БССР. Ён быў сябрам Бураўкіна, іхнае сяброўства ішло з кніжных кантактаў у Беларусі.

Генадзь Бураўкін яго пазнаёміў са мной, і Міхайлаў пачаў прыходзіць у бібліятэку зь дзесяткамі сьпісаў кніжак – дастань яму «Петлистые уши», дастань яму тое, дастань сёе. У яго заўсёды быў сьпіс цікавай літаратуры. Міхайлаў, як выглядала, меў шмат часу – вельмі часта бываў у бібліятэцы. Апрача літаратуры яго мала што цікавіла.

Аднойчы ён кажа, што едзе на Беларусь у адпачынак, і Зора мамэнтальна дала яму заказ: Анатоль, прывязі нам пару старых арыгінальных экспанатаў тэкстыльных вырабаў. Міхайлаў Зорыну просьбу выканаў, у Менску яму дапамагла гэта зрабіць Вольга Церашчатава. Яны знайшлі ў Слуцку спадніцу, якой сто дваццаць гадоў. Цяпер яна ці ў Кузьміцкай, ці ў Сокалава-Воюша. Тады яшчэ чорны збанок з Палесься – ён цяпер у Юркі. І зь вёскі Неглюбка шасьцімэтровы ручнік – ён цяпер у Алесі. І нават больш – Міхайлаў прывёз зь Неглюбкі ліст ад Тацяны Дзеранок – мы яе з Зорай адведалі ў 1995 годзе – ліст да беларусаў Амэрыкі.

Міхайлаў прывёз ліст ад Барыса Сачанкі, у якім той прасіў прывезьці шмат твораў эміграцкай літаратуры. Я, кажа Сачанка, пішу кніжку пра літаратуру беларускай эміграцыі, і мне трэба тое і тое. І гэта было апошняе, што я зрабіў Сачанку празь Міхайлава, бо тады Міхайлава забралі. Яго паслалі ў Вену, а зь Вены адразу Беларусь адклікала. А ён у той час меўся стаць акадэмікам. У Менску Міхайлава «органы» пачалі пытацца: раскажыце нам пра эміграцыю. Вы ні чарта не рабілі ў сваім камітэце, а толькі шляліся невядома дзе і з кім. Ужо пайшлі і прозьвішчы, што ён знаёмы і з Запруднікам, і з Кіпелем – што вы зь імі рабілі і гэтак далей. Міхайлаў кажа, што ён нават не падазраваў, што за ім так сачылі. Яго зьнялі з пасады, акадэмікам ён ня стаў.

Пра ўсё гэта Міхайлаў мне расказаў у Менску ўжо значна пазьней, у 1990-х гадох. Тады ж Сачанка папярэдзіў нас з Зорай, што Анатоль Міхайлаў арганізуе ўнівэрсытэт, яму дапамагаюць Фонд Сораса і мітрапаліт Філарэт, але што гэта ня будзе беларуская ўстанова – наадварот, беларусіка там ня будзе ў праграме, і ён, Сачанка, ня раіць нам мець ніякіх дачыненьняў з заплянаваным унівэрсытэтам.

Зь Міхайлавым я адзін раз спаткаўся ў Менску, але ніякіх прапановаў наконт ЭГУ ён не рабіў, толькі казаў, што мае дачыненьне з амэрыканцамі, і яны яго з ЭГУ падтрымаюць, і што ў яго ёсьць перавага – ён разам зь Філарэтам плянаваў адкрыць у ЭГУ тэалягічны факультэт.

Анатоль Міхайлаў быў настроены антыкамуністычна ўвесь час, калі быў у Амэрыцы. Я пытаўся ў яго: «Як цябе церпяць?» А ў 1995-м Анатоль мне казаў: перажылі камунізм, але невядома, ці перажывем Лукашэнку. І далей: «Вітаўт, і ты верыш, што ён будзе толькі чатыры гады? Давай, – кажа, – закладземся! Я даю мінімум дваццаць гадоў». Гэта ягоныя словы.

Ягоная варожасьць да беларускай мовы нас з Зорай заўсёды дзёргала і моцна дзівіла. Мы зь ім гаварылі пра гэта – Анатоль заўсёды неяк выкручваўся. Але факт застаецца фактам: да беларускай мовы Міхайлаў варожы.

Сустракаліся я і Запруднік з Анатолем у ЗША і ў 2009–2011 гадох. Тады выглядала, што ў ЭГУ палепшыцца справа зь беларусістыкай. Але гэта было толькі мары...

Аркадзь Тоўсьцік

Сустракаўся я з рэдактарам «Звязды» Аркадзем Тоўсьцікам, год ужо дакладна ня памятаю – ён быў у складзе дэлегацыі БССР. Прыйшлі ў бібліятэку, ён адразу сказаў, што валодае мовай. Разгаварыліся, выявілася, што ён з-пад Глуску. У адрозьненьне ад іншых партыйных гасьцей, Тоўсьцік шмат ведаў пра Беларусь, шчыра цікавіўся беларускасьцю. Я зь ім чуўся няблага.

Затое мне было вельмі непрыемна, калі праз добры дзесяток гадоў я з Аркадзем Тоўсьцікам сустрэўся ў Скарынаўскім цэнтры на вуліцы Рэвалюцыйнай і ён мне з папрокам сказаў, што ў кнізе «Беларусы ў ЗША» я сярод сваіх гасьцей у бібліятэцы не згадаў ягонага прозьвішча. Гэта была памылка, прыкры недагляд, а ў Тоўсьціка было ўражаньне, што я зрабіў гэта наўмысна. Я выбачыўся. Пазьней я з Тоўсьцікам сустракаўся яшчэ, калі ён быў членам камісіі «Вяртаньне» і шчыра там працаваў. Ясная справа, што ў англамоўным выданьні «Беларусаў у ЗША» я ўжо сустрэчу з Аркадзем Тоўсьцікам не прапусьціў.

Ад Тоўсьціка я ўпершыню пачуў, што ён знаёмы з прозьвішчам Кіпель і што былі Кіпелі, якіх у вайну зьнішчылі немцы – Тоўсьцік казаў праўду, такое было каля Глуску, а ён тыя мясьціны ведаў.

З Тоўсьцікам я, памятаю, закрануў пытаньне пра слуцкія паясы, забраныя зь Віленскага музэю. А ён: «Адкуль вы ведаеце, што яны забраныя зь Віленскага музэю?» Я сказаў, што ўзяў літоўскую кніжку, і там ёсьць рэпрадукцыі і напісана, адкуль узятыя паясы, і што гэта трэба на дзяржаўным узроўні закрануць, бо музэй быў беларускі. Тоўсьцік пачаў даводзіць, што як музэй застаўся ў Літве, дык ён Літве і належыць. Мне здавалася, што ў Тоўсьціка было жаданьне згадзіцца з нашымі довадамі, што Музэй Івана Луцкевіча – гэта беларуская ўласнасьць, але адначасна ён апраўдваў і ўладу. Што запала ў памяць з гутаркі з Тоўсьцікам – гэта яго пазыцыя, што і да паглядаў эміграцыі трэба прыслухоўвацца.

Мікалай Сікорскі

Знаёмства і кантакт зь Мікалаем Сікорскім адбыліся ў такіх абставінах. Сікорскі на пачатку 1970-х прыехаў на кангрэс у Вашынгтон, а затым завітаў і ў Нью Ёрк, а там і ў нашу бібліятэку.

Аднае раніцы выклікае мяне дырэктар бібліятэкі да сябе ў кабінэт і кажа: заўтра ў бібліятэцы будзе савецкая дэлегацыя, і ў ейным складзе будзе дырэктар Ленінскай бібліятэкі Мікалай Сікорскі. І Сікорскі, будучы ў Вашынгтоне, заявіў, што гаворыць па-беларуску. Ты, Кіпель, умееш і па-руску і па-беларуску, ты будзеш нам патрэбны як перакладчык.

Назаўтра прыйшла дэлегацыя, а сярод іх выдзяляецца высокі і сьціплы чалавек, якога прадстаўляюць як дырэктара Бібліятэкі імя Леніна ў Маскве. Дырэктар нашае бібліятэкі Джэймс Гэндэрсан прадстаўляе мяне Сікорскаму і кажа на мой адрас некалькі стандартных камплімэнтаў. Праўда, мы зь Сікорскім пачалі гаварыць па-ангельску, а тады я пытаюся: «Мне нібыта сказалі, што вы беларус?» А ён: «Угу, братка ты мой! Вось табе й амэрыканцы! Так, – кажа, – я беларус». Ну й я беларус. «О, – кажа, – ну тады справа іншая».

Наш дырэктар Гэндэрсан усьміхаецца ад вуха да вуха. Дэлегацыю павялі па бібліятэцы – у фінансавы аддзел, у каталягізацыю і гэтак далей. А я думаю – далучуся да іх, калі яны будуць у Аддзеле рэдкай кнігі.

У Аддзеле рэдкай кнігі ў нас зь Сікорскім пачаліся гутаркі на беларускія тэмы. Трэба сказаць, што ён добра ведаў беларускую кнігу. Ён спытаўся, ці ёсьць у нас віленскія друкі. Так, сказаў я – зь віленскіх выданьняў маем некалькі. Потым гаварылі пра Скарыну.

Пад вечар таго дня бібліятэка наладзіла для дэлегацыі шыкоўны абед у Залі дырэктароў. Прыйшлі і гарадзкія ўлады, і кангрэсмэны. Узначальваў савецкую дэлегацыю Сікорскі, і, вядома ж, яго пасадзілі ў цэнтры, а побач зь ім пасадзілі мяне! Перад тым дырэктар Гэндэрсан мне сказаў: «Кіпель, як выдатна, што ты ёсьць у бібліятэцы. Ты гавары госьцю пра бібліятэку і скажы, што мы гатовыя на працоўны абмен бібліятэкароў». Абед пачаўся, гасьцей віталі і віталі, а мы зь Сікорскім гаварылі аб беларускіх справах. Яму было цікава ведаць пра эміграцыю, і ён быў зьдзіўлены, калі даведаўся, як прасунутыя дасьледаваньні Скарыніяны доктарам Вітаўтам Тумашам. Сёе-тое расказаў мне і пра Менск.

Так у гутарках мы знайшлі агульныя інтарэсы, і ў адзін момант я сказаў: «Я б хацеў у вас шчыра запытацца». – «Гаварыце ўсё, – кажа. – Патрэбна нешта?» «Так, – кажу, – патрэбна. Патрэбна «Наша Ніва». – «Наша Ніва»? У нас у Маскве поўнага камплекту няма». – «Я ведаю, што ў вас няма, але ў Ленінградзе ёсьць». – «А адкуль вы ведаеце?» Я кажу, што я прасачыў па каталёгах, а яшчэ мы зь Ленінградам мелі кантакты, яны, зь Бібліятэкі імя Салтыкова-Шчадрына, у нас прасілі матэрыялы пра сьпевака Вярцінскага, мы ім далі, і я папрасіў у іх інфармацыю пра «Нашу Ніву» – у іх ёсьць камплект. Ёсьць і папяровае выданьне, ёсьць і мікрафільмы. А нам газэта патрэбна, бо нідзе на Захадзе няма. У нас шмат хто газэту патрабуе, і вы як беларус мусіце разумець значэньне гэтага – былі мае словы да Сікорскага. Ён кажа: «Вы мне не кажыце, я добра разумею значэньне». Кажа, што ў іх нядаўна была дыскусія ў Менску і што ён схіляецца да думкі, што «Нашу Ніву» трэба зрабіць здабыткам публічнасьці. «Так, – кажу, – Качана за такія думкі зьнялі з работы». І мы ўжо гаворым як беларус зь беларусам. «Вы, – кажа, – маеце ўсе дадзеныя, шыфры?» – «Усё маю. Падрыхтаваў для вас спэцыяльна». Ён кажа, ня ведае, ці зможа зрабіць – каб гэта было ў Маскве, усё было б проста, а тое ў Ленінградзкай публічнай. Я кажу, што добра разумею, але што ён – апошняя інстанцыя, адкуль мы можам мець. Сікорскі паабяцаў паглядзець, што будзе магчыма: «Але верце мне, пастараюся». Так мы закончылі гутарку пра «Нашу Ніву».

Скончыўся абед пазнавата, назаўтра ён яшчэ мне пазваніў, сказаў,

што была прыемная шчырая гутарка. Я спытаўся, якія яму патрэбныя кніжкі, ён сказаў, што яму нічога не патрэбна.

Забыць такой гутаркі я ня мог. Усё чакаў – што з гэтага выйдзе?

Праз тыдняў шэсьць бібліятэка атрымоўвае велізарны пачак заказной поштай, а ў пачку – штук восем катушак з пазнакай: «На ўвагу В. Кіпелю». Мяне клічуць у аддзел атрыманьня кніг. Там стаіць начальніца, Уаніта Дорыс, з гішпанскага Гарлему, а на стале ў яе катушкі зь мікрафільмамі. Я ўхмыльнуўся. Яна кажа: «Кіпель, што гэта такое? Ад якога часу ты, Кіпель, можаш заказваць такія рэчы?» Я кажу – я не заказваў! Яна кажа: «Ты лепш маўчы. Бачыш усю гэтую музыку – нам давядзецца нешта за гэта плаціць». Я расказаў ёй, як была гутарка: ні я нічога не абяцаў, ні ён. Я папрасіў для бібліятэкі і ня думаў у той мамэнт пра фінансавы бок. Але калі што – магу заплаціць, сам, вылічце з майго заробку, і на гэтым спынім гутарку, бо гэтая газэта для беларусаў незвычайная. Ох яна тады пакрыўдзілася! Але я ведаў, што яна мне сымпатызуе. ОК, кажа, ладна, маўчы, неяк разьлічымся. Пасьля паспакайнела і кажа: «Слухай, ці ты дазваляеш, каб мы аддалі гэта ў Славянскі аддзел?» Я кажу: «Вы разумна гаворыце. Аддайце гэта лепш Зоры, а Зора закаталягуе. На гэтым тая гутарка і скончылася, хоць Уаніта мне пасьля гэта пару разоў успамінала. Дорыс скантактавалася зь Ленінградзкай публічнай бібліятэкай, і там адказалі, што гэта быў падарунак, а калі мы нешта прышлем узамен, дык яны будуць удзячныя. Бібліятэка паслала ім падпіску на пару навуковых часопісаў, і справа скончылася.

Доктар Віктар Корэсар (эстонец, тагачасны загадчык Славянскага аддзелу) зразумеў адразу значаньне «Нашай Нівы» для беларускай калекцыі – ён быў чалавек наагул адукаваны – як толькі Зора прынесла газэту ў аддзел. Газэту закаталягізавалі і паставілі ў спэцыяльныя калекцыі. Я пачаў правяраць – хто карыстаецца, якія чытачы. Першы, хто карыстаўся «Нівай», быў прафэсар Майкл Пап зь езуіцкага John Carl University каля Кліўлэнду. А потым «Наша Ніва» пайшла ў ход. Ну, безумоўна, нашыя беларусы пачалі карыстацца – я, Стась Станкевіч, Уладзімер Сядура.

Пазьней з газэты «Наша Ніва» бібліятэка зрабіла дзьве фатаграфічныя копіі, а нэгатыў схавалі ў сэйфе ў падвале – усе нэгатывы захоўваюцца ў зачыненым памяшканьні дзеля рэжыму тэмпэратуры і сьвятла.

Мне вельмі падабаецца тэрмін «спрацавала». І вось у гэтым выпадку беларускасьць Мікалая Сікорскага сапраўды спрацавала. Бо ж ён мог і не прыслаць, забыцца, але вырашыў, што трэба беларусам замежжа даць «Нашу Ніву». Добры ўчынак. Дарэчы, прысланая зь Ленінграду копія-нэгатыў «Нашай Нівы» была адзіная на Захадзе.

Леў Уладзіміраў

Бібліятэка рэгулярна арганізоўвала кніжныя выстаўкі, прысьвечаныя юбілеям, пераважна важным датам з культурнай гісторыі. У 1967 годзе Славянскі аддзел арганізаваў вялікую выстаўку – на 300-400 экспанатаў, вітрыны стаялі па цэлай бібліятэцы – прысьвечаную 450-годзьдзю беларускага друку. І ў гэтым самым часе загадчыкам бібліятэкі ААН быў прафэсар Лявас Уладзіміравас – Леў Уладзіміраў. Сам ён па нацыянальнасьці расеец (але не радня Ўладзімірава, які напісаў першую кнігу пра Скарыну), ягоная сям'я жыла ў Коўне каля сотні гадоў, і калі саветы занялі Літву, яны ўспрынялі гэта нармальна – зноў апынуліся ў дзяржаве, у якой некалі жылі. Яго прызвалі ў савецкае войска, ён быў на фронце «ў чыне лейтэнанта», а пасьля вярнуўся ў Літву, працаваў у Коўне бібліятэкарам. А калі абвясьцілі конкурс на загадчыка бібліятэкі ААН, ён выйграў конкурс і пару гадоў працаваў на гэтай пасадзе ў Нью-Ёрку.

Уладзіміраў часта бываў у нашай бібліятэцы, у мяне зь ім напачатку было «шапачнае знаёмства», але калі пачалася праца над выстаўкай «450 гадоў беларускага друку», я да яго зьвярнуўся і дамовіўся, што аб некаторых рэчах наконт выстаўкі я зь ім буду радзіцца. Уладзіміраў дапамагаў зь вялікай ахвотай, прынёс некалькі скарынаведных кніжак, прынёс і сваю кніжачку пра Скарыну. Я пазнаёміў Уладзімірава з доктарам Тумашам. З Тумашам ён гаварыў па-літоўску, таксама па-ангельску.

Калі выстаўка адкрылася і адбылося ўрачыстае прыняцьцё, Уладзіміраў мне кажа – мы зь ім перайшлі нават на «ты», хоць я быў крыху маладзейшы: «Вітаўт, я табе раскажу адну забаўную гісторыйку». Ён, працуючы ў Літве, «раскапаў», што некалі Купала ў Вільні працаваў з паўгода ці год у бібліятэцы і што ў яго былі сувязі зь літоўскімі бібліятэкарамі. Уладзіміраў напісаў пра гэты эпізод артыкул па-беларуску і паслаў у «Полымя», але там яго не надрукавалі і прысалі артыкул назад. Ён быў вельмі абураны, бо не было сэнсу друкаваць гэта па-літоўску, ён хацеў, каб гэта надрукавалі ў Беларусі. Тады ён пераклаў гэты артыкул на расейскую мову і надрукаваў яго ў Маскве. Прайшоў, можа, год ці два, ён быў у Менску і зайшоў у «Полымя» ды пытаецца, чаму артыкул не апублікавалі. А яму адказная асоба кажа, што дырэктар той бібліятэкі, дзе працаваў Купала, быў царскі афіцэр! І таму ў Менску не надрукавалі артыкул пра Купалу... «Вот, – кажа, – твае землячкі...» Уладзіміраў быў вельмі абураны на беларусаўкультурнікаў у БССР.

У Нью Ёрку Ўладзіміраў «забыў» кніжку Антановіча аб татарскім пісьме, падараваную яму аўтарам (з аўтографам!).

Сьцяпан Калупайла

Былі ў бібліятэцы сустрэчы ня толькі зь беларусамі. Летам 1969 году ў нас была дэлегацыя бібліятэкароў з Расеі, і адна бібліятэкарка была з Кірава. Як толькі я стаў іх вадзіць па кнігасховішчы і сказаў, што я беларус, яна адразу загаварыла са мною па-беларуску. Яе прозьвішча было ці Касоўская, ці Красоўская, ейныя дзяды былі з тых беларусаў, якіх высылалі ў 1930-я гады, недзе зь Віцебшчыны, яна там выросла і засталася на пасяленьні. Яна надта мяне прасіла, каб я трымаў зь ёй лучнасьць, мы абмяняліся карткамі, але жыцьцё было такое занятае, што гэты кантакт не ўтрымаўся.

Памятаю іншы момант. Недзе ў 1961 годзе мне сказалі, што ў Навуковы аддзел прыйшоў літовец і хоча мяне бачыць. Я падумаў, што гэта нехта з самой Літвы, ажно прыйшоў прафэсар Сьцяпан Калупайла – ведамы літоўскі гідроляг, да вайны працаваў у Літве, а ў Амэрыцы выкладаў ва ўнівэрсытэце Нотр-Дам у Індыяне і напісаў кніжку «Nemunas». І вось ён даведаўся, што я беларус, і прынёс мне падараваць сваю кніжку. Мы зь ім разгаварыліся, ён гаварыў парасейску, па-нямецку, і ён сказаў, што хоча, каб беларусы мелі ягоную кнігу. Ён яе падпісаў. На кнігу была рэцэнзія ў «Запісах», пасьля я гэтую кніжку падараваў беларускай Нацыянальнай бібліятэцы. Ён прысьвяціў дасьледаваньню Нёману ўсё сваё жыцьцё, усе напрацоўкі, якія ён зрабіў на Бацькаўшчыне, спадар Калупайла забраў з сабой на эміграцыю.

Эссон

Эссон – псэўданім А. Зураева, каўказкага дасьледніка і дзеяча, асэціна па нацыянальнасьці, аўтара колькіх працаў па этнаграфіі й гісторыі Асэціі. Я зь ім пазнаёміўся ў 1960-х гадох у бібліятэцы, куды Эссон прыходзіў як чытач. Калі ён даведаўся, што я беларус, Эссон сказаў, што некалі, у маладосьці, быў добра знаёмы і нават сябраваў зь іншым беларусам – Алесем Прушынскім.

У мяне ў той час амаль заняло дух: я пазнаёміўся з чалавекам, які ведаў нашага вялікага паэта-пачынальніка, палітычнага дзеяча Алеся Гаруна! Гэтак паўсталі, выплылі з памяці Эссона славутыя ўспаміны.

Некалькі словаў пра Эссона. Ён зь Сібіры, пасьля 1917 году трапіў у ЗША, скончыў інжынэрны факультэт унівэрсытэту. Доўгі час працаваў па фаху ды паралельна дасьледаваў розныя аспэкты гісторыі Асэціі. У 1970-х гадох Эссон адведаў Каўказ, быў у родных мясьцінах. Прынцыпова ніколі не зьмірыўся з савецкім ладам. Эссон-Зураеў быў прыхільнікам нацыянальных дзяржаваў, а не імпэрыі.

Я з Эссонам сябраваў даўгавата. Ён мне хацеў аддаць сваю

бібліятэку, у якой былі кнігі Карскага, Карамзіна ды іншыя цікавыя выданьні. На жаль, я ўсё адкладаў свой візыт да яго, пакуль Эссон не адышоў у лепшы сьвет у 1970-х. Адну кнігу ягонага аўтарства я перадаў у Нацыянальную Бібліятэку Беларусі.

Іншыя сустрэчы

Сустракаўся я з Марыяй Карпенка, рэдактарам «Работніцы і сялянкі». Зь ёй даўгой гутаркі не было: добра гаварыла па-беларуску, была трубадур савецкай прапаганды.

З Генадзем Бураўкіным пазнаёміліся ў другой палове 1970-х і засталіся сябрамі. Бураўкін прыйшоў сам, мы зь ім шмат шчыра гаварылі. Ён тады, здаецца, быў рэдактарам «Маладосьці» і казаў, што ягоная мара – давесьці тыраж да 25 тысяч, а тады было толькі 10 тысяч. Бураўкін быў у Амэрыцы два разы – як дэлегат у 1970-х гадох, а потым ужо прыехаў як прадстаўнік Беларусі ў ААН, таму кантакт зь ім быў даўжэйшы і трывалейшы. Мне здаецца, што Генадзь Бураўкін у нашых размовах хацеў бы сказаць і больш, але стрымваўся.

Шапачнае знаёмства адбылося з Рыгорам Барадуліным. Барадулін больш маўчаў, мала гаварыў. Іншыя стараліся трошкі падхваліць, маўляў, у Беларусі ўсё квітнее, а Барадулін улады не хваліў.

Затое рэдактар «Сельскай газэты», я ўжо забыўся, як яго звалі – быў поўнай адваротнасьцю рэдактара «Звязды» Аркадзя Тоўсьціка. Тоўсьцік быў спакайнейшы. Хоць ён і казаў, што іх сыстэма перамагае, але выкладаў довады вельмі інтэлігентна. А рэдактар «Сельскай газэты» адразу пачаў сыпаць статыстыкай – колькі пашаў, колькі кукурузы і г. д.

З пазьнейшых кантактаў прыемнае ўражаньне пакінуў мастак Кішчанка – ён падараваў ААН адну з сваіх вялікіх карцін.

Прыходзіў да нас Анатоль Вярцінскі, але быў вельмі халодны. Пасьля мы ўсе ішлі на абед, і ён з намі не пайшоў.

Бываў у бібліятэцы Адам Мальдзіс – там ён быў, як у сябе ў хаце.

Вядомая справа, сярод гасьцей з БССР было ладна й такіх, хто дбаў пра беларускую культуру, жадаў ёй дабра.

Прыкладам, спадар Шчасны быў ладны час у Нью Ёрку, прыносіў кнігі, у тым ліку і вядомую анталёгію Купалавага верша «А хто там ідзе?» на розных мовах. Было выданьне анталёгіі, дзе расейскі пераклад быў не на пачатку, а паводле альфабэту – дык Шчасны дбаў, каб наша бібліятэка мела і гэтае выданьне.

Былы міністар замежных справаў Беларусі Пятро Краўчанка перадаў бібліятэцы ладна кніжак, а таксама партрэт Францішка Скарыны.

Рэгулярна дараваў бібліятэцы кнігі Алег Пашкевіч – адзін з сакратароў Беларускае місіі пры ААН. Шмат кніг зь Беларусі

бібліятэка атрымала дзякуючы дыплямату Андрэю Дапкюнасу. Вядомая справа: тыя, у каго ў душы была беларускасьць, дбалі пра беларускую культуру і ў Нью Ёрку.

Прыяжджалі часам сюды прадстаўнікі гандлёвых кампаніяў, звычайна ў складзе агульных савецкіх дэлегацыяў – помню, адзін раз жанчына была зь Берасьця – і яны заходзілі ці выпадкова, ці ім казалі зайсьці.

Часам прыходзілі спартоўцы, але як турысты – сустрэчы ў памяці не засядалі.

Звычайна на сустрэчы з гасьцямі з БССР прыходзілі Адамовіч, Тумаш, часам Клёнаў, Рутман. Хто ніколі ні з кім не спатыкаўся – гэта Янка Юхнавец. Ні з кім. Проста ня мог ці не хацеў. Помню, калі быў Алесь Адамовіч, дык я Юхнаўца запрашаў асабіста, каб ён прыйшоў – не пайшоў. Казаў – не хачу зь імі ні пра што гаварыць.

Ясна, шырока гэтыя сустрэчы з гасьцямі з БССР мы не афішавалі. Пра ўсе сустрэчы я дзяліўся ўражаньнямі зь Янам Запруднікам. Тумаш ведаў, Адамовіч ведаў, часам мы расказвалі аб гэтым на зборках БІНіМу, але наагул гаварылася няшмат. Праўда, злыя языкі казалі, што адбываліся сустрэчы па-за намі. Казалі, што Максім Танк прыходзіў да Адамовіча, але Адамовіч ніколі пра гэта не казаў. Мы ў яго пыталіся, ён маўчаў. Казалі, што Цэлеш таксама меў сустрэчы з Танкам, я з Цэлешам бачыўся шмат разоў, і ён таксама ніколі нічога не сказаў. Маглі быць прыватныя спаткаьні – людзі маглі шукаць сваіх родных. Прыпушчаю, што сустрэчы былі больш шырокай зьявай, чым падавалася ў друку.

Сустрэчы зь «іншымі» землякамі

Бясспрэчна, беларуская эміграцыя па Другой сусьветнай вайне – эміграцыя ідэалягічная, палітычная. Яна варожа і непрымальна ставілася да ўсяго, што атаясамлівалася з Савецкім Саюзам, пагатоў сустрэчы з «савецкімі» і не разглядаліся інакш, чым «агентурныя», «шпіёнскія». Спрачацца з такім паглядам, бадай, наўрад ці было пажаданым і карысным, бо зьмены ў паглядах былі амаль немагчымыя. Мне здаецца, што ў беларускім грамадзтве – і эміграцыйным, і на Бацькаўшчыне – вельмі лёгка абыходзяцца з тэрмінамі «агент», «калябарант», «гэбіст» і падобнымі. Найчасьцей такія мянушкі лепяцца сумысьля дзяржавай, а калі на прыватным узроўні – то каб падкрэсьліць асабістую варожасьць да паглядаў і думак суразмоўцы.

Я да гэткай разьвязанасьці языка стаўлюся асьцярожна і стрымана. Праўда, і я маю непахісны пагляд, што дзейнасьць «органаў» – жывая і жывучая рэальнасьць. Паводле сьветагляду я належу да тых, хто ўпэўнены, што ў дзяржаўным апараце паліцэйскай дзяржавы ёсьць

орган, які сочыць за палітычнымі паглядамі грамадзтва, а частка гэтага органу адказная за пілнаваньне паглядаў і дзейнасьці эміграцыі. Так было ў Расейскай імпэрыі, бязь зьменаў прадаўжалася ў СССР, так ёсьць і ў сёньняшняй Расейскай фэдэрацыі. І я ўпэўнены, што БССР як частка СССР, а цяпер Рэспубліка Беларусь як саюзьнік Расеі сочыць за эміграцыяй, а каб эміграцыя ня сталася пагрозай імпэрыі (улучна з палітычным ладам у Беларусі) – яе трэба раскладаць, сварыць, а калі ўдаецца – зьнішчаць. Гэта ня тое, што мой пагляд – гэта частка мае самасьвядомасьці.

І тым ня менш я зь землякамі з БССР сустракаўся, бо, па-першае – ня ўсе яны былі «савецкія», а па-другое – я гэтым не выхваляўся, хоць і не трымаў у таямніцы. За час маёй працы ў бібліятэцы я, як я заўважыў вышэй, сустракаўся з асобамі, якія, на мой пагляд, глыбака ў душы былі нацыянальныя, хоць на іх і ціснулі «органы» (як, прыкладам, прафэсар Васілёнак), але былі сустрэчы і з «агентамі».

Адным зь першых людзей «невыразнага профілю», хто пачаў да мяне прыходзіць, быў нехта Сітнік – беларускамоўны, абазнаны ў нацыянальным руху, «працаваў над дактаратам». Вось гэты мамэнцік бываў вызначальны: «працую над дактаратам». Прыходзілі такія «дактаранты» зь місіі. Найчасьцей гэта бывалі «рускія людзі», якіх «органы» накіравалі на працу ў беларускую місію. Але бывалі і беларусы.

Але прыходзілі ня толькі «дактаранты», забягалі наведаць земляка і іншыя (нехта ж даваў адрас!). Былі іх дзесяткі. Адзін такі дзівак запамятаўся. Падышоў да даведачнага стала ў Навуковым аддзеле параўнаўча малады чалавек, гадоў 30-32, і спытаў Вітаўта Кіпеля. Мяне паклікалі. Я з «госьцем» прайшоў у вэстыбюль. Ідучы, «госьць» назваўся: Сьцяпан (імя я памятаю добра, а прозьвішча забыўся, здаецца Дашкевіч). Родам з Глушчыны, чуў пра мяне. Служыць у гандлёвым флёце і цяпер на савецкім караблі вяртаецца «на радзіму». Хутка будзе на Глушчыне – можа ў мяне там ёсьць сваякі і я нешта хацеў бы ім перадаць? Ясна, я адмовіўся: у мяне сваякі згінулі! Але ж дзіўнае спатканьне.

Апрача таго, што людзей з «органаў» можна было пазнаць з таго, што яны «працуюць над дактаратам», яны заўсёды былі гатовыя «нешта перадаць сям'і». «Звычайныя» землякі ніякіх даручэньняў не прапаноўвалі – яны заўсёды запрашалі «на радзіму»: прыедзьце, пабачыце, у нас усё зьмянілася ад вашых часоў! Бяскрыўдныя фразы...

Іван Стэльмашонак

Доўгі час прыходзіў да мяне нехта Іван Стэльмашонак – беларускамоўны – ладны час у сярэдзіне 1960-х ён быў першым сакратаром місіі. Аднойчы Стэльмашонак прыйшоў да мяне і чытаў мне ліст ад

бацькі: бацька былы партызан, яму выдзелілі дровы, але не далі каня, дык ён просіць сынка, каб яму дапамог прывезьці тыя дровы – і гэта ён мне ўсё сэнтымэнтальна чытае. Мы зь ім былі на ты – ён быў на год ці два за мяне старэйшы – меў сваю машыну, адзін раз разьбіў яе і пытаўся, дзе купіць запчасткі. Ці Іван быў шчыры або не – ня ведаю. Але я ўспрымаў ягоную бытавую расчуленасьць як ліпу. Я быў нагэтулькі загартаваны на прыкладзе ўласнай сям'і супраць саветчыны, што ня верыў нікому і ніколі, пакуль у 1990-х гадох не паехаў у Беларусь – там я пераканаўся ў антысавецкім духу тысячаў і тысячаў людзей. І толькі таму, што я быў моцна загартаваны, я адчуваў, што магу сустракацца зь любым савецкім «агентам» і заставацца антысавецкім.

І Іван мяне прасіў: пазнаём мяне яшчэ з кім! Пазнаёміў я яго з Запруднікам, з Васілём Мельяновічам, які жыў у Мэрылэндзе, але якраз быў у Нью-Ёрку на курсах мэнэджмэнту, але Стэльмашонак усё хацеў пашырыць сваё кола знаёмстваў. Я зь ім разышоўся на такой ноце: ён вёз дываны, а па дарозе праверылі – дазволілі правезьці толькі тры, а пятнаццаць забралі. Стэльмашонак прыйшоў у бібліятэку і кажа мне, што я некаму сказаў пра дываны. Я кажу: Іван, ты мне пра гэта ніколі не гаварыў, я й ня ведаў. Так ён і зьехаў.

Цікава, што Стэльмашонак быў ці не адзіны, хто пытаўся ў мяне – як запісацца ў бібліятэку на абанэмэнт. Я расказаў, як гэта робіцца, ён пайшоў і запісаўся ў бібліятэку Донэл на 53-й вуліцы.

Калі я пазнаёміў яго зь Мельяновічам, то ў іх ужо кантакт быў лягчэйшы – зойдуць і ў рэстаран, і па чарцы вып'юць, я зь імі не хадзіў.

Іван Стэльмашонак шукаў кантактаў. У бібліятэцы ён пазнаёміўся з маім сябрам Сяргеем Казаковым*, які ў той час рабіў магістарскі дыплём і працаваў у эканамічнай кампаніі. А Мельяновіч працаваў у Bell Telephone у камунікацыйнай сфэры, да таго ж меў першаклясную амэрыканскую біяграфію – добра скончыў сярэднюю школу ў ЗША, пайшоў добраахвотнікам у армію, служыў у Панаме, меў

---

*Значна пазьней, у 1980-х гадох, Сяргей Казакоў працаваў у Вашынгтоне ў Міністэрстве абароны, а потым у Міністэрстве адукацыі. Я, праўда, згубіў Сяргея з поля зроку. Але аднойчы ноччу, было гэта, можа, у 1985-м, гадзіне а 2-3-й, цёмная, глухая ноч – тэлефон. Я кіплю ад злосьці, але трубку бяру. «Здароў! Гэта Сяргей Казакоў зь Нігерыі! Я тут працую для Дзярждэпу. Раскажу пазьней што к чаму. А цяпер – гаспадар кватэры, дзе я жыву, індус, заўтра будзе ў Нью Ёрку. Ён зойдзе да цябе ў бібліятэку. Ты пазыч яму 1000 даляраў, я табе іх вярну, калі прыеду празь месяц у ЗША. Калі ласка, зрабі абавязкова! Бывай!»

Гутарка зь Сяргеем скончылася, але перадаць яе зьмест мне давялося і Зоры, бо ж і яна прачнулася! Усё было добра, пакуль я не дайшоў да той тысячы даляраў. Было крыху сваркі, але грошы індусу пазычылі, а Сяргей нам доўг аддаў ды завёў нас у дарагі рэстаран, зафундаваў нам дарагі абед.

рэпутацыю добрага мэнэджэра ў вялікай амэрыканскай тэлефоннай кампаніі, знаны ў беларускіх колах. Аднак з Васілём Мельяновічам Стэльмашонак хутка разышоўся – Васіль быў моцна антысавецкі.

Але з Стэльмашонкам Васілю Мельяновічу яшчэ давялося сустрэцца. У канцы 1980-х гадоў амэрыканцы арганізоўвалі ў Менску тэхнічную выстаўку, і Васіля Мельяновіча запрасілі працаваць на выстаўцы гідам. Праўда, калі арганізатары выстаўкі набіралі працаўнікоў, кандыдатаў добра адбіралі і экзамэнавалі. Галоўныя патрабаваньні былі амэрыканскае грамадзянства і веданьне беларускае мовы – гэтыя вымогі стаялі разам. Наступныя пытаньні пры падборы на працу былі – ці вы належалі да прафсаюзу, калі так – то да якога, бо ўдзел у некаторых левых прафсаюзах выключаў магчымасьць трапіць у склад амэрыканскіх замежных працаўнікоў. Іншыя пытаньні ў анкетах для атрыманьня працы гіда на амэрыканскай выстаўцы былі: ці ёсьць радня ў СССР, ці ўступалі ў кантакты з савецкімі грамадзянамі і падобныя. Кандыдатаў папераджалі: адказы на пытаньні будуць правярацца на паліграфе.

Васіль запоўніў анкеты апытаньняў, а тады прыходзіць да мяне ў бібліятэку і кажа: «Ведаеш, у мяне сёньня будзе экзамэн на паліграфе. Першае, што могуць спытаць – ці я меў тут дачыненьні з савецкімі людзьмі. Дык казаць пра Івана ці не?» – «Ясна, – кажу я. – Пра кантакты з Іванам раскажы абавязкова. Васіль, – падкрэсьліў я, – гэтага эпізоду ня ўтойвай. Ты зь ім цэлы год бавіў час!» І Васіль на паліграфе пра кантакты з Іванам Стэльмашонкам расказаў.

Далей было так. Васіль паехаў у Менск. Адчыняецца выстаўка, і каго ж бачыць Васіль у першай партыі наведнікаў – Івана Стэльмашонка! У цывільным, з двума людзьмі, цяпер я, кажа, генэрал, перадай прывет Кіпелю, як у цябе справы? Амэрыканцы, відаць, сачылі за сваімі праз камэры, бо мэнэджэр пасьля Васіля паклікаў да сябе і пытаецца: чаму ў цябе на гэтага чалавека была такая рэакцыя, што ў цябе нават голас пачаў дрыжэць? І ён расказвае, што сустрэў чалавека, які 15 гадоў перад тым быў у Нью-Ёрку і, мабыць, быў агентам КДБ, а тут і не хаваецца!

Пасьля Мельяновіч дзякаваў мне: добра, што ты мне падказаў пра яго расказаць на паліграфе!

Аб «шпіёнах» у бібліятэках

Як я зазначыў раней, Галівуд і прэса стварылі міт пра тое, што ў бібліятэках прызначаюць сустрэчы шпіёны. Ясна, у галівудзкіх фільмах так бывае, але ў рэальным жыцьці ў публічных бібліятэках – наўрад. Бясспрэчна, агенты выведак, інжынеры-тэхнікі палююць за новай інфармацыяй, часам у часапісах праз недагляд рэдактароў

трапляюцца матэрыялы, не прызначаныя для шырокай публікі, – але такія публікацыі даступныя абсалютна ўсім. Замаўляй, запоўніўшы квіток замовы, і праз 10-15 хвілін публікацыя ў тваіх руках. Праўда, у гэтай простай трансакцыі ёсьць вельмі важны пікантны момант: зьмест квітка замовы становіцца ўласнасьцю бібліятэкі і нікому ня можа быць раскрыты. У сярэдзіне 1940-х гадоў Амэрыканская бібліятэчная асацыяцыя прыняла пастанову, якая гарантуе «сакрэтнасьць» інтарэсаў чытача. Усе амэрыканскія публічныя бібліятэкі з гэткай фармулёўкай унутранага закону згадзіліся, а ў Нью-Ёркскай публічнай бібліятэкар нават можа страціць працу, калі некаму «збоку» пакажа квіток замовы.

Не пярэчу, сустрэчы, абмен інфармацыяй паміж чытачамі (і шпіёнамі!) – усё гэта можа адбывацца, і часта бібліятэкары (публіка пільная і назіральная) бачаць нейкіх «падазроных» чытачоў, а разгледзеўшыся, бачаць і тое, што нехта за некім або нечым сочыць. Але наагул такія сытуацыі бываюць вельмі рэдка. За чвэрць стагодзьдзя, што я адпрацаваў у публічным аддзеле, я толькі адзін раз «краем вока» бачыў, як нейкі чалавек (агент?) вельмі спрытна прыкаваў кайданкамі сваю левую руку да правае рукі чытача! Толькі раз. Абодва, злучаныя кайданкамі, вельмі ціха выйшлі з чытальні – прыпушчаю, што ніхто апрача мяне нічога й не заўважыў. Пазьней у друку было паведамленьне, што савецкага грамадзяніна, супрацоўніка ААН, выдварылі з ЗША за нелегальныя спробы здабыцьця інфармацыі.

Калі расходзіцца пра квіткі замоваў, то два разы нам у аддзел прыходзіў загад ад судзьдзі: паказаць нью-ёркскім дэтэктывам замовы за пэўную дату. Безумоўна, загад судзьдзі мы выканалі.

Выдвараліся з ЗША і беларускія дыпляматы, прыкладам Юры Орандж, але іх справа была зьвязаная не зь бібліятэкай а з канфліктам вакол паркоўкі машыны на вуліцы. У бібліятэцы прадстаўнікі Місіі БССР пры ААН захоўваліся на ўзроўні, хоць часта – асабліва функцыянэры з тытулам «сакратар» – зьнікалі: дамовяцца прыйсьці, каб пабачыць пэўную публікацыю, але так ніколі й ня зьявяцца.

Пасьля СССР

Сустракаўся я ў бібліятэцы зь землякамі і ў 1990-х гадох, калі «лопнуў» СССР – прыкладам, з Антонам Сабалеўскім, Тацянай Антонавай, Лідзіяй Савік, Вольгай Іпатавай, Леанідам Казырам, Віктарам Скарабагатавым (зь ім было асабліва памыснае пазьнейшае супрацоўніцтва – выдалі амаль усю спадчыну Міколы Равенскага) ды дзесяткамі іншых. Гэта былі працоўна-сяброўскія сустрэчы, найчасьцей – пачаткі трывалага знаёмства.

Мушу дадаць абавязкова і такую дэталь. У гадох, калі я частавата бываў у Менску ды знаёміўся там зь людзьмі з амэрыканскае амбасады – маімі «прыдбанымі» землякамі, дык аб будучых кантактах у ЗША дамаўляліся заўсёды сустрэцца «паміж ільвамі» – ля ўваходу ў бібліятэку на 5-м авэню. Толькі з амбасадарамі Козакам і Кролем я пасьля Беларусі сустракаўся ў Вашынгтоне.

Сям'я і будні

Дзеці на фарме

З працай у бібліятэцы амаль супадае жыцьцёвы этап нашага блізкага сямейнага бытаваньня: дзеці былі разам з намі, яшчэ ня выехалі ў коледж, нашы бацькі былі яшчэ жывыя – адных мы адведвалі, з другімі жылі. Добра памятная, даволі доўгая жыцьцёвая, энэргічная старонка.

Як я зазначаў, пасьля выезду з Балтымору нашай «базай» стала фарма, дзе жылі спадарства Савёнкі, Зорыны бацькі. Я шукаў працу, езьдзіў, але на ўікэнды варочаўся на фарму, дзе мы праводзілі час разам. На фарме мы ўсе дапамагалі колькі маглі ў сельскагаспадарчых працах: матыкавалі, палолі, палівалі. Унукі падносілі напіцца, перакусіць. А калі ўнукі падрасьлі, на іх адказнасьці быў дагляд за памідорамі, праполка агуркоў, буракоў, цыбулі. Часта езьдзілі лавіць рыбу, найчасьцей на рэчку Муліка, але езьдзілі і на марскую лоўлю.

Памятаю здарэньне. Калі дзеці былі яшчэ зусім маленькія, сядзелі ў загарадцы, сабака Ваўчок злавіў зайчанё і прынёс дзецям у загарадку.

Калі мы з Зорай выяжджалі, дзеці заставаліся зь дзядамі. Бабка Апалёнія – каталічка, заўсёды адведвала касьцёл, кілямэтры за 2-3, дык унукі хадзілі зь ёй. Часам іх падвозілі суседзі.

Грыбы, ягады, яблыкі, пэрсікі – усё было сваё, гадаванае на фарме.

Абсалютна можна сьцьвердзіць: дзяцінства дзяцей прайшло на прыродзе, на фарме зь дзядамі – Нёням (Лёням) і Бабкай.

Ўолінгтан

Але... дзяцінства праляцела... жыцьцё інакшала.

Перабраўшыся ў канцы 1958 году на поўнач штату Нью Джэрзі, мы пасяліліся ў мястэчку Ўолінгтан – мястэчка старое, непадалёк гораду Пасэйк, у XX стагодзьдзі амаль цалкам польскае, хоць кватэру мы знайшлі ва ўкраінцаў – «цёця гаспадыня» адразу да малых загаварыла па-ўкраінску. У гэтым мястэчку Алеся пайшла ў школу, а Юра – у дзіцячы садок. Калі мы бывалі занятыя, за дзецьмі даглядалі – прыходзілі бабка Марыя і дзед Яўхім, найбольш і найчасьцей, канешне, бабка. Так ад адных дзядоў унукі перайшлі да другіх, знаёмячыся ў міжчасе і з украінскай мовай ад «цёці гаспадыні».

У гэтым пэрыядзе ў нас пачынаецца вельмі трывалае ўваходжаньне ў жыцьцё нью-ёркаўскае беларускае грамады, шырэйшая грамадзка-палітычная дзейнасьць, а таксама занятасьць зь дзецьмі – ім аддаецца вялікая ўвага і ладна часу.

Беларуская суботняя школка

Мы сталі рэгулярнымі наведнікамі і парафіянамі праваслаўнай царквы Сьв. Кірылы Тураўскага на 401, Atlantic Avenue (прыход БАПЦ). Пры царкве была добрая беларуская суботняя школка, дзе настаўнікамі былі Натальля Орса, Зіна Станкевіч, Юрка Станкевіч, Міхась Тулейка, музыку выкладаў Алесь Каптуровіч. Мы, пачынаючы ад 1962 году кожную суботу і нядзелю вазілі туды дзяцей. У суботу ў іх было 3-4 лекцыі: выкладалася беларуская мова, песьні, танцы, а таксама рэлігія. Рэлігію выкладаў уладыка Васіль і Барыс Данілюк. Данілюк выкладаў рэлігію па-ангельску, і для дзяцей гэта было добра, таму што яны наведвалі беларускую школу, дзе яны вельмі цешыліся, гулялі, атмасфэра збліжала, але ў гэтай школе было нешта такое, аб чым яны маглі назаўтра сказаць у англамоўнай школе або дзіцячым садку. Так што такая камбінацыя была вельмі ўдалая. Гэтай школе мы сапраўды вельмі ўдзячныя, бо апрача навучаньня – у мяне недзе захоўваецца цэлая валізка тых сшытачкаў, якія пісалі Алеся і Юрка – была і шырокая дзейнасьць тэатральнага профілю, яны развучвалі розныя п'ескі, інсцэніроўкі. Часам як кляснае заданьне нават перакладалі амэрыканскія дзіцячыя п'ескі на беларускую мову. У нядзелю зь імі таксама былі карацейшыя заняткі, Данілюк даваў дзецям нешта з рэлігіі.

Вазіць дзяцей у школу і быць зь імі было важным абавязкам, мы выконвалі яго сьведама і ахвотна і заўсёды разам – усім разам было весялей! Цяпер, больш як праз 50 гадоў ад тае пары, як кажуць, з пэрспэктывы часу я магу з упэўненасьцю сказаць, што вельмі трывалы ўплыў на беларускасьць выхаваньня робіць беларуская грамада – школа, царква, арганізацыя. Падтрымку ў беларускасьці выхаваньня мы мелі якраз у царкве на 401 Atlantic Ave. у Брукліне. Гэтаксама мушу падкрэсьліць, што беларуская дапаможная школка ня зможа існаваць без падтрымкі і ўдзелу бацькоў. У нашай была ідэальная сытуацыя: спрыяльныя царкоўныя ўлады, асабліва Ўладыка Васіль, выдатны «ідэёвы» калектыў настаўнікаў, ладная грамада ахвярных бацькоў і добрыя дзеці – вучняў у школцы бывала і да паўсотні.

Беларускае выхаваньне дома

Дома на беларускае выхаваньне зьвярталася вялізарная ўвага, асаблівую ролю, як мы й разьлічвалі, тут адыгрывалі бабкі – бабка Апалёнія і бабка Марыя прымушалі дзяцей чытаць, пісаць, узбага-

чалі іх беларускі слоўнік – праводзілі зь імі цэлыя гадзіны. Бабкі патраплялі народжанаму ў англамоўным асяродзьдзі дзіцяці даваць беларускую адукацыю ненавязьліва, у дзяцей не было да гэтага адмоўнага стаўленьня. Але калі дзеці ўжо сталі падрастаць, яны ўлучыліся ў арганізацыю беларускай моладзі, якая ў той час – канец 1960-х – пачатак 1970-х гадоў – была вельмі дзейная. У арганізацыі моладзі дзейнічала танцавальная група «Васілёк» пад кіраўніцтвам Алы Орса-Рамана, моладзь езьдзіла на экскурсіі, зьбіралася, танцавала – і народныя танцы, і амэрыканскія патанцулькі, і гэта беларускіх дзяцей вельмі збліжала. Былі такія падзеі, як «караван» – яны некалькі гадоў запар езьдзілі ў Канаду. Мастацка-тэатральная дзейнасьць вельмі спрыяла і вывучэньню мовы.

На пачатку 1970-х гадоў, калі ўжо дзеці пайшлі ў коледж і ладзіліся этнічныя фэстывалі, дзеці з арганізацыі моладзі былі апорай і для нашай прапаганды ў амэрыканскім грамадзтве праз мастацтва, і ў справах арганізацыі фэстываляў.

Мы з Зорай мелі нядрэнную дзіцячую бібліятэку і час ад часу чыталі дзецям – ня толькі казкі, але і іншую літаратуру, я чытаў апавяданьні геаграфічнага профілю – але бацькоў яны так сур'ёзна не ўспрымалі, бабак паважалі як настаўніц значна больш.

Яшчэ ў сярэдняй школе, а пазьней у коледжах і Алеся і Юрка, як і ўсе дзеці беларускага паходжаньня, сустрэліся з праблемай, што пра Беларусь мала ведама, і яны інфармавалі сваё асяродзьдзе. Алеся яшчэ ў сярэдняй школе дапамагала школьнай танцавальнай групе развучыць беларускія танцы. Юра, калі быў у скаўтынгу і езьдзіў на джэмбары – міжнародныя ці амэрыканскія – стараўся паказаць нешта беларускае. У скаўтынгу ёсьць праграма – у дадатак да абавязковых патрабаваньняў можна рабіць яшчэ нешта дадатковае, напрыклад, здаваць іспыты на рэлігійныя адзнакі, бо наагул амэрыканскі скаўтынг «асьцярожна-рэлігійны». Юра, будучы праваслаўным, сказаў, што будзе здабываць адзнаку ў беларускай царкве. І ўладыка Васіль, і асабліва айцец Карп Стар доўгі час зь ім займаліся, праўда айцу Карпу трэба было дапамагаць у ангельскай мове і тлумачыць, якія веды мае атрымаць скаўт. Праз паўтара года Юрка тую адзнаку атрымаў і заўсёды тлумачыў, што атрымаў яе ў беларускай царкве.

Падарожжы зь дзецьмі

Як сям'я мы былі актыўныя ня толькі ў сваіх беларускай і амэрыканскай грамадах. Мы шмат езьдзілі. Падарожжы ў нашым жыцьці заўсёды мелі важнае значаньне. Перш-наперш, калі я пераканаўся, што няма кніжак пра беларусаў ЗША, то падумаў, што езьдзячы па Амэрыцы можна шмат чаго назьбіраць – наведаць бібліятэкі, архівы. Зора пачала плянаваць паездкі зь дзецьмі па Амэрыцы вельмі рана.

Мы паставілі сабе за мэту наведаць кожны штат, там – калі ёсьць – нацыянальныя паркі. На месцах мы праглядалі тэлефонныя кнігі, шукаючы, ці ёсьць там установы, у якіх можна было б знайсьці беларускую прысутнасьць. Гэтыя нашы паездкі пачаліся ў 60-х гадох, езьдзілі мы летам, маршрут плянаваўся загадзя. І шмат дзе сапраўды нейкая беларусіка сустракалася. Прыкладам, у штаце Мантана ў горадзе Гэлэн у сэрбскай праваслаўнай царкве знайшлася ікона Эўфрасіньні Полацкай. У Алясцы ў праваслаўным манастыры нават атрымлівалі часапіс «Голас Царквы».

Сямейныя падарожжы Зора разглядала як важны выхаваўчы момант. Па-першае, яна зь дзецьмі гэтыя паездкі рыхтавала – гаварылі па-беларуску, дыскутавалі, гэта збліжала зь дзецьмі. А тады чатыры тыдні – працоўная сыстэма ў бібліятэцы была досыць лібэральная, адпачынкі былі даўгія – мы праводзілі разам зь дзецьмі, гэта ім шмат чаго давала.

У ЗША мы зьведалі ўсе штаты й нацыянальныя паркі. Некаторую інфармацыю з падарожжаў я выкарыстаў для кнігі «Беларусы ў ЗША» (1993). У падарожжах і дзеці давалі нам ладна ведаў пра краіну: помнікі, бітвы, асобы. «Узамен» я часта даваў дзецям лекцыі пра карст і карставыя зьявы, калі мы езьдзілі па Флорыдзе, або тлумачыў, якая розьніца паміж базальтам і гранітам, калі мы былі ў штаце Орэган ці Мэйн. Такі ўзаемны абмен нас вельмі збліжаў.

Захаваньне беларускасьці

Ці чыталі нашы дзеці кнігі па-беларуску? У раньнім дзяцінстве, калі змушалі бабкі – так, але пазьней – ня думаю. Кніжкі беларускія яны мелі, але працэс чытаньня пачынаецца вельмі рана, гэта працяглы працэс, і трэба ўжо добра налаўчыцца ў ім, каб пазьней чытаць таўсьцейшыя кнігі.

Я прыпушчаю, што Алеся, калі яна займалася ва ўнівэрсытэце – яна скончыла Прынстан, і там яна брала расейскую мову – магла чытаць і беларускія матэрыялы. Дарэчы, пры паступленьні ў Прынстанскі ўнівэрсытэт яна сказала, што валодае беларускай мовай, і гэта ёй было плюсам. І пасьля, калі пісала тэзу пра дапамаговую арганізацыю АРА, яна шукала дакумэнты, якія да таго часу не былі ведамыя, і пазнаходзіла дакумэнты, якія датычаць Беларусі.

Юра беларускія кнігі пераглядае, часам нават дыскутуем зь ім аб зьмесьце.

Дзеці безумоўна ў асноўным гадаваліся ў амэрыканскім асяродзьдзі, але яны знаёмыя зь беларускім грамадзкім жыцьцём, арыентуюцца ў нашых падзелах на эміграцыі ды ставяцца да гэтага досыць холадна, бо лічаць сябе амэрыканцамі беларускага паходжаньня, для якіх беларускі палітычны падзел не такі важны.

Ясна, яны падтрымоўваюць беларускую незалежнасьць, беларускую дзяржаўнасьць, але партыйны падзел беларусаў у Амэрыцы мае для іх малое значаньне.

Беларускасьць да іх прыходзіла з розных бакоў, у тым ліку праз царкву і праз касьцёл. Бабка Апалёнія была каталічка, дзеці часта былі ў яе на фарме ў Памоне. Яна хадзіла ў касьцёл два разы на тыдзень, часта зь ёй хадзілі і дзеці, якія ўрэшце былі «двухканфэсійныя», бо бабка Апалонія мела на іх вялікі ўплыў, вучыла іх казаць малітвы па-беларуску. Прыпушчаю, што і з гэтай бабчынай навукі ў дзяцей ладна засталося.

У канцы 1980-х Алеся і Юрка езьдзілі ў Беларусь з танцавальным гуртком. І пасьля таго Алеся езьдзіла некалькі разоў – і ў Лужкі на Глыбоччыне, адкуль паходзяць Савёнкі, і на Глушчыну, адкуль паходзяць Кіпелі – і нядрэнна там чулася. Я быў зьдзіўлены, калі прачытаў у «Запісах» інтэрвію, якое рабіла зь ёй Алеся Сёмуха ў рамках рубрыкі «Дзеці эмігрантаў», дзе Алеся кажа, што зь людзьмі зь Беларусі ў яе кантакты заўсёды былі добрыя, але што яна зь некім пасябруе і што будзе мець найлепшых сяброваk зь Беларусі – гэтага яна й сама не чакала.

Унукі. Лучнасьць зь Беларусьсю

Ціраз я зазначаў, што выхавальны працэс дзяцей быў больш у Зорыных руках, чым у маіх. Я стараўся дапамагаць у іх беларускім выхаваньні, але дапілноўвала гэта Зора. Тым ня менш я поўнасьцю задаволены, бо ўнукі – тры Юркавы сыны, хоць гавораць па-ангельску, а па-беларуску разумеюць, па духу яны адчуваюць у сабе прысутнасьць беларускасьці. Я лічу, што гэта зусім нармальна – у дыяспары трэба, каб людзі былі зь беларускім духам. Добра, калі яны ведаюць або разумеюць мову, але яны маюць у першую чаргу дачыненьне зь іншым сьветам, і ў тым іншым сьвеце трэба пашыраць беларускасьць. І яна з большым посьпехам будзе пашырацца празь людзей, народжаных у Амэрыцы. Так што тут маё сумленьне цалкам спакойнае – мы з Зорай выканалі свой абавязак выхаваньня дзяцей у беларускім духу.

Характэрная зьява – калі ўнукі бачаць новую кніжку, дзе згадваецца Беларусь, яны заўсёды стараюцца яе купіць і даць мне, хоць я не магу сказаць, што прадаўжаю зьбіраць кніжкі – але яны адчуваюць абавязак падтрымаць беларускасьць, купляючы кніжку або паштоўку. Амаль заўсёды пры гэтым яны й самі пераглядаюць новую кнігу.

І Алеся і Юрка маюць сталую лучнасьць з роднымі ў Беларусі. Юрка – больш карэспандэнцыйна, шле паштоўкі трэцяму пакаленьню сваёй радні, а Алеся мае лучнасьць з нашчадкамі Кіпеляў і Раткевічаў у Беларусі праз электронную пошту. Яны актыўна падтрымоўваюць

беларускія выдавецкія праекты, харытатыўныя арганізацыі – гэта, я лічу, абавязак новага пакаленьня дыяспары, народжанага ўжо паза Беларусьсю.

І дзеці, і нявестка Лёрэйн (італьянска-ірляндзкага паходжаньня) належаць да БАЗА, да беларускай царквы – парафія Божай Маці Жыровіцкай (БАПЦ) у Гайлэнд Парку і Сьв. Кірылы Тураўскага (БАПЦ) у Нью Ёрку.

Дзеці вырасьлі амэрыканцамі і беларусамі

Аглядаючыся на жыцьцёвы шлях ды ўводзячы ў фокус гады сталеньня дзяцей, магу сказаць, што я задаволены. Дзеці вырасьлі, сталіся і амэрыканцамі, і беларусамі – сьмела можна пісаць праз злучок: амэрыканска-беларускія, двухмоўныя. Бясспрэчна, сям'я была асноўным элемэнтам у выхаваньні, але мелі значаньне і беларускія арганізацыі, і школка, і сямейнае сяброўства. Мы ж, бацькі, імкнуліся спалучыць у выхаваньні і беларускасьць, і амэрыканскасьць, бо ўсё ж Амэрыка – краіна іх нараджэньня. За сямейным сталом – пераважна за вячэрай ці за нядзельным сьнеданьнем – мы гаварылі пра справы і амэрыканскія, і беларускія. Часта, калі з намі бывалі бабкі Марыя і Апалёнія, мы «разьбіралі» зь імі школьныя заняткі – дзеці вычарпальна прадстаўлялі нам свае школьныя будні, пазашкольную дзейнасьць, а мы з бабкамі аналізавалі і прыпаміналі «старыя часы». Такія дыскусіі былі захапляльныя і павучальныя. Магчыма, наша сямейная атмасфэра была крышку больш інтэлектуальная, чым у суседзяў, але я ўпэўнены, што дзеці нейкай іншасьці не адчувалі апрача адрозьненьня ў краіне паходжаньня бацькоў і дзядоў. Кругом нас суседзі мелі карані ў Італіі, Нямеччыне, Ізраілі, Бэльгіі, Францыі, Пуэрта-Рыка.

Дзеці былі вельмі актыўныя ў школе і добра вучыліся. Закончылі ўнівэрсытэты: Алеся – адвакат, Юра – доктар мэдыцыны. Прызнаюся: і на бібліятэчнай зарплаце мы за вышэйшую адукацыю дзяцей усё сплацілі гатоўкай – пазыкаў ня бралі. Унівэрсытэцкая навука дзяцей каштавала каля $200,000, і гэта ў 1970-х гадох.

Але ж бацькі ёсьць бацькі! Вялікае хваляваньне было, калі дзеці атрымалі правы кіроўцы і першы раз безь ніякага нагляду Алеся паехала зь сяброўкамі ў Пэнсыльванію, а Юра недзе «раскатваў» па горадзе. Мы купілі ім кожнаму машыну, калі яны скончылі сярэднюю школу.

Праўда, адзін выпадак зь Юрам памятаецца. Аднойчы летам Юра і ягоны найбліжэйшы сябар Бары Грын (цяпер – хірург у штаце Мэрылэнд) захацелі адведаць Вашынгтон. Ну мы, ясна, ідэю падтрымалі – едзьце, вось вам пару капеек на музэі. «А між іншага, – пытаюся я, – сёньня пятніца, ці замовілі вы білеты?» – «Мы едзем заўтра, але ня

едзем, а ляцім». – «Як ляцім?» – пытаецца Зора. Адказ: «А так ляцім – нанялі малы самалёт, Бары кіруе, я буду дапамагаць». У нас з Зорай духі заняло – нанялі малы самалёт, каб зьлётаць у Вашынгтон! Але охаць і ахаць было позна. Ноччу мы заснуць не маглі, а назаўтра ў нас была працоўная субота. Папрасілі хлопцаў – адразу ж патэлефанаваць, калі прыляцяць. Працуем мы ў суботу і кожную гадзіну камунікуемся з Зорай – ці пазванілі? Не. 12-я гадзіна, 1-я, 2-я, і раптам а 3-й тэлефон: «Мы ў Пэнсыльваніі». Калі прыляцелі пад Вашынгтон, не патрапілі ляцець паводле пляну, а зьбіліся з курсу, і іх вайсковыя самалёты, якія імгненна апынуліся побач, пад канвоем даставілі ў Пэнсыльванію. Цяпер іх правяраюць, і будзе штраф. Добра, што так абышлося. Мы з Зорай далей ужо й ня слухалі і былі шчасьлівыя.

Сямейнае сяброўства

У значнай меры на выхаваньне дзяцей мелі ўплыў і сямейныя сувязі. Сямейнае сяброўства, таварыскія сустрэчы – усё гэта ў нас было, і дзеці былі часткай гэтага жыцьця. Не скажу, каб мы вялі «замкнёны» лад жыцьця. Колькасьць людзей, якія ў нас бывалі, днявалі, начавалі, налічвае сотні. На прыняцьці з нагоды 1-га беларускага этнічнага фэстывалю ў нас у хаце было каля 120 асобаў! Але захоўвалі мы ў сям'і і прыватнасьць.

Ясна, былі вельмі блізкія сямейныя сябры, зь якімі мы дзяліліся праблемамі «жыцейскага мора», прыкладам, доктар Ян Запруднік і ягоная сям'я. Блізкія былі Алюньця (доктар Ала Орса-Рамана), Юля Андрусышына, Надзя Кудасава. Старэйшымі аўтарытэтамі для сям'і былі Антон Адамовіч, Антон Шукелойць, доктар Вітаўт Тумаш, аўтарытэт і блізкая асоба – Лідзія Рыгораўна Янушкевіч, дзядзя Ваня Нядзьвіга. Перанятая ад бацькоў блізкасьць была зь сям'ёй Сымона Жамойды. Можа я каго й не пералічыў – забываюцца асобы, прозьвішчы!

Хачу падкрэсьліць адно: сямейнае сяброўства ўлучала поўнасьцю і дзяцей, хоць на сустрэчах дзеці «змываліся» ад стала раней, у іх заўсёды былі свае пільныя справы.

Штодзённае амэрыканскае жыццё

Удзел у амэрыканскім жыцьці – гэта былі і штодзённыя дачыненьні з суседзямі, праблемы гарадзкога жыцьця, кантакты ў вольны час, а таксама ўдзел у дзейнасьці такіх арганізацыяў, як PTA (Parent-Teacher Association, Супольнасьць бацькоў і сяброў школы), Boy Scouts of America і падобных.

Прыкладам, скаўцкую арганізацыю спансаравала прэсьвітэрыянская царква, найбольшая ў горадзе Радэрфордзе, дзе я пражываў. Гэта значыла, што скаўцкі пакой, скаўцкія зборкі былі ў царкоўных будынках, і трэба было дамаўляцца, пілнавацца правілаў, мець дачыненьне з адміністрацыяй царквы. Цікавы такі факт: я належаў да скаўцкага руху ў горадзе каля 10 гадоў і ўвесь час меў справы з царкоўнікамі. У пэўным часе мне запрапанавалі далучыцца, стаць парафіянінам гэтае прэсьвітэрыянскае царквы, але я адмовіўся, матывуючы тым, што належу да царквы беларускай.

Суседзі, вуліца

Былі мы ў вельмі блізкіх кантактах і з амэрыканцамі – знаёмымі, суседзямі, калегамі з працы – вялі, як кажуць амэрыканцы, social life. Адзначэньне дзён народзінаў дзяцей «у сябе на раёне», хаджэньне адных да адных «на каву», хрэсьбіны, бар-міцвы, пікнікі – усё гэта было. (Прынагодна суседям расказвалі і пра Беларусь.)

Зь некаторымі калегамі з працы мы сябравалі блізу 40 гадоў, напрыклад з Катэрынай Балерыні – мы яе і пахавалі.

І з гэтай амэрыканскай «дзялянкі» жыцьця ёсьць парачка памятных мамэнтаў.

Аднае восені, недзе ў канцы кастрычніка, я зграбаю з майго двара апалае лісьцё, а дрэваў каля нашае хаты было каля 30, выграбаю лісьцё на вуліцу, бо празь дзень-два па вуліцы будзе праяжджаць спэцыяльны грузавік, які праз пнэўматычную трубу ўцягвае лісьцё ў вялізарны кузаў і прэсуе яго. Я грабу з аднаго боку вуліцы, а з другога боку, якраз насупраць мае хаты, жыў мэр гораду Біл Брукс – і ён таксама зграбае лісьцё на вуліцу. Мы з мэрам добра сябравалі, мэр была ягоная бясплатная пасада, а грошы Брукс зарабляў працуючы прафэсарам літаратуры ў коледжы. Мы часта зь ім гутарылі, а калі выяжджалі ўсёй сям'ёй на канікулы, Біл Брукс часам заходзіў да

маёй маці – Марыі Кіпель – спытацца, як яна маецца. Былі добрыя суседскія адносіны. І вось, зграбаючы лісьцё, Біл махае мне рукой – «хадзі сюды». Я, зразумела, падышоў – перайшоў праз вуліцу, і Біл ціхенька мне кажа: «Вітаўт, каб ты ведаў, на наступным тыдні я зракаюся пасады мэра – у мяне не хапае часу». Я сумеўся: сам Біл Брукс кажа мне, што зьбіраецца зрабіць! І праўда – на наступным тыдні Біл Брукс адмовіўся ад свайго «мэрства» і аддаўся поўнасьцю прафэсарскай кар'еры.

Іншы сусед – усе, і я, звалі яго Mr. Barbieri – аднойчы мне кажа, сустрэўшы на вуліцы: «Вітаўт, на адным пікніку ты казаў, што паходзіш зь Беларусі. Я ведаю цяпер больш пра Беларусь, бо атрымаў працу хіміка на прадпрыемстве, дзе вырабляюць лакі, а наша галоўная кватэра – у горадзе Саўт Рывэр,там жыве шмат беларусаў, і я бачыў там беларускую царкву».

Бліжэйшыя кантакты з суседзямі наладжваліся таксама на аўтобусных прыпынках, калі раніцай трэба было чакаць аўтобус. На працу Зора і я езьдзілі амаль заўсёды аўтобусам, хоць можна было і цягніком. Аўтобусам было выгадней і бліжэй ісьці ад прыпынку да хаты і да працы. Звычайна на прыпынках людзі добра ведалі адны адных, ведалі і пра сем'і, бо дзеці кантактавалі між сабой.

Недзе напрыканцы 1970-х на нашым аўтобусным прыпынку пачаў зьяўляцца новы чалавек – індус. Гэты індус, Кумэш Кайзэр, прадстаўляўся ўсім, хто стаяў і чакаў, і хацеў нешта даведацца пра ўсіх. Знаёмячыся са мной, ён заўважыў мой акцэнт і спытаўся, зь якіх я каранёў і адкуль паходжу. Ня хочучы надта «раззнаёмлівацца», я сказаў: «З Усходняе Эўропы». А спадар Кайзэр мне ў адказ: «Усходнюю Эўропу я ведаю!» – «Ах, ведаеш? Дык я зь Беларусі – чуў?» І тут спадар Кайзэр мяне дабіў: «А я ў Беларусі два месяцы працаваў – у Магілёве! Чуў пра такі горад?» Незвычайная і надзвычайная сытуацыя. Кажу яму: давай сядзем разам у аўтобусе, і ён мне распавёў.

Ён – інжынэр-тэкстыльшчык. Працуе для ўрадавай установы Індыі. Адпрацаваў год у СССР, зь іх два месяцы ў Магілёве, а цяпер на годдва прыехаў ад той самай установы ў ЗША, часова жыве ў Радэрфордзе. Вядомая справа: мы паціснулі адзін аднаму рукі – пасябравалі і былі ў блізкім кантакце, пакуль спадар Кайзэр не пакінуў ЗША.

Скажу так: у штодзённым жыцьці мы зь сяроднім амэрыканцам зжыліся і бадай нічым ад яго навонкі не адрозьніваліся. Аднак пра краіну свайго паходжаньня амэрыканцы першага пакаленьня гаварылі, дбалі, прапагандавалі яе больш, чым той «сярэдні амэрыканец» – другога ці трэцяга пакаленьняў. Мы пра сваю краіну гаварылі бесьперастанку, дапамагалі ў гэтым дзеці і бабкі – у Радэрфордзе ўся вуліца ведала, што Mrs. Kipel або Mrs. Maria (а ўсе дзеці звалі яе «бабка») была настаўніцай у краіне, якая звалася Беларусь.

БІНіМ

Пра БІНіМ я пачуў яшчэ ў Эўропе

Будучы ў сярэдзіне 1950-х гадоў студэнтам у Лювэне, я рэгулярна сачыў за беларускім жыццём на эміграцыі – пераважна праз газэты «Бацькаўшчына», «Беларускае Слова» ды часапісы «Божым Шляхам» і «Аб'еднаньне» – аднак ня так лёгка было арыентавацца ў хадзе грамадзкага жыцьця ў ЗША. Арганізацыйная мітусьня стварала непрыемнае ўражаньне: на наш студэнцкі розум – ствараласа зашмат арганізацыяў. Але тым ня менш мы заўважылі, што ў ЗША быў створаны Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва (БІНіМ). БІНіМ стаў для нас рэальнасьцю, калі мы – студэнцкае згуртаваньне – сталі атрымваць часапіс «Запісы» – орган БІНіМу. Прыпамінаю, што з павагай чыталіся артыкулы Льва Акіншэвіча, Іны Рытар, Міколы Панькова, асабліва запамятаўся нэкралёг пра кампазытара Міколы Равенскага – «нашага» Равенскага! Ясная справа, нам, студэнтам, было прыемна ўсьведамляць, што на эміграцыі дзеіць беларуская навукова-дасьледчая арганізацыя, але мы таксама разумелі, што такія ўстановы, як мюнхэнскі Інстытут Вывучэньня СССР, былі на той час аўтарытэтамі ў дасьледаваньні Ўсходняе Эўропы. І вось зь зьяўленьнем БІНіМу мы прыходзілі да пагляду, што і беларускія навуковыя згуртаваньні будуць мець аўтарытэт. Мы верылі, што беларускія дасьледаваньні будуць адбывацца ў беларускіх арганізацыях.

Першы кантакт зь БІНіМам

Празь некалькі месяцаў пасьля прыезду ў Амэрыку мы з Зорай атрымалі запрашэньне на зборку БІНіМу, і з таго часу пачаўся кантакт з Інстытутам. Гэта адбылося ў канцы чэрвеня 1956 году: на зборцы Іпаліт Паланевіч чытаў даклад, прысьвечаны працы Інстытуту Беларускай Культуры ў Менску ў 1920-х гадох. Паланевіч рыхтаваў манаграфію пра Інбелкульт для мюнхенскага Інстытуту па вывучэньні Савецкага Саюзу і шмат матэрыялаў па сваёй працы дыскутаваў у БІНіМе. Паседжаньне праходзіла на дантаўне ў Мангэтэне, у раёне Delancey Street, дзе месьцілася «Беларуская хатка». Было прысутных чалавек сорак, была і ілюстрацыйная праграма, праца была прадстаўленая на добрым узроўні. У канцы быў зачытаны расклад

далейшых дакладаў БІНіМу. Наступны, наколькі мне прыпамінаецца, плянаваўся даклад Антона Адамовіча пра «Ўзвышша», на жаль, на дакладзе Адамовіча быць не давялося.

На першай зборцы я й Зора запоўнілі анкеты для ўступленьня ў БІНіМ – былі спэцыяльныя фармуляры, і пасьля на паседжаньні ўправы кіраўнікі разглядалі пытаньне аб прыёме. Ва ўправе тады былі В. Тумаш, Н. Арсеньнева, А. Адамовіч, М. Гарошка і, здаецца, Я. Ліманоўскі і М. Кунцэвіч.

Доктар Тумаш пазьней расказаў нам пра заснаваньне БІНіМу наступнае. Інстытут пад назвай Whiteruthenian Institute – Byelorussian Institute быў афіцыйна зарэгістраваны адвакацкай канторай Kupchin у горадзе Олбані (сталіца штату Нью Ёрк) у 1951 годзе як амэрыканска-беларуская арганізацыя, якая займаецца дасьледаваньнем тэмы Беларусі ў розных аспэктах, пераважна ў тых, якія не дасьледуюцца або фальшуюцца ў БССР: гісторыя, рэлігія, грамадазнаўства. БІНіМ таксама дасьледуе гісторыю пасяленьня беларусаў у ЗША, супрацоўнічае з амэрыканскімі навуковымі і навучальнымі ўстановамі ды дапамагае матэрыяламі па беларусістыцы амэрыканскім унівэрсытэтам. БІНіМ мае сваю бібліятэку і друкаваны орган «Запісы». Да таго ж БІНіМ вядзе бібліяграфічны ўлік амэрыканскай і заходнеэўрапейскай беларусістыкі.

На наступнай зборцы, на якой мы былі прысутныя – перад верасьнем 1956 году – быў даклад Уладзімера Сядуры-Глыбіннага пра лёс некаторых літаратараў у БССР, ён добра арыентаваўся і валодаў прадметам, але найбольш нам з Зорай спадабаўся ілюстрацыйны аспэкт дакладу – на сьценах віселі 15-20 партрэтаў літаратараў, зьнішчаных савецкай сыстэмай.

Праз пару месяцаў Тумаш паведаміў нам у Балтымор, што будзе арганізацыйная зборка БІНіМу, і папрасіў нас прыехаць. Мы прыехалі, і мяне выбралі ва ўправу БІНіМу звычайным сябрам.

Так пачалося цясьнейшае супрацоўніцтва. Калі мы жылі ў Балтыморы, супрацоўніцтва зь БІНіМам было фрагмэнтарнае. Мы прыяжджалі, часам траплялі на даклад, а калі не траплялі, то сустракаліся з Тумашам і Адамовічам, і яны інфармавалі, што робіцца ў Інстытуце. Быў кантакт, але, я сказаў бы, павярхоўны.

Дзейнасьць ва ўправе БІНіМу

Актыўнае супрацоўніцтва зь БІНіМам пачалося, калі мы напрыканцы 1958 году пераехалі бліжэй да Нью-Ёрку. Будучы ва ўправе БІНіМу, я паставіў пытаньне, ці мае Інстытут сувязь з аналягічнымі ўстановамі іншых нацыянальнасьцяў. І доктар Тумаш мне паведаміў, што яны блізка супрацоўнічаюць з украінцамі, з палякамі, бываюць частымі гасьцямі ў славацкай навуковай установе. Аднак кантактаў

з дасьледніцкімі арганізацыямі агульнаамэрыканскага профілю не было. Я асабліва хацеў даведацца, ці ёсьць кантакт з арганізацыяй, якую амэрыканцы называюць «triple A, double S» (AAASS, American Association for the Advancement of Slavic Studies) – Амэрыканскай асацыяцыяй дасьледаваньня славянаведы, бо будучы ў Балтыморы я навязаў кантакты: мы з Зорай сталі членамі арганізацыі. (Ва ўнівэрсытэце Джонса Гопкінса была добрая праграма вывучэньня Савецкага Саюзу ў шмат якіх галінах – эканоміка, палітыка, культура, пры ўнівэрсытэце быў дзейны аддзел AAASS, мы бывалі на зборках.) Я запрапанаваў, каб усе сябры БІНіМу ўвайшлі ў тую арганізацыю. Ці яны гэта зрабілі – ня ведаю, але доктар Тумаш у AAASS уступіў.

У тым самым прыблізна часе ў Амэрыку прыехаў Янка Запруднік і таксама пачаў прыходзіць на зборкі БІНіМу. Мы разам зь ім выказалі пагляд, што добра было б, каб на зборках выступалі ня толькі «добраахвотнікі», а каб можна было замовіць даклад на такую ці такую тэму дакладчыку-госьцю. Рэч у тым, што БІНіМаўская праграма выглядала «перагружаная» адной асобай – прыкладам, Францішак Кушаль меў 10-15 дакладаў пра вайсковасьць або пра войны ВКЛ, і магло здацца, што тэматыка дакладаў звужаецца. Тумаш згадзіўся на нашую прапанову, мы запрасілі выступіць амэрыканскага моваведа Г. Сянькевіча, яўрэйскага дасьледніка С. Бэрнштэйна (яўрэй зь Вільні, аўтар колькіх кніжак пра мястэчкі Заходняй Беларусі), польскага навукоўца Р. Ляванскага, прачыталі пару дакладаў украінскія дасьледнікі, выступіла беларуска З. Юр'ева, пазьнейшы рэдактар Russian Review, якая пісала пра Сяднёва. Так Інстытут паступова пачаў пашыраць сваю дзейнасьць на іншых навукоўцаў, і дзейнасьць гэтая была карысная, водгукі на яе былі пазытыўныя.

На гадавым сходзе БІНіМу ў 1966 годзе мяне абралі скарбнікам, хоць я гэтай функцыі ня надта й хацеў. Справа ў тым, што трэба было наладжваць выданьне «Запісаў», выхад якіх кульгаў, і кніжнай прадукцыі, якая замерла. Мы сталі весьці перамовы зь Мюнхенам – бо Стась Станкевіч, які быў сябрам БІНіМу, выехаў у Мюнхен і працаваў там – каб яны, можа, нам падкінулі грошай, бо там было больш актыўных сяброў. Стась Станкевіч запрапанаваў заснаваць у Нямеччыне філіял Інстытуту. Так яно і сталася, філіял пераняў ад нас выданьне «Запісаў». Пачынаючы ад 1962 году, пяць нумароў «Запісаў» выйшлі ў Мюнхене. Мы пераглядалі матэрыялы ў Нью-Ёрку, але апошняя стадыя рэдагаваньня і друк былі ўжо ў руках Станкевіча. Філіял БІНіМу ў Нямеччыне ніколі ня стаўся незалежным, але супрацоўніцтва было вельмі карыснае. Апрача Станкевіча працавалі Кабыш, Яловіч, Марговіч, Чайкоўскі, Урбан. Дапамога ў выданьні «Запісаў» у Нямеччыне дазволіла БІНіМу ў ЗША палепшыць фінансавае становішча.

Упарадкаваньне членства

У Амэрыцы ў БІНіМе ў першую чаргу я ўзяўся ўпарадкаваць членства ў Інстытуце і сяброўскія складкі. Я перагледзеў крытычна картатэку сяброў БІНіМу. Тых, хто запоўніў анкеты, было чалавек 85. Разаслалі для запаўненьня 150 анкет. Некаторыя даслалі лісты, што ня хочуць запаўняць анкеты – бо баяліся анкет – але будуць належаць і дасылаць складкі.

Паколькі ў БІНіМе ў той час было каля сотні членаў, а складкі (здаецца, $30 гадавых) не зьбіраліся – я правёў інтэнсіўную кампанію збору недаплачаных складак, а прынагодна ў сотнях лістоў прасіў, каб людзі рабілі фінансавыя ахвяраваньні на інстытут. Галоўная матывацыя была: БІНіМ павінен больш друкаваць, а на друк патрэбныя грошы. І трэба сказаць, што людзі адгукнуліся – праз год-два ў касе БІНіМу налічвалася некалькі тысячаў даляраў. Можна было думаць пра сталую выдавецкую праграму.

З больш актыўных, якія адгукнуліся, быў, прыкладам, Аляксандар Ружанцоў, які хоць і быў зь літоўцамі, але запоўніў анкету, упарадкаваў складкі і сказаў, што мы можам поўнасьцю разьлічваць на яго супрацу. Ён быў вельмі дзейны чалавек – кіраваў Літоўскай бібліяграфічнай службай, выдаваў месячны бюлетэнь, супрацоўнічаў у Літоўскай энцыкляпэдыі. Вельмі актыўна далучыўся да працы БІНіМу Аўген Вярбіцкі, фінансавую дапамогу прыслалі Леў Акіншэвіч, Францішак Кушаль, Часлаў Ханяўка, Віктар Войтанка, Язэп Малецкі і шмат іншых.

Упарадкаваўшы сяброўства, складкі і фінансы БІНіМу, мы пачалі думаць аб плянавым выданьні дасьледчага матэрыялу. Управа БІНіМу была ў Нью-Ёрку, яе складалі Тумаш, Адамовіч, Кіпель, Запруднік, Шукелойць, Гарошка. Апрача Гарошкі нас пяцёра сустракаліся амаль кожны тыдзень – пераважна ў бібліятэцы, куды прыходзіў працаваць Тумаш. У сярэдзіне 1960-х пасьля заканчэньня бібліятэчнага факультэту да нас далучылася Зора. Часта сустракаліся мы і ў памешканьні Радыё Свабода, якое разьмяшчалася ў той час на 42-й вуліцы, непадалёк ад бібліятэкі. Гэта было вельмі цеснае супрацоўніцтва. Сябры БІНіМу – Паланевіч, Міцкевіч, Гуткоўскі, Кушаль – таксама часта заходзілі ў бібліятэку. З «пэрыфэрыяй» мы пераважна ліставаліся. Карэспандэнцыя ішла пераважна на адрас доктара Тумаша.

Пляны наладжаньня кнігавыдавецтва

Напрыканцы 1960-х – пачатку 1970-х гадоў дзейнасьць БІНіМу ішла амаль у «плянавым парадку»: адбываліся месячныя зборкі, распрацоўваліся новыя тэмы для дакладаў, пачалася дыскусія вакол тэмы «Беларусы ў ЗША». Ад 12-га выпуску «Запісы» зноў «перабраліся»

ў Нью Ёрк, фінансавае становішча паляпшалася за кошт рэгулярна зьбіраных складак і продажу кніжак. У вузейшым коле – я, Зора, Ян Запруднік і доктар Тумаш – падумоўвалі пачаць друк рэгулярнай кніжнай прадукцыі – мастацкай літаратуры, бо пісьменьнікаў і паэтаў, якія супрацоўнічалі зь БІНіМам, было парадачна.

Відавочна, той, хто сочыць за беларускім кнігавыдавецтвам на эміграцыі, мог бачыць, што БІНіМ і раней, у 1950-х гадох, удзельнічаў разам з выдавецтвам «Бацькаўшчыны» ў Мюнхене ў выданьні шмат якіх мастацкіх твораў, забароненых саветамі, ды выдаў таксама зборнік Купалавых твораў «Спадчына» (1955), падрыхтаваны Тумашам і Станкевічам. З арыгінальных працаў вылі выдадзеныя «Беларуская музыка» Міколы Куліковіча (1953), «Міцькевіч і беларуская плынь польскай літаратуры» Сымона Брагі (1957), праца А. Багровіча аб жыхарстве БССР паводле перапісу 1959 году (1962).

Аднак БІНіМаўскае кнігавыдавецтва не было сыстэматычнае. Асноўная прычына «нерашучасьці» ў наладжаньні цяглага кнігавыдавецтва была ў недастатковасьці фінансавай базы. Над гэтай праблемай я доўга разважаў, пераглядаючы сьпісы сяброў ды прыхільнікаў БІНіМу. Нарэшце я (ясна, з падтрымкай Зоры і Яна Запрудніка) вырашыў, што калі ўзяцца за фінансы сыстэматычна, то мы з гэтай праблемай справімся! На паседжаньні ўправы БІНіМу мы вырашылі, што грошы з банкаўскага конта БІНіМу, якое я адчыніў у 1966 годзе, будуць здымацца толькі на патрэбы кнігадруку, а ўсе іншыя фінансавыя патрэбы будуць залагоджвацца зь бягучых прыходаў гатоўкай.

Варта дадаць, што нам час ад часу дапамагала і Фундацыя Крачэўскага, яны мелі фінансавыя сродкі, невялікія, але нейкіх паўсотні тысяч даляраў у іх было. У 1960-х гадох Тумаш, будучы адначасна і сябрам Фундацыі Крачэўскага, і сябрам управы БІНіМу, запрапанаваў прадаць дамы ў Кўінсе, якія фундацыя набыла ў 1963 годзе, і купіць дом на Мангэтэне, які быў бы поўнасьцю пад адміністрацыяй БІНіМу. Але цэны ў той час былі ўжо не на нашу карысьць. Нават калі б мы прадалі ўсе тыя дамы, што фундацыя мела ў Кўінсе, то наўрад ці нам удалося б купіць нешта ў Мангэтэне – мы з Тумашам перагледзелі, можа пяцьдзясят дамоў, і ў добрым раёне, у раёне 30-х вуліц на ўсход, яны былі ў цане ад паўмільёна да мільёна. Гэткіх грошай у нас не было, мы маглі б атрымаць пазыку ў банку, але не рызыкнулі – навуковая інстытуцыя з сотняй сяброў, мы не маглі ад сяброў патрабаваць грошай на выплату тых дамоў. Таму мы як сталы адрас БІНіМу падавалі адрас Фундацыі Крачэўскага, а штодзённая карэспандэнцыя прадаўжала ісьці на хатні адрас Тумаша.

Шчыра прызнаюся, я «ціснуў на ўсе кнопкі», гаварыў зь людзьмі – будучымі ахвярадаўцамі, багацейшымі, студэнтамі – каб наладзіць кнігавыдавецтва. Кніга – гэта мой улюбёны космас. Зь дзяцінства я любаваўся кніжнай этажэркай у Арле, пазьней – бібліятэчнымі

паліцамі ў розных бібліятэках і нарэшце – сваімі кнігамі! Я купляў і купляю кнігі праз усё жыццьцё і ніколі не шкадаваў на гэта грошай. Купіш нейкую рэч, а пазьней шкадуеш... А аб кнігах пачуцьця шкадаваньня не было ніколі, наадварот – я заўсёды думаў: вот добра купіў кнігу, яна была патрэбная!

Асэнсаваньне прыватнае калекцыі, знаёмства зь беларускімі кнігамі ў бібліятэках нарадзіла ў маёй галаве непрыемную думку – беларускі нацыянальны рух мае мала літаратуры, кніжак наагул, і трэба гэтую хібу выпраўляць. Дакумэнтаваць усе праявы руху, друкаваць новых аўтараў – пісьменьнікаў, дасьледчыкаў – калі магчыма, друкаваць даведнікі. Я ўважаў, што кніга шмат дзе зможа замяніць асобу ды напэўна натхніць маладое пакаленьне. Кніга паспрыяе ўтрыманьню нацыянальнае чытацкае грамады. У БІНіМе я пераканаўся, што гэтак думалі і мае сябры і супрацоўнікі – Ян, Зора, Шукелойць, Тумаш. А кніга выданьня БІНіМу ў амэрыканскіх бібліятэках – яшчэ адзін напамін, што іншая, несавецкая Беларусь жыве.

Пачатак літаратурнай сэрыі БІНіМу «Беларускія паэты й пісьменьнікі»

На адной з штотыднёвых сустрэчаў з Тумашам у бібліятэцы на пачатку 1970-х гадоў (у 1974 ці 1975-м) было прапанавана, каб управа БІНіМу пастанавіла пачаць выданьне літаратурнай сэрыі. Тумаш да гэтага паставіўся пазытыўна, хоць сказаў, іранічна ўхмыляючыся: «Ну, калі Вы, Кіпель, дасьцё грошы, дык падтрымоўваю». Ён наагул любіў «падрэзаць», а ў гэтым выпадку і ня так беспадстаўна, бо вялікія грошы на выданьне я меў толькі ў плянах! Але пытаньне аб друку было вынесенае на паседжаньне ўправы.

Паседжаньне было пашыранае, справу ў асноўным прадставіла Зора. Яна сказала, што на эміграцыі друкуецца нямала маленькіх кніжачак, зборнічкаў, твораў эміграцыйных паэтаў і пісьменьнікаў, твораў добрых, па-мастацку апрацаваных, але выходзяць яны фактычна «самвыдавам» і таму «прападаюць»: іх не каталягуюць бібліятэкі, а ў прыватных кнігазборах такія кніжачкі губляюцца. І тут Зора падала прыклады: «У каго сёньня знойдзецца выданьне зь лягеру DP Натальлі Арсеньневай ці Аўгена Кавалеўскага?» Тыя друкі сапраўды прапалі, загубіліся. Зора запрапанавала пачаць літаратурную сэрыю кніжак «Беларускія паэты й пісьменьнікі на эміграцыі», у якіх будуць выдрукаваныя і ранейшыя творы, а таксама дадасца шмат новых. Так паўстануць «тоўстыя тамы», якія і будуць каталягавацца, і будуць навідавоку ў прыватных калекцыях. Такія «тамы» не прападуць, а дададуць да беларускай літаратуры. Зора падмацавала сваё выступленьне «мэмарандумам», у якім разьвіла і структуру кніг новай сэрыі – улучаць ліставаньне, бібліяграфію, пераклады і г. д.

Прапанова, ясна, была зацьверджаная з удакладненьнямі аб «акадэмічнасьці» новых кніг ды з засьцярогай, што выдавецтва будзе забясьпечанае фінансава. Я паведаміў аб плянах збору грошай. Адным словам, тэарэтычна БІНіМ згаджаўся пачаць літаратурную сэрыю, пры гэтым заручыўшыся таксама згодай дапамагаць у тэхнічным афармленьні з боку мастачкі Ірэны Рагалевіч.

Першая кніга: «Між берагамі» Натальлі Арсеньневай

Першай кнігай у сэрыі было пастаноўлена выдаць творы Натальлі Арсеньневай, якая, багата пішучы, была «па вушы» ўцягнутая ў грамадзкую працу ды была нязьменным беларускамоўным сакратаром БІНіМу аж да ейнага выезду зь Нью Ёрку ў горад Рочэстэр, штат Нью Ёрк. Пачаўся збор матэрыялаў. Паколькі Зора адразу заявіла, што ўкладае ліставаньне й бібліяграфію твораў Арсеньневай – матэрыялы зьбіраліся ў Зоры і ў хаце ў Тумаша. Рэдагаваць творы было даручана Адамовічу, што не было добрым выбарам, бо, як здавалася, паэтка не лічыла Адамовіча «адпаведным» рэдактарам. Яна з большай ахвотай згадзілася б, каб творы рэдагаваў Тумаш, які ейную паэзію цаніў вельмі высака, а Адамовіч быў «крытычны».

Як толькі было пастаноўлена друкаваць творы Арсеньневай, я разаслаў ад БІНіМу ліст-інфармацыю аб запачаткаваньні новай кніжнай сэрыі, дзе прасіў грамадзтва дапамагчы фінансава ды прысылаць – калі ў каго ёсьць – лісты, фота, газэтныя выцінкі аб Натальлі Арсеньневай. Першы інфармацыйны ліст быў разасланы ў 700-800 копіях. Адказы пачалі прыходзіць амаль імгненна: Наталья Арсеньнева была дзейны грамадзкі працаўнік, ведамая паэтэса – грамадзтва яе паважала, любіла і адгукнулася.

Хутка за першым лістом я разаслаў другі, у якім паведамляў, што друк твораў Арсеньневай БІНіМ вырашыў рабіць у амэрыканскім выдавецтве Wm. Wise, Crowley & Co. у горадзе Джэрзі Сіты, бо нам там давалі найлепшую цану за друк, туды быў вельмі выгодны даезд, а друкарня была адчыненая 15 гадзін штодзённа. Мы замовілі тыраж 3000 асобнікаў, кошт быў ацэнены на 7-8 тысячаў даляраў, пры гэтым кожная кніга загортвалася ў гермэтычна зачынены канвэрт (для нас гэта было вельмі важна – яшчэ і сёньня «ў падвалах» сустракаюцца асобнікі кнігі Арсеньневай і выглядаюць яны як новыя!). Суму на друк Арсеньневай я сабраў досыць хутка, але рассылаў лісты з напамінамі і далей (усяго разам разаслаў каля 5000 лістоў), маючы на ўвазе стварыць літаратурны фонд, бо ў плянах былі і далейшыя кнігі.

Бясспрэчна, я бачыў, што паміж БІНіМам і грамадзтвам наладжвалася супрацоўніцтва: здавалася, што грамадзтва ставілася да

літаратуры пасіўна, аж водгук давёў адваротнае. Аднак, плануючы далейшыя выданьні, мы ўсё ж былі асьцярожныя, бо падтрымка выданьня твораў аўтарытэтнай і вядомай паэткі магло яшчэ й ня быць паказьнікам сапраўднага настрою грамадзтва. Арсеньнева як паэтка была ведамая ня толькі беларускаму чытачу, яе ведалі і ўкраінцы, і расейцы ды куплялі ейныя кнігі.

Аб кнізе Натальлі Арсеньневай прыпамінаецца і такое. Сярод маіх знаёмых «па кніжнай справе» была ў Нью Ёрку арганізацыя «Міжнародны літаратурны клюб». Гэта амэрыканская ўстанова, якая распаўсюджвала эмігранцкія кнігі, галоўным чынам расейскія, такіх выдавецтваў як імя Чэхава або YMCA-Press. З гэтае ўстановы пазванілі мне на працу і сказалі, што хацелі б мець кнігу Арсеньневай «Між берагамі». Я пытаю: «Колькі экзэмпляраў жадаеце?» Адказ: «Тысячу». – «ОК, прыяжджайце, вось вам адрас». Прыехалі, забралі, заплацілі (мы давалі зьніжку на 10%, калі бралі больш як 10 штук) і... паехалі. Кніга Арсеньневай нелегальна распаўсюджвалася ў СССР.

Узялі кнігу Арсеньневай кнігагандляры Szwede ў Каліфорніі, Камкін у Вашынгтоне, а таксама магазын «Тройка» ў Канадзе. Некалькі тамоў Арсеньневай запрасілі ў нас з былога чэхаўскага выдавецтва, а таксама індывідуальныя кнігагандляры, улучна з Аляксандарм Лашуком з Ангельшчыны.

(Прыпомніўшы аб вялікім закупе кнігі Арсеньневай, мушу згадаць і тое, што кнігу I і II падручніка «Fundamental Byelorussian» Валентыны Пашкевіч закупіла амэрыканскае вайсковае ведамства ў горадзе Сіэтл, штат Вашынгтон, колькасьцю сто экзэмпляраў, пасьля яны купілі і слоўнік.)

На кнізе Натальлі Арсеньневай мы здабылі дасьведчаньне: каб мець грошы на выданьне, трэба кнігу вельмі добра рэклямаваць і абавязкова зьвяртацца да беларускага грамадзтва – малаважна, што чытацкая грамада не такая й вялікая, калі грамада адчувае працу – будзе дапамога. Фактычна праз выданьне твораў Арсеньневай усталяваўся сталы лістоўны, тэлефонны і пэрсанальны («у царкве» падчас нядзельных сустрэчаў) кантакт з грамадзтвам, што забясьпечыла БІНіМу фінансавую падтрымку ў далейшым.

Інсульт

Незадоўга перад выхадам кнігі Арсеньневай (лета 1979) управа БІНіМу прыняла пастанову выдаваць наступную кнігу ў сэрыі «Беларускія паэты й пісьменьнікі» – творы Алеся Салаўя. Галоўным ініцыятарам гэтай кнігі быў Антон Адамовіч (кнігу Арсеньневай «рухаў» Тумаш), хоць праца была разьмеркаваная паміж Тумашам, Зорай, Міколам Скабеем і іншымі.

У падрыхтоўцы зборніку твораў Салаўя «Нятускная краса» ўсё ішло паводле пляну: упарадкаваньне вершаў, бібліяграфія і нават збор грошай (асабліва падтрымоўвала выданьне беларуская грамадзтва Аўстраліі) выглядаў вельмі добра. Аж раптам – як гром зь яснага неба! 8 сакавіка 1982 году ў доктара Вітаўта Тумаша здарыўся інсульт, які меў вынікам амаль поўную інваліднасьць.

У маёй памяці гэты дзень застаўся незабыўны. Каля 11-й гадзіны мая сакратарка на працы ў бібліятэцы кажа: «Доктар Кіпель, тэлефонны званок для Вас, але я нічога не разумею!» Бяру трубку і чую паўзразумелы хрыплы голас (я ледзьве пазнаў, што гэта голас Тумаша): «Прыяжджайце, мне дрэнна...» і – канец, шум у тэлефоне. Я адразу расьпісаўся, што пакідаю працу, і паехаў да Тумаша. Праз гадзіну-паўтары я быў у яго ў пакоі.

Тумаш ляжаў на падлозе каля свайго стала, тэлефон боўтаўся, твар у яго быў жаўтавата-сіні, рот напаўраскрыты, ён слаба дыхаў, але мяне пазнаў і пачаў разводзіць рукой... Наўкол ляжалі рассыпаныя гранкі карэкты кнігі Салаўя. Я адразу ўзяў слухаўку – праверыў, ці працуе тэлефон, тэлефон працаваў. Я пазваніў Яры, яна выклікала хуткую дапамогу. Я пасадзіў Тумаша, прыхіліўшы да сьценкі, і пачаў зьбіраць гранкі. Праз хвілін 10 прыехала хуткая і адначасна ў хату ўвайшла Яра.

У гэты дзень доктар Тумаш назаўсёды адышоў ад навуковай і грамадзкай дзейнасьці, ды наагул грамадзтва яго больш літаральна ніколі ня ўбачыла. Ён ні разу не зьявіўся на зборках. Апошні яго-ны «публічны» здымак быў зроблены, калі мы наведалі яго на Вялікдзень 1992 году зь Сяргеем Шупам. У яго быў інсульт з наступнай інваліднасьцю: падупадаў зрок, памяць.

Доктар Тумаш

Тут, мабыць, будзе хіба найзручней расказаць болей пра доктара Вітаўта Тумаша і мае зь ім дачыненьні.

Здаўшы ў канцы 1950-х экзамэн на доктара мэдыцыны паводле вымогаў мэдычных установаў, доктар Тумаш атрымаў дазвол на практыку ў штаце і горадзе Нью-Ёрк. Вельмі кароткі час ён думаў адкрыць сваю прыватную практыку, але ўрэшце махнуў на гэта рукой і пайшоў працаваць у шпіталь. Працаваў ён пераважна як галоўны доктар прыёмнага пакою хуткай дапамогі. Як ён мне казаў, ён выбраў гэтую спэцыялізацыю таму, што праца ў хуткай дапамозе найбольш яму адпавядала: самыя гарачыя дні – пятніца, субота і нядзеля, бо канец тыдня, людзі выпіваюць, б'юцца, рэжуцца, таму бывае завозна, затое астатнія дні вельмі спакойна, і тады можна думаць і пра Скарыну, і пра Вялікае Княства Літоўскае. Мэдыцынская практыка давала яму дастаткова матэрыяльнага забесь-

пячэньня – у яго была сям'я, трое дзяцей, трэба было іх вучыць, яны яшчэ былі ў сярэдняй школе, трэба было плаціць гіпатэку за хату. А ў вольны ад мэдычнай працы час ён займаўся беларусікай, найбольш Скарыніянай. Ён вельмі шмат паўпрыватна перапісваўся зь Беластокам, там ў 1960-я гады жылі людзі, якіх ён ведаў з даваеннага жыцьця.

Я пазнаёміўся з Тумашам ужо ў ЗША і пачаў зь ім зьбліжацца, калі пачаў працаваць у бібліятэцы. Тумаш вельмі падтрымоўваў мяне, каб я застаўся ў бібліятэцы на стала. У першых гадох знаёмства ён быў для мяне як бы настаўнікам у беларускім руху: расказваў пра беларускае жыцьцё ў Вільні, даваў лекцыі з гісторыі – веды ягоныя ў беларусістыцы былі вельмі сыстэматычныя й падмацаваныя фактамі, і так ён даў мне поўную карціну беларускага палітычнага руху ў Заходняй Беларусі. Прычым ён, асоба далікатная, навучаў вельмі асьцярожна, як бы «ў прыдачу» да нейкай іншай інфармацыі.

Паступова адбывалася зьбліжэньне і «жыцейскага» парадку. Галіна, малодшая, народжаная ў Амэрыцы дачка, падаравала свой непатрэбны веласіпед нашай Алесі; Іван Нядзьвіга на маю просьбу абсталяваў палічкамі нядаўна купленую хату Тумаша. Калі беларусы набылі адпачынкавы цэнтар Бэлэр-Менск, Тумаш некалькі гадоў апекаваўся як доктар дзецьмі ў тамтэйшых лягерох.

У беларускай працы мы таксама зьбліжаліся, хоць палітычна, можа, і ня цалкам супадалі ў паглядах. Доктар Тумаш быў вельмі мэтадычны: ягоныя тыднёвыя візыты ў бібліятэку дапамагалі нашаму зьбліжэньню. Часта мы сустракаліся зь ім «пад царквой» на 401 Atlantic Avenue у Брукліне.

У пачатку 1960-х гадоў Тумаш даў мне для перагляду манускрыпт пра жыхарства БССР (выдадзены пасьля пад псэўданімам Андрэй Багровіч), мы пачалі абменьвацца працоўнымі думкамі. Як толькі ў бібліятэцы пачала працаваць Зора, нашыя супольныя сьнеданьні і абеды зрабілі нас «кампаніяй утраіх», часам да нас далучаўся і Ян Запруднік. Любіў Тумаш і гумар, анэкдоты, распружаньне.

Будучы доктарам мэдыцыны, Тумаш харчаваўся «па навуцы», думаючы, што будзе жыць 100 гадоў. Прыйдзе ў бібліятэку, мы ідзем на сьнеданьне ці на абед, то ён выбера тварог, падліе алею – еў толькі тое, што трэба, жыў «па-навуковаму». Мы зь ім заўсёды наконт гэтага жартавалі – сёньня, кажа, я ем такую і такую дыету. Праз два дні прыйдзе, і ў яго ўжо іншая дыета. Ён так і лічыў – калі жыць па кнізе, то пражывеш значна даўжэй. Ён расказваў, што быў такі расейскі навуковец Мечнікаў, які харчаваўся толькі кіслым малаком і ў 59 гадоў памёр – Тумаш з гэтага заўсёды жартаваў і сьмяяўся.

З часам у нас пачаліся гутаркі на біяграфічныя тэмы. Я ведаў, што Тумаш быў першым бургамістрам Менску пры немцах у 1941 годзе, на пачатку вайны. Прыпамінаю ягоны расказ пра гэты эпізод жыцьця.

Бургамістар Менску

Для яго гэта быў непрыемны момант у жыцьці, пра што ён наагул гаварыць не любіў, але сёе-тое з часам расказаў. У 1939 годзе, калі немцы і саветы дзялілі Польшчу, Тумаш быў у Вільні. Калі набліжаліся саветы, яны зь Мікалаем Шчорсам вырашылі ўцякаць – селі на веласіпеды і паехалі на Валынь. Але і там казалі, што неўзабаве прыйдуць саветы, дык яны ўцякалі далей – на Захад. Так яны даехалі, здаецца, да Ліцманштату, а адтуль Шчорс паехаў у Варшаву, а Тумаш – у Бэрлін. І так выйшла, што ён ніводнага дня ня быў пад саветамі. У Бэрліне быў Мікола Шкялёнак, зь якім ён меў кантакт. Але Тумашу быць у Бэрліне было таксама на руку, бо ён хацеў там атрымаць дыплём па канкрэтнай мэдычнай спэцыялізацыі. І там ва ўнівэрсытэце ўпершыню да яго падышлі немцы з гестапа і пыталіся пра ягоныя пляны, але тады яшчэ ніхто не чакаў, што будзе вайна з СССР.

У 1941 годзе за тры ці чатыры дні перад вайной да яго зноў прыйшло гестапа і сказала нікуды не выяжджаць, сядзець у кватэры, бо ён ім будзе патрэбны, і сказалі дату – недзе ў канцы чэрвеня. І вось 27 ці 28 чэрвеня, праз пару дзён пасьля пачатку вайны, да яго прыйшлі і сказалі: «Сёньня вы з намі едзеце ў Менск». І прывезьлі яго ў Менск. Яму сказалі проста: «Мы баімся, што пачнецца эпідэмія». Вэрмахт возьме Менск за пару дзён, лета падыходзіць, можа ня быць вады, ежа будзе нясьвежая, і можа выбухнуць эпідэмія. «Ваша заданьне – арганізаваць адміністрацыю, не дапусьціць эпідэміі». Гэта было ягонае асноўнае заданьне, больш зь ім ні пра што не гаварылі.

Тумаш мусіў арганізоўваць адміністрацыю ў разьбітым Менску. Колькі ён мог, ён сваё заданьне выканаў. Тады ён падаў адзін ліст з адмовай ад пасады, яшчэ ў жніўні, і напісаў, што эпідэміі ўжо ня будзе, пасьля другі – але ніхто не зьвярнуў на гэтыя лісты ўвагі. Урэшце ў канцы восені ён дамогся свайго, яму сказалі: на табе білет куды хочаш, і ён паехаў у Ліцманштат працаваць доктарам. Працаваў ён там гады два, а пасьля перабраўся ў Бэрлін.

Эміграцыя ў ЗША

Аднак менскі эпізод засеў у памяці на ўсё жыцьцё, гэта не было зь ягонай волі, ён хацеў пра гэта забыцца! Ён выканаў тое, што ад яго патрабавалі, нават крыху больш – ён задаў пэўны беларускі тон, хоць немцам да гэтага не было ніякай справы. Ён так ніколі і не даведаўся, чаму на яго наагул выпаў гэты выбар: з нацыстамі ён ніколі ня меў нічога агульнага, меў левыя палітычныя схільнасьці, сябраваў з Танкам. Так што ён хацеў, каб тыя тры месяцы ў Менску былі проста выкрасьленыя з жыцьця. Пра той час ён казаў толькі: «Было,

прайшло – і забудземся». Ніякіх успамінаў, ніякіх перажыванняў не пераказваў. Адзінае – калі ён зь немцамі прыехаў і яны зь нейкай вайсковай групай абышлі горад, каб агледзець сытуацыю, ён расказаў пра гэта, што хадзіць не было як, вуліцы гораду былі для транспарту непраезныя. Давядзеньне гораду да ладу цягнулася каля месяца.

Падчас эміграваньня ў Амэрыку – у 1947 годзе – ён, як і ўсе DP ў ангельскай зоне Нямеччыны запаўняў іміграцыйныя анкеты. Яны былі вельмі дэтальныя, я ня ведаю што там дакладна было, бо сам іх ніколі не запаўняў – напэўна, было пра тое, дзе вы былі і калі і што вы рабілі. І там ён так і напісаў – што быў бургамістрам гораду і арганізоўваў адміністрацыю. Пазьней – ён падазрае, што гэтая інфармацыя трапіла агентам, якія мелі сувязь з саветамі – з гэтага зрабілася крыху большая праблема. Слова «адміністрацыя» нехта праінтэрпрэтаваў, што ён быў адказны за арганізацыю гета – так у гэтую гісторыю ўвайшоў зусім новы элемэнт. Хто ж арганізоўваў гета – беларусы ці немцы? Сам Тумаш казаў, што да гета ніякага дачыненьня ня меў і дэталяў яго арганізацыі ня ведаў. У канцы 1940-х гадоў, калі адбывалася іміграцыя, на гэта ўвагі не зьвярталася, абы былі запоўненыя анкеты.

Слуханьні ў Фэдэральным будынку

І вось доктар Тумаш прыехаў у Амэрыку, нармальна працуе, займаецца грамадзкай дзейнасьцю, а потым раптам, у пачатку 1981 году, «вылазіць» гэткае – яму прыходзіць заказны ліст, што «нехта» хоча зь ім сустрэцца ў Фэдэральным будынку. Ён пайшоў у Фэдэральны будынак, а там яму кажуць: ведаеце, у нас ёсьць дакумэнты, што вы былі адзін з тых, хто прыехаў з Einsatzgrupe, і што ў вас было заданьне арганізаваць гета. Калі вы гэтаму пярэчыце, дык мы прызначым слуханьні ў гэтай справе, мы хочам пачуць ваш бок.

Слуханьні прызначылі на 10 сьнежня 1981 году. Тумаш з Фэдэральнага будынку адразу прыехаў да мяне ў бібліятэку, кажа: «Пойдзем разам» і паказаў мне ўсё – той першы ліст, позву на 10 сьнежня зь пералікам, якія дакумэнты ён мусіць з сабой мець, і з просьбай, што гэта ўсё мусіць мець канфідэнцыйны характар. Ён папрасіў мяне: «Пазваніце ім туды і скажыце, што вы будзеце са мной». (Мы зь ім былі заўсёды толькі на «вы».) Я пазваніў – урадоўцы нічога супраць ня мелі.

10 сьнежня мы сустрэліся з Тумашам раніцай каля Фэдэральнага будынку на Мангэтэне, паказалі швэйцару куды маем ісьці – гэта быў закрыты паверх, куды нікога не пушчаюць, там былі сьледчыя ведамствы – нічога нідзе не напісана, стаяць ахоўнікі ў цывільным, у іх трэба пытацца далейшай дарогі, і яны завядуць «куды трэба». Інтрыга!

Перш-наперш, калі мы толькі зайшлі ў Бюро, нас абавязалі прысягнуць, што мы нікому пра гэтую сустрэчу ня будзем гаварыць на працягу даўжэйшага часу – здаецца, году ці двух. Затым пачаліся слуханьні. Сядзяць два амэрыканцы сьледчыя, адзін – зь сьледчага аддзелу іміграцыйнага агенцтва Міністэрства ўнутраных справаў, а другі – супрацоўнік FBI у якасьці дарадніка. Яшчэ прысутная жанчына, якая ўсё запісвае, а пры ёй – афіцыйны перакладчык і яшчэ адзін чалавек збоку – з апаратам, які запісвае ўсё, што вы гаворыце.

Гутарку распачаў прадстаўнік Іміграцыйнага агенцтва. Ён адразу заявіў, што агенцтва атрымала рукой пісаны ліст, у якім апісваецца Менск улетку 1941 году і зазначаецца, што Вітаўт Тумаш у тым часе быў «начальнікам гораду» і «арганізоўваў гета». Прычым прадстаўнік Іміграцыйнага агенцтва кажа, што ў яго арыгіналу ліста няма, але ёсьць дадатковы дакумэнт з подпісам Тумаша. Пры гэтым прадстаўнік дастае з тэчкі лістовачку. Даюць тую лістовачку Тумашу, дазваляюць узяць у рукі і глянуць на яе і мне.

Лістовачка друкаваная, у ёй абвестка пра тое, што ў горадзе арганізуецца чыстка вуліц, дзе каму можна хадзіць, і згадваецца таксама гета і якія вуліцы ў яго ўваходзяць. І падпісана пропісьсю, рукою: Тумаш. Тумаш глянуў і кажа, што гэта не ягоны подпіс. Абсалютна. Тады яму даюць запоўніць вялікую анкету – падобную да той, што ён запаўняў у 1947 годзе – ён яе запоўніў. Чыноўнікі параўналі дзьве анкеты – яны былі ідэнтычныя. Урадоўцы аж зьдзівіліся – нагэтулькі ідэнтычнымі аказаліся анкеты, запоўненыя ў прамежку 50 гадоў.

Беручы назад лістовачку, чыноўнік Іміграцыйнага агенцтва патлумачыў мне маю ролю: я выступаю як перакладчык, але таксама магу разглядаць дакумэнты. Калі Тумаш хоча сказаць сам – можа сказаць. Калі не – я яму дапамагаю. Калі мы абодва нешта ня можам выказаць – ёсьць афіцыйны беларуска-ангельскі перакладчык, я маю права ў яго запытацца пераклад нейкага слова, калі патрэбна.

Пасьля гэтага невялічкага ўступу галоўны сьледчы (ад Іміграцыйнага агенцтва) кажа: «Тут відавочны канфлікт. Мы маем дакумэнты аб Вашай дзейнасьці, а Вы, доктар Тумаш, адмаўляеце аўтэнтычнасьць гэтых дакумэнтаў. Таму мы пачнем разгляд справы».

Падрабязна разглядаецца ўся біяграфія – дзе вучыўся, дзе працаваў, што рабіў. Ці былі каманды па ачыстцы вуліц? Былі. Як гэта рабілася? Немцы далі некалькі машын, мы езьдзілі па горадзе і заклікалі – хто хоча ісьці разьбіраць руіны і расчышчаць вуліцы, за гэта будзе даваццa ежа. А горад быў разьбіты, па Савецкай вуліцы не было як праехаць, тут разьбітыя грузавікі, там падбіты танк... Спачатку паехалі пад лягер палонных – Там завэрбавалі пару дзесяткоў чалавек. Непадалёк была паходная кухня, і ахвотнікаў накармілі. Так пачалася расчыстка гораду.

Тады слуханьне даходзіць да пытаньня – як плацілі тым, хто

працаваў. Тумаш кажа, што ніяк – аплатай была ежа. А пазьней? Пазьней, калі прыйшлі цывільныя ўлады – а расчыстка прадаўжалася далей, і трэба было мець каля 500 чалавек, каб за першыя 10-15 дзён усё расчысьціць – Тумаш сказаў, што немцы будуць даваць соль, 2 кг солі за дзень працы. Ці плацілі грашыма? Не. А ці вам паступалі грошы, калі вы былі бургамістрам? Паступалі. Зь якога банку? Мне плаціў вэрмахт – у нас былі чэкі з штампам вэрмахту. Ці вам калі было сказана, які банк стаяў за гэтымі выплатамі? Ніколі не было сказана. Тады сьледчы паказвае блянкі, на якіх пазначаны банк. Тумаш кажа, што такіх блянкаў ніколі ня бачыў і пра такія банкі ніколі ня чуў – усё было праз вэрмахт. На гэтым справа апытаньня доктара Тумаша пра першыя часы ў Менску ў 1941 годзе скончылася.

Затым пачаўся больш дэталёвы разгляд. Былі названыя канкрэтныя прозьвішчы. Працавалі ў вас такія? Працавалі. Вы ведалі, што яны яўрэі? Ведаў. Ці вы ведалі, што яны прыходзяць з гета? Не, ня ведаў. Тумаш іх «знайшоў», і яны яму рабілі бухгальтэрыю... Такіх дэталяў у яго распыталі каля пяцідзесяці. Трэба сказаць, што апытвалі досыць прафэсійна. У часе аднаго пытаньня паставяць папярэдняе, вернуцца да пачатку. Апытаньне працягвалася гадзін пяць, да абеду. Перапынак на абед быў кароткі – мы купілі пару бутэрбродаў з аўтамата.

Па абедзе апытаньне пачалося з жніўня месяца 1941 году. Паказваюць картачкі людзей у нямецкай уніформе – ці мелі вы дачыненьні з такімі і такімі? Тумаш кажа: не. Ён добра памятаў, што меў дачыненьні з генэралам такім-та, з палкоўнікам такім-та. І так працэдура цягнулася да 9-й гадзіны вечара (а прыйшлі мы ў 8.30), адзін раз далі перапынак на абед, другі раз яны нас пакармілі.

Было ўжо пазнавата. Чыноўнік нам падзякаваў, і яны выйшлі. Мы з Тумашам – таксама да дзьвярэй, але я затрымаўся і сам-насам у перакладчыка пытаюся: «Слухайце, магу я ў вас запытацца – вы ж напэўна ня першы раз пры такім прысутныя... Ці нам далей будзе патрэбны адвакат?» Бо я бачыў, да чаго гэта йдзе. Перакладчык адказвае (аказалася, што ён латыскага паходжаньня): «Думаю, што вы можаце спаць спакойна». – «Вы ўпэўненыя?» – «Я амаль упэўнены. Гэта данос савецкай амбасады, і амэрыканцы правяраюць, ці Тумаш не зманіў у часе іміграцыі ў 1947 годзе». Паўтарае: справа закончаная.

Я пераказаў гэта Тумашу. Ён ухмыльнуўся і сказаў: «Я ведаю, што саветы за мной палююць, палююць і за сям'ёй у Беларусі і ў Польшчы. Але довадаў у іх, што я нешта зманіў – няма. Будзем бачыць, што будзе далей». Была 10-я гадзіна вечара. Мы разам даехалі на мэтро да станцыі Times Square і разышліся кожны ў свой бок.

Праз пару дзён я пад'ехаў да Тумаша дахаты. Ён быў у прыбітым настроі: а што калі нейкая дэталь будзе разыходзіцца? Дэпартацыя? Прыдзецца выяжджаць у Заходнюю Нямеччыну, разважаў уголас Тумаш. Вядомая справа, я яго стараўся падтрымаць на духу і сказаў,

што мы зь Юрчыкам Андрусышыным (пазьней ён працаваў у FBI, а тады яшчэ толькі скончыў унівэрсытэт) пойдзем да адваката яшчэ раз пагутарыць аб «справе». Гэта яго падбадзёрыла. Але ён фактычна ўжо ніколі ад таго шоку не аправіўся. Ён страціў энэргію, стаў абыякавы, нават да Скарыніяны. У бібліятэку зайшоў мо раз ці два, а пасьля зь ім здарыўся інсульт. У сьнежні мы былі ў сьледчага, а ў сакавіку Тумаш трапіў у шпіталь.

Канец справы

Празь месяц-другі слуханьняў у справе Тумаша мы пайшлі зь Юрчыкам Андрусышыным да ведамага адваката – забраў 650 даляраў яшчэ перад тым, як пачаў з намі гаварыць! Я расказаў яму ўсю справу, і ён кажа: ніякага суду ня будзе. Ніякіх доказаў няма, амэрыканцы толькі хочуць пераканацца, каб адказаць таму, хто на яго напісаў данос – што з Тумашам пагаварылі, ён сказаў, што гэта няпраўда, і яны з гэтым згадзіліся. Уся «музыка», сказаў адвакат, пачынаецца з пытаньня, ці ён легальна прыехаў, таму й глядзелі, ці ён дзе ня зблытаецца пры запаўненьні анкеты. Калі б зблытаўся – гэта б ужо была вялікая праблема. А ўсе тыя фатаграфіі і дакумэнты, што яму паказвалі, былі толькі на тое, каб праверыць, ці Тумаш гаварыў праўду пра анкетныя дадзеныя. Але паколькі ёсьць данос – улады мусяць адказаць. У канцы сказаў, што мы можам на яго разьлічваць, і калі ён возьмецца за справу, то будзе браць па 350 даляраў за гадзіну. На гэтым справа доктара Тумаша канчаецца.

БІНіМ бяз Тумаша

Калі Тумаш захварэў і адышоў ад справаў, на ягоным стале ляжаў макет кніжкі Алеся Салаўя – другая кніга ў БІНіМаўскай літаратурнай сэрыі. Ад гэтага моманту ўсё лягло на нас, і трэба было справу дацягваць. Я пачаў адведваць Тумаша – два разы на тыдзень, потым раз на тыдзень. Спачатку ён і не чытаў, і не пісаў, а потым патроху пачаў чытаць з павелічальным шклом. Але ад таго часу Тумаш ужо ніколі на людзях не бываў.

У яго быў бранхіт – думаю, яшчэ з польскіх часоў – ён заўсёды кашляў, але цяпер хвароба пачала праяўляцца больш інтэнсіўна, і раз на паўгода ён клаўся ў шпіталь на два-тры тыдні, дзе яму прачышчалі лёгкія. Было відаць, што чалавек ад працы ўжо адбіты зусім. Пасьля гэтага ён пражыў яшчэ гадоў сямнаццаць, але жыцьцё гэтае было для Тумаша ўжо нецікавае.

Адзін раз была нагода прыехаць на зборку Інстытуту, калі польскі навуковец прафэсар Зымэр выдаў сваю кнігу «Кірылічны друк у Кракаве», і мы пастанавілі надаць яму тытул ганаровага сябра БІНіМу.

Была вялікая ўрачыстасьць, і мы думалі, што Тумаш прыедзе, але ён не прыехаў. Інстытуцкія зборкі мы рабілі ў будынку Freedom House у цэнтры гораду, на 40-й вуліцы – наймалі там памешканьне на 2-3 гадзіны за мінімальную, сымбалічную цану.

Потым выйшла Тумашава кніжка «500 гадоў Скарыніяны». На прэзэнтацыю ён таксама не прыехаў. Скарыну ён прысьвяціў усё сваё жыцьцё, вельмі ім цікавіўся, лічыў, што трэба больш дасьледаваць архівы, бо ня высьветленае пытаньне Скарына – Лютэр, няяснае пытаньне пабыту ў Кёнігсбэргу. Але пасьля інсульту ён ужо больш ніколі да Скарыны не вярнуўся.

Калі зь ім здарыўся інсульт, кніжка гэтая наагул была яшчэ толькі ў скрыначках. Запруднік і Адамовіч узяліся скончыць Салаўя, а мы з Зорай узяліся за бібліяграфію Скарыніяны і давялі яе да канца. Магчыма, каб Тумаш працаваў далей, там было б і нешта большае – але трэба было выдаць хоць так.

Сям'я сказала – забірайце бібліятэку і карэспандэнцыю. Тое-сёе, што было відавочна БІНіМаўскае, я забраў, а прыватнае пакінуў – прыватны архіў і бібліятэка застаюцца ў ягоным доме і да сёньня. Сярод іншага, у яго была багатая перапіска з Ларысай Геніюш. Ён быў хросным бацькам яе першага зборніка, які выйшаў у Бэрліне, бо ён у той час быў рэдактарам «Раніцы». Вершы ў «Раніцы» яна пачала друкаваць яшчэ раней, і ён падаў ёй думку выдаць іх асобнай кнігай. Карэспандэнцыю з Геніюш я не чапаў, бо яна ішла не на Тумаша, а на малодшую дачку Галіну, там было шмат прыватных момантаў – у іх былі супольныя знаёмыя. У Тумаша была сям'я – брат і бацька. Бацька памёр досыць рана, ён жыў недзе пад Вялейкай, а брат, здаецца, пераехаў у Польшчу. Але ён мала расказваў пра сям'ю, ён быў такі чалавек, што надта не раскрываўся – такая натура, праўда, калі запытаесься, то ён не рабіў з гэтага ніякіх сакрэтаў.

Гэта была вялікая згуба, бо гэта быў чалавек вельмі інтэлектуальна падрыхтаваны, ведаў шмат, і наагул адыгрываў вялікую ролю ў беларускім грамадзтве. Так ён і адышоў – дзеля таго, што яму выпала быць першым бургамістрам Менску пад нямецкай акупацыяй, і гэта была бірка на ўсё жыцьцё, яму гэта было ня надта прыемна, ён цяжка перажываў.

Адыход доктара Тумаша быў вялікай стратай у дасьледаваньнях беларусікі. Так што таму, хто ініцыяваў справу перагляду імігрыцыйных папераў доктара Тумаша ды ягонай дзейнасьці ў часе нямецкай акупацыі – кажучы простай мовай – данос у фэдэральнае агенцтва, гэтая справа ўдалася, і Тумаш быў выведзены са строю досыць рана, яму было толькі 72 гады (ён нарадзіўся 21 сьнежня 1910 году).

У красавіку 1982 году на пасаду старшыні БІНіМу быў выбраны Ўправай я, Вітаўт Кіпель.

Працяг літаратурнай сэрыі

Хутка пасьля здарэньня з Тумашам кніга Салаўя была закончаная і шырака разыйшлася.

Чароднай кнігай у сэрыі «Беларускія паэты й пісьменьнікі» было пастаноўлена выдаць творы Аляксандры Саковіч (Іны Рытар) – сабраць ранейшыя й далучыць новыя – пад загалоўкам «У пошуках праўды – апавяданьні і аповесьці» (1986). У выданьні гэтае кнігі вялікую рэдактарскую дапамогу даў нам Аўген Каханоўскі – муж аўтаркі. Не было вялікай праблемы і зь фінансамі – дапамагла кліўлэндзкая калёнія (і Рытар, і Каханоўскі – старажылы, дзеячы кліўлэндзкай беларускай грамады). Тыраж кнігі А. Саковіч друкаваў Мікола Прускі – мы зрабілі 750 экзэмпляраў і... пралічыліся. Кніга вельмі хутка разышлася: на прэзэнтацыі, толькі ў Кліўлэндзе, разабралі каля 200 экзэмпляраў. Мушу таксама падкрэсьліць, што на прэзэнтацыі кнігі было шмат амэрыканцаў, сяброў аўтаркі. Аўтарка падпісала некалькі даравальных экзэмпляраў і Кліўлэндзкай публічнай бібліятэцы.

Прыблізна ў гэтым часе пачалі паступаць у БІНіМ просьбы ад грамадзянаў і пісьменьнікаў, каб выдаць іхную кнігу ў выдавецтве БІНіМу. Базыль Косараў з штату Пэнсыльванія пытаўся, ці мог бы БІНіМ выдаць невялічкі ангельска-беларускі размоўнік, на што наш адказ быў: на дадзеным этапе да выданьня размоўнікаў мы не гатовыя. Да мяне асабіста зазваніла жонка памерлага пісьменьніка Уладзімера Клішэвіча і паінфармавала, што ў яе «стаіць сундук» з матэрыяламі мужа, дык ці ня ўзяліся б мы іх друкаваць? Мой адказ тады (і пазьней лістоўна) быў: прысылайце «сундук» – пабачым, што ў ім, а тады будзем гаварыць далей. Але на гэтым кантакты спыніліся, і «сундук», відаць, стаіць дзе й стаяў.

Зьвярнуліся й маладзейшыя сябры БІНіМу з просьбай выдаць свае ўспаміны – напрыклад, Славік Шабовіч. Але мы яму парадзілі аб выданьні сваіх успамінаў паклапаціцца самому, праўда, паабяцалі літаратурную апрацоўку і вычытку. Такіх, як Шабовіч, было некалькі.

На вялікі жаль, не атрымалася ў мяне (у БІНіМу – бо я вёў гутаркі ад інстытуту) памыснага выніку, каб выдаць багатую й добрую мастацкую спадчыну аднаго з закладчыкаў і энтузіястаў БІНіМу паэта Рыгора Крушыны. Некалькі разоў БІНіМ вёў перамовы з сынам паэта, але гутаркі перапыняліся, калі мы закраналі фінансавае пытаньне – мы ўважалі, найбольш дзеля гарантыі, што частку кошту друку павінна забясьпечыць радня. Перамовы заходзілі ў тупік, і сын друкаваў творы Крушыны ў іншых выдавецтвах.

БІНіМ вёў перамовы адносна друку твораў зь Янкам Золакам, Масеем Сяднёвым, але пісьменьнікі ставілі свае ўмовы, на якія БІНіМ не пагаджаўся. Даўгавата мы гутарылі зь Янкам Юхнаўцом – і ён, і БІНіМ былі зацікаўленыя выдаць яго выбраныя творы ў сэрыі БІНіМу.

Але Юхнавец ніяк не згаджаўся на тое, што ягоныя творы «нехта будзе рэдагаваць». Падобная сытуацыя паўстала і з Кастусём Акулам, дзейным сябрам БІНіМу – свае творы ён хацеў рэдагаваць сам. Праўда, былі пісьменьнікі, якія ўспрымалі рэдактарства БІНіМу нармальна, нават былі задаволеныя. Прыкладам, Алесь Салавей толькі й хацеў, каб ягоныя творы рэдагаваў Антон Адамовіч. Міхась Кавыль, калі ягоныя творы рыхтаваліся для друку ў БІНіМе, сказаў прыблізна так: «Мне Адамовіч дапамагаў ствараць санэты – ягоная дапамога для мяне была вельмі важная». (Калі выйшаў том Кавыля «Міжагнёўе», паэт сказаў: «Мне Адамовіч зрабіў лешпую кнігу, чым бы я выдаў сам».)

«Міжагнёўе» Міхася Кавыля

Выдаць творы Кавыля на паседжаньні ўправы БІНіМу было пастаноўлена недзе ў чэрвені 1982 году, і ад таго часу пачалося зьбіраньне матэрыялаў. Міхась Кавыль шмат дзе друкаваўся, пачынаючы ад канца 1920-х у Беларусі і ад канца 1940-х на эміграцыі. Ён быў вельмі папулярны, шмат ягоных вершаў былі пакладзеныя на музыку і сьпяваліся амаль як народныя песьні («Расьцьвіталі ў жыце васілёчкі...»). Паэт таксама выдаў сам некалькі зборнічкаў вершаў, быў актыўны – пісаў на патрэбы грамадзтва. Быў таксама вядомы – паводле ацэнкі Антона Адамовіча – як «першы ў беларускай літаратуры, хто стварыў вянок санэтаў». Адным словам, сабраць Кавылёву спадчыну было ёмістае заданьне. Але справа рухалася – творы, карэспандэнцыя, бібліяграфія былі «ў купе», трэба было рэдагаваць. Ясная справа, Адамовіч адразу заявіў, што Кавыля рэдагуе ён. Аднак заява заявай, але з рэдагаваньнем твораў Кавыля атрымоўвалася затрымка: чамусьці Адамовіч за працу ня браўся. Бывалі з Адамовічам такія «фокусы» і раней, ён затрымліваў працу, але тады быў дзейны Тумаш і ён часам гаварыў з Адамовічам бюракратычна-начальніцкай мовай. Цяпер Тумаша не было, а мы – ні Зора, ні Ян Запруднік, ні я – Адамовічу загадаць не маглі. Мы чакалі і ўвесь час яму «намякалі»: «Кавыль гатовы да рэдагаваньня!» Адамовіч маўчаў – відаць была старэчая стомленасьць, асабліва пасьля афэры з Лофтусам, пра якую – крыху пазьней.

Сытуацыя вытваралася непрыемная: праца ня рухалася, а ў нас ужо былі пляны на далейшае. Нарэшце, як кажацца, цярпеньне лопнула і Ян з Зорай заселі за Кавыля, нічога ня кажучы Адамовічу. Сталася таксама так, што два тыдні (дакладней, канцатыдні) запар нам траім давялося быць у Канадзе (1989), дык рэдагаваньне ішло і ў дарозе, і ў Канадзе! У канцы сакавіка 1989 году манускрыпт быў адрэдагаваны. Далі «прадукт» для апрабаты Адамовічу, і, як ні дзіўна, ён зь вялікім аплёмбам заявіў: «Манускрыпт можа ісьці ў друк!» Друкавалі Кавыля ў друкарні Міколы Прускага, тыраж – каля 500 экзэмпляраў.

Мы былі вельмі задаволеныя, што «працэс пайшоў», бо пачыналі псавацца дачыненьні з паэтам – зусім зразумела чаму. Праўда, друк узяў крыху часу: прэзэнтацыя кнігі адбылася толькі 13 красавіка 1991 году. Але прэзэнтацыя была цудоўная. У Беларускім Грамадзкім Цэнтры ў Саўт Рывэры сабралася каля 200 чалавек: сябры паэта, грамадзтва, студэнты з Ратгерскага ўнівэрсытэту. Былі прадстаўнікі і ад мясцовае адміністрацыі – гораду гонар, што сярод іх жыве паэт! Ян Запруднік, Зора Кіпель, Том Бэрд зрабілі невялічкія аналізы творчасьці паэта, а Міхась Сенька падсумаваў паэтаву шырокую грамадзкую дзейнасьць. Ад імя БІНіМу я падзякаваў і саўтрывэрскаму грамадзтву, асабліва Ігару Шчорсу, за шчодрае фінансавае падтрыманьне друку. Мне і Зоры паэт падараваў кнігу з надпісам «Дарагім Зоры і Вітаўту Кіпелям – «віноўнікам» блакітнага полымя «Міжагнёўя» ад шчырага сэрца».

Пашырэньне выдавецкай дзейнасьці

Гэтак, можна сказаць, сэрыя кніжак «Беларускія паэты й пісьменьнікі» пачалася і выдатна разьвівалася. Паступалі замовы ад бібліятэкаў, зьяўляліся рэцэнзіі, па меры магчымасьці пасылалі кнігі і ў Беларусь. Досыць хутка, на пачатку 1990-х, рэдагаваньне і апрацоўку кніжак у сэрыі ўзялі ў свае рукі новыя эмігранты – Алена Юрэвіч, Навум Кацнэльсон, Лявон Юрэвіч. Яны сапраўды дадалі энэргіі, кніжкі пачалі выходзіць амаль пэрыядычна, прычым Алена Казіміраўна Юрэвіч, заслужаны беларусавед, навязала лучнасьць зь Менскам, і чаго не хапала да сэрыі (напрыклад, апавяданьні Міколы Цэлеша), мы атрымалі праз Людмілу Рабок зь Менску. Пачалася сапраўды супольная праца БІНіМу і Бацькаўшчыны.

У сэрыі выйшлі кнігі Уладзімера Дудзіцкага, Антона Адамовіча, Міколы Цэлеша, Лявона Савёнка, Юркі Віцьбіча ды абагульняючыя літаратурныя працы Лявона Юрэвіча.

Калі мы ўбачылі што літаратурная сэрыя «на добрай дарозе», пачалі рабіць пляны, каб пачаць іншую сэрыю – бібліяграфічную. Справа ў тым, што як амэрыканскія бібліятэкі, так і бібліятэкі сьвету найперш імкнуцца набываць бібліяграфіі, бо бібліяграфіі – ключ да далейшых пошукаў, знаёмства зь літаратурай. Беларускіх бібліяграфіяў, на жаль, было на кніжным рынку малавата, і мы ведалі, што амэрыканскія бібліятэкі беларускую бібліяграфічную сэрыю адразу прымуць. Забегшы наперад, скажу – мы не памыліліся.

Бібліяграфічная сэрыя

Бібліяграфічную сэрыю БІНіМу пачалі з кнігі «Бібліяграфія: Купала і Колас на Захадзе» (1985) – і кніжка хутка разышлася. Трэба сказаць, што пра «Коласа-Купалу» ў амэрыканскім літаратурным і ўні-

вэрсытэцкім сьвеце часам успаміналася, і таму мы наперад ведалі, што бібліяграфіяй зацікавяцца. Так яно й было – «Бібліяграфія: Купала і Колас» «насьцярожыла» славістаў: ёсьць беларускія бібліяграфіі і ў ЗША. Тыраж гэтай кнігі быў 300 экзэмпляраў.

Пару слоў аб іншай кнізе ў бібліяграфічнай сэрыі БІНіМу – «Byelorussian Statehood. Беларуская дзяржаўнасьць» (1988). Думка апрацаваць англамоўны дапаможнік, які ўлучаў бы ў сябе даведнік і хрэстаматыю пра нараджэньне дзяржавы БНР у 1918 годзе была ў мяне й Зоры ў галовах даўнавата (не бяруся судзіць аб першынстве, але я схільны да майго, бо думка зарадзілася ў часе «Дыялёгаў з моладзьдзю», а гэта канец 1960-х – пачатак 1970-х гадоў). Я пачаў зьбіраць бібліяграфію англамоўных працаў аб БНР у сярэдзіне 1970-х. Аднак занятасьць фэстывалямі і ўдзел у Этнічнай радзе пакідалі мала часу для працы ў БІНіМе, калі ўлічыць, што трэба было браць удзел у канфэрэнцыях і рыхтавацца да іх. Але калі я выйшаў на пэнсію, мы сур'ёзна ўзяліся за апрацоўку англамоўнага дапаможніка пра БНР. Прызнаюся, апрацаваць бібліяграфію толькі на аснове таго, што было сабрана, не хацелася – хацелася даць нечага новага. І з гэтай мэтай мы аб'ехалі большыя бібліятэкі, дзе спадзяваліся знайсьці нешта новае пра БНР. У Скарынінцы ў Лёндане мы «знайшлі»манускрыпт Васіля Захаркі, пару артыкулаў Язэпа Варонкі. Шмат часапісаў знайшлі ў бібліятэцы Хэльсынкі (бібліятэка, у якую дасылалася ўсё, што друкавалася ў Расейскай імпэрыі).

Трэба сказаць, што шмат матэрыялаў пра дзейнасьць БНР – мэмарандумы, некаторыя лісты – захоўваецца ў бібліятэцы былой Лігі Нацыяў у Жэнэве. У Жэнэве мы працавалі дні два ды пазнаёміліся з дырэктарам Бібліятэкі ААН спадаром Тодарам Дзімітравым, баўгарынам па нацыянальнасьці. Ён паказаў ладна некаталягаваных матэрыялаў, а таксама ў каталёгу беларускія матэрыялы пад іншымі рубрыкамі. Мы зь ім пасябравалі і прапанавалі сваю дапамогу, калі б яму што спатрэбілася ў ЗША.

Апрача гэтага ў бібліяграфічнай сэрыі мы выдалі «Пяць стагодьздзяў Скарыніяны» доктара Тумаша, бібліяграфію беларускіх слоўнікаў (Вітаўт Кіпель, Зьміцер і Ілона Саўкі) ды іншыя кнігі (дагэтуль выйшла 9, сэрыя прадаўжаецца).

У бібліяграфічнай сэрыі БІНіМу варта вылучыць адну публікацыю, паводле зьместу гэта больш дакумэнтацыя, чым бібліяграфія – манумэнтальная праца «Архівы БНР. Том І. Кн. 1 і 2» (1998) укладаньня, аўтарства і рэдакцыі Сяргея Шупы. Гэткай працы ў гісторыі беларускага кнігадруку не было – гэта надзвычайная дакумэнтацыя гісторыі новай беларускай дзяржаўнасьці. Гэтыя два тамы – неаспрэчны дакумэнт, адказ скептыкам, што БНР была і дзеіла. «Архівы БНР» – праца, ініцыяваная, выкананая і дадзеная чытачу адным чалавекам – Сяргеем Шупам. Публікацыю дакумэнтаў ён пачынаў у пэрыядычным

бюлетэні «Acta Archivalia Alboruthenica» (Вільня, 1993–1994), але хутка спасьцярог, што кніга прынясе большую карысьць беларускай навуцы. З задавальненьнем скажу, што мы ў БІНіМе Сяргея Шупу ад самага пачатку зразумелі, падтрымоўвалі і дапамагалі выдаць працу.

Сэрыя «Да гісторыі беларускай эміграцыі»

І яшчэ адну сэрыю мы распачалі ў БІНіМе – «Да гісторыі беларускай эміграцыі». Пачалі мы яе як нумараваную, першай кнігай была праца Яна Максімюка «Беларуская гімназія імя Янкі Купалы ў Заходняй Нямеччыне 1945–1950» (Нью Ёрк – Беласток, БІНіМ, 1994). Аднак нумарацыя ў сэрыі хутка паблыталася, і цяпер сэрыя прадаўжаецца без нумароў. Аб кнізе Яна Максімюка можна толькі сказаць: такой поўнай, аналітычнай, удумлівай працы аб эміграцыйнай установе ні ў нас, ні ў суседзяў не было. Кніга – фундамэнтальная, аўтару бязьмежная падзяка.

Дасюль у сэрыі «Да гісторыі эміграцыі» выйшлі кнігі Яна Запрудніка «Дванаццатка» (2001), Вітаўта Кіпеля «Беларусы ў ЗША» (1993), Лявона Юрэвіча «Летапісны звод сусьвету Чалавека Сьведамага» (2006), Алега Гардзіенкі «Беларускі Кангрэсавы Камітэт Амэрыкі» (2009).

Не магу ўстрымацца, каб не сказаць пару словаў аб некаторых з гэтых кніг. Найперш аб кнізе «Беларусы ў ЗША» майго аўтарства, якую я марыў напісаць ад пачатку майго побыту ў ЗША. Як рабілася кніга? Да гэтай кнігі цалкам падыходзіць банальны выраз «аўтар працуе над ёй усё жыцьцё». Як я зазначаў раней – як толькі я, зусім новы імігрант, не знайшоў інфармацыі пра беларусаў у бібліятэцы гораду Пасэйку (калядная пара, 1955 год), у мяне зьявілася думка – напісаць пра беларусаў у ЗША. Але колькі такіх думак скача ў галаве – шмат іх проста забываецца. Думкі пра беларусаў у ЗША я не пакідаў. Ад таго часу, калі дзе што знаходзіў пра землякоў – закладаў у папку. У гэтым выпадку выдатна падыходзяць радкі Маякоўскага: «Тысячи тонн словесной руды единого слова ради». Сапраўды, часам перачытаеш сотні бачынаў газэт, старонак кніжак, пакуль знойдзеш слова «беларус» – і тую публікацыю закладаеш у папку. За тысячамі перагледжаных друкаваных старонак зьведваліся архівы, падвалы цэркваў і падобнае. Нарэшце, я бачыў, што матэрыялу хапае. Кніга сунулася наперад. І гэтак сунуцца яна магла б яшчэ доўга, каб не... перабудова, развал СССР, паездка «дахаты»! Зьбег гэтых акалічнасьцяў спрыяў рэалізацыі задумы, і гэтаму дапамаглі некалькі канкрэтных людзей. Гэта Алесь Лукашук – першы, хто пабачыў англамоўны манускрыпт і сказаў: «Трэба выдаваць»; Сяргей Шупа, рэдактар, які пераклаў манускрыпт з ангельскай мовы ў беларускую і падрыхтаваў макет; Адам Мальдзіс і Пётра Краўчанка – адміністратары, якія дапамагалі ў Менску і залагоджвалі бюракратычныя пытаньні. Я ім шчыра ўдзячны!

Сэрыя «Да гісторыі беларускай эміграцыі» дзейная і да цяпер. Выходзяць кнігі гэтай сэрыі ў Беларусі пад грыфам БІНіМу, зьяўляюцца «манумэнты» ў гэтай сэрыі і на эміграцыі.

Адна з апошніх кніг «гістарычнай» сэрыі – «Беларускія фэстывалі й выстаўкі ў Нью Джэрзі: Палітычная інфармацыя моваю мастацтва (1948–2011)» (Нью Ёрк, 2013) аўтарства доктара Яна Запрудніка. Кніга дзьвюхмоўная, ангельска-беларуская, прычым тэксты падобныя, але не ідэнтычныя. Кніга – фактычна, каляровы альбом – аформленая Ірынай і Мікалаем Дутко. Я напісаў прадмовы да абедзьвюх частак. Гэтая кніга, на мой пагляд, вельмі важная тым, што падсумоўвае грамадзка-рэпрэзэнтацыйную працу беларусаў у штаце Нью Джэрзі: сотні прозьвішчаў дакумэнтуюць агульную дзейнасьць. Другі аспэкт, які разьвівае кніга – «запросіны» цяперашнім эмігрантам: стварайце новыя калектывы, рэпрэзэнтуйце Беларусь! Беларусь і надалей застаецца малаведамая, новыя эмігранты, цяпер – ваша чарга! І далей, як, відаць, і плянаваў аўтар, кніга знаходзіць сваё месца на палічках ня толькі бібліятэкаў, але і ў сотнях хатаў – унукаў тых дзядоў-«першапраходцаў», якія 50-70 гадоў таму выступалі ад Беларусі. Хочацца думаць, што гэтыя тры аспэкты: багатая гістарычна-храналягічная спадчына, заклікі да новых эмігрантаў і «прыспаная энэргія» ўнукаў – прычыняцца да стварэньня беларускіх эстрадных калектываў і да пашырэньня беларускай прысутнасьці ў шырокай амэрыканскай эстрадзе – дзейнай і прыгожай – у штаце Нью Джэрзі. Яшчэ адна спроба старэйшага пакаленьня прыцягнуць да грамадзкай працы «новых землякоў». Дарэчы, кніга доктара Запрудніка выдадзеная БІНіМам на грамадзкія ахвяраваньні пры вельмі шчодрай, каля $7.000, фінансавай падтрымцы Надзі і Яна Запруднікаў.

Іншыя кнігі

1980-я гады для выдавецкай праграмы БІНіМу былі вельмі спорныя і напружаныя. Апрача сэрыяў, выходзілі і іншыя кнігі. Так, у пачатку 1988 году праз Канаду, праз Кастуся Акулу прыйшоў да нас манускрыпт з суправаджальным лістом, дзе прасілі надрукаваць кнігу, якую ў БССР ніхто не хацеў друкаваць – «Праз рок-прызму» Вітаўта Мартыненкі і Анатоля Мяльгуя. Прааналізаваўшы зьмест, БІНіМ пастанавіў гэтую кнігу выдаць. Праўда, тэхнічна гэта было ня так проста, бо набор рабіў Акула (Прускі быў заняты). Да супрацоўніцтва мы падключылі сябра БІНіМу Адама Акуліча (на той час – «новага эмігранта», былога актора ТЮГу) ды Паўліну Сурвілу – выкладчыцу амэрыканскага коледжу, спэцыяліста па музыкалёгіі. Фінансы я забясьпечыў асноўным чынам за кошт грамадзкіх ахвяраваньняў і невялікіх сумаў з боку беларускіх арганізацыяў – БАЗА, Фундацыі Пётры Крачэўскага, БККА і БАПЦ. Кніга была гатовая ў 1989 годзе

і хутка разышлася. Акула значную частку тыражу пераслаў у Беларусь.

Аднак «на варштаце» былі ня толькі беларускія праграмы, мы шмат супрацоўнічалі з амэрыканскімі выдавецтвамі, празь якія можна было тлумачыць і пашыраць «беларускую справу».

Эўрапейская спадчына

Ад імя БІНіМу я супрацоўнічаў і зь іншымі выдавецтвамі, у якіх друкавалася інфармацыя пра Ўсходнюю Эўропу, Беларусь. Адным з найбольш працаёмкіх праектаў была сэрыя кніжак пад назовам «Эўрапейская спадчына» (European Heritage), якую выдаваў New York Times, дакладней адно зь яго адгалінаваньняў, выдавецтва Arno Press. Была ідэя стварыць сэрыю выданьняў для амэрыканскіх коледжаў пра пачаткі эўрапейскай эміграцыі ў Амэрыку. З гэтым яны зьвярнуліся ў БІНіМ да мяне – я ў той час ужо быў старшынём БІНіМу. Праца была такая: было пяць чалавек: рэдактар – прафэсар з Mont Claire University, і чатыры асобы рэдкалегія. Нам трэба было выбраць кожнаму па некалькі сотняў доктарскіх дысэртацыяў на тэму эміграцыі і, перачытаўшы іх, падабраць каля 15 такіх, якія надаюцца для друку. New York Times хацеў выдаць сэрыю «Эўрапейская спадчына» ў 50 тамах. У выніку яны выдалі 49 тамоў. Нам трэба было аформіць гэтых 49 тамоў з агульнай базы каля тысячы доктарскіх дысэртацыяў. Гэта было даволі прэстыжнае і працаёмкае заданьне.

Я прачытаў, можа, каля сотні дысэртацыяў. І толькі ў адной доктарскай дысэртацыі была згадка, што людзі выяжджалі зь Беларусі. Але паколькі кнігі былі рэклямай тым, хто працаваў у гэтай рэдкалегіі для New York Times – я быў зь Беларусі, галоўны рэдактар быў італьянскага паходжаньня, яшчэ адзін быў шкоцкага паходжаньня – гэта была і рэкляма для Беларусі. І ў маіх прадмовах да некаторых тамоў, якія я рэкамэндаваў да друку, я казаў, што я паходжу зь Беларусі і што лёс эміграцыі зь Беларусі падобны да таго, што апісваецца ў гэтым томе, які я рэкамэндую для друку.

Гэтыя тамы выйшлі, нам быў заплачаны нядрэнны ганарар – пару тысячаў кожнаму з нас, і мы атрымалі поўны камплект выданьня, я перадаў яго ў Нацыянальную бібліятэку Беларусі, бо мне гэтыя 49 кніжак былі непатрэбныя – яны ёсьць у амэрыканскіх бібліятэках.

Супрацоўніцтва з энцыкляпэдычнымі выданьнямі

Апрача працы ў рамках БІНіМаўскіх выдавецкіх праграмаў, я супрацоўнічаў з шматлікімі энцыкляпэдычнымі выданьнямі. Я даў артыкулы ў American Immigrant Cultures (1998) – энцыкляпэдыю

культураў Амэрыкі, разьлічаную на студэнтаў. Мае артыкулы выйшлі ў Dictionary of American Immigrant History (1990), у энцыкляпэдыях гарадоў і штатаў – Encyclopedia of New York City (1993), Encyclopedia of Cleveland (1997), Encyclopedia of Chicago (2004), Encyclopedia of New York State (2005) ды ў іншых інфармацыйных выданьнях, якія ёсьць цяпер у бібліятэках тысячаў школаў і сотняў коледжаў.

Пра беларускую эміграцыю я апублікаваў артыкул у Энцыкляпэдыі ўкраінскай дыяспары (2005).

Вельмі прыемная зьява на гэтай дзялянцы – прадстаўнікі «новай» эміграцыі, у першую чаргу Лявон Юрэвіч, перанялі эстафэту ў пашырэньні інфармацыі. Лявон напісаў некалькі артыкулаў у розныя энцыкляпэдыі, ён надалей выдатна супрацоўнічае з амэрыканскімі арганізацыямі і выдавецтвамі.

У некаторых кнігах БІНіМу мы зьмяшчалі англамоўныя ўступы, якія чыталіся на славянскіх факультэтах. Дарэчы, дзе маглі, мы дапаўнялі англамоўныя выданьні кароткімі нататкамі аб беларускай перакладной літаратуры. Я асабіста напісаў у папулярны літаратурны дапаможнік Reader's Advisor (1977) артыкул аб беларускай літаратуры ў ангельскай мове.

«*Сакрэт Лофтуса*»

1980-я гады былі плённымі ў працы БІНіМу, аднак навокал беларускай дыяспары адбываліся і адмоўныя падзеі, якія ўплывалі на працу. Няма словаў, адыход доктара Тумаша быў невымернай стратай. Але ў тым самым часе ўсплыла «справа Лофтуса», якая ўзяла шмат часу і сілаў на тлумачэньні і абарону ад нападаў на беларусаўамэрыканцаў безь перабольшаньня «чужых і варожых сілаў». Займала часу пісаньне апраўдальна-вытлумачальных мэмарандумаў, візыты да канграсмэнаў у Вашынгтоне, Нью Ёрку і Нью Джэрзі, а таксама гутаркі з адвакатамі.

Кніжка Лофтуса «Belarus Secret» прадавалася, думаю, што ён на ёй зарабіў. Яна падавалася так, што вы, простыя грамадзяне, маўляў, ня ведаеце, а я працаваў з матэрыяламі і раскрыў гэтыя цёмныя беларускія справы. Пры гэтым у кнізе поўна ўсякай белібярды. Там такія моманты: на беларускіх могілках у Саўт Рывэры 95% пахаваных былі ў беларускай адміністрацыі ў часы нямецкай акупацыі, уключна з Астроўскім, Касяком, іншымі. Гэтыя могілкі маюць браму, у гэтай браме ёсьць невялікія весьнічкі, там трэба падняць клямку і ўвайсьці. Лофтус піша: «У іх зачыненая брама, я мусіў пералазіць праз каменны плот, а ўначы трэба лезьці вельмі асьцярожна, бо можа пабачыць паліцыя...» І далей усякае такое шэрлакхолмства. Я, прачытаўшы кнігу, думаю – як жа ў іх там зачыняецца, паехаў у Саўт Рывэр, гляджу – могілкі адчыненыя 24 гадзіны! А брама зачы-

неная – яна адчыняецца толькі калі ўяжджае катафалк або грузавік з помнікам.

Карацей, камэрцыйны аспэкт Лофтусу ўдаўся, зрабіў ён прапаганду, але была гэта прапаганда і для Беларусі, бо ня ўсе ўспрымалі гэта так, нібыта беларусы ў часе Другой сусьветнай вайны нешта вялікае крымінальнае зрабілі. Шмат людзей казалі і выступалі ў газэтах, што – ну што ж, была адміністрацыя, трэба было некаму працаваць і людзі працавалі. Я б сказаў, што ў агульным афэра Лофтуса зрабіла прапаганду для Беларусі – можа й ня так, як нам бы хацелася, але і так пра Беларусь было мала ведама, дык шмат шкоднага не адбылося.

Кніжка Лофтуса разышлася шырака. Езьдзячы па краіне, я, дзе ні прыеду, дзе ні зайду ў бібліятэку – «Belarus Secret» ёсьць, заўсёды стаіць на паліцы. Умела зробленая рэкляма кнігі, умела распрададзеная.

Справа Адамовіча

Адыход ад дзейнасьці доктара Тумаша праз савецкія даносы быў вялікім ударам і тормазам у працы, але беларуская дзейнасьць мусіла прадаўжацца. Неяк наладжвалі працу. І раптам – як гром зь яснага неба – Адамовіча клічуць у Іміграцыйнае ведамства! Ня ведаю, ці гэтая кампанія была зьвязаная з справай Лофтуса, але падзея адбывалася больш менш у тым самым часе. Адамовіч паказаў мне позву і папрасіў ісьці разам зь ім. Бясспрэчна, ісьці з Адамовічам я мушу – ён мяне ведае ад маіх 5-6 гадоў, зь Вяткі, да таго ж, «сьцежкі» ў Іміграцыйнае ведамства мне вядомыя, за паўгода перад тым я бываў там з Тумашам.

Справа Адамовіча была падобная, але інакшая ад Тумашавай. Адзін бок праверкі – вызначэньне месца народжаньня (ці правільна яно пададзенае ў іміграцыйных анкетах канца 1940-х гадоў), а другі – ці Адамовіч быў аўтарам антысэміцкіх і антыамэрыканскіх артыкулаў у «Раніцы» і іншых газэтах у 1943–1944 гадох. Адносна месца народжаньня справа разьвязалася хутка: у анкеце Адамовіч запісаў Менск – што праўда, але нехта, не ягонай рукой, дадаў у дужках «Заходняя Беларусь». Цяпер на запытаньне сьледчых Адамовіч паўтарыў, што народжаны ў Менску, а дапіска – справа не ягоная, з чым сьледчы пагадзіўся. Значыць, пры ўезьдзе ў ЗША ў Адамовічавых анкетах фальшу не было.

Тады перайшлі да разгляду другога пытаньня справы, якое датычыла палітычных артыкулаў антысэміцкага і антыамэрыканскага зьместу, якія друкаваліся ў бэрлінскай беларускай газэце «Раніца» і іншых выданьнях. Справа ў тым, што Адамовіч быў мусова перавезены ў Нямеччыну зь Менску ў 1943 годзе і там працаваў пад Бэрлінам ва ўстанове «антыінтэрнацыянальнага» профілю. Шмат друкаванае

прадукцыі гэтае ўстановы было пранацысцкай, антысацыялістычнай, антысавецкай, але ўсе артыкулы былі бяз подпісаў. Адамовічу далі паглядзець пару артыкулаў, і ён не прызнаў свайго аўтарства, як не прызнаў сваімі і пранацысцкія артыкулы ў беларускім друку. Амэрыканцам расходзілася таксама пра тое, хто пастанаўляў, зацьвярджаў да друку пранямецкія матэрыялы. На гэта Адамовіч даў адказ адразу: немцы (ён прыпомніў пару прозьвішчаў), а пра іншыя артыкулы ён выказаў думку, што гэта пераклады зь нямецкай мовы. Сьледзтва ў справе Адамовіча закончылася каля 3-й гадзіны па абедзе. Наагул іміграцыйныя ўлады ставіліся да Адамовіча зь меншай заўзятасьцю, чым да Тумаша. Прычым, на заканчэньне апытаньняў сьледчы таксама сказаў, што «Адамовічава справа» правяраецца з прычыны даносу, на думку сьледчага, у Адамовіча было «ўсё ў парадку».

Паколькі Лофтус рыхтаваў сваю кнігу недзе ў тым самым часе, яму была патрэбная рэкляма. Мабыць, ідэя была больш-менш такая: я адкрыю падпольныя цёмныя арганізацыі беларускіх фашыстаў, а слова «фашысты» ў Амэрыцы пампуе адрэналін. Ён хацеў зрабіць інтэрвію з Тумашам, але Тумаш адмовіўся, а Адамовіч на інтэрвію пагадзіўся. (Наагул Тумаш і Адамовіч былі розныя асобы. Адамовіч крышачку любіў, як яго недзе выстаўляюць, а Тумаш больш паводзіў сябе як заходні палітык – да журналістыкі падыходзіў вельмі асьцярожна, «скажаш ім адно, яны напішуць другое».) Пасьля інтэрвію з Адамовічам было паказанае па тэлебачаньні. Яно было адрэдагаванае, і кавалачкі інтэрвію былі падабраныя так, што выглядала, нібы Адамовіч быў адзін з нацысцкіх супрацоўнікаў, а цяпер працаваў у Радыё Свабода! Дык Лофтус стараўся паказаць грамадзтву, што «радыё прыцягнула да працы былых фашыстаў». Адамовіч адказаў на гэта, што з фашыстамі ён не працаваў і што супрацоўніцтва з радыё было абмежаванае. Для кіраўнікоў радыё гэта быў непрыемны момант, хоць тая справа нікому асабліва не нашкодзіла.

Новыя сілы БІНіМу

Пад канец 1980-х гадоў працаваць у БІНіМе станавілася цяжкавата, калі йдзецца пра выкананьне плянаў дзейнасьці. Цалкам адышоў ад працы доктар Тумаш, здорава «заламаўся» А. Адамовіч. На поўную пару працавалі я, Ян Запруднік, Зора, Антон Шукелойць, Том Бэрд ды «часовы памагаты» Мікола Прускі. Дапамагаў і Янка Юхнавец, а пазьней маладзейшыя Барбара Пякарская і Валік Сэльвясюк з Польшчы.

На шчасьце, сусьветная палітычная сытуацыя пачынала мяняцца: прачыніліся дзьверы ў Беларусь. Для БІНіМу гэта азначала шмат. У Нью Ёрку зьявіліся Юрэвічы-Кацнэльсоны. Алеся Казіміраўна з мужам Навумам і сынам Лявонам цалкам улучыліся ў БІНіМаўскую дзейнасьць – на іх плечы легла выданьне твораў Дудзіцкага, Цэлеша, іншых кніг.

Паступова прыплыў новых працоўных галоваў павялічваўся і праца пашыралася. Мы, «старажылы», дастаўлялі матэрыял і фінансы, радзіліся – часам бурна – з «новымі», але вынікі былі станоўчыя: выдавецкая праца БІНіМу прадаўжалася.

Апошнім дзесяцігодзьдзем інтэлектуальная дзейнасьць БІНіМу значна ўзрасла дзякуючы прытоку новых, маладых дасьледчыкаў зь Беларусі – а ў Беларусі была заснаваная Архіўная сэкцыя БІНіМу пры БДАЛіМе. Выданьне «Запісаў БІНіМу» ляжыць цяпер цалкам на плячах маладых на Бацькаўшчыне. Актыўна працуюць у БІНіМе Лявон Юрэвіч (фактычна ён можа лічыцца вэтэранам БІНіМу, бо «цягне лямку» ад 1993 году), Зьміцер і Ілона Саўкі, Сяргей Шупа, Таня Кулакевіч, Юрась Гарбінскі, Алег Гардзіенка ды Натальля Гардзіенка (рэдактар «Запісаў»).

У 2005 годзе ад імя БІНіМу я падпісаў кантракт супрацоўніцтва з Польскай Акадэміяй Навук. Былі выдадзеныя ў Варшаве «Беларускі друк на Захадзе» (2006) і доктарская дысэртацыя Юрася Гарбінскага «Беларускі рэлігійны друк на Захадзе» (2009).

У супрацоўніцтве з польскімі навуковымі ўстановамі БІНіМ пачаў выданьне кніг на рэлігійную тэматыку. Мушу тут зазначыць, што ў мінулым беларускія арганізацыі, навуковыя і дасьледныя суполкі ўстрымоўваліся ад выданьня рэлігійнага друку, маўляў, «рэлігія – ня наша справа». У БІНіМе мы прыйшлі да перакананьня, што і беларускі рэлігійны друк – справа нашая. Нельга абыходзіць стараною такую важную галіну жыцьця народу, як рэлігія. Таму з у пэўненасьцю ў сваёй рацыі мы распачалі і рэлігійнае кнігавыданьне: былі выдадзеныя працы а. М. Лапіцкага (2005), які як сьвятар адрадзіў гістарычную традыцыю – беларускія прыходы ў юрысдыкцыі Канстантынопальскага патрыярха, а таксама працы мітрапаліта Мікалая, Першаярарха БАПЦ (2014), саліднага духоўнага практыка ды стваральніка рэлігійнай літаратуры для праваслаўных вернікаў.

У ЗША памыснае супрацоўніцтва адбываецца з БАЗА і БККА. Дарэчы, БККА (Беларускі Кангрэсавы Камітэт Амэрыкі) стварыў выдавецкую камісію: старшыня Алена Касоўская (Лапіцкая), сябры Бабі Цупрык, Жорж Навумчык, Жорж Арцішэнка, Ліза Літаровіч, Надзя Запруднік, В. і М. Сенькі, Таня Кулакевіч, Віталі і Ірэна Цярпіцкія. Была выдадзеная манаграфія пра БККА аўтарства Алега Гардзіенкі і падрыхтаваная кніга пра БЦР.

Ангельска-беларускі слоўнік

Падсумоўваючы кнігавыдавецкую дзейнасьць БІНіМу, я гляджу на яе як на найбольш працаёмкую: дзясяткі людзей – пісьменьнікаў, дасьледчыкаў – укладалі тысячы і тысячы гадзінаў, арыгінальныя творчыя думкі ў працу «для душы», для беларускай культуры, за

якую не атрымлівалі нічога апрача ўдзячнасьці чытача. Бясспрэчна, нешта мы зрабілі, нечага дасягнулі. Цяжка дакладна вызначыць, якая з тых кнігаў была «чэмпіёнам» па працаёмкасьці. Але прыпушчаю, што мэдаль належыць «Ангельска-беларускаму слоўніку», асноўная картатэка якога была ўкладзеная Валентынай Пашкевіч, а апрацоўка рухалася дзесяцігодзьдзямі пад кіраўніцтвам Зоры Кіпель і Яна Запрудніка пры канчатковым рэдагаваньні Сяргея Шупы. Каля 20 чалавек рэдкалегіі на працягу блізу 20 гадоў карпатліва, дзень у дзень стваралі кнігу, якую сёньня мае карыстальнік, а ў дзесяткох заходніх бібліятэкаў гэты слоўнік – адзіны ключ доступу англамоўнай публікі да беларускай літаратуры.

Рэдактар слоўніка Сяргей Шупа ў інтэрвію з нагоды выхаду кнігі з друку сказаў, што слоўнік быў створаны на энтузіязме. Так, энтузіязму ў працы было шмат. Дыскутавалі картатэку ўсюды, улучна з паседжаньнем у Менску ў кабінэце старшыні Саюзу Пісьменьнікаў Беларусі Вольгі Іпатавай – БІНіМ шчыра ўдзячны паэтэсе. Аднак гэты энтузіязм быў падмацаваны кампэтэнцыяй і вялікай працай. Прыпомню такое: калі слоўнік быў гатовы да друку, рэдкалегія вырашыла праверыць, вычытаць яшчэ раз англамоўную частку. Канчатковая чытка была за прафэсарам Томам Бэрдам. Мэханіка гэтага цыклю працы выглядала наступна: у 2004–2005 гадох кожную сераду і кожную другую суботу я ехаў з матэрыяламі слоўніка да Тома ў Куінз Коледж, дзе ад 8.30 да 16.30 чыталася англамоўная частка. Я вёў каляндарык працоўных дзён. Дык вось, на канчатковую вычытку англамоўнае часткі было патрачана 132 дні, а калі перавесьці ў гадзіны – каля 1000 гадзін. Нядрэнная падтрымка энтузіязму!

Як зьбіраліся грошы на кнігавыдавецтва

Ясна без асаблівых тлумачэньняў: не было б выдавецкай дзейнасьці БІНіМу, калі б не было фінансавай базы. Сяброўскіх складак БІНіМу на выдавецтва не хапала, фінансавую аснову трэба было стварыць. Я каардынаваў фінансы БІНіМу, але вельмі часта нарады аб «грашох» адбываліся з Запруднікам, Шукелойцем, Зорай і нашым «практычным» дараднікам Міколам Прускім. Фінансавую базу дзейнасьці БІНіМу стваралі шырокае беларускае грамадзтва, датацыі Фундацыі імя Пётры Крачэўскага, аказійныя сумы ад беларускіх арганізацыяў (БАЗА, БНР), ахвяраваньні сябраў БІНіМу, індывідуальных дабрадзеяў і... прыбыткі з продажу кнігаў.

Працы хапала. Перад кожным кніжным праектам рассылаліся сотні лістоў-тлумачэньняў: што мы плянуем рабіць і колькі праект будзе каштаваць. Тлумачэньне грамадзтву плянаў БІНіМу было гарантыяй падтрымкі. Прычым падкрэсьлю, лісты з адозвамі, заклікамі і просьбамі слаліся з нагоды кожнага новага пачыну, будзь то малая

кніга аб Браніславу Туронку (1990) ці вялікі праект «Архіваў БНР» (1998) – грамадзтва такую інфармацыю вельмі дацэньвала і дзейнасьць БІНіМу падтрымоўвала.

На «багацейшых» дабрадзеяў зьвярталася большая ўвага. Прыпамінаюцца і цікавыя здарэньні з практыкі здабыцьця фінансаў для БІНіМу. Было такое: у беларускай рэдакцыі «Радыё Свабода» ў Нью Ёрку людзі мяняліся – гэта дапілноўваў Ян Запруднік. У канцы 1970-х у рэдакцыю прыйшоў новы журналіст – патрыятычны, абазнаны ў беларускіх справах, былы актор ТЮГу Адам Акуліч. Адам аказаўся добрым калегам і сябрам. Праз пару гадоў Адам вырашыў купіць хату і, як водзіцца і як бывала й раней з Анатолем Цярэшкам, зьвярнуўся шмат да каго, каб пазычылі грошай. Мы ўсе скінуліся па пару тысяч, а Адамовіч пазычыў Адаму 5 тысячаў. Праз год-два Адам пачаў сплачваць пазыкі і, аддаючы Адамовічу 5 тысячаў, пачуў такое: «От аддае! Я зьбіраюся ісьці ў дом старцаў – там забяруць усе грошы. Ты, Адаме, аддай мае 5 тысячаў на БІНіМ». Адам гэтак і зрабіў.

Іншая цікавая гісторыйка. Юрась Гарбінскі апрацаваў вялікую кнігу пра беларускі рэлігійны друк на эміграцыі (выйшла ў 2009 годзе). Кнігу гэтую мы друкавалі ў Польшчы, але кошты друку поўнасьцю забясьпечыў БІНіМ – каля $15.000. Плаціліў тры раты, і вось надышоў час слаць трэцюю рату – час расплаціцца. Я званю «абяцальнікам»: шліце абяцаныя сумы! Званю ў Аўстралію Міхасю Лужынскаму (зь ім я быў знаёмы і сябраваў яшчэ з часоў скаўтынгу ў лягерах DP), кажу: «Міхась, шлі абяцаныя тры тысячы на кнігу Гарбінскага – грошы патрэбныя зараз». А Лужынскі мне ў адказ: «Вітаўт, я цяпер еду ў турыстычнае падарожжа, закладзі за мяне». Ну закладзі дык закладзі. Я залажыў за яго тры тысячы. Але! З падарожжа Міхась не вярнуўся: у Пецярбургу пасьлізнуўся на жалезным трапе, упаў і паехаў у «лепшы сьвет»... Вечная яму памяць!

Такое бывала часта: сябры БІНіМу закладалі аплату за друк сваімі грашыма. Сьвежы прыклад: Ян Запруднік выдаў кнігі пра фэстывалі (2013), а БІНіМ недабраў да патрэбнай сумы, і 7 тысячаў даляраў даплацілі Янка і Надзя Запруднікі. Так бывала раней, так бывае й цяпер – для справы ахвяраваць ня грэх. Мая шчырая падзяка і Янку з Надзяй, і іншым «змушаным» ахвярадаўцам.

Сьцьверджу з задавальненьнем аднак тое, што эмігранцкая літаратура сёньня налічае дзесяткі і дзесяткі пазыцыяў. Ганна Сурмач у нядаўна выдадзенай кнізе «Беларусь бязь межаў» (2013, рэдактар Валянціна Трыгубовіч, прадмова мая) склала сьпіс кніжных выданьняў «пра беларускую эміграцыю», куды ўвайшло панад 60 кніг пра беларускую эміграцыю, зь якіх 52 у беларускай мове. Перагортваючы ацалелыя пажоўклыя падшыўкі фінансавых дакумэнтаў (хоць і ня ўсе яны захаваліся), я падлічыў, што на кніжна-выдавецкую дзей-

насьць БІНіМ за мінулыя 60 гадоў выдаткаваў панад $250.000! Сума немалая. Але і кніжак выдалі нямала: паводле майго павярхоўнага падліку, каля 50 назваў. За ўсё гэта падзяка беларускаму грамадзтву, Фундацыі імя Пётры Крачэўскага, сотням індывідуальных ахвярадаўцаў ды асабліва сябром БІНіМу, людзям небагатым, але сьведамым і ахвярным – заўсёдным падтрымальнікам беларускай справы.

Падтрымка грамадзтва

Паколькі мне давялося найчасьцей мець дачыненьне з друкам, кніжнай прадукцыяй, я заўсёды шчыра дзякаваў грамадзтву, а цяпер выкажу такую думку, падкрэсьлю яе на аснове блізу 60-гадовае дзейнасьці. Якое б малое і раздробленае ні было грамадзтва, але калі яно пераконваецца, што робіцца патрэбная справа – грамадзтва справу патрымае. Я верыў у грамадзтва, калі працаваў у БІНіМе, арганізоўваў фэстывалі, беларускія імпрэзы. Веру я ў падтрымку грамадзтва і сёньня, хоць перажываем мы, беларусы-эмігранты, пераважна «ціхі» пэрыяд нашага побыту на Захадзе. Мушу таксама падзяліцца з чытачом і такім прыемным мамэнтам: павышаецца ўзровень адрэналіну, калі, адведваючы, прыкладам, бібліятэку Прынстанскага ўнівэрсытэту або Ўнівэрсытэту штату Вісконсін, бачыш, як на паліцах адкрытага доступу на відным месцы стаяць «Архівы БНР» ці Ангельска-беларускі слоўнік. І не «стаяць» – гэтымі выданьнямі карыстаюцца тысячы студэнтаў. Няма словаў, выдатнае пачуцьцё!

«Запісы»

Да кніжнай прадукцыі трэба дадаць і выданьне «Запісаў» – у 2015 годзе выйшаў ужо 37-ы выпуск. Праўда, на «Запісы», пачынаючы ад канца 20-х выпускаў, мы рэгулярна атрымоўвалі дапамогу ад Фундацыі Крачэўскага, якая пакрывала 70-75% выдаткаў. (Да таго «Запісы» цалкам утрымліваліся беларускім грамадзтвам з дадаткам сумаў ад падпіскі.) Такая «формула» працягваецца і цяпер, калі выданьне «Запісаў» ад 21-га нумару амаль цалкам у руках дасьледнікаў зь Беларусі – Сяргея Шупы, Лявона Юрэвіча, Алега і Натальлі Гардзіенкаў, Зьмітра і Ілоны Саўкаў. Юрася Гарбінскага. Праўда, галоўным рэдактарам «Запісаў» ад 18-га выпуску і да 2015 году быў наш блізкі сябра і супрацоўнік прафэсар Томас Бэрд, якому мы ўдзячныя за ўсё англамоўнае, што выходзіць пад грыфам БІНіМу, а таксама за шырокае ўвядзеньне «Запісаў» у англамоўны акадэмічны сьвет. Паважаны Том, вялікая падзяка табе за доўгія гады супрацоўніцтва!

Выданьне «Курапатаў»

Прыпамінаючы аб кніжнай прадукцыі БІНіМу, ясная справа, неабходна расказаць і аб «Курапатах». Гэтая кніжка – фактычна дакумэнтальны помнік мільёнам замардаваных савецкай уладай беларусаў. БІНіМ разаслаў яе ў каля 800 установаў сьвету, якія вывучаюць злачынствы нарадагубстваў. Цікавай была гісторыя яе выданьня.

На Кангрэсе беларусістаў у Менску ў травені 1991 году я даведаўся, што манускрыпт «Курапатаў» ужо падрыхтаваны, але яшчэ нікім ня выдадзены. Гэтаксама ў кулюарах кангрэсу мне сказалі, што спробы перадаць манускрыпт на Захад былі, але «недзе нешта не пайшло». Пачуўшы такія непрыемныя весткі, я ўсё ж вырашыў даведацца аб «Курапатах» больш канкрэтна.

Хоць у стаўленьні да нас, «амэрыканцаў», на Кангрэсе адчуваўся халадок, з Мальдзісам я чуўся добра, адкрыта, таму, гуляючы па вуліцах каля Дому літаратара, павёў зь ім гутарку пра «Курапаты». Мальдзіс шчыра сказаў, што пра манускрыпт шмат ня ведае , але запросіць да сябе ў хату на невялічкае прыняцьцё пасьля Кангрэсу Зянона Пазьняка, расказаўшы яму папярэдне, што БІНіМ цікавіцца манускрыптам.

Гэтак і сталася. На «гарбатку» (а было і да гарбаткі!) прыйшоў Пазьняк, і я зь ім пачаў гутарку, спытаўшыся, у якім стане выданьне «Курапатаў». Пазьняк расказаў пра розныя спробы выдрукаваць манускрыпт, але ўсе яны былі няўдалыя. Я яму кажу: «Давайце мне манускрыпт, мы надрукуем і распаўсюдзім». Пазьняк дастаў з партфэля немалых памераў манускрыпт і асьцярожна, молячыся да ўсіх сьвятых, ня вельмі ахвоча перадаў яго мне. «Майце на ўвазе, – сказаў ён, – гэта нацыянальны скарб! Ён ня можа згінуць». Думаю, паколькі мы сустракаліся ўпершыню, Пазьняк ня надта мне давяраў, але тым ня менш рызыкнуў.

Атрымаўшы манускрыпт, я пачаў думаць, як яго перавезьці. Палёт назад праз Маскву – могуць «шманаць». Але калі мы ляцелі, я манускрыпт схаваў пад ніжнюю кашулю, трымаў не «на пузе», а на сьпіне, здавалася, мой выгляд быў больш-менш натуральны! У Маскве праз мытны кантроль прайшлі бяз клопатаў, але на багажным канвэеры я заўважыў, што мой чамадан мытнікі соваюць туды-сюды. Я трохі спалохаўся, падумаў – калі прычэпяцца да чамадана, то могуць і мяне абмацаць. Падыходжу я да мытнікаў і кажу: «Ребята, вам что-то неясно в чемодане, да?» – «Да нет...», – сьмяюцца мытнікі. Кажуць, вось адну бутэльку расчыталі – «Белавежская», а другую ніяк ня могуць, дык што гэта за бутэлька? Ребята, кажу, я сам ня надта памятаю, але прапусьціце чамадан, а невядомая бутэлька – ваша! Праўда, бутэльку пры людзях яны ня ўзялі, я прынёс ім яе пазьней, але аддаў бы ім усё – абы яны не пабачылі «Курапатаў».

Вось так манускрыпт «Курапатаў» выехаў зь Беларусі і пасьля быў надрукаваны ў Нью Ёрку. Манускрыпт пераклала ў ангельскую мову Вера Рыч, рэдактарам кнігі быў Том Бэрд. Тыраж першага выданьня быў 3 000 экзэмпляраў. Кніга шырака разыходзілася, былі водгукі ў друку, даводзілася мець «міні-канфэрэнцыі».

Здаецца, у Дэнвэры (штат Каларада) на гадавым зьезьдзе амэрыканскіх славістаў мне давялося выступіць, і там амэрыканскі журналіст спытаўся, ці ў беларусаў ёсьць іншыя дакумэнты, падобныя да «Курапатаў». На што я адказаў: так, ёсьць – вялікі грунтоўны дакумэнт, праца маладзейшага беларускага гісторыка Генадзя Сагановіча «Невядомая вайна. 1654–1667», у якой аналізуюцца падзеі, зьвязаныя з наступам маскоўскіх войскаў на тэрыторыю ВКЛ і вынішчэньнем беларускага насельніцтва. Як прааналізаваў аўтар, колькасьць насельніцтва ў межах Беларусі за той пэрыяд зьменшылася амаль напалову, страты Беларусі – фізычнае вынішчэньне і вываз палонных у Расею дасягнулі каля 53 працэнтаў. Думаю, што не памылюся, калі сьцьверджу, што гэта было першае нарадагубства беларускага народу з боку Масквы. Фактычна, Беларусь пасьля таго генацыду так і не акрыяла. Дык, казаў я журналісту, Курапаты ў XX стагодзьдзі – гэта працяг зьнішчэньня Беларусі ад XVII стагодзьдзя і пазьней. Мушу таксама прызнацца, што мы ў БІНіМе пастанавілі перакласьці ў ангельскую мову і выдаць гэтую працу Сагановіча. Справа пайшла ў рух – перакладаць узялася Вера Рыч, але яна была нагэтулькі занятая іншымі справамі, што «поўнай парай» пераклад ня рухаўся і ўсё спынілася, калі Вера Рыч адышла. Прыпомню, аднак, маладзейшым, што пераклад «Невядомай вайны» мусіць быць зроблены – у даўгой чарадзе дакумэнтаў аб зьнішчэньні Беларусі Масквою.

Зрабаваная мастацкая спадчына

Іншы важны кніжны праект, з кіраўніцтвам якога я цесна супрацоўнічаў (БІНіМу была выказаная падзяка ў друку) – арганізацыя канфэрэнцыі «Зрабаваная мастацкая спадчына: Другая сусьветная вайна» і выданьне яе матэрыялаў. Канфэрэнцыя была скліканая ў Нью Ёрку на пачатку 1995 году амэрыканцамі (прадстаўнікі дзярждэпу, коледжы). Адна з кіраўніц канфэрэнцыі доктар Элізабэт Сімпсан (амэрыканка, прафэсар у Bard College, Нью Ёрк) зьвярнулася да мяне па параду, каго запрасіць на канфэрэнцыю зь Беларусі, паколькі яна ведала, што ў Беларусі не было дзяржаўнай структуры для ўліку зрабаваных каштоўнасьцяў. Я паінфармаваў спадарыню Сімпсан, што, хоць дзяржаўнай структуры такога кшталту ў Беларусі і няма, але ёсьць недзяржаўныя арганізацыі, а як прадстаўніка ад Беларусі на канфэрэнцыю і найбольш аўтарытэтную асобу ў гэтай справе я параіў

доктара Адама Мальдзіса. Спадарыня Сімпсан маю прапанову прыняла, запрасіла мяне ўзяць удзел у канфэрэнцыі і пусьціла ў ход справу афармленьня дакумэнтаў і візаў для Мальдзіса. Праз пару дзён я даведаўся ў Вашынгтоне, што новая адміністрацыя ў Менску на канфэрэнцыю хоча прыслаць свайго чалавека. Я сустрэўся з спадарыняй Сімпсан і прадставіў ёй справу. Яна адразу ж зьняла трубку і пазваніла ў Вашынгтон у беларускую амбасаду: альбо прыяжджае Мальдзіс, або Беларусь на канфэрэнцыі будзе прадстаўляць амэрыканец.

Праз тыдзень доктар Мальдзіс быў у Нью Ёрку, праўда, з багажнымі «пэрыпэтыямі». Ён выступіў з выдатным дакладам аб скарбах Беларусі, якія загінулі падчас Другой сусьветнай вайны. У канфэрэнцыі бралі ўдзел каля 500 аўтарытэтных навукоўцаў з Расеі, Нямеччыны, Францыі, Італіі, балтыйскіх краінаў, Украіны і, вядома, амэрыканцаў. Бальшыня амэрыканцаў былі старэйшыя векам навукоўцы, якія ў 1945–46 гадох знаходзілі ў Нямеччыне зрабаваныя каштоўнасьці. У дакладзе Мальдзіса сярод іншага гаварылася пра Крыж Эўфрасіньні, а я дапільнаваў, каб Крыж быў ня толькі ў тэксьце кнігі з матэрыяламі канфэрэнцыі, але і ў рэкляме зрабаваных каштоўнасьцяў Беларусі. Дарэчы, фатаграфія Крыжа была зробленая з паштоўкі БІНіМу 1966 году выданьня.

БІНіМ і гранты

І на заканчэньне разьдзелу пра выдавецкую дзейнасьць БІНіМу закрану такое пытаньне: ці маглі б мы ў БІНіМе атрымоўваць розныя субсыдыі, гранты, стыпэндыі ад ураду або нейкіх дабрадзеяў зь недзяржаўных арганізацыяў? Адказ мой станоўчы: так, мы маглі атрымоўваць такія датацыі і стыпэндыі – наша дзейнасьць была празрыста дакумэнтаваная, а на гэта ў ЗША ёсьць ладна «арганізмаў», якія могуць дапамагаць. Наколькі я ведаю гісторыю БІНіМу, задоўга да майго прыезду ў ЗША тагачасныя кіраўнікі інстытуту па гранты зьвярталіся і атрымалі нейкую суму ад Фонду Форда. Было гэта ў 1951–53 гадох.

У часе мае дзейнасьці ў БІНіМе мы пра гранты не клапаціліся. Чаму? Па-першае, мы сябе вельмі добра адчувалі, бо нашу дзейнасьць падтрымоўвала грамадзтва. Грамадзтва ганарылася, што ёсьць БІНіМ, і ганарылася тым, што можа яго падтрымаць. Гонар за сябе – вялікі рухавік! А другая прычына, чаму мы не зьвярталіся па гранты – бюракратычна-бухгальтарская працэдура, зьвязаная зь любой фінансавай дапамогай. Мы задавальняліся мінімальнымі справаздачамі і не жадалі павялічваць сваю канцылярыю. Дарэчы, нашыя сябры індывідуальныя гранты атрымоўвалі, карыстаючыся БІНіМам як базай сваёй дзейнасьці.

Падсумоўваючы, скажу, што выдавецкая праца ў БІНіМе ўзяла ў мяне гэтулькі ж часу, энэргіі і клопатаў – так-так, клопатаў – колькі й жыццёвая штодзённчына зарабляньня грошай. Але гэтым этапам майго жыцьця я задаволены.

Мастацкія выстаўкі

Мастацкія выстаўкі на эміграцыі пачаліся яшчэ ў лягерох DP у Нямеччыне. Аднак сыстэматычна і часта рэклямаваць беларускае мастацтва на эміграцыі пачаў Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва ў 1950-х гадох. Трэба сказаць, што мастакоў у БІНіМе было некалькі і выстаўкі чаргаваліся.

Ініцыятарамі і каардынатарамі мастацкіх выставак БІНіМу былі Пётра Мірановіч, Тамара Кольба-Стагановіч, Галіна Русак, Ірэна Дутко-Рагалевіч, Надзя Кудасава (Запруднік), а ў Канадзе Івонка Сурвіла і Раіса Жук-Грышкевіч.

Мая справа ў падрыхтоўцы і арганізацыі выставак была забясьпечыць фінансавую падтрымку выданьня каталёгаў, разаслаць рэкляму і падобнае. Трэба аднак сьцьвердзіць, што грамадзтва – беларускае і шырэйшае амэрыканскае – наведваючы выстаўкі, купляла карціны, а мастакі заўсёды імкнуліся даваць БІНіМу фінансавыя ахвяраваньні.

Навуковыя канфэрэнцыі

Дзялянка дзейнасьці ў БІНіМе, якая займала шмат падрыхтоўкі – удзел у навуковых канфэрэнцыях. Праўда, я браў удзел у канфэрэнцыях задоўга да супрацоўніцтва зь БІНіМам – гэта былі канфэрэнцыі Інстытуту па Вывучэньні СССР у Мюнхене ў 1950 гадох, а таксама канфэрэнцыі бэльгійскіх геалягічных таварыстваў. Арганізацыйны ўдзел адрозьніваўся ад асабістага: трэба было заўсёды паведаміць арганізатараў аб намерах выстаўляць і прадаваць свае кнігі, рэкламаваць БІНіМ, часам заплаціць дадатковыя складкі ад арганізацыі. Адміністрацыйныя справы трэба было залагоджваць за паўгода. Аднак удзел у канфэрэнцыях быў вельмі важны. Найперш, чытаючы даклад, я меў нагоду азнаёміць дасьледчыкаў зь беларускімі справамі. Па-другое, на канфэрэнцыях і кангрэсах навязваліся трывалыя знаёмствы і працоўныя сувязі з шырокім колам дасьледчыкаў. Трэцяе, шыльда «Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва» пры стале з выстаўкай кніжак – сьведчаньне аб беларускай дзейнасьці і прысутнасьці.

Паводле сваёй формы канфэрэнцыі, ясна, былі розныя: канфэрэнцыі БІНіМу, канфэрэнцыі прафэсійных таварыстваў, тэматычныя ўнівэрсытэцкія канфэрэнцыі, міжнародныя кангрэсы.

Коратка прыпомню аб некаторых.

Канфэрэнцыі БІНіМу

У лютым 1977 году адбылася канфэрэнцыя, прысьвечаная 25-м угодкам БІНіМу. На маю прапанову месцам для яе правядзеньня быў абраны амэрыканскі ўнівэрсытэт Seton Hall у горадзе Саўт Орэндж, штат Нью Джэрзі. Матывацыя выбару вызначалася тым, што я быў добра знаёмы з загадчыкам катэдры гісторыі прафэсарам Джонам Цу, і празь яго ўнівэрсытэт даваў нам за мінімальную цану памешканьне, карыстаньне кафэтэрыяй, а ў выпадку патрэбы прыежджым дакладчыкам – інтэрнаты для начоўкі. Да таго ж унівэрсытэт – 50 тысячаў студэнтаў – даваў нам рэкляму. Умовы былі выдатныя. Канфэрэнцыя прайшла вельмі добра, яе вынікі былі надрукаваныя ў 17-м выпуску «Запісаў» (1983) – амаль увесь выпуск быў у ангельскай мове.

Цікавае супадзеньне. 8 сьнежня 1978 году Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва ўдзельнічаў у канфэрэнцыі ў тым самым унівэрсытэце Seton Hall у агульнаамэрыканскай канфэрэнцыі, прысьвечанай тэме «Ethnicity – Humanistic Perspective», дзе я чытаў даклад «Беларуская этнічнасьць – перадача пакаленьням». Бываў БІНіМ і на канфэрэнцыях, прысьвечаных адукацыі, якія ладзіліся ў гэтым унівэрсытэце ў 1980-х гадох.

Часта канфэрэнцыі БІНіМу спалучаліся ў часе з Сустрэчамі беларусаў Паўночнай Амэрыкі. Так, у 1980 годзе БІНіМ разам з Кліўлэндзкім штатным унівэрсытэтам ладзіў канфэрэнцыю, прысьвечаную Статуту ВКЛ – адначасна з 14-й Сустрэчай беларусаў. У 1984 годзе канфэрэнцыя, прысьвечаная пасяленьню беларусаў у ЗША, адбывалася ў часе 16-й Сустрэчы беларусаў Паўночнай Амэрыкі.

Удзел у амэрыканскіх, польскіх, украінскіх канфэрэнцыях

Амаль рэгулярна сябры БІНіМу (заўсёды Ян Запруднік, Зора і я, часта Уладзімер Сядура, Галіна Русак і Віктар Сянкевіч) бралі ўдзел у гадавых канфэрэнцыях Амэрыканскай Асацыяцыі Славянаведы (American Association for the Advancement of Slavic Studies, AAASS). Мы былі на канфэрэнцыях у Новым Арлеане, Г'юстане, Вашынгтоне, Нью Ёрку, Бостане, Калюмбусе, Канзас-Сіты, Дэнвэры і мелі там свае выставы, пераважна беларускіх кніжак. На адной з такіх канфэрэнцыяў AAASS у Новым Арлеане я меў даклад аб беларускай бібліяграфіі, які па дамоўленасьці з прафэсарам Сьцяпанам Горакам (украінскага паходжаньня) быў улучаны ў адзіны бібліяграфічны дапаможнік па нацыянальным пытаньні для амэрыканскіх коледжаў – Guide to the Study of the Soviet Nationalities (1982). Пазьней БІНіМ

зрабіў з кніжкі адбітку. Мушу сказаць, што паколькі бібліяграфія была з англамоўнымі анатацыямі – як падручнік, так і адбітка пра беларусаў карысталіся вялікім попытам. Я нават плянаваў зрабіць другое выданьне. Але хай зробяць маладзейшыя – матэрыялу пра Беларусь цяпер хапае.

Ад пачатку 1980-х я рэгулярна ўдзельнічаў у гадавых канфэрэнцыях Польскага Інстытуту Навукі й Мастацтва, з дырэктарам якога доктарам Тэдам Грамадам я сябраваў некалькі дзесяткоў гадоў. Ян Запруднік і Антон Адамовіч былі дзейнымі сябрамі Ўкраінскай Акадэміі Навук і ўдзельнічалі ва ўкраінскіх канфэрэнцыях. Дарэчы, у студэнцкія гады ў Лювэне мы былі сябрамі з пазьнейшым старшынём Украінскага Навуковага Таварыства імя Шаўчэнкі доктарам Аўгенам Федарэнкам. Як цяпер прыпамінаю Жэньку ў беларускім студэнцкім доме з заклапочаным тварам: «Ну що, хлопці, невже не знайду нікого для покеру?» – ён быў майстрам покеру.

Тэматычныя канфэрэнцыі ва ўнівэрсытэтах я стараўся дапілноўваць, пераглядаючы кожныя два тыдні ў Навуковым аддзеле бібліятэкі бюлетэнь «Навуковыя канфэрэнцыі, кангрэсы, сымпозіюмы», дзе адлюстраванае амэрыканскае інтэлектуальнае жыцьцё. Калі я бачыў нешта прыдатнае, рабіў заяўку. Да таго ж шмат унівэрсытэтаў, дзе вывучалася Ўсходняя Эўропа, прысылалі на БІНіМ свае календары. Унівэрсытэцкіх канфэрэнцыяў на працягу году ў ЗША адбывалася сотні – трэба было выбіраць. Выбіралася толькі тыя, дзе можна было прадставіць беларускую тэматыку. Звычайна за год прадстаўнікі БІНіМу ўдзельнічалі ў паўтузіне канфэрэнцыяў. Некаторыя канфэрэнцыі мы проста не маглі прапусьціць. Прыклад: тэматычная канфэрэнцыя ў John Carrol University, Cleveland, Ohio, 10–11 ліпеня 1979 году «Нерасейскія народы супраць маскоўскага імпэрыялізму», з зазначэньнем у абвестцы: матэрыялы адразу ідуць у друк. На гэтай канфэрэнцыі мой даклад меў загаловак «Беларусь пад расейскай акупацыяй» і быў надрукаваны як асобны разьдзел у кнізе «Russian Empire: Some aspects of Tsarist and Soviet colonial practices».

У «Запісах» я вёў рубрыку «Удзел у канфэрэнцыях», рубрыка гэтая жывая і дагэтуль, але сёньня ахапіць усе канфэрэнцыі з удзелам беларусаў немагчыма!

Міжнародныя Кангрэсы па вывучэньні СССР

Міжнародныя кангрэсы – параўнаўча новая падзея ў гуманітарных дасьледаваньнях, рэгулярнай зьявай яны сталі прыблізна ад 1970-х гадоў, і БІНіМ ад пачатку ўважліва сачыў за хадою справаў у гэтай дзейнасьці – у міжнародных кангрэсах мы стараліся браць удзел.

Першыя лістоўныя кантакты з арганізатарамі Міжнародных Кангрэсаў па вывучэньні СССР у БІНіМе датуюцца канцом 1970-х гадоў, калі рыхтаваўся кангрэс у Гарміш-Партэнкірхене (Нямеччына). На жаль на той кангрэс, які адбыўся ў 1980 годзе, з ЗША ад БІНіМу ніхто ня браў удзелу, але мы дамаўляліся зь Верай Рыч з Ангельшчыны, што нашыя публікацыі будуць выстаўленыя, і яна гэта дапілнавала.

Наступны Міжнародны Кангрэс па вывучэньні СССР адбываўся ўвосень 1985 году ў Вашынгтоне, дзе пасьля доўгіх перамоваў з арганізатарамі мы зладзілі дзьве сэкцыі. Гэтым разам беларускія панэлі дапаўнялі Элізабэт Бэтц зь Нью-Ёркскага ўнівэрсытэту, Віктар Сянкевіч з Гішпаніі, Васіль Мельяновіч з штату Мэрылэнд. Я арганізаваў на кангрэсе выстаўку друкаў БІНіМу, і мы здабылі некалькі падпісчыкаў на «Запісы».

Шмат арганізацыйнай перапіскі – трэба было ўзгадніць усе дакклады – было перад 4-м Сусьветным кангрэсам вывучэньня СССР і Ўсходняе Эўропы, які праходзіў 21–26 ліпеня 1990 году ў Гэраўгейце (Ангельшчына).

Аб прабегу кангрэсу зацытую пару пасажаў з рэпартажу Яна Запрудніка ў газэце «Беларус» (№372, 1990):

«На кангрэсе было прачытана каля 1200 дакладаў і ўзяло ўдзел больш за 1900 асобаў, у тым ліку 122 з Савецкага Саюзу, але не зь Беларусі.

На цырымоніі адкрыцьця гэтага зьезду адным з прамоўцаў быў савецкі акадэмік Алег Багамолаў, які, гаворачы ад імя савецкае дэлегацыі, сказаў: «Часы мяняюцца, і выявілася, што камунізм дыскрэдытаваў сябе, і заходнія спэцыялісты, якія вывучалі Савецкі Саюз ды іншыя краіны, былі ня так ужо й далёкія ад слушнасьці ў сваіх ацэнках нашага жыцьця і нашае мінуўшчыны».

У першы дзень працы кангрэсу адбыліся дзьве беларускія сэсіі на агульную тэму «Галоснасьць і адкрыцьці ў беларускай літаратуры». Старшынявала на сэсіях брытанскі прафэсар д-р Лінда Г'юз. Дакладчыкамі былі: праф. Томас Бэрд (пра газэту «Наша Ніва»), д-р Янка Запруднік («Усевалад Ігнатоўскі як гісторык і дзяржаўны дзеяч»), д-р Вітаўт Кіпель («Белыя плямы ў беларускай бібліяграфіі»), праф. Джэймс Дынглі (творчасьць Натальлі Арсеньневай), Зора Кіпель, заст. дырэктара Славянскага аддзелу Нью-Ёркскае Публічнае Бібліятэкі (пра беларускія пераклады XVI ст. заходнеэўрапейскіх клясычных аповесьцяў «Трыстан» і «Тундаль»), паэтка Вера Рыч (пра паэтычнае наватарства Алеся Гаруна), праф. Аляксандар Баршчэўскі (пра Антона Луцкевіча як літаратурнага крытыка) [...]

Пра Беларусь часта згадвалася ў шматлікіх дакладах на экалягічныя тэмы [...]

Менск зрабіў недаравальную памылку, што ня выслаў сваіх навукоўцаў у Гэраўгейт і нават ня даў магчымасьці прыбыць на кангрэс пісьменьніку Барысу Сачанку, прозьвішча якога фігуравала ў праграме як камэнтатара дакладу праф. Дынглі».

Дарэчы, пазьней Барыс Сачанка пісаў мне, што ня змог прыехаць на кангрэс дзеля перагружанасьці працай: «Хацеў пабываць я і ў Англіі, але мне было даручана кіраваць рабочай групай па падрыхтоўцы праекту пастановы Савету міністраў БССР па рэалізацыі Закону аб мовах. А становішча з мовай у нас Вы ведаеце якое. Давялося ахвяраваць паездкай і сустрэчай з Вамі. Вам пра гэта пішу першаму, каб ведалі, чаму я ня змог прыехаць у Англію».

Грамадзкая дзейнасьць

Грамадзкая праца

Беларуская грамадзка-палітычная дзейнасьць у ЗША ў сваёй аснове адрозьнівалася ад беларускай дзейнасьці ў Заходняй Эўропе.

У пасьляваеннай Заходняй Эўропе засноўваліся беларускія палітычныя партыі, асяродкі, асновай ідэалёгіі якіх было – мы эмігранты, мы беларускія дзяржаўнікі, наша Бацькаўшчына паняволеная камунізмам, мы ворагі камунізму. У ЗША да такое беларускае палітычнае плятформы дадавалася яшчэ адна вельмі важная задача: беларусы Амэрыкі – ня толькі новыя імігранты, але і старажылы, будаўнікі сёньняшняй Амэрыкі. Беларуская нацыя – адна з тых раньніх, што давалі Амэрыцы працоўную сілу. Гэткі прынцып быў і назаўсёды застаецца ў Беларускай Амэрыцы.

Мая грамадзкая дзейнасьць у ЗША ішла паралельна з працоўным жыцьцём, у гэтую дзейнасьць я ўкладаў энэргію, грошы, дасьведчаньне, а галоўнае – праз гэтую дзейнасьць я выказваў свой сьветагляд, сутнасьць якога палягае ў тым, каб дамагацца інфармаваць небеларускі сьвет аб Беларускіх Ідэалах – гістарычнасьці нацыі, дэмакратычнай дзяржаўнасьці і інш.

Удзельнічаў і працаваў я ў дзесяткох, часам вельмі кароткатрывалых амэрыканска-беларускіх арганізацыях, прафэсійных таварыствах, палітычных партыях, бываў на сходах царкоўных арганізацыяў, плаціў членскія складкі дзесяткам асацыяцыяў навучальнага профілю, а найбольш і найглыбей дзеіў у Беларускім Інстытуце Навукі й Мастацтва ў ЗША.

Асацыяцыя бацькоў і настаўнікаў

Пачну свае ўспаміны аб маім мэханічным – але зь беларускім «ярлыком» – удзеле ў сьціплай, але велізарнай амэрыканскай арганізацыі, ведамай у ЗША як PTA (Parents and Teachers Association) – Асацыяцыі бацькоў і настаўнікаў. Прыпушчаю, што ўсе імігранты, якія маюць дзяцей школьнага веку, «завэрбаваныя» ў гэтую арганізацыю. Мэта арганізацыі – дапамагаць школьным і пазашкольным праграмам ды ствараць «лобі» – ціск на мясцовыя (і ня толькі!) улады, каб тыя дапамагалі школам. Арганізацыя вельмі шматлікая, сяброўства палягае ў тым, што плаціш складкі і... можаш выступаць на сходах.

Дарэчы, што добра пастаўлена ў гэтай арганізацыі – месячныя сходы бацькоў і настаўнікаў. Гэты момант – сходы – нас з Зорай і прыцягнуў.

Ужо на першым сходзе, калі прадстаўлялі новых сяброў, нам была дадзеная магчымасьць «абвясьціць», што мы – беларусы. Гэткая заўвага надзвычай важная, важна было, каб яе пачула кіраўніцтва школы, якое заўсёды на першых сходах РТА прысутнічае. Я ўважаю, што такая заява на такім хоць і нязначным, але важным адукацыйным форуме вельмі важная.

На беларускую прысутнасьць была зьвернутая ўвага ў тым мястэчку, дзе Алеся пайшла ў школу – у Ёолінгтане. Ведаю таксама, што ў пару пачатковых школах у Пасэйку прадстаўленьне бацькоў беларусамі спрыяла і дачыненьням з адміністрацыяй, і прысутнасьці Беларусі ў адукацыйным працэсе. Калі казаць коратка: праз РТА настаўнікі даведваюцца, што ў школе ёсьць дзеці беларускага паходжаньня. Гэта важна, і гэта лёгка дасягаецца. Шмат дзе РТА дапамагала школам арганізаваць лекцыі пра Беларусь, зь якімі выступалі, прыкладам, сп-ня Плескач у Дэтройце, сп-ня Божка ў Пасэйку, сп-ня Рагалевіч ў Саўт-Віндзары і інш.

Як я зазначыў, наш удзел у гэтай арганізацыі быў больш «мэханічны» – заявіць пра Беларусь. Сяброўства ў РТА канчаецца, калі дзеці пераходзяць у сярэднюю школу – так было і з намі.

Праца з моладзьдзю. Амэрыканскі скаўтынг

Іншая амэрыканская арганізацыя, зь якой я супрацоўнічаў каля дзесятка гадоў, прыблізна ад 1966 да 1976-га – гэта амэрыканскія скаўты, Boy Scouts of America, BSA. Сам я пазнаёміўся з маладзёвым рухам скаўтаў у 1945 годзе, хутка па вайне. Наагул мне маладзёвыя арганізацыі падабаліся – я быў у піянэрах, у СБМ, а пасьля стаўся арганізатарам і хутка адным з кіраўнікоў беларускага скаўтынгу на эміграцыі – арганізацыя атрымала назоў Згуртаваньне Беларускіх Скаўтаў на Чужыне, ЗБСЧ.

У працы зь беларускімі скаўтамі я атрымаў добрае дасьведчаньне і пазнаў глыбей выхаваўчую праграму скаўтынгу. Таму ў Амэрыцы, маючы сына-падлетка, які стаў сябрам BSA, я таксама вырашыў папрацаваць з моладзьдзю ў скаўтынгу. Я далучыўся да амэрыканскай скаўцкай адзінкі Troop 161, Tamarack Council, якая была заснаваная ў маім горадзе Радэрфорд у 1910 годзе, а спонсарам арганізацыі была прэсьвітэрыянская царква. У гэтай групе я прабыў ладны час на кіраўнічых пасадах, улучна з пасадай «скаўтмайстар» і «дырэктар падрыхтоўкі скаўтмайстраў у акрузе».

Ясная справа, што я меў нагоду гаварыць моладзі і пра Беларусь. На тыднёвых зборках адзінкі – 25-35 чалавек – скаўтмайстар кожны раз, зачыняючы зборку, мае сказаць «scoutmaster minute» – нейкае

інфармацыйнае паведамленьне. Часта я ў гэтую хвіліну расказваў пра Беларусь, асабліва пра прыроду Беларусі, бо дзеці кожны месяц бывалі на прыродзе, рабілі кэмпінгі і маглі нешта параўнаць.

У скаўтынгу я яшчэ раз пераканаўся, як гэтая арганізацыя зможа дапамагаць Беларусі ўзгадаваньнем новых маладых лідэраў. У скаўцкі рух улучылася і мая сям'я: Юрка і ўсе ягоныя тры сыны здабылі ступень скаўта-арла і трымаюць лучнасьць з арганізацыяй і да сёньня.

Крыху дапамагаў я і дзявочаму скаўтынгу. Алеся была скаўткай, потым кіраўніцай, надрукавала свой першы артыкул у агульнаамэрыканскім дзявочым скаўцкім часапісе, калі ёй было гадоў 13-14.

Ідучы насустрач пажаданьню айца Лапіцкага, які быў прыхільнікам скаўцкае праграмы і арганізацыі, я арганізаваў скаўцкую адзінку Troop 225, Edison Council пры беларускай царкве Сьв. Эўфрасіньні Полацкай у Саўт Рывэры. У адзінцы было 25 скаўтаў, больш за год я штотыдня езьдзіў на скаўцкія зборкі, хадзіў зь імі ў паходы. Аднак у шырэйшага беларускага грамадзтва ў Саўт Рывэры зацікаўленьня весьці гэтую амэрыканскую арганізацыю не было, і праз паўтара года арганізацыя зьліквідавалася, а моладзь пайшла ў іншыя адзінкі.

Дарэчы, ад імя скаўтаў-беларусаў музэю амэрыканскай скаўцкай арганізацыі была падараваная беларуская скаўцкая лялейка ў павялічаным выглядзе, выразаная з дрэва Алегам Махнюком.

Лягер для беларускіх дзяцей

Калі я бываў са скаўтамі ў лягерох, мне прыйшла думка арганізаваць лягер для беларускай моладзі. Я разьлічваў на дапамогу бацькоў і тых дзяцей, якія прайшлі праз амэрыканскі скаўтынг. Удалося гэта зьдзейсьніць, калі беларускае грамадзтва набыло цэнтар адпачынку Belair-Менск.

Я ўвайшоў у дырэкцыю нованабытага дому адпачынку Belair-Менск. Гэта каля 35 гектараў зямлі, вялікае возера, некалькі дамоў у Sullivan county, штат Нью Ёрк, за дзьве з паловаю гадзіны язды ад гораду Нью Ёрку, там, дзе пачынаюцца Кэтскілскія горы. Вельмі прыгожая мясцовасьць, пераважна сасновыя лясы. Мясцовасьць нам спадабалася, і я лічыў, што трэба нейкі час аддаць на разбудову гэтага асяродку. Там я тры гады арганізоўваў і праводзіў дзіцячыя лягеры. Я лічыў так: калі дзеці прывыкнуць да той мясцовасьці, да таго лягеру, то й бацькі будуць езьдзіць. Я сам добра знаёмы з маладзёвым рухам – гэта было арганізавана па форме скаўцкіх дзіцячых лягероў: дзеці сьпяць у палатках, некаторыя – хто кашляе ці што – сьпяць у будынках, раніцай прачынаюцца, і пачынаецца дзённая праграма. Гэтую праграму мы зрабілі чыста беларускай. Дзеці былі англамоўныя, але разумелі па-беларуску, зь імі займаліся сьпевамі, маляваньнем, беларускімі танцамі – «Лявоніха», «Крыжачок».

Празь лягеры ў Belair-Менску прайшло панад сотню беларускіх дзяцей. Шмат для каго зь іх беларускія праграмы лягеру былі адзіным беларускім навучаньнем у жыцьці. Сёе-тое засталося ў іх у памяці. Але галоўнае – засталося сяброўства: беларускія дзеці, якія былі ў лягерох, і да сёньня трымаюцца разам. Ясна, «трымаюцца» трэба разумець у шырокім сэнсе – трымаюць лучнасьць электронную, тэлефанічную. Слоў няма, без дапамогі бацькоў лягеры было б цяжка арганізаваць, бацькі дапамагалі, асабліва шмат спадарства Кажуры. Мушу тут падзякаваць і іншым энтузіястам праекту: Зоры найперш, а таксама Яну Запрудніку, Але Рамана, Юрку Станкевічу, Івану Муху, Міхасю Сеньку. Асабліва ўдзячны я сьвятарам а. Мікалаю Лапіцкаму, а. Язэпу Строку і а. Францішку Чарняўскаму – гэтыя сьвятары выступалі перад беларускімі дзецьмі хоць і з кароценькімі, але зьмястоўнымі гутаркамі аб рэлігіі і беларускай рэлігійнасьці.

Трэба сказаць, што ў ЗША пра выхаваньне беларускага пачуцьця ў моладзі пры беларускіх арганізацыях і цэрквах нямала думалася і экспэрымэнтавалася. На пачатку 1970-х гадоў у арганізацыі моладзі ЗБМА ў Нью Ёрку паўстала думка арганізаваць курсы беларусазнаўства для моладзі пад назовам «Дыялёгі». Гэта меліся быць лекцыі і дыскусіі пра Беларусь, яе гісторыю, культуру ды сучаснае становішча ў сьвеце. Мы зь Янам Запруднікам гэтую думку падтрымалі і пачынаючы ад канца 1972 і да 1975 году рэгулярна зьбіраліся на лекцыі то ў памяшканьні Freedom House на 40-й вуліцы ў Нью Ёрку, то ў Гарадзкім унівэрсытэце.

У 1974–75 гадох з ініцыятывы Галіны Тумаш, тады яшчэ студэнткі, і пры падтрымцы прафэсара Пятра Гоя з Гарадзкога ўнівэрсытэту на катэдры сацыялёгіі раз на тыдзень ладзілі лекцыі пра Беларусь, а я канкрэтна падрыхтаваў канспэкт «Беларуская эміграцыя», чаргаваліся тэмамі і лекцыямі з доктарам Янам Запруднікам.

Пасьля сэрыі беларускіх фэстываляў (1976–1979 гг.) Міхась Бахар арганізаваў сэрыю лекцыяў пра Беларусь для моладзі ў Саўт Рывэры. Дарэчы, для лекцыяў – а іх было каля дзесятка – я падрыхтаваў англамоўную бібліяграфію пра Беларусь, а Ян Запруднік зрабіў на ксэрографе канспэкт з артыкулаў пра Беларусь у тагачасным друку.

Бываючы ў Кліўлэндзе, асабліва падчас працы над манаграфіяй «Беларусы ў Кліўлэндзе» (1983), я ладзіў таксама і там лекцыі для моладзі.

Відавочна, што я «аўтаматычна» падтрымоўваў і дзейнасьць танцавальнага гуртка «Васілёк» пад кіраўніцтвам доктара Алы Орса-Рамана. Няма чаго й казаць, гэтая група найбольш зрабіла для выхаваньня беларускасьці дзяцей у ЗША, а таксама для рэклямы Беларусі. Не памылюся, калі сьцьверджу, што «Васілёк» падтрымоўвала ўсё грамадзтва, якое яшчэ і да 1980-х гадоў дзялілася на БНРаўцаў і БЦРаўцаў, хоць межы паміж імі больш і больш расплываліся.

Беларуская палітыка: БЦР і БНР

БЦР у Менску

У Менску я газэт не чытаў, але з загалоўкаў даведаўся, што стварылася Беларуская Цэнтральная Рада. Часам на вячэры, калі бацька бываў у хаце, запытаесься, што там робіцца, дык бацька нешта буркне: займайся сваімі справамі, а я сваімі, БЦР – гэта ўрад, кіруе ім Астроўскі, каля яго вельмі шмат заходнікаў, ты нікога ня знаеш. Майму бацьку расходзілася найбольш, каб пры немцах у школах пайшла беларусізацыя. І маці і бацька заўсёды былі прыхільнікамі таго, каб у школах было чым больш беларускага – тады рух будзе жыць. І Астроўскі ставіўся прыхільна да тых плянаў, якія паўставалі і ў Аддзеле асьветы, і ў Навуковым аддзеле, якім кіраваў бацька. Гэта што тычылася станоўчага боку. Але шмат за сямейнай вячэрай было і адмоўных выказваньняў пра Астроўскага – што ён тое ці тое няправільна робіць.

Гэта ўсё, што я зь Менску ведаў пра Астроўскага. Плюс адзін раз я яго бачыў на парадзе, дзе мы, СБМаўцы, ішлі ў калёне асобнай часткай як Менскі аддзел СБМ. Больш я яго ня бачыў – ні ў часе эвакуацыі, ні пазьней у Бэрліне.

Значаньне БЦР для Беларусі было яснае, прынаймней у маёй галаве – гэта быў урад, які мае нейкую ўладу. Якая гэтая ўлада была – я ў той час ня мог ясна сабе ўявіць, бо я бываў на вуліцы, я бачыў немцаў, бачыў паліцыю, і для мяне было няясна – належыць беларуская паліцыя да БЦР ці не належыць. Думаю, што звычайны мянчук майго ці крыху старэйшага веку таксама ня меў дакладнага ўяўленьня пра абсяг улады Беларускай Цэнтральнай Рады. Мы ведалі, што ёсьць беларускія школы, ёсьць беларускія «амты», бюро, а хто імі кіруе (бо яны існавалі і да БЦР, захаваліся і пасьля яе стварэньня) – не зусім ясна.

Аб абсягу ўлады БЦР я мог меркаваць з таго, што казаў бацька: пра розныя паседжаньні БЦР, на якія прыяжджалі людзі з правінцыі – значыць была беларуская ўлада і ў правінцыі, але як яно там дакладна было, гэта, як амэрыканцы любяць казаць, было beyond my grade.

Што было чуць пра БЦР у Нямеччыне

Прыехалі мы ў Нямеччыну, жывем, кожны займаецца сваім. Я быў звычайным прадстаўніком «усходняй хвалі» эміграцыі, але я вучыў мову ў Deutsches Institut für Ausländer – там ладзіліся лекцыі, прысьвечаныя розным нацыянальнасьцям Усходу. Адзін раз я, памятаю, быў на румынскай лекцыі. Была і беларуская, якую арганізавала доктар Крэймэр, выкладчыца адных з курсаў і адначасна адміністратар. Яна прысьвяціла цэлую лекцыю Беларускай Народнай Рэспубліцы – там я ўпершыню пачуў у дэталях, чым была БНР. І закончыла яна сваю лекцыю тым, што сёньня ў Бэрліне знаходзіцца Беларуская Цэнтральная Рада, якая ёсьць урадам – такім, як ён быў у Беларускай Народнай Рэспубліцы. І тады ў маёй галаве бліснула: ага, дык БЦР – гэта ня толькі тое, што пішуць у «Раніцы», якая прадаецца ў кіёсках, ці гаворыцца па радыё, а гэтая немка кажа, што была БНР, а цяпер беларускі ўрад – гэта Беларуская Цэнтральная Рада. Так я гэта сабе ўявіў. Апрача гэтага я ніякіх сьведчаньняў існаваньня БЦР ня бачыў.

Магчыма, людзі, якія былі ў войску і стаялі бліжэй да Беларускай Цэнтральнай Рады, неяк больш гэта адчувалі. Але я быў з бацькамі – а бацька адышоў ад БЦР і быў улучаны ў рух арганізацыі вайскоўцаў пры Ўласаве – і пра БЦР мала чуў.

Калі ўжо закончылася вайна і пачалася беларуская арганізацыйная праца, я прыехаў у Рэгенсбург, дзе быў арганізаваны Беларускі Камітэт. Я спаў і жыў у гэтым камітэце і бачыў яго дзейнасьць. Старэйшыя – асабліва, як я памятаю, Шыбут, Вайцяхоўскі, мы часта хадзілі ў сталоўку праваслаўнай абшчыны абедаць разам з гэтымі асобамі – дык яны там гаварылі, успаміналі Астроўскага. Але я канкрэтна нічога ня бачыў і ня чуў і так адчуваў, што на арганізацыю той грамады, дзе быў я, ніякая БЦР ніякага ўплыву ня мае.

Царкоўны падзел

У 1945 годзе, калі арганізавалася Беларускае селішча ў Рэгенсбургу, беларусы, будучы народам рэлігійным, збудавалі на селішчы і царкву – бадай ці ня першую ў беларускай дыяспары – і назвалі яе ў гонар сьв. Эўфрасіньні. Пачынальнікам гэтай акцыі быў сьвятар Мікалай Лапіцкі. Як айцец Лапіцкі, гэтак і шырокае беларускае грамадзтва, будуючы сваю царкву, ведалі, што ў беларусаў на эміграцыі ёсьць царкоўнае кіраўніцтва – епіскапат, які ў 1944 годзе выехаў зь Беларусі. Епіскапат выяжджаў як самастойная царкоўная адзінка з сваёй юрысдыкцыяй, ён атрымаў паўнамоцтвы прадстаўляць Беларускую праваслаўную царкву ад Сабору ў Менску ў 1942 годзе. А Сабор 1942 году – працяг дзейнасьці беларускага духавенства па

стварэньні Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы, запачаткаванай у Менску ў 1920-х гадох.

Аднак беларускі епіскапат 1940-х гадоў, апынуўшыся на эміграцыі, таемна ад беларускага грамадзтва далучыўся да Расейскай зарубежнай праваслаўнай царквы. Гэты здрадніцкі акт парушаў пастановы Сабору 1942 году. Дзеля таго, што япіскапы далучыліся да Расейскай зарубежнай царквы, зьявіўся тэрмін «зарубежнікі». І гэтая падзея больш як што прычынілася да падзелу беларускай эміграцыі на два лягеры – «крывічоў» і «зарубежнікаў».

Беларуская палітычная эміграцыя апынулася ў непрывабнай сытуацыі – няма япіскапаў, няма царкоўнага кіраўніцтва, што рабіць далей? Некаторыя сьвятары казалі, што будуць разам зь япіскапамі, іншыя – што ня будуць. І тады адбываецца дадатковы палітычны падзел – на сцэну выходзяць БНР і БЦР. Тыя, што аб'ядналіся вакол БНР, кажуць: мы знойдзем новых япіскапаў. А БЦР кажа: мы з старымі япіскапамі будзем весьці перамовы далей. «Ах, вы з Зарубежнай царквой? Дык вы – зарубежнікі!» «А вы хто? А, тыя, хто за Крывію? Дык вы – крывічы!» І хоць сярод БНРаўцаў «крывічоў» было вельмі мала, гэты назоў за імі замацаваўся і жыў гадоў 50 – ня ведаю, ці ён цяпер яшчэ жывы, бо новая эміграцыя вялікага зацікаўленьня да гэтага пэрыяду беларускай гісторыі не выказвае.

Прыехаўшы ў Амэрыку, адзін з былых супрацоўнікаў япіскапаў, але не прыхільнікаў «зарубежніцтва» – айцец Лапіцкі – вырашыў так: ён не прызнае, што зрабілі япіскапы, яны яму нават забаранілі служыць, а грэкі на падставе гістарычных фактаў – праваслаўе ў ВКЛ было ў кананічнай сувязі з Канстантынопалем – дазволілі заснаваць структуру беларускіх праваслаўных прыходаў у юрысдыкцыі Канстантынопальскага патрыярха.

Я аб царкоўных беларускіх справах на эміграцыі выказваюся: маю свае пагляды, падтрымваю найперш БАПЦ, але таксама беларускія прыходы Канстантынопальскага патрыярхату – жадаю ім афармленьня ў асобную дыяцэзію. Я жадаў бы, каб і беларусы-каталікі атрымалі каталіцкага япіскапа на эміграцыі. Я жадаю посьпеху беларускім уніятам і пратэстантам. Але справы рэлігійныя былі і застаюцца для мяне другаснымі па-за маёй грамадзкай дзейнасьцю.

Расколы

Разьдзелы сярод беларусаў пачаліся, калі з цэнтру Рэгенсбургу беларусы пачалі пераяжджаць на Ganghofersiedlung і там арганізавалася «Крывіцкае селішча». Вось тады пачалі фармавацца паасобныя групоўкі. Мне быў прыпісаны як адзін з маіх кватарантаў Вітаўт Рамук, ён прыяжджаў зь Мюнхену забраць свае прадукты, бо лічылася,

што ён жыве са мной. Дык ён мне першы сказаў, што тут пачынаюць групавацца – ён сустрэў сваіх знаёмых, якія працавалі ў БЦР. Мая энэргія ішла на арганізацыю моладзі, там ніякага падзелу ці бэцээрства не адчувалася.

Калі мы пераехалі ў Міхельсдорф і пачалося разьдзяленьне, дык я фактычна даведаўся ад маіх сяброў – ад Цьвіркі, ад Запрудніка – што ёсьць БНРаўская група, і ў гэтай групе Каханоўскі мае сваю партыю і ім, Цьвірку і Запрудніку, прапануе ўступіць у тую партыю. Мне Каханоўскі ніколі нічога такога не прапаноўваў, але тады я ведаў – ёсьць нейкая групоўка БНР і да яе належыць партыя. Беларуская Нацыянал-Дэмакратычная Партыя так, здаецца, яна звалася. Так што яшчэ да афіцыйнага стварэньня ці аднаўленьня БНР у сьнежні 1947 году групоўкі ўжо існавалі.

Потым у Міхельсдорф пару разоў прыехаў мой бацька з спадаром Жамойдам. І, здаецца, Жамойда мне сказаў, што скора будуць выбары і ўсе будуць галасаваць за Ігнатовіча. Я запытаўся – што за выбары? Ну, кажа Жамойда, існуе міжлягерная рада, а крывічы хочуць накінуць сваю ўладу. У той гутарцы з Жамойдам я ўпершыню пачуў пра «крывічоў». «А што за крывічы?» – «Ну, ты ж быў у гімназіі, тады была «Крывіцкая гімназія». Ага, дык гэта ўсё было невыпадкова, калі мяняліся назовы на «Крывіцкая гімназія» ці «Крывіцкае селішча» – мне здавалася, што гэта было вузкое кола, якое пад уплывам Янкі Станкевіча хацела папулярызаваць назоў «Крывія». Я тады неяк арганічна паставіўся супраць, магчыма, мне нешта інтуіцыйна падказвала – нашы людзі ня ўсе згрупаваныя ў беларускае грамадзтва, а тут мы яшчэ хочам нешта ўводзіць новае.

А тут ужо крыху пазьней – у канцы 1946 ці пачатку 1947 году – я чую, што ёсьць некалькі групаў, якія дзейнічаюць супраць «крывічоў». У маім «кацялку» тая міжлягерная рада, людзі, якія ў яе ўвайшлі, не былі для мяне аўтарытэтам: там былі Міхаіл Ігнатовіч, Герасім Галожын. Яны перад гэтым былі ў кіраўніцтве лягеру, я меў зь імі дачыненьні па скаўцкай лініі і бачыў, што ім нацыянальная праца са скаўтамі ня надта даспадобы, яны казалі: ну, вы там больш інтэрнацыянальнага давайце. Карацей, кантакт зь імі не выходзіў, наша хімія была занадта розная. Так што нягледзячы на тое, што я лічыў БЦР досыць аўтарытэтнай установай, зь некаторымі людзьмі, якія былі ў складзе БЦР, у мяне былі нацягнутыя дачыненьні і падозраньне да іх. Тым часам як да людзей, якія гуртаваліся ў БНРаўскім лягеры, я ніякіх засьцярогаў ня меў.

Я асабіста ўважаю, што гэты падзел быў сапраўды палітычна вельмі шкодным, непатрэбным і неабгрунтаваным, бо ў маім разуменьні – кожная з гэтых груповак лічыла, што вось-вось яны паедуць на Беларусь і ўлада, якая будзе ў іхных руках, будзе менавіта такой. Я пра

ўладу ня думаў, я бачыў, што мы ўлады ня маем, мы эмігранты, мне ўяўлялася – як ты выехаў з Бацькаўшчыны, ты можаш весьці навуковую, палітычную, інфармацыйную працу, але выстаўляць сябе так нібыта ты – «прадстаўнік ураду Беларусі» ты ня меў права.

Вайна ў друку

БНРаўскі бок у той час быў актыўны, нацыянальны, інтэлігентны, адукаваны. Бок БЦР быў значна менш актыўны, там было менш адукаваных людзей. Я думаю, што пры асьцярожным падыходзе ў сваёй дзейнасьці БНРаўскі бок мог бы запанаваць і з часам стаўся б адзіным, які б прадстаўляў беларускую эміграцыю. Калі ў 1947 годзе ў «Бацькаўшчыне» зьявіўся артыкул пра «квісьлінгаў», ён актывізаваў БЦРаўскі бок, абразіў людзей. Людзі вайсковага кшталту, якія пасьля вайны сядзелі спакойна і казалі: наша справа скончаная, мы працавалі там, дзе працавалі, у ня надта добры час, хай сабе беларускі рух ідзе далей бяз нас. І тут раптам: пачакай! мы сябе не адчуваем ніякімі здраднікамі ці прадажнымі людзьмі – мы ў першую чаргу былі антысаветчыкі, чаго нам прыплятаць «квісьлінгаў»? Іх гэта ўзбурыла – узбурыла «заснулую» частку БЦРаўскага крыла. І тады ўжо – ого! – пачынаюць пісаць людзі, якія ў тым самым часе пад акупацыяй займалі нейкія пасады.

Артыкул гэты быў успрыняты зь вялікім нэгатывам. Я лічу, што на эміграцыі былі два вельмі шкодныя выступленьні ў друку – артыкул Адамовіча пра «квісьлінгаў» (надрукаваны, як кажуць, пасьля вялікай спрэчкі са Стасем Станкевічам, які стрымоўваў і не хацеў ні гэтага слова, ні нейкага аналізу колішняй дзейнасьці), і другая шкодная, можа, у меншай меры, публікацыя – адозва Астроўскага ў ліпені 1950 году з заклікам ісьці добраахвотнікамі на Карэйскую вайну. У маёй галаве гэтыя два друкаваныя дакумэнты былі вельмі шкодныя для беларускай грамады ў эміграцыі. Яны дзялілі грамадзтва, падлівалі алівы ў пажар нязгоды, спрыялі таму, каб трымалася напружанасьць. Артыкул пра «квісьлінгаў» узбудзіў людзей, якія займалі спакойную пазыцыю ў беларускім руху, змусіў іх ісьці да рататараў і друкаваць розныя абвяржэньні. А адозва Астроўскага ў духу, што «будучы ў Карэі, мы змагаемся за Беларусь» выклікала неўразуменьне і насьмешкі – «братка, ты з глузду зьехаў! што ты гаворыш?» Спадар Астроўскі, калі мы ўжо спакойна ставіліся да твайго мінулага, дык цяпер зусім дурацтва!

Ведаючы натуру Адамовіча – патрыёт, інтэлектуал, моцны аналітык, літаратурны крытык, ён часам мог увайсьці ў нэрвовы стан і пачаць крычаць, істэрычна захлёбвацца і ўжываць ня надта прыемны лексыкон, гэтак сама было ў пісаньні – я думаю, што той артыкул пра «квісьлінгаў» ён пісаў у экстатычным стане: ну, брат, я ім уклею!

Астроўскі ў Лювэне

У Лювэн да студэнтаў часта прыязджалі беларускія палітычныя і грамадзкія дзеячы. Прыязджалі Абрамчык, Сыч, калі ён яшчэ жыў, кампазытар Карповіч – яны мелі гутаркі са студэнтамі

Юрка Сянькоўскі запрасіў у Лювэн Астроўскага – ён меў зь ім бліжэйшыя дачыненьні, у Сянькоўскага жонка жыла ў Нямеччыне, і ён да яе часта езьдзіў і сустракаўся там з Астроўскім. Дык ён запрасіў яго на гутарку са студэнтамі. Студэнты на 95 працэнтаў, а можа і на 99, былі на баку Абрамчыка і БНР, але Сянькоўскі лічыў, што гэта было б нядрэнна. Я толькі спытаўся ў яго, ці ён гэта ўзгадніў з студэнцкім згуртаваньнем, бо публічная сустрэча зь нейкай асобай мусіла быць узгодненая. Не, кажа, я нікому не гаварыў. І так атрымалася, што Астроўскі, едучы з Англіі, заплянаваў пабыць пару дзён у Лювэне.

Я пабег да пэра Рабэра па параду. Пэр Рабэр быў заходні дэмакрат, ён ведаў, што бальшыня студэнтаў за Абрамчыка, але ён дазволіў бы сустрэчу і з Астроўскім – са згоды студэнцкага згуртаваньня. Але ёсьць нейкія правілы Беларускага дома, нейкія арганізацыйныя правілы – сёньня прыняць яго ў доме ніяк ня можна. Хай, кажа, ён недзе пераначуе, я заплачу за гатэль.

Мы павесілі абвестку, што можна будзе сустрэцца з Астроўскім. Пагаварыць зь ім прыйшло пару людзей – мы зь Сянькоўскім, здаецца, Арэшка. Мы сядзелі, абедалі – гэта быў першы раз, што я гаварыў з Астроўскім. Я сказаў хто я і што я, ён запытаўся пра бацькоў, дзе я быў у Менску. Я сказаў, што адзін раз бачыў яго здалёк. На гэтым і скончылася – ён пабыў і паехаў.

Раздача чыноў

У мяне з Астроўскім быў яшчэ такі інцыдэнт. Пасьля нашага першага беларускага фэстывалю я раптам атрымоўваю ліст за подпісам Астроўскага, дзе пішацца, што мне надаецца званьне палкоўніка. Праз тыдзень – другі ліст. Мяне гэта ўзбурыла. Я адразу сеў і адказваю: «Спадар Астроўскі, спыніце дасылаць гэткія лісты. Я ніякіх чыноў не прымаю і наагул лічу Вашу дзейнасьць трохі ненармальнай, лепш бы Вы заняліся пісаньнем успамінаў аб дзейнасьці Беларускай Цэнтральнай Рады, якая адыграла значную ролю, чым Вам умешвацца ў грамадзкае жыцьцё беларусаў Амэрыкі».

І пасьля гэтага празь нейкі час – здаецца, Астроўскі ўжо быў памёр і Мядзейка яго заступіў – Мядзейка мне сказаў, што бачыў тыя лісты і даў ім адпаведны ход так, як я прасіў. Значыць: зьнялі зь мяне нададзены мне тытул. Мядзейка быў выбраны на прэзыдэнта БЦР, але ў мяне зь ім былі вельмі добрыя дачыненьні.

Што да гэтых лістоў з раздачай чыноў – думаю, што ён быў ужо стары і не разумеў, што робіцца, а нехта зь ягоных супрацоўнікаў лічыў, што такая «акцыя» патрэбная. Гэта было ў сярэдзіне 1970-х гадоў, калі грамадзтва ўжо жыло тым, што мы – амэрыканцы, мы хочам адрадзіць страчаную тут беларускасьць, даказаць, што і мы ўдзельнічалі ў разбудове Амэрыкі – і тут раптам гэтыя БЦРаўскія лісты. На той час гэта быў выразны дысананс.

Мой пагляд на палітычны падзел у беларускай эміграцыі

Магчыма, будзе на месцы выказаць мой пагляд на падзел у беларускім эміграцкім асяродзьдзі – на «крывічоў-БНРаўцаў» і «зарубежнікаў-БЦРаўцаў». Дарэчы, тэрміны «крывічы» і «зарубежнікі» я ніколі не ўжываў, бо яны неадпаведныя, зводныя, абразьлівыя. Уважаю, што падзел насамрэч быў на лягеры БЦР і БНР. У Амэрыцы па лініі гэтага падзелу ўтварыліся і дзьве беларуска-амэрыканскія грамадзкія арганізацыі – Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне (БАЗА, на плятформе БНР) і Беларускі Кангрэсавы Камітэт Амэрыкі (БККА, на плятформе БЦР.)

Часта ў беларускім асяродзьдзі ставіцца пытаньне: хто больш «вінаваты» ў палітычным падзеле грамадзтва на эміграцыі – Астроўскі ці Абрамчык? Хоць я лічу, што тэрмін «вінаваты» тут не зусім дарэчны, я б яго не ўжываў. Падзел эміграцыі на два лягеры я прыпісаў бы не «віне» названых лідэраў, а неразуменьню (ня поўнаму разуменьню) імі агульнай палітычнай сытуацыі і настрояў беларускага грамадзтва.

Разважаньні мае ідуць гэткім шляхам: Радаслаў Астроўскі – асоба, дзейная ў беларускім палітычным руху ад пачатку і амаль да апошняй чвэрці XX стагодзьдзя. Пэрыяд немалы. Згодзімся, што ў нацыянальным руху было (і ёсьць) няшмат такіх «рабацягаў». Кульмінацыйнай фазай дзейнасьці Астроўскага, на мой пагляд, былі гады нямецкай акупацыі, 1941–1944, калі вышукоўвалася, фармавалася, структурызавалася беларуская адміністрацыя. Справа была нялёгкая, але яна была зробленая. Выехаўшы на эміграцыю ў 1944 годзе, тыя беларускія актывісты, адміністрацыя акупацыйных часоў, далі пачатак новай беларускай эміграцыі. Дасягненьне? Так, бясспрэчна. Але надышла новая рэальнасьць – старонка дзейнасьці БЦР зачынялася. Прыходзілі новыя людзі. 1945 год стаўся пачаткам новай эры ня толькі для беларусаў. Трэба было зразумець, што БЦР аджыла сваё. Але таксама трэба было мець на ўвазе, што, пачынаючы новае, ня трэба ганьбіць старое. Старая старонка хай так старой і застаецца. Як выглядае, спадар Астроўскі ня быў гатовы зачыніць старонку цалкам, думаючы, што сваім аўтарытэтам змусіць беларускае грамадзтва апраўдаць ягоныя крокі. Грамадзтва думала інакш.

Цяпер аб Міколу Абрамчыку. Пачаўшы палітычную кар'еру ў Беларусі, ён рана, у пачатку 1920-х гадоў, выехаў на эміграцыю і большасць свае дзейнасьці зьвязвае з Чэхіяй, Францыяй, Нямеччынай. Бясспрэчна, Абрамчык назіраў і разумеў, што на эміграцыі не атрымоўвалася супрацоўніцтва паміж БНРаўскай элітай у Празе і беларускімі масамі эміграцыі.

У 1945 годзе паўстала магчымасьць наладзіць кантакт і супрацоўніцтва, але над гэтым трэба было працаваць. Сытуацыя была няпростая: была магчымасьць зачыніць старонку дзейнасьці БЦР, бачачы ў ёй нацыянальную дзейнасьць, хоць і часовую, і ўлучаючы яе ў рэчышча нацыянальнага руху пад гаслам БНР – руху краевугольнага ў новай беларускай гісторыі. Магчымасьць асягнуць гэта была толькі праз даўгую дыпляматычную працу і ўдумлівыя перамовы. Але Абрамчык падумаў, што хопіць ягонага аўтарытэту як дасьведчанага замежніка, дыплямата, знаўцы Заходняй Эўропы, і справа прызнаньня яго як беларускага эўрапейскага лідэра будзе вырашаная – грамадзтва прызнае яго як лідэра беларускай палітычнай эміграцыі. Аднак рэальнасьць сталася іншай – адзіным аўтарытэтам, бесканкурэнцыйным лідэрам Абрамчык ня стаўся.

На мой пагляд, самаўпэўненасьць абодвух дзеячоў прычынілася да падзелу грамадзтва. На гэтую тэму ў мяне была нагода гутарыць і з Астроўскім – які ці раз размаўляў аб гэтым і ў Лювэне, і ў Нью Ёрку – і з Абрамчыкам. Як ні дзіўна, кожны зь іх уважаў, што мае найбольш рацыі, а апазыцыйная ім частка грамадзтва была «дывэрсійным зборышчам». Астроўскі быў перакананы, што ў выпадку, калі будзе патрэбнае яднаньне, ягоны, Астроўскага, грамадзкі стаж пераканае ўсё беларускае грамадзтва ў патрэбе ягонага лідэрства, а Абрамчык уважаў, што ягоная заходнясьць, эўрапейскасьць, далёкасьць ад немцаў – тыя фактары, што давалі падставы для ачоленьня беларускага палітычнага руху, а эвэнтуальна – і кіраўніцтва дзяржавай. Як мне здаецца, такая самаўпэўненасьць ня мела поўнае падставы, і рэакцыя на гэта – раскол грамадзтва – гэта пацьвердзіла.

Такім парадкам, да расколу ў асноўным (ясна, былі і іншыя прычыны) прычыніліся неразуменьне грамадзтва гэтымі выбітнымі палітычнымі дзеячамі і іх упэўненасьць у сваім палітычным першынстве.

Чаму я не хацеў быць радным

Іншае пытаньне, якое мне час-часом ставілася: чаму я ня быў радным ні ў БЦР, ні ў БНР. Адказ пачну з асноўнага палітычнага пагляду: не ў маёй натуры, маім перакананьні быць асацыяваным на эміграцыі з плыньню, якая разумее сябе як «урад» – а і БЦР, і БНР на эміграцыі, асабліва ў 1950–60-я гады, гэта падкрэсьлівалі. Аднак – гэткі па-

гляд быў у мяне недзе глыбака – нацыянальная дзейнасьць гэтых асамблеяў (гэты тэрмін – асамблея – мне падабаецца найбольш) магла мяне захапіць, і я мог стацца радным. Але былі іншыя «тармазы». Прапанову быць радным БЦР мне рабілі Астроўскі ў 1950-х і Мядзейка ў 1970-х гадох. Я адмаўляўся, матывуючы адмовы тым, што ўважаў: БЦР як кіраўнічы ворган – пройдзены этап у нацыянальна-дзяржаўніцкім руху, хоць гэта быў важны, пазытыўны эпізод. Стацца радным БНР мне прапаноўвалі ў Лювэне Янка Жытка, Барыс Рагуля і Мікола Абрамчык, а пазьней у ЗША Вінцэнт Жук-Грышкевіч і Язэп Сажыч. Рагуля нават падаваў думку, каб я стаўся старшынём Рады БНР, што, на ягоны пагляд, аб'яднала б, злучыла б БНР і БЦР. Мае адмовы стацца радным БНР базаваліся на тым, што Рада БНР поўнасьцю ігнаравала дзейнасьць БЦР, нацыянальную дзейнасьць пад нямецкай акупацыяй, выкідаючы гэты эпізод з нацыянальнага руху, асабліва ў сваёй раньняй дзейнасьці. Я з такім паглядам ніяк не згаджаўся. Не станавіўся я радным і з такога гледзішча: стаўшы амэрыканскім грамадзянінам, беручы ўдзел у амэрыканскім палітычным жыцьці, я часта мусіў запаўняць анкеты біяграфічна-палітычнага профілю, і зьяўленьне ў такой анкеце тэрміну Рада або Ўрад БНР пацягнула б за сабой неабходнае тлумачэньне. Асабліва гэта было б складаным, калі бывалі канфэрэнцыі ў Белым Доме, Дзярждэпартамэнце, тым часам як рэгістрацыя ў тых установах як прадстаўніка беларуска-амэрыканскай арганізацыі ішла безь ніякага тлумачэньня. Да таго ж сяброўства ці старшынства ў такой беларуска-амэрыканскай арганізацыі, як БІНіМ, давала ў пэўным сэнсе свабоду быць прысутным і ў асяродзьдзі апазыцыйных арганізацыяў або нават тых, што стаялі не на нацыянальнай аснове. (Праўда, на просьбу доктара Рагулі, я ўрэшце стаўся радным БНР і нават заступнікам старшыні ў 1997–2001 гадох. Гэта быў пераходны пэрыяд, калі старшынёй Рады БНР была выбраная паважная грамадзкая дзяячка, мой доўгагадовы сябар, Івонка Сурвіла. На заканчэньне скажу: нягледзячы на тое, што я ня быў сябрам БНР, уважаю ўсю маю грамадзка-палітычную дзейнасьць ад паходаў па Менску са скарбонкай у 1942 годзе і да сёньня як дзейнасьць патрыёта-дзяржаўніка, незалежніка, будаўніка-аднаўленца першаснай формы новай беларускай дзяржавы – БНР.

БАЗА і БККА разам

Гэтак жыцьцё ішло. Ня будучы радным ні БЦР, ні БНР, я супрацоўнічаў, а вельмі часта і прадстаўляў на розных амэрыканскіх палітычных форумах абедзьве гэтыя беларуска-амэрыканскія арганізацыі. Мушу таксама падкрэсьліць, што нягледзячы на зацятасьць палітычнага падзелу сярод беларуска-амэрыканскіх арганізацыяў, былі дзялянкі палітычнай дзейнасьці, дзе прадстаўнікі абодвух бакоў выступалі раз-

ам. Прыкладам, удзел у адзначэньні Тыдня паняволеных народаў – парады заўсёды «ўмяшчалі» прадстаўнікоў і БАЗА, і БККА.

Мушу падкрэсьліць, што ў падрыхтоўцы Тыдня паняволеных народаў амэрыканскім Кангрэсам у ліпені 1959 году беларускія арганізацыі працавалі ў поўнай згодзе – БАЗА, БККА, БІНіМ, студэнцкія і маладзёвыя ўгрупаваньні падавалі Кангрэсу мэмарандумы, статыстыку, дакумэнтацыю, папярэдне ўзгадніўшы міжсобку. Я ў гэтым канчаткова пераканаўся, калі ў красавіку 1959 году прадстаўляў беларусаў на канфэрэнцыі «Эканамічны каляніялізм у СССР» (назоў прыблізны) у Калюмбійскім унівэрсытэце ў Нью Ёрку, дзе галоўным прамоўцам быў прафэсар Леў Дабранскі – украінскі дзяяч, ініцыятар Закону аб паняволеных нацыях. У пасьляканфэрэнцыйных нарадах зь Львом Дабранскім ён мне аўтарытэтна і вельмі пазытыўна акрэсьліў беларускую аргумэнтацыю (ад розных групаў) для ўлучэньня ў тады праектаваны закон, які быў прыняты праз пару месяцаў пасьля канфэрэнцыі.

Прыпамінаецца мне таксама вялікае адзначэньне ў 1977 годзе выхаду тому дакумэнтаў «Дэкалянізацыя Савецкага Саюзу», прымеркаванага да дня 7 лістапада. У Нью Ёрку шматтысячная дэманстрацыя прайшла ад 5-га да 3-га авэню, я быў адным з прамоўцаў і падвёў вынікі – што дала савецкая ўлада савецкім рэспублікам ад рэвалюцыі 1917 году і да 1977 году. Дарэчы, выдадзены том дакумэнтаў быў перададзены кожнай місіі ААН – мы з спадаром Шукелойцем даручалі асабіста гэты том дзесятку ААНаўскіх дыпляматаў. Як выданьне кнігі, гэтак і шэсьце было падтрыманае абедзьвюма беларускімі палітычнымі плынямі, а ў дакумэнты былі залучаныя і пастановы 2-га Ўсебеларускага Кангрэсу 1944 году.

Абедзьве арганізацыі запрашалі мяне выступіць з дакладам на розных сьвяткаваньнях: адзначэньня 25 Сакавіка, дня Слуцкага паўстаньня, угодак 2-га Ўсебеларускага Кангрэсу і іншых. Я рыхтаваўся да дакладаў паступова – заўсёды імкнуўся знайсьці і ўставіць нешта новае. Але быў аб'ектыўны і ніколі ня лаяў нацыянальнае. Даклады – працаёмкая дзейнасьць, я яе не цураўся, бо кожны даклад зьбліжаў з грамадзтвам. Рыхтуючыся да дакладаў, чалавек адкрываў новае, адукоўваўся сам. Даклады на дзесяткі тэмаў – і ў ангельскай, і ў беларускай мовах – для беларускіх арганізацыяў я чытаў у Нью Ёрку, Вашынгтоне, Дэтройце, Чыкага, Кліўлэндзе, Саўт Рывэры, Нью Брансўіку. Як старшыня Беларускіх Рэспубліканскіх Клюбаў я таксама дзеіў аб'ектыўна: як прадстаўніка ад беларусаў я папрасіў Міхася Бахара (Беларускі Кангрэсавы Камітэт) удзельнічаць у Белым Доме ў канфэрэнцыі з прэзыдэнтам Фордам і Генры Кісынджэрам напярэдадні канфэрэнцыі ў Хэльсынкі (ліпень 1975).

Іншая палітычная падзея, якая аб'ядноўвала прыхільнікамі БНР і БЦР – адзначэньне Дня правоў чалавека 10 сьнежня. Падзея,праўда,

адзначалася не штогоду, але мне добра запамяталіся 30-я ўгодкі ў сьнежні 1979 году, калі гэта адбывалася ў Белым Доме. Было гэта ў часы адміністрацыі прэзыдэнта Джымі Картэра, і я ў Белым Доме прадстаўляў і БАЗА, і БККА. Профіль адзначэньня быў вельмі шырокі – агулам каля 200 гасьцей: сэнатары, кангрэсмэны, прадстаўнікі навуковага сьвету, дыпляматы. З нацыянальнасьцяў былі запрошаныя беларусы, украінцы, літоўцы, латышы, эстонцы, палякі, чэхі і вугорцы. Дзяржаўны сакратар Сайрус Вэнс адчыніў урачыстасьць, пасьля выступаў Зьбігнеў Бжэзінскі і прадстаўнікі розных ведамстваў ЗША. Наапошку прамаўляў прэзыдэнт Джым Картэр. Ён падкрэсьліў, што ягоная адміністрацыя будзе адзначацца падтрымкай правоў чалавека. Пасьля былі прадстаўленыя госьці ад нацыянальнасьцяў (у тым ліку і я ад БАЗА і БККА) ды адбылася працоўная гутарка, падчас якой быў акрэсьлены стан правоў чалавека ў асобных краінах, у тым ліку і ў БССР. Я, дарэчы, меў спэцыяльны мэмарандум на гэтую тэму, які перадаў шмат каму, а галоўнае – мяне ўпершыню пазнаёмілі з сэнатарам Тэдам Кенэды, якому я таксама ўручыў гэты дакумэнт. З сэнатарам Кенэды я гутарыў хвілін дзесяць, і на разьвітаньне ён мне сказаў: «Нарэшце буду мець у сябе ў кабінэце і беларускія дакумэнты, якія напэўна скарыстаю».

Мушу падкрэсьліць, што я бываў вельмі часта ў Вашынгтоне, асабліва ў часы рэспубліканскіх адміністрацыяў, і БАЗА, і БККА даручалі мне іх рэпрэзэнтаваць.

Супольная абарона ў «Справе Лофтуса»

Асаблівая «супольнасьць» у супрацоўніцтве адчулася, калі з паклёпам на беларусаў выступіў Джон Лофтус, а прэса разьдзьмула гэтую справу. Аб «справе Лофтуса» я ўжо коратка згадваў, а тут толькі зазначу, што ў справе дзейнасьці Аддзелу спэцыяльных расьсьледаваньняў Міністэрства юстыцыі і зьвязаных з гэтым судовых працэсаў адбылося некалькі канфэрэнцыяў нацыянальных групаў з адвакатамі ў Вашынгтоне і Чыкага. У абедзьвюх канфэрэнцыях я ўдзельнічаў і прадстаўляў БАЗА і БККА.

Беларуска-амэрыканскія арганізацыі для больш эфэктыўнага змаганьня супраць паклёпаў і абвінавачаньняў беларусаў у супрацоўніцтве з нацыстамі аб'ядналіся ў адну структуру – Беларуска-амэрыканскую кааліцыю супрацьдзеяньня паклёпам. Ад імя гэтай кааліцыі я выступаў у Вашынгтоне 4–5 лютага 1984 году. У канфэрэнцыі ўдзельнічалі каля 50 адвакатаў, прадстаўнікі прэсы, улучна з такімі «тузамі», як Патрык Б'юкэнэн і Ўорэн Роджэрс, якія добра разумелі, што абвінавачаньне некаторых амэрыканскіх грамадзянаў у супрацоўніцтве з нацыстамі ў часе Другой сусьветнай вайны – гэта чарговая «вылазка» савецкіх спэцслужбаў з мэтай ачарніць

амэрыканцаў румынскага, літоўскага, беларускага, нямецкага, украінскага, эстонскага і латыскага паходжаньня.

У сваім дакладзе на канфэрэнцыі я даў агляд беларускага нацыянальнага руху і паказаў, як саветы спрабуюць і беларускае адраджэньне, і беларускі палітычны рух зьвязаць з яўрэйствам, Польшчай і нацыстоўскай Нямеччынай. Была створаная арганізацыя «Амэрыканцы за належную прававую працэдуру» (American for Due Process) і высланыя мэмарандумы прэзыдэнту Рэйгану і ў Дзярждэпартамэнт. Для легальных працэдураў, а ў выпадку патрэбы і для абароны ў судзе былі абраныя некалькі адвакатаў, якім былі перададзеныя тоўстыя папкі беларускіх дакумэнтаў.

На канфэрэнцыі ў Чыкага ўвосень 1985 году адвакаты паінфармавалі нас, прадстаўнікоў нацыянальных групаў, што прадбачаныя судовыя працэсы не адбудуцца, а Бюро іміграцыі разгледзіць паасобна справы асобаў, на якіх саветы прадставілі «доказы злачыннай дзейнасьці» ў часе Другой сусьветнай вайны. На чыкагскай канфэрэнцыі нам стала ясна, што інсьпіраваная КГБ акцыя абвінавачаньня некаторых беларускіх эмігрантаў у ваенных злачынствах заканчваецца, бо абвінавачаньні, прадстаўленыя саветамі, неабгрунтаваныя.

Беларускія дэманстрацыі ў Нью-Ёрку

Я зазначыў, што найбліжэй у грамадзкім жыцьці ў ЗША я супрацоўнічаў з БАЗА, асабліва з шматгадовым кіраўніком гэтай арганізацыі Антонам Шукелойцем. Яму, жыхару самага цэнтру Мангэтэну, па лініі БАЗА даводзілася залагоджваць шмат рутынных бюракратычных справаў для арганізацыі. Прыкладам – праводжаньне дэманстрацыяў. БАЗА бясспрэчна галоўны ініцыятар беларускіх дэманстрацыяў у ЗША. Управа пастанаўляла, а залагоджваньне вымогаў да дэманстрацыі звычайна ўскладалася на спадара Шукелойця. Паколькі я бываў у цэнтры гораду (я там працаваў, а падчас перапынку на абед быў вольны) спадар Шукелойць часта зварачаўся да мяне па дапамогу: зрабі сёе ці тое. Я дапамагаў. Але чаму я прыпомніў менавіта дэманстрацыі? А таму, што на дэманстрацыі трэба было атрымаць часам два, а часам і тры дазволы, і заўсёды адзін у паліцыі, ва ўчастку непадалёк ад будынку ААН. У той участак мы з Шукелойцем хадзілі дзесяткі разоў. І што мы заўважылі: у тым участку на сьцяне прыколатыя каляровыя сьцяжкі ўсіх дзяржаваў ААН. Калі вы просіце дазволу на дэманстрацыю, то першае пытаньне да вас ад паліцэйскага – пад якім сьцягам будзе ваша дэманстрацыя. І адпаведна паліцэйскі зазначае ці апісвае ваш сьцяг. У нашым беларускім выпадку яны ведалі (а Шукелойця па вусах ведалі даўно!), што мы дэманструем пад бел-чырвона-белым сьця-

гам. У 1995 годзе сьцяжок ва ўчастку так і не мяняўся, застаўся бел-чырвона-белы – і мы надалей дэманстравалі пад гэтым сьцягам. Паліцэйскія дзівіліся! Бо каб зьмяніць сьцяжок ва ўчастку, патрэбнае было афіцыйнае паведамленьне з ААН, а «лукашэнкаўцы» ў ААН, відаць, аб гэтым ня ведалі. Была кур'ёзная сытуацыя, якая давала нам добры повад расказаць паліцэйскім аб нашых справах.

Гаворачы аб дэманстрацыях – мы з Васілём Шчэцькам у складзе дэлегацыі БАЗА дэманстравалі супраць прыезду ў ЗША Кірылы Мазурава – гэта было ў годзе 1959-м – і трапілі ў вялікі друк. Потым я браў удзел у вялікіх дэманстрацыях у беларускіх калёнах – на Парадах ляяльнасьці, дэманстрацыях, прысьвечаных Чарнобылю, беларускім дысыдэнтам і інш. Варта таксама падкрэсьліць, што ў Нью Ёрку беларускі рух у дэманстрацыях дапілноўвала БАЗА, але запросіны ўдзельнічаць слаліся таксама БКК А, бо арганізатары разумелі – на дэманстрацыях патрэбныя людзі.

Пару словаў мушу сказаць і аб сягоньняшнім грамадзкім руху беларусаў у ЗША, у прыватнасьці ў Нью Ёрку. Трэба прызнаць, што рух ажывіўся, беларускія дэманстрацыі перад будынкам ААН – амаль звычайная зьява. Маладыя эмігранты з арганізацыяў «Пагоня» і БАЗА выдатна прадаўжаюць беларускую рэпрэзэнтацыю. Зьявіліся новыя людзі, лідэры: Ганна Сурмач, Валянціна Трыгубовіч, Віталь Зайка, Марат Клакоцкі, Сяргей Трыгубовіч, Лявон Зубараў, Валеры Дворнік, Тацяна Красоўская. Надзвычай актывізавалася дзейнасьць у Вашынгтоне – гурток БАЗА з актывістамі Алесяй Кіпель, Алесяй Сёмухай, Славам Бортнікам, Валерам Кавалеўскім амаль штодзённа дае весткі афіцыйнаму Вашынгтону аб беларускім руху!

Амэрыканская палітычная дзейнасьць

Выбары

Кожнага году ў першы аўторак пасьля першага панядзелку ў лістападзе ў ЗША праходзяць самыя розныя выбары – мясцовыя, штатныя, выбары кангрэсмэнаў, губэрнатараў, рэфэрэндумы. Раз на чатыры гады – у высакосны год – адбываюцца выбары прэзыдэнцкія, аб якіх бывае найбольшы розгалас як у ЗША, гэтак і ў цэлым сьвеце.

Гаворка аб выбарах адразу пераходзіць у партыйную плашчыню: каторая партыя выйграла? У ЗША, як ведама, дзесяткі палітычных партыяў, аднак партыяў сапраўднай моцы, якія кіруюць краінай, толькі дзьве – Дэмакратычная, большая паводле колькасьці сяброў, і Рэспубліканская, якая колькасна саступае дэмакратам, але за кошт беспартыйнага незалежнага галасаваньня досыць часта перамагае партыю-суперніцу і становіцца кіруючай партыяй краіны.

Непахісная рэчаіснасьць Амэрыкі: да ўлады партыю прыводзяць выбары, а ў выбарах кожны голас мае значаньне, таму змаганьне за галасы, падрыхтоўка да наступных выбараў пачынаецца адразу пасьля таго, як пройдуць выбары папярэднія. Партыі змагаюцца за галасы цярпліва і ўпарта. Перамога партыі перш за ўсё азначае працу для сотняў тысячаў актывістаў-бюракратаў, якія належаць да партыяў і працуюць (найчасьцей бясплатна) у выбарчых кампаніях. Магчымая таксама зьмена эканамічнай палітыкі – павышэньне або зьніжэньне падаткаў і падобнае.

Перадвыбарчая мабілізацыйная праца скіроўваецца на розныя ўгрупаваньні. Найперш кіраўнікі перадвыбарчай кампаніі ўпэўніваюцца, што галасаваць прыйдуць усе члены партыі – электаральная база, затым увага завайстраецца на розных пластох насельніцтва, прафэсійных групах і г. д. Адна зь дзялянак, дзе амэрыканскія выбарчыя мазгі шукаюць сабе падтрымку – гэта нацыянальныя арганізацыі, бо да іх належаць некалькі мільёнаў людзей. Калі вы патрапіце гаварыць зь імі адной мовай і ім праграма партыі падаецца прымальнай, то ў пэўных месцах нацыянальныя арганізацыі могуць прывесьці да перамогі. Прыкладам, літоўская арганізацыя ў Чыкага вельмі моцная, і калі партыя іх «прыдбае» на свой бок, то яны істотна дапамагаюць. Таму перад нацыянальнымі арганізацыямі

напярэдадні выбараў заўсёды робяцца рэвэрансы – кандыдаты ідуць да іх, агітуюць, прыводзяць патрэбныя аргумэнты.

Вывучаючы беларускае жыццё ў Амэрыцы, я бачыў, што дэмакраты былі першыя, хто зьвярнуў увагу на беларусаў. Кандыдат у прэзыдэнты ад Дэмакратычнай партыі Эл Сьміт у 1928 годзе наведаў беларускі асяродак у Чыкага. Рэспубліканцы пачалі цікавіцца нацыянальнымі групамі значна пазьней. Але мне адзін рэспубліканец-украінец – Мірон Лескіў – казаў, што ў Нью-Ёрку з рэспубліканцамі быў беларускі прадстаўнік і ў 1930-х гадох, праўда, я пра гэта нічога ў літаратуры не знайшоў, але будзем шукаць і, можа, знойдзем.

Беларускія рэспубліканскія клюбы

Жывучы ў ЗША, я прачытаў у беларускім друку, што ў Дэтройце заснаваны рэспубліканскі клюб. Гэта было ў канцы 1950-х гадоў, арганізатарам клюбу быў беларускі дзяяч Васіль Пляскач. Напрыканцы 1971 году кіраўніком беларускіх рэспубліканскіх клюбаў ЗША стаў доктар Станіслаў Станкевіч. Яго выбралі, бо ён быў актыўны, хоць і ня надта быў інтэграваны ў амэрыканскае жыццё, але беларусы, якія мелі пару рэспубліканскіх клюбаў к таму часу – у Дэтройце, Чыкага і Нью-Ёрку – уважалі: доктар Станкевіч актыўны, дык няхай будзе старшынём беларускіх рэспубліканскіх клюбаў. Але якраз напрыканцы 1971 – пачатку 1972 году пачала набіраць абароты выбарчая кампанія за прэзыдэнта Рычарда Ніксана, і доктар Станкевіч адчуваў, што ў кампаніі 1972 году беларусам трэба будзе актыўна ўдзельнічаць. Ён не ўважаў, што зможа аддацца гэтаму працэсу і таму зьвярнуўся да мяне: Кіпель, кажа, падыходзіць вялікая выбарчая кампанія – вы Ніксана падтрымоўваеце, дык чаму б вам не далучыцца да рэспубліканскіх клюбаў?

Кажучы шчыра, палітыка Рэспубліканскай партыі мне падабалася толькі ў адным аспэкце: у вонкавай палітыцы. Рэспубліканская платформа прадбачала цьвёрдую антыкамуністычную палітыку, падтрыманьне «Радыё Свабода», будучае самавызначэньне і дзяржаўнасьць рэспублікаў СССР, адзначэньне Тыдня паняволеных народаў. А ў Дэмакратычнай партыі я бачыў шмат таго, што ўважаў нармальным і правільным у нутраным жыцьці ЗША. Але вонкавае пераважала, таму я далучыўся да рэспубліканцаў.

«Беларусы за Ніксана»

Палітычная сытуацыя ў 1971 годзе была складаная. Прэзыдэнт Ніксан баяўся, што яго не перавыберуць, бо ён перад тым абяцаў, што скончыць вайну ў Віетнаме, а яшчэ ў 1971 годзе вайна была незакончаная. Да таго ж, Ніксана недалюблівалі шмат за што зь ягонай

папярэдняй дзейнасьці – за хітрасьць, невялічкія інтрыжкі, усякія ўлоўкі. А тут на пачатку 1972 году стаўся «Ўотэргейт»: асобы, блізкія да кіраўніцтва рэспубліканскіх колаў, улезьлі ў штаб-кватэру Дэмакратычнай партыі. Сам па сабе факт крымінальны, а ў дадатак Ніксан і ягонае асяродзьдзе сталі выкручвацца, ілгаць, круціць, прыкрываць гэты факт узламаньня. Гэтыя падзеі стваралі непрыемную атмасфэру, і падставы баяцца, што яго не перавыберуць, у Ніксана – чалавека вельмі амбітнага – былі.

Асабіста я быў перакананы, што трэба галасаваць і пераабраць Ніксана на другі тэрмін, і ўважаў, што трэба ўлучыцца ў беларускі рэспубліканскі рух. Тым болей, што ўтвараўся Камітэт пераабраньня прэзыдэнта Ніксана, які ўлучаў ня толькі рэспубліканцаў, але галоўным чынам незалежных і «дэмакратаў за Ніксана». На зборцы беларускага рэспубліканскага актыву ў Кліўлэндзе доктар Станкевіч – са згодай актыву – кіраўніцтва Камітэтам пераабраньня Ніксана даручыў мне, улучаючы ў гэты камітэт і беларускія рэспубліканскія клюбы.

Беларускіх рэспубліканскіх клюбаў было ўсяго некалькі, а кіраўніцтва выбарчай кампаніі ў Вашынгтоне ціснула, каб прадстаўніцтвы Камітэту за пераабраньне Ніксана былі ва ўсіх штатах. Я ўзяў адпачынак на працы і блізу 6 тыдняў аддаваўся выбарчай кампаніі. Я езьдзіў як па сумежных зь Нью Джэрзі штатах, так і далей – у Чыкага, Кліўлэнд, Бостан. Беларускія клюбы «за Ніксана» былі створаныя больш, чым у дзесятку мясцовасьцяў.

Што было новага пры стварэньні клюбаў, дык гэта тое, што сябры, якія згаджаліся ўступіць у клюб, запаўнялі невялікія анкеты, дзе пацьвярджалі, што будуць актыўна працаваць у выбарчай кампаніі, і плацілі за сяброўства адзін даляр. Гэты сымбалічны даляр – адбітак амэрыканскай псыхалёгіі: маўляў, калі плаціш за нешта грошы – гэта справа сур'ёзная! Мараль з гэтага – будзеш працаваць і галасаваць за Ніксана. Але для мяне найважнейшае было тое, што здаваныя ў Вашынгтон анкеткі залічаліся ў нацыянальнасьць таго, хто іх здае. За першыя два тыдні я сабраў панад тысячу анкетак (падпісваліся і беларусы, і небеларусы) і калі здаваў тыя дакумэнцікі і даляры ў галоўную выбарчую кватэру ў Вашынгтоне, то на рахунак беларусаў было ўпісана панад тысячу добраахвотнікаў выбарчае кампаніі. За ўсю кампанію гэты лік склаў некалькі тысячаў.

Безумоўна, у выбарчай кампаніі 1972 году беларусы прадэманстравалі сябе як сур'ёзная палітычная грамада. Але адзін элемэнт тае кампаніі я ўважаю за вельмі важны – мы дамагліся вырабу выбарчых жэтонаў «Беларусы за прэзыдэнта Ніксана». Справа жэтонаў дыскутавалася на аднэй зборцы выбарчага камітэту, дзе былі прысутныя каля 25 прадстаўнікоў розных нацыянальнасьцяў і было ведама зь невялікае справаздачы, як лічбова ідзе справа ў Камітэце пераабраньня прэзыдэнта Ніксана. Я гэта, як кажуць, «намотваў на

вус». Выданьне жэтонаў галоўным выбарчым штабам у Вашынгтоне я ўважаў за вельмі важную справу агульнаамэрыканскага маштабу. Гэта азначала, што жэтоны будуць пасланыя ў выбарчыя штабы ў кожны штат. Там актывісты кампаніі будуць аналізаваць, дзе ёсьць якія нацыянальнасьці, і адпаведна слаць у тыя мясцовасьці жэтоны. Апрача таго, у кожным штабе будзе зладжаная выстаўка жэтонаў, і наведнікі змогуць такі жэтон атрымаць. На паседжаньні я запрапанаваў, каб тыраж сэрыі беларускіх жэтонаў быў ня меншы як 25 тысячаў штук. Якім тыражом дакладна былі выдадзеныя жэтоны, я ня ведаю, але што яны былі ва ўсіх штатах – гэта факт.

Лічу, што выданьне тысячнымі тыражамі жэтонаў (былі дадатковыя выданьні) было для нас вялікай удачай, бо надзвычай спрыяла пашырэньню інфармацыі пра беларусаў.

Выбары, як ведама, прэзыдэнт Ніксан выйграў. Асобы, групы, камітэты, якія ўдзельнічалі ў выбарчай кампаніі, атрымалі лягчэйшы доступ да «палітычнага» Вашынгтону. У мяне як прадстаўніка беларусаў у выбарчым штабе ў Вашынгтоне спыталіся: ці я маю сьпіс асобаў, якія жадалі б атрымаць працу. Я, як прыпомню, падаў пару прозьвішчаў маладзейшых людзей, і некаторыя зь іх атрымалі працу – лепшую або ў іншым месцы. Аднак я заўсёды падкрэсьліваў, што ў палітычных кампаніях мы, беларусы, у большасьці бярэм удзел дзеля прынцыпу, або падтрымваем вонкавую палітыку рэспубліканцаў і наагул іх стаўленьне да Савецкага Саюзу.

Знаёмства з Бушам-старэйшым

Паводле завядзёнкі пасьля выбарчай кампаніі былі розныя прыняцьці ў Белым Доме і па-за ім, новыя знаёмствы.

На Каляды 1972 году прэзыдэнт Рычард Ніксан зладзіў вялікае прыняцьцё для ўсіх кіраўнікоў выбарчых клюбаў нацыянальных групаў. Майстрам цырымоніі быў кардынал Крол, польскага паходжаньня. Палякі былі амаль стопрацэнтна за Ніксана. І вось, першы, хто вітаў гасьцей, быў кардынал Крол. (Калі мяне прадставілі яму як беларускага дзеяча – мы былі з Зорай – дык кардынал нам: скажыце мне мацней на вуха. Я кажу: можа, напісаць на паперцы? Ён бачыць, што я ўжо пачынаю кпіць, не, кажа, я ведаю, што такое Беларусь...) А потым абвяшчаюць: вас усіх прадставяць Ніксану, хоць мы Ніксана бачылі некалькі разоў у часе выбарчай кампаніі – нас інструктавалі па апошніх пазыцыях Ніксана па розных пытаньнях. Ну і прадстаўляюць нас як беларускіх дзеячоў. За намі стаіць Буш-старэйшы, бацька – мала хто яго тады ведаў. Буш пачуў пра беларусаў і пасьля прадстаўленьня бярэ мяне за рукаў: адыдзем убок. Я, кажа, цяпер прадстаўнік у Аб'яднаных Нацыях, часта зь беларусамі маю дачыненьне і ня ведаю, пра што зь імі можна гаварыць, ці можна

ім верыць. І так мы гадзіны паўтары правялі з Бушам, гаворачы пра БССРаўскіх прадстаўнікоў – хто яны і што яны, што гэта такая за каша. І потым я з Бушам спатыкаўся ў Кліўлэндзе – ён ужо тады ня быў прадстаўніком у ААН – і ён мне дзякаваў за тую інфармацыю. Для яго гэта было нешта зусім новае. Сустракаўся я з Бушам і пазьней, калі ён стаў прэзыдэнтам ЗША.

Сэнатар Робэрт Доўл

У часе кампаніі 1972 году і пазьней мы завялі ў Вашынгтоне шмат цікавых і патрэбных знаёмстваў. Знаёмства з сэнатарам Робэртам Доўлам, прыкладам, было вельмі памыснае – калі мы адзначалі 60-я ўгодкі БНР на Капіталійскім узгорку ў Вашынгтоне, сэнатар Доўл быў у нас галоўны прамоўца.

У дачыненьнях з сэнатарам Доўлам прыпамінаецца такі выпадак. Адзін з дараднікаў Доўла быў украінскага паходжаньня – Мірон Курапас з Чыкага. Як толькі Мірон Курапас даведаўся, што я – беларус, ён мне сказаў: «Зь беларускім пытаньнем я знаёмы, я ведаю беларусаў». Зразумела, я запытаў у Мірона, адкуль ён знаёмы зь беларусамі. На што ён мне адказаў: «У нас на кватэры ладны час пражываў Язэп Варонка, калі ён прыехаў у ЗША, і ён шмат нам расказваў пра Беларусь». Цікавае супадзеньне! Зь Міронам Курапасам я меў дачыненьні і пазьней.

Аднойчы ў Вашынгтоне была зборка рэспубліканскіх кіраўнікоў, і Курапас, убачыўшы мяне, завёў у нейкі офіс і кажа: чытай. І даў мне на папяроснай паперы кавалак тэксту «Утраченная родина» Кукабакі! Гэта, паводле Курапаса, быў тэкст, які амэрыканская амбасада ў Маскве атрымала і пераслала ў Вашынгтон. Гэтак я ў Вашынгтоне ўпершыню даведаўся пра гэты тэкст. Пазьней было высьветлена, што аўтар тэксту – Міхаіл Кукабака. Я хачу сказаць, што часам праз прыватныя кантакты нарываесься на мамэнты, да якіх мабыць і выведка мае нейкае дачыненьне.

Сэнатар Робэрт Доўл у 1970-х гадох быў бясспрэчна самы ўплывовы рэспубліканец. Шчасьлівае супадзеньне, але ў мяне і ў іншых беларусаў – рэспубліканскіх актывістаў наладзіліся з Доўлам выдатныя дачыненьні. Каб адзначыць ягоны адыход ад кіраўніцтва партыі, нацыянальныя клюбы вырашылі арганізаваць вечарыну. Я і спадарыня Мінг Шу былі адказныя за імпрэзу, і я, як мог, «падцягваў» беларусаў. Найбольшае ўвагі і адзнакі на гэтай вечарыне беларусы дасягнулі тым, што на ўрачыстасьць быў запрошаны беларускі аркестар спадара Мартыновіча і паводле праграмы беларус айцец Алег Махнюк прачытаў заключную малітву. Адчыненьне і зачыненьне такога роду ўрачыстасьці беларускай «Лявоніхай» – нештодзённая зьява. Удзел у ёй беларусаў быў адзначаны амэрыканскім друкам, а жан-

чыны ў беларускіх нацыянальных строях і прадстаўнікі беларускіх рэспубліканскіх клюбаў былі ўдзельнікамі тэлевізійнай праграмы.

Рыхтуючы імпрэзу, я адчуў, што рэспубліканскія «тузы» Нью Ёрку стараліся неяк адцеміць «нэўтральнасьць» сэнатара Доўла, яго няведаньне аб падрыхтоўцы авантуры Watergate. Я гэта сказаў, за што Робэрт Доўл мне асабіста падзякаваў.

Сэнатар дапамагаў нам і ў чыста беларускіх справах. У чэрвені 1979 году ён даслаў лісты генэральнаму пракурору СССР Раману Рудэнку і савецкаму паслу ў Вашынгтоне Анатолю Дабрыніну ў справе Міхала Кукабакі з просьбай вызваліць яго і даць магчымасьць эміграваць.

Як Ніксан паехаў у Менск

Беларускі ўдзел у выбарчай кампаніі 1972 году і навязаныя блізкія кантакты з рэспубліканцамі дапамагалі нам у палітычнай працы. Мы часта былі ініцыятарамі і ўдзельнікамі слуханьняў, працаў камісіяў, сьведчылі пра русыфікацыю Беларусі, былі на прыняцьцёх у Белым Доме, Дзярждэпартамэнце.

На адным з прыняцьцёў у Белым Доме нехта з калегаў кажа мне, што прэзыдэнт Ніксан едзе ў Маскву. Я якраз гавару з кангрэсмэнам Эдвардам Дэрвінскім і кажу яму – добра было б, каб Ніксан заехаў і ў Менск, калі ён ужо будзе ў Маскве. На прыняцьці быў выканаўчы дырэктар па працы з нацыянальнымі клюбамі, і ён мне кажа: пагавары з такім і такім кангрэсмэнам. Я пагаварыў, а кангрэсмэн кажа: трэба гэта перадаць Ніксану. Нехта з функцыянэраў увёў гэта яму ў вушы. Быў там яшчэ й Кісынджэр. Ну і разьвіталіся мы на тым, што Ніксан гэта пачуў. Мы едзем дахаты, я Стасю Станкевічу кажу: трэба падаць пра гэта ў газэту «Беларус» – будзе нагода. Ён кажа: слухай, Кіпель, ня будзь дурнем, у газэту нічога ня будзем даваць. Стась Станкевіч наагул быў вельмі сьціплы чалавек і надта баяўся: дасі ў газэту бурбалку, а пасьля, як нічога ня будзе – страцім давер, аўтарытэт. Ну але сталася так, што ў газэце не хапала матэрыялу. Запруднік звоніць, што не хапае, і я на калене напісаў, што мы былі ў Белым Доме і пра што мы там гаварылі. Запруднік быў у друкарні і пусьціў вестку ў друк, і яно пайшло ў лютаўскім нумары 1974 году. А мяне тады ў Белым Доме запыталіся – калі б да гэтага дайшло, ім будуць патрэбныя магнітафонныя запісы мовы па-беларуску, на што я парадзіў зьвярнуцца да доктара Запрудніка на Радыё Свабода. «А, ну з Радыё Свабода мы дагаворымся!» – быў упэўнены адказ зь Белага Дому. І вось у красавіку Запрудніку звоняць: нагаварыце, як па-беларуску прывітаць людзей. Дык мы ўжо бачым, што справа ідзе вышэй і вышэй.

Урэшце Ніксан заехаў у Беларусь, а рэшта, як кажуць амэрыканцы – гісторыя!

Змаганьне за «Голас Амэрыкі»

Шмат энэргіі – і рэспубліканскія клюбы як частачка тае энэргіі – мы патраціл на дамаганьне адкрыцьця беларускай рэдакцыі «Голасу Амэрыкі», але так і не дамагліся гэтага аж да XXI стагодзьдзя (новыя, пост-БССРаўскія эмігранты гавораць у «Голасе Амэрыкі» і па-беларуску). Бяда нашая была ў тым, што мы, беларусы, не атрымалі сваёй квоты на самым пачатку, у канцы 1940-х гадоў, а пазьней дзеля розных бюджэтных рагатак (так казалася афіцыйна) здабыць беларускамоўныя праграмы было немагчыма.

Як я даведаўся пазьней, напачатку ў «Голасе Амэрыкі» нам нашкодзілі літоўцы, пераканаўшы амэрыканцаў, што ўсе беларусы разумеюць па-расейску і асобных праграмаў ім ня трэба. Пра пачаткі перадачаў на нацыянальных мовах у «Голасе Амэрыкі» мне ў 1982 годзе расказаў літоўскі дзяяч Канстанцінас Юргела, першы кіраўнік літоўскай службы «Голасу Амэрыкі». Гаварыў, дарэчы, вельмі добра па-беларуску – ён некалі, варочаючыся з палону з Румыніі, затрымаўся ў Беларусі перад тым, як ён пайшоў у Літву, і гадоў пяць жыў недзе каля Баранавіч, навучыўся гаварыць па-беларуску, і толькі ў 1930-х гадох вярнуўся ў Літву. Дык вось, гэты Юргела мне расказаў, што менавіта літоўцы пераканалі амэрыканцаў, што «ўсе беларусы разумеюць па-расейску». Я ў яго спытаўся, чаму яны гэта сказалі? Ну, кажа, баяліся за бюджэт, што, можа і ім пашкодзіць, а галоўнае – проста не разумелі палітычнай патрэбы таго, што трэба падтрымаць беларусаў. Ён сам казаў, што ён быў адзін з тых, хто прагаласаваў за тое, што «Голас Амэрыкі» для беларусаў не патрэбны. А пасьля пра гэта шкадаваў.

Праца ў рэспубліканскім руху

Актыўна працаваў я ў палітычным (пераважна рэспубліканскім) руху гадоў каля дзесятка: належаў да ўправы Нацыянальных рэспубліканскіх клюбаў у Вашынгтоне (NRHGF – National Republican Heritage Groups Federation), пару гадоў узначальваў Фэдэрацыю рэспубліканскіх клюбаў штату Нью Джэрзі і быў пару гадоў рэдактарам рэспубліканскае газэты нацыянальнасьцяў штату Нью Джэрзі – The Heritage Review.

Мушу зазначыць, што газэту The Heritage Review (1971–1977) мы зрабілі нагэтулькі дынамічным рэспубліканскім выданьнем, што аддзел нацыянальнасьцяў Рэспубліканскай партыі ў Вашынгтоне («ЦК Партыі») хацеў зрабіць яе агульнаамэрыканскай рэспубліканскай газэтай нацыянальнасьцяў. Аднак, пазандаваўшы апінію ў штаце,

я адмовіўся ад гэтае задумы, бо было б цяжка зьбіраць рэкляму ды паўсталі б і бюракратычна-адміністрацыйныя цяжкасьці.

Уважаю, што маё супрацоўніцтва з рэспубліканцамі было вельмі памыснае. Мы зрабілі шмат для прапаганды імя Беларусі і дзейнасьці беларусаў-амэрыканцаў. У газэце The Heritage Review падавалася шмат інфармацыі пра беларускія грамады ЗША. У Вашынгтоне Рэспубліканская партыя таксама выдавала прапагандысцкую літаратуру – календары, ілюстраваныя брашуркі, дзе адзначаліся беларускія сьвяты (25 Сакавіка, Дзень Слуцкіх паўстанцаў, Дзень Каліноўскага). Вельмі важна было таксама, што рэгулярна інфармацыя пра Беларусь – асабліва дамаганьне беларускамоўных праграмаў у «Голасе Амэрыкі» – трапляла ў праграмныя дакумэнты партыі, бадай выключна дзякуючы дзейнасьці доктара Расьціслава Гарошкі зь Нью Ёрку. На мой пагляд, рэспубліканцы былі больш падрыхтаваныя да падзеяў пасьля распаду СССР. Прэзыдэнт Джордж Буш прызнаў Беларусь імгненна.

Што давалі палітычныя кантакты

Ня ведаю, як у іншых народаў, але ў амэрыканцаў прыналежнасьць да партыі ў першую чаргу, бясспрэчна, абумоўліваецца ідэалягічнай арыентацыяй, хоць вельмі часта бывае, што людзі (асабліва бізнэсоўцы) кіруюцца менш высокімі пачуцьцямі – шанцамі лепшай працы, большага бізнэсу. Карысталіся такімі «аказіямі» і беларускія рэспубліканцы – атрымоўвалі лепшыя пасады. Але ў цэлым рэспубліканцы-беларусы былі ідэалістамі: іх займала падтрымка беларускіх ідэалаў, найперш дзяржаўнасьці ў форме БНР, дамаганьне беларускамоўных праграмаў у вяшчаньні «Голасу Амэрыкі».

Кіраўнікі Рэспубліканскай партыі (большасьць іх) нас добра разумелі і падтрымвалі. У часы прэзыдэнцтва Рычарда Ніксана, Джэралда Форда, Роналда Рэйгана, Джорджа Буша-бацькі ў нас была мажлівасьць падаваць мэмарандумы ў Дзярждэпартамэнт і іншыя дзяржаўныя структуры. Рэйган быў першым прэзыдэнтам, які прывітаў беларусаў з днём 25 Сакавіка. Мы таксама падалі шмат дакладаў і мэмарандумаў аб русыфікацыі БССР – у Белы Дом, Міністэрства Асьветы, Міністэрства сацыяльных справаў.

Адным з найбольшых нашых посьпехаў у супрацоўніцтве з рэспубліканцамі я ўважаю задавальненьне нашае просьбы адзначыць 60-я ўгодкі абвешчаньня БНР на Капіталійскім узгорку. Урачыстасьць адбылася ў клюбе Capitol Hill побач з будынкам Кангрэсу ЗША. Непасрэдна з паседжаньня Сэнату на сьваткаваньне прыйшоў сэнатар Робэрт Доўл, які выступіў з прамовай, прысутныя былі таксама кангрэсмэн Эдвард Дэрвінскі і некалькі функцыянэраў зь дзярждэпу.

Дэмакраты

Мушу таксама адзначыць, што кантакты зь Белым Домам, усталяваныя ў часы рэспубліканскіх прэзыдэнтаў, працавалі і пры дэмакратах. Гэтак я быў запрошаны колькі разоў у Белы Дом прэзыдэнтам Картэрам, а на адной з сустрэчаў зь ім у Белым Доме асабіста перадаў прэзыдэнту сьпіс беларускіх іншадумцаў, якіх перасьледавалі ў БССР.

Асабліва памысным было супрацоўніцтва з сэнатарамі-дэмакратамі ад штату Нью Джэрзі Білам Брэдлі і Фрэнкам Лаўтэнбэргам. З абодвума я сустракаўся дзесяткі разоў, перадаваў ім беларускія мэмарандумы, інфармаваў пра Беларусь і пра беларусаў у штаце.

Падсумоўваючы рэспубліканскі досьвед

Дзейнасьць у сфэры Рэспубліканскай партыі была працаёмкая. Апрача ўдзелу ў рэгулярных арганізацыйных зборках я быў адначасна і старшынём Нацыянальных рэспубліканскіх клюбаў ў штаце Нью Джэрзі (колькасьць клюбаў мянялася ад 14 да 20 і залежала ад аплаты складак).

Трэба было бываць на розных прынагодных мерапрыемствах – то трэба прывітаць Ракфэлера, які прыяжджае ў штат, то трэба пабываць на прыняцьці прысягі новымі грамадзянамі, або паўдзельнічаць у розных паседжаньнях. Але рабіў я гэта ахвотна, бо заўсёды можна было нешта сказаць пра Беларусь. Гэтаксама было ясна: партыя цікавіцца толькі тым, каб здабыць больш галасоў за рэспубліканцаў. Як для мяне, дык гэтая мэта была абмежаваная. Я й так аддаў гэтай дзейнасьці шмат гадоў, і таму быў ужо час ад яе адысьці.

Беларускія рэспубліканскія клюбы былі дзейныя і пасьля майго адыходу, калі старшынём стаў Васіль Мельяновіч – мой доўгагадовы сябра і аднадумец. На вялікі жаль, Васілю не было наканавана даўжэйшае жыцьцё – ён заўчасна адышоў у іншы сьвет у 2004 годзе.

Гаворачы па шчырасьці, амэрыканская Рэспубліканская партыя перажывае крызіс. Пасьля колішняга ўздыму пры прэзыдэнце Рэйгане палітыка Джорджа Буша-малодшага – войны ў Іраку і Афганістане – была для рэспубліканскага руху разбуральнай, партыя страціла шмат сяброў, асабліва сярод маладых. Праўда, цяпер «рэспубліканства» адраджаецца, асабліва на мясцовым, штатным узроўні. Будучыня пакажа, дзе ў гэтым працэсе будуць амэрыканскія беларусы-рэспубліканцы.

ЗША. Этнічная рада

Шлях да Рады

Яшчэ адна амэрыканская арганізацыя, у якой мне давялося дзеіць і чатыры гады быць старшынём – гэта Этнічная дарадчая рада пры губэрнатары штату Нью Джэрзі (Governor's Ethnic Advisor Council of NJ). Арганізацыя, пакліканая спэцыяльным дэкрэтам губэрнатара, мае функцыі: радзіць губэрнатару ў пытаньнях нацыянальнасьцяў штату, падтрымоўваць культурна-грамадзкія праекты нацыянальнасьцяў штату. Арганізацыя гэтая не палітычная, а грамадзка-культурная.

На адным з інаўгурацыйных баляў у Вашынгтоне ў студзені 1973 году з нагоды перамогі Рычарда Ніксана ў выбарах і пачатку ягонага другога прэзыдэнцкага тэрміну, мы – я і Зора – пазнаёміліся з губэрнатарам штату Нью Джэрзі Білам Кэгілам. У часе гутаркі губэрнатар сказаў, што чуў пра мой удзел у выбарчай кампаніі прэзыдэнта Ніксана, ведае, што мы – беларусы (перад тым ён паказваў прэсе жэтоны нацыянальнасьцяў, якія «працавалі» на Ніксана ў Нью Джэрзі), і прапанаваў мне ўвайсьці як сябру ў склад Інтэрнацыянальнага камітэту нью-джэрзійскае камісіі па адзначэньні 200-годзьдзя ЗША, якое ў тым часе рыхтавалася «на поўную пару», і для адзначэньня юбілею ствараліся розныя структуры ўлучна з згаданым камітэтам. Я прапанову губэрнатара прыняў – стаў сябрам таго камітэту.

У камітэце было 14 чалавек, а ўзначальваў яго доктар Пітэр Самартына – тагачасны рэктар, а пазьней канцлер унівэрсытэту Фэрлея Дыкенсана. Доктар Самартына жыў у нашым мястэчку Радэрфорд, там мясьціўся і ўнівэрсытэт – за дзесяток кварталаў ад нашае хаты. Для мяне гэта было вельмі выгодна, і я не прапушчаў ніводнага паседжаньня камітэту, бо яны адбываліся альбо ў хаце доктара Самартына, альбо ў унівэрсытэцкіх будынках.

Востраў Сьлёз

Асноўным заданьнем камітэту было падрыхтаваць справаздачу аб стане Эліс Айлэнду – былога «Востраву Сьлёз» у Нью-ёркскай гавані, які ад канца XIX стагодзьдзя і да сярэдзіны 1950-х гадоў быў важным пунктам у эміграцыі ў ЗША з Эўропы. Праз востраў прайшло каля 13 мільёнаў эмігрантаў (ясна, што праз востраў прайшлі ўсе нашыя

землякі!). Ад сярэдзіны 1950-х гадоў востраў быў цалкам закрыты і знаходзіўся пад аховай берагавой памежнай службы ЗША. І вось у Вашынгтоне вырашылі аднавіць востраў як нацыянальны памятнік. Каб справіцца з заданьнем, трэба было востраў адведаць. І ў першай афіцыйнай паездцы сяброў камітэту на востраў браў удзел і я.

У прызначаны дзень мы з Самартына пад'ехалі да берагу, і там нас катэр памежнай службы павёз на невялікі астравок каля Статуі Свабоды. Калі мы высадзіліся з катэра, прадстаўнікі з Вашынгтону сказалі нам, што востраў, г. зн. будынкі на ім, трэба ўважліва агледзець ды выказаць меркаваньні што да магчымасьці ці немагчымасьці ўжыцьця востраву. Нашыя заўвагі мусілі мець характар гістарычна-сэнтымэнтальны, а інжынэры і будаўнікі мусілі аглядаць будынкі пазьней.

Атрымаўшы блякноцікі, мы пайшлі па будынках. Будынкі былі ў жахлівым стане ўсярэдзіне, хоць звонку, з чырвонай цэглы, выглядалі досыць прыстойна, калі не зважаць на пабітыя шыбы. Было відаць, што будынкі былі зачыненыя як бы ў сьпешцы: непрыбраныя перакуленыя сталы, на падлогах бруд, судзьдзё, старыя коўдры, паламаныя ўслоны... Адміністрацыйны будынак быў прыстойны. У ядрэнным стане быў і будынак, дзе эмігранты праходзілі камісіі – мэдыцынскую, іміграцыйную.

Натаваў я розныя заўвагі й проста не даваў веры: сюды ж прыходзілі мае землякі – менскія, віленскія... Ствараласа ў мяне ўражаньне, што, калі я перагаворваўся з Самартына, рэха, якое разносілася, мела ў сабе нешта беларускае – галасы землякоў.

«Жыве Беларусь!»

Апошні будынак, ці, правільней, частка будынку каля мэханічна-ацяпляльнага цэху, які трэба было агледзець, называўся карантынным. Сюды зводзілі эмігрантаў на карантынны пэрыяд. Эмігранты з мэдычнымі праблемамі знаходзіліся ў меншай, адгароджанай частцы, а з праблемамі палітычна-адміністрацыйнага характару – у большай.

І гэты будынак быў вельмі закінуты. Кідалася ў вочы, што было ў ім шмат надпісаў на сьценах – прозьвішчы, цытаты, разнамоўе. Я дык неяк затрымаўся, разьбіраючы тыя прозьвішчы. І раптам недалёка ад акна ўбачыў... Спачатку ня даў веры! Зьлінялае, выцьвілае, напісанае колісь хімічным алоўкам «Жыве Беларусь»! Ясна, я ўсхваляваўся. Паклікаў Самартына, некага іншага. Тлумачыў ім, што гэта такое, і стараўся перадаць пачуцьці. Асабліва хацеў я ведаць, ці ў каго-небудзь з нашае дэлегацыі ёсьць фотаапарат. Ніхто ня меў. Ня мэта была дакумэнтаваць дэталі. Ды наагул, да маіх узрушаных пачуцьцяў калегі аднесьліся спакойна, абыякава. Супакоіўся і я. Думкамі пера-

нёсься да таго земляка, што напісаў «Жыве Беларусь!». Я ведаў, што земляка не знайду, але ягоны настрой адчуваў: ён у цяжкую хвіліну, магчыма перад адпраўкаю назад у Эўропу, сказаў «Жыве Беларусь!» і напісаў нешта важнае для яго!

Ведаў я, што гэтыя сьцены хутка замалююць і надпіс згіне. Але ведаў я таксама, што таго, хто вывеў гэтыя словы, я не забуду. Ды наўздагон скажу: справаздачу мы зрабілі. Рэкамэндавалі будынкі аднавіць. Бюракратыя запрацавала. На Востраве сьлёз цяпер – Музэй эміграцыі.

Губэрнатар Брэндан Бэрн

У тым самым 1973 годзе ў штаце Нью Джэрзі адбываліся чародныя – раз на чатыры гады – выбары губэрнатара. Дасюлешні губэрнатар рэспубліканец Біл Кэгіл выбары прайграў, а штат выбраў новага губэрнатара – дэмакрата Брэндана Бэрна (абодва, дарэчы, знаныя палітыкі штату, ірляндзкага паходжаньня).

Новы губэрнатар Брэндан Бэрн, ствараючы сваю адміністрацыю (каля 1500 чалавек), пакінуў створаныя папярэднікам структуры адзначэньня 200-годзьдзя ЗША амаль бязь зьменаў, толькі дадаў у камітэты сваіх дарадчыкаў.

У Інтэрнацыянальны камітэт, дзе я быў сябрам, ад новае адміністрацыі быў прызначаны Стывэн Рычэр – маладзейшы чалавек, кіраўнік аддзелу Дэмакратычнай партыі ў адной з акругаў штату Нью Джэрзі, выпускнік Прынстанскага ўнівэрсытэту. Я з Стывэнам Рычэрам пасябраваў, асабліва пасьля таго, як ён папрасіў мяне «настроіць» сяброў камітэту на прыняцьцё рэзалюцыі патрэбнага новай адміністрацыі зьместу – што я і зрабіў. Стывэн быў яўрэйскага паходжаньня, яго продкі прыехалі ў ЗША напрыканцы XIX стагодзьдзя з Оўручу ва Ўкраіне. Але, як казаў Стывэну дзед, у бюракратычным млыне іміграцыі ягонае прозьвішча Оўруцкі было спрошчана на Рычэр. Сяброўства нашае мацнела, бо Стывэн хутка зразумеў і маё зацікаўленьне амэрыканскім палітычным працэсам, і прасіў растлумачыць болей пра Беларусь, бо пра Ўкраіну ён сёе-тое ведаў. (Маё сяброўства з Стывэнам працягваецца і цяпер. Аднойчы ён прапанаваў мяне ў кандыдаты на атрыманьне «Ганаровага мэдаля Эліс Айлэнд», але яму паведамілі, што ўзнагарода даецца аднаму чалавеку паходжаньнем з пэўнай краіны і што як выхадзец зь Беларусі яе атрымаў Кэрк Дуглас.)

Аднак поўнасьцю ў той час я аддаваўся арганізацыі Беларускіх фэстываляў. Дарэчы, мая прысутнасьць у Інтэрнацыянальным камітэце дапамагала мне і ў справе фэстываляў – усе сябры камітэту і іх сем'і набывалі квіткі на Беларускія фэстывалі.

Штатная палітыка таксама ішла сваім ходам – набліжаўся канец

першага тэрміну губэрнатара Бэрна (1973–1977) – дэмакраты штату рыхтаваліся да перавыбараў губэрнатара. Я ў гэтай кампаніі ўдзелу ня браў – уся энэргія канцэнтравалася на нашых беларускіх справах. Аднак калі дэмакраты пыталіся, асабліва ў Зоры – яна апрацоўвала даведнік нацыянальнасьцяў штату Нью Джэрзі – дык парады мы давалі.

Пераабраньне Бэрна

Справа пераабраньня на другі тэрмін губэрнатара Брэндана Бэрна не выглядала простай, пераможнай або нават абяцальнай. Рэйтынг губэрнатара Бэрна ў штаце, асабліва сярод дэмакратаў, быў вельмі нізкі. Прычына незадавальненьня губэрнатарам палягала ў тым, што ён правёў заканадаўства, якое абвяшчала і замацоўвала «на векі вечныя» недатыкальнасьць вялікае тэрыторыі штату – гэтай тэрыторыі надаваўся статус запаведніку Pine Lands. Гэта вялізарная тэрыторыя цэнтральнае часткі штату Нью Джэрзі, пераважна пясчаная зь нізкаслымі сасонкамі, рачулкамі і багатай фаўнай. Пад пластамі пяску – аквіпласт чысьцюткай вады, рэзэрвуар пітной вады для штату Нью Джэрзі і гораду Філядэльфія. Бясспрэчна, тэрыторыя магла ў будучыні стаць месцам «будаўнічага буму», бо ляжала выгодна паміж Нью Ёркам і Філядэльфіяй. Губэрнатар Бэрн прыкончыў мары будаўнікоў, камэрсантаў, прадпрымальнікаў, а з гэтымі катэгорыямі салідарызаваліся і будаўнічыя прафсаюзы. І хоць заканадаўства прайшло, зацэмэнтавала закон, шырокія пласты выбаршчыкаў думалі праваліць губэрнатара на наступных выбарах (1977) і закон адмяніць.

Перадвыбарчая кампанія была заўзятая, і калі традыцыйныя дэмакратычныя групы, такія як прафсаюзы, губэрнатара не падтрымвалі, то нацыянальныя мяншыні з кансэрватыўным падыходам да «пустой зямлі, парослай лесам» – беларусы, палякі, італьянцы – далі губэрнатару неабходную перавагу і забясьпечылі перамогу ў выбарах: Брэндан Бэрн быў пераабраны на другі тэрмін, 1978–1982.

Было ў ходзе тае перадвыбарчае кампаніі і нешта новае ў гутарках з нацыянальнасьцямі. Губэрнатар казаў: «Калі мяне пераабяруць, я буду больш зьвяртаць увагі на праблемы і клопаты нацыянальных групаў і арганізую Этнічную дарадчую раду». Выбаршчыкі думалі – гэта прапаганда, як заўсёды. Ажно, выйграўшы выбары, губэрнатар Брэндан Бэрн вырашыў стварыць Этнічную дарадчую раду – першую ў краіне.

Старшынём Этнічнае рады абраны беларус!

Гэткі быў шлях да Этнічнае рады ў Нью Джэрзі.

Неўзабаве пасьля выбараў, 11 красавіка 1978 году, губэрнатар Бэрн спэцыяльным дэкрэтам паклікаў да жыцьця, арганізаваў і зацьвер-

дзіў Губэрнатарскую Этнічную раду штату Нью Джэрзі – Governor's Ethnic Advisory Council. Рада складалася з 28 асобаў, прадстаўнікоў розных нацыянальных арганізацыяў штату. Паклікалася яна на 2 гады дзейнасьці з тым, што наступны тэрмін прадстаўнікі нацыянальнасьцяў будуць чаргавацца. Рада была зарэгістраваная як штатная адзінка ў State Government Manual зь сядзібай у сталіцы штату горадзе Трэнтане. Старшыня рады прызначаецца губэрнатарам. Асноўная функцыя Рады – кансультаваць губэрнатара ў дачыненьнях з нацыянальнасьцямі штату і дапамагаць аддзелу адукацыі ў наладжаньні школьных і пазашкольных адукацыйных праграмаў у вывучэньні этнічных спадчын штату. Губэрнатар абвясьціў аб стварэньні Рады на спэцыяльнай цырымоніі з удзелам прадстаўнікоў прэсы і адміністрацыі.

Стварэньне Рады не было вялікім сюрпрызам, аб магчымасьці гэтага гаварылася і раней, але «бомбай» сталася тое, што старшынём Рады быў прызначаны Вітаўт Кіпель – прадстаўнік ад беларусаў штату. Ясна, найбольш спадзяваліся на старшынёўства ў Радзе прадстаўнікі большых нацыянальных групаў, асабліва палякі і гішпанскамоўныя групы, сярод якіх найбольш палітычна актыўныя былі кубінцы. Але старшынём зрабілі беларуса. Прыпушчаю, што зрабіў гэта губэрнатар Брэндан Бэрн не без уплыву Стывэна Рычэра.

Праца на пасадзе старшыні

Відавочна, пачынаць працу было ня лёгка – адчуваўся супраціў. Але я ведаў шмат людзей у штаце, меў добрыя дачыненьні з адміністрацыяй, дык праца зрушылася. Рада атрымала свой офіс у аддзеле турызму, была прызначаная сакратарка, бюджэт для канцылярыі, і праца пайшла-паехала. Раз на тыдзень я вызваляўся ад працы ў бібліятэцы (за кошт дня адпачынку альбо адпрацоўваў гэты дзень у суботу) і ехаў у Трэнтан. У Трэнтане залагоджвалася карэспандэнцыя, а галоўнае – узгадняліся пляны з канцылярыяй губэрнатара і аддзелам асьветы. Радзе прапаноўвалі рабіць даклады ў школах, выступаць ад імя губэрнатара на нацыянальных урачыстасьцях, сустракацца з замежнымі гасьцямі штату. Дзейнасьць была актыўная, трэба было каардынаваць з Радай паседжаньні, якія адбываліся штомесяц. Асабліва «горача» мне было на першым паседжаньні, калі мяне атакавалі і палякі, і кубінцы, але я з гэтымі «нападамі» справіўся.

У пару дзейнасьці Рады, хоць мне даводзілася шмат езьдзіць і выступаць, я перажываў вельмі прыемныя часы, бо заўсёды меў магчымасьць «закінуць слова» за Беларусь. Пачынаў я свае выступы перад рознымі аўдыторыямі зь дзесяткамі, а часам і сотнямі слухачоў словамі «Я – Вітаўт Кіпель... буду гаварыць з акцэнтам, якога вы, думаю, ніколі ня чулі – з акцэнтам беларускім...» і тады казаў пару

фразаў пра Беларусь. Такі ўступ заўсёды падкупляў слухачоў, і таму на сустрэчах я заўсёды чуўся вельмі добра і ўпэўнена.

За чатыры гады працы ў Радзе (дарэчы, гэтая праца не аплачвалася, але штат кампэнсаваў выдаткі на бэнзін) прыходзілася часта даваць інтэрвію ў прэсе – англамоўнай і іншамоўнай, а таксама выступаць па радыё і пару разоў быць на тэлебачаньні.

Шмат даводзілася выступаць у школах. У штаце Нью Джэрзі панад 600 школьных акругаў. Загадчыкі акругаў – школьныя супэр-дырэктары – атрымоўваюць багата інфармацыйнае літаратуры пра тое, што робіцца ў штаце. Дзейнасьць Рады прыцягвала іхную ўвагу, і таму мне даводзілася выступаць у школах з дакладамі аб этнічных справах штату. Пры гэтым заўсёды я даваў інфармацыю пра Беларусь.

Даводзілася выступаць і на афіцыйных штатных мерапрыемствах.

Мушу сказаць, што ў адрозьненьне ад іншых арганізацыяў, дзе мне давялося супрацоўнічаць, найбольш частым і часаёмкім абавязкам у Этнічнай радзе было выступаць ад імя губэрнатара на розных урачыстасьцях. За чатыры гады ў Радзе я выступаў на армянскіх, славацкіх, польскіх, ірляндзкіх урачыстасьцях, быў прадстаўніком Рады на нарадзе пуэртарыканцаў. Аднак пару падзеяў асабліва ўрэзаліся ў памяць.

Аднойчы на пачатку лета 1979 году губэрнатар атрымаў запросіны ўзяць удзел у карэйскай урачыстасьці, якую ладзілі карэйскія вэтэраны ў горадзе Рэдбанк непадалёк ад Атлянтычнага акіяну. Губэрнатар запросіны перадаў мне і даручыў прачытаць адпаведную адозву. Я, выступаючы перад карэйскімі вэтэранамі, як і заўсёды, сказаў пра свой беларускі акцэнт, усё ішло, «як памазана». Але раптам кіраўнік урачыстасьці ў вэтэранскай форме ўстае і кажа: «На знак пашаны да Вас, паважаны Вітаўт, калі ласка, раскажыце нам пра краіну Вашага паходжаньня – Беларусь». Я быў зьдзіўлены, але просьбу выканаў.

Выступаў я ад імя губэрнатара штату Нью Джэрзі і ад беларусаў на адзначэньні Тыдня паняволеных народаў у Вашынгтоне. У рэпартажы з тае ўрачыстасьці ў 1979 годзе ў газэце «Беларус» цытуецца фрагмэнт майго выступу: «Часам раздаюцца галасы, што Тыдзень паняволеных народаў – зьява застарэлая. Але калі мы параўнаем лік паняволеных народаў у 1959 годзе й сяньня, дык пабачым, што лік гэты ўсьцяж узрастае. Дык як жа можа застарэцца гэтая зьява! Наадварот, справа Паняволеных народаў – справа жывучая й гэтак жа актуальная сяньня, як і ў 1959 годзе!»

Праект «Вусная гісторыя»

У дзейнасьці Рады апрача рэпрэзэнтацыйнай функцыі было ладна і працоўных абавязкаў. Шмат часу за гады майго старшынёўства ў Этнічнай радзе штату было адведзена наладжаньню праграмы «Вус-

най гісторыі» – параўнаўча новага ў той час прадмету. Праграма «Вусная гісторыя» фінансавалася фэдэральным урадам, а ў Нью Джэрзі рухавіком праграмы была Гістарычная камісія штату Нью Джэрзі, якая адразу пачала супрацоўнічаць з Этнічнай радай. Зьмест праграмы складаўся з таго, каб запісаць на магнітныя стужкі дасьведчаньні імігрантаў у часе прыбыцьця і ў раньніх гадох жыцьця ў ЗША. Прычым праграма прадбачала ня толькі жыцьцёвае дасьведчаньне, але інструктавала таксама запісваць мову, калі былі – асаблівыя звычаі, асьвятляць паходжаньне імігранта ў Старым Сьвеце. Я як старшыня Этнічнай рады ўваходзіў у групу кіраўнікоў, якія пад наглядам Гістарычнай камісіі плянавалі і праводзілі запісы інтэрвію. Было зроблена шмат запісаў зь беларускімі імігрантамі. Адзін зь беларускіх запісаў – інтэрвію з спадарыняй Тамарай Кольбай (Тамара Стагановіч, псэўданім Ст. Тамара) быў выдрукаваныя ў форме кніжкі ў сэрыі New Jersey Ethnic Life Series, №10, 1986. (Дарэчы, беларуская мастачка Тамара Кольба аформіла каля дзесятка дзіцячых кніжак ведамых амэрыканскіх выдавецтваў ды мела сэрыю выставак сваіх твораў у Беларусі пад агульным назовам «Мая Амэрыка» – каталёг выйшаў у Менску ў 1994 годзе.)

Дзе мы даведаліся пра Чарнобыль

Паколькі я шмат дапамагаў Гістарычнай камісіі, яны мяне «запрэглі» ў шмат якія адукацыйныя праекты, зьвязаныя з вывучэньнем нацыянальнасьцяў штату. Я супрацоўнічаў з камісіяй гадоў дзесяць. Падам адну памятную дэталь з часу гэтага супрацоўніцтва. Выканаўчым дырэктарам Гістарычнай камісіі ў 1980-х гадах быў спадар Бэрнард Буш, мой добры сябра й калега. Быў ён яўрэйскага паходжаньня – дзяды зь Менскае губэрні. У нядзельны дзень 26 красавіка 1986 году Бэрнард Буш запрасіў мяне й Зору да сябе ў госьці ў мястэчка Джэймстаўн у цэнтральнай частцы штату Нью Джэрзі. Сядзім, гутарым, Бэрнард успамінае нешта пра дзеда. Гадзіна 3.30 папаўдні – і раптам радыё перапыняе праграмы і даецца кароткае паведамленьне: скандынаўскія крыніцы перадаюць, што на захадзе СССР – ці ў Беларускай ССР, ці ў Украінскай ССР – адбыўся атамны выбух... Гэтак 26 красавіка 1986 году мы пачулі пра Чарнобыль. Пасядзелі мы ў Буша яшчэ хвілінаў 15-20 – так, як і іншыя госьці, было не да гасьцяваньня – і паехалі дахаты.

Што такое Галакост

У Этнічнай радзе трэба было займацца часам і далікатнымі тэрміналягічнымі праблемамі, у аснове якіх ляжалі міжнацыянальныя дачыненьні. Справа, якую мне давялося разглядаць, была важная –

значэньне тэрміну Галакост. Яўрэйскія арганізацыі штату – а іх сотні, і арганізацыі ўплывовыя – дамагаліся, каб у публічных школах на лекцыях гісторыі праходзілі Галакост. Аднак паколькі гэтага дамагаліся яўрэйскія арганізацыі, тэрміну надавалася толькі адно значаньне – зьнішчэньне яўрэяў. Супраць такога падыходу выступілі армяне. Справа дайшла да «штатных слуханьняў», куды запрасілі выступіць і мяне як кіраўніка Рады. Я, безумоўна, выступіў і моцна парэкамэндаваў, каб тэрмін Галакост ужываўся ня толькі ў дачыненьні да падзеяў Другой сусьветнай вайны, але і шырэй. У маім разуменьні гэта шырокі тэрмін, які павінен быць ужываны і ў дачыненьні да іншых выпадкаў генацыду – такіх, як Галадамор, армянскі Галакост або менш ведамыя падзеі накшталт гвалтоўнага перасяленьня крымскіх татараў, беларусаў, іншых народаў.

Зора выбрала сядзібу для губэрнатара

Яшчэ адна гісторыя, зьвязаная зь дзейнасьцю Этнічнай рады, якая мне добра памятаецца – выбар сядзібы для губэрнатара штату. Калі ўтварылася Рада, быў прыняты статут і залагоджаныя ўсе фармальнасьці разьмеркаваньня функцыяў, на адно зь першых паседжаньняў цэлае Рады мы запрасілі губэрнатара. Перад тым паседжаньні адбываліся ў Трэнтане, але гэтае – з буфэтам – мелася адбыцца ў шыкоўным будынку, які стаяў пусты на паўночнай ускраіне Прынстану. На паседжаньне былі запрошаныя і госьці – жонкі, урадоўцы. Само паседжаньне было фармальнае і вельмі кароценькае. Пасьля яго пачаліся гутаркі. У гутарцы з губэрнатарам Зора кажа: Спадар губэрнатар, у Прынстане вы жывяце зусім у халупе, малой хаце (праўда, гістарычна вядомай), а тут такі асабняк – і пусты! Чаму б Вам не перабрацца з свайго Morven у гэты Drumthwacket? Губэрнатар Бэрн глянуў праніклівa, крутануў галавой і сказаў: «Спадарыня Зора, я гэтага рабіць ня буду, але новаму губэрнатару падкажу. Думка добрая». Гутарка гэтая была ў 1978 годзе, а ад 1982 году губэрнатары штату Нью Джэрзі жывуць у сядзібе Drumthwacket.

Вынікі працы Рады

Пры падтрымцы Рады ў школьныя праграмы штату ўвайшла як дадатковае чытаньне кніга «Этнічны досьвед штату Нью Джэрзі» (NJ Ethnic Experience, 1979), дзе згадваецца шмат нацыянальнасьцяў, улучна зь беларусамі, як прадстаўнікоў розных культураў, якія прычыніліся да будаваньня штату. Дарэчы, на вокладцы і супэрвокладцы гэтае кнігі была карціна Пётры Мірановіча «Беларускія эмігранты».

З ініцыятывы Этнічнай рады ў горадзе Джэрзі Сіты пачаліся этнічныя фэстывалі, якія працягваюцца і да сёньняшняга часу. Дадам: перамовы – і то складаныя – наконт запачаткаваньня фэстываляў з «айцамі» гораду і з фэдэральнымі ўладамі праводзіў я. Складанасьць перамоваў была ў тым, што Этнічная рада жадала, каб фэстывалі адбываліся ў Парку Свабоды (Liberty Park), які знаходзіцца ў юрысдыкцыі фэдэральнай адміністрацыі.

Па лініі дзейнасьці Этнічнай рады ў штаце адбылося некалькі канфэрэнцыяў, прысьвечаных адукацыі і каардынацыі інфармаваньня пра нацыянальнасьці штату. Прайшла бібліятэчная канфэрэнцыя, дзе падкрэсьлілі неабходнасьць мець у Штатнай бібліятэцы ў Трэнтане калекцыю кніжак пра нацыянальнасьці штату.

«Губэрнатар зь беларускай падушачкай»

Прыпамінаючы аб Этнічнай радзе, не магу не адзначыць і такога факту: тагачаснага губэрнатара штату Брэндана Бэрна (1974–1982) журналісты часта называлі «губэрнатарам зь беларускай падушачкай», ды губэрнатар пра тую падушачку расказваў і сам. Гісторыя была такая: як толькі ў 1974 годзе Брэндан Бэрн стаў губэрнатарам, да яго 25 сакавіка прыйшла беларуская дэлегацыя і падаравала яму вышытую падушачку, якую вышыла матушка Валянціна Лапіцкая, а Галіна Бахар, якая жыве ў Радэрфордзе, тую падушачку ўручыла. Праз год ці пра два беларусы зноў падарылі яму падушачку! Адну ён пакінуў у сваёй сядзібе ў Трэнтане, а другую ўзяў сабе ў машыну – падушачка ляжала каля задняга акна машыны і была добра бачная, асабліва арнамэнт. А калі я ўжо стаў старшынём Этнічнай рады – губэрнатар выступіў, прадставіў, паціснуў руку і кажа: вось у мяне падушачка ляжыць беларуская, а каб вы ведалі – Кіпель таксама беларус! Ну, так яно прайшло, журналісты запісалі, але за падушачку ўчапіліся. І пасьля выйшла пара рэпартажоў, у якіх казалі: едзе машына, ззаду ляжыць чырвоная беларуская падушачка – гэта паехаў губэрнатар! А там і губэрнатара не было – сядзеў паліцэйскі.

На прыняцьці з нагоды заканчэньня свайго губэрнатарскага тэрміну ў 1982 годзе Брэндан Бэрн сказаў нам з Зорай: «Адна падушачка застаецца ў мяне, а другая ідзе ў музэй». Дарэчы, пра сваю сядзібу Morven Бэрн напісаў кніжку і з аўтографам падараваў мне, а я аддаў яе ў Менск у Нацыянальную бібліятэку.

Мушу сказаць, што з губэрнатарам Брэнданам Бэрнам у нас устанавіліся выдатныя адносіны – прыватныя й працоўныя. Нават пры сустрэчах пазьней, калі ён ужо ня быў губэрнатарам, мы ўспаміналі мінулае, жартавалі. Быў я таксама прыемна задаволены, калі атрымаў яго разьвітальны ліст пры сыходзе з пасады – быў ён больш сяброўскі, чым афіцыйны.

Прадстаўніцтва Рады па-за штатам

Будучы ў Этнічнай радзе, трэба было ўваходзіць і ў іншыя структуры. Так я быў адным з дырэктараў Міжнароднага інстытуту гораду Джэрзі Сіты – гэта лібэральная арганізацыя, бадай найстарэйшая ў ЗША, якая дапамагае імігрантам.

Стаіць у памяці яшчэ адзін эпізод з тых часоў. Спадар Джэк Тапорэк – адказны за дзённы расклад губэрнатара, мой добры сябра – у адзін прыгожы дзень мне кажа: «Ві (гэтак мяне скарочана – замест «Вітаўт» – называлі амэрыканцы), у такі і такі дзень табе трэба будзе паехаць у Нью Ёрк на паседжаньне з губэрнатарам штату Нью Ёрк Марыё Куома і прадстаўнікамі нацыянальнасьцяў штатаў і расказаць ім пра дзейнасьць Этнічнай рады ў Нью Джэрзі. Яны плянуюць арганізаваць падобную раду ў штаце Нью Ёрк». Гэтую просьбу я выканаў.

Аднойчы ад імя Этнічнай рады трэба было ўдзельнічаць у канфэрэнцыі ў Белым Доме, скліканай віцэ-прэзыдэнтам Ўолтэрам Мондэйлам для абмену думкамі з «этнічнымі» лідэрамі на тэму як зьменшыць інфляцыю. Быў 1980 год, інфляцыя перакрочыла 10%! Трэба сказаць, што этнічная Амэрыка інфляцыі ня надта баялася: жылі ашчадна, незадавальненьне было, інфляцыя адчувалася, але не было панікі.

Праект «этнічнага» Кліўлэнду

Дзейнасьць у Этнічнай радзе штату Нью Джэрзі прывяла мяне і да такога выпадку. Я не належу да групы людзей, якія надаюць значаньне тытулам. Я будую дачыненьні на падставе веданьня асобы. Аднак быў выпадак, калі тытул старшыні Рады прычыніўся да важнае для мяне падзеі.

Хутка пасьля прызначэньня мяне старшынём Этнічнае рады штату Нью Джэрзі – а гэта падзея штатнага маштабу, якая рэгіструецца ў штатных адміністрацыйных і юрыдычных цыркулярах, што рассылаюцца адпаведным аддзелам ва ўсе штаты – мне пазваніў з Кліўлэндзкага штатнага ўнівэрсытэту загадчык катэдры сацыялёгіі і эканомікі прафэсар Карл Бануты. У размове прафэсар сказаў, што яны хацелі б са мной пагаварыць аб этнічных справах у Кліўлэндзе і таму запрашаюць мяне туды прыехаць – вядома, запрапанаваўшы аплаціць падарожжа. Я прапанову прыняў, зазначыўшы, што ў мяне ў Кліўлэндзе ёсьць добрыя сябры, я і так да іх плянаваў прыехаць, а фінансавыя справы хай пакінуць мне. Праз пару тыдняў я быў у Кліўлэндзе і меў доўгую гаворку з прафэсарам Бануты ў штатным унівэрсытэце. Аказалася, што ў Кліўлэндзе ў публічных школах чыталіся лекцыі з гісторыі эмігрантаў у горадзе. Больш таго, штатны

ўнівэрсытэт плянаваў выдаць сэрыю кніжак-дапаможнікаў для школаў з гісторыі этнічных групаў у Кліўлэндзе. У плянах было выдаць панад 25 кніжак, і мне запрапанавалі напісаць кнігі пра гісторыю пасяленьня ў Кліўлэндзе беларусаў. Я, вядомая справа, прапанову прыняў, і праз пару гадоў у выдавецтве Кліўлэндзкага штатнага ўнівэрсытэту выйшла кніжка «Беларусы ў Кліўлэндзе». Прыпушчаю, што кніга ўжываецца ў школах і цяпер, зразумела, з дапаўненьнямі. Вось, я думаю, дзе маё старшынёўства ў Этнічнай радзе дапамагло «прасунуць» беларусіку і ў іншым штаце. Поўны назоў кнігі – Byelorussian Americans and Their Communities of Cleveland. Уступ для кнігі напісаў прафэсар Бануты, кароткую зацемку пра беларусаў напісаў прафэсар Томас Бэрд зь Нью Ёрку. (З Карлам Бануты мы пасябравалі, ён браў удзел у беларускіх канфэрэнцыях. Калі рухнула савецкая імпэрыя, Карл Бануты стаўся амбасадарам Славеніі ў Ватыкане і запрашаў нас у госьці.)

Але на гэтым мае кантакты з Кліўлэндам ня скончыліся. У 1982 годзе мне быў нададзены тытул Ганаровага грамадзяніна гораду Кліўлэнду, а праз пару гадоў мне запрапанавалі напісаць артыкул пра беларусаў у Энцыкляпэдыю Кліўлэнду (1985), а пазьней – артыкул пра беларусаў Амэрыкі для выданьня Ethnic Forum, Kent State University, 1989. Vol. 9, у выдавецтве ўнівэрсытэту, які цесна зьвязаны з Кліўлэндам (кілямэтраў 50-70 ад гораду).

***

Этнічная рада штату Нью Джэрзі дзейная і сёньня. Спэцыяльны дэкрэт Брэндана Бэрна ніколі ня быў скасаваны. Час-часом у Раду паклікаюцца і беларускія прадстаўнікі – у Радзе была Ірэна Рагалевіч-Дутко, Лявон Шурак. Раз ці два Рада запрашала мяне на паседжаньні – пераважна, каб я расказаў, «як усё пачыналася». Бясспрэчна, дзейнасьць у Радзе была ў маім жыцьці пазытыўным пэрыядам, праца ў ёй прыносіла мне задавальненьне, я шмат расказаў пра Беларусь.

Беларускія фэстывалі

Сытуацыя ў краіне на пачатку 1970-х

Пасьля перамогі на выбарах 1972 году Рычарда Ніксана краіну захапіў палітычны скандал вядомы пад назвай «Watergate», паводле назвы жыльлёвага комплексу ў Вашынгтоне. У аснове «Watergate» была банальная падзея – рабаўніцкі ўзлом у чэрвені 1972 году выбарчага штабу Дэмакратычнай партыі з мэтай знайсьці кампрамат на дэмакратаў, каб выкарыстаць яго ў выбарчай кампаніі.

Лякальны крымінальны акт – так выглядала гэтая навіна ў газэтах – пры дапамозе прэсы разросься ў агульнаамэрыканскі скандал. Відавочны рабунак, які патрабаваў паліцэйскага расьсьледаваньня, ператварыўся ў грандыёзны скандал з палітычнай афарбоўкай, які стараліся неяк прыкрыць блізкія супрацоўнікі прэзыдэнта Ніксана. Іх дзеяньні ня мелі ніякага сэнсу, бо расьсьледаваньне і журналісты даводзілі, што ня толькі блізкае атачэньне Ніксана плянавала ўзлом, але і ён сам меў дачыненьне да гэтага здарэньня.

У выніку найпадрабязьнейшага крымінальнага аналізу і судовага працэсу справа дайшла да адмовы Рычарда Ніксана ад прэзыдэнцкай пасады ў 1974 годзе і канстытуцыйна прадбачанага абраньня прэзыдэнтам Джэралда Форда. Краіна бушавала! Алівы ў агонь абурэньня падліло прабачэньне і дараваньне віны былому прэзыдэнту Ніксану прэзыдэнтам Фордам. Здавалася, скандалу ня будзе канца. Праўда, кіраўніцтва Рэспубліканскай партыі, у першую чаргу сэнатар Робэрт Доўл, якія стаялі далёка ад падзеяў «Watergate», бо рабілі «справу» людзі Ніксана, стараліся адмежавацца ад скандалу, аднак гэта было амаль немагчыма.

Аддзел нацыянальнасьцяў Рэспубліканскай партыі некалькі разоў праводзіў апытаньні сярод нацыянальных клюбаў наконт таго – што яны думаюць пра «Watergate». Мы апыталі беларускую грамаду – справа «Watergate» яе мала цікавіла. У газэце «Беларус» пра гэтую справу бадай што й ня згадвалася. Вынікі пэрсанальных і тэлефанічных апытаньняў былі такія: каля 90% апытаных адказалі, што гэта справа дробная, якая не заслугоўвае ўвагі і рэклямы; 8% выказаліся так, што калі было ўчыненае крымінальнае злачынства, то гэтая справа мусіла апынуцца ў судзе; каля 2% уважалі, што справа «Watergate» мусіла разглядацца так, як разглядалася.

З маіх сувязяў зь іншымі нацыянальнасьцямі я ведаў, што іх таксама справа «Watergate» цікавіць няшмат, хоць, можа, і больш, чым беларусаў. Як бы там ні было, кіраўніцтва Рэспубліканскае партыі заняло нэўтральную пазыцыю, будучы пераконаным, што шмат рэспубліканцаў уважала: гэтую справу трэба было «вывесьці на чыстую ваду», што б ні думалі асобныя ўгрупаваньні ў партыі. Але напружаньне ўсё ж зьмяншалася.

Пробліскі супакаеньня пачалі сыходзіць ад дэмакратаў – яны адчулі магчымасьць прыйсьці ў Белы Дом, а таму было лепш і больш апраўдана канцэнтравацца на падрыхтоўцы да выбараў. У 1976 годзе прэзыдэнтам ЗША стаў дэмакрат Джымі Картэр.

200-годзьдзе Злучаных Штатаў Амэрыкі

Зьніжэньню напружанасьці спрыяла і тая акалічнасьць, што краіна рыхтавалася адзначаць 200-годзьдзе – значны юбілей, які прыпаў на 1976 год. Сьвяточны ўздым моцна астудзіў палітычныя эмоцыі, і пра «Watergate» пачалі забываць.

Затое адзначэньне 200-годзьдзя набывала ўсё больш магутны размах. Амэрыка ганарылася юбілеем, у сьвяткаваньнях бралі ўдзел і «вялікія» і «малыя» – штаты, школы, дзяржаўныя ўстановы, звычайныя грамадзяне. У сьвяточным узбуджэньні знаходзіліся і беларускія арганізацыі: БАЗА, БККА, вэтэраны, БІНіМ слалі прадстаўнікоў на юбілейныя канфэрэнцыі, танцавальны гурток моладзі «Васілёк» нарасхват выступаў у розных гарадох на рэпэтыцыях і сапраўдных інсцэніроўках рэвалюцыйных падзеяў 1776 году. Прадаваліся юбілейныя сувэніры, беларускія эміграцыйныя паэты пісалі адпаведныя вершы.

Юбілейнасьць асабліва адчувалася ў тых штатах, дзе за дзьвесьце гадоў да таго адбываліся рэвалюцыйныя падзеі: у Прынстане, Трэнтане, штаце Вірджынія. Газэты штату Нью Джэрзі, падрыхтоўваючы грамадзтва да адзначэньня юбілею краіны, зазначалі таксама, што ў штаце нядаўна адчыніўся новы Цэнтар мастацтваў – Garden State Arts Center, адміністрацыйна падначалены Аддзелу дарожнае камунікацыі штату Нью Джэрзі з адрасам горад Голмэйл, Садовая аўтастрада. (Дарэчы, штат Нью Джэрзі мае мянушку «Садовы штат», а названая магістраль даўжынёю каля 200 км праразае ўвесь штат з поўначы на поўдзень.) Новазбудаваны Цэнтар мастацтваў разьмясьціўся ў цэнтральнай частцы штату паміж маляўнічымі ўзгоркамі ўздоўж магістралі – так, што відаць з розных бакоў. Будовіна ў выглядзе «лятучай талеркі» разьлічаная прыблізна на 5 з паловай тысячаў гледачоў і акружаная каштанавымі пасадкамі з сотнямі дрэваў, спартовымі пляцоўкамі, месцамі для паркаваньня, пікнікоў. Будову ўрачыста

«ахоўваюць» алюмініевыя мачты, на якіх палошчуцца сьцягі – каляpытнае ўражаньне.

Этнічныя фэстывалі ў Цэнтры мастацтваў

Навіна аб новым Цэнтры хутка разыходзілася, найперш таму, што ў Цэнтры пачалі праводзіць нацыянальныя фэстывалі: італьянскі, ірляндзкі, польскі, яўрэйскі і іншыя, а жыхарства штату Нью Джэрзі вельмі шматнацыянальнае і такімі праграмамі цікавіцца. А другі аспэкт, чаму Цэнтар мастацтваў прыцягнуў увагу – ён спансараваў клясычныя вечары: опэра, мастацтва, літаратура.

На Цэнтар мастацтваў хутка зьвярнула ўвагу і беларускае грамадзтва: два значныя беларускія асяродкі ў гарадох Саўт Рывэр і Нью Брансўік знаходзяцца на блізкай адлегласьці ад Цэнтру, і шмат хто зь беларусаў наведваў там розныя мастацкія праграмы. Цэнтар мастацтваў ладзіў таксама канцэрты і для школаў – такія выступы адбываліся сярод тыдня. Усё гэта рабіла новы Цэнтар ведамым і папулярным. Нагэтулькі папулярным, што аднойчы мне ў беларускай царкве Божай Маці Жыровіцкае ў Гайлэнд Парку нехта з маладых «кінуў» такое: «Спадар Вітаўт, вы ведаеце Цэнтар мастацтваў? А можа і мы некалі адважымся там выступіць?» На гэткі намёк-выклік я жартаўліва прамармытаў нешта накшталт «некалі... напэўна...», думаючы сам сабе «калі рак сьвісьне». Але гэты «абмен паглядамі» ўсё ж пакінуў кавалачак нейкае інфармацыі ў кампутары маёй галавы. А можа?..

Тым часам жыцьцё бурліла, сьвяткавальны ўздым быў у зэніце. Трэба было недзе бываць на зборках, сьвяткаваньнях, расказваць пра беларусаў-амэрыканцаў, устаўляючы ў гутарках Касьцюшку – у той юбілейны сэзон інфармацыя пра беларусаў разыходзілася добра, людзі цікавіліся.

Нараджэньне ідэі беларускіх фэстываляў

Прыблізна ў пачатку лістапада 1975 году мне па лініі нацыянальных рэспубліканскіх клюбаў трэба было быць на афіцыйным абедзе ў горадзе Пэрт Амбой і выступіць там ад беларусаў. Гэта стары амэрыканскі прамысловы горад непадалёк акіяну з старой калёніяй «этнічных» амэрыканцаў. Я ведаў, што ў Пэрт Амбой гадоў 100 таму назад пасялілася шмат нашых землякоў, асабліва зь Віленскай і Менскай губэрняў, і што яны бралі ўдзел у пабудове царквы Сьв. Сьпірыдона. Я, прызнацца, на такія «зборышчы» ў старых прамысловых гарадох заўсёды, калі запрашалі, хадзіў. З дасьведчаньня ведаў, што гутарка пра беларусаў у кампаніі старажылаў шмат у каго адгукнецца і дапаможа мне «вылавіць» землякоў-піянэраў. Апрача мяне

ў той дзень на імпрэзе выступалі славакі і палякі – частыя кампаньёны «краянаў».

Пасьля майго выступу мяне пазнаёмілі з прысутным на абедзе спадаром Фрэдам Вэкам, дырэктарам праграмаў нацыянальных фэстываляў у новаадчыненым Цэнтры мастацтваў. Пасьля стандартнага знаёмства – хто, што, адкуль – мы з Вэкам пачалі больш сур'ёзную гутарку аб перахаваньні этнічнасьці амэрыканцамі-«этнікамі». Паходзіў Вэк з Чыкага, меў нямецка-ірляндзкіх продкаў, а пра беларусаў-амэрыканцаў, казаў ён, «нічога ня ведае». Для мяне было важна, што Вэк быў з Чыкага, а што пра беларусаў нічога ня чуў, мяне не зьдзівіла. Гаварыў я з Вэкам амаль гадзіну – абед сабе ішоў, а мы вялі сваю тэму. Фактычна, гаварыў найбольш я – прадставіў Вэку нашу беларускую «трагедыю»: прыехала ў ЗША больш за паўмільёна беларусаў, а знайсьці іх цяпер днём са сьвечкай цяжка. Я вяду гутарку, і раптам Вэк перапыняе мяне й кажа: «Вітаўт, ты ляманту-еш, што цяжка выявіць вашых людзей, а яны ёсьць, і я табе веру, ты мяне пераканаў. А чаму б вам, беларусам, не наладзіць свой беларускі фэстываль у Цэнтры мастацтваў? Нашая квота – сабраць у Цэнтар мінімум тры тысячы чалавек, г. зн. прадаць тры тысячы білетаў. Што ты на гэта?» – закончыў тыраду Вэк. Я, як мне здалося, разгубіўся, страціў канцэнтрацыю. Фактычна, праносілася думка – ці Вэк гаворыць сур'ёзна? Ці можа жартуе? Але спадар Вэк не спыняўся: «Я стаўлю табе пытаньне. Адважыцеся на фэстываль?» Тут у маёй галаве пачалі калейдаскапічна скакаць думкі: мне чыноўнік, адміністратар ставіць пытаньне. Я ацэньваю сытуацыю: гэта выдатна! Але ня проста. Тры тысячы – ці зьбярэм? Што адказаць?.. Сам для сябе я рашэньне прымаю: трэба рабіць, трэба згаджацца. Але гэта ж толькі маё рашэньне, нягледзячы на маю ўпэўненасьць я Фрэду Вэку адразу даць згоды не магу – усё гэта круцілася ў маёй галаве...

Тым часам я сур'ёзна адказваю: «Спадар Вэк, Вашая прапанова цудоўная – я Вам удзячны. Выглядае, што Вы мяне зразумелі. Але, хоць я настаўлены пазытыўна да прапановы, на сваю адказнасьць даць Вам адказ зараз я не магу. Я мушу пагаварыць зь беларускімі кіраўнікамі, з грамадзтвам. Абяцаю: канчатковы адказ Вы атрымаеце празь дзесяць дзён». На гэта Фрэд адказаў: «Вітаўт, ты падыходзіш да справы сур'ёзна – буду чакаць адказу, магчымая дата фэстывалю – канец траўня або пачатак чэрвеня». На гэтым мы моцна паціснулі рукі і разышліся.

Дахаты я ехаў машынальна, дарогі не прыпамінаю. Галава была занятая фэстывалем. Сваім розумам я на фэстываль пагадзіўся. Даў сабе слова: зробім, выцягнем. Але сабраць тры тысячы – з чаго пачаць? Трэба рабіць праграму. Хто згодзіцца працаваць? Мітусьня думак: то безвыходнасьць, то прасьвятленьне, задавальненьне. Во, брат, будзе рэкляма!

Абмеркаваньні ў беларускіх колах

Гэтая фэстывальная мітусьня ў галаве імгненна зьнікла, выпарылася, як толькі я запаркаваў машыну ў сваім двары ў Радэрфордзе. Раптам я вярнуўся ў рэчаіснасьць. Заходжу ў хату і з налёту выпальваю Зоры пра сустрэчу і гутарку з Фрэдам Вэкам. Апавядаю, бо ўсё ў галаве яшчэ сьвежае, ад першага да апошняга слова. Зора, вельмі спакойна выслухаўшы маю ўзьнёслую прамову, кажа: «Ты, я бачу, у сваёй галаве на арганізацыю фэстывалю пагадзіўся. Ня ведаю, што цябе можа стрымаць, але каб крыху астудзіць сытуацыю, паразважай аб наступным. Як мы будзем выглядаць перад Вэкам, перад нашым грамадствам, калі справу правалім? Ці зьбярэм мы тры тысячы людзей? Ты, Вітаўт, выдатна ведаеш наша грамадзтва: сваркі, нязгоды, падзелы. Калі згаджацца на фэстываль, трэба быць пэўным, што мы ўсе зьяднаемся і яшчэ прыцягнем новых людзей». Так Зора «астуджала» мяне, хоць сама і сказала: «Гэта ж надзвычайна, што нас запрашаюць. Нам вераць!» Мы яшчэ перакінуліся думкамі, і Зора закончыла вечар так: «Як кажуць, «утро вечера мудренее»- заўтра пагутарым зь Янкам Запруднікам. Гэта вельмі важна!» Я крыху супакоіўся, пачаў думаць сам сабе. Але ноччу ня спалася.

Назаўтра ў абед мы пайшлі да Янкі. Я перадаў яму – так, як за дзень да таго Зоры – зьмест гутаркі з Вэкам і ягоную прапанову. Янка, пачуўшы аб прапанове, выклікнуў: «Ого! Гэта, брат, навіна! Ты, я бачу, хочаш брацца за справу, але зразумей: я ўпэўнены, што праграму мы зладзім, сабраць тры тысячы народу – справа няпростая. Мы ўтраіх гэтага ня зробім. Я згаджаюся з табой, што Вэку трэба будзе даць адказ, але справу трэба «павалкаваць». Дзесяць дзён – добры тэрмін на развагі. Давай склічам сход грамадзтва, ты ведаеш, каго клікаць – тых, хто будзе ахвочы працаваць!»

Думку Янкі павалкаваць справу шырэй мы з Зорай падхапілі, і я прапанаваў зрабіць сходку ў Саўт Рывэры праз тыдзень, мяркуючы, што будзе якраз дзесяць дзён, калі будзе гатовы адказ Вэку. Я скантактаваўся з старшынямі арганізацыяў, блізкімі сябрамі, і на 14 лістапада 1975 году мы склікалі сход у Саўт Рывэры. На сход прыйшло каля 50-55 чалавек, але дзейных, уплывовых. Я прадставіў справу так, як было запрапанавана спадаром Вэкам: беларусы арганізуюць фэстываль у Цэнтры мастацтваў – трэба прадаць мінімум тры тысячы білетаў, а Цэнтар дапамагае беларусам рэклямай, неабходнымі для канцэрту фінансамі, залагоджвае адміністрацыйныя вымогі – дамовы з прафсаюзамі (у Цэнтры мелі права выступаць толькі сябры музычных прафсаюзаў ЗША), страхоўкі і падобнае.

Пачалася дыскусія. Над падрыхтоўкай праграмы дыскутавалася карацей – былі прысутныя і кіраўнікі хораў, танцавальных групаў, і індывідуальныя выступоўцы – дык яны з упэўненасьцю сьцьвердзілі,

што праграма зладзіцца. Затое аб колькасьці гледачоў пачалася войстрая дыскусія. Бальшыня прысутных былі вельмі асьцярожныя – прост ня верылі ў магчымасьць сабраць тры тысячы гледачоў. Тут мусілі выступаць больш дасьведчаныя ў грамадзкіх справах асобы, пераконваючы пэсымістаў, што сабраць тры тысячы насамрэч магчыма. Я паставіў справу на галасаваньне: ладзіць фэстываль або не. 90% прысутных прагаласавалі за. На старшыню арганізацыйнага камітэту аднагалосна выбралі мяне.

Бярэмся правесьці фэстываль!

Праз два дні – на дзясяты абяцаны Вэку дзень – мы паведамілі Цэнтру мастацтваў, што прапанову арганізаваць Беларускі фэстываль на ўмовах Цэнтру беларусы прымаюць.

Наступна я меў сустрэчу ў дырэкцыі Цэнтру мастацтваў з Вэкам і іншымі начальнікамі – паінфармаваў іх аб кроках арганізацыі фэстывальнага камітэту, які ў агульных рысах ужо фактычна быў сфармаваны, ды выказаў гатовасьць «поўнай парай» пачаць працу. Як кажуць... паехалі!

Відавочна, наладжаньне імпрэзы такога маштабу было для беларускага грамадзкага актыву зьявай новай. Заданьне перад намі было такое: падрыхтаваць 3-4-гадзінную мастацка-эстрадную праграму, наладзіць сыстэматычную шырокую рэкляму, вызначыць асноўныя мерапрыемствы на пляцы: спартыўныя спаборніцтвы, паказ касьцюмаў, інфармацыйны стол, сувэніры, кухня. А галоўнае – пачаць продаж білетаў! Аб хадзе падрыхтоўкі я мусіў раз на два тыдні даваць справаздачы дырэкцыі Цэнтру. Прыблізна да сярэдзіны студзеня 1976 году падрыхтоўчы мэханізм фэстывалю быў укамплектаваны, і ў касе пачалі прадавацца білеты на Беларускі фэстываль.

Падрыхтоўка

Першае паседжаньне фэстывальнага камітэту адбылося ў студзені 1976 году, і першым пунктам парадку дня было: прысягнуць самім перад сабой, што мы ня можам дапусьціць сварак, гэта наш нацыянальна-грамадзкі абавязак – фэстываль рэпрэзэнтуе Беларусь, і мы павінны яго зьдзейсьніць. І мы сваё слова стрымалі – ніводзін сябра з камітэту ня выйшаў, усё ішло беззаганна. Бясспрэчна, некаторым даводзілася працаваць больш інтэнсіўна. Прыкладам, сэкцыя падрыхтоўкі праграмы – там была надзвычай цяжкая праца. Вялі яе кіраўніцы І. Рагалевіч і Г. Русак і бліжэйшая група – Н. Кудасава, Л. Літаровіч, І. Цупрык, А. Орса-Рамана, В. Леўчук, Р. Касьцюк. Продаж білетаў: адказныя В. Русак, М. Бахар, В. Цярпіцкі, група – М. Сенька, У. Пеляса, Ж. Навумчык; выстаўкі і атракцыёны – Т. Коль-

ба, А. Шукелойць, З. Кіпель, В. Бартуль; рэкляма – В. Станкевіч, Ф. Рамана; дзейнасьць моладзі – Ю. Азарка, Н. Махнюк, А. Кіпель, Ю. Кіпель, Н. Русак, Л. Русак, Г. Бартуль, В. Запруднік, Н. Запруднік; спорт – Ж. Навумчык, Ж. Арцішэнка, Б. Цупрык – хай прабачаць мне тыя, чые прозьвішчы выпалі з памяці – век!..

Я асабіста быў на сувязі і з Цэнтрам, і з усімі сябрамі камітэту. Бясцэнную дапамогу мне ў каардынацыі працы давалі мой пажыцьцёвы сябра Янка Запруднік (ён, дарэчы, быў вядучы на ўсіх фэстывалях) і мая жонка Зора. Больш таго, паколькі ў Нью Ёрку Янка і я працавалі непадалёк адзін ад аднаго – амаль побач – мы штодзённа сустракаліся і радзіліся, Янка падключыў у камунікацыйную дапамогу фэстывалю свае тэлефоны – магутныя! – і я імі карыстаўся. Бывала, прыходжу ў будынак, дзе мясьцілася «Радыё Свабода», заходжу ў іхныя офісы, а Антон Адамовіч – ягоная клетка-офіс была пры ўваходзе і ён сустракаў мяне першы – голасна апавяшчаў: «Кіпель зьявіўся! Зараз пачне працаваць сыстэма» – маючы на ўвазе тэлефонную сетку. Праз гэтую «сыстэму» мы (я, Янка і Зора) ведалі дакладна аб стане падрыхтоўкі.

Падрыхтоўчы пэрыяд быў напружаны, але напружаньне дасягнула максымуму, калі трэба было «адбыць» яшчэ адно патрабаваньне Цэнтру мастацтваў – правесьці ў Цэнтры дзьве генэральныя рэпэтыцыі. Я мусіў добра «адвакатаваць» перад кіраўнікамі Цэнтру, тлумачачы, што на дзьве рэпэтыцыі мы ня здолеем сьцягнуць усіх выступоўцаў. Цэнтар нам саступіў: адну рэпэтыцыю з удзелам каля 75% выступоўцаў мы правялі ў Грамадзкім цэнтры ў Саўт Рывэры, а другую – 100-працэнтную – у Цэнтры мастацтваў. Прыблізна ў сярэдзіне траўня мне паведамілі, што на Беларускі фэстываль прададзена 3000 білетаў. Шчыра кажучы, для мяне й маіх бліжэйшых сяброў і супрацоўнікаў гэта быў дзень вялікага адпружаньня – амаль сьвята. Мы былі ў экстазе – норму выканалі, хоць да дня фэстывалю заставаўся яшчэ амаль месяц. Як кажуць землякі на Бацькаўшчыне – гэта было здорава!

Першы беларускі фэстываль

На дзень фэстывалю 12 чэрвеня 1976 году каса прадала на Беларускі фэстываль панад 4 тысячы білетаў, а пачынаючы ад 1-ай гадзіны фэстывальнага дня публіка магла прыходзіць бясплатна – «паглядзець на беларусаў» прыйшло каля тысячы дадатковых гледачоў.

Дзень фэстывалю выпаў выдатны – нам спрыяла надвор'е, настроі. Беларусы – а іх, паводле маіх падлікаў, было на фэстывалі працэнтаў 75, рэшта небеларусы – цешыліся. Гэты дзень выдатна апісаны як у беларускім, так і ў англамоўным друку. Але найпаўней фэстываль апісаў адзін зь яго кіраўнікоў і арганізатараў, мой найбліжэйшы ся-

бра Янка Запруднік у кнізе «Беларускія фэстывалі й выстаўкі ў Нью Джэрзі. Палітычная інфармацыя моваю мастацтва (1948–2011)». Ясна, гэтую кнігу-альбом я раю ўсім набыць і пачытаць. Выдатны дакумэнт пра беларускую мастацкую дзейнасьць, за што Яну – найшчырэйшая падзяка!

Посьпех фэстывалю быў надзвычайны: грамадзтва было гэтулькі задаволенае, што экспромтам зладзілі вечарыну і аднадушна – асобаў 200 – выказалі пажаданьне зладзіць наступны фэстываль. Гэтаксама было выказана пажаданьне, каб і старшыня, і цэлы фэстывальны камітэт заставаліся тыя самыя. Гэтыя пажаданьні былі прынятыя пад увагу. Я скантактаваўся з дырэкцыяй Цэнтру мастацтваў, вусная згода на прадаўжэньне Беларускага фэстывалю была атрыманая.

Першы Беларускі фэстываль 12 чэрвеня 1976 году супаў з адзначэньнем 200-годзьдзя ЗША – 1776–1976. У праграму фэстывалю былі ўлучаныя – асабліва ў якасьці заключнага акорду – амэрыканскія творы, прысьвечаныя і краіне, і юбілею.

Другі і трэці фэстывалі

Другі Беларускі фэстываль, 21 травеня 1977 году, апрача выдатнае беларускае праграмы адзначыўся і тым, што яго адчыніў губэрнатар штату Брэндан Бэрн. Для губэрнатара гэта быў першы візыт у Цэнтар мастацтваў.

Дзень трэцяга фэстывалю, 19 травеня 1979 году, выпаў дажджлівы – дождж ліў як з цэбра, аднак білетаў было прададзена найбольш – панад 4 тысячы. Кожны фэстываль мы сустракалі з большым дасьведчаньнем, прадавалі больш білетаў – беларусаў пазнавалі і цікавіліся імі.

«Глубокая работа сепаратистов»

Для мяне ўдзел у арганізацыі фэстываляў быў важны тым, што я пазнаў шмат людзей, шмат палітыкаў, але й заняты быў вельмі моцна. Калі Ян Запруднік рыхтаваў кнігу пра беларускія фэстывалі і папрасіў даць якія-небудзь «гісторыйкі» вакол фэстываляў, я яму прыпомніў дзьве такія гісторыйкі.

У мяне быў добры знаёмы, зь якім я езьдзіў штодня аўтобусам на працу – інжынер Пэн, жыў за два кварталы ад мяне ў Радэрфордзе. Некалі ён зваўся Пэніёнчык, сам з Кіева, у міжваенным часе скончыў унівэрсытэт у Празе, а сам вельмі праваслаўны – хадзіў у царкву, розныя каноны, усё такое. І вось, калі мы рыхтаваліся да першага фэстывалю, я пытаюся ў яго, ці ня мог бы ён у сваю царкву занесьці пару рэклямаў (для фэстывалю кожнай нацыянальнасьці

штат выпускаў тысячу рэклямных афішаў недзе 80×40 см). «О, да, почему же нет, конечно! Давайте!» Празь дзень ці два садзімся мы ў аўтобус, і я пытаюся «Містэр Пэн (мы па-ангельску гаварылі), як там нашы афішы?» «Не, – кажа, не павесім». – «Чаму? Бо дзе я ні прашу – усюды вешаюць». А тады ён пераходзіць на расейскую мову: «Ну, вы знаете, чтобы повесить такое в приходе, надо же спросить разрешения. Я пошел к батюшке. А батюшка говорит: нет, не разрешу! Я ему говорю: это же культурная работа. А батюшка: Эээ, вы не понимаете, это глубокая работа сепаратистов!»

Стыў Рычэр, губэрнатар Брэндан Бэрн

Другі мамэнт. Другі фэстываль, і перад фэстывалем я галоўнаму кіраўніку, Фрэду Вэку, кажу, што ў нас можа быць губэрнатар. Ён мне адразу паказвае на галаву: «Слухай, Кіпель, я ведаю, што ты надта заняты, але ж трэба быць рэалістам». Я кажу: «Фрэд, я ўпэўнены, што будзе. Я табе ня мусіў пра гэта казаць». Ну, ён толькі махнуў рукой. А было так. У мяне былі вельмі блізкія і добрыя дачыненьні з губэрнатарам, бо адным зь ягоных асыстэнтаў быў мой сябар Стыў Рычэр. І вось адзін раз я ў Трэнтане, ня памятаю па якой справе, зайшоў да Стыва і кажу: ведаеш, мы робім фэстываль. «Я, – кажа, – бачыў, я ведаў, што ты ў гэта ўцягнуты». А я кажу: добра, каб быў губэрнатар. Ён кажа: слухай, хадзем да Джэка Тапорэка (сакратара губэрнатара), ты зь ім добра будзеш гаварыць – бо ён гаворыць па-ўзьбецку і па-расейску, ён гадаваўся ў Узьбекістане, польскі яўрэй, у вайну сям'я была там, пасьля прыехалі ў Амэрыку, тут ён скончыў права. Ну мы з тым Джэкам два-тры словы сказалі па-расейску, пасьля я яму кажу, што хачу. Ён пытаецца: ці сапраўды табе на гэтым так залежыць? Я кажу: вельмі залежыць! Слухайце, кажа, я так адразу не магу, ідзіце са Стывам паабедайце, а пасьля абеду я вам скажу. Пайшлі мы паабедалі, пасьля абеду прыходзім, а той кажа так: я зрабіў так, каб ён быў – бо ён яшчэ ні разу ня быў у тым цэнтры. Калі б ён пайшоў на яўрэйскі дзень або італьянскі – то пакрыўдзіў бы іншыя вялікія групы, а так ён выбірае малую групу – а пасьля скажа, што ўжо быў у цэнтры і больш хадзіць ня будзе, каб не выбіраць. Але слухай, кажа, нікому пра гэта не гавары! Мы ўсё зробім тут, скажам паліцыі, яны ўсё залагодзяць. Так яно ўсё і йшло, а за дзень ці два мне той Тапорэк пазваніў і кажа: я табе прачытаю, што ён скажа, бо ён напэўна прыйдзе, а я пра Беларусь ні чарта ня знаю, каб пра Ўзьбекістан, дык я б сам сказаў, што і як казаць.

І вось я таму Вэку сказаў, а ён думае, што я вар'ят. Бо фэстывалі ўжо ідуць тры гады, і ні разу губэрнатар не прыйшоў. Ірляндцы злыя – бо губэрнатар, Брэндан Бэрн, сам ірляндзкага паходжаньня, а яўрэі – найбольшая група, яны зьбіраюць па 12 тысяч і запаўняюць ня толькі

амфітэатар, а наагул увесь цэнтар. А італьянцы кажуць – калі мы прывязем з Італіі таго і таго, то й 25 тысяч прыйдзе! Дык губэрнатар не хацеў паміж імі выбіраць.

Перад самым пачаткам фэстывалю раптам бачу – Вэк да мяне бяжыць. Слухай, кажа, мясцовую паліцыю адставілі, прыехала штатная паліцыя і кажуць – гелікоптар прыляціць. Дык ты казаў праўду, а я ж думаў, што ты вар'ят! Гелікоптар прыляцеў, стаў каля таго цэнтру, два паліцэйскія перад ім, губэрнатар прыйшоў і цэлую гадзіну пратырчаў на гэтым фэстывалі!

Плён фэстывальнай дзейнасьці

Тры Беларускія фэстывалі зрабілі беларусам Амэрыкі вялікую рэкляму. Рэпартажы аб беларускай прысутнасьці друкаваліся ў дзесятках газэтаў і часапісаў. Картатэка адрасоў Цэнтру мастацтваў налічала панад 25 тысячаў, па гэтых адрасах высылаліся рэклямы фэстывалю. Відавочна, дапамагала і газэта «Беларус». У газэце і я выдрукаваў колькі разважаньняў аб фэстывалі. Нас як беларусаў віталі кангрэсмэны, сэнатары, прэзыдэнты Форд, Картэр, шмат палітычных дзеячоў і выдатных амэрыканцаў. Дзень фэстывалю абвяшчаўся Днём беларускае культуры штату – значная падзея. Рэкляма фэстывалю выйшла за межы ЗША, нас віталі Ларыса Геніюш, беларусы з Польшчы, Аўстраліі, Нямеччыны. Бясспрэчна, фэстывалі ў Нью Джэрзі вельмі спрыялі прапагандзе беларускасьці, беларусам у ЗША і беларускай незалежніцкай ідэі.

Фэстывалі таксама дапамаглі зблізіць, згуртаваць беларускую грамаду ў ЗША. Мы здолелі давесьці, што мы – група дынамічная, працоўная, якая адраджае сваю «затуманеную» прысутнасьць у Амэрыцы. Праца ў фэстывалі надала энэргіі беларускай дыяспары. І хоць мы хваляваліся – ці здолеем сабраць тысячы – мы глыбака ў сабе верылі, былі ўпэўненыя, што выканаем пастаўленае заданьне. І мы яго выканалі ды пераканаліся, што калі самі згуртуемся – вернем «загубленых» суродзічаў.

Мы як грамада фэстывалі маглі і можам прадаўжаць. Патрэбныя арганізатары. Шмат з тых, хто арганізоўваў фэстывалі, стаміўшыся пасьля трох, аддаліся іншай працы. Я асабіста поўнасьцю заняўся апрацоўкай кнігі «Беларусы ў ЗША». У акадэмічную дзейнасьць пайшлі і доктар Ян Запруднік – выдаў некалькі кніг з гісторыі Беларусі, і Зора – пераклала на ангельскую мову «Беларускага Трышчана», іншыя стварылі нешта новае. Данчык, які дэбютаваў у фэстывалях, выдаў некалькі кружэлак, як і Ансамбль «Нова». Ірына Рагалевіч разам з Надзяй Запруднік і Валяй Рагалевіч стварылі мноства новых сувэніраў. Такім чынам актывісты першых фэстываляў аддаліся працы на іншых дзялянках. Фэстывалі былі адкладзеныя на пазьней, і гэ-

тае «пазьней» цягнецца дагэтуль. Аднак я ўпэўнены, калі знойдуцца актывісты – фэстывалі адновяцца.

Фэстывалі – выдатная падзея для рэклямы і інфармаваньня пра Беларусь, напамін пра беларускую спадчыну ў ЗША, стымул да супрацоўніцтва розных беларускіх групаў, адзін з моцных паказьнікаў, што Беларусь у ЗША – жыве!

Радыё

Пачаткі «Радыё Вызваленьне»

Радыё «Вызваленьне» (пазьней «Свабода»), пачало вяшчаць на Беларусь у 1954 годзе. У беларускім старэйшым грамадзтве, асабліва ў колах БНР, якія праз прэзыдэнта Міколу Абрамчыка супрацоўнічалі з радыё ад самага пачатку – прыпушчаю, што ён супрацоўнічаў з амэрыканцамі задоўга да зьяўленьня радыё – дык паўтаруся, у грамадзтве паўстаў раскол адносна гэтага супрацоўніцтва – маўляў, ці супрацоўнічаць з коламі, дзе прапаганда ў нейкай меры абмежаваная, стрыманая? У Радзе БНР над гэтай тэмай вяліся даўгія дыскусіі, бразгалі дзьверы. У той жа час, нам тады, маладому пакаленьню – мы былі ў дваццатках, – было зусім ясна, што з радыё супрацоўніцтва патрэбнае, яно неабходнае, калі мы жадаем, каб нашыя беларускія нацыянальныя ідэі траплялі на Бацькаўшчыну. Я й мае сябры разважалі, што амэрыканскае радыё было адной з наймацнейшых прыладаў у тым змаганьні сыстэмаў дэмакратыі й таталітарызму.

Супрацоўніцтва з радыё ў Мюнхэне

Маё супрацоўніцтва з «Радыё Вызваленьне»/»Радыё Свабода» працягвалася панад 35 гадоў: ад сярэдзіны 1950-х да зачыненьня бюро радыё ў Нью Ёрку ў пачатку 1990-х гадоў. Увесь час я быў пазаштатным супрацоўнікам, па-ангельску «freelancer». Імя маё ў радыё было Вітаўт Зубкоўскі – прозьвішча, якое я меў ад 1935 да 1942 году (дзявочае прозьвішча маёй маці – Зубкоўская, яна карысталася ім, каб зьменшыць магчымасьць быць арыштаванай як жонка Кіпеля, «ворага народу»).

Пачалося супрацоўніцтва з трагічнае падзеі – восеньню 1954 году ў Мюнхэне быў забіты малады супрацоўнік беларускае сэкцыі радыё «Вызваленьне» Лявон Карась. Колькі дзён перад гэтым Лявон Карась быў у Бэльгіі, у Лювэне, і я быў апошнім, хто зь ім разьвітваўся на вакзале, калі той ад'яжджаў у Мюнхэн. Мюнхэнская паліцыя хацела са мной паразмаўляць і выклікала мяне. Зь Лювэну ў Мюнхэн на паховіны Лявона Карася паехалі двое студэнтаў: я і Васіль Шчэцька. Паліцыі я сказаў, што Лявон Карась марыў рабіць кар'еру на радыё, быў гарачым патрыётам Беларусі. Для мяне асабіста не было ніякага

сумневу, што Карася забілі камуністы дзеля застрашэньня маладых, каб тыя не працавалі на радыё. Халодная вайна тады была ў пачатковай стадыі, і Саветы добра разумелі, што маладзейшыя кадры на радыё – вельмі непажаданая зьява для камуністычнае прапаганды. Ня ведаю, ці з маімі поглядамі пагадзілася паліцыя, але адзін з начальнікаў мне сказаў, што ў Мюнхэне поўна савецкіх агентаў і, бясспрэчна, яны тут дзейнічаюць. Пасьля паховінаў Лявона Карася я даваў на радыё нэкралёг-успаміны аб ім. Запісваў інтэрвію са мною найбольш спадар Янка Ліманоўскі, а таксама гутарыў я зь Пётрам Сычом, блізкім сябрам Карася. Гэткі быў мой пачатак супрацоўніцтва з радыё. Матэрыял, які я даваў у рэпартажы, быў часткова пададзены і ў нямецкім друку.

Пазьней, у 1955 годзе, я даваў на радыё «Вызваленьне» яшчэ колькі інтэрвію ў зьвязку з маім удзелам у працах канфэрэнцыі Інстытуту Вывучэньня СССР у Мюнхэне ды супрацоўніцтвам у «Беларускім Зборніку», выданьні таго самага Інстытуту. Пару інтэрвію на радыё «Вызваленьне» было зроблена і аб жыцьці беларускіх эмігрантаў у Бэльгіі, дзе я тады студыяваў ды займаў пасаду заступніка старшыні Саюзу Беларусаў у Бэльгіі. Напісаў я таксама некалькі скрыптаў аб дзейнасьці беларусаў у Швэцыі й Даніі, якія я наведаў у 1954–1955 гадох цягам мае працы над доктарскай тэзай з геалёгіі пры Лювэнскім унівэрсытэце. У той час і ў Швэцыі, і ў Даніі былі шматлікія беларускія арганізацыі, і ў абедзьвюх краінах яны мелі свае офісы.

Аднак у тым пэрыядзе маё супрацоўніцтва з радыё было эпізадычным. Сталае пачалося напрыканцы 1950-х гадоў, калі ў Нью Ёрку доктар Янка Запруднік запачаткаваў беларускае бюро радыё «Вызваленьне».

Праца ў Нью-Ёркскім бюро

Асноўнай тэматыкай маіх скрыптаў звычайна было жыцьцё беларускае дыяспары. Найбольш, відавочна, было скрыптаў аб жыцьці беларусаў у Злучаных Штатах і Канадзе. Фактычна з тых скрыптаў і пачалася сэрыя «Беларусы ў ЗША». У матэрыялах падавалася арганізацыйная структура беларускае групы ў ЗША, праграмы дзеяньняў арганізацыяў. Найбольш вызначальнымі былі скрыпты, у якіх паведамлялася пра беларускія нацыянальныя сьвяты, адзначэньні юбілеяў, прабег кангрэсаў, сходаў. Паступова пачалася і новая радыйная сэрыя «Беларусы ў амэрыканскім друку». У гэтым выпадку даваўся агляд штодзённага друку ды «Кангрэсавых Запісаў», падаваліся прамовы сэнатараў, кангрэсмэнаў і іншых палітыкаў. Прыкладам, калі ў 1973 годзе губэрнатар Біл Кэгіл у штаце Нью-Джэрзі абвясьціў дзень, прысьвечаны Слуцкаму Паўстаньню, як

Дзень беларускіх вэтэранаў, я ў праграму ўлучыў ня толькі праклямацыю губэрнатара, але й інтэрвію зь іншымі палітыкамі штату.

Абсяг тэматыкі скрыптаў пашыраўся. Я пачаў стала сачыць за кніжным рынкам і падаваць праз радыё інфармацыю пра Беларусь у дасьледчых публікацыях, спачатку англамоўных, а потым наогул у заходніх мовах. Агляды кніжак дасьледчага профілю сталіся адной з важных тэмаў беларускага радыё. Мушу сказаць, што ў дадзенай дзялянцы – агляды дасьледчае літаратуры – мне дапамагала праца ў Нью-Ёркскай публічнай бібліятэцы, дзе я працаваў і дзе праз мае рукі штодня праходзілі дзесяткі кніжак важных і цікавых для беларускага навукоўца, які з прычыны «жалезнай заслоны» быў пазбаўлены інфармацыі.

Цягам працы ў Нью-Ёркскай публічнай бібліятэцы, а таксама ў зьвязку зь дзейнасьцю Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва мне даводзілася вельмі часта бываць на навуковых канфэрэнцыях, зьездах, кангрэсах. Рэпартажы пра такія падзеі ды беларускую тэматыку, асабліва на славянаведных канфэрэнцыях, былі таксама сталай зьявай беларускае праграмы радыё.

Перадавалася й пра розныя беларускія выставы. Прыкладам, Нью-Ёрская публічная бібліятэка, розныя ўнівэрсытэты, Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва ладзілі выставы, прысьвечаныя беларускаму друку, Янку Купалу, Якубу Коласу, беларускім юбілеям.

Шмат увагі зьвярталі на беларускую дасьледчую дзейнасьць: рабіліся агляды друкаў Крывіцкага Навуковага Таварыства, БІНіМу, выдавецтваў «Беларуская Думка», «Беларускі Сьвет» і пад.

У скрыпты таксама ўлучалася хроніка дзейнасьці ды ўзаемадзеяньня беларускіх арганізацыяў зь іншымі нацыянальнасьцямі. Гэтак на адзначэньнях армянскага Галакосту беларускія прадстаўнікі праводзілі паралелі між Арменіяй і Беларусьсю, дзе адбываўся культурны этнацыд цягам блізу двух стагодзьдзяў. Пры сустрэчах з кардыналам Міндсэнты беларусы падкрэсьлівалі цяжкое становішча нашых вернікаў на Бацькаўшчыне асабліва дзеля таго, што ў Беларусі няма сваіх беларускіх ярархаў.

Беларусы супрацоўнічалі бадай з усімі нацыянальнасьцямі, якія імкнуліся аднавіць сваю незалежнасьць, а таксама з палітычнымі групамі на Захадзе, што падтрымоўвалі незалежніцкія погляды. У тэматыку такіх праграмаў уваходзілі таксама рэпартажы пра беларускія дэлегацыі ў Вашынгтоне, на сустрэчах з амэрыканскімі палітыкамі.

Значную ролю ў маіх скрыптах адыгрывалі й амэрыканскія падзеі, прыкладам у канцы 1970-х гадоў адзначаўся юбілей (стагодзьдзе) нью-ёркскага мэтро. У часе працы з гарадзкімі архівамі я ўбачыў, што ў стварэньні сыстэмы гэтае падземнае магістралі ўдзельнічалі некалькі інжынэраў беларусаў, а калі ў 1920-х гадох мэтрапалітэн дабудоўваўся, на тых будоўлях было таксама шмат беларускіх

эмігрантаў. Гэта, на мой погляд, была цікавая інфармацыя для нашага суродзіча на Бацькаўшчыне.

Наогул мушу падкрэсьліць, што ў падборы тэматыкі я й іншыя супрацоўнікі беларускае сэкцыі рады «Вызваленьне» («Свабода») кіраваліся найперш тым, каб даць інфармацыю, цікавую беларускаму слухачу, падаць беларусаведны матэрыял, які ня быў даступны на Бацькаўшчыне. У сваю чаргу, у часе адзначэньня 200-годзьдзя ЗША, калі мне даводзілася частавата выступаць па амэрыканскім радыё й тэлебачаньні, я ўспамінаў маё супрацоўніцтва з радыё «Свабода» ды гаварыў амэрыканскаму слухачу пра патрэбы й зацікаўленьні беларускае аўдыторыі на Бацькаўшчыне.

Ці ўплывалі падзеі ў Беларусі на тэматыку праграмаў? Вядома ж, што ўплывалі, хоць на мае скрыпты, магчыма, гэты ўплыў быў мінімальны. Прыкладам, у часе візыту прэзыдэнта Рычарда Ніксана ў Менск у 1973 годзе мы далі вельмі шмат інфармацыі пра беларуска-амэрыканскія дачыненьні ды ці раз падкрэсьлівалі, што менавіта з ініцыятывы беларусаў-амэрыканцаў гэты візыт і адбыўся.

Гаворачы агульна, кожная значная палітычная й культурная падзея ў БССР аналізавалася й камэнтавалася з пункту гледжаньня беларускае справы, пад поглядам беларускасьці.

У пляне асабістым хачу зазначыць, што мне й маёй спадарожніцы жыцьця Зоры давялося спатыкацца й гутарыць з прэзыдэнтамі Рычардам Ніксанам, Джэралдам Фордам, Джымі Картэрам, сэнатарам Робэртам Доўлам, ды гэтыя асабістыя ўражаньні таксама адзначаліся ў скрыптах.

Як выглядала праца: ад напісаньня скрыпта да радыёхваляў

Трэба сказаць, што радыё было своеасаблівым цэнтрам. Тыя дні, калі людзі прыяжджалі на радыё, яны заходзілі таксама ў Нью-Ёркскую публічную бібліятэку, якая мясьцілася за паўквартала ад радыё, і гэтыя сустрэчы былі досыць прыемныя.

Сам я на радыё не сядзеў – толькі прыносіў і начытваў скрыпты. Адзінае – калі Запруднік выходзіў у адпачынак, ён прасіў мяне рабіць раніцай палітычныя скрыпты. Палітычныя агляды звычайна выходзілі вельмі рана – у той час яшчэ не было кампутараў, іх трэба было скончыць да паловы восьмай, каб пасьпець на самалёт у Мюнхэн.

Сам працэс выглядаў так – чалавек прыносіў скрыпт. Калі надрукаваны – гэта яшчэ паўбяды. А так яго мусіла друкаваць машыністка – некалі гэта была Натальля Арсеньнева, а потым Яніна Каханоўская. Гэты скрыпт друкаваўся ў некалькіх копіях – адну табе чытаць, другую рэдактару, трэцюю глядзеў той, хто слухаў, калі гэта выходзіць у эфір. Рэдактар беларускіх скрыптаў спадар Запруднік, калі трэба,

наводзіў глянец. Калі гэта хроніка – дык там асабліва нічога не было, мы мелі свае стандарты як пісаць, па іншых скрыптах ён часам рабіў моўна-стылістычныя заўвагі. Тады вам вызначалася пэўная гадзіна, вы йшлі ў студыю, там з вамі нехта сядзеў, хто слухаў гэты скрыпт, ну і быў інжынэр, які гэта запісваў. Пасьля таго, як запіша – стужка была на такім вялікім дыску – ён хутка рабіў копію. Адну копію пакідалі сабе, а другую аддавалі – і зьбіраліся стужкі з усіх службаў – нейкі матацыкліст чакаў, каб хутка завезьці гэта ўсё на самалёт, які адлятаў у пэўную гадзіну. Прылятаў той самалёт у Мюнхэн, там, відаць, таксама на матацыкле – а можа й на веласіпедзе, ня ведаю – чакаў нехта іншы. Адным словам, спосаб перасылкі быў досыць прымітыўны, але ў выніку нашы скрыпты гучалі, як зь мюнхэнскай студыі. А друкаваліся скрыпты на такіх сініх матрыцах – за два-тры дні яны выцьвіталі, і ўжо было немагчыма нічога прачытаць. Копіі скрыптоў пакідаліся, яны зьбіраліся, бо пазьней іх часам трэба было перагледзець, і спадар Запруднік месяцаў пару трымаў іх у сябе.

Трэба сказаць, што тут, у Нью-Ёрку, пры Радыё Свабода была вельмі добрая бібліятэка, былі добра падрыхтаваныя кадры, і што тычыцца фактычнага боку справы, усё было вельмі добра. Часам я пісаў, напрыклад, скрыпт пра тое, што сёньня адчыніўся нейкі новы магазын, куды прынесьлі нібыта й нейкія беларускія цукеркі, і мне была патрэбная статыстыка. Дык я мамэнтальна мог яе знайсьці ў бібліятэцы Радыё Свабода. Безумоўна, я мог бы гэта знайсьці і ў Нью-Ёркскай публічнай бібліятэцы, але там трэба было б доўга шукаць. Бібліятэка пры радыё была выдатна дапасаваная да патрэбаў тагачасных рэдакцыяў.

Супрацоўнікі

З кім даводзілася працаваць за гэтыя даўгія гады? На памяць прыходзяць такія асобы: Тамара Навагрaдчанская, Ізыдар Плашчынскі, Аляксей Арэшка, Браніслаў Міркоўскі, Андрэй Клёнаў, Аркадзь Рутман. Пару разоў сустракаўся й меў дзелавыя дыскусіі з Эмілем Цяўлоўскім, меў частыя гутаркі зь Юркам Віцьбічам, доктарам Стасем Станкевічам, уладыкам Васілём. Непасрэдныя рэдактары маіх скрыптаў былі доктар Янка Запруднік і прафэсар Антон Адамовіч, а ў пазьнейшыя часы Адам Акуліч ды блізкі супрацоўнік і слухач Сяржук Сокалаў-Воюш. Мушу таксама падкрэсьліць, што наогул з рэдакцыяй радыё ў Мюнхэне, са шмат якімі яе працаўнікамі, у мяне былі сяброўскія дачыненьні, а гэта Ўладзімер Цьвірка, Юры Сянькоўскі, Павал Урбан, Пётра Сыч, Вячка Станкевіч. Выдатнымі памагатымі, а часта й дарадцамі ў шматлікіх пытаньнях адміністрацыйных ды ўспамінных былі Натальля Арсеньнева (якая, дарэчы, часта бывала са мною ў студыі) і Яніна Каханоўская.

Падсумоўваючы сваё супрацоўніцтва з радыё «Вызваленьне» («Свабода»), магу з гонарам адзначыць, што яно выяўляецца ў тым, што за больш чым трыццаціпяцігадовы пэрыяд у этэр пайшло каля трох тысячаў беларускіх скрыптаў аўтарства Вітаўта Зубкоўскага.

На амэрыканскім радыё

Даводзіліся мне выступаць і ў праграмах на амэрыканскім радыё.

У часе працы ў бібліятэцы даводзілася выступаць на радыё ў сувязі з рознымі нью-ёркскімі юбілеямі. Пару разоў выступаў на муніцыпальным (гарадзкім) радыё, але найчасьцей на станцыі 710-WOR – магутная станцыя. Ва ўступе мяне прадстаўлялі як амэрыканца беларускага паходжаньня.

Якія юбілеі адзначалі? У пачатку 1970-х гадоў – «Уздым і заняпад нью-ёркскага мэтро» – пра тое, як будавалася сыстэма. Вывучаючы архівы мэтро для выстаўкі, я бачыў, што на яго пабудове працавала шмат землякоў-беларусаў. Іншыя выступы: на пачатку 1960-х – «Пабудова і адкрыцьцё мосту Вэразана», «Цікавыя матэрыялы з гісторыі астранаўтыкі ў Нью-Ёркскай Публічнай Бібліятэцы (дзе былі выстаўленыя кнігі Казіміра Семяновіча, а ў канцы гутаркі было падкрэсьлена, што Семяновіч – беларус).

Гаварыў я таксама ў Нью Ёрку колькі раз з муніцыпальным радыё, а таксама ў праграме радыё ABC-770 аб этнічных рэсурсах гораду. Пра нацыянальнасьці ў горадзе я меў інтэрвію на радыёстанцыях у Філядэльфіі і ў Каламбусе, штат Агаё.

Некалькі разоў меў інтэрвію ў «Голасе Амэрыкі» – з нагоды выстаўкі пра ўгодкі беларускага кнігадруку ў 1967 годзе, пра цэнзуру ў літаратуры ў БССР у 1984 годзе, а таксама пра выстаўкі, прысьвечаныя Дзьмітрыю Мендзялееву, Янку Купалу і Якубу Коласу, Статуту Вялікага Княства Літоўскага.

Часта даводзілася выступаць на радыё ў штаце Нью Джэрзі, асабліва ў часе майго старшынёўства ў Этнічнай радзе штату.

Вяртаньне ў Беларусь

Запрашэньне на канфэрэнцыю, прысьвечаную ВКЛ

У разьдзеле пра БІНіМ я пісаў пра ўдзел у навуковых канфэрэнцыях і кангрэсах. Але кангрэс, які цьвёрда застаецца ў памяці як першы, дзе пачалося наша супрацоўніцтва, наш «паварот на Бацькаўшчыну» – гэта міжнародная канфэрэнцыя, прысьвечаная Вялікаму Княству Літоўскаму ў Рыме 30 красавіка – 4 траўня 1990 году.

Аб гэтай канфэрэнцыі я памятаю да дробязяў.

Улетку 1989 году мне пазванілі з Рыму, з Польскага інстытуту, які дзеіў там ужо каля 80 гадоў, і сказалі, што паўстала думка (а званіў прафэсар Ежы Клачоўскі) арганізаваць у Рыме кангрэс, прысьвечаны вывучэньню гістарычнай спадчыны чатырох народаў былых «грамадзянаў ВКЛ» – палякоў, беларусаў, літоўцаў і ўкраінцаў.

Доктару Клачоўскаму я адказаў, што ў прынцыпе згаджаюся з такой прапановай, але мушу ўзгадніць справу з управай БІНіМу, і паабяцаў адзваніцца. Адразу ж пасьля размовы я тэлефанічна зьвязаўся з Запруднікам, Бэрдам, Зорай і Шукелойцем – усёй управай БІНіМу. Аднадушна ўсе згаджаліся браць удзел. Аб пастанове ўправы БІНіМу я паведаміў арганізацыйны камітэт, і падрыхтоўка да канфэрэнцыі пачалася. Праграма канфэрэнцыі ўзгаднялася з Клачоўскім, калі ён у лютым-сакавіку 1990 году адведаў ЗША, а таксама на паседжаньнях аргкамітэту ў Філядэльфіі.

У часе падрыхтоўкі літоўцы, украінцы і мы выказалі думку запрасіць прадстаўнікоў з Бацькаўшчыны. У палякаў з гэтым праблемы не было, Польшча камунікавалася з Захадам, у Польшчу езьдзілі свабодна – арганізатары адразу сказалі, што з Польшчы будзе шмат навукоўцаў. Ну а ў нас яшчэ не было так ясна – ці змогуць прыехаць з БССР. Зь Беларусі мы вырашылі запрасіць Адама Мальдзіса, якога зь літаратуры ведалі найбольш, Анатоля Грыцкевіча, пажадана было таксама, каб нехта быў зь пісьменьнікаў, таму мы запрасілі Васіля Быкава. Зваротны адрас для сувязі мы падалі рымскі – арганізацыйны цэнтар канфэрэнцыі быў у Рыме. Мальдзіс і Грыцкевіч паведамілі, што прыедуць, а ад Быкава прыйшоў невыразны адказ – нібыта ён заняты і ўдзелу ў канфэрэнцыі браць ня будзе.

Паколькі канфэрэнцыя плянавалася шырака, а мы даведаліся, што ёсьць ахвочыя дасьледчыкі – вырашылі запрасіць больш навукоўцаў. З БССР мы запрапанавалі Вячаслава Вярэніча з Акадэміі Навук – мы, безумоўна, сказалі, што і яго трэба запрасіць. З Польшчы беларусаў прадстаўлялі Юры Туронак і Альжбета Смулкова. З Захаду мы запрасілі айца Аляксандра Надсана, паслалі таксама запросіны Вользе Арэхве, але яна не змагла прыехаць.

Рым-I

Пра канфэрэнцыю напісаў у газэце «Беларус» (№370, 1990) Ян Запруднік:

«Падзею гэтую арганізаваў Польскі Інстытут Хрысьціянскае Культуры, што знаходзіцца ў Рыме, у супрацоўніцтве зь філядэльфійскім украінскім Інстытутам Дасьледаваньня Ўсходняе Эўропы імя Лыпынскага, ньюёркскім Беларускім Інстытутам Навукі й Мастацтва ды Літоўскай Каталіцкай Акадэміяй Навук у Рыме. На канфэрэнцыю было запрошана 58 асобаў дакладчыкаў, супрацоўнікаў вышэй названых інстытутаў, а таксама навуковых установаў Варшавы, Кракава, Любліна, Менску, Вільні, Кіева. Бальшыня зь іх прыбыла на канфэрэнцыю. Усе шкадавалі, што не прыехаў Васіль Быкаў, які быў запрошаны таксама, але нехта ў Вандэі пастараўся, каб запросіны да пісьменьніка не дайшлі.

Беларускія дакладчыкі гаварылі (храналягічна) на тэмы: Янка Запруднік (Нью Ёрк) – «Гістарычныя й культурныя асновы нацыянальнай сьведамасьці беларусаў»; Зора Кіпель (Нью Ёрк) – «Беларускі Трыстан» (аповесьць з XVI-га ст.); а. Аляксандар Надсон (Лёндан) – «Асновы рэлігійнага й культурнага жыцьця беларусаў»; Анатоль Грыцкевіч (Менск) – «Вуніяцкія тэндэнцыі і Вуніяцкая царква ў Беларусі ў XV-XVIII стст.»; Адам Мальдзіс (Менск) – «Франьціішак Скарына – пасярэднік паміж хрысьціянскім Усходам і Захадам»; Юры Туронак (Варшава) – «Праблемы каталіцызму ў Беларусі» (аналіз статыстыкі беларускіх каталікоў); Вітаўт Кіпель (Нью Ёрк) – «Беларускае грамадзтва й палітыка ў мінуўшчыне й сучаснасьці»; Вячаслаў Вярэніч (Менск) – «Гістарычныя й культурныя асновы польскае нацыянальнае сьведамасьці ў СССР».

Беларуская тэматыка разглядалася таксама ў дакладах іншых аўтараў».

А мне гэта ўсё прыпамінаецца так.

Канфэрэнцыя адбылася ў канцы красавіка – пачатку травеня 1990 году і атрымала сымбалічны афіцыйны назоў «Рым I» (з тлумачэньнем, што наступныя падобныя канфэрэнцыі будуць называцца «Рым II», «Рым III» і г. д.). Усяго ў ёй брала ўдзел чалавек трыста. Гэта была першая канфэрэнцыя, на якую прыехалі беларускія навукоўцы

з дыяспары і зь Беларусі – з Савецкага Саюзу і з Польшчы. Адзначалася, што на гэтай канфэрэнцыі былі і маладыя ўдзельнікі – была маладзейшая дасьледніца зь Беластоку, была Алеся Кіпель, была таксама дасьледніца беларускіх тэмаў зь Нямеччыны.

Асноўная мэта канфэрэнцыі была выпрацаваць супольны падыход да вывучэньня Вялікага Княства Літоўскага, каб у школах маладому пакаленьню падавалася больш-менш агульная карціна, прымальная і для беларусаў, і для літоўцаў, і для палякаў – каб не было антаганізмаў. Мы, беларуская дэлегацыя, да канфэрэнцыі ставіліся вельмі сур'ёзна: мы ўважалі, што калі не дасягнем згоды ў насьвятленьні гісторыі ВКЛ, дык прынамсі пра гэта пагаворым і, магчыма... дасягнем згоды ў будучыні.

Мовы канфэрэнцыі

На канфэрэнцыі часам паўставалі кур'ёзныя сытуацыі. Найперш паўстала пытаньне: на якой мове будзе весьціся канфэрэнцыя? Мы адразу ўхапіліся, і Мальдзіс сказаў: ясна – на мове Вялікага Княства Літоўскага! Гэта быў выбух. Літоўцы не зразумелі, што гэта ня быў жарт, і ўспрынялі заяву Мальдзіса так, нібыта мы хочам іх падкалоць. Тады выступіў Ян Запруднік, даў характарыстыку гэтай мове, пагадзіўся, што сёньня мы ня можам камунікаваць поўнасьцю на гэтай мове. Польскую дэлегацыю ўзначальваў прафэсар Ежы Клачоўскі – ведамая фігура – і ён спакойна сказаў: трэба прызнаць, што ў ВКЛ была і лаціна, але штодзённай моваю дзяржаўнага апарату была беларуская мова, якая, магчыма, і адрозьніваецца ад сягоньняшняй, але аснова ў той мове была беларуская. Да гэтага трэба падыходзіць навукова дакладна, і тут не павінна быць ніякіх крыўдаў. Безумоўна, ні Клачоўскі, ні хто іншы не хацеў, каб на гэтай канфэрэнцыі раптам пачаліся спрэчкі. Мэтай канфэрэнцыі было яднаньне, адчуваньне прагрэсу.

Украінцаў было шмат, вялікая ўкраінская дэлегацыя была і з Польшчы.

У літоўскай дэлегацыі было шмат людзей, якія гаварылі па-беларуску – быў прафэсар Валеры Чэкман, быў Чэслявас Кудаба. Кудаба сказаў, што будзе рабіць даклад на мове ВКЛ – гэта, кажа, мова маёй маці – і пачаў гаварыць па-беларуску. Мы вельмі зьдзівіліся, ён зрабіў вельмі добрае ўражаньне дасканалым веданьнем беларускае мовы.

Урэшце з мовамі вырашылася так, што ўсе гаварылі, хто як хоча – збольшага ўсе па-свойму, а літоўцы пераважна па-ангельску, але пару дакладаў было таксама і на польскай мове. Па-літоўску не было нічога.

Як я ўжо згадаў, на канфэрэнцыю не прыехаў Быкаў. Зь іншых пісьменьнікаў на канфэрэнцыі быў Чэслаў Мілаш – ён быў вельмі актыўны, зь ім было вельмі прыемна кантактаваць. Я зь ім быў асабіста знаёмы і раней і сустракаўся зь ім, але на канфэрэнцыі ён быў вельмі пажаданая і дарэчная асоба, бо ў ім было тое «ліцьвінства», ён вельмі добра быў зь літоўцамі, выдатна чуўся сярод нас, пару вечароў правёў выключна толькі зь беларусамі. Ягоная прысутнасьць неяк паказвала, што Вялікае Княства Літоўскае сапраўды культурна ня так адналітнае, як яно часам здаецца, калі чытаеш працы некаторых дасьледнікаў. Усё ж гэта было мультыэтнічнае і мультыкультурнае ўтварэньне, і гэтак яго трэба на будучыню і разглядаць.

Сустрэча з Папам

Канфэрэнцыя цягнулася дзён пяць. Адміністратарам канфэрэнцыі быў польскі ксёндз Родаван, які блізка стаяў да ватыканскага кіраўніцтва, гэта значыць да Папы – а Папа якраз у той час быў паляк.

Было наладжанае прыняцьцё ў Папы, мы правялі зь ім гадзін пяць. Усе дэлегаты былі прадстаўлены Папу асабіста. Я думаю, што папа ніколі такога ня чуў на свае вушы, што яму нагаварылі беларусы – Мальдзіс, Запруднік, айцец Надсан, Зора і асабліва Смулкова – адносна беларусізацыі каталіцкай службы, адносна пасылкі польскіх ксяндзоў на Беларусь. Беларусы акружылі Папу і казалі яму вельмі зьмястоўна: усё мусіць быць шчыра, а не прыхавана, што калі едзе польскі ксёндз, ён нібыта «вяртае веру» і адначасна нясе пальшчызну. Так не павінна быць – вельмі горача прамаўляла спадарыня Смулкова. На Папу гэта рабіла ўражаньне, ён спачатку ўхмыляўся, пасьля перастаў ухмыляцца – пабачыў, што сур'ёзная гутарка. Я ў гэтую гутарку надта не мяшаўся, але сказаў пару слоў: «Калі ў вас ёсьць у думках, што каталіцызм будзе прадаўжаць свой паход на ўсход, дык вам трэба пакінуць думку, што гэта будзе рабіцца праз палякаў». Трэба сказаць, што Папа слухаў, часам пагаджаўся, часам пярэчыў: «Ну, пра гэта яшчэ можна дыскутаваць» – але бясспрэчна Папа ўдзельнічаў у дыскусіі як звычайны дасьледчык, а ня ціснуў аўтарытэтам Царквы, і гэта было і карысна, і прыемна.

На сустрэчы з Папам былі іншыя цікавыя мамэнты. Папа даваў усім ружанец. У Зоры мама каталічка, і яна папрасіла два, а пры нагодзе дала Папу лекцыю – колькі сярод беларусаў праваслаўных, а колькі каталікоў. Тое самае зрабіў Мальдзіс – ён сказаў, што яго заб'юць, калі ён не прывязе жонцы ружанец ад Папы. Папа сьмяяўся, але адначасна Мальдзіс сказаў, што трэба забараніць распаўсюджваць польскія малітоўнікі.

Па-за канфэрэнцыяй

Рымская канфэрэнцыя ўспамінаецца і тым, што ў той самы час, як мы былі ў Рыме, была заснаваная суполка Таварыства Беларускай Мовы ў Італіі. Арганізатарам той сходкі быў Янка Мойсік, які ў той час быў кіраўніком беларускіх перадачаў Радыё Ватыкан – ён сабраў ладную грамаду людзей, зацікаўленых беларускай мовай, беларусаў і небеларусаў.

З Рымам зьвязаныя і амаль гумарыстычныя ўспаміны. Мы прыехалі з Амэрыкі, у нас былі даляры, і мы вырашылі абмяняць крыху даляраў – нам сказалі, што калі мяняць у той краіне, дзе ты знаходзісься, будзе лепшы курс. І вось мы – я, Зора і Алеся – ходзім па горадзе, і бачым, што ў банках вельмі вялікія чэргі на абмен валюты – па сто чалавек, і нам часу няма, трэба быць на канфэрэнцыі. Алеся кажа: «Давайце пашукаем сыцылійскі банк». Я кажу: «Ты што, жартуеш? Па-першае, будзе тое самае». Але яна настойвае – давай паспрабуем, бо нібыта кажуць, што ў сыцылійскіх банках усё адбываецца хутчэй. Запыталіся мы ў паліцыянта, дзе Bank of Sicily, прайшлі два кварталы – і ў сыцылійскім банку няма чаргі! Зайшлі, за дзьве мінуты абмянялі, прычым выгадней, чым у іншых банках. Ясна – сыцылійскія банкі спраўнейшыя!

Яшчэ ўспамін – арганізоўвалася экскурсія наведаць іншыя месцы Італіі, у прыватнасьці паехаць на Монтэ Касына. Прадстаўнік турыстычнага бюро, які арганізоўваў гэтую экскурсію, надта рэклямаваў тое Монтэ Касына, успомніў, хто там змагаўся, і сярод іх беларусаў. Гэта нам было вельмі прыемна пачуць. Мы не паехалі, бо былі абмежаваныя часам.

У часе пабыту ў Рыме айцец Аляксандар Надсан паказаў нам горад, правёў па мясьцінах, зьвязаных з пабытам беларускіх ксяндзоў, бо на працягу XX стагодзьдзя ў Рыме вельмі шмат вучылася беларускіх ксяндзоў. Нам гэта было вельмі цікава, мы распытваліся пра тых ксяндзоў, некаторых мы ведалі, некаторыя адыгралі выдатную ролю ў беларускім нацыянальным руху. Янка Мойсік зрабіў экскурсію па ватыканскім радыё і расказаў пра пачаткі беларускіх перадачаў. Ад Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва я ім паабяцаў перадаць усе БІНіМаўскія публікацыі, што і выканаў.

Вельмі прыемнае ўражаньне зрабілі на нас беларусы з Польшчы – мы ўпершыню пабачыліся зь Юркам Туронкам, Альжбетай Смулковай.

Беларуская дэлегацыя адзначалася тым, што мы прысутнічалі амаль ва ўсіх сэкцыях, і калі трэба было весьці некаторыя сэкцыі, то мы чаргаваліся – беларусы з Захаду і беларусы з Усходу. Гэта была супольная беларуская прысутнасьць на міжнароднай канфэрэнцыі, між намі не было ніякага падзелу – ці хто з БССР, з Захаду ці з Польшчы.

Прадстаўнікі БССР зрабілі для жадаючых асобную сходку, на якой падрабязна расказалі, што адбываецца ў Беларусі. На сходцы прысутнічаў Норман Дэйвіс, брытанскі гісторык, ён задаваў пытаньні. Канфэрэнцыя «Рым» адбывалася ў красавіку, а за месяц перад тым, у сакавіку, прайшлі выбары ў Вярхоўны Савет, усё гэта было досыць жывое, тады, здаецца, забалятавалі Мальдзіса і Грыцкевіча. Гэтая інфармацыйная зборка пра падзеі ў Беларусі, якая не ўваходзіла ў праграму канфэрэнцыі, была вельмі цікавая, і на ёй вельмі шмат прысутнічала народу.

Прадаўжэньне «Рыму»

На канфэрэнцыі ў Рыме адбыўся таксама арганізацыйны сход прадстаўнікоў нацыянальных установаў, дзе мы вырашылі выбраць камітэт, які меўся плянаваць наступныя канфэрэнцыі Рым-II, Рым-III, Рым-IV і гэтак далей. (Там жартавалі – «усе дарогі вядуць у Рым».) У новую арганізацыйную структуру – арганізацыйна-кіраўнічы камітэт «Рым» – увайшоў ад беларусаў Адам Мальдзіс, так што мы, БІНіМ, адчувалі, што выканалі місію: першапачаткова арганізатарамі былі мы, а цяпер перадалі эстафэту навукоўцам з Бацькаўшчыны. Выдатнае адчуваньне: беларускасьць жыве!

Былі таксама прынятыя рэзалюцыі, каб падрыхтаваць агульны падручнік па гісторыі, які будзе перакладзены на ўсе працоўныя мовы гэтай канфэрэнцыі. Поўнасьцю гэтая ідэя не была рэалізаваная, але ўсё ж пазьней Захар Шыбека і Генадзь Сагановіч супрацоўнічалі ў гэтым кірунку.

Бясспрэчна, канфэрэнцыя ў Рыме сталася «форткай», якая адчыніла нам дарогу на Беларусь.

Тым часам «рымскія» канфэрэнцыі мелі пасьпяховы працяг. Арганізацыйны камітэт канфэрэнцыяў, які ўзначальваў прафэсар Ежы Клачоўскі і ў якім Беларусь прадстаўляў Адам Мальдзіс, правёў другую канфэрэнцыю ва Ўкраіне – Камянцы-Падольскім.

Канфэрэнцыя «Рым-III» адбылася ў Любліне, і мы там узялі актыўны ўдзел, была вялікая беларуская дэлегацыя з самой Беларусі – чалавек 40-50, вельмі шмат прыехала зь Беласточчыны. Гарадзкія ўлады Любліна зрабілі прыняцьцё ў гістарычнай будове, якая брала пачаткі ледзь не ад Люблінскай уніі, што было вельмі імпазантна. Важную ролю ў падрыхтоўцы канфэрэнцыі адыгрываў Захар Шыбека, што было вельмі прыемна. Зь ім у нас адразу склаліся добрыя, даверлівыя дачыненьні. (Мы пазнаёміліся ў ліфце, калі першы раз увайшлі ў гатэль у Менску. Нехта яго прадставіў: «Захар Шыбека», на што я адразу адрэагаваў: «Той Шыбека, які напісаў кнігу пра Менск?» – «Той самы». «Слухайце, – кажу я, – я гэтую кнігу прачытаў пару разоў – цудоўная, несавецкая кніга...» Ліфт спыніўся – мы выйшлі, але по-

тым з Захарам сустракаліся ня раз.) Адчувалася, што ў Любліне мы калі й не зусім гаспадары, то прынаймні адны з гаспадароў. Была таксама зладжаная культурная імпрэза, было шмат студэнтаў зь Беласточчыны.

Міжнародная асацыяцыя беларусістаў

На першай канфэрэнцыі ў Рыме былі абгавораныя і ўзгодненыя кантакты для далейшага супрацоўніцтва навукоўцаў з эміграцыі і Беларусі. У Рыме Адам Мальдзіс сказаў, што ў Міністэрстве юстыцыі зацьвярджаецца Міжнародная асацыяцыя беларусістаў, чыя галоўная сядзіба будзе ў Менску, і што ў Менску плянуецца правесьці кангрэс гэтай асацыяцыі. Мальдзіс тады неафіцыйна запрасіў нас на гэты кангрэс. Мы прынялі гэта з усьмешкай: ну ясна, ну добра, плянуйце, а там будзем бачыць – ці дадуць нам візы.

Яшчэ ў тым самым 1990 годзе Мальдзіс прыехаў у складзе дэлегацыі Беларускай ССР на генэральную асамблею ААН і паведаміў, што асацыяцыя ўжо аформленая і што прынятая пастанова правесьці ў травені 1991 году ў Менску сусьветны кангрэс беларусістаў. Неўзабаве ўсім будуць высланыя фармальныя запросіны. Тады ж, у Нью Ёрку, мы пачалі канкрэтнае супрацоўніцтва. Адным зь першых супольных праектаў Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва (ЗША) і Нацыянальна-асьветнага цэнтру імя Скарыны (Менск) была падрыхтоўка сэрыйнага выданьня бібліяграфіі Скарыніяны.

Ясна, што ўсё гэта мы ўспрымалі і з задавальненьнем, і зь нейкай асьцярожнасьцю. Хто яго ведае, што там на той Бацькаўшчыне будзе. Ну, калі гэта ў руках беларусаў, то ясна, што ня будзе ніякіх арыштаў, нічога такога. Але калі органы ўмяшаюцца ў гэта, то могуць быць пэўныя непаразуменьні – мы не баяліся, не было падставаў ні для якага зьняволеньня. К таму часу наагул вятры ў палітыцы дзьмулі ўжо зусім іншыя, але, ведаючы непрадбачнасьць саветаў, мы ўспрымалі ўсё стрымана.

Запросіны на Бацькаўшчыну

Недзе пад канец 1990 году мы атрымалі запросіны – я, Запруднік, Зора, Том Бэрд, Вольга Арэхва, усяго каля дзесятка асобаў – на кангрэс, які мае адбыцца ў Менску ў травені 1991 году. Да пэўнай даты трэба было пацьвердзіць сваю згоду на прыезд і ўдзел у Кангрэсе.

На пачатку мы нават і самі ня ведалі – ехаць ці ня ехаць, успаміналі старое, якое было невясёлае, але глядзелі і на рэальнасьць, што сьвет мяняецца. Усё ж такі вырашылі, што мы паедзем. Я, Запруднік і Зора трымаліся найбліжэй у Нью-Ёрку, працавалі блізка, добра адно аднаго ведалі – і вырашылі ехаць. Гэтае рашэньне мы нават

не падавалі да шырокага ведама, бо яшчэ быў Савецкі Саюз – і вось раптам мы едзем у Савецкі Саюз! Грамадзтва магло прыняць гэта адмоўна – чаго вы туды прэцеся!

А пакуль што трэба было афармляць візы – візы савецкія. Ні ў Менск, ні ў Вільню, ні ў Кіеў міжнародныя лініі яшчэ ня лёталі – трэба было ляцець праз Маскву, а з Масквы ўжо мясцовымі лініямі дабірацца да Менску. Так што зварачацца па візы трэба было ў савецкі кансулят. Я пайшоў у турыстычнае агенцтва, думаў, што праз агенцтва будзе хутчэй, але мне сказалі, што хутчэй гэта ня будзе, рабіце лепш самі, бо праз агенцтва будзе на 200 даляраў даражэй. Дык мы пачалі самі. Выявілася, што галоўны кансулят, які выдае савецкія візы, быў у Вашынгтоне. Мы запоўнілі ўсе патрэбныя анкеты, выслалі ў кансулят, але нешта ў тых дакумэнтах было няясна, і нам даслалі яшчэ дадатковыя анкеткі розных колераў – я атрымаў аднаго колеру, Зора і Запруднік – іншага. Трэба было пазваніць у Вашынгтон і ўдакладніць, што і як запаўняць. Я званю і пачынаю гаварыць, што я такі і такі, здаў дакумэнты на атрыманьне візы, а цяпер атрымаў ад вас анкетку такога колеру, а мае сябры – іншага колеру. А мне адтуль: «А вам что – цвета не нравятся? Давайте эти формальности отбросим и сделаем все по телефону». Гэта для мяне была проста бомба – значыць бюракратыі ўжо няма, я ўбачыў нармальны падыход. Напэўна, пачуўшы пра колеры, тая жанчына-адміністратар рагатала ад вуха да вуха – во, жыве яшчэ старпёр-эмігрант, баіцца невядома чаго. А я сапраўды быў у напружаньні, думаў, што гэты колер мае нейкае значаньне, а ў іх можа проста паперы не хапіла. Я расказаў пра анкеткі сябрам, і настой у нас крыху палепшыўся.

Масква, самалёт

Калі мы прыляцелі ў Маскву і вылезьлі з самалёта, быў кантроль рэчаў, а да пункту кантролю – даўжэзная чарга. А Зора падышла да мытніка і ламанай мовай, каб падумалі, што мы старыя дзяды, папрасіла, каб нас, можа, хутчэй прапусьцілі. Нас прапусьцілі раней, і мы пачалі пачувацца зусім добра – усё ідзе нармальна. У нас усё ж яшчэ моцна быў умацаваны ў галаве стэрэатып, што Савецкі Саюз – гэта тое, што было раней, а тут уваччу сытуацыя мяняецца к лепшаму.

У Маскве трэба было пераехаць з аднаго аэрадрому на другі, і калі мы ўжо пераехалі туды, адкуль ляцеў самалёт на Менск, то там трошкі павеяла тым Саюзам, які мы ведалі: самалёт быў брудны, спазьніўся. Мы нічога не купілі паесьці – усё было зачыненае – і я папытаўся ў сцьюардэсы, ці яны нас пакормяць у самалёце. А яна нам у адказ: «А что, вы не могли купить в аэропорту?» Не, кажу я, было ўжо позна. «Ну ничего, как-нибудь потерпите до Минска, не по-

худеете». Прычым, адчувалася, што яна ставіцца да нас як да сваіх. Дык я пабачыў, што Саюз заставаўся шмат у чым такім, як я яго памятаў, хоць праўда, я не баяўся. Ва ўсялякім разе настрой у нас быў добры, напружаньне спала.

У самалёце мы сустрэліся з швэйцаркай Монікай Банькоўскай – яна таксама ляцела на кангрэс у Менск. Мы зацікавіліся, чым яна займаецца, трохі пагаварылі. На яе зрабіла вялікае ўражаньне, што нехта ляціць на кангрэс з Амэрыкі, а на нас – што нехта ў Швэйцарыі займаецца Беларусьсю. Мы пачалі гаварыць зь ёй пра бібліятэкі – а яна аж ускрыкнула, што працуе ў бібліятэцы – і пабачылі, што ў нас зь ёй супольная мова ня толькі на тэмы палітыкі, але і ў шмат чым іншым, уключна зь бібліятэчнай справай. Мы разгаварыліся і пасябравалі.

Прылёт у Менск

Самалёт падняўся – было ўжо цемнавата, калі прыляцелі ў Менск, было ўжо зусім цёмна. Нас сустрэла на аэрадроме грамада моладзі зь бел-чырвона-белым сьцягам. Гэта было вельмі прыемна, бо ўсё ж гэта быў яшчэ Савецкі Саюз – дык у галаве эмігранта такая карціна стварала вялікі пералом: ага, ёсьць зьмены, нешта нацыянальнае робіцца. Бо мы сачылі за літаратурай, за друкам, я шмат часу праводзіў на радыё, мы ведалі, што ёсьць Фронт, што ёсьць рух моладзі. Ну але так, каб са сьцягам сустракалі на аэрадроме – гэта яшчэ ў галаву не ўкладалася. Перажывалі мы вельмі прыемны час.

Везьлі нас з аэрапорту на аўтобусіку ў Менск, і хоць было цёмна, я стараўся нешта пазнаць (наіўнасьць!), але гэта было цяжка. Разьмясьцілі нас у гатэлі «Юбілейны», дапамагалі нам Сяргей Шупа, Адам Мальдзіс і іншыя незнаёмыя людзі.

Першая ноч у Менску пасьля амаль паўстагодзьдзя! Неяк дзіўна сябе адчувалі – гаварылі, разважалі. Былі вельмі задаволеныя, што на жыцьцёвым шляху давялося вярнуцца ў Менск – горад, дзе мы нарадзіліся!

Першая раніца

Раніцай я выглянуў у акно і збольшага пазнаў аколіцы – арыенцірам быў тэатар опэры і балету. Я кажу Зоры: хадзем выйдзем. А гадзіне сёмай мы выйшлі і пайшлі адразу пад рэчку. Я бачу – стаіць рыбак. Падыходзім мы да рыбака, як заўсёды, асьцярожненька, бо рыбакі ня надта любяць, калі людзі за імі глядзяць. Закідае вуду – нічога няма, закідае яшчэ раз – нічога. Неяк пачынаецца гутарка, і я яму кажу, што мы прыежджыя з далёкіх краёў, але я ўспамінаю дзяцінства – і гавару гэта па-беларуску – і вось, кажу, на тым беразе якраз, паказваю месца, некалі і я рыбу лавіў, але былі іншыя часы, іншыя вудачкі, па-

чынаю гаварыць пра рыбацтва. Але яго, відаць, беларуская гаворка ўзьдзёрнула, ён раптам па-расейску: «У меня всё в порядке! И документ есть!» Ён прыняў нас за нейкіх інспэктароў! Я кажу: ды не, землячок, я ж нічога не пытаюся! А ён нас заваліў сваімі дакумэнтамі. Такая дзіўная была сустрэча. Мы ўжо з Зорай адышлі, а ён яшчэ ня верыў, круціў галавой. З гэтага пачаўся наш пабыт у Менску – ня надта прыемна.

Прынагодна я ўспомніў мамэнт пра адно здарэньне ў Менску праз пару гадоў пасьля таго: я ішоў па Інтэрнацыянальнай ад плошчы Свабоды пад музэй Купалы, і ў канцы вуліца была зачыненая – стаяў фанэрны плот, нешта будавалася, прайсьці не было як. Іду я там, разглядаю, а з боку Купалаўскай вуліцы чалавек выходзіць з-за плота, ідзе наверх мне насустрач, я ў яго пытаюся, як мне тут лепш прайсьці ў музэй? А ён пытаецца: «Какой музей?» Я кажу, што тут за 250 мэтраў пад рэчку музэй Купалы. «О чем вы говорите? Я уже 25 лет здесь живу и хожу и никогда ни о каком музее не слышал!» Сапраўды дзіўныя, непрадбачлівыя бываюць мянчане. Думаю, што гэта рэакцыі не карэнных менчукоў, а прыбыльцаў.

Пачатак кангрэсу

Пасьнедаўшы, мы выйшлі з гатэлю. Сяргей Шупа павёў нас напрасткі ў Дом літаратара на вуліцу Фрунзэ, дзе праходзіў кангрэс. Я па дарозе справа і зьлева нешта пазнаваў, Зора нічога не пазнавала. Адчувалі сябе крыху разгублена, крыху прыўзьнята, але – бачым: мы ўжо на Бацькаўшчыне! Падышлі мы да грамады, што чакала каля ўваходу ў парк Горкага (у маім дзяцінстве – Сад Прафінтэрну): знаёмствы, пытаньні, невыразнасьць сытуацыі, вычэкваньне.

Пачаўся кангрэс мастацкім выступам капэлы, яны вельмі прыгожа выканалі «О, Беларусь, мая шыпшына» – гэта рабіла ўражаньне, камок пад горла падыходзіў, бо гэтага мы не спадзяваліся. На зьезьдзе выступленьняў было шмат, шмат знаёмстваў на перапынках – паўсюль беларуская мова. Здавалася – уся Беларусь такая, як тут на зьезьдзе. Так што першыя дні мы былі калі не захопленыя, то вельмі задаволеныя, Беларусь сапраўды выглядала такой, якой бы нам яе хацелася бачыць – беларуская, людзі думаюць пра Беларусь, працуюць над беларускімі тэмамі. Мы яшчэ нікуды «далей» не выходзілі, сустрэліся з грамадой, якая была амаль такіх самых паглядаў, што і мы. З пэрспэктывы часу цяпер аналізуеш і разумееш, што трэба быць вельмі асьцярожным у сваіх высновах.

Нам, эмігрантам, кідалася ў вочы, што было шмат маладых – Шупа, Зайка, Сагановіч. Нам тады было па 65, мы ўжо былі людзі сталага веку, а на канфэрэнцыі было поўна людзей, каму было па 20-30, і на нас гэта зрабіла вялікае ўражаньне, бо мы, жывучы на

эміграцыі, лічылі, што маладое пакаленьне адыходзіць, саветызуецца і мала чым беларускім цікавіцца. У значнай меры яно так і было, але ў тыя дні на зьезьдзе мы гэтага яшчэ ня бачылі – з рэчаіснасьцю мы пазнаёміліся пазьней.

Былі на кангрэсе круглыя сталы, часам даволі вострыя дыскусіі. Памятаю, я выступаў на круглым стале, і дакладчык, які быў перада мной – Мацюнін закрануў кнігу Раманоўскага «Саўдзельнікі ў злачынстве», якую мы на эміграцыі добра ведалі – ведалі яе значаньне і шкоду, якую яна нам рабіла. Я выступіў і сказаў: калі мы будзем базаваць нашыя дасьледаваньні і нашую статыстыку на кнізе Раманоўскага, то супольнай мовы для будучай дзейнасьці мы ня знойдзем.

Але на такія дыскусійныя мамэнты асабліва ўвагі не зьвярталася, бо бальшыня людзей былі настроеныя на тое, каб пачуць нешта новае ад эміграцыі, нешта даведацца, прыгледзецца. Я працаваў над тэмай «Беларусы ў ЗША», да мяне было шмат пытаньняў у кулюарах, і гэта было рэальнае і прыемнае супрацоўніцтва.

Прагулкі па Менску

У перапынках працы кангрэсу мы мелі час прайсьціся па Менску. Якое было наша ўражаньне? У 1944 годзе мы пакінулі Менск цалкам разьбіты. Ясна, як Зора пісала, прыехаўшы праз 47 гадоў, мы не спадзяваліся пабачыць руіны. Але мы не спадзяваліся бачыць і такой адбудовы – на наш пагляд цалкам мадэрнай. Бо мы прыехалі з Амэрыкі, дзе разбураюць стары будынак і на яго месцы будуюць мадэрны – дык гэтая мадэрнасьць Менску нам спадабалася. Новыя будынкі, усё расчышчана, ёсьць клюмбы. Мне асабліва спадабаўся новы мост празь Сьвіслач, бо той, які я прыпамінаю, быў страваты. Адным словам, Менск зрабіў добрае ўражаньне.

Раён, дзе я некалі жыў, зьмяніўся, але дамкі, якія зьніклі – я ніколі не лічыў, што драўляныя дамкі з мохам на страсе былі надта прывабным для разгляду аб'ектам. Дык адсутнасьць тых драўляных дамкоў ня надта мяне і засмуціла. Дом Васіля Паўлавіча Зубкоўскага быў адзін зь лепшых на Горным завулку, ён быў ашаляваны і кожныя трычатыры гады фарбаваўся і выглядаў, як новы. А іншыя дамкі былі стараваценькія. Асабліва мне не падабаўся мох на стрэхах – я цярпець ня мог, а таксама брамы – кожны дом меў браму – якія ў некаторых дамах былі напалову перакошаныя. Цяпер на тым месцы – аднатыпныя двухпавярховыя дамкі, гэтая ўраўнілаўка нам была спачатку незразумелая, але пасьля нам расказалі, што іх будавалі нямецкія палонныя, а потым яшчэ чэхі, і яны былі падобныя адзін на адзін. Як бы там ні было, але «майго» Горнага завулку было шкадавата.

Мы пайшлі на могілкі, я знайшоў магілу маёй бабкі, і на мяне зрабіла добрае ўражаньне тое, што за могілкамі нехта даглядае. На

магіле маёй бабкі была падстрыжаная трава, пасаджаныя кветкі – я й дасюль ня ведаю, хто гэта рабіў. Наагул беларускія могілкі выглядаюць больш закінутымі ў параўнаньні з амэрыканскімі, дзе іх даглядаюць і ледзь не нажніцамі стрыгуць траву, робяць зь іх нейкі садзік. Але Вайсковыя могілкі зрабілі добрае ўражаньне, быў відаць дагляд, нічога не развальваецца, шмат кветак, пафарбаваныя агароджы.

Мне асабіста прыемна было тое, што тыя два паўкруглыя дамы на плошчы Перамогі былі дабудаваныя, бо ў часе, калі я выяжджаў, яны будаваліся і былі збудаваныя да паловы. Я падумаў: добра, што пасьля вайны іх не ўзарвалі, а дабудавалі, і гэта прыгожая архітэктура – мне падабаецца наагул, калі архітэктура не прасталінейная, а калі ёсьць трошкі фантазіі, мастацтва.

Сумнае...

Пазьней, калі мы пайшлі ў горад – спадабаўся стадыён, перш за ўсё – ён быў на тым самым месцы, што і некалі. Што зрабіла непрыемнае ўражаньне – гэта барахолка каля стадыёна. Божа, што там было! Мне гэта нагадала базары, на якія я хадзіў у ваенным Менску, але ж тое была вайна – а тут цяпер хапаюць за руку: «Посмотрите, может вам кофточка нужна?» Для сталіцы, у гэтым месцы – гэта, як мне здалося, было не на месцы і не на часе. Такі базар мусіў быць за дзесяць кілямэтраў ад Менску недзе ў лесе – едзь туды і купляй. Але ў горадзе такому ня месца.

Сумнае ўражаньне пакінула таксама тое, што не было ўжо зусім «польскіх» могілак на Залатой Горцы. Я ведаў, што там не хаваюць – там не хавалі і раней. Але гэтыя могілкі жылі ў маіх успамінах, бо мой дзед сюды прыходзіў, у жніўні заўсёды было вялікае сьвята – а тут ужо няма нічога! Зьнішчана мінулае. Залатую горку я асабліва назіраў, калі бываў летам у дзеда. На сьвята 15 жніўня сюды прыяжджала шмат людзей зь вёсак – навакольныя завулкі былі застаўленыя вазамі. І мой дзед у той дзень прападаў на тых могілках, бо прыяжджалі былыя «землякі» зь вёсак Вугляны, Юзафова. Часта дзед не прыходзіў дадому – напэўна выпіваў, а дома «Маня» заўсёды сварылася, калі дзед быў нападпітку.

Зусім мы спахмурнелі, калі пайшлі паглядзець на Нямігу – і не знайшлі яе! Гэта быў шок. Мне Няміга прыпамінала дзеда – ён заўсёды хадзіў на Нямігу сустрэцца зь сябрамі, а пры немцах я ўважаў Нямігу за цэнтар гораду. І сапраўды яна такая была: сотні і сотні людзей, і калі на базарах людзей з зоркай Давіда амаль не бывала, на Нямізе яны былі!

Што яшчэ было вельмі дзіўна – натоўпы на трамвайных прыпынках. Натоўпы! Бо ў Амэрыцы стаіць чарга – людзей можа й больш, чым у Менску, але стаяць даўгой чаргой адзін за адным. А там – натоўп.

Трамвай прыходзіць – і ўсе з боем у тыя дзьверы. Гэта было дзіўна і непрыемна.

Працяг кангрэсу

Затое працоўная грамада на зьезьдзе зрабіла на нас вельмі пазытыўнае ўражаньне. Хоць, ясна, мы адчулі, што блізкасьці вялікай няма, ёсьць кантакт, але ўсе вельмі да нас, амэрыканцаў, асьцярожныя. Шчырэйшы падыход быў з боку маладзейшых, чым людзей нашага веку і крыху маладзейшых за нас. Там ужо адчувалася, што перагародка існуе, ёсьць недавер. З нашага боку не было недаверу, была засьцярога.

Але безумоўна пабыт у Менску быў у нашым жыцьці падзеяй значнай, бо на эміграцыі, да 1985 году, калі прыйшоў Гарбачоў, выглядала, што старэньне Савецкага Саюзу будзе цягнуцца вечна, а значыць вечная будзе і адарванасьць гэтай краіны. Але калі прыйшоў Гарбачоў, пачулася «гласнасьць», адчуліся павевы нечага іншага, то мы падумалі, што, можа, кантакт з Бацькаўшчынай прыйдзе. І калі ён наступіў – у жыцьці гэта быў сапраўды выбітны мамэнт. У жыцьці кожнага чалавека ёсьць важныя мамэнты – ён жэніцца, нараджаюцца дзеці, але калі ты жывеш на эміграцыі з думай пра Бацькаўшчыну і ўвесь час ад яе адарваны, то вельмі сумна, калі Бацькаўшчыны ня ўбачыш. А тут прыйшоў мамэнт, што ня толькі ўбачыў, а наладзіўся працоўны кантакт – можна выступіць з дакладам, выказаць свае думкі – гэта было прыемна і важна для жыцьця, бо ж на эміграцыі мы дзеілі для Беларусі, мы зь Беларусьсю жылі!

Вільня

Празь дзень-два Шупа пераканаў нас аб магчымасьці і патрэбе зьезьдзіць у Вільню, што мы зрабілі і былі вельмі задаволеныя. Зора баялася ехаць больш, чым я, баялася, што нешта ня так будзе з дакумэнтамі, скажуць, што няма візы, арыштуюць, пасадзяць на самалёт і адправяць. Мы не хацелі зрабіць нічога такога, што пазьней зрабіла б немагчымым прыезд на Бацькаўшчыну. Фактычна ў Вільню мы езьдзілі нелегальна – мы ня мелі літоўскай візы і ня мелі паўторнай савецкай, каб вярнуцца назад. Хто яго ведае, як маглі зрэагаваць літоўцы – а можа гэта беларуская правакацыя? Я гэта тады вельмі добра адчуваў, але жаданьне пабыць у Вільні было мацнейшае за ўсе магчымыя небясьпекі і перасьцярогі.

Выдатна, што мы зьезьдзілі, паглядзелі Вільню. Вільня нам была як Мэкка: пабыць у Вільні – абавязак у жыцьці, і мы яго выканалі. Вяртаючыся, заехалі ў Кушляны ў музэй Багушэвіча. Але Зора вельмі хвалявалася і пазьней гэтае хваляваньне часта ўспамінала, і, думаю,

падставы для хваляваньня былі, але адведаць Багушэвічаву мясьціну і крыху расслабіцца там было апраўдана.

Сустрэча з раднёй

Безумоўна, была навязаная лучнасьць з раднёй, асабліва з Зорынай – Зора зьезьдзіла і знайшла сваю радню на Глыбоччыне – беларускамоўную, што там не такая рэдкая зьява. Рэдкае, можа, гэта будзе на Магілёўшчыне – што ўся сям'я між сабой гаворыць па-беларуску. Была яна ў Лужках, у Падсьвільлі – і паўсюль гаварылі па-беларуску. Усталяваліся сталыя кантакты.

Кватэра ў Менску

У часе зьездаўскай актыўнасьці і занятасьці мы ўсё ж знайшлі хвілінку і, калі былі разам зь Пятром Краўчанкам, асьцярожна спыталіся ў яго: ці ёсьць магчымасьць амэрыканцам купіць у Менску кватэру. (Гэта была нашая першая мара ў думках вяртаньня, хоць і ня сталага, на Бацькаўшчыну.) Краўчанка адразу адказаў: пакуль у Беларусі няма заканадаўства, якое б абараняла ўласнасьць замежнікаў, а таксама няма заканадаўства аб двайным грамадзянстве. Так што практычнай магчымасьці набыць кватэру няма, але можна здымаць. Здыманьне нас не цікавіла, і гэтая тэма больш ніколі не ўзьнімалася. Думку мець кватэру ў Менску мы пахавалі – задавольваліся тым, што хадзілі па мясцох, дзе стаялі некалі нашыя собскія хаты ды заходзілі да мае бабкі на могілкі.

Адлёт з самаварам

У Менску была адна вясёлая гісторыйка. Том Бэрд прыехаў позна, мы не былі пэўныя, ці прыедзе ён наагул. Я ў гатэлі пытаюся, ці маюць яны весткі ад яго, а гатэльныя начальнікі мне кажуць: «А вы зайдите на втором этаже в такой-то номер». Я пайшоў на той другі паверх, стукаю – «войдите». Заходжу я, а там – Анатоль Абрамчык, супрацоўнік арганізацыі «па сувязях з суайчыньнікамі за рубяжом», якога я ведаў зь Нью Ёрку! Ну, мы павіталіся як старыя знаёмыя, і ён кажа – ведаю, Том Бэрд прылятае такім і такім самалётам. Так што было відавочна, што ўлада яшчэ трымаецца – «арганізацыя» ведала больш, чым гатэль! Абрамчык запрапанаваў сваю дапамогу, каб дабрацца да лётнішча, мы пагадзіліся. Тым часам Вацлава Вярбоўская, якая тады жыла ў Амэрыцы перадала сваёй радні ў Менск пяць ці шэсьць пар красовак, і каб аддзячыць нам, ейная дачка ў апошні дзень перад ад'ездам прынесла нам самавар. І вось нам ад'яжджаць – а тут вялікі пузаты самавар! Зора кажа: выкінуць

вон! А я – не, ня выкінем. І з гэтым самаварам мы цягаліся, Абрамчык даў нам машыну, якая завезла нас на аэрадром, селі ў самалёт. А каля нас у самалёце сядзіць пан Цеханавецкі. Ён быў на зьезьдзе, там вакол яго ўсе «танцавалі», асабліва Мальдзіс – нібыта гэты пан зробіць нас шчасьлівымі. Ляцім мы ў Маскву, пралятаем над Смаленшчынай, а Цеханавецкі паказвае наніз і кажа: тут былі мае землі. Я наагул да «паноў» стаўлюся заўсёды з засьцярогай, а ў гэтым выпадку зрабіў канчатковае ўяўленьне пра спадара Цеханавецкага.

З польскім панам у Маскве

Прыехалі мы ў Маскву, а там паводле раскладу трэба пераехаць на іншы аэрадром. Пан Цеханавецкі, які трымаўся каля нас, кажа: нікуды не выходзьце, мне тут пададуць лімузын, бо спадар Мальдзіс сказаў, што ў Маскве ўсё залагоджана. Я кажу: «Пан Цеханавецкі, я ня думаю, што спадар Мальдзіс у Маскве мае нейкую асаблівую ўладу». Ён кажа: не, зараз прыедзе лімузын, і вы на мой лімузын сядзеце і паедзеце. Пастаялі мы пяць мінут, Зора кажа: «Віта, ня будзем дурнямі, ніякага лімузына ня будзе». Я Цеханавецкаму кажу, што мы ўжо паедзем, а ён: не, нех пан зачэка, ешчэ пеньць мінут. Я ж, кажа, ня хто-небудзь, тут ведаюць, хто я. Я дзеля ветлівасьці стаю. Стаім мы яшчэ дзесяць мінут – нічога няма. Я выходжу замовіць таксі, таксіст пад'яжджае і кажа: «Милейший, отечественных денег не берем!» Цеханавецкі ззаду хвалюецца: «Цо он муві?» А я махаю другому таксісту – і той гатовы мне сказаць, што «ацечэственных» не бярэ. Я дастаю пачак цыгарэт Chesterfield – таксіст адразу адчыняе: сядайце! Селі. Я Цеханавецкаму кажу, каб сядзеў спакойна. Ён ціхенька «бунтуецца»: не, дзесьці мусіць быць ягоны лімузын! Мальдзіс, відаць, яму нагаварыў шмат чаго, або можа гэтаму Цеханавецкаму хацелася быць нечым большым. Я пытаюся ў шафёра: я вам пачак даў, ці хопіць? Ён кажа: о, я вас два разы павязу туды і назад!

Але гэта яшчэ не канец. Прайшлі мы мытню, ідзем далей. Цеханавецкі дзяўбе: відаць, лімузын спазьніўся. Зора дае мне «пінкара», каб нічога Цеханавецкаму не адказваў! Садзімся ў самалёт, а Мальдзіс купіў Цеханавецкаму білет у бізнэс-клясу, дык ён кажа: давайце разьвітвацца, а ў Лёндане каб мы да яго падышлі, ён нам дасьць сваю візытоўку – як будзем у Лёндане, прыйдзем да яго, ён нас пакорміць і прыме. Стаім мы ў чарзе на рэгістрацыю, а сьцюардэса абыходзіць чаргу і глядзіць, што ў нас поўна багажу, а яшчэ я трымаю нешта круглае запакаванае. Яна пытаецца, што гэта мы вязем. Я кажу: у апошнюю хвіліну мне прывезьлі самавар як падарунак. Сьцюардэса кажа, што ні ў турыстычнай, ні ў бізнэс-клясе для самавара ня будзе месца, і яна нас пасадзіць у першую клясу. Я падумаў – Цеханавецкі зараз будзе мець сардэчны прыступ. Мы селі ў першай клясе на тры

круглыя крэслы – я, Зора і самавар. А тады міма нас у бізнэс-клясу праходзіць Цеханавецкі і пытаецца, ці няма каля нас месца. Дзе там, кажу, тут жа во самавар... Мабыць, ён падумаў: нейкага хлопа з самаварам – і ў першую клясу! Гэта была камічная сытуацыя. Больш з панам Цеханавецкім мы не сустракаліся.

Вынікі першага пабыту на Бацькаўшчыне

Усяго мы пабылі ў Менску пяць дзён, было вельмі цікава. Для нас былі сапраўды важнымі знаёмствы зь людзьмі, з новай атмасфэрай, якая існавала тады на Бацькаўшчыне. Што асабіста для мяне было вельмі важна – я дзесяткі гадоў зьбіраў матэрыялы для кніжкі «Беларусы ў ЗША», яна тады была ўжо падрыхтаваная па-ангельску, і тады ў Менску Аляксандар Лукашук, які быў галоўным рэдактарам выдавецтва «Беларусь» (манускрыпт Алесь упершыню бачыў у ЗША), запрапанаваў выдаць кнігу ў яго і параіў Сяргея Шупу як перакладчыка. Дамовіліся мы летам 1991 году, у лютым 1992 году Шупа прыехаў у Амэрыку, у красавіку з гатовым перакладам ён выехаў у Менск, і за год – да Зьезду беларусаў сьвету ў 1993 годзе – кніга была надрукаваная тыражом 5000 асобнікаў. Як я чуў, друку паспрыяў і Пятро Краўчанка. Для мяне гэта было вельмі важна, бо матэрыялы па гэтай тэме я пачаў зьбіраць яшчэ сорак гадоў перад тым і думаў, што публікацыя па-ангельску зробіць у Амэрыцы ўражаньне, што мы заявілі сваё права на амэрыканскую спадчыну. А тут надарылася нагода выдаць кнігу па-беларуску, кніга разышлася ў Беларусі – і за гэта я Лукашуку, Шупу, Мальдзісу і Краўчанку шчыра ўдзячны. Я быў вельмі задаволены, што кніга найперш выйшла ў Беларусі, уважаю, што мы заявілі наша слова на нашу спадчыну ў ЗША.

Аб далейшых дасьледаваньнях беларусаў у ЗША

Мушу дадаць яшчэ пару дэталяў да кніжкі «Беларусы ў ЗША». Я зьбіраў матэрыялы, безумоўна, у Нью-Ёркскай публічнай бібліятэцы, а таксама падчас нашых падарожжаў зь дзецьмі па Амэрыцы – і дзеці мне дапамагалі, і ім самім гэта ў нечым дапамагала. Але мушу падкрэсьліць пару месцаў, якія будуць важныя для далейшых досьледаў. Перш за ўсё – Гаваі. На Гаваях ёсьць Гавайскі нацыянальны архіў, там вельмі шмат лістоў Мікалая Судзілоўскага-Русэля. Я іх перагледзеў, глядзеў іх і нехта зь Беларусі, але там матэрыялаў Судзілоўскага – друкаваных і рукапісных – зьбярэцца яшчэ на адну такую кніжку, якую выдаў Ёська (кніжка нядрэнная, я на яе рабіў рэцэнзію). На Гаваях сабраная спадчына Судзілоўскага – сотні артыкулаў, якія ён друкаваў у часе расейска-японскай вайны – ён быў на японскім баку, супраць Расеі, выступаў за разьдзел

Расеі. Яшчэ адзін важны цэнтар – Балтымор, езуіцкія архівы, частка якіх захоўваецца і ў Нью-Ёрку. Так шмат папак карэспандэнцыі ксяндза Дзеружынскага па-расейску зь ягонымі сёстрамі, якія жылі ў Магілёве – гэта 1840–1850-я гады. Прычым гэтая карэспандэнцыя ня йшла праз пошту – яе перадавалі пасыльныя. Гэтая дзялянка застаецца недасьледаванай. Іншае месца – архіў у Сэнт-Поле, штаце Мінэсота, дзе цяпер працуе айцец Ігар Лабацэвіч. Тамтэйшы архіў важны тым, што там захоўваецца вельмі шмат расейскіх газэт Амэрыкі, у тым ліку тых, якія існавалі кароткі час. Яшчэ там захоўваецца рэгістар Рускага праваслаўнага дома, які быў у Нью-Ёрку. На Алясцы захоўваецца архіў Вінакурава, якім перапісваўся з Варонкам. Я тых лістоў ня бачыў, але з выказваньняў Вінакурава выцякае, што паміж імі была карэспандэнцыя – гэта ўсё варта пашукаць. Гэтаксама трэба перагледзець архіўныя матэрыялы былых паўстанцаў 1831–32 і 1863 гадоў: шмат хто зь іх уважалі сябе ліцьвінамі – а гэта ў амэрыканскіх штатных архівах.

Па вяртаньні ў Амэрыку

Першае наведаньне Беларусі адкрыла дарогу далейшым паездкам, якіх было даволі шмат. Але я асабіста пачуўся, што пачаў супрацоўнічаць зь Беларусьсю, нягледзячы на тое, што ў 1991 годзе гэта быў яшчэ Савецкі Саюз. Былі наладжаныя кантакты – пэрсанальныя, сямейныя, грамадзкія, пайшла ў ход кніжка, былі заплянаваныя далейшыя публікацыі.

Першы кангрэс беларусістаў адбыўся ў канцы траўня 1991 году. Мы прадставілі наш пункт гледжаньня, былі дыскусіі, былі і напружаныя мамэнты, але разьехаліся мы ў настроі, што нацыянальная думка працуе ў правільным кірунку.

Пасьля кангрэсу мы вярнуліся ў Злучаныя Штаты Амэрыкі і зрабілі пару вечароў, дзе паінфармавалі беларускае грамадзтва аб нашым побыце ў Беларусі. Беларускае грамадзтва ў Амэрыцы яшчэ не было гатовае ўспрыняць той факт, што мы наладжваем кантакты зь Беларусьсю, што часы зьмяніліся. Затое пару дакладаў, якія я зрабіў амэрыканскім аўдыторыям, успрымаліся вельмі пазытыўна. Злучаныя Штаты хацелі бачыць у Беларусі саюзьніка, які мае салідныя карані ў Амэрыцы.

Жнівеньскі путч і Незалежнасьць

Раптоўная і нечаканая падзея – путч у жніўні 1991-га ў Маскве. Эміграцыю гэта насьцярожыла – што будзе далей? Ясна, ніхто на эміграцыі не хацеў вяртаньня старога. За час пасьля нашага вяртаньня ў Беларусі адбываліся палітычныя зьмены, друк пачаў зьвяртаць

увагу на беларускія падзеі. У ліпені быў абвешчаны сувэрэнітэт, мы давалі інтэрвію газэтам, тлумачылі, што значыць новая Беларусь, якая нашая пазыцыя, якою мы бачылі Беларусь у ідэальным стане – адным словам, Беларусь увайшла на старонкі вялікага друку: у ЗША эмігранты добра тлумачылі становішча.

Жнівеньскі путч быў для ўсіх нечаканасьцю: і для эмігрантаў, і для заходніх палітыкаў. Але путч скончыўся, для нас ён, думаю, быў карысны – пасьля яго нацыянальная дзейнасьць пачала разьвівацца больш дынамічна. У Расеі не абышлося нават без праліцьця крыві, але пасьля путчу ўжо было «ў картах», што гісторыя СССР набліжаецца да канца.

Прыняцьце новай дзяржаўнай сымболікі – бел-чырвона-белага сьцяга і «Пагоні» – было аднадушна прынята эміграцыяй як вельмі пажаданы крок, і вельмі хутка зьявіліся паштоўкі, выдадзеныя ААН, зь сьцягам новай дзяржавы – Беларусі. Памятаю, як некаторыя эмігранты – Машанскі, Субота – езьдзілі купляць тыя паштоўкі па сотні штук і рассылалі, каму толькі маглі.

Рым-IV у Горадні

У пачатку 1993 году мы атрымалі вестку з Рыму, што ў Менску было вырашана: чародны – «беларускі Рым» – адбудзецца ў Горадні. Мы ня ведалі ўсіх тонкасьцяў перамоваў, але навіну вельмі віталі. Канфэрэнцыя «Рым-IV» адбылася ў канцы чэрвеня 1993 году. Безумоўна, мы таксама на яе паехалі. Па велічыні і колькасьці ўдзельнікаў канфэрэнцыя ў Горадні была самая вялікая. Горадня прыняла нас вельмі сымпатычна, хоць і былі адміністрацыйныя недагляды, але гэта дробная справа.

На мяне канфэрэнцыя зрабіла велізарнае ўражаньне. Скажу шчыра: па памерах такой беларускай канфэрэнцыі мне наведваць не даводзілася. Па-першае, гэта было працягам сэрыі важных канфэрэнцыяў. Па-другое, не выпадала казаць пра беларускую «дэлегацыю» – там была беларуская цэлая канфэрэнцыя. Беларусаў былі сотні, гэта было ў беларускім горадзе, былі шмат дзесяткоў дакладаў на беларускую тэму. Беларускія выстаўкі, эстрада, тэатар – Беларусь навуковая рэпрэзэнтавалася ў поўнай моцы. У часе канфэрэнцыі былі дадзеныя ганаровыя дактараты Гарадзенскага ўнівэрсытэту – мне нумар першы, я яго захоўваю і ганаруся, прафэсару Клачоўскаму, украінцу Ісаевічу і літоўцу Вітаўтасу Мяркісу.

Падчас канфэрэнцыі сярод сотні новых знаёмстваў я пазнаёміўся таксама з Алесем Белакозам, ён звазіў нас у свой музэй – усё гэта было на вельмі прыўзьнятай ноце. Калі праходзіла адкрыцьцё канфэрэнцыі, я сядзеў за сталом прэзыдыюму разам з Радзімам Гарэцкім, і я яму кажу: мы сядзім цяпер на канфэрэнцыі, а нашыя

бацькі разам сядзелі ў іншым месцы – ён пасьмяяўся, жарт быў на месцы.

Каб павесяліць гасьцей былі розныя вечарыны, і на адной вечарыне выступалі два ці тры беларускія аркестры, і Шыбека танцаваў польку – я ніколі ня бачыў, каб хто так добра танцаваў польку, як Захар Шыбека! Я нават падумаў – ці ня быў ён нейкім танцорам, што так віртуозна танцаваў. Што кінулася ў вочы – было мала падпітых, і то больш падпітыя былі госьці.

Шмат цікавых мясьцінаў у Горадні мы наведалі з прафэсарам Майсяёнкам, ён расказаў, як ва ўнівэрсытэце адбываецца навучальны працэс, якія там факультэты. Ва ўнівэрсытэце мы правялі шмат гадзінаў.

«Бос» Арцыменя

Было таксама знаёмства з прадстаўніком уладаў, дзякуючы якому канфэрэнцыя і магла адбыцца ў Горадні. Адам Мальдзіс мне сказаў, што спачатку яны з Клачоўскім плянавалі правесьці канфэрэнцыю ў Пінску, але пінскія ўлады паставіліся да гэтага вельмі холадна. Тады Мальдзіс вырашыў паехаць у Горадню – бо ён сам з Астравеччыны, ён знае там людзей – і пайшоў да Арцымені. Дзьмітры Арцыменя быў ягоны супернік на выбарах у Вярхоўны Савет, але прыняў ідэю канфэрэнцыі вельмі пазытыўна і шмат дапамог.

У Горадні я пазнаёміўся з Арцыменем – Мальдзіс мяне прадставіў. На адкрыцьці канфэрэнцыі Арцыменя нават сказаў пару слоў – што ён задаволены, што гэта адбываецца ў Горадні, і што ён чым можа дапаможа. І сапраўды, гарадзенскія ўлады дапамаглі канфэрэнцыі фінансава.

Мальдзіс пасьля расказваў мне пра першы кантакт з Арцыменем у гэтай справе – ён прыйшоў да яго, а Арцыменя думаў, што той будзе гаварыць пра выбары. А Мальдзіс кажа: не, не, пра выбары я забыўся, тут новая справа. Арцыменю ідэя канфэрэнцыі ў Горадні спадабалася, і ён грунтоўна прычыніўся да арганізацыі канфэрэнцыі.

З Арцыменем у мяне склаліся таварыскія дачыненьні. У часе банкету ён падышоў да мяне пагутарыць і сказаў нешта незвычайнае: «Вітаўт Яўхімавіч, у мяне ёсьць яхта 40 футаў, трэба яе прадаць». – «А дзе яхта?» – «Яхта ў Каліфорніі...» Я кажу, што ў мяне нават лодкі няма, ёсьць толькі сьпінінг, і той ня самы дарагі, так што я ў гэтай справе ніяк не дапамагу. Мы яшчэ пажартавалі, я яго далей не распытваўся. Ён сказаў, што калі б у мяне ў Горадні былі якія патрэбы, то ён заўсёды гатовы дапамагчы. Запрапанаваў, калі трэба куды паехаць, то дасьць сваю машыну. Гаварыў ён вельмі ўпэўнена, казаў, што сам ён з-пад Баранавіч, праваслаўны, у Горадню прыехаў гадоў трыццаць назад, тут яго часам не разумеюць, але ён наладзіў

супрацоўніцтва зь людзьмі. Ён лічыць, што рэспубліка цяпер бярэ правільны кірунак, ідучы ў бок нацыянальнага. Прапанаваў адведаць музэй, дзе зьбіраюць канфіскаваныя на мяжы прадметы мастацтва – я схадзіў, там сапраўды было шыкоўна, поўна мармуровых статуек, якія, мабыць зразалі недзе на могілках і хацелі правезьці, былі там старыя іконы, крышталь, ткацкія вырабы. Я быў «заскочаны» багацьцем.

У той вечар я з Арцыменем разьвітаўся, але прыняў ягоную прапанову зноў сустрэцца. На жаль, гэтаму не было наканавана стацца: праз пару месяцаў Арцыменю застрэлілі – справа нагадвала мафійны дэтэктыў.

Ганаровы дактарат

З гледзішча беларусікі канфэрэнцыя ў Горадні бясспрэчна была найбольшай. Але канфэрэнцыя «Рым-IV» была таксама і гістарычна значная, мне казаў пра гэта прафэсар Клачоўскі – з увагі на значэньне Горадні ў ВКЛ. Клачоўскаму было вельмі прыемна, што беларусы ацанілі яго працу ў галіне супольнай гісторыі – ён атрымаў ганаровы дактарат. Я таксама ўспрыняў свой дактарат як падзяку за тое, што я раблю. У маім слове, калі я дзякаваў рэктару і радзе, якія далі мне гэты ганаровы тытул, я сказаў, што свой першы дактарат я атрымаў у адным з найстарэйшых унівэрсытэтаў Эўропы, заснаваным у 1425 годзе, а цяпер атрымоўваю ганаровы дактарат на Бацькаўшчыне, у наймаладзейшым унівэрсытэце нашай краіны – Купалаўскім унівэрсытэце ў Горадні. Ісаевіч таксама быў вельмі задаволены, сапраўды, ніхто перад гэтым не зрабіў такога жэсту – ні ў Рыме, ні ў Камянцы, ні ў Любліне. Задаволены быў і Мяркіс.

Канфэрэнцыя «Рым-V» у Троках

Гарадзенская канфэрэнцыя была чацьвертая, а пятая (1995) канфэрэнцыя адбывалася ў Троках. Канфэрэнцыя была арганізаваная нядрэнна, але памерам была мініятурная. Беларуская дэлегацыя была на належным месцы, былі даклады Снапкоўскага, Трусава, іншых навукоўцаў. З дакладу Трусава мне спадабалася пра тое, як мы археалягічна вызначаем сувязь з Эўропай: там, дзе ў доме ёсьць фундамэнт – гэта Эўропа, а дзе фундамэнту няма, адразу пачынаецца зруб – гэта ўжо расейская тэрыторыя.

Наагул, настрой на канфэрэнцыі ня быў такі бадзёры, як у Горадні – атмасфэра была прыдаўленая.

У Троках мы прабылі дні тры ці чатыры. Арганізатары – літоўцы – казалі, што дзяржава ў арганізацыі канфэрэнцыі нічога не дапамагала, і зь іхных гаворак выглядала, што гэта была лебядзіная песьня

«рымскіх канфэрэнцыяў» – і сапраўды, канфэрэнцыя ў Троках сталася апошняй.

На мой погляд, спыненьне канфэрэнцыяў «Рым» – адмоўнае зьявішча, бо арганізацыйны энтузіязм напачатку – у Рыме ў 1990 годзе – здавалася, быў сапраўдны і апраўданы. Бо вывучэньне Вялікага Княства Літоўскага – жывая праблема, а з часам канфэрэнцыі маглі б стацца форумам і для дасьледнікаў ВКЛ, дзе можна было б непасрэдна і хутка дзяліцца паглядамі, новымі адкрыцьцямі і здабыткамі. Так плянавалася напачатку, але на канфэрэнцыі ў Троках усё скончылася. Я пазьней пытаўся ў Мальдзіса, чаму не прадаўжаюць далей, ён сказаў, што ў Троках было выказана меркаваньне, што канфэрэнцыя – аднаразовае зьявішча, адбылі пяць канфэрэнцый – і на гэтым канец. Паколькі я займаўся іншымі справамі, махнуў на гэта рукой. Але я вельмі шкадую, што так сталася, бо ўсё ж на гэтых канфэрэнцыях мы, беларусы, выказвалі свае погляды, іншыя маглі не згаджацца, вяліся дыскусіі. Мы выходзілі ў навуку як сур'ёзная група і мелі аўдыторыю, якой маглі прадставіць нашыя погляды, бо беларускія гледжаньні не заўсёды даходзяць – і нашы друкі не такія частыя, да таго ж мы шмат друкуем па-беларуску, што таксама часам абмяжоўвае.

Я асабіста чакаў ад «рымскіх канфэрэнцыяў» нечага вялікага, але скончылася справа вельмі празаічна. Мая думка: канфэрэнцыі «Рым» не хацелі прадаўжаць літоўцы, маўляў – лепш не ўваходзіць у дэталі ВКЛ.

Працы першых чатырох канфэрэнцыяў былі надрукаваныя асобнымі кніжкамі, і найбольшыя публікацыі былі з канфэрэнцый у Рыме і ў Горадні.

Я напісаў ліст прафэсару Клачоўскаму адносна працягу канфэрэнцыяў, але атрымаў фармальны адказ у тым сэнсе, што ён ужо не ў арганізацыйным камітэце і ня ведае, ідзе далей гэтая справа або не. Але ў падтэксьце чыталася: я, Ежы Клачоўскі, на гэта ніякага ўплыву ня маю.

Першы зьезд беларусаў сьвету

Наш наступны прыезд на Бацькаўшчыну адбыўся дзякуючы арганізацыі Зьезду беларусаў сьвету.

Ясная справа, калі ў сакавіку 1993 году мы атрымалі запросіны на Першы Зьезд беларусаў сьвету, які «Бацькаўшчына» арганізавала на пачатку ліпеня 1993 году – мы гэтыя запросіны прынялі.

Зьезд адбываўся ў памешканьні опэрнага тэатру. Быў вялізарны маральны ўздым, выступалі прадстаўнікі і эміграцыі, і ўладаў Беларусі. Бясспрэчна, гэта была вялікая гістарычная падзея. Прабег Зьезду дастаткова апісаны ў друку. Аднак некаторыя мамэнты там ня згадваюцца, а яны мне запамяталіся.

Банкет. Навуменка

Заключны банкет зьезду. Мы з Зорай сядзелі ззаду, ня пёрліся наперад, калі раптам да мяне падыходзіць салідных гадоў і саліднай вагі чалавек зь нейкім другім, і той другі пытаецца: «Вы Кіпель?» – «Кіпель». – «Вы знаеце гэтага чалавека?» Я кажу: «Не, ня знаю». – «Яго кніжкі перакладзены на дзесяць моваў». Я кажу, што ўсё роўна ня знаю – можа, на тых мовах я й не чытаю. – «А па-французску вы чытаеце?» Ну, я кажу, што чытаю, бо сем гадоў вучыўся па-французску ва ўнівэрсытэце. Праўда, прайшло ўжо ладна часу, гаварыць я можа так бегла й не гавару, але чытаць магу. «Ну дык вось, ягоная апошняя кніжка выйшла па-французску і яна добра разышлася». Я кажу, што па-французску выходзіла ў Парыжы кніжка Івана Навуменкі пра Купалу і Коласа – гэта такая савецкая кніжка, што і Мазалькоў мог бы пазайздросьціць. Тады той вялікі кажа: «Гэта мая кніжка! Я – Іван Навуменка! Вы ня чулі пра мяне?» Ууу, кажу, Іван Навуменка! Будзем знаёмы: Вітаўт Кіпель, і падаю руку, а ён не падае! Ну, не падае і хай сабе.

«Дык што вы скажаце пра тую кніжку?» Я кажу, што купіў тую кніжку: адна мая супрацоўніца, іранка, ехала ў Парыж і прывезла. Там многа савецкага – і цытаты, і пагляды... «Ну, я з вамі ня згодзен!» Я кажу, што дакладна не прааналізаваў усяго, але, пасьля беглага перагляду кнігі ў мяне склалася ўражаньне, што тыя паэты не былі такія ўжо савецкія. Навуменку мой пагляд вельмі не спадабаўся, і ён, падпіўшы, пачаў лаяць эміграцыю.

І тут патухла сьвятло – цёмна стала! Іван Навуменка літаральна зароў: «Гэтыя пазьнякоўцы ўсюды робяць шкоду – мы да іх дабярэмся!» Праз пару хвілін загарэлася сьвятло, што здарылася – ня ведаю. Бачу – каля мяне Зора, асьцярожна торгае за рукаў, каб я толькі ня выпіў крышачку больш, хоць я тады ўжо й ня піў.

Але Навуменка не адыходзіў, ён хацеў сварыцца. Пачалася рэзкая дыскусія з Навуменкам, а ягоны «асыстэнт» быў Уладзімер Гніламёдаў. «Эміграцыя нічога ня вартая!» – нападае Навуменка. Я кажу яму: «Слухайце, спадар Навуменка, калі мы будзем толькі лаяцца, то што з гэтага будзе? Нашто нам лаяцца, тут ва ўсіх такі вясёлы настрой, зьезд прайшоў, няма чаго сварыцца. Калі хочаце пагаварыць пра літаратараў, я вам скажу». Ну, ён трошкі сьціх, пытаецца: «Ну, як чытаюць мае кнігі?» Я кажу: «Вашы кнігі не чытаюць, бо яны нават нідзе не прадаюцца. Я ў сваёй калекцыі маю – бо ў мяне 5-6 тысячаў кніжак». – «Ну, я пішу пра вайну, і ўсе хваляць Быкава, але Іван Навуменка таксама добра піша. Чаму на эміграцыі пішуць толькі пра Быкава?» Я кажу, што, відаць, Быкаў падабаецца, дык яго чытаюць і пішуць пра яго, а я асабіста пра вайну ня надта й цікаўлюся чытаць.

«Я, як і вы, перажыў тую вайну, мы ведаем, як было, пісьменьнікі заўсёды могуць прыўкрасіць трошкі...» – «Не, – кажа, – пісьменьнікі перадаюць самую сутнасьць!» Навуменка цяпер добра ўзьняў голас – крычаў, вакол нас пачыналі зьбірацца людзі.

Раптам падыходзіць Пазьняк. Навуменка на яго: «Во, яны давядуць Беларусь, гэтыя Пазьнякі!» Пазьняк глянуў, сківіцы сьціснуў і адышоў, ён не хацеў канфрантацыі. Але Навуменка якраз шукаў канфрантацыі, літаральна шукаў – я спрабаваў яе сьцішыць увесь час. Урэшце Гніламёдаў сказаў Навуменку нешта на вуха, той паспакайнеў і адышоў

Аднойчы, праз год-два, я працаваў у Нацыянальнай бібліятэцы – у залю ўваходзіць Іван Навуменка, мы ледзь ня стукнуліся лоб у лоб, ён глянуў на мяне, нашы пагляды сустрэліся, ён адвярнуўся і выйшаў з залі.

Кантакты зь беларускімі ўстановамі, асобамі

Гэтак мы апынуліся ў Беларусі!

Пасьпяховасьць дачыненьняў зь Беларусьсю безумоўна не вымяраецца толькі прыватнымі кантактамі, хоць мне было прыемна было пазнаёміцца зь людзьмі і ў Магілёве, і ў Полацку, і ў Віцебску, і ў Горадні, і ў Глыбокім, і ў іншых гарадох. Я пабываў амаль ва ўсіх беларускіх унівэрсытэтах, і вельмі шмат дзе мяне папрасілі даслаць эмігранцкую літаратуру. Апрача Нацыянальнай бібліятэкі мы завезьлі сотні кніжак у Горадню, сотні кніжак у Скарынаўскую лябараторыю Гомельскага ўнівэрсытэту. Вельмі шмат кніжак мы завезьлі ў Полацак, рэктар Эрнст Бабенка сказаў, што іх цікавіць эканоміка, і я сабраў кнігі ня толькі беларускіх выдавецтваў, але і расейскіх, калі яны датычылі эканомікі Беларусі, а таксама каля дзесятка кніг іншамоўных: ангельскіх, французскіх.

У бібліятэкі на Бацькаўшчыне БІНіМ завёз некалькі дзесяткоў тысяч кніг, лічу, што гэта было важным крокам да супрацоўніцтва. Апрача таго мы рассылалі кнігі сотням (!) жадаючых.

Вельмі прыязныя працоўныя дачыненьні ўстанавіліся з Нацыянальнай бібліятэкай. Галіна Алейнік і Людміла Рабок былі дзьве асобы, якія гэтаму спрыялі, і мы зь імі часта радзіліся, казалі, чаго не хапае, і мы стараліся гэтае супрацоўніцтва разьвіваць. Дзякуючы Людміле Рабок, мы пазнаёміліся зь Нінай Ватацы, якая ўжо была ў салідных гадох – зрабілі зь ёй фатаграфію: тры пакаленьні бібліятэкароў – Ніна Ватацы, Зора Кіпель і Людміла Рабок.

Наагул я лічу, што кантакт і супрацоўніцтва зь Беларусьсю ў мяне ў першую чаргу прайшло праз кнігі. Мне хацелася, каб беларускія дасьледнікі мелі доступ да літаратуры, гэтую патрэбу яны выказвалі, і я мог яе задавальняць.

ТБМ

Дарэчы, дакладна ня памятаю, але на адной зь першых сустрэчаў з дасьледнікамі і пісьменьнікамі, на якой дыскутаваліся друкі, я пазнаёміўся зь Нілам Гілевічам, з творамі якога я быў добра знаёмы – любіў ягоную паэзію, а цяпер пазнаёміўся зь ім і як з старшынём ТБМ. Я поўнасьцю падзяляў погляды Гілевіча на праваджаньне заканадаўства аб беларускай мове і на эміграцыі як мог падтрымоўваў ТБМ. Дзіўнае супадзеньне: доўгі час адным з тэхнічных рэдактараў «Нашага Слова» – воргану ТБМ – была Валя (Валянціна Восіпаўна) Караткевіч, Зорына кузынка, і часам раніцай мы з Валяй і Зорай ішлі разам аж да друкарні – здавалі ў друк «Наша слова». Зь Нілам Гілевічам шмат гутарылася, я цалкам разумеў ягоны гнеў з таго, што ўлада зрабіла, цэнзуруючы Купалу, а таксама той шкоды, што нанесла цэнзура беларускай літаратуры ды ўзгадаваньню маладых пакаленьняў. Выдатныя працоўныя дачыненьні ў мяне былі і з наступнікамі Гілевіча – Генадзем Бураўкіным і Алегам Трусавым. Гэтаксама я маю вялікую павагу да ТБМ, чыю дзейнасьць я разглядаю як адну з важнейшых у нацыянальным руху. Так на ТБМ я глядзеў ад пачатку, і таму, калі ў сярэдзіне 1990-х гадоў у Таварыстве быў адміністрацыйна-фінансавы крызіс, я дапамог, мабілізуючы для падтрымкі амэрыканска-беларускае грамадзтва.

Зьведваем «глыбінку»

Мы шмат езьдзілі па Беларусі. Першае падарожжа – у Вільню, зь Сяргеем Шупам і Сержуком Сокалавым – было больш турыстычнага профілю. Але пазьней ужо былі паездкі больш спэцыяльныя – найчасьцей з Уладзімерам Арловым, калі ўдавалася нават і ў бібліятэках папрацаваць і сустрэцца зь людзьмі. З Уладзімерам, як і зь ягонай жонкай Валяй, мы добра пасябравалі. Уладзімер быў для нас выдатным гідам па старой гісторыі Беларусі – ён цудоўна апавядаў пра мясьціны, будынкі, падзеі, асобаў. З Уладзімерам мы добра прайшлі практычную школу гісторыі.

Ладна часу я правёў і з прафэсарам Уладзімерам Анічэнкам – рэктар Гомельскага ўнівэрсытэту Шамяткоў даў нам машыну, і мы аб'ехалі Гомельшчыну, заехалі і ў Крычаў, дзе некалі жыла Зора.

Вельмі цікавая была паездка ў Неглюбку, адкуль мы значна раней атрымалі ручнік. Мы знайшлі майстрыху Тацяну Дзеранок, пагаварылі зь ёй, зрабілі фатаграфіі.

Кантакты ў Беларусі былі шырокія, працоўныя і сымпатычныя. Мы апавядалі пра эміграцыю, нашую працу, падкрэсьліваючы, што эміграцыя зь Беларусі – зьява адмоўная, у будучыні яе не павінна быць. Нейкае месца, безумоўна, было адведзена і пэрсанальным

справам. У першую чаргу Зора навязала кантакты зь сям'ёй на Глыбоччыне, у Лужках, у Вяльцы. Ейнай цёці Нюце ў 1997 годзе было 100 гадоў, Зора арганізавала адзначэньне яе юбілею. Цёця Нюта прынесла ўсё, што належала Зорынаму тату – ручнікі, кашулі: «Зорачка, – кажа, – я пяцьдзясят гадоў трымала Лёневы рэчы, цяпер ты іх забірай». На тым сьвяткаваньні была Вольга Іпатава, яна зрабіла з гэтага тэлесюжэт – мы былі ёй вельмі ўдзячныя.

Я, дзякуючы Генадзю Сагановічу, навязаў лучнасьць з Байлюкамі, знайшоў там сям'ю Кіпеляў, свае карані. Мне асабліва спадабалася, што з намі езьдзіла і Алеся – і таксама пабачыла, адкуль ейны род.

Але найбольш разоў мы наведалі Полацак – адбываліся там і канфэрэнцыі, але мы хацелі зьведаць Полаччыну больш падрабязна. Арганізатарам гэтых падарожжаў і нашым гідам па Полацку і Полаччыне быў Уладзімер Арлоў. Часам мы затрымоўваліся ў яго-най сястры Тані. Ясная справа, апрача гістарычнасьці Полацак нас прыцягваў Музэем кнігадрукаваньня і сяброўскімі сустрэчамі творчае інтэлігенцыі. Дарэчы, апрача ўнівэрсытэту, мы падаравалі ладна кніжак і выяву Сьвятой Эўфрасіньні скульптара Дэ Вінчэ музэю, а аб кіраўніцы Цэнтру й Музэю спадарыні Ладзісавай мы захавалі найлепшыя ўспаміны.

Аднак, мушу тут падкрэсьліць – ніхто нам гэтулькі не расказаў аб гістарычнай Беларусі, не паказаў нам шмат таго, што мы ведалі толькі з кнігаў, як Уладзя Арлоў. Шчырая яму падзяка!

Зора апрача сваіх дасьледаваньняў «Трыстана» займалася тэмай «Капітан Сьміт на Беларусі». Капітан Сьміт быў першы губэрнатар Вірджыніі – у 1604 годзе, калі Вірджынія яшчэ была калёніяй, брытанская каралева яго паслала туды губэрнатарам. А некалькі гадоў перад тым ён быў у Рэчыцы – гэта быў ангельскі вайсковец, які біўся з туркамі на Міжземным моры, туркі ўзялі яго ў палон, ён уцёк з палону, праз Дон ішоў на поўнач, каб прайсьці ў Эўропу і дабрацца да Англіі. Так ён прыйшоў у Рэчыцу. Усё гэта ён апісвае ў сваёй кнізе «Сапраўдныя падарожжы», там ёсьць апісаньні Рэчыцы XVI-XVII стст., і Зора апублікавала артыкул пра гэта ў «Запісах».

Мы паехалі ў Рэчыцу, каб знайсьці нешта гістарычнае. На жаль, тамтэйшыя архівы недаступныя, краязнаўчы музэй нічога ня ведае, яны разявілі рот. І пасьля такога расчараваньня – мы былі з Арловым – вырашылі мы пайсьці ў рэстаран, каб паабедаць. А на рэстаране напісана: «Закрыто на обед»! Але гэта яшчэ не канец. Мы мелі машыну, рафік – пазычылі ў Фронце – едзем у бок Магілёва, і нас затрымоўваюць. Як адчынілі машыну – там стаіць бел-чырвона-белы сьцяг. Міліцыянт казырнуў: «Едьте дальше!»

Падчас наведваньняў Беларусі бывалі і сьмешныя мамэнты. У 1995 годзе памежнік на лётнішчы ў Менску пытаецца: што вы ў гэтых скрынках везяцё? Я кажу, што кніжкі. «А, кніжкі...» – і паклікаў

старшага, лейтэнанта. Той раскрывае першую скрынку, а там наверсе кніга Язэпа Малецкага «Пад знакам Пагоні». Дык ён кажа: «Ну вот видишь – лошадка, я же тебе говорил – проверь, что там за литература». І затрымалі тыя кніжкі. Я кажу – гэта для бібліятэкі! – «Где надо, разберемся». Я прашу, каб пазванілі ў Нацыянальную бібліятэку – і праўда, яны пазванілі Галіне Алейнік, яна прыехала на сваёй машыне і сказала: «Мы забіраем, гэта кніжкі для нас». Усё спакойна абышлося, але магла паўстаць канфліктная сытуацыя.

Але было раз і такое, што адзін памежнік, правяраючы пашпарт, пазнаў прозьвішча «Кіпель» і папрасіў, каб я яму прыслаў кнігу «Беларусы ЗША».

Для нас гэтыя падарожжы ў Беларусь былі вельмі прыемныя, мы адчувалі, што наладжваецца кантакт, беларускасьць мацнее ад супрацоўніцтва эміграцыі зь людзьмі на Бацькаўшчыне. Безумоўна, былі патрэбныя і сямейныя кантакты – што маглі, мы дапамаглі матэрыяльна – і яшчэ, гэтыя карані перадаюцца новаму пакаленьню. Цяпер і нашы дзеці, і ўнукі канкрэтна ведаюць пра карані на Беларусі – гэта спрыяе ўсьведамленьню беларускага паходжаньня, збліжае зь Беларусьсю.

Барыс Сачанка і Беларуская энцыкляпэдыя

Мы стараліся так: навязаць кантакты зь людзьмі, з установамі, і калі магчыма – знайсьці, што б нам дапамагло ў беларускай працы. Найбліжэйшыя дачыненьні ў нас усталяваліся з Скарынаўскім цэнтрам, аднак супрацоўнічалі мы і зь іншымі арганізацыямі.

Калі я ў 1993 годзе сустрэўся ў Менску з Барысом Сачанкам, першае, што ён мне сказаў, было: «Вітаўт, дзякую за ўсю літаратуру, якую ты прысылаў – яна была базай кнігі «Туга па Радзіме»«. Я вытлумачу: гэта была працоўная сувязь – я слаў Сачанку на ягоныя запыты – і ня толькі – шмат эмігранцкай літаратуры. Я ведаў, што такая сувязь, хоць і празь літаратуру, прынясе карысьць беларускай справе. Сачанка мне давяраў – каб гэта было супрацоўніцтва, а не прапагандысцкі выкрык.

У часе сустрэчы ў Менску, Сачанка запрасіў нас з Зорай на абед, падараваў нам «Чароўная іголку» Л. Свэна (Лявона Савёнка, Зорынага бацькі) ды запрасіў на сустрэчу з пару дзясяткамі супрацоўнікаў выдавецтва «Беларуская Энцыкляпэдыя». Будучы знаёмым з працай навуковай энцыкляпэдыі McGraw-Hill, я расказаў, наколькі ведаў, пра амэрыканскія энцыкляпэдыі. Дыскусія ў будынку Энцыкляпэдыі цягнулася гадзін пяць, а пасьля з Барысом Сачанкам мы яшчэ дыскутавалі дэталі. З дыскусіяў выявілася: у Менску шмат чаго не хапае ў галіне інфарматыкі – прыходзіцца званіць «туды-сюды», у «цэнтар», у Маскву, каб атрымаць вестку зь першай крыніцы. Непрываб-

ная для новай дзяржавы сытуацыя. Абодва мы прыйшлі да высновы: трэба стварыць у Менску свой даведачна-энцыкляпэдычны цэнтар, мець пад рукой усё, што патрэбна. Я прапанаваў Сачанку сваю дапамогу.

Вярнуўшыся ў ЗША, я праз тыдзень-два выслаў у Менск каля дзясятка англамоўных даведнікаў ды парупіўся, каб азнаёміць зь «Беларускай Энцыкляпэдыяй» такія амэрыканскія выданьні, як Collier's і Encyclopedia Americana. Карацей, мы з Сачанкам зрабілі захады да пашырэньня менскага энцыкляпэдычнага цэнтру. Я таксама прапанаваў Сачанку дапамогу – маю і іншых сяброў БІНіМу – у справах карэкты.

Але – як кажуць, «усе мы пад Богам» – сталася трагедыя: Барыс Сачанка раптоўна памёр. Пасьля я чакаў зь Менску, з выдавецтва «Беларуская Энцыкляпэдыя» нейкага слова, але было маўчаньне.

У першым томе Беларускай Энцыкляпэдыі (1996) маё прозьвішча пададзена ў сьпісе Рэдакцыйнага Савету, але ўжо ў другім томе яго там няма. Відаць, новы галоўны рэдактар палічыў, што ня варта з тымі «белбурнацамі» супрацоўнічаць. Гэтак спроба супрацоўніцтва з БЭ ляснула, як і зьнікла патрэба ў тых даведніках, якія я купляў для гэтага выдавецтва. Шкада, што прапанову супрацоўніцтва не прынялі, бо ў энцыкляпэдыі – асабліва тое, што тычыцца эміграцыі дый наагул англамоўнага матэрыялу, магло б быць больш сыстэматычнае (прыкладам, апісаньне беларускай эміграцыі: у Нью Джэрзі дэтальна, а Нью Ёрк, Агаё, Ілінойс – ні мур-мур!). Магла б быць больш выкарыстаная арыгінальная англамоўная бібліяграфія, а не расейскія пераклады. Напэўна, можна было б пазьбегнуць і непрыемных памылак, накшталт такой: «Уласна Нью Ёрк складаецца з 5 акруг (адм. раёнаў): Манхатан, Бруклін, Куінс, Бронкс, Рычманд (!)» (БЭ, т. 11, ст. 394).

Радзім Гарэцкі

Пачалося супрацоўніцтва і з навуковымі коламі. Разам з Радзімам Гарэцкім, віцэ-старшынём АН Беларусі, і іншымі аўтарытэтнымі навукоўцамі мы падалі заяўку ў Амэрыканскае Геафізычнае Таварыства на дапамогу (першапачаткова на $250 000), каб пачаць распрацоўку Сусьветнага музэю-парку валуноў на тэрыторыі паўночна-заходняе Беларусі. Стварыць такі парк, геалягічна-геамарфалягічны запаведнік – думка, народжаная навукоўцамі Беларусі, я яе цалкам вітаю і падтрымваю, яна базуецца на ўнікальным марэнным ляндшафце краіны. Мэмарандум, перададзены ў Вашынгтон у пачатку 1994 году, патрабаваў тлумачэньняў, абмеркаваньняў. Аднак у сувязі з прыходам да ўлады іншых людзей, не зацікаўленых у беларускай прыродзе і эканоміцы, праект замёр.

Дарэчы, з Радзімам Гарэцкім і ягонай жонкай Галяй у нас склаліся прыяцельскія адносіны: мы былі ў іх гасьцьмі – шмат «аднаўлялі ў памяці», дзе мы бывалі, калі нашы сем'і выселілі зь Менску. Я так рады быў атрымаць ад Радзіма падпісаны ім «Жыцьцёвы меланж» і іншыя кнігі, што перачытваў... вяртаўся ў мінулае... не адзін раз! Дзякую, Радзім і Галя!

Яўрэйская канфэрэнцыя

Паездкі на Бацькаўшчыну мелі на мэце азнаёміцца зь Беларусьсю як мага шырэй, каб пазьней, расказваючы пра Беларусь амэрыканцам або пішучы артыкулы, паказаць, што мы ведаем сёньняшнюю Беларусь.

Падчас адной з паездак я браў удзел у беларуска-яўрэйскай канфэрэнцыі, там было пару ўдзельнікаў і з Амэрыкі, якія цьмяна сабе ўяўлялі, што ў Амэрыцы могуць быць беларусы. Я навязаў зь імі кантакт.

Ніколі не забуду: на гэтую канфэрэнцыю я ехаў трамваем да прыпынку, які каля вуліцы Пуліхава – а канфэрэнцыя адбывалася ў будынку Коласаўскага ліцэю. куды я ад прыпынку ішоў пешкі. Быў дождж, і я вымак да ніткі. На канфэрэнцыю прыйшоў таксама амбасадар Джордж Крол, я яму дапамагаў з тэкстам выступу. А я ў кожнага пытаўся, ці няма ў каго запаснога пінжака, каб мець на сабе нешта сушэйшае.

Сярод удзельнікаў было шмат яўрэяў, пераважна старэйшыя людзі. З адным старым чалавекам у мяне здарыўся кур'ёзны эпізод. Абедалі мы ў іншым месцы, і нас рафікам вазілі ў рэстаран. І вось я заходжу ў рафік, ён пусты, толькі адзін чалавек сядзіць. Я ўвайшоў, а ён мне: «На каком фронте сражались?» А я кажу: «Я з Амэрыкі...» Дык ён – бах дзьвярмі! – і выскачыў, як ашпараны: баяўся застацца сам-насам з амэрыканцам.

Гэты выпадак нагадаў мне падарожжа ў рафіку зь Менску ў Полацак, таксама на канфэрэнцыю – зь Менску ехала каля дзесятка асобаў, і адзін з апошніх пасажыраў меўся быць міністар Стражаў. Дык, даведаўшыся, што ў машыне ёсьць амэрыканцы – я і Зора – Стражаў, асоба міністэрскага ўзроўню, выйшаў і перасеў у іншы рафік.

Гомельшчына, Анічэнка

Добрае ўражаньне пакінула азнаямленьне з універсытэтам у Гомелі. Мы правялі там тры дні з прафэсарам Уладзімерам Анічэнкам, начавалі ў прафэсарскім інтэрнаце. Правялі б і больш, але гэта быў год выбараў, 1994-ы, і Анічэнка рыхтаваўся да выбараў. Ён вельмі прыемна нас прыняў, але хацеў чым хутчэй нас выперці,

каб на дзень выбараў нас там ужо не было. Перад днём выбараў ён нам паказаў свае ордэны, дык я пытаюся – вы, напэўна, іх надзенеце? Ну, не, кажа, але хай будуць недалёка.

Рэктар даў нам машыну, каб мы паезьдзілі па Гомельшчыне, зьезьдзілі ў Крычаў, у Неглюбку. Мы прывезьлі ва ўнівэрсытэт шмат кніжак, і была наладжаная сустрэча са студэнтамі – прыйшло, можа, з сотню студэнтаў. Мы, Зора і я, расказалі, як мы жывем на эміграцыі, пыталіся, ці ня маюць яны якія зацікаўленьні, зьвязаныя з эмігрантамі. Перад пачаткам гэтай сустрэчы я сказаў рэктару, што зраблю ўступнае слова і раскажу, хто я і што я. І ўжо амаль калі я пачынаў гаварыць, мне падсунулі пісульку. Я яе разгортваю, а там напісана: «Нічога не ўспамінайце пра бацьку!» Я й ня думаў нічога пра яго казаць... Пазьней я запытаўся, хто прыслаў гэтую пісульку – выявілася, што гэта Анічэнка. Ён, напэўна, думаў, што я буду расказваць пра савецкія канцлягеры, і спалохаўся. Дарэчы, гаворачы пра Анічэнку – ён хацеў адведаць Амэрыку, бо ён вывучаў мову Скарыны, быў у Лёндане ў Скарынаўскай бібліятэцы і хацеў пазнаёміцца з Тумашам і паглядзець скарыніяну ў Амэрыцы – шчыра хацеў. Я, прызнацца, думаў знайсьці амэрыканскі коледж, які навязаў бы лучнасьць з Гомельскім унівэрсытэтам.. Але прафэсар Анічэнка неўзабаве памёр, і мае кантакты з Гомелем абарваліся.

Чаму я тады зьдзівіўся – і то прыемна зьдзівіўся. Была жвавая экскурсія – мы езьдзілі ў Рэчыцу, у Мазыр, была сустрэча са студэнтамі, што былі ў этнаграфічнай экспэдыцыі. Вельмі дзелавая паездка была ў Ветку, Зора пазьней ім прыслала шмат бісэру, бо там рэстаўруюць іконы, і ім быў патрэбны бісэр. Я зьдзівіўся, кажу: ты ім так шмат абяцаеш, а дзе ты гэта купіш? Але Зора сказала: ты не бядуй. І праўда, у Нью-Ёрку яна пайшла на даўнтаўн і купіла кіляграмы чатыры тых шкельцаў – і сіненькіх, і чырвоненькіх, можа якіх дзесяць колераў. Мы выслалі гэта на ўнівэрсытэт, Анічэнка пазваніў, што атрымаў, і пасьля завёз у Ветку.

Два разы мы наведалі Крычаў, Зора хацела адведаць мясьціны свайго дзяцінства. Пад'яжджаем мы да Крычава на ўнівэрсытэцкай машыне, і раптам Анічэнка кажа: «Ох, я мусіў вас зарэгістраваць...» – «Дзе там, мы ж толькі на пару гадзін?» – «Не!» і спыніў машыну. Зора пайшла шукаць свае мясьціны, я застаўся каля машыны, а ён пабег у міліцыю і сказаў там, што прыехалі амэрыканцы. І гэта ў 1994 годзе, ужо даўно не Савецкі Саюз... Для мяне такое захаваньне прафэсара было незразумелым!

У той час Анічэнка працаваў над трэцім томам «Слоўніка мовы Скарыны», дык ён завёў нас і паказаў, як ідзе праца. Тым часам трошкі расказаў пра сябе, пра сям'ю. У яго было два сыны, адзін інжынер, а другога ён «згубіў». Мы пытаемся – як згубіў? А так, быў у іх на га-

стролях цырк, і як цырк паехаў, то і сын паехаў з тым цыркам. Пасьля ён скончыў цыркавую школу ў Маскве, а цяпер жыве ў Італіі.

Праз год ці два, здаецца, у 1996 годзе, мы з Зорай былі ў Менску, Анічэнка даведаўся, што мы прыехалі і звоніць нам: «Выступае цырк, і там будзе мой сын. Хочаце пайсьці? Колькі білетаў?» Мы кажам: тры – я, Зора і Зорына кузынка Валянціна. Мы, вядома, з тым сынам не былі знаёмыя і сказалі на касе, што хочам пазнаёміцца. Ён прыйшоў. Зора яму падарыла бел-чырвона-белы гальштук. І што вы думаеце – ён выступаў на трапэцыі ў тым гальштуку! І яшчэ памахаў нам рукой.

І яшчэ Анічэнка расказаў, што, на ягоную думку, у часе вайны мы маглі недзе сустракацца. Ён быў на два гады старэйшы, але ён быў у калгасе, і яму даручылі адагнаць 150 коней ад нямецкага наступу. Дык ён гэтых коней гнаў аж да Арла і ў Арле паіў гэтых коней у Орліку. Такое ў Арле бывала – людзі зь Беларусі былі з коньмі і часта нам, асабліва мне, бо я гаварыў па-беларуску, коней давяралі накарміць і напаіць. Можа, там быў і Анічэнка?

Прэзыдэнцкія выбары 1994 году

У тым годзе я ў Беларусі быў ад красавіка да канца чэрвеня. Адбылося пару сустрэчаў з інтэлігенцыяй, была канфэрэнцыя ў Ісламы (мы былі там зь Янам Запруднікам), я сустракаўся з скаўтамі (арганізаваў сустрэчу Косьця Хадыка), а ў вольны ад сустрэчаў час бываў у тэатры, у бібліятэцы ды, калі магчыма, бываў на перадвыбарчых мітынгах. Адзін зь мітынгаў у раёне вуліцаў Бялінскага і Коласа сабраў пару тысячаў чалавек, галоўным выступоўцам быў Заблоцкі. На мяне мітынг зрабіў вельмі пазытыўнае ўражаньне – гадзіны тры Заблоцкі даводзіў і тлумачыў, чым новая ўлада будзе розьніцца ад папярэдняй.

Перад выбарамі мы былі ў Глушы, дзе рыхтавалася адкрыцьцё помніка Алесю Адамовічу. На ўсіх установах віселі бел-чырвона-белыя сьцягі. Прадстаўнік мясцовай улады – прыемны, дзелавы малады чалавек – пасьля адкрыцьця запрасіў нас на прыняцьцё з гэтай нагоды. І вось усе людзі там – і з самой Глушы, і зь нейкай суседняй фабрыкі – усе былі за Лукашэнку. Цяпер, кажуць, у нас 600 чалавек беспрацоўных, а калі Лукашэнку выберам – ва ўсіх будзе праца. Калі мы з Запруднікам пачалі гаварыць з начальствам, дык яны кажуць, што тут няма чаго й казаць – яны будуць толькі за Лукашэнку! А гаварылі па-беларуску...

Незадоўга перад тым адбыўся «тэатральны спэктакль» пад Лёзнам, і мы з маім гаспадаром – Зорыным сваяком Мікалаем Караткевічам – якраз тады паехалі на аўтамабільны базар у канцы вуліцы Коласа, там

пагаварылі з адным, з другім – усе ў адзін голас казалі, што Лукашэнку трэба выбіраць, бо яго нехта хацеў забіць, на яго быў замах, і мы ведаем, хто за гэтым стаіць! Мікалай спытаўся: хто ж? О, кажуць, тут могуць быць і амэрыканцы замяшаныя! Карацей, расказвалі розную фантастыку. Але маркі Лукашэнкі ішлі ўгару.

Лукашэнкава плынь, на мой пагляд, вырвалася наперад – але ж ніхто маёй апініі не пытаўся. У значнай меры для сваіх высноваў я стасаваў амэрыканскія крытэрыі да выбараў у Беларусі. Галоўныя факты былі – папулізм Лукашэнкавай праграмы і раздробленасьць нацыянальна сьведамага электарату – яны адыгралі асноўную ролю ў перамозе Лукашэнкі. Так сталася. Але зь Беларусьсю мы не разьвіталіся – прадаўжалі адведваць. Думалі: будзем гутарыць і зь не зусім «нацыянальным», але выбраным кіраўніцтвам.

Другі кангрэс беларусістаў

Другі кангрэс беларусістаў праходзіў у 1995 годзе і адбываўся ў Акадэміі Навук. Памешканьне было ня надта прыдатнае. У мяне застаўся ніякаваты ўспамін. На кангрэсе быў прафэсар Том Бэрд, прыехаў таксама Курт Вулгайзэр, і ягоная кандыдатура была запрапанаваная для абраньня ў кіраўніцтва асацыяцыі. Менскія дасьледчыкі пачалі выступаць супраць – а, ён жыве далёка, а што ён там ведае, а Вулгайзэр сядзіць і ўсё разумее. Я мусіў выступіць і сказаць, што я яго рэкамэндую, я зь ім супрацоўнічаў, ён добрае ведае Беларусь – і ў выніку яго выбралі. Проста публіка ня ведала прозьвішча, зацікаўленьняў. Але ён не пакрыўдзіўся, прыняў гэта нармальна. «Вітаўт, – кажа Курт, – я стараюся нешта зрабіць для беларускай справы, яны проста не разумеюць». Я кажу: «Слухай, палова гэтых людзей ніколі ня чула твайго прозьвішча, дык ты не пераймайся». Курт нам у Злучаных Штатах вельмі карысны, ён даўгі час быў у Гарвардзе, быў старшынём Амэрыканскай асацыяцыі беларусістаў і заўсёды выступаў на беларускія тэмы. Прычым ён добра знае мову, ён рабіў сваю тэзу на польска-беларускім памежжы на Беласточчыне, так што ён поўнасьцю кваліфікаваны, каб быць у кіраўніцтве асацыяцыі, і ён поўнасьцю сваё абраньне апраўдаў.

Рэфэрэндум, парваньне сьцяга

Кангрэс праходзіў у травені – у тым самым часе, калі адбываўся рэфэрэндум аб мове і нацыянальных сымбалях. Аднае раніцы на кангрэсе разышлася вестка, што быў зьняты сьцяг з прэзыдэнцкай адміністрацыі і што Іван Ціцянкоў рваў яго на кавалкі і падпісваў іх. На мяне гэта зрабіла цяжкое ўражаньне, першы раз у жыцьці я меў такі

дэпрэсіўны настрой. Мы былі спыніўшыся ў гатэлі каля трактарнага заводу, дык мне не хацелася адтуль нікуды выходзіць – нагэтулькі я быў прыбіты захаваньнем новага кіраўніцтва. Нідзе ў цывілізаваным сьвеце няма такога, каб рвалі дзяржаўны сьцяг. Гэта была проста біялягічная злосьць на апанэнтаў, у сьцягу Ціцянкоў уяўляў людзей, якіх ён гэтак сымбалічна зьнішчаў.

У ЗША я на паседжаньні ў Дзярждэпартамэнце паказваў фотаздымкі, як рвуць той сьцяг – амэрыканскія службоўцы амаль не давалі веры! Амэрыка ўскладала надзеі, што Беларусь будзе нармальная дзяржава, тым больш, што беларусы здалі атамную зброю – хоць і не зусім заходняя дэмакратыя, але будзем разьвівацца. А тут раптам такое дзікунства! І пра беларусаў зарадзіўся пагляд, што мы яшчэ нявырабленыя, непарлямэнтарны народ, «дзікія людзі». Было пару артыкулаў, здаецца, нават адзін у New York Times, што зь Беларусі можа стацца моцная і жорсткая дыктатура, што гэты народ яшчэ будзе цярпець. Так яно і сталася.

Адно толькі было суцяшэньне, што ў Менску тады цяжкое ўражаньне было ня толькі ў мяне, але і ў іншых удзельнікаў кангрэсу і тысячаў менчукоў. На другі дзень пасьля гэтага выпадку мяне запрасілі ў Акадэмію навук, здаецца, у Інстытут гісторыі, і я пачаў сваё выступленьне, сказаўшы, што цяпер мы на эміграцыі і вы тут, хто думае нацыянальна, фактычна апынуліся ў адным лягеры. Бо парваньне сьцяга – гэта аплявуха той частцы беларусаў, той частцы грамадзтва, якая падтрымоўвала гэты сьцяг. І сам факт, што нешта рвецца, топчацца – гэта вельмі празрысты, злосны акт. Мяне падтрымала тады Галіна Сяргеева і амаль увесь пэрсанал інстытуту.

Эміграцыя Пазьняка і Навумчыка

А тады яшчэ, у 1996 годзе на эміграцыю выехалі Пазьняк і Навумчык – у Менску была вялікая дэманстрацыя, і пасьля гэтай дэманстрацыі яны зьехалі. Празь нейкі час яны зьявіліся ў нас, сказалі, што выехалі таму, што наступ Лукашэнкі і цёмных сілаў будзе прадаўжацца, і што яны хочуць нейкі час затрымацца на Захадзе. Яны выбіралі, дзе будуць заставацца – у Польшчы, у Брытаніі ці ў ЗША. І нехта ім падказаў, што, прыехаўшы ў ЗША, можна не прасіць амэрыканскага грамадзянства, а атрымаць дарожны дакумэнт, зь якім можна езьдзіць па сьвеце. Адначасна яны вырашылі падаць прашэньне на атрыманьне палітычнага прытулку. Я ў гэтым удзельнічаў, бо я быў іхным перакладчыкам і дапамагаў запаўняць анкеты з заявай. Пасьля паданьня заявы імігрыйныя ўлады выклікаюць на інтэрвію – і я і з адным і з другім хадзіў у якасьці перакладчыка.

Яны падавалі на прытулак у Вашынгтоне, бо там гэта ідзе значна

хутчэй. Там задавалі пытаньні – чаму вы думаеце выяжджаць, яны сказалі чаму: бо ідзе наступ на дэмакратычныя сілы, і калі яны там будуць, то ня выключана, што іх заб'юць. Гэта было асноўным аргумэнтам пры атрыманьні прытулку.

Працэс цягнуўся два тыдні, пасьля чаго іх паклікалі ў Аддзел імігрыцыі і абвясьцілі рашэньне. Але за гэтыя два тыдні я адчуў, што тут існуе трохкутнік: Дзяржаўны дэпартамэнт, беларуская амбасада і расейскае консульства, якому амэрыканскія ўлады паведамілі пра гэтую справу – у тым сэнсе, што яны схільныя даць прытулак, але беларускія ўлады будуць супраць, а Расея і Беларусь саюзьнікі. Расейцы занялі пазыцыю чаканьня, не казалі ні так, ні не, а пасьля сказалі, што салідарызуюцца зь беларускімі ўладамі.

Пра гэтую справу шырока паведамлялася ў прэсе, і на абвяшчэньне рашэньня аб прытулку ў кангрэсавы будынак прыйшлі больш за сотню журналістаў. Мы прыйшлі туды з Пазьняком і Навумчыкам і пачулі рашэньне аб тым, што ім даецца палітычны прытулак у Злучаных Штатах. Была прэс-канфэрэнцыя, я адказваў па-ангельску, некаторыя пытаньні былі па-расейску. Карацей, справа была досыць гучная, і гучнай зрабілі яе амэрыканцы: Пазьняк у іх, яны яго прымаюць, а што скажуць іншыя – іх мала тычыцца.

Беларускія ўлады прыслалі ноту, якая была пададзеная кіраўніку аддзелу Ўкраіны, Беларусі і Малдовы ў Дзярждэпартамэнце Сігэлу, што яны супраць гэтага рашэньня. Амэрыка поўнасьцю гэта ігнаравала.

Тут трэба сказаць, што калі Пазьняк падаў заяву на прытулак, яна пайшла ў імігрыцыйнае ведамства, а ў другім ведамстве – па абароне і правох чалавека – мне сказалі: чаму ж вы нам не паведамілі, мы б дапамаглі, але не хвалюйцеся, Пазьняк усё атрымае. Але каб прысьпешыць гэта ўсё, кліўлэндзкія беларусы – а Пазьняк адразу паехаў у Кліўлэнд – сказалі, што зьвернуцца да свайго кангрэсмэна. І сапраўды, кангрэсмэн Гоўк – рэалізоўваючы сваё права – заявіў у Імігрыцыйным камітэце, што ён хоча, каб Пазьняку далі прытулак. У выніку ўсіх гэтых захадаў на працягу 12 дзён прытулак быў дадзены.

Амэрыканскія беларусы ўспрынялі гэтую падзею пазытыўна – цяпер Лукашэнка Пазьняка ня зьнішчыць. Але з другога боку лічылі, што як ён выедзе, дык Фронт ня будзе такі дынамічны і дзейны. Так яно й атрымалася.

І яшчэ эміграцыйнае грамадзтва ўспрыняло дадатна, што і Пазьняк цяпер эмігрант, ён разам з намі і мы поўнасьцю, стопрацэнтна яго падтрымваем. Эміграцыя дапамагла выдаць па-ангельску і па-беларуску кніжку пра Курапаты, яна вельмі шырака разышлася. Амэрыканскія беларусы дапамаглі і выдаць і распаўсюдзіць кнігу і наагул спрыялі Пазьняку. Але з другога боку – ніхто ня думаў, што гэта надоўга, думалі, што Пазьняк вернецца, што рэжым Лукашэнкі

скажа: яны нікога не саджаюць за палітычныя пераканаьні – так лічылі ў эміграцыі і думалі, што на Бацькаўшчыне Пазьняк значна больш патрэбны.

Прыезд Пазьняка бясспрэчна дапамог пашырэньню ў ЗША інфармацыі пра Беларусь – у той час ён быў ведамы палітык, яны з Навумчыкам зладзілі некалькі прэс-канфэрэнцыяў. Гэта завастрыла беларускае пытаньне ў мэдыях – відаць, у Беларусі ня ўсё так проста, калі адтуль уцякае палітычны лідэр.

Пазьней я кантакт абсалютна страціў, Пазьняк езьдзіў у Эўропу, жыў то ў Эўропе, то тут. Навумчык неўзабаве зьехаў у Прагу.

Думкі аб працы ў Беларусі

Безумоўна, хада палітычных падзеяў у Беларусі не прадказвала нацыянальнага разьвіцьця: аналізу гісторыі, ужываньня беларускай мовы, вывучэньня эміграцыі. Зноў вярнулася старое – «мы і вялікі рускі народ», «мы – адна дзяржава», «руская культура вялікая, а мы – лапцюжнікі, павінны вучыцца ў старшага брата». Пачалася дэбеларусізацыя. Кіраўніцтва, гледзячы ў рот «бацьку», выкараняла беларускасьць, зачыняла школы. Тым часам сам новаабраны кіраўнік у два вокі глядзеў, як «скокнуць» на ўсход і стацца новым уладаром ад Брэсту да Ўладзівастоку.

Але нягледзячы на такую беспрасьветнасьць мы з Зорай усё ж не адмаўляліся ад думкі працаваць у Беларусі.

Навязаўшы добрыя кантакты зь Беларусьсю – асобамі і ўстановамі, – мы ніяк не маглі адважыцца, выбраць момант, каб спытацца – а ці маглі б мы прыехаць працаваць у Беларусь? Так, працаваць: нешта выкладаць або аналізаваць, парадкаваць. Мы ўжо мелі цьвёрдую адмову ў пытаньні набыцьця кватэры ў Менску, і адносна працы, аб якой мы думалі-марылі, пытацца не наважваліся. Першую такую спробу мы зрабілі ў Гомелі – спыталіся ў прафэсара Анічэнкі: «Можа, вам патрэбная працоўная дапамога? Мы гатовыя – вам гэта нічога ня будзе каштаваць!» Анічэнка нас адразу зразумеў і адказаў прыблізна так: «Калі б вы былі студэнтамі, можа й знайшлося б для вас што рабіць. Але «працы» ў нас няма, ды я з гэтым і вазіцца ня буду!» Так наша першая спроба «праляцела». Другая спроба з працай была зробленая, калі мы спыталіся пра магчымасьці ў Ядзьвігі Грыгаровіч, тадышняга рэктара Ўнівэрсытэту Культуры ў Менску. Яна нас выслухала, шмат аб нас, нашых прафэсійных характарыстыках запісала (мы гутарылі на гэтую тэму гадзіны дзьве!) і сказала: «Я папытаю вышэй, гэта ня так проста. Але мы аб гэтым яшчэ пагутарым!» Паўторнай гутаркі так ніколі й не адбылося, хоць мы з спадарыняй Грыгаровіч сустракаліся дзесяткі разоў.

Успаміны падмяняе рэальнасьць…

Вось я збольшага накідаў тое, што помніцца – жылося зь Беларусьсю, Беларусь была ў цэнтры пачуццяў, дзеяньняў, жыцьця. Цяпер падыходзім да пункту, адкуль успамінаць больш няма патрэбы – да рэальнасьці.

Чаканьне, ці то набыць кватэру, ці атрымаць працу ў Беларусі (без аплаты – працаваць, каб стварацьі) было безвыніковае, адказам было маўчаньне. Людзі, ад якіх я спадзяваўся рашэньня, згоды, – адышлі ўбок, «зьніклі». Жорсткая рэальнасьць паказвае: Выкіньце з галавы думку ад перасяленьні ў Менск, аб працы там. Добра, што хоць бы «дазваляюць» глядзець на Беларусь! А шкада – мы яшчэ шмат чаго маглі б зрабіць карыснага для Бацькаўшчыны. Розумам гэта цяжка ахапіць – чаму эмігрантам нельга працаваць у Беларусі для Беларусі? Але так ёсьць. І тым ня менш аддавацца роспачы няма патрэбы. Можна прадаўжаць жыць і дзеіць, як жылося і дзеілася да гэтага часу: працаваць для Беларусі па-за Беларусьсю. Гэтак і будзе!

Па-за Беларусьсю, для Беларусі.

Паказальнік імёнаў

Абрамава Надзея — 96
Абрамчык Анатоль — 409, 410
Абрамчык Мікола — 206, 207, 351–354, 390
Адамовіч Алесь — 280, 281, 289, 425
Адамовіч Антон — 19, 84, 95, 97, 103, 104, 164, 170, 211, 275–277, 279, 289, 301, 305, 307, 310, 311, 319, 321, 322, 328, 329, 332, 339, 350, 385, 394
Адамчык Вячаслаў — 280
Азарка Юрка — 385
Азбукін Мікола — 12, 14, 16–18
Айзэнштат Пётр — 262, 263
Акановіч Аляксандар — 100, 102, 104–106, 119, 167
Акановіч Ганна — 104
Акінчыц Фабіян — 99
Акіншэвіч Леў — 304, 307
Актан Міхаіл — 70
Акула Кастусь — 321, 325
Акуліч Адам — 325, 332, 394
Алейнік Галіна — 278, 418, 421
Алексіевіч Сьвятлана — 268
Алешчанка, украінец з Харкава — 152
Аляксандраў Е. — 243
Аляксееў Алёшка — 77, 117
Андрусышын Багдан (Данчык) — 388
Андрусышын Юрчык — 318
Андрусышына Юля — 301
Андэрс Уладзіслаў — 244
Андэрсэн Ганс Крыстыян 219
Анічэнка Уладзімер — 419, 423–425, 427, 428
Антановіч Антон — 286
Антонава Тацяна — 293
Аня, Алесіна сяброўка — 262
Арлова Любоў — 42
Арлова Таня — 420
Арлоў Уладзімер — 419, 420
Арсеньнева Натальля — 97, 134, 166, 172, 279, 305, 309–311, 340, 393, 394
Арцішэнка Жорж — 330, 385
Арцыменя Дзьмітры — 414, 415
Арцюх Мікола — 201
Арцюх Язэп — 175, 251
Арэхва Вольга — 397, 402
Арэшка Аляксей — 208, 212, 394
Астор Джон Джэйкаб — 248
Астроўскі Мікалай — 44
Астроўскі Радаслаў — 138, 207, 327, 346, 347, 350–354
Асьлюк Віктар — 5
Асэльбэргс Эцьен — 194, 220
Б'юкэнэн Патрык — 356
Бабарэка Адам — 19
Бабенка Эрнст — 418
Багамолаў Алег — 340
Багдановіч Аляксандар — 165
Багдановіч Максім — 214
Багровіч Андрэй *гл.* Тумаш Вітаўт
Багушэвіч Францішак — 90, 91, 408, 409
Балерыні Катэрына — 251, 263, 302
Бануты Карл — 377, 378
Банькоўска Моніка — 404
Барадулін Рыгор — 280, 288
Баранавых Сымон — 275
Барбіеры — 303
Барскі Алесь *гл.* Баршчэўскі Аляксандар
Барсук Аркадзь — 227
Барташэвіч Юрка — 235
Бартуль Вера — 385
Бартуль Ганна — 385
Баршчэўскі Аляксандар (Барскі Алесь) — 251, 280, 340
Барыс «Юда» — 32
Баскін Борка — 65
Бахар Галіна — 376
Бахар Міхась — 355, 384
Бедны Дзям'ян — 59
Белакоз Алесь — 413
Белямук Міхась — 251

Бжэзінскі Зьбігнеў — 356
Беластоцкі — 159
Блюхер Васіль — 36
Блюхер Вася, сын — 36
Божка Вера — 235, 343
Бон Джордж — 244–247, 252
Бортнік Слава — 358
Бортнік Уладзімер — 251
Брага Сымон *гл.* Тумаш Вітаўт
Бранавіцкая — 94
Брукс Біл — 302, 303
Брынза — 155
Брэдлі Біл — 367
Брэдфард Джоэн — 251
Брэчка Юзя — 169
Будзіловіч Мікалай — 150
Букацкая Марыя — 96
Булат — 279, 280
Булат Барыс — 279
Бураў Толя — 95
Бураўкін Генадзь — 280, 281, 288, 419
Бута Алесь — 169, 170, 174
Бухта Мікалай — 8
Буш Бэрнард — 374
Буш-малодшы Джордж — 367
Буш-старэйшы Джордж — 362, 363, 366
Быкаў Васіль — 396, 397, 399, 417
Бэнэдыкт, папа — 146
Бэрг Морыс — 257
Бэрд Том — 280, 322, 329, 331, 333, 335, 340, 378, 396, 402, 409, 426
Бэрн Брэндан — 370–372, 375, 376, 378, 386–388
Бэрнштэйн С. — 306
Бэтц Элізабэт — 340
Бяганская Ядзя — 9, 35
Бядуля Зьмітрок — 87, 122
Вайтовіч Андрэй — 128
Вайцяхоўскі Кастусь — 164, 169, 232
Вайцяхоўскі Ксэнафонт — 158, 347
Варатніцкая дачка — 85, 98
Варатніцкая Маня — 85
Варатніцкая пані — 85
Варатніцкая Рэня — 85
Варатніцкая Чэся — 85
Варатніцкая Яня — 85, 125
Варатніцкі, «татусь» — 85, 98, 125
Варатніцкі Юзік — 85
Варатніцкія — 8, 83, 85, 86
Варонка Язэп — 323, 363, 412
Васілеўская Ванда — 50
Васілёнак — 273, 274
Ватацы Ніна — 266, 418
Ваўчкі — 85, 86
Ваўчок Лукаш — 8, 9, 84
Ваўчок Марфа Кандрацеўна — 5, 8, 9, 129, 406, 407
Ваўчок Сярожка — 9, 103, 125
Ваўчок Юзік — 8
Вачнадзэ Леа — 144
Вінакураў — 412
Вініцкі Алесь — 154, 158, 159
Віціг, прафэсар — 180
Віцьбіч Юрка — 164, 210, 322, 394
Войтанка Віктар — 181, 307
Войтанка Сьцяпан — 180, 181
Волкаў Валянцін — 108
Вострыкаў Цімох (Міхась) — 206, 215, 216, 210, 214
Вулгайзэр Курт — 426
Вэк Фрэд — 381–384, 387, 388
Вэксьлер Пол — 272
Вэнс Сайрус — 356
Вэрн Жуль — 44
Вярбіцкі Аўген — 307
Вярбоўская Вацлава — 409
Вярцінскі Аляксандар — 107, 284
Вярцінскі Анатоль — 288
Вярэніч Вячаслаў — 397
Г'юз Лінда — 340
Гадлеўскі Вінцэнт — 88, 94, 102
Гаеўскі — 142, 143
Гайнц — 151–153, 157
Галожын Герасім — 349
Галяк, сястра Лявона — 136
Ганчар К. — 101
Ганчарэнка Галіна (Руднік) — 104, 143, 176–179, 181, 182, 230, 232
Ганько Міхась — 138
Гапонаў — 29, 30
Гарбачоў Міхаіл — 408
Гарбінскі Юрась — 251, 330, 332, 333
Гарбузік Ніна — 107, 128

Гардзіенка Алег — 251, 324, 330, 333
Гардзіенка Натальля — 330, 333
Гарошка Леў — 211
Гарошка Мікола — 305, 307
Гарошка Расьціслаў — 366
Гарун Алесь (Алесь Прушынскі) — 12, 287
Гарэцкая Галіна — 422, 423
Гарэцкі Гаўрыла — 414
Гарэцкі Радзім — 251, 413, 422, 423
Гвозьдзік — 53
Геніюш Ларыса — 266, 319, 388
Герцых — 170
Гётэ Ёган Вольфганг — 95
Гілевіч Ніл — 419
Гітлер Адольф — 79, 95, 96, 141
Гітры Саша — 212
Глебка Пятро — 274–277
Глік — 262
Глыбінны Ўладзімер *гл.* Сядура Ўладзімер
Гніламёдаў Уладзімер — 417, 418
Гогаль Мікалай — 44, 45
Гой Пятро — 272, 345
Горак Сьцяпан — 272, 338
Горкі Максім — 44
Готбэрг Курт, фон — 100
Грамада Тэд — 339
Грас Гюнтэр — 146
Грыгаровіч Ядзьвіга — 428
Грымстэд Патрыцыя — 271
Грын Бары — 300, 301
Грынкевіч Стась — 145
Грыцкевіч Анатоль — 396, 397, 401
Гужон Аляксандра — 251
Гукоўскі Іван — 162
Гуткоўскі Язэп *гл.* Плашчынскі Ізыдар
Гуцька Ўладзімер *гл.* Дудзіцкі Уладзімер
Гэндэрсан Джэймс — 283, 284
Гюго Віктор — 44
Гюлентопс Франс — 216, 217, 223
Дабранскі Леў — 355
Дабрынін Анатоль — 364
Данілюк Барыс — 296
Данчык *гл.* Андрусышын Багдан
Данэй Джозэф — 233, 238
Дапкюнас Андрэй — 288
Даўгаленка Віктар — 214
Дашкевіч Сьцяпан — 290
Дворнік Валеры — 358
Дземчанка Мікола — 148, 150
Дзеранок Тацяна — 281, 419
Дзеружынскі Францішак — 412
Дзімітраў Тодар — 323
Дзю Банэ (Дзю Манэ) — 178
Дзюма Аляксандар — 44
Дорыс Уаніта — 285
Доўл Робэрт — 363, 364, 366, 379, 393
Доўнар Вася — 101
Доўнар-Запольскі Мітрафан — 124
Дубавец Сяргей — 5
Дубовік — 181
Дуглас Кэрк — 370
Дудзіцкі Уладзімер (Гуцька Ўладзімер) — 149, 322, 329
Дуня — 60
Дутка Уладзімер — 227
Дутко-Рагалевіч Ірэна — 337
Дыкенштэйн Андрэй Міхайлавіч — 221, 222
Дынглі Джым — 251, 340
Дэ Вінчэ — 420
Дэбэзьё — 218
Дэбэцюн П'ер — 194
Дэйвіс Норман — 401
Дэрвінскі Эдвард — 364, 366
Езавітаў Кастусь — 106
Ёська Міхаіл — 411
Жалязоўская Зоя — 186, 214
Жамойда Сымон — 151, 152, 154, 155, 227, 232, 235, 301, 349
ЖамойдаТацяна — 235
Жаромскі Валодзя — 180, 181
Жарскі Платон — 97
Жарэс Мікалай — 29
Ждановіч Маня — 131
Ждановічы — 85
Жолудзеў Ігар — 277, 278
Жук Жэня — 111, 112, 120
Жук Ларыса — 111
Жук Серафіма — 111, 120, 123
Жук-Грышкевіч Вінцэнт — 244, 354

Жук-Грышкевіч Раіса — 251, 337
Жучка Янка — 169, 174, 219
Жылік Міхась — 189, 190
Жылка Ўладзімер — 82, 84, 266
Жытка Янка — 186, 196, 354
Заблоцкі Ўладзімер — 425
Задняпроўскі — 39
Зайка Віталь — 358, 405
Запарожац Саша — 95
Запольскі Коля — 168
Запольскі Чэсік — 108
Запруднік Ян — 4, 174, 205, 208, 211, 215, 251, 274–277, 281, 282, 289, 291, 301, 306–309, 313, 319, 321, 322, 324, 325, 329, 331, 332, 338–340, 345, 349, 364, 383, 385, 386, 388, 391, 393, 394, 396–399, 402, 403, 425
Запруднік Вера — 385
Запруднік Ніна — 385
Запруднік Надзя (Кудасава Надзя) — 301, 325, 330, 332, 337, 384, 388
Заруцкі Ваня — 183
Захарка Васіль — 323
Золак Янка — 164, 320
Зубараў Лявон — 358
Зубкоўская Марыя Васілеўна — 5–12, 14–16, 18–24, 26–32, 34, 35, 37, 38, 40, 41, 45–49, 51–57, 60–62, 64, 65, 67–69, 71, 72, 74–77, 79–85, 88–91, 97, 101, 111, 118, 124, 125, 129, 130, 132, 133, 136, 138–141, 152, 154, 155, 199–201, 220, 227–229, 231, 232, 274, 275, 295–297, 300, 303, 346, 390, 407
Зубкоўская Насьця — 30, 48
Зубкоўскі Васіль Паўлавіч — 5–9, 18, 35, 38, 48, 49, 55, 56, 67, 69, 74, 75, 77–79, 81, 85, 86, 129, 406, 407
Зубкоўскі, дзедаў брат — 6, 38
Зубкоўскі Іван — 115
Зубкоўскі Мікалай — 6, 7
Зубкоўскі Павел — 7
Зуй Міхась — 251
Зымэр Сьцяпан — 272, 318
Зынгенвальд — 236
Зэмгаліс — 169
Іваноўскі Вацлаў — 99
Ігнатовіч Міхаіл — 172, 349
Ігнатоўскі Ўсевалад — 92, 108, 340
Ільлюшын Міхаіл — 30, 50. 54
Іпатава Вольга — 251, 293, 331, 420
Ісаевіч Яраслаў — 413, 415
Кабыш Іра — 137
Кабыш Сымон *гл.* Кандыбовіч Сымон
Каваленка Яўціхі — 150, 152
Кавалеўскі Аўген — 108, 309
Кавалеўскі Валера — 358
Кавалеўскі Жэнька — 103–105, 108, 128
Кавалёў Лёўка — 237
Кавыль Міхась — 275, 321
Кажуры — 345
Казак Ігар — 320
Казакоў Сяргей — 291, 292
Казлоўскі Ўладзіслаў — 99
Казыра Леанід — 293
Казько Віктар — 280
Кайзэр Кумэш — 303
Кайка Сяргей — 183
Калбаска Аляксандар — 251
Каліна Юрка — 251
Калінка Мікола — 216
Каліноўскі Кастусь — 5
Калоша Кастусь — 251
Калубовіч Аўген (Каханоўскі Аўген) — 137–141, 158, 164, 320, 349
Калупайла Сьцяпан — 287
Кальніцкі Міхась — 210, 215, 216
Калюцік Янка — 180, 181
Камінскі Браніслаў — 126
Канарчук Іван — 236, 237
Канарчук Лёўка — 237
Канарчук Маруся — 237
Канарчук Оля — 237
Канарчукі — 239
Кандыбовіч Сымон (Кабыш Сымон) — 137–140, 211, 306
Канінгхэм Сара — 256
Кант Эмануіл — 136
Капернік Мікалай — 266
Каптуровіч Алесь — 296
Карабанава Валя — 23

Карабанава Соня — 23
Каракулька Ўладзімер — 138
Каралевіч Пятро — 112–114
Карамзін Мікалай — 288
Карась Лявон — 169, 230, 390, 391
Караткевіч Валянціна — 419, 425
Караткевіч Мікалай — 425
Карман Борка — 32, 63
Карніловіч Сяргей — 251
Карпенка Дзімка — 103, 104, 122, 128
Карпенка Марыя — 288
Карпінскі-Карпейка — 140
Карповіч Алесь — 198, 351
Карповіч Тамара — 169, 183
Карскі Яўхім — 288
Картэр Джымі — 356, 367, 380, 388, 393
Касоўская (Лапіцкая) Алена — 330
Касоўская (*тс* Красоўская) — 287
Касьпяровіч Саша — 105, 106
Касьцюк Рэня — 384
Касяк Іван — 327
Каўэлярт Рабэр ван — 202, 205–207, 218, 222, 351
Каханоўская Яніна — 138, 393, 394
Каханоўскі Аўген *гл.* Калубовіч Аўген
Кацнэльсон Навум — 322, 329
Качан Якаў — 273, 284
Квасіновіч Галіна — 251
Кейзэн Фэлікс — 222
Кенэды Тэд — 356
Кіпель Алеся — 4, 238, 239, 267, 281, 295–300, 313, 343, 344, 358, 385, 398, 400, 420
Кіпель Андрэй — 6
Кіпель Зора (Савёнак Зора) — 3, 4, 7, 101, 107, 117, 127–129, 135, 136, 157, 160, 169, 176, 177, 179–183, 187, 191, 197, 198, 201, 206, 209, 212, 215–218, 220, 222–224, 228–232, 234, 238, 239, 241, 247, 250, 251, 263, 265–267, 272, 277, 278, 281, 282, 285, 292, 295, 297–299, 301, 303–311, 313, 319, 321–323, 329, 331, 338, 340, 343, 345, 362, 368, 374–376, 383, 385, 388, 393, 396, 397, 399, 400, 402–404, 406, 408–411, 417–421, 423–425, 427
Кіпель Лёрэйн — 267, 300
Кіпель Маланьня — 6
Кіпель Марыя — 3
Кіпель Мікіта — 6
Кіпель Фядора — 5
Кіпель Юра — 4, 239, 267, 281, 295–301, 344, 385
Кіпель Яўхім — 3, 5–7, 9–12, 14–20, 22, 23, 26, 27, 49, 60, 61, 65, 72–82, 84, 85, 88, 89–91, 97, 101, 111, 115, 116, 118, 119, 129–134, 136–139, 141, 142, 146, 148, 151, 152, 154–158, 199–201, 227–229, 231, 232, 295, 346, 347, 349, 414, 424
Кіраў Сяргей — 15, 16
Кірылава Валя — 34
Кірылаў Пецька — 32, 34, 71
Кірылік Сьцяпан — 169, 170, 174
Кісель Пётра — 90, 91, 92, 93, 94, 101, 102, 128
Кісель Сьцяпан — 169
Кіслы Кастусь — 198
Кісынджэр Генры — 355, 364
Кішчанка Аляксандар — 288
Клакоцкі Марат — 358
Клачоўскі Ежы — 396, 398, 401, 413–416
Клёнаў Андрэй — 280, 281, 289, 394
Клінцэвіч Даніла — 114, 162
Клішэвіч Уладзімер — 320
Клэтніекс — 175, 176
Козак Майкл — 294
Козьлік Янка — 106
Колас Якуб — 87, 122, 266, 392, 395, 417
Коль Гельмут — 146
Кольба-Стагановіч Тамара (Навагрудчанская Тамара) — 337, 374, 384, 385, 394
Комар Анатоль — 85, 97, 108, 148
Конан-Дойль Артур — 58
Корэсар Віктар — 285
Косараў Базыль — 320
Косэль — 180

Кошалева Лялька — 128
Красоўская Тацяна — 358
Краўчанка Пятро — 288, 324, 409, 411
Крол Джордж — 294, 423
Крол Джон, кардынал — 362
Кругловіч Мікола — 166
Круп Боб — 264
Круцько — 215, 216
Крушына Рыгор (Казак Рыгор) — 320
Крэймэр — 143, 347
Крэсла Янка — 171
Кубэ Вільгельм — 99, 100
Кудаба Чэславас — 398
Кудасава Надзя *гл.* Запруднік Надзя
Куджамбердыеў Кудайберген — 241, 242, 243, 244, 245, 246, 276
Кузьміцкая Ала — 281
Кукабака Міхаіл — 363, 364
Кулакевіч Таня — 330
Куліковіч Мікола (Шчаглоў Мікола) — 134, 308
Кулін Яўген — 95
Куляшоў — 107
Куляшоў Аркадзь — 107
Кунцэвіч Мікола — 305
Куома Марыё — 377
Купала Янка — 35, 266, 286, 288, 308, 392, 395, 405, 417, 419
Купрэвіч Васіль — 258
Купэр Фэнімор — 43
Курапас Мірон — 363
Курдзюмава Эмілія — 70
Кучынскія — 83, 85
Кушаль Уладак — 134, 135, 143, 158
Кушаль Францішак — 97, 106, 134, 157, 158, 162, 172, 174, 306, 307
Кушаль Яраслаў — 97
Кушнер Іван — 93, 129
Кэгіл Біл — 368, 370, 391
Кэйс Кліфард — 216
Лабацэвіч Ігар — 251, 412
Лабейка — 219
Ладзісава Галіна — 420
Лазанаў Сашка — 202
Лангбард Іосіф — 104
Лапіцкая Валянціна — 376
Лапіцкі Мікалай — 93, 165, 172, 227–229, 231, 330, 344, 345, 347, 348
Ластоўскі Вацлаў — 108
Латышонак Алег — 251
Лаўтэнбэрг Фрэнк — 367
Лашук Аляксандар — 251, 311
Лебяда Тодар — 126
Левіт Борка — 53
Леконт Марыюс — 221
Ленакс Джэймс — 248
Лермантаў Міхаіл — 44
Лескіў Мірон — 360
Леўчук Віла — 384
Лешчанка Пётр — 107
Лешчанка — 90
Лёсік Антон — 91, 111
Лёсік Язэп — 91, 92
Ліманоўскі Янка — 305, 391
Літ, біскуп — 222
Літаровіч Ліза — 330, 384
Ложка — 168
Лофтус Джон — 201, 321, 327–329, 356
Лужынскі Міхась — 332
Лукашук Аляксандар — 324, 411
Лукашэнка Аляксандар — 278, 281, 282, 425, 426
Луцкевіч Антон — 340
Луцкевічы — 116
Лынькоў Міхась — 44
Любачка Іван — 271
Лютэр Марцін — 319
Ляванскі Рычард — 243–246, 306
Магдзей Жора — 32
Мазалькоў Яўген — 417
Мазураў Кірыла — 358
Майсяёнак Андрэй — 414
Максімюк Ян — 251, 324
Малецкі Язэп — 307, 421
Малышка — 158
Мальдзіс Адам — 95, 251, 288, 324, 334, 336, 396–399, 401, 402, 404, 410, 411, 414, 416
Мамін-Сібірак Дзьмітры — 44
Манькоў Палікарп — 169, 170, 183
Манэргейм Карл Густаў Эміль — 49

Марговіч Алесь — 169, 174, 201, 208, 211, 306
Марк Яфімавіч — 65
Маркс Карл — 262
Мартыненка Вітаўт — 325
Мартыновіч — 363
Мартынчык — 273
Маўр Янка — 35
Махнюк Алег — 344, 363
Махнюк Н. — 385
Мацукевіч Міхаіл *гл.* Мікалай, мітрапаліт
Мацюнін Сяргей — 406
Машанскі Ўладзімер — 413
Маякоўскі Ўладзімір — 324
Мегероўскі Л. Ф. — 246
Мельяновіч Васіль — 251, 291, 292, 340, 367
Мендзялееў Дзьмітры — 266, 395
Мечнікаў Ільля — 313
Мікалай, мітрапаліт (Мацукевіч Міхаіл) — 251, 330
Мілаш Чэслаў — 399
Міндсэнты Ёжэф — 392
Мінковіч Міхаіл — 272
Мінц Лу — 263
Мінчук Анрэй — 227
Мірановіч Пётра — 337, 375
Міркоўскі Браніслаў — 394
Міхайлаў Анатоль — 251, 277, 281, 282
Міхальскі Саўка — 202
Міхалюк Лёля — 251
Міхалюк Янка — 251
Міцкевіч Алесь — 225, 307
Міцкевіч Міхась — 158
Міш Джон — 243
Мойсік Янка — 400
Мондэйл Ўолтэр — 377
Мурашка Рыгор — 122
Муха Іван — 166, 345
Мэдына Тоні — 263
Мэйсан Браян — 229
Мэрш ван — 221, 223
Мядзейка Нікандар — 351, 354
Мяльгуй Анатоль — 325
Мяркіс Вітаўтас — 413, 415
Мярляк Кастусь — 281
Навуменка Іван — 417, 418
Навумчык Жорж — 330, 384, 385
Навумчык Сяргей — 4, 251
Нагорны Мікалай — 237
Надсан Аляксандар — 251, 397, 399, 400
Некрашэвіч Сьцяпан — 104
Неслухоўскі Іван (Янка Лучына) — 91
Нікіфаровіч Ванкарэм — 7
Ніксан Рычард — 360–362, 364, 366, 368, 379, 393
Новік — 251
Новікаў Іван — 33, 63, 66
Нюнька Хведар — 251
Нядзьвіга Іван — 161, 162, 224, 301, 313
Някрасаў Мікалай — 44, 45, 58
Ойгстэр Ганс — 236
Олдсўорт — 242
Орандж Юры — 293
Орса Аляксандар — 102, 165–168, 176, 177, 232
Орса Натальля — 167, 168, 296
Орса-Рамана Ала — 297, 301, 345, 384
Пагуда Хведар — 175
Падшывалава Марыя — 27, 28, 31, 48, 62
Падшывалавы — 57, 58, 61, 72, 74
Падшывалаў Міхаіл — 27, 28, 31
Пазьняк Зянон — 4, 251, 334, 418
Паланевіч Іпаліт — 164, 304, 307
Паланевічы — 239
Палянская Ніна — 160, 230, 232
Пануцэвіч Вацлаў — 170, 174, 1757
Панькоў Мікола — 164, 304
Пап Майкл — 285
Парамонаў Ягор — 56
Пар Ўолтэр — 221
Пастар Ласла — 251
Пашкевіч Алег — 288
Пашкевіч Валентына — 311, 331
Пашкевіч Ева — 251
Пашковічы, браты — 111
Пеляса Ўладзімер — 183, 384
Перская Жэня — 35
Пій XII, папа — 207

Пікарда Гай — 251
Пікаса Пабла — 276
Плашчынскі Ізыдар (Гуткоўскі Язэп) — 307, 394
Пляскач — 343
Пляскач Васіль — 360
Полмэн Доўн — 263
Поп Майкл — 272
Прускі Мікола — 251, 320, 321, 325, 329, 331
Пугачоў Міхал — 142, 148, 149
Пушкін Аляксандар — 30
Пэн (Пэніёнчык) — 386, 387
Пякарская Барбара — 329
Рабок Людміла — 266, 322, 418
Равенскі Мікола — 197, 198, 206, 293, 304
Рагажэцкі Мечыслаў — 164, 166
Рагалевіч — 343
Рагалевіч Валя — 388
Рагалевіч-Дутко Ірэна — 264, 310, 378, 384, 388
Рагуля Барыс — 186, 188, 190, 205, 354
Рагуля Люда — 197, 214
Радзянкова Вера — 58
Радзянкова Тоня — 58
Радзянковы — 58
Радзянкоў Іван — 31, 34, 46, 61, 65, 68
Радзянкоў Сямён — 31, 32, 34, 58, 68, 69
Разіель Джэй — 264
Ракфэлер — 367
Рамана Фрэнк — 385
Раманавы — 188
Раманоўскі Васіль — 406
Рамук Вітаўт — 170, 171, 204, 207, 208, 251, 348
Рапапорт Эмануіл — 262
Раткевічы — 299
Рачкоўскія — 86
Родаван — 399
Роджэрс Ўорэн — 356
Роджэрс — 262
Рок Марыка — 125
Роска Дэрэк — 260
Рудэнка Раман — 364
Ружанцоў Аляксандар — 307
Русак Аляксандар — 158, 161, 162, 227
Русак Васіль — 384
Русак Галіна — 337, 338, 384
Русак Л. — 385
Русак Н. — 385
Русанаў Жэнька — 44, 45
Рутман Аркадзь — 280, 281, 289, 394
Рыдлеўскі Лявон — 207
Рыжы Уладзюк — 186–188, 193, 194, 196, 216
Рыкаў Аляксей — 45
Рытар Іна (Саковіч Аляксандра) — 165, 166, 304, 320
Рыч Вера — 335, 340
Рычэр Стывэн — 370, 372, 387
Рэйган Роналд — 357, 366, 367
Рэнэ — 260
Сабалеўскі Антон — 293
Сабалеўскі Юры — 136
Сава, япіскап — 171
Савёнак Апалёнія — 10, 157, 228, 231, 239, 295–297, 299, 300, 399
Савёнак Лявон — 229, 231, 239, 295, 322, 420, 421
Савёнак, цёця Нюта — 420
Савёнкі — 144, 158, 206, 228–232, 237, 239, 295, 299
Савік Лідзія — 293
Сагановіч Генадзь — 335, 401, 405, 420
Сажыч Язэп — 251, 354
Саковіч Аляксандра *гл.* Іна Рытар
Салавей Алесь — 311, 312, 318–321
Салівэн Уолтэр — 255
Саломенік Антон — 101, 102
Самартына Пітэр — 368, 369
Сасукевіч Саша — 169, 174
Саўка Зьміцер — 323, 330, 333
Саўка Ілона — 323, 330, 333
Саўка Міхась — 208
Сачанка Барыс — 282, 340, 341, 421, 422
Семяновіч Казімір — 258, 266, 395
Сенька Міхась — 322, 330, 345, 384
Сёмуха Алеся — 299, 358

Сікорскі Мікалай — 283, 284, 285
Сімпсан Элізабэт — 335, 336
Сінельнікаў Сярожа — 59
Сітнік — 290
Сітнік Валодзя — 216
Сіцько Мікола — 166
Скабей Мікола — 311
Скарабагатаў Віктар — 293
Скарына Францішак — 16, 130, 164, 266, 267, 269,284, 286, 288, 312, 319, 424
Скрыган Янка — 275
Скурат Яўхім — 105
Славікоўскі — 124
Славікоўскі Чэсік — 101
Слосканс Баляслаў — 207, 208
Слуцкі Брус — 261, 262
Случанскі Ўладзімер — 275
Смаршчок Аўген — 196, 202
Смаршчок Зоя — 251
Смулкова Альжбета — 397, 399, 400
Снапкоўскі Ўладзімер — 415
Сокалаў-Воюш Сяржук — 281, 394, 419
Сонькіна Тайба — 40
Спаак Пол-Генры — 212
Стагановіч Тамара *гл.* Кольба-Стагановіч Тамара
Сталін Іосіф — 29, 210, 211, 271
Сталін Якаў — 67
Станкевіч Вячка — 385, 394
Станкевіч Зіна — 296
Станкевіч Марыя — 166
Станкевіч Станіслаў — 207, 211, 279, 285, 306, 308, 350, 360, 361, 364, 394
Станкевіч Юрка — 166, 169, 251, 296, 345
Станкевіч Янка — 160, 162, 164–167, 241, 349
Станюковіч Канстанцін — 44
Стар Карп — 297
Стаськевіч Сьцяпан — 137, 138
Стаханаў Аляксей — 43
Стомы — 239
Стражаў Васіль — 423
Строк Язэп — 345
Струк (*тс* Строк) — 139
Струк сын — 143
Стэльмах Зьміцер — 105
Стэльмашонак Іван — 290, 291, 292
Субота Адольф — 413
Судзілоўскі-Русэл Мікалай — 411
Суднік — 38, 83, 86
Сурвіла Івонка — 251, 337, 354
Сурвіла Паўліна — 325
Сурмач Ганна — 332, 358
Сыч Пётра — 207, 351, 391, 394
Сьмірнова Анастасія — 28, 29, 39, 40
Сьмірноў Леанід — 243
Сьміт Джон — 420
Сьміт Эл — 360
Сьцепаніда — 47, 60
Сьцяпанаў М. — 227
Сэдоў Арнольд — 269
Сэлер Максін — 272
Сэльвясюк Валік — 329
Сэлях Вячаслаў — 7, 126, 142, 148
Сяднёў Масей — 172, 275, 279, 306, 320
Сядура Ўладзімер (Глыбінны Ўладзімер) — 285, 305, 338
Сямёнаў Дзіма — 135, 136, 158, 169, 170, 174
Сянкевіч Віктар — 251, 338, 340
Сянькевіч Аляксандар — 238
Сянькевіч Г. — 306
Сянькоўскі Юрка — 206–208, 212, 214, 222, 251, 351, 394
Сяргеева Галіна — 427
Талстая Аляксандра — 225
Талстой Аляксей — 44
Талстой Леў — 225
Тамашчык Уладзімер (япіскап БАПЦ Васіль) — 155, 201, 296, 297, 394
Танк Максім — 289, 314
Тапорэк Джэк — 377, 387
Тарасэвіч Лявон — 251
Таро Жак — 217, 218, 221–223, 233
Тоўсьцік Аркадзь — 282, 283, 288
Трусаў Алег — 415, 419
Трусаў Аўген — 217, 251
Трыгубовіч Валянціна — 332, 358
Трыгубовіч Сяргей — 358

Трысмакоў Парфіры — 138, 165
Тугалукаў Іван — 161, 162
Тулейка Міхась — 175, 296
Тумаш Вітаўт (Багровіч Андрэй, Брага Сымон) — 4, 139, 284, 286, 289, 301, 305–321, 323, 327–329, 424
Тумаш Галіна — 313, 319, 345
Тумаш Яра — 312
Тургенеў Іван — 44
Туронак Браніслаў — 332
Туронак Юры — 397, 400
Тусэн Боб — 189
Тусэн мадам — 188, 189, 190, 191, 192, 202
Тусэн Марыя — 189, 190
Тылдэн Сэмюэл — 248
Уладзіміраў Леў — 286
Уласаў Андрэй — 142, 148, 149, 347
Улашчык Мікола — 12, 16, 17, 18
Унбэгаўн Барыс — 272
Урбан Павал — 174, 211, 306, 394
Урбан Майкл — 272
Уцёсаў Леанід — 42
Ўільямс Сэм — 266
Ўотэрс Арон — 235
Федарук — 218
Федарэнка Аўген — 339
Федарэнка Жэнька — 204, 339
Ферсман Аляксандар — 182
Філарэт мітрапаліт — 282
Філафей япіскап — 105
Філістовіч Янка — 210
Форд Джэралд — 355, 366, 379, 388, 393
Фурманаў Дзьмітры — 44
Фэрнандэль — 211
Хадыка Кастусь — 251, 425
Ханяўка Часлаў — 35, 307
Харавец Галіна — 216
Харытончык Вольга — 176, 177, 179, 181, 182, 201, 230
Хацкевіч Рыта — 96
Хібінскі Алесь — 165
Хітраво — 33
Хлебнікава Ларыса — 41, 57
Хмара — 187
Церашчатава Вольга — 281
Цеханавецкі Анджэй — 410, 411
Цётка (Алаіза Пашкевіч) — 108
Цёця Каця (Кацярына Трафімаўна) — 11, 12, 13, 14, 16, 17, 18, 53, 220
Цёця Паша (Праскоўя Дзьмітрыеўна) — 11, 12, 13, 14, 16, 18, 53, 220
Цімафейчык Тодар — 197
Ціцянкоў Іван — 426, 427
Цу Джон — 338
Цупрык Бабі — 330, 385
Цупрык І. — 384
Цыганкоў Эдуард — 277
Цьвірка Ўладзімер — 167, 168, 174, 197, 201, 208, 349, 394
Цэлеш Мікола — 103, 289, 329, 322
Цэлеш Слава — 103, 105, 122
Цярпіцкая Ірэна — 330
Цярпіцкі Віталі — 330, 384
Цярэшка Анатоль — 332
Цяўлоўскі Эміль — 394
Чайкоўскі Дзьмітры — 306
Чакмарова Ніна — 54
Чапаеў Васіль — 44
Чарняўскі Францішак — 345
Чафранаў — 39
Чачнёва Валя — 123
Чыгрынаў Іван — 278, 279, 280
Чэкман Валеры — 398
Шабанава Каця — 87, 107
Шабанавы — 8, 83–86, 107, 111, 115, 121, 128
Шабанаў Коля — 87, 107, 115, 116
Шабовіч Славік — 320
Шабуня Эдвард — 138–140
Шавялёў Юры — 272
Шаміль — 45, 55
Шамяткоў Леанід — 419
Шапіра Тамара — 40, 65
Шаўфус Тацяна — 225
Шварц Саламон — 272
Шкет Борка — 32, 63
Шкода Лёня — 95
Шкялёнак Мікола — 314
Шнэк Алег — 136
Шу Мінг — 363
Шукелойць Антон — 132–134, 251,

301, 307, 309, 323, 324, 329, 331, 333, 355, 357, 385, 396
Шупа Сяргей — 3, 251, 312, 323, 324, 330, 331, 404, 405, 408, 411, 419
Шурак Лявон — 378
Шуст Мікола — 189–191, 251
Шчаглова Туся — 136, 160, 230
Шчаглоў Мікола *гл.* Куліковіч Мікола
Шчасны Ўладзімер — 288
Шчорс Барыс — 172, 183, 210, 215
Шчорс Ігар — 322
Шчорс Мікалай — 314
Шчурка Міхаіл — 181
Шчэцька Васіль — 169, 208, 213, 223, 231, 358, 390
Шыбека Захар — 86, 401, 402, 414
Шыбут — 158, 347
Шылер Фрыдрых — 95
Шылкін Мікалай — 21, 23
Шылкіна Раіса — 21, 23
Шыманец Віржыні — 251
Шыпко Вера — 101
Шэйман — 113
Энгельгарт Ойген фон — 139, 178, 214
Эссон (А. Зураеў) — 287, 288
Эўфрасіньня Полацкая — 165
Юр'ева Зоя — 272, 306
Юргела Канстанцінас — 365
Юрэвіч Алена — 322, 329
Юрэвіч Лявон — 181, 263, 267, 268, 324, 327, 329, 330, 333
Юрэвіч Надзя — 180
Юхнавец Янка — 289, 320, 321, 329
Яловіч А. — 211, 306
Ян Павал II, папа — 399
Янкоўскі Фёдар — 5
Яновіч Сакрат — 251
Янушкевіч Лідзія — 224, 232, 235, 301
Ясенін Сяргей — 58
Ясюк Эмануіл — 227

Зьмест

Янка Запруднік. Прадмова 3

Бацькі і маленства ў Менску 5
Налінск і Кіраў 11
Арол 20
Арол. Вайна 62
Менск 82
Нямеччына 135
Бэльгія 186
ЗША. Пачаткі 227
Бібліятэка 240
Бібліятэчныя сустрэчы і кантакты 271
Сям'я і будні 295
Штодзённае амэрыканскае жыцьцё 302
БІНіМ 304
Грамадзкая дзейнасьць 342
Беларуская палітыка: БЦР і БНР 346
Амэрыканская палітычная дзейнасьць 359
ЗША. Этнічная рада 368
Беларускія фэстывалі 378
Радыё 390
Вяртаньне ў Беларусь 396

Паказальнік імёнаў 431

Кіпель, В.

К42 Жыць і дзеіць : успаміны / Вітаўт Кіпель; прадмова Янкі Запрудніка. — Мінск : Зміцер Колас, 2015.— 442 с., [29 л.] іл.

ISBN 978-985-6783-68-4

У кнізе ўспамінаў «Жыць і дзеіць» адзін зь вядучых дзеячоў беларускай эміграцыі доктар Вітаўт Кіпель прыгадвае сваё дзяцінства ў Менску і ў расейскай высылцы, юнацтва ў акупаваным Менску, маладосьць у Нямеччыне і Бэльгіі і сталае жыцьцё ў Злучаных Штатах – амаль стагодзьдзе беларускай гісторыі, дзе аўтар, чалавек незвычайнага лёсу, быў у гушчы падзеяў палітычнага, грамадзкага і культурнага жыцьця.

Адрасуецца ўсім, хто цікавіцца пытаннямі гісторыі, культуры і арганізацыі жыцьця беларускай дыяспары за мяжой.

УДК [325.2(=161.3)(73)+94(476)](093.3)
ББК 63.3(4Беи)

Літаратурна-мастацкае выданне

Кіпель Вітаўт

ЖЫЦЬ І ДЗЕІЦЬ

Успаміны

Адказны за выпуск *Зміцер Колас*

Падпісана да друку 11.05.2015. Фармат 60х90 $^{1}/_{16}$.
Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 31,38. Ул.-выд. арк. 38,70.
Наклад 500 асобнікаў.

Выдавец і паліграфічнае выкананне
індывідуальны прадпрымальнік Зміцер Колас.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вытворцы, распаўсюдніка
друкаваных выданняў № 1/291 ад 17.04.2014.
Пр. Незалежнасці, 105-14, 220023, Мінск.